Архітэктура Беларусі



НАРЫСЫ ЭВАЛЮЦЫІ ВА ЎСХОДНЕ-СЛАВЯНСКІМ І ЕЎРАПЕЙСКІМ КАНТЭКСЦЕ



Том 1


IX–XIV стст.

Архітэктура Беларусі

Нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце


Том 1

IX–XIV стст.



АРХІТЭКТУРА БЕЛАРУСІ

НАРЫСЫ ЭВАЛЮЦЫІ
ВА ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКІМ
І ЕЎРАПЕЙСКІМ
КАНТЭКСЦЕ



НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору
імя Кандрата Крапівы

АРХІТЭКТУРА БЕЛАРУСІ

НАРЫСЫ ЭВАЛЮЦЫІ ВА ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКІМ І ЕЎРАПЕЙСКІМ КАНТЭКСЦЕ

У чатырох тамах

Том 1

IX–XIV стст.

Мінск
«Беларуская навука»
2005

УДК 72(476) «08/13»
ББК 85.12(4Беи)
А 87

Рэдакцыйная калегія:

А. І. Лакотка, Т. В. Габрусь, А. М. Кулагін,
А. Ю. Пятросава, А. С. Сардараў, Ю. У. Чантурыя

Навуковы рэдактар

член-карэспандэнт НАН Беларусі А. І. Лакотка

Рэцэнзенты:

доктар архітэктуры Н. В. Кожар,
доктар архітэктуры Я. С. Аграновіч-Панамарова

Выпуск выдання ажыццёўлены па заказу і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславян.
А 87 і еўрап. кантэксце. У 4 т. Т. 1. IX—XIV стст. / А. І. Лакотка [і інш.]; навук. рэд. А. І. Лакотка. — Мн.: Бел. навука. 2005. — 392 с.
ISBN 985-08-0681.

Прапануецца шматтомнае фундаментальнае даследаванне архітэктуры Беларусі на працягу другога тысячагоддзя. На падставе шматлікіх архіўных крыніц, бібліяграфічнага аналізу, натурных даследаванняў раскрыты працэсы станаўлення і развіцця айчыннага горадабудаўніцтва і архітэктуры. Першы том прысвечаны перыяду IX—XIV стст.

Разлічана на архітэктараў, мастацтвазнаўцаў, культуролагаў і шырокае кола чытачоў.

УДК 72(476)«08/13»
ББК 85.12(4Беи)

ISBN 985-08-0681-8 (Т. 1)
ISBN 985-08-0680-X

© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2005

УВОДЗІНЫ

Дойлідства Беларусі як гістарычны феномен еўрапейскай культуры

Архітэктура і будаўніцтва на працягу развіцця цывілізацыі з'яўляліся заўсёды аднымі з галоўных форм стваральнай дзейнасці. У даіндустрыяльную эпоху будаўніцтва ўвогуле з'яўлялася галоўным у працэсе адаптацыі асяроддзя для вытворчых, камунікацыйных, сацыяльных і побытавых патрэб.

Прыродна-ландшафтныя ўмовы, тыпы гаспадарання (аседлае, вандроўнае), гісторыка-этнаграфічныя асаблівасці ўплывалі на фарміраванне рассялення, вызначалі гістарычныя тыпы паселішчаў, інфраструктуру камунікацый. Ва ўсходнееўрапейскім ландшафтным арэале існуюць дзве гаспадарчавызначальныя геаграфічныя зоны: лес і стэп. Гэта не толькі прыродна-кліматычныя зоны, гэта дзве культуры, два віды гаспадарання, дзве глабальныя сістэмы светапогляду і грамадскіх адносін, сацыяльнага і палітычнага ўплыву. Разам з тым у другой палове I тысячагоддзя нашай эры ў пазначаным арэале пачынаецца этнічны рух: з поўначы і ўсходу на поўдзень і захад Еўропы рухаюцца угра-фіны, гуны, готы, арабы.

Яны аказваюць моцнае ўздзеянне на антычныя культуры міжземнамор'я, кельцкае і гальскае насельніцтва цэнтральна- і заходнееўрапейскіх раўнін.

Наступнай хваляй стаў рух славян у канцы пазначанага перыяду на поўнач і ўсход Еўропы. Да канца I тысячагоддзя на тэрыторыі Беларусі заканчваецца працэс усходнеславянскай каланізацыі. Ва Усходняй Еўропе ўтвараецца магутная дзяржава — Кіеўская Русь.

Вытокі дойлідства на тэрыторыі Беларусі бяруць карані з часу рассялення славян (дрыгавічоў, радзімічаў, крывічоў). Менавіта з гэтага часу вядзецца будаўніцтва шматлікіх умацаваных гарадзішчаў (як правіла, ля сутоку рэк), вакол іх — земляробчыя селішчы. Драўляныя ўмацаванні гарадзішчаў нямецкія і скандынаўскія храністы памылкова называлі гарадамі (Нюрнбергскія хронікі X—XI стст. паведамляюць пра сотні гарадоў на прасторы паміж Заходнім Бугам і Дняпром).

Драўлянае дойлідства ўсходніх славян часоў Кіеўскай Русі ўяўляла сабою развітую і дасканалую будаўнічую культуру арэалу лясной паласы Еўропы. Суадноснасць дойлідства і прыроды тут дасягнула пэўнай гармоніі і канструктыўнай дасканаласці. Былі вынайдзены эфектыўныя драўляна-земляныя і драўляна-каменныя ўмацаванні (субструкцыі валоў, першыя ярусы сцен з тэрасаў і гародняў, дамбы і масты цераз водныя перашкоды). Атрыма-


лі развіццё адмысловыя вежавыя формы: шмат'ярусныя, у спалучэнні з галерэямі (чацверыкі, круглікі). Жыллё гарадскіх феадалаў мела ярусныя і вежавыя канструкцыі, галерэі-гульбішчы, падклеці і сутарэнні (цокалі).

З распаўсюджаннем хрысціянства росквіту дасягае драўлянае царкоўнае будаўніцтва, асабліва ў вотчынных цэнтрах сельскіх акруг (пагостах, сёлах), гарадскіх слабодах, загарадных кляштарах. У буйных гарадах, цэнтрах земляў і княстваў з'яўляюцца манументальныя мураваныя збудаванні (у Кіеве, Чарнігаве, Полацку, Пскове). Але асноўным пакуль застаецца драўлянае дойлідства. Гэта быў усенародны творчы працэс. Славянская дзяржава стала сапраўды краінай дойлідаў. Ад паўзямлянак лесастэпавай паласы да наземнага жытла сярэдняй лясной паласы і жытла на падклецях зоны еўрапейскай тайгі фарміраваліся канструктыўныя, планіровачныя і кампазіцыйныя прыёмы, тыпы забудовы ў вёсках і гарадах. Пад усходнеславянскай традыцыяй часам праглядвалі глыбінныя рудыменты старажытных індаеўрапейскіх рыс. Кругавыя, канцэнтрычныя паселішчы трыпальскай культуры згадваюцца не толькі ў круглых дварах-курэнях Украіны і чарназёмнай паласы Расіі, але і ў палякаў, лужычан, балтаў, на сярэднярускай раўніне (Стары Аскол). Круг, хор, харавод атаясамліваліся з сусветам, адлюстраваным у кругавой забудове. У замкнёнай структуры бачыліся парадак і гармонія, арганізуючыя асяроддзе. Пазначанае было характэрна і антычным пасяленням і дварам.


Кругавая забудова супрацьпастаўлялася адкрытай прасторы, прасторы палёў і лугоў (поле, аполле, дол, доля, далягляд). Разам з тым замкнёнасць забудовы атаясамлівалася з каляндарным цыклам, кругаваротам сонца і мела ў славян вобразна-светапоглядавае значэнне: сонечны кругаварот, круг далягляду і нават ралля, поле — таксама круг.

Для жыхароў лясной паласы тэрыторыі Беларусі замкнёныя структуры забудовы былі больш дробнымі (гарадзішча, сядзіба, акольны град). Сярод лясоў і само поле называлася інакш: паляна. Ворыўна-падсечнае земляробства — гэта сістэма палян. Паляна і паліць, выпальваць у лесе дзялянку, паляваць, палоць — гэтыя паняцці раскрываюць іншы сусвет і іншы светапогляд.

У славян сярэдняй лясной паласы Усходняй Еўропы даволі рана выявіліся, нароўні з замкнёнымі, лінейныя структуры забудовы. Нешта падобнае да прыходу славян нагадвалі шматкамерныя абшчынныя дамы балтаў, аднак ад славянскіх лінейных структур яны прынцыпова адрозніваліся канструкцыяй (слупавая і зрубная). Лінейныя структуры ўсходніх славян канструкцыйна вытворныя ад зрубаячэек тэрас і гародняў, з якіх фарміраваліся сцены гарадзішчаў і замчышчаў. Археалагічныя матэрыялы сведчаць, што забудова многіх гарадзішчаў часам уяўляла лакальныя лінейныя структуры. Так, археалагічныя даследаванні горада Каладзяжын на Украіне выявілі лінейныя структуры зрубаў жылых і




Мал. 1. Горад Дзіміні. Фесалія, каля 2000 г. да н. э.




Мал. 2. Горад Мальці. Пелапанес, каля 2500 г. да н. э.

гаспадарчых пабудоў. Зрубныя субструкцыі валу рэзідэнцыі Яраслава XI ст. у Кіеве ўладкаваны ў выглядзе лінейных зрубных клетак. Наглядна забудову гарадзішча лінейнымі (пагоннымі) шматкамернымі жытламі ілюструе рэканструкцыя гарадзішча ў Біскупіцах (Польшча) VI—IX стст. Гарадзішча плошчай каля 4 га, авальнай формы, паводле раскопак 1930-х гг., было абнесена сценамі з тэрас на высокім грэбні валу. Насупраць варот, унутры комплексу, знаходзілася невялікая плошча (прыкладна 50 × 50 м). Астатняя тэрыторыя шырынёю каля 6 і даўжынёю ад 30 да 100 м шчыльна забудавана лінейнымі дамамі. Памеры жылой ячэйкі каля 6 × 6 м. Кожная ячэйка мае самастойны ўваход, па баках якога — невялікія кладоўкі. Суцэльны двухсхільны дах з боку ўваходаў пераходзіць у палогі прычолак. У выяўленых канструкцыях шмат элементаў, уласцівых традыцыйным сельскім жылым і гаспадарчым пабудовам. Субструкцыя валоў гарадзішча ў Радомлі (X—XI стст., Польшча) уяўляе шмат'ярусныя каскады зрубаў-клецяў.

У X—XI стст. ва Усходняй Еўропе у славян лінейныя шматкамерныя



Мал. 3. Гарадзішча Біскупін. Польшча, VII—IV стст. да н. э.



Мал. 4. Ноўгарад. Выява XVII ст.

жытлы саступаюць месца аднакамерным (паўзямляначным і наземным). Апошнія суседнічаюць з гаспадарчымі пабудовамі і па тыпу сядзібы шчыльна месцяцца, асабліва ў гарадах (Бярэсце, Полацк, Мінск, Віцебск, Ноўгарад і інш.).


Разам з тым этнаграфічныя даследаванні паказваюць, што ў Цэнтральным і Заходнім Палессі, на Поўдні Беларусі яшчэ ў 1930-я гг. масава бытавалі лінейныя (пагонныя) двары, па структуры вельмі блізкія археалагічнаму матэрыялу Каладзяжына. Абмеры З. Дмахоўскага забудовы мястэчка Кажан-Гарадок таксама выявілі падобную структуру. Этнографы першай паловы XX ст. выказвалі меркаванне, што гэта прыклады старажытнай дрыгавічскай забудовы (І. Сербаў).

Лінейныя дамы селішча абароннага тыпу ў Біскупіне VI—IX стст. маюць слупавую канструкцыю, аналагічныя збудаванні Кіева, Каладзяжына (XI—XII стст.) і помнікі народнага жытла пачатку XX ст. — зрубную. Верагодна, у дадзеным выпадку мае месца суіснаванне даславянскіх (слупавых) і славянскіх (зрубных) канструкцыйных прыёмаў.

У цэлым, усходнеславянскае драўлянае дойлідства эпохі Кіеўскай Русі грунтавалася на гарызантальнай канструкцыйнай схеме. Гэта было, умоўна кажучы, гарызантальнае будаўніцтва, калі збудаванні ўзводзіліся з вянкоў, завяршаліся зрубнымі дахамі на самцах (закотам). Каркасныя, жылыя і грамадскія збудаванні вылучаліся канструкцыйным



Мал. 5. Іерусалім. Роспіс бібліятэкі семінарыі ў Падуі. XIII ст.



Мал. 6. Рым. Гравюра на дрэве. Нюрнберг, 1493 г.

адзінствам: адзінствам форм, прапорцый і маштабу, — у аснове якіх знаходзілася адзіная аб'ёмная модульная ячэйка — зруб (паруб, клець, клетка). Этнаграфічныя даследаванні (М. Чачулін) паказваюць, што да XVI ст. большасць будынкаў у гарадах называлася клецямі. У актавых матэрыялах апісваліся сядзібы баяр, якія мелі больш дзесятка жылых клецяў (І. Забелін). Этнографы на падставе гэтага выказалі меркаванне аб паходжанні традыцыйнага жытла ад клеці (А. Харузін).


Універсальнасць зруба як аб'ёмнага модуля вызначыла кампазіцыйную разнастайнасць, выразнасць і разам з тым шырокую інварыянтнасць збудаванняў, іх адаптацыю да складаных ландшафтных умоў. Драўлянае дойлідства беларускіх земляў X—XII стст. цалкам адлюстроўвала самыя высокія яго дасягненні, аб чым сведчаць археалагічныя помнікі Брэста, Полацка, Віцебска, Мінска.

Археалагічныя і актавыя матэрыялы XV—XVI стст. (чарцяжы, гравюры, планы) сведчаць, што ў гарадах Беларусі меліся дасканалыя, двух- і трохпавярховыя жылыя і грамадскія будынкі, гарадское добраўпарадкаванне.

Усходнеславянскі горад IX—XII стст. — гэта праява арганічнага знітавання прыроды і архітэктуры, камунікацый і навакольных паселішчаў. Сацыяльная іерархія таксама накладвала адбітак на схему будовы горада: град (замчышча) — гандлёвая плошча (торг) — пасады. Замак з'яўляўся рэзідэнцыяй князя і яго дружыны, што быў уладаром тутэйшай правінцыі, ці рэгіёна, таму горад не адчуваў дэфіцыту ў плошчах, мог арганічна развівацца і расці. Апошнім славянскія гарады прынцыпова адрозніваліся ад заходнееўрапейскіх. Там паміж уладальнікам зямель — феадалам — і рамеснікамі-гараджанамі адносіны грунтаваліся на рыначных дачыненнях. Рамеснікі-гандляры, магістрат для будоўлі і развіцця горада павінны былі выкупаць землі ў феадала. Заходнееўрапейскія гарады ўжо ў



Мал. 7. Цюрых. Гравюра Юзэфа Ледрэра, 1576 г.




Мал. 8. Ростак. Вікэ Шорэр, 1584 г.

XII—XIV стст. вылучаліся празмернай шчыльнасцю. Рэйнскія гарады ў XIV ст. ужо мелі забудову ў 5—7 паверхаў. Антаганізм паміж горадам і драпежнікам-феадалам замацаваўся ў заходнееўрапейскім фальклоры.

Сілуэт усходнеславянскага горада вылучаўся натуральнасцю і маляўнічасцю. На ўзвышэнні, як правіла, ля сутоку рэк — замчышча. Па напрамках галоўных дарог — вароты. Насупраць замчышча — гандлёвая плошча. Паміж дарогамі (вуліцамі, канцамі) — сектары пасадаў (вакольны град). Знешнія межы забудовы пасадаў таксама мелі абарончыя збудаванні (вал, сцяна, вежы). За вакольным градам размяшчаліся палі пахаванняў (курганныя могільнікі). Далей ішлі палеткі, лугі, селішчы. На адносна недалёкай адлегласці размяшчаліся кляштары (манастыры), нібы спадарожнікі горада (Ноўгарад і Старая Ладага, Пскоў і Ізборск, Полацк і Бельчыцы, Кіеў і Вышгарад). Паразуменне прасторы, волі, натуральнасці заўсёды прысутнічала ва ўсходнеславянскім горадабудаўніцтве. Эстэтычныя пачуцці пры гэтым адыгрывалі не апошнюю ролю. Ландшафтныя дамінанты ўтваралі прыродна-ландшафтную аснову кампазіцыі горада. У «Аповесці мінулых гадоў» прыводзяцца словы апостала Андрэя: «Вы бачыце гэтыя горы? Дык вось, на гэтых гарах узнясецца благадаць божая, і будзе горад вялікі (Кіеў. — *А. Л.*), і царква святая ўздвігнута будзе...» Адметныя ландшафтныя дамінанты абіраліся месцамі ўзвядзення цэркваў. Самавызначэнне ў ландшафце, мабыць, — галоўнае ў паразуменні вобраза старажытнага ўсходнеславянскага горада. Дамінантай Ноўгарада X ст. на раўнінных берагах Волхава стаў дубовы Сафійскі сабор «а 13-ці купалах».

З'яўленне мураваных сакральных збудаванняў істотна змяніла кампазіцыю і эстэтычнае аблічча гарадоў Кіеўскай Русі. На фоне натуральных колераў зрубаў і стракатай кары дранкавых дахаў кантрастна вылучаюцца бледна-ружовыя, велічныя храмы. Для такіх гарадоў, як Полацк, Ноўгарад, Віцебск, муры Сафій атаясамліваюцца з во-



бразам горада. У Кіеве X–XI стст. існавала некалькі сакральных і палацавых мураваных комплексаў (Дзесяцінная царква, Сафійскі сабор з манастырамі Ірыны і Георгія, двор Юрыя Даўгарукага і інш.).

З'яўленне мураваных храмаў прыўнесла ў народна-самабытную архітэктуру ўсходніх славян новыя прафесійна-стылёвыя і канструкцыйныя веды, тэхналогіі, матэрыялы. Узвядзенне такіх унікальных збудаванняў патрабавала мабілізацыі рэсурсаў цэлага рэгіёна і пэўнай будаўнічай індустрыі. Зразумела, чаму напачатку мураваныя храмы ўзводзяцца ў цэнтрах княстваў. Пры агульнай тыпалагічнай і стылёвай ідэнтычнасці свайму візантыйскаму аналагу Сафіі Кіеўскай Русі вылучаліся дакладнай адпаведнасцю маштабаў прыроднага і архітэктурнага асяроддзя.

У XII–XIII стст. будуюцца храмы рэгіянальнага і лакальнага значэння, захоўваючы кампазіцыйныя асаблівасці сваіх больш буйных папярэднікаў, але іншага маштабу і часам пластыкі, прадыктаванай мастацкімі асаблівасцямі муроўкі і матэрыялам (спалучэнне плінфы, валуноў, вапняку). Гэтым былі абумоўлены рэгіянальныя адрозненні. Да XIII ст., можна меркаваць, на тэрыторыі Беларусі пераважалі два тыпы муроўкі: з плінфы і вапняку (Полацк, Віцебск, Мінск) і з плінфы і валуноў (Мінск, Ваўкавыск, Гродна). Акрамя таго, амаль кожны храм меў індывідуальныя рысы муроўкі. Так, полацкія храмы мелі муроўку з патаемным радам і дабаўленнем валуноў; мінскі — унутраную частку сцен з валуноў, знешнюю — з абчасаных блокаў; Дабравешчанская царква ў Віцебску складзена з каменных блокаў і радоў плінфы. Спалучэнне ў муроўцы плінфы і валуноў, каменнай кладкі сведчыць пра ўплыў раманскай і гатычнай архітэктуры. Заходнееўрапейскія прыёмы будаўніцтва траплялі і праз абарончае дойлідства, замкі і крэпасці. Актыўна працэсы культурнага ўзаемаўплыву адбываліся ў заходніх рэгіёнах Беларусі, якія амаль да самага Гродна ўваходзілі ва Уладзіміра-Валынскае княства.

У XII ст. на тэрыторыі Беларусі існавала два буйных горада — цэнтры



Мал. 9. Лейпцыг. Фрыдрых Вэмер, 1750 г.



Мал. 10. Прага. Гравюра Іагана Пірца, 1830 г.

зямель: Полацк і Тураў. 9 гарадоў з'яўляліся цэнтрамі ўдзельных княстваў, а 21 былі мясцовымі цэнтрамі эканамічнага развіцця. Такім чынам, да канца існавання Кіеўскай Русі беларускія землі ў архітэктурна-горадабудаўнічых адносінах былі аднымі з найбольш развітых, у прыватнасці па агульнай колькасці гарадоў.

У сярэдзіне XIII ст. палітычная карта Усходняй Еўропы рэзка мяняецца. Яе паўднёва-ўсходнія прасторы займае улус Джучы-хана (Арда). На поўначы — землі Вялікага княства Уладзімірскага. Яшчэ вышэй — зямля Наўгародская. На берагах Рыжскага заліву — Лівонскі ордэн. На землях прусаў уладкаваўся Тэўтонскі ордэн. Уздоўж басейнаў Віслы, Буга і Днястра — Каралеўства Польскае. У цэнтры гэтай прасторы новых дзяржаўных утварэнняў акрэсліліся межы маладой дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага з цэнтрам у Навагрудку. Яна аб'ядноўвала княствы з цэнтрамі ва Уладзіміры (Валынскім), Дубровіцы, Пінску, Тураве, Навагрудку, Свіслачы, Друцку, Віцебску, Полацку. Даніну Ардзе плацілі Берасцейская, Тураўская і Валынская землі. Асобныя тэрыторыі новай дзяржавы былі незалежнымі. Эканамічныя кантакты з землямі на ўсходзе, залежнымі ад Арды, аслаблі, але адначасова ўзмацніліся з землямі Каралеўства Польскага і краінамі Цэнтральнай Еўропы.

Адбываецца далейшы рост гарадоў, узнікаюць новыя, у асноўным у паўночнай частцы арэала (Вільня — Луцк — Кіеў — Смаленск — Полацк). Змена маёмасных адносін паміж рамеснікамі-гандлярамі і феадаламі, распаўсюджванне магдэбургскага права змяняюць горадабудаўнічую структуру. Ускладняецца адміністр-

рацыйна-тэрытарыяльная іерархія гарадоў (цэнтры зямель і ваяводстваў, дзяржаўных намесніцтваў, княжацкіх вотчын). Ядром новага горада становіцца не замак (крэпасць) з рэзідэнцыяй князя, а гандлёвая плошча з ратушай і гандлёвымі радамі, прадстаўнічымі манументальнымі збудаваннямі.

Кантакты з ваеннымі манаскімі ордэнамі (Лівонскім і Тэўтонскім), ганзейскімі купцамі, экспансія на ўсход Еўропы шматлікіх каталіцкіх ордэнаў спрыялі рэзкаму росту на землях Беларусі мураванага будаўніцтва (замкаў, палацаў, сакральна-кляштарных комплексаў). Гарады часоў Кіеўскай Русі набываюць два горадабудаўнічыя ядры: Стары (замак) і Новы (плошча з ратушай) горад.

Мураваныя замкі ўзводзяцца ў дзяржаўных і княжацкіх рэзідэнцыях: Навагрудку, Крэве, Гродна, Вільні, Троках, Лідзе, Бярэсці. Прымяняліся ўсе перадавыя тыпы муроўкі, вядомыя ў Еўропе: балтыйская, гатычная, крыжавая, галандская, пазней — рэнесансная і варыянты змешаных (гранд-апарэль і г. д.). Новыя даследаванні паказваюць, што тыпы муроўкі сцен Навагрудскага замка XIII—XIV стст. аналагічныя замкавым збудаванням у Кёльне і іншых нямецкіх гарадах тых часоў. Верагодна, што першыя замкавыя муры ў ВКЛ ўзводзілі нямецкія муляры.

Замкавыя збудаванні XIII—XIV стст. у Гродна, Навагрудку, Лідзе, Троках, Крэва ўяўляюць сабою не толькі ваенна-фартыфікацыйныя




Мал. 11. Лейпцыг. Фрыдрых Вэмер, 1750 г.

цытадэлі, але і ўзоры гатычнай архітэктуры. Гатычная архітэктура, вобраз гатычнага горада фарміраваліся і набывалі развіццё на землях Беларусі ў XIV і XV стст. У Гродна, Бярэсці, Вільні з'яўляюцца шматлікія драўляна-мураваныя збудаванні. Дамы рамеснікаў, гандляроў, заможных мяшчан у два і тры паверхі шчыльна запаўняюць вуліцы. Вобраз гатычнага горада дапаўняюць стромкія дахі, мансарды, разнастайныя вежавыя формы. Вертыкальныя дамінанты тут, там абвастраюць дынаміку гарадскога сілуэта. Каркас двухвежавых сцен, стракатасць дрэва, тынкоўкі, валуноў, вулічнага брукавання ствараюць насычаную каляровую гаму.

У параўнанні з усходнеславянскай будаўнічай традыцыяй, заснаванай на гарызантальнай, вянковай канструкцыі зруба-клеці, готыка прыўнесла на Беларусь прынцыпова новую, вертыкальную канструкцыю, заснаваную на слупавым каркасе. Нясучыя слупы выконвалі ролю асноўнай апоры. Запаўненне каркаса (гліна, каменне, цэгла) адыгрывала загараджальную ролю. Слупавы каркас лагічна завяршаўся і каркасным дахам, кроквенным.


Вертыкальная тэктоніка гатычнага будаўніцтва прынцыпова прысутнічала і ў сакральна-манументальных збудаваннях, дзе асновай нясучай сістэмы быў той жа каркас: рады калон, сценавыя пілястры, рэбры сутарэнняў, контрфорсы, аркбутаны. Менавіта дакладная каркасная схема размеркавання нагрузак дазваляла ўзводзіць гатычныя саборы грандыёзных памераў і вышыні.




Мал. 12. Нова Місто (Чэхія). Забудова XI—XII стст.

На змену цэнтрычна-купальнай сістэме праваслаўнага храма прыходзіць восева-вежавая, спалучаючая вертыкальную ўзнёсласць вежаў з гарызантальнай лініяй нефа. Менавіта працяглыя высокія сутарэнні нефа з высокімі грандыёзнымі вокнамі ў прасценках успрымаліся як сакральная прастора, разгорнутая ў перспектыве, што дазваляе адчуваць велічнасць святыні ў руху і часе. Вежы выконвалі ролю прапілей, велічных пілонаў, фланкіруючых уваход. Праёмы ўвахода (звычайна тры) паўтаралі тэму прапілей. Узорыстая разетка акцэнтавала тэму ўрачыстага моманту ўваходу ў сабор.

З пункту гледжання архітэктуры пастаянна актуальным з'яўляецца пытанне: у чым сутнасць адрозненняў візантыйскага і гатычнага тыпаў храмаў? На першы погляд, у аснове формаўтварэння першага ляжыць арка, другога — слуп. Але



Мал. 13. Масква. Малюнак XVIII ст.



Мал. 14. Троіца-Сергіева лаўра. Малюнак XVIII ст.

вежы гатычных сабораў з шатровымі дахамі, спічастыя аркі і зоркавыя сутарэнні ў пэўнай ступені тоесныя арцы. Хутчэй, адрозненні ў архітэктуры тлумачацца адрозненнямі літургічнага дзеяння.

Вежы-прапілеі вядомы ў манументальнай грамадзянскай архітэктуры з часоў Старажытнага Егіпта, Вавілона і антычнасці (пілоны ў выглядзе ўсечаных пірамід, галерэі, каланады і інш.). Яны з'яўляліся архітэктурным абрамленнем грамадскага шэсця: вуліца — прапілеі — наас (двор перад храмам) — храм. Дынаміка лінейнага руху вызначала архітэктуру. Архітэктурна-планіровачная арганізацыя акропаля ў Афінах і рымскага форума таксама адпавядала дынаміцы грамадскага цырыманіяла. Апошняе зыходзіць з каранёў грамадска-сацыяльных адносін, адлюстроўваючы традыцыі і законы грамадскай бытнасці і іх падтрымкі дзяржавай. Іерархія пантэонаў таксама адлюстроўвала і іерархію ў грамадстве. Гатычны сабор у сканцэнтраваным выглядзе ўвасабляе дынаміку літургіі як формы грамадскага дзейства. Пазначанае пазней пацвердзіцца ў барочных ансамблях, дзе спалучэнне вуліцы, плошчы і храма, як адзінай цырыманіяльнай восі, будзе зусім відавочна.

Сутнасць літургіі ў архітэктуры храма Св. Сафіі ў Канстанцінопалі вынікала з іншых грамадскіх каранёў. Па сутнасці, у яе архітэктуры сінтэзаваны традыцыі Старажытнага Усходу (галерэі, аркады, каланады) з традыцыямі антычнай архітэктуры (арка, купал). Цэнтрычнасць, статыка літургічнай прасторы, грандыёзнасць, увасобленыя не ў працягласці, а ў аб'ёме. Роўнаканцовы (грэчаскі) крыж, які часта бачыцца ў размяшчэнні нефаў і алтароў, узмацняе адчуванне статыкі. Рыту-

альныя цырымоніі ў праваслаўнай літургіі звязаны з шэсцямі вакол храма, вакол восі, цэнтра грамадскага дзеяння. Каскад аб'ёмаў з сутарэннямі і главамі згадвае піраміду. Разам з тым гатычны храм можна таксама разглядаць як лінію аб'ёмаў пад асобнымі сутарэннямі.

Вастрыня, дынаміка, кантрастнасць гатычнай архітэктуры, каляровая стракатасць істотна дапаўнялі аблічча старажытных беларускіх гарадоў і іх традыцыйна-славянскую архітэктуру.

Разам з готыкай у народна-традыцыйнае дойлідства Беларусі прыйшоў брус. Спачатку як каркас у фахверкавай сцяне, як кроквы ў дахах сабораў і замкаў, а потым і як элемент драўляных сакральных збудаванняў (касцёлаў), жылых і гаспадарчых пабудоў маёнткаў, фальваркаў, кляштараў і нарэшце гарадскога і сельскага жытла.


У традыцыйным жыллі, асабліва гарадскім, на змену зрубным (на самцах, закоце) дахам прыходзяць дахі кроквенныя. Брус і кроквы робяць драўляныя збудаванні па фактуры бліжэй да мураваных. Гэта блізкасць робіцца яшчэ большай, калі ў XVI ст. у драўляным дойлідстве гарадоў з'яўляецца шалёўка, а хутка і афарбоўка.

Своеасаблівы сінтэз стылёвых рыс драўлянай і мураванай архітэктуры, наяўнасць у гарадах мураваных, фахверкавых, драўляна-мураваных і драўляных збудаванняў, афарбоўка апошніх надавалі архітэктурнаму абліччу горада маляўнічасць, рэгіянальную выразнасць, арганічную сувязь з прыродай. Гарады заходніх рэгіёнаў Беларусі ўжо ў XIV—XVI стст. вылучаліся вялікім працэнтам мураваных і драўляна-мураваных збудаванняў. Гарады ўсходніх рэгіёнаў у большасці захоўвалі перавагу драўлянай архітэктуры. Але ў апошняй заўважваюцца новыя формы, вытворныя ад гатычных мураваных, аб чым сведчаць «Чарцёж горада Віцебска 1664 г.», інвентары Оршы, Дуброўна, Магілёва.


У XV ст. на тэрыторыі Беларусі з'яўляюцца мястэчкі — гандлёва-рамесніцкія паселішчы пры каралеў-



Мал. 15. Вялікі Усцюг, XVII—XVIII стст.



Мал. 16. Салавецкі манастыр. XVI ст.




Мал. 17. Полацк. Малюнак С. Пахалавіцкага. XVI ст.

скіх і прыватнаўладальніцкіх таргах. Да сярэдзіны XVI ст. іх у беларускіх рэгіёнах ВКЛ налічваецца каля 200. Архітэктура беларускага мястэчка XV–XVI стст. — гэта гатычны горадабудаўнічы феномен на славянскай аснове.

Драўляная, шчыльная забудова, дах да даху (пераважна драўлянымі мястэчкі ў XV–XVI стст. былі і ў заходніх рэгіёнах), паабапал вузкіх вуліц, вакол гандлёвай плошчы, якую напачатку замяняла скрыжаванне ці пашырэнне вуліцы. Аднадвухпавярховыя дамы з сутарэннямі і мансардамі, галерэямі і прыклетнікамі, стракатымі шыльдамі ствараліе выразнае, спецыфічнае архітэктурнае аблічча. Склаўся спецыфічны тып местачковага дома — дом рамесніка-гандляра, што спалучыў у сабе майстэрню, жыллё і краму. На плошчы ўзвышаліся царква і касцёл, сінагога і мячэць, стаялі гандлёвыя рады, пастаялы двор (карчма). Мястэчкі ўзнікалі на скрыжаваннях, прыстанях, балоцістых нізінах (на сырым корні).

Сельскія паселішчы і народнае жыллё ў XIV–XVI стст. працягвалі развіццё славянскіх будаўнічых традыцый. Існавалі вёскі, сёлы (цэнтры вотчынных уладанняў, ці пагосты XI–XIII стст.), хутары і дворышчы (паселішчы груп сваякоў і іх батракоў — удольнікаў, кутнікаў). Але ў XVI ст. з'яўляюцца і слабоды (паселішчы на новым месцы, вызваленыя на пэўны час ад падаткаў), а таксама фальваркі (дробныя маёнткі, сядзібы арандатараў для вытворчасці хлеба на продаж). Рэформа 1554 г. «Устава на валокі» ў заходніх і паўднёва-заходніх рэгіёнах Беларусі карэнным чынам змяняе інфраструктуру сельскіх паселішчаў, вядзе да іх узбуйнення, уладкавання вулічнай забудовы і яе ўшчыльнення. У выніку рэформы фарміруецца архітэктурны вобраз беларускай вёскі: вулічнай, са шчыльнай забудовай, з размяшчэннем двароў уздоўж вуліцы і прыгуменняў (гумнішча) у канцы сядзібы, паралельна вуліцы. І лінейныя (пагонныя) двары, і замкненні (круглыя, вяночныя) падпарадкоўваліся жорсткай і кампактнай схеме. Яшчэ адным спараджэннем рэформы з'явіліся засценкі (ваколіцы, авулкі) — асобныя двары за мяжой (сценкай) грамадскага поля, якія звычайна належалі дробнай (засцянковай) шляхце і служыламу люду.


На тэрыторыях, дзе рэформа была рэалізавана часткова ці не рэалізавана зусім, пераважалі спарадычна размеркаваныя дробныя вёсачкі, дворышчы, забудова якіх ладзілася па традыцыі «ўсялякі маладзец на свой абразец». Тут кіраваліся зручнасцямі ландшафту, размяшчэннем ворыва, лугоў і лесу.



Мал. 18. Стары замак у Гродна (Замак Вітаўта)

У жылых і гаспадарчых пабудовах пераважалі зрубы з самцовымі дахамі (поўны і няпоўны закот). Зрубы нязначна адрозніваліся па памерах і прапорцыях ад тых, што існавалі ў X–XIII стст. Традыцыйнае жытло, двор вясковага феадала, шляхціца вылучалася як планіровачнай будовай, так і архітэктурна-канструкцыйнымі асаблівасцямі.

У аснове планіроўкі фальварка ці палацава-паркавага комплексу



Мал. 19. Архітэктура гарадоў Беларусі XV—XVI стст.: а) Мінск, б) Гродна, в) Клецк

ляжала восевая сістэма: брама — алея — курданер, паабапал якіх меўся сад (пазней парк) з флігелямі і «чыстымі» гаспадарчымі пабудовамі (свірнамі, сырніцамі, лямусам і інш.), панскі дом (палац) са скразнымі сенцамі (у палацы вестыбюль, перахадзячы ў аванзалу), паабапал якіх — жылыя пакоі. На цокальным паверсе месціліся кладоўкі, кухня, прыслуга, печкі каларыфераў. За сенцамі — сад і парк, за імі — комплекс гаспадарчага двара.

Да сярэдзіны XVI ст. на тэрыторыі Беларусі ў асноўным завяршылася фарміраванне інфраструктуры рассялення. У сваёй аснове яна захавалася да сённяшняга дня. Пазначаная інфраструктура адлюстроўвае тое, што Беларусь да гэтага часу стала адным з густанаселеных і эканамічна развітых рэгіёнаў Еўропы.

У XVI ст. у цэлым завяршыўся працэс фарміравання беларускай народнасці. Важным кампанентам стала беларуская культура, духоўная і матэрыяльная. Архітэктура як частка культуры новай этнічнай супольнасці таксама набыла канкрэтныя нацыянальныя рысы. У архітэктуры горада — гэта сінтэз усходнеславянскіх, гатычных і рэнесансных горадабудаўнічых асаблівасцей. Сфарміравалася мястэчка — адметны для Беларусі тып паселішча рамеснікаў-гандляроў на гандлёвых скрыжаваннях, знітаваўшы рысы як агульнабеларускай, так і іншаэтнічнай будаўнічых культур.

Сфарміравалася вулічная беларуская вёска са шчыльнай, кампактнай забудовай. Абазначыліся агульныя рысы і кампазіцыйныя прыёмы палацава-паркавай архітэктуры.

Перыяд XIV—XVI стст. — гэта час сапраўднага росквіту архітэктуры і будаўніцтва на землях Беларусі. Вызначаюцца тыпалагічная разнастайнасць будынкаў, удасканаленне і разнастайнасць канструкцый і матэрыялаў. Утварэнне федэратыўнай цэнтралізаванай дзяржавы, Рэ-

чы Паспалітай, спрыяе паступовай трансфармацыі абарончых збудаванняў, замкаў у палацава-замкавыя і палацава-паркавыя комплексы. Рэнесансныя замкі ў Любчы, Гальшанах, Міры, Новы замак у Гродна, замак у Быхаве не столькі ваенныя аб'екты, колькі прадстаўнічыя рэзідэнцыі.

З'яўляюцца новыя тыпы сакральна-манументальных збудаванняў. Шырокае будаўніцтва каталіцкіх храмаў узбагачае ансамблі і сілуэт паселішчаў двухвежавымі гатычнымі дамінантамі. Ансамблі каталіцкіх кляштароў мяркуюцца і як абарончыя комплексы (адсюль паразуменне тоеснасці паміж кастэлем і касцёлам-замкам). Складанае становішча праваслаўнай царквы, вобраз яе абароны ў неспрыяльным асяроддзі ўвасобіліся ў храмах абарончага тыпу (Супрасль, Сінкевічы, Мураванка). Мячэці і сінагогі ўзбагацілі манументальнае дойлідства новымі формамі і канструкцыямі, прыўнеслі матывы і формы Усходу (галерэі, мінарэты, ярусныя дахі).

Ратушы, гандлёвыя рады, навучальныя ўстановы і шпіталі пры кляштарах, пазней будынкі тыпаграфій рабілі архітэктуру гарадоў разнастайнай і шматпланавай.

Разам з тым традыцыі славянскага горада не знікаюць у новай, прадуманай і дакладнай структуры горада-магдэбургіі, асяродка рамесніцтва і гандлю. Інвентары XV—XVI стст. сведчаць, што ў буйных гарадах (Мінску, Гродна, Магілёве) прысутнічала вялікая колькасць сядзіб фальварачнага тыпу (з жылымі пабудовамі, хлявамі, свірнамі) з зямельнымі пляцамі і гуменнымі комплексамі, выганамі і сенажацямі. У заходнееўрапейскім горадзе такога ўявіць нельга. Усходнеславянскія гарады арганічна і павольна пераходзілі ў сельскае, прыроднае асяроддзе. Апошняе прыкметна прысутнічала ў інфраструктуры гарадоў. Пазначаная асаблівасць захаваецца да сучаснасці. Драўляныя прыватныя кварталы і нават вёскі сёння існуюць у межах буйных гарадоў Беларусі.



Мал. 20. Гродна. Гравюра сярэдзіны XVI ст.

З пункту гледжання архітэктурных стыляў, XIII—XVI стст. прыўнеслі да старажытнаруска-візантыйскай архітэктуры архітэктуру рама-


на-гатычную і рэнесансную. Готыка і рэнесанс часта суседнічалі ў адным збудаванні (Сынкавічы, Новы замак у Гродна, Ніжні замак у Вільні). Мабыць, адзінкавым і тыповым помнікам готыкі з'яўляецца касцёл Святой Ганны ў Вільні. Іншыя (Траецкі касцёл у Ішкальдзі, 1472) маюць шмат агульнага з помнікамі рэнесаснай архітэктуры (Сынкавічы, першая палова XVI ст.; замак у Міры, мяжа XV—XVI стст.; царква ў Мураванцы, першая палова XVI ст.; царква Барыса і Глеба ў Навагрудку, 1519; і інш.). Плоскія нішы, машыкулі, кантраст белага і чырвонага колераў, светлаценевыя нюансы, пераўтварэнне контрфорсаў у архітэктурна-мастацкую дэталь (Ішкальдзь, Навагрудак, Коўна) — прыклады сінтэзу рэнесансных і гатычных рыс. Адзначым, што рысы готыкі ў заходнееўрапейскіх краінах да канца XIX ст. не зніклі поўнасцю. Нацыянальнымі гатычныя рысы і ў XIX ст. лічылі англічане (віктарыянская готыка, вертыкальны стыль), французы, галандцы (старагаландскі стыль), скандзінавы (стыль вікінг). Прасценкі-пілястры, калоны-слупы, кроквенныя дахі амаль на тысячагоддзе (да эпохі прамысловага перавароту) вызначылі сутнасць будаўнічай культуры Еўропы.

Шматлікія рэнесансныя помнікі архітэктуры Беларусі зафіксаваны ў графічным матэрыяле XVI—XVII стст. Гэта палац Стэфана Баторы ў Старым замку ў Гродна (пабудаваны каля 1580 г.), палац замка ў Любчы (XVI—XVII стст.). Да ўзораў рэнесаснай архітэктуры адносяцца такія помнікі, як кальвінскія саборы ў Смаргоні (1553) і Заслаў'і (XVI—XVI стст.), Асташыне (XVI ст.), замкавая царква ў Кадэне (каля 1830 г.), вежа замкавых варот у Нясвіжы (XVI ст.).

Утварэнне Рэчы Паспалітай, рост магутнасці феадалаў — магнатаў і аслабленне каралеўскай улады ў XVII ст. прыводзілі да аслаблення каралеўскіх гарадоў і ўзмацнення прыватнаўласніцкіх. Яшчэ ў XVI ст. у сувязі з цяжкасцямі вайны з Іванам Грозным на тэрыторыю Беларусі трапляюць езуіты. У XVII ст. каталіцкія манаскія ордэны імкнуцца на Усход, іх падтрымліваюць магнаты. Праваслаўныя прыходы ў адказ аб'ядноўваюцца ў брацтвы. Ідзе працэс узбуйнення рамесніцкіх цэхаў. Будаўнікоў яб'ядноўвалі цэхі плотнікаў. Асноўным будаўнічым матэрыялам усё яшчэ было дрэва.

Манастыры мелі сваіх архітэктараў, якія часта запрашаліся з-за мяжы. Пры навучальных установах манастыроў (кляштараў) у XVII ст. рыхтавалі сваіх дойлідаў. Прыдворных архітэктараў мелі магнаты.

Далейшае развіццё атрымала фахверкавае будаўніцва. Высокага майстэрства дасягнулі цесляры ва ўзвядзенні кроквенных дахаў, стварыўшы цудоўную, з падоўжанымі і папярочнымі сувязямі жорсткасці канструкцыю, якая перакрывала шырокія пралёты Нясвіжскага замка, барочных касцёлаў, палацаў. У мураваным дойлідстве па традыцыі нароўні з цэглай ужываліся валуны, адслужыўшыя век жорны. Цэгла мела розныя памеры: гродзенская — 32 × 25 × 8 см, магілёўская — у 1,5 раза меней. З'яўляюцца тынкоўка і пабелка (пераважна сакральна-ма-



Мал. 21. Гродзенскі замак



Мал. 22. Гродна. Ратуша

нументальныя, палацавыя збудаванні), металічныя канструкцыі (сувязі жорсткасці, зацяжкі, анкеры).

У XVII ст. у гарадах Беларусі яшчэ адыгрываюць сваю ролю ўмацаванні. Буйныя каралеўскія гарады маюць знешнія ўмацаванні і ўнутраныя замкі (Магілёў, Віцебск, Полацк). Рэканструкцыя знешніх умацаванняў гарадоў пераўтварае іх у рэнесансныя крэпасці: правільныя контуры знешніх валоў і бастыёнаў, квартальная планіроўка з асноўнымі ўзаемаперпендыкулярнымі вуліцамі, на перакрыжаванні якіх знаходзіцца плошча (Мінск, Слуцк, Стары Быхаў, Рэчыца). Прыватнаўладальніцкія гарады таксама рэканструіруюцца. У канцы XVI — пачатку XVII ст. буйнейшы магнат Беларусі Радзівіл Сіротка распачаў рэканструкцыю Нясвіжа. Горад пры замку быў рэгулярнай планіроўкі, са знешнімі фартэцыямі.

У XVII ст. на Беларусі развіваюцца і гарады, якія не мелі земляных умацаванняў. Іх замянялі выконваючыя абарончую ролю буйныя кляштары. Да такіх адносіцца Слонім. У XVII—XVIII стст. у ім

фарміруецца горадабудаўнічая сістэма плошчаў, злучаных вуліцамі. Гэта адзін з нешматлікіх на Беларусі прыкладаў горадабудаўнічай схемы перыяду барока.

Езуіты вызначалі ў мастацкай культуры Еўропы новыя ідэйныя і стылёвыя напрамкі. Перамены вызывалі карэнныя змены, што адбыліся ў эканамічным і палітычным напрамках развіцця Еўропы. Магутнай дзяржавай стала Францыя з цэнтралізаванай абсалютнай каралеўскай уладай. Апошняй ахвярай царкоўнага тэрору стаў у 1680 г. Джардана Бруна. Навукі імкліва развіваліся. На змену геацэнтрычнай мадэлі сусвету прыходзіць геліяцэнтрычная. Ідэалізаваны гераічны вобраз чалавека, статычнасць і манументалізм саступаюць месца дынаміцы і руху. Статычнаму кругу супрацьпастаўляецца дынамічная лінія. Рух, развіццё як дамінуючая ідэя ўвасабляюцца ў праменях вуліц, у фантанах, у алеях паркаў. Прырода як крыніца вечнага руху ўжо не ігнаруецца, не разглядаецца як падаснова жорсткіх ідэальных схем, а арганічна знітавана з горадабудаўнічымі ансамблямі. Па-новаму ў горадабудаўніцтве адносяцца да рэльефу: руслу ракі, урочышчу, саду; прыгарадныя вілы з'яўляюцца



Мал. 23. Гродна. Царква Чэснага Крыжа



Мал. 24. Гродна. Прадмесце Каложа

арганічым працягам гарадскога асяроддзя.

У рэнесансным горадабудаўніцтве кожнае збудаванне існавала як архітэктурны індывід у сістэме замкнёных (лакальных) прастор. Такі фактар архітэктурна-мастацкай выразнасці, як перспектыва, амаль не выкарыстоўваўся. Барочны горад падразумявае бачанне як асобных аб'ектаў, так і ўсёй прасторы горада праз перспектыву вуліц, скіраваных да храмаў, фантанаў і г. д. Перабудова Рыма Дамінікам Фантанам — тыповы прыклад гэтаму.

Галоўны храм Заходняй Еўропы — сабор Св. Пятра ў Рыме (Мікеланджэла Брамантэ), рэнесансны, цэнтрычны па кампазіцыі, у XVII ст. перажывае рэканструкцыю, якая павінна была таксама змяніць яго статычнасць на дынамізм, ператвараючы яго ў маляўнічы ансамбль.

Дзеля дасягнення мэты архітэктар Карла Мадэрна дабудоўвае працяглы неф з манументальным парталам шырынёю каля 100 і вышынёю каля 40 метраў. Магутныя 29-метровыя калоны падтрымлівалі масіўны атык. Рызаліты на флангах павінны былі завяршацца вежамі (левая была пабудавана, а потым разбурана). Цяпер велічны купал Мікеланджэла быў бачны толькі метраў за 700. Праз некаторы час Ларэнца Берніні стварае перад саборам плошчу са знакамітай каланадай. Ідэя руху, перспектыўнае ўспрыняцце прасторы сталі пануючымі.

Рух і перспектыва ўвасабляліся нават у невялікіх аб'ёмах. Прыкладамі з'яўляюцца лесвіца Скала Рэджыа ў саборы Св. Пятра (Л. Берніні), калідор Палаца Спада (Франчэска Бараміні), у якіх створана адваротная перспектыва.

Рух, святочнасць, карнавальнасць, тэатралізаванасць пераўтваралі архітэктурныя масы ў шторы і кулісы, занавес: царква Сан-Андрэа аль Квірынале (Л. Берніні), заходні фасад Луўра (К. Перро). Лагічна, што ў XVII ст. развіваліся опера і музычны тэатр. Мяняецца архітэктура тэатра. Гэта ўжо не цэнтрычная арэна антычнай традыцыі, а прастора для руху, для гучання музыкі, для сцэнічнага дзеяння (тэатр у Бардо Віктора Луі), восевай кампазіцыі.

Барочныя будаўнічыя пераўтварэнні ў Еўропе ажыццяўляліся толькі ў буйных сталічных гарадах (Рым, Венецыя) або гарадах-рэзідэнцыях (Версаль, Патсдам, Шонбрун). Барочныя гарады Беларусі — гэта гарады з барочнымі манументальнымі ансамблямі: сакральнымі і палацавымі. Ордэнскія (рымска-каталіцкія і грэка-каталіцкія) мужскія і жаночыя кляштары месціліся пераважна ў цэнральнай частцы новага горада (Мінск, Полацк, Віцебск). Строгія сцены манаскіх карпусоў утваралі замкнёныя структуры, якія кантрастна суадносіліся з пластычнымі вежамі, шчыпцамі касцёлаў. Крыжовыя, цэнтрычныя, купальныя кампазіцыі дапаўняліся купальна-вежавымі (Гродна, Магілёў).

Як і ў краінах Заходняй Еўропы, барока стымуляваў росквіт на Беларусі палацава-паркавага дойлідства. Да комплексаў дзяржаўнага (каралеўскага) маштабу можна аднесці палацава-паркавы комплекс Сапегаў у Ружанах (канец XVIII ст.,



Мал. 25. Гродна. Царква

Я. С. Бекер), сядзібы Станіслававa (Гродна, канец XVIII ст.), Аўгустава (Гродзенскі раён, другая палова XVIII ст.) і інш. Ім не саступалі і магнацкія версалі (Свяцк, Дзятлава, Шчорсы). Рэгулярныя і відарысныя кампазіцыі з дрэва, сажалкі і палацы ствараліся вопытнымі еўрапейскімі майстрамі-садоўнікамі. Сядзібна-паркавыя комплексы XVIII ст. на Беларусі вылучаліся сумаштабнасцю свайму асяроддзю, арганічнасцю і еднасцю з натуральнай ланшафтна-дэндралагічнай сітуацыяй. Архітэктура палацаў вытанчаная, элегантная. Формы і лініі маляўнічыя. Тут няма нястрыманага дэкаратывізму Сан-Сусі. Цвінгера, Бельведэра, Німфэнбурга, як і самападаўляючай грандыёзнасці Версаля і Шэнбруна. Правінцыйны (рэгіянальны) маштаб, але з густам і мастацкай выразнасцю.

У апошнія гады абвастрылася спрэчка пра месца мастацтва ракако ў беларускай архітэктуры. З аднаго боку, ёсць пераканаўчыя сцвярджэнні пра ракако як стыль у беларускай архітэктуры (А. Кулагін), з другога — як з'ява на фоне барока (Б. Лазука). Ва ўсходнееўрапейскай навуковай літаратуры таксама шырока разглядаецца ракако як стыль у архітэктуры (Н. Бруноў, Ю. Голігэр, С. Лорэнц, Е. Кавальчык і інш.).

Ракако ўзнікла і праявілася ў архітэктуры Францыі ў другой трэці XVIII ст. Ва ўмовах французскага класіцызму, на яго фоне некалькі фламандскіх дойлідаў (Мейсанье, Піно, Ажэро, Бафан, Эрэ дэ Карні) спрабуюць ствараць новыя кампазіцыі, больш выразныя ў параўнанні з класічнымі збудаваннямі па законах супарападкавання сіметрыі, акадэмізму Буле і Бландэля. У якасці такіх кампазіцый Бафан бачыў наўмысныя геаметрычныя схемы (палац Мальгранж з планам у выглядзе кальца, перакрыжаванага калідорамі), а ў аб'ёмна-прасторавым рашэнні Эрэ дэ Карні бачыў экспрэ-

сіўнае, дынамічнае размеркаванне архітэктурных мас (палац Шатэно, у выглядзе ярусаў цыліндрычных аб'ёмаў). Пластыка і дэкор тут не адыгрывалі ніякай ролі.

Ракайльныя эксперыменты не знайшлі распаўсюджвання, і ракако як мастацка-стылёвая з'ява атрымала развіццё ў абсталяванні інтэр'ераў, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, тэатры, музыцы. Пра ракако можна гаварыць як пра стыль у мастацкай культуры Еўропы, але не ў архітэктуры. Пластычнасць і дэкаратызм, як адзначалася, не вызначальныя прыёмы для ракако ў архітэкруры. Дэкаратыўная пластыка ў архітэктурных ансамблях Фішэра фон Эрлаха, і Кнобельдорфа, і Пёпельмана, і іншых павінна трактавацца як ракайльны дэкор у барочнай архітэктуры. Кампазіцыйны закон — прыкмета стылю ў архітэктуры, але ён не быў выпрацаваны.

Ракако як з'ява культуры адлюстроўвала эмацыянальнасць душы, значэнне індывідуальных пачуццяў, асабістага светаўспрымання. Ракако суседнічала з рамантызмам, з ідэалізацыяй інтымнага і рамантычнага. Ракако можна разглядаць як эмацыянальную выразную культуру барока не толькі як мастацкай з'явы, але і як этыкі, эстэтыкі. Гэта лагічнае завяршэнне ўласцівай барока цырыманіяльнасці, прыроднай рухомасці і дынамікі, разам з тым, асветы, свецкасці, галантнасці, сацыяльнай і побытавай культуры.

Ракако ў дачыненні да барока можна разглядаць і як дачыненне готыкі да палымнеючай готыкі, маньерызму да рэнесансу, ампіру да класіцызму, мадэрну да эклектыкі, постмадэрну да індустрыяльнай архітэктуры. Выразнае мастацтва архітэктуры мастацка-стылёвай эпохі завяршаецца яркім эмацыянальным гімнам. Пры гэтым і ў маньерызме, і ў ракако, і ў ампіры, і ў мадэрне эмацыянальна-выразны аспект не вынік творчай працы і творчага пошуку, а зададзеная мэта.

XVI—XVII стст. — гэта эпоха творчай дзейнасці на Беларусі плеяды еўрапейскіх дойлідаў: Бернардоні, Парока, Фантана, Педэці, Сака, Спампані (італьянцы, XVI—XVII стст.); Нонхарта Ван Додэна, Волана, Голанда, Лаэна (фламандцы, XVI—XVII стст.); Пепельмана, Бекеа, Мезера, Кнобеля (немцы, XVIII ст.); Габрыэля, Пусье (французы, XVIII ст.); Дзідзерштэйна, Пенса (бельгійцы, XVIII ст.).


Спасылкі на італьянскую ці нямецкую школы дойлідства не характарызуюць сапраўдны змест архітэктуры заходніх майстраў. Ніводнае іх збудаванне на тэрыторыі Беларусі не дысаніруе з навакольлем, гістарычным, прыродным і будаўнічым асяроддзем. Яны арганічна знітаваны з ландшафтам, шчыльнасцю і сілуэтам будынкаў, памерамі палёў, лугоў, лясоў. Гэта робіць архітэктуру еўрапейскіх дойлідаў на Беларусі сапраўды нацыянальнай, архітэктурай яе рэгіёнаў, гарадоў, мястэчак.


З далучэннем земляў Беларусі да Расійскай імперыі скончыўся амаль паўтысячагадовы своеасаблівы працэс развіцця дойлідства і культуры. Паміж Захадам і Усходам Еўропы абазначалася мяжа сутыкнення супрацьлеглых інтарэсаў: новых, народжаных Вялікай французскай рэ-

валюцыяй і натупаючым прамысловым пераваротам, і кансерватыўных, саслоўных, аплотам якіх стала Расійская імперыя.

І ў Еўропе, і ў Расіі ў канцы XVIII — пачатку XIX ст. у горада-будаўніцтве і архітэктуры панаваў класіцызм — увасабленне парадку, дзяржаўнай магутнасці, строгасці і розуму. Класіцызм эпохі Станіслава-Аўгуста Панятоўскага арыентаваўся на Францыю, на ўзоры Суфло, Габрыэля, К. Леду, Р. дэ Кота. Гэта былі ўзоры дзяржаўнай велічнасці, звароту да антычнасці, да вечных ідэй гармоніі, раўнавагі паміж розумам і прыродай (Русо, Вальтэр). Класіцызм ад Кацярыны да Аляксандра быў класіцызмам італьянцаў, арыентаваным на ўзоры Б'янкі і Рыкіні, Сакецці і П'ермарыні, Ванвітэлі і Валадз'е. Паўлаўскі і Казанскі сабор, Адміралтэйства і біржа, крылы будынка Генеральнага штабу перад Зімнім палацам мелі рысы падабенства з тэатрам ў Неапалі (Б'янкі), каралеўскім палацам у Мадрыдзе (Сакецці), будынкам Раяль-Крэсэт у Лондане (Нэш).

Імперскі размах адгукнуўся на перабудове гарадоў Беларусі: губернскіх, павятовых, пазаштатных. Генеральныя планы, прамянёва-квартальная планіроўка, новыя цэнтры, палацы генерал-губернатараў, прысутныя месцы, банкі, казармы парушаюць адвечнае, паслядоўнае развіц-





цё гарадоў. Пройдзе час, за кальцом з'явяцца будынкі прадпрыемстваў, а за імі — новае кальцо, у тым ліку і з далучаных да горада вёсак (Грушаўкі, Пятроўшчыны, Серабранкі і г. д.). Вядома, што па аналагічнай схеме развіваліся ў гады прамысловага пераваротумногія гарады Еўропы, вымусіўшы будаўнікоў прыйсці да ідэі горада-сада.

Эклектыка ў дойлідстве Беларусі як у люстэрку адлюстравала карані, з якіх абіраюцца новыя сродкі выразнасці. У заходніх рэгіёнах пераважалі заходнееўрапейскія матывы, узятыя з готыкі, рэнесансу, барока. Ва ўсходніх эклектычныя варыяцыі сімвалізаваў «рускі стыль». Было нямала і змешаных варыянтаў, асабліва ў архітэктуры даходных дамоў, асабнякоў, банкаў і кантор. Архітэктура праваслаўных цэркваў арыентавалася на розныя візантыйскія матывы, каталіцкіх — на гатычныя. Адметнасцю эклектыкі ў архітэктуры Беларусі якраз і з'яўляецца яе шматтэмнасць. Тут не склаўся дамінуючы напрамак, як у краінах Заходняй Еўропы (віктарыянская готыка, старагаландскі стыль, стыль вікінг, вітрэску) ці Расіі (рускі стыль). У дзяржаўных будынках і ансамблях (вакзалы, тэатры, суды, палацы губернатараў, прамысловыя будынкі) пераважалі элементы рускага стылю: дробная, стракатая пластыка з чырвонай цэглы, кантрастныя белыя нішы. У прыватных асабняках, палацах тэматычная разнастайнасць не мела межаў. Сустракаліся



Мал. 26. Дамы рамеснікаў і рамесніцкі пасад г. Гродна

палацы і павільёны ў стылі готыкі, рамантызму, барока, ракако. Магутным гатычным акордам у архітэктуры Заходняй Беларусі прагучалі касцёлы першай трэці XX ст. (Зэльва, Міхацішкі, Гервяты, Сар'я і інш.).

Архітэктура мадэрна канца XIX — пачатку XX ст., таксама як і эклектыкі, знітоўвала рускія і заходнееўрапейскія матывы. Першыя ўвасобіліся ў бочкападобных формах, усечаных шатрах, кашомніках (Бабруйск, Магілёў, Клімавічы). Другія — у інтэрпрэтацыі гатычных веж, мансардных дахаў, малюнкаў фахверкавай канструкцыі (Гродна). Лініям і дэкору надавалася трактоўка, скіраваная на падабенства да прыроды і яе форм (што ўвогуле характэрна для архітэктуры мадэрна). У гарадах з'яўляюцца шматлікія і разнастайныя будынкі ў стылі мадэрна: банкі, даходныя дамы, гімназіі, асабнякі. Мадэрн з поспехам распаўсюджваўся ў архітэктуры дач, маёнткаў (Манькавічы, Лошыца, Лучасна, Чырвоны Бераг, Германовічы).


Тым не менш мадэрн не пакінуў у архітэктуры Беларусі такога следу, як у Рызе, Пецярбургу і Маскве. Гэта быў стыль буйнага капіталу, густаў банкіраў і фінансістаў, увасабленнем шыку і бляску буржуазных колаў, не заўсёды валодаючых густам. У адрозненне ад Заходняй Еўропы, у славянскіх краінах моцную ролю ў культуры адыгрывалі традыцыі. Тут носьбітам перадавой культуры выступала дваранства. Нездарма мадэрн дасягнуў вялікага росквіту ў Нідэрландах, Бельгіі, ЗША, дзе на вяршыні грамадскай лесвіцы былі банкіры. У Расіі, у культурна-асветніцкіх кругах мадэрн успрымалі неадназначна, называючы яго іншы раз і «мадзерай».

Канун Першай сусветнай вайны і рэвалюцыі для Беларусі прыкладна супаў з перыядам прамысловага пераваротy. Гэта азначала канец амаль тысячагадовага перыяду даіндустрыяльнага развіцця вытворчых сіл сазідальнай дзейнасці, у тым ліку і ў архітэктуры. Праз стагоддзі і эпохі, разнастайнасці стыляў прайшло дойлідства, законы якога і матэрыяльная сутнасць вызначаліся прыродай (дрэва, цэгла, камень, класічная статычная сістэма трываласці і размеркавання сіл). Гэта быў працяглы час, калі будаўніцтва стаяла на чале стваральнай дзейнасці грамадства (побач з сельскай гаспадаркай і рамесніцтвам).

Інфраструктура рассялення: сельскага, малых і буйных гарадоў, сістэма камунікацый дамашыннай эпохі — грандыёзная ў маштабах Еўропы сістэма, стала асновай развіцця краіны ў індустрыяльную эпоху.

Першая сусветная вайна, рэвалюцыя, грамадзянская вайна, раздзел Беларусі на Усходнюю і Заходнюю ўскладнілі паступальны працэс яе развіцця у першай палове XX ст., стварылі рэгіянальныя адрозненні ў горадабудаўніцтве і архітэктуры, якія не страцілі сваіх прыкмет да сённяшняга дня.

З канца першай чвэрці XX ст. у гісторыі горадабудаўніцтва і архітэктуры Беларусі пачынаецца новы этап. Новыя палітычныя і сацыяльна-эканамічныя ўмовы карэнным чынам змянілі як сацыяльную,




Мал. 27. Чарцёж горада Віцебска. 1664 г.

так і эстэтычную сутнасць архітэктуры. У выніку Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў гарады Беларусі моцна пацярпелі, што стымулявала іх абнаўленне.

З утварэннем Беларускай ССР паўстала пытанне стварэння ў яе сталіцы г. Мінску комплексу ўрадавых устаноў і будынкаў палітычных і грамадскіх структур рэспубліканскага значэння. Вызначаны асноўны дыяметр сталіцы — вось былой Захар'еўскай вуліцы. Уздоўж яе і пачынаюць фарміравацца некалькі новых горадабудаўнічых цэнтраў. Галоўны з іх — плошча Незалежнасці (былая Леніна) з Домам урада. Сілуэтная кампазіцыя прадстаўнічага будынка вызначыла новую, галоўную гарадскую дамінанту. Насупраць Аляксандраўскага сквера ўзводзіцца Дом афіцэраў, крыху далей, на былой Скобелеўскай вуліцы (цяпер Чырвонаармейская) — корпус Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Бліжэй да Свіслачы, на Траецкай гары, насупраць карпусоў былога Праабражэнскага кляштара, фарміруецца ансамбль плошчы Парыжскай Камуны, дзе ўзводзіцца велічны будынак Нацыянальнага тэатра оперы і балета. Апошнім па напрамку новай гарадской восі становіцца ансамбль Беларускай акадэміі навук. Усе пазначаныя комплексы, за выключэннем будынка Нацыянальнай бібліятэкі, выкананы па праектах архітэктара І. Лангбарда, таму яны аб'яднаны адзіным стылёвым малюнкам. У раёне паміж Домам урада і Домам афіцэраў у 1930-я гг. узведзены яшчэ некалькі ансамбляў-будынкаў, у тым ліку Палац піянераў, гасцініца. Насупраць Акадэміі навук пабудаваны Дом друку ў стылі канструктывізму.

Новыя цэнтры і напрамкі развіцця вызначаны і для іншых гарадоў. У Магілёве галоўнай воссю горада стала Першамайская вуліца, а новым гарадскім цэнтрам — прасторная плошча з будынкам Дома Саветаў, спраектаваным І. Лангбардам і стылёва блізкім да мінскага Дома урада. Першамайская вуліца, якая пачыналася ад чыгуначнага вакзала, заканчвалася пляцоўкай над высокім берагам Дняпра.

Пры распрацоўцы праектаў забудовы гарадоў у той перыяд вызна-



Мал. 28. Планы гарадоў Беларусі XVIII ст.: а) Быхаў, б) Слуцк

чалася і функцыянальнае заніраванне тэрыторыі з вылучэннем зон: адміністрацыйна-грамадскай (адміністрацыйныя будынкі, тэатры, бібліятэкі), гандлёвай (магазіны), вытворчай (прадпрыемствы, заводы, фабрыкі) і жылой. Першыя дзве размяшчаліся пераважна ў цэнтральнай частцы, вытворчыя зоны выносіліся за горад.

Масавае будаўніцтва ва ўмовах дзяржаўнай уласнасці магчыма было толькі на індустрыяльнай аснове, што патрабавала стандартызацыі будаўнічых матэрыялаў і канструкцый, выпрацоўкі тыпавых рашэнняў у праектаванні. Дзяржбуд на правах камітэта ці міністэрства працаваў над стварэннем індустрыяльнай будаўнічай базы і сістэмы ўстаноў праектавання. Тэхніка-эканамічныя разлікі, якія вынікалі з індустрыяльных і эканамічных магчымасцей дзяржавы, вялі да выпрацоўкі будаўнічых норм і правіл. У 1930-я гг. тыпавое праектаванне пачало складвацца ў сферы жылой забудовы гарадоў, а таксама ў будаўніцтве дашкольных, школьных і іншых навучальных устаноў.

Узнікае шэраг новых тыпаў гарадскіх пабудоў: рабочыя клубы, клубы рабочай моладзі, кінатэатры, дамы палітычнай асветы, рабочыя вучылішчы (рабфакі), паліклінікі і інш. З'яўленне новых транспартных сродкаў і павелічэнне аўтамабільнага руху патрабавалі рэканструкцыі вуліц — пашырэння і брукавання іх, уладкавання тратуараў і прыпынкаў. Добраўпарадкоўваліся ў межах гарадоў набярэжныя рэчак і вадаёмаў.


Новае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне зрабіла шэраг былых заштатных гарадоў рэгіянальнымі цэнтрамі, што спрыяла іх росту і развіццю. У рэспубліканскім цэнтры і абласных гарадах ствараюцца прадпрыемствы агульнадзяржаўнага значэння, што рэзка павялічыла іх населенасць і адпаведна развіццё гарадскіх жыллёва-сацыяльных сектараў. Там, дзе з'яўляліся буйныя прамысловыя прадпрыемствы, больш хуткімі тэмпамі раслі і гарады: Бабруйск, Барысаў, Гомель,

Полацк, Баранавічы. Растуць і добраўпарадкоўваюцца цэнтры селькагаспадарчых рэгіёнаў: Слуцк, Нясвіж, Маладзечна.

Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў развіцці гарадоў Беларусі існавала дыяхроннасць, абумоўленая тым, што ўсходняя частка рэспублікі і заходняя да 1939 г. уваходзілі ў розныя дзяржавы. За два перадваенныя гады ў гарадах Заходняй Беларусі не адбылося значных горадабудаўнічых змен. Гарады ж Усходняй Беларусі за два перадваенныя дзесяцігоддзі набылі моцны адбітак новага ладу і жыцця.

Пры распрацоўцы Генеральнага плана Мінска ў 1946 г. былі вызначаны два напрамкі яго развіцця: уздоўж магістраляў Брэст — Масква і Мінск — Магілёў. Абазначылася двухпрамянёвая схема праспектаў. Вакол першага прадугледжвалася фарміраванне грамадска-адміністрацыйнай і культурнай інфраструктуры горада, вакол другога — прамыслова-вытворчай. У хуткім часе вызначыўся і папярочны дыяметр уздоўж Даўгабродскай вуліцы (цяпер пр. Машэрава — Казлова). Ён злучыў абодва прамяні, і цэнтральная частка горада склалася ў выглядзе велізарнага трохвугольніка.

Адпраўнымі пунктамі ўзнаўлення горада сталі даваенныя ансамблі: Дом урада, Дом афіцэраў, будынак ЦК КПБ, Оперны тэатр, Акадэмія навук. Першая чарга забудовы галоўнага праспекта пачыналася ад Дома ўрада і заканчвалася плошчай Перамогі. Будынкі педагагічнага інстытута, Белдзяржуніверсітэта, Галоўпаштамта, Міністэрства ўнутраных спраў, Нацыянальнага банка,



Мал. 29. Нясвіж. З малюнка Т. Макоўскага. XVII ст.



Мал. 30. Любча. З малюнка XVII ст.

універмага, Палаца прафсаюзаў, цырка і іншыя былі вырашаны ў стылі класіцызму. Галоўны праспект горада набыў урачысты выгляд. Берагі ракі Свіслач, набярэжныя ператвораны ў паркавую зону. На левым яе беразе некалькі ансамбляў: штаб БВА, радыё- і тэлецэнтр, порцік увахода ў дзіцячы парк імя М. Горкага, вуліца Фрунзе — арыентуюцца на кульмінацыйны цэнтр — ансамбль плошчы Перамогі (архітэктары М. Андросаў, Н. Трахтэнберг, М. Баршч, Г. Заборскі і інш.).

У сярэдзіне 1950-х гг. працягвалася фарміраванне ансамбля пло-



Мал. 31. Пінск. Фота. Пачатак XX ст.

шчы Якуба Коласа з будынкамі Інстытута фізкультуры, філармоніі, паліграфкамбіната імя Я. Коласа і завода імя С. Арджанікідзе. Вежавае завяршэнне апошніх двух будынкаў акцэнтуе пачатак вуліцы В. Харужай.

Прыкладна ў гэты ж час адбудоўваецца комплекс політэхнічнага інстытута, галоўны корпус якога выкананы ў высакародных рысах класіцызму. Да канца 1950-х гг. комплекс забудовы праспекта завяршаўся кварталамі паміж Акадэміяй навук, Домам друку і плошчай імя Калініна, насупраць якой — прасторная паркавая тэрыторыя з уваходам у Батанічны сад; далей — парк Чалюскінцаў. Ансамблевая забудова праспекта пераўтварала Мінск у адзін з прыгажэйшых гарадоў Еўропы.

Вакол Прывакзальнай плошчы пачала фарміравацца радыяльная вулічная структура. Гэты ансамбль забудовы вызначаўся, з аднаго боку, сціплым будынкам чыгуначнага вакзала, пабудаваным на месцы вакзала Лібава-Роменскай чыгункі, з другога — двума высокімі вежамі, што фланкіруюць вуліцу Кірава і атрымалі сімвалічную назву «вароты горада». Адсюль ішлі напрамкі ў бок праспекта, у бок Завадскога раёна, у паўночную частку горада і ў раён на паўднёвы захад ад чыгункі. Да 1960-х гг. дакладна абазначылася радыяльна-кальцавая горадабудаўнічая інфраструктура Мінска. У выніку былі пракладзены кальца-

выя вуліцы, каб злучыць іх галоўнымі магістралямі.

Значная ўвага ўдзялялася рэканструкцыі абласных цэнтраў.

У Магілёве вырашалася праблема развіцця горада на абодвух берагах Дняпра. На правым яго беразе, у прадмесці Лупалава, занятым пераважна драўлянай забудовай, пачалі інтэнсіўна расці і новыя жылыя раёны пасля ўзвядзення тут буйнога машынабудаўнічага завода. У старой частцы горада створаны новы дыяметр — праспект Міру.


Планіроўка Брэста прадугледжвала найбольш хуткае развіццё горада ва ўсходнім і паўночна-ўсходнім напрамках. Самым прыгожым яго новаўзвядзеннем у 1950-я гг. стаў ансамбль чыгуначнага вакзала — «заходнія вароты краіны».

Структура Гомеля развівалася паводле цэнтрычна-прамянёвай схемы. Галоўныя вуліцы-прамяні горада (праспект Леніна, вуліцы Савецкая і Перамогі) злучаюць тры плошчы. Прыкладна па сярэдзіне вуліцы Савецкай фарміруецца галоўная плошча з адміністрацыйнымі будынкамі.

У горадабудаўнічай структуры старажытнага Гродна вызначаліся дзве цэнтральныя вуліцы: Ажэшкі і Савецкая. Першая ад чыгуначнага вакзала ідзе ў заходнім напрамку, другая цягнецца з поўначы на поўдзень і заканчваецца на беразе Нёмана. Прыкладна па сярэдзіне



Мал. 32. Касцёл Св. Ганны. Вільна. XIII ст.



Мал. 33. Замак у Нясвіжы, XVII—XVIII стст. Фота 1929 г.

яе сфарміраваны новы гарадскі цэнтр: плошча з адміністрацыйнымі і грамадскімі будынкамі, гасцініцай і г. д.

Актыўнае горадабудаўніцтва тут вядзецца з часу стварэння буйных хімічных прадпрыемстваў. Гістарычны цэнтр дапаўняецца «кропкавымі» будынкамі ўстаноў улады, універмага, педагагічнага інстытута (цяпер універсітэт імя Я. Купалы), Дома афіцэраў і інш.

Адбудова моцна разбуранага Віцебска вялася адначасова з рэканструкцыяй яго цэнтра, дзе былі ўзведзены будынкі абласной адміністрацыі, гасцініца, універмаг.

На працягу 1950-х гг. было выпрацавана тыпавое планіровачнае рашэнне забудовы цэнтраў раённых гарадоў: плошча з будынкамі раённых улад, Дом культуры, вузел сувязі, універмаг, сталовая-рэстаран, гасцініца, а таксама тыпавыя будынкі школ, дзіцячых садоў, кінатэатраў, магазінаў і інш.

У 1960—1970-я гг. у сістэме Дзяржбуда Беларусі навукова-даследчымі і праектнымі інстытутамі працягвалася распрацоўка генеральных планаў забудовы гарадоў. Галоўнай іх задачай было вызначыць перспектывы развіцця ў залежнасці ад росту прамысловай і сацыяльнай інфраструктур. Вызначаліся індустрыяльныя рэгіёны ў сістэме ландшафтна-прыродных арэалаў рэспублікі: Салігорскі, Мазырскі, Мікашэвіцкі, Новалукомльскі, Полацкі, Жлобінскі.


Комплекс горада падзяляўся на грамадска-сацыяльныя зоны ў залежнасці ад паўсядзённых патрэб. Цэнтральная частка з адміністра-



Мал. 34. Мірскі замак



Мал. 35. Беліца. Фота. Пачатак XX ст.



Мал. 36. Дзятлава. Фота 1991 г.

цыйнымі, культурнымі і буйнымі гандлёвымі комплексамі трактавалася як зона эпізадычнага карыстання, наведванне якой асноўнай масай жыхароў, не занятых тут у працы, адбывалася па меры неабходнасці. Грамадска-культурныя і гандлёвыя цэнтры раёнаў горада адносіліся да зон перыядычнага карыстання, гэта значыць насельніцтва карыстаецца імі праз пэўны час (перыяд). Грамадска-сацыяльныя і гандлёва-абслуговыя комплексы мікрараёнаў адносіліся да зон пастаяннага карыстання. Арганізм горада набываў цэнтрычна-падпарадкаваны характар.

У 1980-я гг. у Мінску склаўся шэраг унікальных комплексаў: завершана рэканструкцыя стадыёна, узведзены комплексы гасцініц «Беларусь» і «Планета», будынкаў на Юбілейнай плошчы. Унікальныя ансамблі створаны і ў мікрараёнах Усход, Зялёны Луг, Вяснянка, Ангарская, Уручча. Завершана стварэнне водна-паркавага пояса. У зонах лесапаркавых рэкрэацый узведзены унікальныя будынкі воднаспартыўнага камбіната (Зялёны Луг), архітэктурнага факультэта політэхнічнай акадэміі (праспект Незалежнасці), выставачны павільён «Мінск Экспа» (праспект Пераможцаў). Сучасныя архітэктурныя формы сталі набываць новыя карпусы заводаў: трактарнага, робатаў, па выпрацоўцы скур у Гатаве і г. д. Распрацавана тэхналогія мазаічнага, рэльефнага, колеравага аздаблення панэляў і г. д.

У канцы 80-х гг. у грамадскай свядомасці склалася разуменне, што сучасныя урбаністычныя формы не заўсёды маюць тую духоўнасць, якая была ўласціва нацыянальнай архітэктурнай спадчыне. Пачалі ствараць дзяржаўныя праграмы па рэгенерацыі і аднаўленні помнікаў ар-



Мал. 37. Касцёл у Гервятах. Пачатак XX ст.



Мал. 38. Касцёл у Гервятах, апсіда



Мал. 39. Траецкае прадмесце ў Мінску. XIX — пачатак XX ст.

хітэктуры і горадабудаўніцтва, распрацоўвацца праекты рэгенерацыі гістарычнай забудовы Мінска, Гродна, Нясвіжа, Бабруйска і іншых гарадоў. Са стварэннем НВА «Белрэстаўрацыя» (цяпер Камітэт па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў пры Міністэрстве культуры) пачалі распрацоўвацца нормы і правілы па захаванні помнікаў: зоны ахо-



Мал. 40. Будынак пазямельнага банка ў Віцебску. Пачатак XX ст.

вы помнікаў і ландшафту, рэгуляванне забудовы. У Мінску пачалася рэстаўрацыя комплексу забудоў XIX ст. у Траецкім і Ракаўскім прадмесцях і помнікаў Верхняга горада. Адпаведныя работы пачаліся ў Гродна, Віцебску, Магілёве. Гарадам пачалі вяртаць іх гістарычнае аблічча. Рэстаўрацыйна-горадабудаўнічыя работы па ініцыятыве мясцовых улад праводзіліся і ў раённых гарадах. Асабліва гэта бачна ў аднаўленні Паставаў, Іўя, Ліды, Навагрудка. У працэсе рэстаўрацыі вызначаны новыя зоны ў інфраструктуры гарадоў, гіста-



Мал. 41. Забудова вуліцы Ангарскай у Мінску. 1980-я гг.



Мал. 42. Забудова мікрараёна Уручча ў Мінску. 1998 г.

рычныя тэрыторыі. Для некаторых гістарычных гарадоў вызначаны запаведныя тэрыторыі (Полацк, Заслаўе).

У гарадской забудове канца 1980-х — пачатку 1990-хгг. праявіліся тэндэнцыі сучаснай трактоўкі гістарычных стылёвых прыёмаў і форм. Гэта бачна ў грамадскіх збудаваннях з унутранымі дворыкамі, порцікамі, кампазіцыі з сілуэтнай забудовай і падкрэсленым вертыкальным рытмам (Палац Рэспублікі, адміністрацыйны будынак па вуліцы Мельнікайтэ, будынак «Беларусбанка», тыпавы праект райвыканкама па вул. Р. Люксембург у Мінску). У забудове мікрараёнаў набылі ўвасабленне некаторыя гістарычныя архітэктурныя рысы і матывы: мікрараён плошчы Бангалор і вуліца Солтыса ў Мінску, жылыя комплексы ў Магілёве, Бялынічах і інш. Гістарычныя матывы выкарыстоўваюцца не толькі як тэктанічны (завяршэнне лесвічна-ліфтавых блокаў,



Мал. 43. Дом на вуліцы К. Чорнага ў Мінску. 2003 г.

вентыляцыйных камер у шматпавярховых дамах), але і як дэкаратыўна-пластычны прыём — рэльефнае ўпрыгожванне плоскасцей фасадаў. Пло-



Мал. 44. Цэнтр Мінска

скія дахі невыразных пяціпавярховак замяняюцца схільнымі, з мансардамі, люкарнамі і г. д. У архітэктуры унікальных будынкаў 1990-х гг. праяўляюцца рысы постмадэрну. Яны бачныя ў знарок ускладненых аб'ёмна-пластычных рашэннях, асіметрыі кампазіцыі, прысутнасці вежаў (напрыклад, рэканструяваны будынак ЦУМа ў Мінску).

У апошнія гады назіраецца пранікненне ў будаўнічую індустрыю заходніх тэхналогій і матэрыялаў. Кампазітныя матэрыялы дазваляюць ствараць значныя аб'ёмы, нейтральныя па сваёй архітэктуры да навакольнага асяроддзя: Такая нейтральнасць зручная пры дабудове і рэканструкцыі існуючых будынкаў. Пазначаныя адметнасці бачныя ў офіснай архітэктуры, у некаторых тыпах грамадскіх і вытворчых збудаванняў (шматпавярховыя гаражы, прадпрыемствы, банкі).

У 1950-я гг. у прэстыжных раёнах Мінска і некаторых іншых гарадоў Беларусі ствараліся невялікія ўтульныя кварталы, забудаваныя катэджамі, прызначанымі для інтэлектуальнай эліты (квартал вуліцы Фрунзе, Захарава ў Мінску). Сёння катэджнае будаўніцтва стала больш актуальным. Як і ў заходніх краінах, катэджы ўзводзяцца пераважна ў прыгарадных зонах. Катэджныя зоны вельмі стракатыя і эклектычныя. Распрацоўваюцца варыянты стварэння катэджнай забудовы ў мікрараёнах з прыватнымі магазінамі, майстэрнямі, кафэ (праектная прапанова забудовы мікрараёна Лошыца ў Мінску).

Значную ролю ў камунікацыйнай інфраструктуры сталіцы адыгрывае метро, якое працуе з 1984 г. На сёння дзейнічаюць дзве лініі, якія дыяметральна перасякаюць горад. Перспектыўным планам прадугледжана стварэнне падземнай транспартнай інфраструктуры на ўсіх магістральных напрамках, а таксама і кальцавой лініі. Архітэктура станцый афармлена сродкамі манументальнага мастацтва. У перспектыве развіцця сталіцы запланавана стварэнне ліній хуткага трамвая.

1990-я гг. пазначаны паваротам у бок гуманізацыі гарадскога ася-



роддзя, стварэння сумаштабнай вулічнай прасторы, арганізацыі пешаходных зон, бульвараў, сквераў і г. д. Асабліва гэта характэрна для гарадоў заходніх рэгіёнаў, багатых помнікамі архітэктуры. Распрацоўваюцца ідэі захавання ў гарадах традыцыйна-гістарычнай драўлянай забудовы, што дасць магчымасць ствараць раёны ўтульнага, прасякнутага духоўнасцю асяроддзя, якім спрадвеку вызначаліся гарады Беларусі.

У 1980—1990-я гг. склаўся новы кірунак стварэння эстэтычнага аблічча прамысловых прадпрыемстваў, які можна характарызаваць як дызайнерска-архітэктурны. Прапорцыі, формы і аб'ёмы збудаванняў арганічна спалучаюцца з тэхналагічнымі канструкцыямі: рэзервуарамі, вентыляцыйнымі камерамі, тэхнічнымі паверхамі, сістэмамі трубаправодаў. Пры гэтым назіраецца імкненне знайсці індывідуальны вобраз пэўнага прадпрыемства ў залежнасці ад яго тэхналагічнага прызначэння. Перспектыўнасць прамысловай архітэктуры надаюць сучасныя высакаякасныя матэрыялы, аблегчаныя прасторавыя канструкцыі, модульныя блокі, якія маюць вялікую варыянтнасць кампаноўкі. Новыя вытворчыя комплексы праектуюцца выключна з улікам не толькі эстэтычных, але і экалагічных праблем асяроддзя.

XX стагоддзе для беларускіх гарадоў стала эпохай помнікаў і манументаў. Менавіта праз іх выяўлялася адлюстраванне светапогляду грамадства і пануючых ідэй. Яны становяцца кампазіцыйнымі цэнтрамі многіх гарадскіх ансамбляў.

У перадваенны перыяд былі створаны ансамблі з высокімі архітэктурна-горадабудаўнічымі вартасцямі ў Мінску і абласных гарадах. У 1950—1970-я гг. праводзілася праграма рэканструкцыі цэнтральных плошчаў малых і сярэдніх гарадоў. У выніку склаліся даволі ўдалыя ансамблі з манументальнымі аб'ектамі ў Салігорску, Століне, Маларыце, Баранавічах, Бабруйску, Маладзечна, Барысаве, Полацку і іншых гарадах.





Мал. 45. Мінск: новы будынак Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, чыгуначны вакзал, Прывакзальная плошча

Найбольшае месца сярод аб'ектаў манументальнай архітэктуры займаюць помнікі, якія сімвалізуюць перамогу, памяць пра герояў, ахвяр гераічнай барацьбы. Галоўным манументам сталіцы рэспублікі, які стаў агульнавядомым сімвалам Мінска, з'яўляецца помнік барацьбітам за вызваленне Беларусі на плошчы Перамогі (архітэктары Г. Заборскі, В. Кароль).

Удала абрана месца для помніка — левабярэжжа Свіслачы. Гэта дазваляе ажыццяўляць адкрыты перспектыўны агляд ансамбля з узвышаных напрамкаў на далёкім падыходзе да плошчы, павялічыць час візуальнага бачання помніка, паступова назіраць змяненне ракурсаў і пер-

спектывы. Пасля завяршэння работ па стварэнні станцыі метро «Плошча Перамогі» ў 1984 г. пад манументам усталявалі кругавы праход і мемарыяльную залу. Канфігурацыя плошчы зменена з круглай на авальную, што значна павялічыла тэрыторыю мемарыяла.

У 1971 г. адкрыты мемарыяльны ансамбль «Брэсцкая крэпасць-герой», выкананы паводле праекта аўтарскага калектыву пад кіраўніцтвам скульптара А. Кібальнікава. Комплекс арганічна спалучае руінныя фрагменты цытадэлі Брэсцкай крэпасці з аб'ектамі манументальнага мастацтва.

У пачатку 1970-х гг. на ўсход ад Мінска, па Маскоўскай шашы, створаны мемарыяльны комплекс «Курган Славы». Мемарыяльныя комплексы адкрываюцца таксама ў Віцебску, Магілёве, Гомелі і іншых гарадах. Высокімі эмацыянальна-мастацкімі вартасцямі вызначаецца манумент «Барацьбітам за савецкую ўладу» ў Магілёве. Комплекс размешчаны ў важным горадабудаўнічым вузле — у месцы сыходжання вуліц Першамайскай і Піянерскай, на высокім правым беразе Дняпра, з якога адкрываюцца прасторныя краявіды. Галоўным акцэнтам з'яўляецца бронзавая постаць маці-ахоўніцы на высокім п'едэстале (скульптар М. Гумілёўскі).

У 1985 г. у Мінску, на праспекце Машэрава, у гонар 40-годдзя з Дня Перамогі быў закладзены парк і размешчаны манумент «Мінск — горад-герой». Да яго вядзе працяглая ступеньчатая эстакада. Вертыкальная стэла — эмацыянальная дамінанта ансамбля. Побач — бронзавая фігура багіні перамогі Нікі.

У апошняе дзесяцігоддзе адраджаецца традыцыя ўстанаўлення ў гонар пэўных падзей капліц, цэркваў, памятных крыжоў. Найбольш яркай праявай такога імкнення з'яўляецца ўсталяванне памятнай капліцы ў гонар воінаў-афганцаў у Траецкім прадмесці Мінска. Манумент выкананы як стылізаваная капліца, сцены якой нібы нясуць бронзавыя фігуры маці.

У фарміраванні плошчаў і зялёных рэкрэацый гарадоў Беларусі значную ролю адыгрываюць мемарыяльныя комплексы, прысвечаныя дзеячам нацыянальнай культуры. У сярэдзіне 1970-х гг. у Мінску ўзведзены мемарыяльны комплекс на плошчы Якуба Коласа. Галоўным акцэнтам ансамбля з'яўляецца кампазіцыя на тэму «Якуб Колас і героі яго твораў» (скульптар З. Азгур). Маштаб скульптур і іх арыентацыя вызначаюць усю прастору плошчы.

Удала арганізуе прастору ўвахода ў парк Янкі Купалы скульптурны помнік песняру. Партэр перад помнікам пераходзіць у шырокую рэкрэацыю з фантанам і скульптурнай групай, якая раскрываецца на набярэжную Свіслачы і панараму левабярэжнай забудовы горада. Перспектыву плошчы перад Оперным тэатрам сталіцы з боку вуліцы Я. Купалы трапна завяршае помнік М. Багдановічу, фонам якому служыць велічны сілуэт тэатра.

У апошнія часы ўсё больш сустракаецца манументальных форм, якія арганізуюць лакальныя куткі гарадскіх вуліц: помнік Язэпу Драздовічу ў Траецкім прадмесці, помнік

М. Багдановічу каля філіяла аднайменнага музея па вуліцы Рабкораўскай, скульптурныя кампазіцыі на традыцыйныя сюжэты па праспекце Машэрава, вуліцы Харужай (насупраць бібліятэкі імя Я. Купалы) і іншых месцах.

Як адзначалася, у гістарычнай інфраструктуры паселішчаў Беларусі істотнае месца належала мястэчкам. Да пачатку XX ст. у рэспубліцы налічвалася каля тысячы мястэчкаў. Як правіла, яны сталі ці адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі цэнтрамі (раёнаў, сельскіх саветаў), ці цэнтрамі буйных гаспадарак. У адпаведнасці з гэтым адна частка з іх набыла ў хуткім часе статус горада (Паставы, Клецк, Валожын, Шклоў, Крычаў), другая — пасёлка гарадскога тыпу (Іўе, Дзятлава, Клічаў, Краснаполле, Ракаў, Івянец і г. д.). Частка мястэчак перайшла ў кантынгент вёсак і сёл, стаўшы цэнтрамі сельскіх саветаў, калгасаў і саўгасаў.

Адбыліся і архітэктурна-планіровачныя змены ў іх структуры. У тых, што сталі раённымі цэнтрамі, былі рэканструяваны (заходнія рэгіёны) ці зноў створаны (усходнія рэгіёны) плошчы, дзе віднае месца набылі адміністрацыйныя будынкі, дамы культуры, рэстаран, гасцініца, універсальныя магазіны. У заходнебеларускіх мястэчках пад новыя патрэбы часам прыстасоўваліся старыя збудаванні: гандлёвыя рады ў Іўі, Навагрудку, Пружанах — пад магазіны; дамы-крамы ў Нясвіжы, Ваўкавыску, Іўі, Валожыне, Ракаве — пад майстэрні, пункты харчавання, невялікія гандлёвыя кропкі. Развіццё былых мястэчак ішло па індывідуальна распрацаваных праектах. Прадугледжвалася добраўпарадкаванне плошчаў, разбіўка кветнікаў і сквераў, узвядзенне манументальных комплексаў. Жылая забудова вялася секцыйнымі 2-, 5-павярховымі дамамі. З 1970-х гг. у мястэчках-райцэнтрах пачынаюць узводзіць і 9-павярховыя жылыя дамы.

Галоўная прычына сучасных структурна-планіровачных і архітэктурных змен у мястэчках Беларусі заключаецца ў страце імі традыцыйнага сацыяльна-гаспадарчага статуса. Сённяшняе іх насельніцтва занята на мясцовых прадпрыемствах альбо ў сельскай гаспадарцы. У 1970-я гг. некаторае развіццё атрымала мясцовая сфера абслугоўвання (атэлье, майстэрні і г. д.), якая таксама забяспечвала пэўную занятасць насельніцтва былых мястэчак. Адзначаныя акалічнасці спрыялі хуткай палярызацыі мястэчак: адны развіваліся ў напрамку атрымання статусу горада (Старыя Дарогі, Глуск, Хойнікі, Ветка), другія канчаткова станавіліся вёскамі (Каралішчавічы, Шацк, Даўгінава, Станькава).

У сучасных умовах развіцця рыначнай эканомікі магчыма адраджэнне некаторых функцый былых мястэчак: адкрыццё ў раённых цэнтрах і пасёлках гарадскога тыпу прыватных крам, майстэрняў, пунктаў харчавання і г. д. Сёння архітэктары распрацоўваюць варыянты катэджных дамоў, што сумяшчаюць функцыі жылля і гандлёвай кропкі.

Істотныя змяненні сельскай інфраструктуры ў канцы 1920-х і ў 1930-я гг. былі выкліканы стварэннем камун і масавай калектывіза-

цыяй. Гэта прывяло да ліквідацыі хутароў і дробных вёсак, арганізацыі планавання сельскай забудовы. У перыяд калектывізацыі сядзібная забудова ў вёсках Беларусі развівалася на традыцыйнай аснове. Праекты сельскіх сядзіб калгаснікаў, распрацаваныя архітэктарамі, мелі нязначнае распаўсюджанне.

У пачатку 1950-х гг. пачалася распрацоўка дзяржаўных праграм, скіраваных на карэнную перабудову сельскага рассялення на аснове далейшага развіцця калгасна-саўгаснай сістэмы. Асноўным тыпам паселішча лічылася сяло, у якім размяшчаліся цэнтральныя сядзібы калгаса ці саўгаса. Будаўніцтва пазначаных паселішчаў вялося двума шляхамі: на аснове рэканструкцыі вулічнай сеткі існуючай вёскі; на новым месцы побач са старой забудовай, так што паселішча ў хуткім часе складалася з новай і старой частак. Жылы масіў забудоўваўся блочнымі 2-, 4-павярховымі дамамі з невялікім прысядзібным участкам і мінімумам гаспадарчых пабудоў, што дазваляла значна павялічыць шчыльнасць вёскі.

У 1960-я гг. была праведзена праграма ўзбуйнення калгасаў. Забудова цэнтраў калгасаў часам вялася па індывідуальных праектах, распрацаваных у эксперыментальных майстэрнях праектных інстытутаў Дзяржбуда рэспублікі (Мышкавічы Кіраўскага, Новы Быт Мінскага, Чырвоная Змена Любанскага, Новае Палессе Салігорскага, Верцялішкі Гродзенскага раёнаў і інш.). Структура функцыянальных зон захоўваецца і дапаўняецца элементамі ландшафтнай архітэктуры: дэкаратыўнымі вадаёмамі, скверамі і садамі, паркамі. Цэнтральная частка найчасцей вырашалася ў выглядзе плошчы з манументальнымі аб'ектамі, у акружэнні будынкаў адміністрацыйнага і грамадска-культурнага прызначэння. Забудова зон вырашалася паводле прынцыпу рэкрэацый. Жылая забудова праектавалася шчыльным масівам па тыпу гарадскога пасёлка. Аснову жылой забудовы складалі дамы-катэджы — 2-, 4-кватэрныя на двух узроўнях. У 1970-я гг. робяцца спробы ўключэння ў жылы масіў 4-павярховых дамоў.

Да сярэдзіны 1970-х гг. узнікае новы планіровачны тып сяла (вёскі), найбольш выразнымі асаблівасцямі якога з'яўляюцца грамадска-культурны цэнтр з плошчай, будынкамі навучальных, дзіцячых і культурных устаноў і жылы масіў квартальнай структуры. Бярэцца кірунак на стварэнне ў сельскай мясцовасці аграпрамысловых комплексаў.

У цэлым, да сярэдзіны 1980-х гг. у структуры сельскага рассялення рэспублікі абазначыліся два арэалы: усходні, з перавагай шматвулічных паселішчаў, у якім вылучаюцца лакальныя зоны кампактнага размяшчэння буйных вёсак, і заходні, са змешанай структурай адна- і шматвулічных паселішчаў і лакальнымі зонамі маладворных вёсак і хутароў (Нарачанска-Браслаўская, Ашмяна-Астравецкая, Валожынска-Навагрудская). Мяжа паміж пазначанымі арэаламі праходзіць прыкладна

па лініі Браслаў—Пінск. Эканамічныя праблемы 1980-х — пачатку 1990-х гг. замарудзілі рэалізацыю праграм будаўніцтва аграпрамысловых комплексаў. Да канца 1980-х гг. пасёлкаў тыпу Верцялішкі і Малеч налічвалася некалькі дзесяткаў. У апошнія гады разгорнута будаўніцтва пасёлкаў для жыхароў раёнаў, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

У новых сацыяльна-эканамічных умовах разгарнулася сельскае і асабліва прыгараднае будаўніцтва катэджнага тыпу. Катэджныя пасёлкі хутка растуць у прыгарадных зонах, забяспечаных камунікацыямі, як на новым месцы, так і ў асяроддзі гістарычнай забудовы вёсак, хаатычна пашыраюцца на тэрыторыях вода- і лесаахоўных зон, прыгарадных зялёных рэкрэацый (Заслаўскае вадасховішча, вярхоўе Пцічы і інш.). Адсутнасць планавання робіць такую забудову амаль бессістэмнай. Прыняты шэраг пастаноў, якія рэгулююць катэджнае і дачнае будаўніцтва з абавязковым папярэднім планіровачным рашэннем участка (Раўбічы, Фаніпаль, Міханавічы, Гарадзішча, Сенніца, Прылукі).

У канцы 1980-х — пачатку 1990-х гг. стала відавочным, што ў сённяшніх умовах традыцыйна-гістарычная забудова многіх сельскіх паселішчаў можа быць страчана. Многія вёскі і сёлы, іх гістарычная забудова ўяўляюць сабой помнікі ландшафту, гісторыі і культуры, народна-традыцыйнага дойлідства. Сярод іх вялікая колькасць населеных пунктаў, якія маюць мемарыяльнае значэнне, напрыклад Кушляны, Мікалаеўшчына, Мастаўляны і г. д. З улікам перспектывы адраджэння сядзібна-гаспадарчай асновы сельскага развіцця варта засяродзіць увагу на ролі традыцый, каранёў сядзібы і на гістарычнае асяроддзе паселішча.

Гістарычна лёс беларускіх вёсак і іх жыхароў засведчаны ў мемарыяльных помніках. Гэта манументы, прысвечаныя векапомным падзеям — Паўночнай вайне, Айчыннай вайне 1812 г., Першай сусветнай вайне, рэвалюцыі і грамадзянскай вайне. Аднак асноўную масу помнікаў і манументаў у вёсках (каля 5 тыс.) складаюць тыя, што ўслаўляюць гераічную барацьбу беларускіх вяскоўцаў у гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг. У канцы 1970-х—1980-я гады мемарыяльныя комплексы становяцца больш значнымі па маштабу, выразнасці і сіле эмацыянальнага ўздзеяння.

На месцы спаленай фашыстамі вёскі Хатынь у Лагойскім раёне ў канцы 1960-х гг. узведзены унікальны мемарыяльны комплекс (архітэктары Л. Левін, Ю. Градаў, В. Занковіч, скульптар С. Селіханаў, 1969) плошчаю каля 50 га. Сімвалічныя «могілкі» спаленых вёсак на галоўнай кампазіцыйнай восі мемарыяла і Вечны агонь робяць эмацыянальнае гучанне ансамбля надзвычай моцным.

Дойлідства Беларусі ў сістэме навук

Пачатак новага тысячагоддзя ў архітэктуры Беларусі азначыўся развіццём постмадэрну і архітэктурнага дызайну.

З'яўленне постмадэрну ў Беларусі супала з адраджэннем у нацыянальнай культуры традыцый, рухам за рэстаўрацыю і аднаўленне архітэктурнай спадчыны (канец 1980-х гг.). У краінах Еўропы аналагічныя працэсы прайшлі гадоў на трыццаць раней. Гэта была эпоха рэстаўрацыі, асабліва для такіх краін, як Польшча, Германія, Аўстрыя, Югаславія. Аднаўляліся не толькі помнікі і ансамблі, разбураныя апошняй сусветнай вайной, але і руіны ранняга сярэднявечча, археалагічныя рэшткі (Германія, Аўстрыя, Югаславія), часта насуперак рэкамендацыям і методыкам ЮНЭСКА. Працэнт адноўленых будынкаў робіцца прыкметным у еўрапейскіх гарадах, асабліва Польшчы і Германіі.

Гістарычныя формы і вобразы пераймаюць практыкуючыя архітэктары. Сучасная архітэктура стварае рэзананс з гістарычнай. У адрозненне ад сапраўднага мадэрну, у якім яшчэ захаваліся карані ад прыродных форм і ліній, постмадэрн нагадваў гістарычную рэканструкцыю (пераважна гатычную, што праз тысячу гадоў не страціла для Еўропы актуальнасць). Разам з тым з рацыянальнага напрамку ў архітэктуры інжынерыі (Хрустальны палац, 1851; Галерэя машын, 1878; Палац машын, 1889; Эйфелева вежа, 1889), з Чыкагскай школы з рацыянальнай галіны мадэрну сфарміравалася канцэпцыя архітэкуры школы «Баўхаўза» і канструктывізму.

У другой палове XX ст. з пазначаных крыніц у архітэктуры сфарміраваўся новы напрамак, які можна характэрызаваць як архітэктурны дызайн. Прынцыповым адрозненнем апошняга ад акадэмічнай архітэктуры з'яўляецца адсутнасць адлюстравання тэктанічнага каркасу (вертыкальных і гарызантальных чляненняў, адпавядаючых прасценкам і паверхам). Архітэктурная экспрэсія, адкрытая некалі А. Гаўдзі, увасобленая ў архітэктурным футурызме Сант-Эліа, у пластычных масах бетона Мендэльсона, праз стагоддзе набыла новыя якасці, абумоўленыя кампазітнымі, шматколернымі матэрыяламі, лініямі і формамі, вытворнымі ад іх матэрыяльных уласцівасцяў.

Сіла цяжару перастала быць законам архітэктонікі. З'яўляюцца новыя сцены і вокны, інтэр'еры, нагадваючыя шторы і гроты (Хундэртвасэр). Часам дызайнерскія абстрактныя кампазіцыі сумяшчаюцца з гістарычнымі формамі: гатычныя шатры, калоны без капітэляў, адарваныя ад перакрыццяў, парталы і портыкі, «накладзеныя» на суцэльныя паверхні са шкла. Часам элементы сучаснай архітэктуры набываюць «цацачны» маштаб (будынак адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Мінска па вул. Мельнікайтэ).

Айчынны архітэктурны постмадэрн часам супярэчлівы і эклектычны. Кампазіцыныя матэрыялы і дызайнерскія формы дысаніруюць з

традыцыйнымі аб'ёмамі, цэглай і тынкоўкай. Праблему ўяўляе імкненне да яркага і стракатага колеру. Пры значных масах і пласкасцях яркая стракатасць разбурае асяроддзе. Імкненне парушыць лагічную для архітэктуры вертыкаль (сцяна, прасценак) робіць увогуле кампазіцыю бессэнсоўнай.

Разам з тым існуе станоўчы творчы вопыт — творы сучаснай архітэктуры, наватарскай і выразнай, якія сталі новымі архетыпамі архітэктуры Беларусі. Гэта чыгуначны вакзал, Нацыянальная бібліятэка, крыты футбольны манеж у Мінску, лядовыя спартыўныя палацы ў абласных гарадах.

Істотную ролю ў развіцці сучаснай беларускай архітэктуры адыгрываюць працэсы аховы, рэстаўрацыі і аднаўлення помнікаў. У генеральных палацах буйных гарадоў вызначаны зоны рэгенерацыі гістарычнай забудовы. Прынята канцэпцыя аднаўлення гістарычнага цэнтра Мінска. Адноўлена гістарычнае аблічча многіх малых гарадоў: Шклова, Давыд-Гарадка, Нясвіжа, Навагрудка, Міра, Ваўкавыска, Слуцка, Смаргоні, Мастоў, Шчучына. Развіццё рэгіянальнага і вясковага турызму, адраджэнне культурнай і прыроднай спадчыны лакальных раёнаў робіць актуальнай ідэю адраджэння гістарычных вёсак, мемарыяльных сядзіб і хутароў.

У элементах добраўпарадкавання гарадоў і сельскіх паселішчаў пераважае імкненне да маляўнічасці, натуральнасці (альпійскія горкі, кветнікі, каляровыя кветкавыя партрэры, аб'ёмныя кампазіцыі з дрэў і кустоў'я). Аднаўляюцца бульвары і скверы, ствараюцца новыя. Элементы малых форм выконваюцца з даўгавечных матэрыялаў (граніт, чыгун, бронза). Зялёныя зоны адпачынку дапаўняюцца пленэрнымі скульптурнымі кампазіцыямі.

Сучасная архітэктура Беларусі развівае свае гістарычныя рысы і адпавядае навейшым дасягненням сусветнага дойлідства.

Нацыянальнае дойлідства — спецыфічны феномен культуры (творчы працэс стварэння архітэктуры), мастацтва стварэння і гарманізацыі асяроддзя бытнасці грамадства. Шматграннасць даследуемай з'явы тлумачыць і неабходнасць вывучэння ў сістэме некалькіх навук (гістарычных, мастацтвазнаўчых, архітэктуразнаўчых). У сістэме гістарычных навук дойлідства даследуецца ў галіне этнаграфіі як складаючая частка матэрыяльнай культуры. Такія даследаванні прысутнічаюць у этнаграфіі з канца XVIII ст. і да нашых часоў і зафіксаваны ў працах М. Анімеле (1854), І. Эрэміча (1868), А. Семянтоўскага (1872), М. Доўнар-Запольскага (1891, 1895), І. Забеліна (1883), А. Турцэвіча (1889), Я. Карскага (1893), М. Нікіфароўскага (1895), П. Шэйна (1902), Е. Раманава (1911, 1912), А. Харузіна (1907), А. Сержпутоўскага (1910), І. Сербава (1914, 1915, 1928), З. Глогера (1907, 1909), К. Машынскага (1929), Ч. Пяткевіча (1928), В. Равенскай (1938), А. Александровіча (1966, 1970), З. Дмахоўскага (1934, 1935, 1937) і інш.

З этнаграфічных даследаванняў савецкага і сучаснага перыядаў аналіз народнага дойлідства Беларусі змяшчаюць працы Н. Лебедзевай

(1927), Е. Бломквіст (1956), Л. Малчанавай (1956, 1959, 1968, 1981), У. Гуркова (1975), В. Цітова (1983, 1994), А. Лакоткі (1986, 1991). У этнаграфічных даследаваннях знайшлі развіццё шматлікія агульныя, рэгіянальныя і лакальныя рысы народнай архітэктуры, а таксама традыцыйна-гістарычнай драўлянай забудовы гарадоў XI — пачатку XX ст. (А. Лакотка, 1991).

У канцы XIX — XX ст. у галіне гістарычных навук пачынае фарміравацца асобны напрамак — археалогія архітэктуры. На Беларусі яе фарміраванне напачатку было звязана з праграмай вывучэння помнікаў «рускай» даўніны ў другой палове — канцы XIX і пачатку XX стагодзяў. Археалагічныя дадзеныя былі атрыманы па помніках Полацка і Віцебска (А. Семянтоўскі, 1878; А. Паўлінаў, 1895; Н. Зорын, 1910; І. Хозераў, 1928; К. Шэроцкі, 1915; М. Шчакаціхін, 1928; Н. Бруноў, 1918; А. Ляўданскі, 1930), Гродна (У. Гразноў, 1893; Ф. Пакроўскі, 1893; І. Ядкоўскі, 1915), Пінска (А. Мілавідаў, 1898).

У савецкі і наш час беларуская археалогія архітэктуры распрацавала гістарычную карціну фарміравання школ дойлідства перыяду X–XVI стст. Старажытнае дойлідства Гродна даследавалі М. Варонін (1949), П. Рапапорт (1982), Гродзеншчыны — Л. Краўцэвіч (1991), Навагрудка — М. Каргер (1977), М. Малеўская (1983), Полаччыны — В. Булкін (1981), Ваўкавыска — Я. Звяруга (1975), Турава — М. Каргер (1963, 1968). Найбольш грунтоўнымі археалагічнымі даследаваннямі ў пазначанай галіне з'яўляюцца працы па гарадах Полацкай зямлі Г. Штыхава (1966, 1967) і па Бярэсцю П. Лысенкі (1985). Грунтоўныя дадзеныя па помніках Мінска апублікаваны ў працах Э. Загарульскага (1982).

Археалогія архітэктуры раскрыла рысы дойлідства перыядаў усходнеславянскага этнічнага адзінства і фарміравання культур усходнеславянскіх народаў. Разам са спецыфічнымі рысамі раскрыты асаблівасці візантыйскіх традыцый (Полацк, Віцебск), а таксама раманскагатычных, засведчаных ў муроўцы помнікаў цэнтральных і заходніх рэгіёнаў Беларусі (Мінск, Навагрудак, Ваўкавыск, Гродна).

Архітэктуразнаўчыя даследаванні беларускага дойлідства бяруць пачатак з канца XIX — пачатку XX ст. Першапачаткова архітэктуразнаўцамі, як і гісторыкамі, помнікі архітэктуры разглядаліся як частка культурнага комплексу паўночна-заходняга рэгіёна Расіі. Іх каштоўнасць у зборы звестак і сведчаннях аб стане асобных помнікаў і іх ансамбляў, большасць з якіх у далейшым панесла значныя страты першапачатковага аблічча (А. Паўлінаў, 1894; У. Суслаў, 1895; Л. Паеўскі, 1892, 1894; П. Красавіцкі, 1911; Ф. Волкаў, 1910; М. Красоўскі, 1916; М. Брунаў, 1928). Пазначаныя даследаванні грунтуюцца на параўнальна-гістарычнай метадалогіі. Архітэктуразнаўчыя даследаванні сярэдзіны — канца XX ст. ставілі мэтай даць сістэматызацыю планіровачных, канструкцыйных, стылёвых рыс у гістарычным кантэксце, а таксама сфарміраваць тэорыю сучаснага горадабудаўніцтва і архітэктуры (Ю. Ягораў, 1954, 1957; А. Воі-

наў, 1975, 1987; Е. Квітніцкая, 1961, 1963; У. Чантурыя, 1963, 1977, 1985; Е. Заслаўскі, 1963, 1988; І. Іода, 1988, 1993; А. Сычова, 1988; І. Боўт, 1978; Ю. Патапаў, У. Сакалоўскі, 1975, 1979 і інш.).

Гісторыка-архітэктурныя даследаванні апошніх дзесяцігоддзяў раскрылі як агульную карціну гістарычнага развіцця айчыннай архітэктуры (У. Чантурыя), так і шматлікіх яе кампанентаў: сакральнага дойлідства (Т. Габрусь, 1979; А. Кулагін, 1989), палацава-сядзібнага (А. Кулагін, 1981), горадабудаўнічых ансамбляў (Ю. Чантурыя, 1977; А. Пятросава, 1989; Т. Чарняўская, 1973, 1980; І. Слюнькова, 1992; М. Латан, 1980, 1994). Праграмы карэннай рэканструкцыі вёскі другой паловы XXI ст. абумовілі актуальнасць даследавання помнікаў народнай архітэктуры (Ю. Якімовіч, 1978; С. Сергачоў, 1984, 1992; У. Трацэўскі, 1989; А. Лакотка, 1991). Асобныя даследаванні прысвечаны гісторыі архітэктуры дарог (А. Сардараў, 1978) і садова-паркаваму мастацтву (А. Анціпаў, 1975; А. Федарук, 1988).

Вялікае значэнне для сістэматызацыі звестак пра помнікі айчыннай архітэктуры маюць энцыклапедычныя працы (Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: У 8 т. Мн., 1984—1988; Архітэктура Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1993).

Змяненні ў грамадска-палітычнай сферы ў апошнім дзесяцігоддзі, праблемы станаўлення нацыянальнай дзяржавы, патрэба ў стварэнні выразнай, вобразнай архітэктуры, арганічна знітаванай з рэгіянальным і лакальным прыродна-культурным асяроддзем, робяць актуальным вывучэнне нацыянальных асаблівасцей беларускай архітэктуры (А. Лакотка, 1997, 1999).

У галіне айчыннага мастацтвазнаўства даследаваліся праблемы дэкаратыўна-стылёвай выразнасці ў айчыннай архітэктуры, яе стылеўтвараючай ролі (М. Шчакаціхін, 1928; История искусства народов СССР. Т. 1—9. М., 1971—1982; Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. Т. 1—4. Мн., 1984—1987; Гісторыя беларускага мастацтва. Т. 1—6. Мн., 1987—1995).

У канцы 1990-х гг. — пачатку XXI ст. з'яўляюцца працы, прысвечаныя не толькі архітэктурнай спадчыне Беларусі, але і аналізу стыляў, тыпаў пабудоў, архітэктуры як часціцы сістэмы аб'ектаў культуры.

Вынікам сістэматызацыі гісторыка-архіўных даследаванняў помнікаў архітэктуры, што не дайшлі да нашых дзён, стала калектыўная праца «Страчаная спадчына» (Т. В. Габрусь, А. М. Кулагін, Ю. У. Чантурыя і інш., 1998). Архітэктура Беларусі таксама даследуецца ў 2-ім томе шматтомнай комплекснай працы«Беларусы» (А. І. Лакотка, 1997). Упершыню архітэктура Беларусі аналізуецца як яркая грань стваральнай дзейнасці нацыі ў шматтомным выданні «Народы і культуры» Расійскай акадэміі навук (том «Беларусы», 1998). Нарэшце, атрыманыя за апошнія дзесяцігоддзі мінулага веку вынікі дазволілі акрэсліць нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры, ролю архітэкурнай спадчыны ў адраджэнні правінцый і лакальных раёнаў Беларусі, раскрыць недаследаваныя моманты манументальнага дойлідства, вызначыць новы

напрамак даследавання архітэктурна-ландшафтнай тапаграфіі (А. І. Лакотка, 2001, 2002, 2003, 2005).

З'яўляюцца даследаванні генезісу буйных стылёвых напрамкаў: эклектыкі, барока, класіцызму, ракако, готыкі (А. М. Кулагін, 2000; Т. В. Габрусь, 2001; В. Ф. Марозаў, 2001; А. М. Кулагін, 2004; А. М. Кушнярэвіч, 2005). Выконваюцца даследаванні па архітэктурнай тэорыі ў кантэксце развіцця заходнееўрапейскага дойлідства (Н. У. Кожар, 2001), архітэктуры дарог (А. С. Сардараў, 2001), па горадабудаўніцтву Беларусі XVI—XIX стст. (Ю. У. Чантурыя, 2005). Актуальнымі з'яўляюцца спецыяльныя даследаванні сакральна-манументальнага дойлідства (Г. А. Лаўрэцкі, 2000) і архітэктурна-прасторавай будовы ордэнскіх кляштараў (А. Н. Каласоўская, 2004).

Новым напрамкам даследавання з'яўляецца вывучэнне перспектыў развіцця турызму на аснове архітэктурна-горадабудаўнічай спадчыны (В. У. Дражын, 2004).

Лагічна чакаць большай увагі да праблемы сучаснай архітэктуры Беларусі.

У цэлым, даследаванні апошніх гадоў стварылі дыферэнцыраваную сістэму аналізу праблем айчыннай гісторыка-архітэктурнай навукі. Вылучыліся канкрэтныя, самастойныя напрамкі даследаванняў: горадабудаўніцтва, манументальная архітэктура, народна-традыцыйнае драўлянае дойлідства, палацава-паркавае дойлідства (А. Т. Федарук, 2000, 2001), праблема стылю, архітэктурная спадчына і турызм. У выніку стала рэальным стварэнне канцэпцыі нацыянальных рыс і рэгіянальнай разнастайнасці беларускай архітэктуры, раскрыццё яе гістарычнага феномену ў кантэксце еўрапейскай культуры.

Традыцыйнае кола крыніц для гістарычна-архітэктурных даследаванняў складаюць археалагічныя матэрыялы, звесткі з летапісаў і старажытных актаў, інвентароў, люстрацый, візіт, апісанняў, падарожных дзённікаў і сведчанняў, статыстычных збораў, справаздач, географа-тапаграфічных і картаграфічных вышукаў, праектныя матэрыялы з архіваў і бібліятэк Мінска, Гродна, Масквы, Санкт-Пецярбурга, Кіева, Львова, Вільнюса, Варшавы.

Даследаванне беларускага дойлідства патрабуе новых метадалагічных падыходаў. Неабходна абследаванне такіх фактараў, утвараючых асяроддзе існавання архітэктуры, як рэгіянальныя і лакальныя рысы прыроды і ландшафту, натуральная каларыстыка, кампаненты маштабу, фактары духоўнай культуры, традыцыйна-эстэтычны светапогляд.

Літаратура

1. *Акты* Виленской археографической комиссии (АВАК). Т. 1—36. Вильно, 1865—1912.

2. *Алексеев Л. В.* Полоцкая земля. М., 1966.

3. *Алфавитный* географический указатель древнего Великого княжества Литовского. Ч. 1. Вильно, 1920.

4. *Антипов В. Г.* Парки Белоруссии. Мн., 1975.

5. *Аникин В. И., Аникина Л. И., Габрусь Т. В. и др.* Архитекторы Советской Белоруссии. Мн., 1991.

6. *Аникин В. И.* Жилой район крупного города (опыт Белорусии). М., 1987.

7. *Аникин В. И., Заславский Е. Л., Иодо И. И., Потаев Г. А.* Градостроительство Белорусии. Мн., 1988.

8. *Антонович В. Б.* Очерки истории Великого княжества Литовского до половины XV столетия. Ч. 1. Киев, 1878.

9. *Археологический* сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной России (АСД СЭР). Вильно, 1867.

10. *Беларускае* народнае жыллё. Мн., 1973.

11. *Белинскис Ф. К.* Литовское народное зодчество. М., 1960.

12. *Белоруссия* и Литва. Исторические судьбы Северо-Западного края. СПб., 1890.

13. *Бломквист Е. Э.* Крестьянские постройки русских, украинцев и белорусов // Восточнославянский этнографический сборник. Новая серия. Т. 31. М., 1956.

14. *Бовт И. И., Воинов А. А., Потапов Ю. Ф., Соколовский В. Э.* Архитектура Советской Белоруссии. М., 1986.

15. *Брунов Н.* Белорусская архитектура XI—XII стст. Мн., 1928.

16. *Булкин В. А.* Работы в верхнем замке в Полоцке // Археол. открытия 1978 г. М., 1979.

17. *Булкин В. А.* Исследования Софийского собора в Полоцке // Археол. открытия 1980 г. М., 1981.

18. *Воинов А. А.* История архитектуры Белоруссии. Мн., 1975.

19. *Волков Ф. К.* Старинные деревянные церкви на Волыни // Материалы по этнографии России. СПб., 1910.

20. *Воронин Н. Н.* Древнее Гродно // Материалы и исследования по археологии СССР. М., 1954; Ён жа. Бельчицкие руины // Архитектурное наследство. М., 1956. № 6.

21. *Габрусь Т. В.* Становление стиля барокко в монументальной архитектуре Белоруссии XVII в.: Дис. ... канд. архитектуры. М., 1979.

22. *Габрусь Т. В.* Мураваныя харалы: Сакральная архітэктура беларускага барока. Мн., 2001.

23. *Гісторыя* беларускага мастацтва. Т. 1—6. Мн., 1987—1995.

24. *Гозина Г. И.* Жилище и хозяйственные постройки восточной Литвы // Балтийский этнографический сборник. М., 1956.

25. *Гозина Г. И.* Литовское народное зодчество. Вильнюс, 1968.

26. *Города* и поселения в уездах, имеющих 2000 и более жителей. СПб., 1905.

27. *Города* России в 1810 г. СПб., 1914.

28. *Городские* поселения в Российской империи. Т. 1—3. СПб., 1960—1963.

29. *Грушевский А. С.* Города Великого княжества Литовского в VIV—XVI вв. Киев, 1918.

30. *Грязнов В.* Коложская Борисоглебская церковь в г. Гродно. Вильно, 1893.

31. *Гурков В. С.* Современная белорусская деревня. Мн., 1975.

32. *Данилевич В. Е.* Очерки истории Полоцкой земли до конца XIV столетия. Киев, 1896.

33. *Довнар-Запольский М.* Очерки истории кривичской и дреговичской земель до конца XII в. Киев, 1891.

34. *Довнар-Запольский М.* Белорусское Полесье // Сборник этнографических материалов, собранных М. Довнар-Запольским. Вып. 1. Киев, 1895.

35. *Дражин В. В.* Архитектурно-планировочная организация культурно-туристских зон малых и средних городских поселений Беларуси. Мн., 2004.

36. *Древнее* жилище народов Восточной Европы. Мн., 1975.

37. *Древняя Русь.* Город, замок, село. М., 1985.

38. *Егоров Ю. А.* Градостроительство Белоруссии. Мн., 1954

39. *Егоров Ю. А., Войнов А. П.* Архитектура и градостроительство Советской Белоруссии. Мн., 1957.

40. *Забелин И.* Краткое описание части Западного Полесья. Киев, 1883.

41. *Загорульский Э. М.* Древняя история Белоруссии: Очерки этнической истории и материальной культуры до IX в. Мн., 1977.

42. *Загорульский Э. М.* Возникновение Минска. Мн., 1982.

43. *Заяц Ю. А.* Заславль X–XVIII вв.: Историко-археологический очерк. Мн., 1987.

44. *Збор* помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Брэсцкая вобласць. Мн., 1984.

45. *Збор* помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Віцебская вобласць. Мн., 1985.

46. *Збор* помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Гомельская вобласць. Мн., 1985.

47. *Збор* помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Гродзенская вобласць. Мн., 1986.

48. *Збор* помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Магілёўская вобласць. Мн., 1986.

49. *Збор* помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Мінская вобласць. Мн., 1987.

50. *Збор* помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: г. Мінск. Мн., 1988.

51. *Зверуго Я. Г.* Древний Волковыск X–XIV вв. Мн., 1975.

52. *Зорин Н.* Минувшее и настоящее г. Полоцка. Полоцк, 1910.

53. *Иконников А. В.* Тысяча лет русской архитектуры. Развитие традиций. М., 1990.

54. *Иодо И. А.* Основы градостроительства: Теория, методология. Мн., 1993.

55. *Иодоковский И. И.* Церкви, приспособленные к обороне, в Литве и Литовской Руси // Древности. М., 1915.

56. *История* искусств народов СССР. Т. 1–9. М., 1971–1982.

57. *Каргер М. К.* Памятники древнего зодчества Белоруссии // Тезисы докл. на заседаниях, посвященных итогам полевых исследований 1962 г. М., 1963.

58. *Каргер М. К.* Новый памятник зодчества XII в. в Турове // Краткие сообщ. Института археологии АН СССР. Вып. 100. 1965.

59. *Каргер М. К.* К вопросу о памятниках зодчества XII в. в Волковыске // Славяне и Русь. М., 1968.

60. *Каргер М. К.* К истории полоцкого зодчества XII в. // Новое в археологии. М., 1972.

61. *Каргер М. К.* Раскопки церкви Бориса и Глеба в Новогрудке // Краткие сообщ. Института археологии АН СССР. Вып. 150. М., 1977.

62. *Карский Е.* Село Ляховцы Брестского уезда // Гродненские губернские ведомости. 1891. № 73, 75, 77.

63. *Карский Е.* Краткое описание села Ятвезка Гродненской губернии Волковысского уезда // Гродненские губернские ведомости. 1891. № 15–17; Шляхта-мазуры. С. Л. Этнографический очерк // Гродненские губернские ведомости. 1892. № 67.

64. *Квитницкая Е. Д.* Старые городские деревянные дома на юго-западе Белоруссии // Архитектурное наследство. 1961. № 13.

65. *Квитницкая Е. Д.* Застройка Тизенгауза в Поставах // Архитектурное наследство. 1963. № 3.

66. *Квитницкая Е. Д.* Планировка Гродно XVI–XVIII стст. // Архитектурное наследство. 1963. № 17.

67. *Киев* и западные земли Руси в IX–XIII вв. Мн., 1982.

68. *Кожар Н. В.* Архитектурная теория эпохи романтизма в Германии и развитие западноевропейского зодчества конца XVIII — первой половины XIX в. М., 2001.

69. *Колосовская А. Н.* Архитектурно-пространственная структура орденских монастырей Беларуси XVII–XVIII веков. Мн., 2004.

70. *Комеч А. И.* Древнерусское зодчество конца X — начала XII в. М., 1987.

71. *Копысский З. Ю.* Экономическое развитие городов Белоруссии (XVI–XVII вв.). Мн., 1966.

72. *Корб И. Г.* Дневник путешествия в Московию (1698 – 1699). СПб., 1906.

73. *Корбушкина Т.* Земледелие на территории Белоруссии в X–XIII вв. Мн., 1979.

74. *Космина Т. В.* Сільское житло Поділля: кінец XIX–XX ст. Історико-етнограф. дослидження. Київ, 1980.

75. *Космина О. Ю.* Общее и региональное в традиционном жилище Украины и Белоруссии (конец XIX в. – 70-е гг. XX в.). Дис. ... канд. ист. наук. Мн., 1988.

76. *Косич М. Н.* О постройках белорусского крестьянства // Живая старина. 1906. XV. № 1. С. 74–93.

77. *Красовицкий П. М.* Памятники церковной старины Полоцко-Витебского края и их охранение. Витебск, 1911.

78. *Красовский М.* Курс истории и русской архитектуры. Ч. 1. Пг., 1916.

79. *Краўцэвіч Л. К.* Гарады і замкі Беларускага Панямоння. XIV–XVIII стст. Мн., 1991.

80. *Кулагин А. Н.* Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии. Мн., 1981.

81. *Кулагин А. Н.* Архитектура и искусство рококо в Беларуси. Мн., 1989.

82. *Кулагін А. М.* Каталіцкія храмы на Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 2000.

83. *Кулагін А. М.* Эклектыка: Архітэктура Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя. Мн., 2000.

84. *Кулагін А. М.* Праваслаўныя храмы на Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 2001.

85. *Кулагин А. Н.* Архитектура и искусство рококо в Беларуси в контексте общеевропейской художественной культуры. Мн., 2004.

86. *Кухаренко Ю. В.* Средневековые памятники Полесья. М., 1994.

87. *Кушнярэвіч А. М.* Гатычнае дойлідства Вялікага княства Літоўскага: Функцыянальная і архітэктурная тыпалогія. Мн., 2004.

88. *Лаврецкий Г. А.* Древнерусская художественно-стилевая ретроспекция в архитектуре Беларуси (вторая половина XIX – начало XX веков). Мн., 2000.

89. *Лазука Б. А.* Беларускае барока. Гісторыка-тэарэтычныя праблемы стылю. Мн., 2003.

90. *Лакотка А. І., Борыс С. В.* Сцежкамі дзядоў. Мн., 1986.

91. *Лакотка А. І.* Сілуэты старых прадмесцяў. Нарысы драўлянай архітэктуры. Мн., 1991.

92. *Лакотка А. І.* Бераг вандраванняў, ці Адкуль ў Беларусі мячэці. Мн., 1994.

93. *Лакотка А. І.* Пад стрэхамі прашчураў. Мн., 1995.

94. *Лакотка А. І.* Дойлідства // Беларусы. Т. 2. Мн., 1997.

95. *Лакотка А. І.* Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры. Мн., 1999.

96. *Лакотка А. І.* Драўлянае і сакральна-манументальнае дойлідства Беларусі. Мн., 2003.

97. *Латан Н. А., Зигмантович И. В.* Историко-культурное наследие сел Белоруссии. Градостроительная программа его сохранения // Архитектура и строительство Беларуси. 1994. № 1.

98. *Лебедева Н. М.* Жилище и хозяйственные постройки Белорусской ССР. Мозырский и Бобруйский округа по левому берегу Припяти и ее притоков. Материал экспедиции 1927 г. М., 1927.

99. *Лисенко Т. Н.* Общие приемы в строительстве деревянных церквей карпатского региона // Архитектурное наследство. 1985. № 33.

Храналагічныя рамкі першапачатковага перыяду развіцця манументальнага мураванага дойлідства Беларусі, які атрымаў у мастацтвазнаўстве вызначэнне старажытнарускага, абмежаваны сярэдзінай XI — пачаткам XIII ст., гэта значыць часам ад узвядзення першага на беларускіх землях мураванага праваслаўнага храма і да ўваходжання гэтых земляў у склад ВКЛ. Такім чынам, паняцце «старажытнарускі перыяд» прынцыпова адрозніваецца ў беларускім і рускім мастацтвазнаўстве. У апошнім перыяд, званы старажытнарускім, ахоплівае значна большы час — да пачатку XVIII ст., што абумоўлена радыкальнымі зменамі сацыяльнага і культурнага жыцця Расіі ў выніку рэформ цара Пятра I. Трэба заўсёды мець на ўвазе гэтую навуковатэрміналагічную адметнасць, што гістарычна склалася ў навуцы. У дачыненні да гісторыі беларускага дойлідства ранняга этапу навукова некарэктна таксама ўжываць пашыраны ў рускім мастацтвазнаўстве тэрмін «дамангольскі перыяд», як гэта іншы раз рабілася раней (М. Брунаў), з прычыны, што такога перыяду (як і татара-мангольскага прыгнёту) у гісторыі Беларусі проста не было.

Вывучэнне архітэктурнай спадчыны старажытнарускага перыяду, якая па свайму якаснаму зместу з'яўлялася пераважна сакральнай, мае шматаспектны характар. Можна вылучыць некалькі асноўных напрамкаў даследаванняў, якія пры адным і тым жа аб'екце даследавання па-рознаму вар'іруюць свае мэты: архітэктурная археалогія, гісторыя архітэктуры і рэлігіязнаўства. Пры сістэмным мастацтвазнаўчым аналізе помнікаў дойлідства неабходна ўлічваць усе гэтыя складаючыя.

Паколькі на сённяшні дзень большасць помнікаў сакральнага дойлідства Беларусі старажытнарускага перыяду знаходзіцца ў архітэктурна-археалагічным стане, гэта значыць на ўзроўні падмуркаў, найбольшая роля ў іх вывучэнні належыць архітэктурнай археалогіі, якая займаецца іх натурным абследаваннем, выяўленнем рэшткаў канструкцый, будаўнічых матэрыялаў і тэхналогій, фрагментаў дэкора і г. д. На падставе летапісных і агіяграфічных крыніц гісторыкамі і археолагамі праведзена асноўная на сённяшні дзень навуковая атрыбуцыя помнікаў: дакладныя альбо верагодныя даты будаўніцтва і асвячэння храмаў, імёны заказчыкаў і майстроў, пазнейшыя перабудовы і інш. У шэрагу выпадкаў імі выкананы

магчымыя архітэктанічныя графічныя рэканструкцыі помнікаў.

Развіццё архітэктурнай археалогіі ў Беларусі пачалося ў другой палове XIX ст. менавіта з даследаванняў старажытных праваслаўных цэркваў Полацка і Гродна XI—XII стст., якія спачатку мелі краязнаўчы характар. Гэтая цікавасць да помнікаў «праваслаўнай царкоўнай даўніны» была абумоўлена, перш за ўсё, жаданнем праваслаўнай царквы абаснаваць свае культурна-канфесійныя прыярытэты на беларускіх землях. Азначаная тэндэнцыя, безумоўна, мела пэўнае гістарычнае абгрунтаванне, аднак несла пры гэтым шавіністычнае руска-імперскае палітычнае адценне. Аднак у навуковым плане гісторыка-краязнаўчыя і архітэктурна-археалагічныя працы А. Сапунова, А. Паўлінава, П. Пакрышкіна, В. Суслава, якія ўжо закраналі пытанні генезісу, тыпалогіі і семантыкі праваслаўнага храма, атрымалі фундаментальнае значэнне. Паступова, на мяжы XIX—XX стст., былі зроблены вельмі важныя крокі: праведзены абмеры выяўленых на той час помнікаў дойлідства старажытнарускага перыяду, ажыццёўлена іх частковая кансервацыя і рэстаўрацыя. У гэтым жа напрамку актыўна працавалі даследчыкі клерыкальна-краязнаўчага плана: А. Семянтоўскі, К. Шэроцкі, Д. Даўгяла, В. Краснянскі.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі архітэктурна-археалагічныя даследаванні пэўны час працягваліся. У 1920-я гг. вывучэнне архітэктурных помнікаў старажытнага Полацка праводзілі археолагі І. Хозераў, С. Мялешка, А. Ляўданскі. Паралельна з імі працавалі гісторыкі архітэктуры М. Шчакаціхін і М. Брунаў, дапаўняючы дадзеныя археолагаў сваімі натурнымі даследаваннямі і мастацтвазнаўчымі высновамі. Гэта былі выдатныя прадстаўнікі рускай мастацтвазнаўчай школы, якія, валодаючы шырокім навуковым кругаглядам, імкнуліся аб'ектыўна вылучыць самабытныя рысы беларускіх помнікаў у кантэксце ўсяго старажытнарускага дойлідства. З гэтай прычыны яны засяроджвалі ўвагу на паходжанні літаральна кожнай адметнай архітэктурнай формы ці кампазіцыйнай асаблівасці, адшукваючы іх генезіс. Іншы раз паміж канцэпцыямі даследчыкаў былі значныя разыходжанні, але ў цэлым яны паклалі пачатак самастойнаму мастацтвазнаўчаму паняццю «полацкая школа дойлідства» ў кантэксце іншых рэгіянальных архітэктурных школ старажытнарускага перыяду.

Археолагамі і мастацтвазнаўцамі 1920—1930-х гг. былі глыбока прааналізаваны архітэктурныя паралелі храмаў Полацка і Смаленска. У шэрагу выпадкаў з прычыны «немагчымасці абсалютна дакладных прамераў», якую адзначаў М. Шчакаціхін, гісторыкамі архітэктуры таго часу было зроблена нямала тэарэтычных хібаў, якія пазней былі выпраўлены шматлікімі археалагічнымі экспедыцыямі 1960—1980-х гг. З другога боку, у той час многія помнікі, пазней цалкам зруйнаваныя, мелі яшчэ наяўныя архітэктурныя канструкцыі, часам да ўзроўню скляпенняў, што робіць натурныя назіранні азначаных даследчыкаў асабліва каштоўнымі крыніцамі.

Самабытная гродзенская школа старажытнарускага царкоўнага будаўніцтва, другая па значнасці на сучасных беларускіх землях, таксама вывучалася з другой паловы XIX ст. (В. Гразноў). Даследаванні помнікаў гэтай школы, хаця і даволі тэндэнцыйныя, праводзіліся таксама ў перыяд 2-й Рэчы Паспалітай, да 1939 г., даследчыкамі Заходняй Беларусі (Я. Ядкоўскі, З. Дурчэўскі, Ю. Клос).

У пасляваенны перыяд інтэнсіўнасць археалагічных даследаванняў значна ўзрасла. З 1944 г. і да распаду СССР даследаваннямі архітэктурных помнікаў Беларусі XI—XIII стст. актыўна займаліся вядомыя археолагі Масквы і Ленінграда: М. Варонін, Л. Аляксееў, М. Каргер, П. Рапапорт, М. Малеўская, В. Булкін, А. Афанасьеў, Б. Рыбакоў; гісторыкі архітэктуры А. Някрасаў, Ю. Ягораў, П. Максімаў, Г. Штэндар і іншыя. Асаблівая роля ў гэтай рабоце, як яе каардынатара ў маштабах агульнай усходнеславянскай прасторы, належала П. Рапапорту, якім выдадзены грунтоўны «Свод археологических источников: Русская архитектура X—XIII вв.». У ім абагульнены вынікі шматгадовых гісторыка-археалагічных даследаванняў па ўсіх вядомых помніках мураванага дойлідства азначанага перыяду старажытнай Русі і беларускіх земляў уключна, прадстаўлены магчымыя рэканструкцыі шэрагу зруйнаваных ці істотна перабудаваных храмаў. З гэтай прычыны невыпадкова, што менавіта ленінградскі археолаг прафесар П. Рапапорт з'яўляўся аўтарам раздзела «Мураванае дойлідства старажытнарускага перыяду» ў 1-м томе шматтомнай «Гісторыі беларускага мастацтва», выдадзеным у 1987 г., дзе яго архітэктурны аналіз прадстаўлены найбольш грунтоўна.

З канца 1960-х гг. пачаў фарміравацца ўласна айчынны навуковы кантынгент гісторыкаў, археолагаў і архітэктараў Беларусі. Важнае месца тут належыць археолагам Г. Штыхаву, П. Лысенка, Э. Загарульскаму, М. Ткачову, А. Трусаву, І. Чарняўскаму, Л. Калядзінскаму, Т. Бубенька, У. Арлову, А. Мельнікаву, С. Тарасаву; рэстаўратарам В. Слюнчанка, С. Друшчыцу, У. Ракіцкаму; мастацтвазнаўцам А. Сяліцкаму, В. Церашчатавай, разнапланавыя даследаванні якіх зафіксаваны шмалікімі публікацыямі.

Працы гісторыкаў архітэктуры У. Чантурыя, В. Кудрашова, якія з'явіліся ў 1960-я гг., коратка падсумоўвалі назіранні іх папярэднікаў М. Брунава і М. Шчакаціхіна, але, адпаведна атэістычнай ідэалогіі таго часу, зусім не закраналі духоўна-семантычнага пачатку сакральнай архітэктуры, што з'яўляецца яе важнейшым кампанентам. У 1970—1990-я гг. помнікі беларускага дойлідства старажытнарускага перыяду на падставе папярэдніх даследаванняў былі даволі поўна адлюстраваны ў шэрагу энцыклапедычных выданняў, у першую чаргу такіх, як «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» і «Архітэктура Беларусі», але з прычыны характэрнай энцыклапедычнай спецыфікі гэтых выданняў у іх не прадстаўлена цэласная карціна генезісу і эвалюцыі беларускага манументальнага дойлідства старажытнарускага перыяду, а толькі коратка сфармуля-

ваны кампазіцыйна-канструкцыйныя адметнасці полацкай і гродзенскай рэгіянальных школаў, дадзены гісторыка-археалагічныя апісанні асобных помнікаў.

Трэба адзначыць, што навуковая атрыбуцыя праваслаўнага царкоўнага будаўніцтва старажытнарускага перыяду, якая выпрацоўвалася на падставе шматлікіх і рознабаковых архітэктурна-археалагічных даследаванняў, даволі ўстойлівая, але небясспрэчная. Відавочна, што ўсе сакральныя збудаванні таго часу маюць агульны генезіс, а варыянтнасць архетыпаў абмежавана адзіным усходнехрысціянскім рэчышчам. Але працэс выпрацоўкі сучаснай агульнапрынятай навуковай атрыбуцыі кожнага помніка быў доўгім і няпростым. Выяўленне першакрыніц архітэктурных формаў і мастацкіх уплываў выклікала і выклікае нямала спрэчак. Напрыклад, у апошніх на сённяшні дзень аўтарскіх манаграфіях і энцыклапедычных даведніках гісторыкаў беларускай архітэктуры А. Лакоткі, А. Кулагіна, І. Слюньковай устойлівая навуковая атрыбуцыя беларускіх помнікаў азначанага перыяду часта адвольна і памылкова карэкціруецца, асабліва ў дачыненні вызначэння тыпалогіі храмаў.

Важнай кампаненце сакральнага праваслаўнага дойлідства — яго філасофска-рэлігійнай семантыцы — таксама прысвечана шмат даследаванняў з паглыбленым аналізам старажытных багаслоўскіх вучэнняў. Вучоныя-багасловы часта спалучалі гэтую праблематыку з пачаткамі архітэктурнай археалогіі, напрыклад, у працах архірэяў Яўгенія Балхавіцінава, Мікалая Ахрыдскага, Сергія Галубцова. Для вывучэння хрысціянскай сімволікі храмабудаўніцтва вялікае значэнне маюць працы Мікалая Троіцкага «Влияние космологии на иконографию византийского купольного свода» (1896) і «Христианский храм в его идее» (1916). Гэтай праблематыцы вялікая ўвага надаецца і сёння як з пункту гледжання праваслаўнага рэлігіязнаўства (М. Кудраўцаў, Т. Кудраўцава), так і сучаснага расійскага мастацтвазнаўства (Г. Вагнер, А. Якабсон, З. Сямёнава).

На сённяшні дзень у беларускім архітэктуразнаўстве важнейшыя пытанні сакральна-сімвалічнай сутнасці старажытнай хрысціянскай архітэктуры Беларусі застаюцца маладаследаванымі. Параўнальна з іншымі, у найбольшай ступені на рэлігійнай сімволіцы архітэктуры праваслаўных храмаў акцэнтуюць увагу публікацыі Г. Лаўрэцкага. Аднак празмернае ўзвышэнне ролі сакральнай сімволікі, якая з'яўляецца важнай, але ўсё ж толькі часткай архітэктурна-мастацкага цэлага, часам прыводзіць даследчыка да ігнаравання рэальных сацыяльна-гістарычных абставін, рознабаковых культурных уплываў, адметнасцей творчых архітэктурных прыёмаў, нівеліроўкі своеасаблівасці мясцовых рэгіянальных школ дойлідства. Між тым іх адметнасць ад самага пачатку і ў далейшым была абумоўлена сутыкненнем тут праваслаўна-візантыйскага і каталіцка-раманскага духоўна-культурных арэалаў.

Пры ўсёй скрупулёзнасці археалагічных даследаванняў помнікаў дойлідства старажытнарускага пе-

рыяду, іх мастацтвазнаўчаму аналізу ўласціва пэўная недастатковасць з-за спецыфічнай канцэнтрацыі ўвагі пераважна на планавых схемах на ўзроўні падмуркаў. Для гісторыкаў архітэктуры адначасова неабходна мець на ўвазе план у верхнім сячэнні збудаванняў, дзе ў сістэме перакрыццяў выяўляецца семантыка сімвалічная ідэя храма. Пры аналізе архітэктонікі сакральных помнікаў больш істотнай з'яўляецца не колькасць апорных слупоў (пры падліку якіх, дарэчы, рознымі даследчыкамі ўжываюцца розныя падыходы), а характар арганізацыі крыжовага ядра кампазіцыі, што мае канкрэтную ідэйна-канфесійную нагрузку.

Відавочна, што дастаткова поўна даследаваныя ў натуры археалагічныя рэшткі помнікаў дойлідства Беларусі старажытнарускага перыяду патрабуюць на сённяшні дзень паглыбленага навуковага аналізу, абагульнення, сістэматызацыі і навуковай карэкціроўкі з пункту гледжання гісторыі архітэктуры, вызначэння іх месца не толькі ва ўсходнеславянскім, але і ў агульнаеўрапейскім кантэксце. Мэтай сучаснага беларускага мастацтвазнаўства з'яўляецца вызначэнне дакладнай архітэктурнай тыпалогіі збудаванняў, генезісу форм і канструкцый, своеадметнасці творчых метадаў і мастацкіх прыёмаў, выяўленне характару ўзаемадзеяння функцыянальнага, канструкцыйнага і эстэтычнага пачаткаў у творах манументальнага дойлідства, узноўленых хаця бы віртуальна.

2.2. Перадумовы ўзнікнення манументальнага сакральнага дойлідства. Хрысціянізацыя Русі

Пачатак фарміравання матэрыяльнай і духоўнай культуры кожнага народа ідзе ад сівой даўніны і не паддаецца дакладнаму храналагічнаму вызначэнню. Ужо ў неаліце з'яўляюцца будаўнічае рамяство і ганчарная вытворчасць, што звязана з аседласцю плямёнаў усходніх славян. Адначасова развіваюцца земляробства і ткацтва, пра што сведчаць шматлікія прасліцы ў археалагічных знаходках. Асноўнымі будаўнічымі матэрыяламі родава-племяннога побыту шмат стагоддзяў з'яўляліся дрэва і гліна. Безумоўна, усходнеславянскія дойліды яшчэ да з'яўлення на іх землях першых велічных мураваных сакральных пабудоў мелі ўласныя будаўнічыя прыёмы і тыпы збудаванняў, што склаліся ў драўляным дойлідстве, а таксама і адпаведныя грамадскаму светапогляду эстэтычныя густы, якія ў далейшым паўплывалі на першыя старажытнарускія мураваныя пабудовы, надаўшы ім рысы мастацкай адметнасці. Пра драўляныя пабудовы раннефеадальнага перыяду вядома надзвычай мала. У пісьмовых крыніцах існуюць толькі кароткія заўвагі наконт наяўнасці драўляных цэркваў і храмаў. Археалагічнымі раскопкамі раскрыты рэшткі драўляных жылых будынкаў, даволі значных фрагментаў гарадской забудовы і г. д. Але ўсё гэта

яшчэ не стала той сацыякультурнай цэласнасцю, што завецца манументальнай архітэктурай.

Велізарная стваральная сфера чалавечай дзейнасці — мастацтва, будаўніцтва, архітэктура, дойлідства — па сваёй сутнасці з'яўляецца сувязным звяном паміж прыродай і грамадствам. Яна адметная ў кожнага народа, што вызначаецца прыродна-геаграфічнымі ўмовамі рэгіёну і яго сацыяльнай гісторыяй. Само слова «архітэктура» мае сэнс «звышструктура» і азначае тып будаўніцтва, якое выконвае важную сацыяльную праграму. Сапраўдныя творы архітэктуры даюць уяўленне пра сутнасць жыцця грамадства, пра яго не толькі утылітарныя, але і ідэалагічныя задачы, раскрываюць сродкі іх адначасовага вырашэння і развіцця творчай думкі, што перажывае свой час. Характэрна, што пункт адліку і вытокі станаўлення прафесійнага манументальнага мураванага дойлідства ўсіх сучасных усходнеславянскіх народаў былі агульнымі і сацыяльна-дэтэрмінаванымі, што звязана з прыняццем імі хрысціянства па візантыйскаму ўзору ў канцы X ст.

Старажытная Русь — кангламерат усходнеславянскіх княстваў пад дзяржаўна-дынастыйным патранатам Кіева. Яна займала гіганцкую раўнінную тэрыторыю Усходняй Еўропы — ад прычарнаморскіх стэпаў да сярэдняга цячэння Заходняй Дзвіны. Народы, якія яе насялялі, упершыню вызначаны ў візантыйскіх хроніках словам «Русь» пад 852 годам (6360 г. ад стварэння сусвету). Гэтую дату ўмоўна можна лічыць пачаткам нацыянальна-культурнай ідэнтыфікацыі ўсходніх славян, аднак карані фарміравання іх матэрыяльнай і мастацкай культуры ідуць у яшчэ больш старажытныя часы. Яно адбывалася ва ўмовах панавання і на грунце паганскага пантэістычнага светапогляду. Арганізацыя быту і культавых рытуалаў была падпарадкавана сістэме першабытных сімвалічных знакаў. Заснавальнік культуралогіі як навукі Л. А. Уайт адзначаў, што з самых старажытных часоў «чалавечыя паводзіны — гэта сімвалічныя паводзіны; сімвалічныя паводзіны — гэта чалавечыя паводзіны. Сімвал — гэта Сусвет чалавека». Вытокі культуры, такім чынам, заключаны ў здольнасці чалавека ствараць нейкае штучнае асяроддзе і надаваць яму пэўную сімволіку.

Сімволіка славянскага язычніцтва была пранізана геаметрызмам, сіметрыяй і раслінными формамі. Гарманізацыя культавай прасторы ў першую чаргу разумелася як стварэнне капішча ці кургана ў выглядзе круга. Падобная кампазіцыя капішча роднасная касмаграфічным уяўленням антычнага свету. У форме круга найбольш выразна выяўлялася супрацьстаўленне ўпарадкаванасці створанай чалавекам рэальнасці і хаосу прыроды, што ўласціва ўсім старажытным цывілізацыям. Капішча ў Кіеве, адкрытае археолагамі ў 1908 г., мела авальную, блізкую да круга форму, было абмуравана невысокай сценкай з вялікіх камянёў з выступамі з чатырох бакоў ў выглядзе крыжа. Гэтае збудаванне абкружала яшчэ адна сцяна, якая ўтварала ў плане форму квадрата. Наўгародскае капішча таксама

мела форму круга, абнесенага валам у выглядзе васьміпялёсткавай кветкі з пялёсткамі паўкруглай формы. У цэнтры ўсіх кругоў раскладваліся вогнішчы.

Сімвалічнае асэнсаванне чатырохвугольнага перыметра збудавання, па меркаванню Г. Я. Вагнера, ёсць больш высокая ступень мыслення, параўнальна з кругам. Форма прамавугольніка сімвалічна суадносіцца з міфалогіяй і «скрынепадобнай» мадэллю сусвету старажытных егіпцян. Між тым чатырохвугольная форма плана пабудовы не магла быць нечым незвычайным і для славянскага язычніцтва з прычыны таго, што з самых старажытных часоў славяне будавалі з дрэва гарызантальнымі вянкамі. У такім выпадку даўжыня бервяна з'яўлялася модулем прамавугольнага перыметра збудавання.

Старажытныя славяне пакланяліся не Тварцу, а тварэнню [110]. Паганская міфалогія ўсходніх славян была менш распрацаванай, чым, напрыклад, у старажытных грэкаў. Пантэон багоў, якія ўвасаблялі асноўныя з'явы прыроды, не меў агульнага вярхоўнага бога. Богам неба лічыўся Сварог, а яго сын «Сварожыч»-Пярун — богам маланкі, грому і вайны, Хорс лічыўся богам сонца, Даждзбог — сонечнага святла, Ярыла — летняга сонца, Стрыбог — ветру. Акрамя нябесных багоў існавалі богі зямлі: Мокаш — багіня ўрадлівасці і хатняга дабрабыту, «скотый бог» Вялес, багіня вясны і шлюбу Лада і шмат іншых. Найвялікшым богам, які ўвабраў у сябе ўсю цэласнасць свету, адзінства зямлі і неба, лічыўся Род-Светавід, які меў чатыры твары, арыентаваныя па баках свету. Менавіта ён прадстаўлены вядомым Збручаўскім ідалам IX—X стст. Вядома, што найбольшым шанаваннем у розных плямёнаў і гарадах карысталіся Пярун і Род, што выяўляе пэўную тэндэнцыю да монатэізму. Паганскі светапогляд з'яўляўся гістарычна-абумоўленай формай грамадскай свядомасці, але паступова страчваў сваё кансалідуючае сацыяльнае значэнне.

У канцы X ст. гісторыка-сацыяльная сітуацыя склалася такім чынам, што Кіеўская Русь засталася адзінай вялікай ўсходнееўрапейскай краінай, у аснове ідэалогіі якой знаходзілася язычніцтва. З поўдня, усходу і захаду яна была абкружана краінамі, з якімі падтрымлівала цесныя палітычныя і гандлёвыя стасункі і якія ўжо даўно прытрымліваліся монатэістычных веравызнанняў: Візантыя, Балканы, краіны Цэнтральнай і Заходняй Еўропы, Грузія і Арменія — хрысціянства, Хазарыя — іудаізма, Паволжская Булгарыя і краіны ўсходняй часткі Арабскага халіфата — ісламa. Параўнальна з паганскім пантэістычным светапоглядам, звязаным з персаніфікацыяй прыроды і абмежаваным разуменнем сусвету як акаляючага асяроддзя, монатэістычныя веравызнанні былі значнымі дасягненнямі цывілізацыйнага працэсу. Яны давалі значна больш развітую і складаную іерархічную мадэль Сусвету, якая лепш адпавядала тагачасным грамадскім абставінам.

У выніку відавочнай перавагі гандлёва-палітычных зносін з хрысціянскімі краінамі, монатэістычныя ідэі хрысціянства пусцілі свае ка-

рані ў асяроддзі ўсходняга славянства яшчэ да яго афіцыйнага прыняцця. Ужо ў найбольш вядомым старажытнарускім летапісе «Аповесці мінулых часоў», складзеным кіева-пячэрскім манахам Нестарам, пад 945 г. двойчы ўпамінаецца Ільінская царква ў Кіеве, якая, да таго ж, вызначаецца як саборная, што сведчыць і пра існаванне іншых. У 955 ці 957 г. (пісьмовыя крыніцы ўзгадваюць розныя даты) прыняла хрысціянства (тады яшчэ не падзеленае на каталіцтва і праваслаўе) кіеўская вялікая княгіня Вольга. Яна па запрашэнню візантыйскага імператара Канстанціна Пурпурароднага наведала Канстанцінопаль, дзе прыняла хрышчэнне пад імем Елены, у гонар маці роўнаапостальнага імператара Канстанціна I Вялікага. Пазней, у 959 г., яна звярнулася з просьбай да германскага імператара Атона I даслаць у Кіеў епіскапа, але гэтая задума не мела поспеху: першы прысланы ў Кіеў епіскап Лібуцый нечакана памёр, а другі — Адальберт — не быў дапушчаны кіеўлянамі, таму што прыняць яго азначала трапіць пад уладу лацінян, да якіх на Русі заўжды былі не вельмі прыязныя адносіны.

Сын княгіні Вольгі Святаслаў, паводле азначанага летапісу, з прычыны неўтаймаванага характару не прыняў хрышчэння, і толькі яе ўнук Уладзімір (гады княжання 978—1015), пасля доўгіх ваганняў і палітычных захадаў, у 988 г. зрабіў найважнейшы для далейшага лёсу ўсходніх славян гістарычны крок — ажыццявіў дзяржаўнае хрышчэнне Русі. Гэта было выклікана, як лічаць, «пачуццём дзяржаўнасці», хаця на пачатку свайго княжання, у 980 г., князь Уладзімір, як зацяты язычнік, паставіў на пагорку над Дняпром «вне двора теремного... Перуна древяна, а главу его серебрену, а уст злат, и Хърса, Дажьбога и Стрибога и Симарьгла и Мокошь». Гэта была апошняя рэакцыя мясцовага язычніцкага політэізму. Але для Русі наспеў час дакладна вызначыць сваё месца сярод іншых еўразійскіх краін і народаў.

Летапісец Нестар панарамна апісвае падзеі, звязаныя з «выбарам веры». У 985 г. пасля ваеннага паходу князь Уладзімір заключыў мірны дагавор з паволжскімі булгарамі, якія прапанавалі яму прыняць іслам. Дзеля азнаямлення з перавагамі ісламу Уладзімір накіраваў пасольства ў Харэзм, але гэтыя захады спынілі жорсткія абмежаванні ісламу. Да іудаізму Уладзіміра схілялі прадстаўнікі яўрэйска-хазарскага гандлёвага насельніцтва, асеўшага ў Кіеве пасля разгрому Хазарыі яго бацькам князем Святаславам, але былі абвергнуты на падставе таго, што яны не маюць сваёй зямлі. «Рымскую веру» не прынялі перш за ўсё з прычыны неабходнасці падпарадкавання дзяржаўнай улады царкве.

Паводле летапісу, «выбар веры» скончыўся размовай князя Уладзіміра з грэчаскім філосафам, які выклаў яму праваслаўнае вучэнне аб выратаванні душы. Але ён вырашыў «пачакаць яшчэ». Накіраваных у Канстанцінопаль пасланцаў князя

больш за ўсё ўразіла набажэнства ў храме Святой Сафіі: «Не знали, на небе или на земле мы, ибо нет на земле такого зрелища и красоты такой, и не знаем, как рассказать об этом, знаем только, что пребывает там Бог с людьми, и служба их лучше, чем во всех других странах. Не можем мы забыть красоты той, ибо каждый человек, если вкусит сладкого, не возьмет потом горького, так и мы не можем уже пребывать в язычестве».

Хрысціянства прыйшло ў Старажытную Русь з Візантыі, але яно надзвычай хутка было ўспрынята ўсходнімі славянамі. Відавочна, што ўсходнеславянская культура была падрыхтавана да прыняцця новай рэлігіі не толькі сацыяльна-палітычнай неабходнасцю, але і ўнутраным духоўным развіццём, пра што сведчыць надзвычайны ўздым культуры Старажытнай Русі. Развітая візантыйская цывілізацыя аказала вызначальны ўплыў на далейшыя шляхі развіцця ўсходнеславянскай культуры перыяду ранняга феадалізму. З Візантыі Русь пераняла дасканала распрацаванае праваслаўнае веравучэнне і спецыфіку культу. Богаслужэнне ў храмах вялося на царкоўнаславянскай мове. З прыняццем хрысціянства звязана з'яўленне і шырокае распаўсюджанне славянскай пісьменнасці, створанай у другой палове IX ст. манахамі-місіянерамі Кірылам і Мяфодзіем, якія на падставе вывучэння славянскай фанетыкі стварылі адпаведную азбуку, кірыліцу і глаголіцу. Кірыліца была хутка засвоена, і на Русі з'явіліся першыя пераклады кніг рэлігійнага зместу, а таксама свецкія кнігі па гісторыі, філасофіі, геаграфіі, што спрыяла пашырэнню асветніцтва на Русі і фарміраванню монатэістычнага светапогляду.

Цяжка пераацаніць сацыякультурнае значэнне хрышчэння Русі. Усяго за стагоддзе пасля прыняцця хрысціянства праваслаўная старажытнаруская культура ўзнялася на больш высокі агульнаеўрапейскі ўзровень. Была пераадолена лакальная абмежаванасць, пашырыліся палітычныя, эканамічныя і культурныя сувязі з больш развітымі краінамі Еўропы і Азіі. Монатэістычная дзяржаўная рэлігія спрыяла ўмацаванню феадальных адносін і міждзяржаўных сувязей. Праваслаўнае веравызнанне падштурхнула працэс фарміравання адзінай рускай народнасці, духоўна ўз'яднала і ўзбагаціла яе духоўны свет. Гэта спрыяла гарманізацыі адносін паміж чалавекам, грамадствам і прыродай, выпрацоўцы новых маральна-этычных уяўленняў.

Прыняцце хрысціянства паклала пачатак бурнаму развіццю сакральнага і манастырскага дойлідства, іканапісу, рэлігійнай літаратуры і музыкі. Пры манастырах дзейнічалі школы, дзе навучалі грамаце, навукам і рамёствам. З развіццём адукацыі ўзнікла ўяўленне пра гістарычнасць часу, з'явіліся арыгінальныя літаратурна-гістарычныя творы — летапісы, якія пачалі фіксаваць важныя падзеі ў жыцці грамадства. Летапісы служылі энцыклапедыямі таго часу, уключалі апі-

санні незвычайных з'яў прыроды, сведчанні палітычных падзей, жыція святых, гістарычныя аповесці, фальклорныя літаратурныя творы і інш. Летапісанне адыграла важную ролю ў палітычным і культурным жыцці тагачаснага грамадства. Старажытнарускія летапісы і на сённяшні дзень з'яўляюцца галоўнай крыніцай па сацыяльнай гісторыі IX—XV стст., у тым ліку і па гісторыі першапачатковага этапу развіцця мураванага сакральнага дойлідства ўсходнеславянскіх земляў.

2.3. Шляхі фарміравання архітэктурнай тыпалогіі хрысціянскага храма

Мастацкі вобраз і кампазіцыйныя характарыстыкі праваслаўнай царкоўнай архітэктуры ў цэлым — гэта складаная зашыфраваная мова архітэктурных формаў і рэлігійных сімвалаў, якія ўзаемна абумоўліваюць і ўзаемна дапаўняюць адзін аднаго. Здольнасць да сістэмнай сімвалізацыі — гэта спецыфічна чалавечая здольнасць і творчая неабходнасць. У той час, як рэлігійныя сімвалы адносна метафізічныя, архітэктурныя формы сакральнага дойлідства мусяць творча развівацца і прыстасоўвацца да рэалій быцця соцыума. Яны залежаць ад палітычнага і эканамічнага стану грамадства, клімата-геаграфічных асаблівасцяў рэгіёна, наяўнасці пэўных рэсурсаў будаўнічых матэрыялаў і кваліфікаваных кадраў, мастацкіх традыцый і ўплываў. Такім чынам, сакральная архітэктура ў цэлым звязвае ідэальнае, адвечнае са штодзённым і магчымым. Таму архітэктурныя формы і канструкцыі, нават калі яны выяўляюць адну і тую ж хрысціянскую ідэю, мяняюцца ад стагоддзя ў стагоддзе, ад рэгіёна да рэгіёна, ад канонаў адной канфесіі да другіх.

«Сакра» на латыні азначае «таінства». Хрысціянская Царква па свайму вызначэнню ёсць таінства паяднання чалавечай супольнасці Святым Духам. Невыпадковым з'яўляецца знітаванне ў адным слове двух паняццяў — Царква і Храм, якія маюць унутранае адзінства і суадносяцца паміж сабою як ідэя і яе форма. Храм, па сутнасці, — гэта велічны і глыбока-ідэйны вобраз хрысціянскай Царквы, напоўнены калектыўнай духоўнасцю. Таму сакральная архітэктура імкнецца да духоўнай роўнасці людзей рознага сацыяльнага паходжання. Храм як мастацкае цэлае з'яўляецца нібыта евангеллем для ўсяго кола вернікаў ад самых нізоў да самых вярхоў. Будова храма трансфармуе вобраз Сусвету моваю архітэктурных формаў і сімвалаў, непарыўна знітаваных са светапоглядам і духоўнымі ідэаламі грамадства.

Пытанні генезісу, эвалюцыі і семантыкі хрысціянскага храма надзвычай складаныя і шматгранныя. Паходжанне рэлігійных сімвалаў і працэс развіцця сакральнага дойлідства з'яўляюцца прадметам шматлікіх навуковых даследаванняў і гі-


потэз як у гісторыі мастацтва, так і гісторыі рэлігіі. Ідэя хрысціянскага храма як сакральнага цэлага склалася і адкрылася паступова.

Прынцыповае значэнне мае сімвалічны падзел святыні на тры часткі, што закладзена ўжо ў Старым Запавеце на прыкладзе скініі, пабудаванай Майсеем у пустыні па прадвызначэнню самога Бога, а таксама велічнага храма Саламона. Але ідэю хрысціянскага храма нельга цалкам ідэнтыфікаваць з ідэяй скініі ў тым выглядзе, як яе разумеў і выклаў іудзейскі гісторык і святар Іосіф Флавій. Паводле яго, старазапаветная скінія мела чатырохвугольную форму з прапорцыямі 1:3 і прамавугольны двор скініі — у прапорцыі 1:2. Семантычна такая будова скініі вызначалася Кнігай Зыходу (главы 25—27). Функцыянальна прапорцыі скініі былі абумоўлены яе падзелам на адкрытую пярэднюю частку, званую «святая», і наступную за ёй «святая святых», якая таксама мела дзве часткі — пярэднюю для святароў і заднюю для Каўчэга Запавету. Скінія не лічылася жыллём Бога, а толькі месцам яго з'яўлення, таму яна была адкрытай, увасабляючы вобраз Сусвету. Раннехрысціянскі літургіст-свяціцель Іаан Златавуст называе храм царквой і падкрэслівае, што яна «праслаўлена паче скініі Маісеевай». Ён сцвярджае, што кожны з вернікаў і ўсе разам ёсць храм, і ўсе народы ёсць чатыры сцяны, на якіх Хрыстос стварыў адзіны храм.

Усходняя частка храма, па старажытнай касмаграфіі і рэлігійнаму светапогляду, ёсць «край святла», Эдэм, дзе знаходзіцца рай. Таму старажытныя хрысціяне па традыцыі размяшчалі алтар (alta ara, што азначае «высокі ахвярнік»), перад якім маліліся і адпраўлялі набажэнствы, заўжды на ўсходзе. Алтар ставіўся на ўзвышэнне, якое мае назву «віма» (узыходжанне на вышыню).

Калі Усход — гэта краіна райскага быцця, то Захад, наадварот, вобласць смутку і жалобы, месцазнаходжанне памерлых, якія чакаюць уваскрашэння і суда. Гэта ўваходная частка храма. А яго цэнтральная частка сімвалізуе зямную прастору, дзе пануе хрысціянская Царква. Малітоўная зала на грэчаскай мове завецца кафалікон — Айкумена, Сусвет. Гэта асноўныя сімвалы хрысціянскага храма, трактаваныя святым апосталам Іаанам Златавустам на прыкладзе старазапаветных святынь. Новы Запавет, на падставе Старога, значна развіў і пашырыў семантыка-сімвалічнае напаўненне ідэі хрысціянскага храма, які стаў атаясамлівацца з Целам Хрыстовым і ў сваіх формах і канструкцыях увасабляць саборнае адзінства іерархіі нябеснай і царквы зямной.

Неабходна коратка звярнуцца да пачатку гістарычнага працэсу фарміравання архітэктурнай тыпалогіі і семантыкі хрысціянскага храма. Першыя хрысціяне, вымушаныя ратавацца ад праследаванняў улад Рымскай імперыі, ажыццяўлялі свае набажэнствы ў катакомбах, звычайна ў прасторы, утворанай перакрыжаваннем вузкіх падземных ходаў. Такая арганізацыя культавай прасторы ў хуткім часе была сімвалічна атаясамлена з пакутамі Хрыста, распятага на крыжы. Таму,



Мал. 64. Царква каля Антыяхіі.
IV ст. н. э. План

калі ў пачатку IV ст. н. э., пры рымскім імператары Канстанціне I Вялікім, хрысціянская царква была афіцыйна прызнана дзяржаўнай, яна адмовілася ад тэктонікі пантэістычнага антычнага храма (грэчаскага перыптэра ці рымскага трохцэлавага) на карысць уласнай ідэі хрысціянскага храма. У яе рэалізацыі на першапачатковым этапе вядучымі былі два тыпы храма. У «Апостальскіх пастанаўленнях» V ст. даецца рэкамендацыя будаваць хрысціянскі храм у выглядзе падоўжанага прамавугольніка, «накшталт карабля» (адсюль архітэктурныя тэрміны: наас, нава, неф, што азначае «карабель»), у чым адлюстравана старазапаветная ідэя храмавага ўпарадкавання — накшталт скініі Майсея.

Новазапаветныя ідэі распяцця і ўваскрашэння Хрыста ўвасабляў храм цэнтрычнай кампазіцыі з планам у выглядзе роўнаканцовага крыжа, арыентаванага чатырма прамавугольнымі аб'ёмамі на чатыры бакі свету, а алтарнай часткай — абавязкова на ўсход, напрыклад царква каля Антыяхіі, IV ст. н. э. Аднак з пункту гледжання літургічных запатрабаванняў, гэтая структура культавага будынка не была дастаткова зручнай: пры вялікім зборы народу вернікі, што знаходзіліся ў доўгіх бакавых рамёнах крыжа, не маглі бачыць алтар. Эвалюцыя хрысціянскай царквы ў V ст. знайшла адлюстраванне ў перамяшчэнні галоўнай літургіі ў цэнтральную прастору, утвораную перасячэннем узаемна перпендыкулярных аб'ёмаў. Ядро кампазіцыі, так званае сяродкрыжжа, пачалі перакрываць крыжовым скляпеннем альбо купалам, які сімвалізаваў нябесную сферу. З цягам часу структура раннехрысціянскага храма паступова мадэрнізавалася.

Для павелічэння ўнутранай прасторы храма стала ўжывацца базілі ка — тып свецкага антычнага збудавання, якое мае адметную структуру. Гэта прамавугольнае ў плане збудаванне, падзеленае радамі апорных слупоў на няцотную колькасць падоўжных памяшканняў (нефаў), з якіх сярэдні абавязкова павінен быць больш высокім за бакавыя і мець двухбаковае верхняе асвятленне. Такім чынам, у папярочным напрамку збудаванне абавязкова мае так званае «базілікальнае сячэнне», што дазваляе зручнае асвятленне абшырнага інтэр'ера, а прамавугольны план — яго неабмежаваныя памеры. Архітэктоніка базілікі давала магчымасць найбольш зручна рэалізаваць лінейна-прасторавае развіццё літургічнага дзеяння, што ад-

павядала зменам у хрысціянскім разуменні гістарычнага часу параўнальна з язычніцтвам. Базіліка ў прасторы і часе ўвасабляла шлях ад Старога Запавету да Новага, адпаведна чаму складаліся яе часткі з захаду на ўсход: нартэкс — для неафітаў, наас — для вернікаў і алтарная частка — для святароў.

Генетычна базіліка паходзіць з Малой Азіі і як архітэктурны тып атрымала пашырэнне яшчэ ў грамадзянскай архітэктуры антычнага свету. Тэрмін «базіліка» этымалагічна паходзіць ад тытула візантыйскага імператара, які зваўся «Васілеўс», і азначае «дом цара». У хрысціянскім храмабудаўніцтве базіліка з паняцця «дом цара зямнога» семантычна пераўтварылася ў «дом Цара Нябеснага», «Дом Божы». У гэтым сэнсе ў клерыкальнай літаратуры тэрмін «базіліка» іншы раз атаясамліваецца з больш шырокімі паняццямі «сабор» ці «царква», што не ахоплівае яе архітэктурнай тыпалагічнай адметнасці. Велічны раннехрысціянскі храм у Калат-Семан (Сірыя), пабудаваны ў V ст. н. э., складаўся з чатырох аднолькавых базілік, пастаўленых у выглядзе крыжа па баках свету з вялізным купалам у цэнтры кампазіцыі.

У спецыфіцы архітэктуры як віда чалавечай дзейнасці галоўным з'яўляецца спосаб перакрыцця прасторы, што азначае падзел прасторы на вонкавую і ўнутраную з дапамогай будаўнічых канструкцый. Таму ў вывучэнні генезісу тыпалогіі хрысціянскага храма вельмі важным з'яўляецца выяўленне паходжання і характару эвалюцыі перакрыцця сакральнай прасторы — скляпенняў розных тыпаў і купалоў. Не менш важным з'яўляецца тэктоніка нясучых канструкцый. Паміж планавымі схемамі збудаванняў і структурай перакрыццяў існуе дакладная ўзаемная абумоўленасць, што выпрацоўвалася будаўнічай традыцыяй і творчым наватарствам. Характар скляпенняў не толькі вызначаўся планавай схемай збудавання, але ў працэсе станаўлення пэўнага канона сам абумоўліваў тую ці іншую планавую схему. Канон праваслаўнай царквы альбо каталіцкага касцёла — гэта ўстойлівае спалучэнне архітэктонікі культавага збудавання з сістэмай пэўных рэлігійных сімвалаў, што ў сукупнасці ствараюць мастацкі вобраз і семантыку храмабудаўніцтва адпаведнай канфесіі.

Найбольш рана хрысціянства набыло дзяржаўны статус у краінах Закаўказзя: у Арменіі — у 301 г., у Грузіі — у 317 г. У 313 г. рымскі імператар Канстанцін I Вялікі абвясціў у Медыялане свой славуты эдыкт, адпаведна якому прызнавалася роўнасць хрысціянства з іншымі рэлігіямі імперыі. Пры ім жа ў 330 г. на месцы старажытнай грэчаскай крэпасці Візантый была закладзена новая сталіца, названая ў гонар імператара Канстанцінопалем. У яе закладцы і асвяшчэнні прымала ўдзел хрысціянскае духавенства. У 392 г. пры імператары Феадосіі хрысціянства стала адзінай дзяржаўнай рэлігіяй. Праз тры гады, у 395 г., Рымская імперыя падзялілася на Усходнюю і Заходнюю. Менш чым праз стагоддзе, у 476 г., Заходняя Рымская імперыя перастала існаваць.

У розных рэгіёнах Усходу і Захаду Еўропы амаль адначасова пачалася выпрацоўка свайго самастойнага тыпу хрысціянскага храма. У складаным працэсе фарміравання асноўных архітэктурных тыпаў раннехрысціянскага храма вызначальным з'явілася прызнанне ў IV ст. формы крыжа сімвалам Хрыста, а затым асвячэнне Царквою адзінства сімвалаў Хрыста і Неба — крыжа і купала.

Раннехрысціянскае храмабудаўніцтва адмовілася ад апорна-бэлечнай сістэмы антычных грэчаскіх і рымскіх ордэраў і за аснову нясучых храмавых канструкцый узяло рымскую арку. Аркай у архітэктуры ў шырокім сэнсе завецца жорсткая прасторавая канструкцыя крывалінейнага абрысу для перакрыцця пралёту паміж апорамі, якая мае датычны бакавы распор. Лічыцца, што арачныя канструкцыі існавалі ў дойлідстве шумераў, але гэта толькі гіпотэза. У найбольш старажытных цывілізацыях, напрыклад крыта-мікенскай, існавалі «несапраўдныя» аркі (без бакавога распору), утвораныя паступовым кансольным напускам верхніх гарызантальных камянёў, якія трымаліся ўласным цяжарам. Яны дазвалялі павялічыць вышыню пралёта (звычайна ўваходнага партала), але не стваралі ўстойлівую ўзаемазвязаную канструкцыю.

Класічную, паўцыркульную паводле абрысу арку, якая складаецца з асобных блокаў (камянёў, цаглін), а ў шалызе замыкаецца клінавата-падобным «замковым» камянём, вынайшлі будаўнікі Старажытнага Рыма — і гэта было вялікае вынаходніцтва ў працэсе эмпірычнага засваення асноў статыкі збудаванняў, іх устойлівасці і трываласці. Падобная канструкцыя прасторава больш жорсткая і трывалая, чым простая прамавугольная канструкцыя з апорных слупоў, злучаных бэлькай, накшталт класічных грэчаскіх ордэрных сістэм. Да таго ж, яна ў большай ступені за іх адпавядае прыродзе каменя як будаўнічага матэрыялу, які лепей працуе на сціск, чым на выгіб.

Радыус паўкружжа рымскай аркі роўны палове пралёту паміж апорамі, на якія яна абапіраецца «пятамі». Чым большы пралёт аркі, тым больш масіўнымі павінны быць апоры. Дзеля візуальнага змяншэння масіўнасці апор, іх звычайна афармлялі пэўным ордэрам. Адкрыццё аркі дазволіла старажытным рымлянам зрабіць якасна новы крок у архітэктуры, стварыць іх славутыя акведукі і такія складаныя шмат'ярусныя арачныя кампазіцыі, як Калізей — сапраўдны шэдэўр будаўнічага мастацтва антычнага свету, дзе арка выступае ў сукупнасці з аформленымі ордэрам апорамі.

Аднак рымляне выкарыстоўвалі арку не толькі як уласна нясучую канструкцыю, але і як разгрузачную. Напрыклад, схаваныя ў тоўшчы муроўкі паўкружжы арак можна бачыць на барабане магутнага паўсферычнага купала Пантэона дыяметрам 43,4 м, узведзенага ў 120—124 гг. н. э. Гэты ўзор антычнага інжынернага мастацтва да XIX ст. заставаўся непераўзыдзеным па памерах. Велічны купал Пантэона перадаваў распор на масіўны барабан, які абапіраўся па ўсяму перыметру

на сцены ніжняга цыліндрычнага аб'ёму. Тут аркі, зробленыя ў роўніцу з агульнай паверхняй барабана, выконваюць ролю разгрузачных канструкцый, якія змяншаюць ціск купала на вонкавыя сцены. Тую ж ролю выконвае і схаваная ўнутры барабана Пантэона арачная галерэя, якая адначасова робіць яго больш лёгкім і прасторава жорсткім, што пэўным чынам папярэднічае канструкцыі аркбутанаў часоў готыкі.

У абодвух культурных арэалах Усходняй і Заходняй Рымскай імперыі раннехрысціянскае дойлідства кананічна абапіралася на сімволіку крыжа, роля якой у эвалюцыі храмабудаўніцтва, нягледзячы на сваю відавочнасць, яшчэ не дастаткова раскрыта. Пытанне пра паходжанне тыпу крыжова-купальнага храма, успрынятага Руссю разам з хрысціянствам, застаецца адкрытым. Напрыклад, А. Л. Якабсон сцвярджае: «Крыжова-купальная кампазіцыя з'явілася ў раннім сярэднявеччы ў Візантыі, але ў якой з дзяржаў вялікай імперыі — дакладна невядома, і вырашыць гэтае пытанне пакуль немагчыма» [167. С. 9—10]. Ён лічыць, што ў VI ст. адбылося зніцаванне базілікі з цэнтральна-купальнай кампазіцыяй у выглядзе купальнай базілікі, а яе развіццё прывяло да фарміравання крыжова-купальнага храма. У прадстаўленым гэтым даследчыкам генезісе крыжова-купальнага храма крыж з'яўляецца амаль выпадкова на апошнім этапе развіцця азначанай кампазіцыі. Але відавочна, што першаснымі ў генезісе раннехрысціянскага будаўніцтва ў цэлым і ўсходнехрысціянскага ў прыватнасці былі менавіта крыж і характар перакрыцця сяродкрыжжа.


Сімволіка крыжа, які з'яўляецца формай утылітарна распаўсюджанай і эстэтычна дасканалай, надзвычай шматгранная і старажытная. Яна зыходзіць далёка ў дахрысціянскія часы. Сярод шматлікіх яе варыянтаў дамінантным з'яўляецца трактоўка крыжа як сімвала цярпення і пакутніцтва, у хрысціянстве — ачышчэння праз пакуты Хрыста. Адным з найбольш прыгожых і змястоўных тлумачэнняў трансфармацыі старажытнай паганскай сімволікі крыжа ў хрысціянскую з'яўляецца гіпотэза французскага вучонага-этнолага А. Мальвера. Яна выводзіць паходжанне формы і сімволікі крыжа з дзвюх перакрыжаваных драўляных палачак, трэннем якіх першабытны чалавек здабываў агонь. Каб дапамагчы з'яўленню агня, ён раздуваў першыя іскры. Так з'явілася першасная сімволіка: агонь — Бог-Айцец, подых — Святы Дух, крыж — пакуты Хрыста, які ахвяруе сабою дзеля чалавецтва. Гэта адна з версій, якая, аднак, выдатна інтэрпрэтуе трыадзіную Божую іпастась хрысціянства ў сімволіцы крыжа.

Архітэктурная прастора, аформленая ў выглядзе крыжа, як адзначана вышэй, таксама мела сімвалічнае асэнсаванне, практычнае утылітарнае прызначэнне і паступовую эмпірычную выпрацоўку сістэмы перакрыццяў. Відавочна, што пры перасячэнні двух узаемна перпендыкулярных аб'ёмаў прамавугольнага перыметра ўтвараецца ўнутраная прастора, званая сяродкрыжам. Пры роўнай шырыні аб'ёмаў

сяродкрыжжа ў плане мае цэнтрычную форму квадрата і можа быць перакрыта розным чынам. У Заходняй і Усходняй Рымскай імперыі былі распрацаваны розныя спосабы перакрыцця цэнтра кампазіцыі крыжовых у плане культавых збудаванняў, што пэўным чынам і абумовіла ў далейшым розную архітэктурную тыпалогію праваслаўнага і каталіцкага храмаў эпохі сярэднявечча.

Канструкцыйнай асновай хрысціянскага храмабудаўніцтва раманскага арэала стала крыжовае скляпенне, запазычанае з рымскай антычнасці. Крыжовае скляпенне ўтвараецца пры перасячэнні двух цыліндрычных скляпенняў аднолькавага пралёту і вышыні, калі яны сыходзяцца ў цэнтры верхнімі кропкамі — шалыгамі. Распор крыжовага скляпення прыходзіцца не на вонкавыя сцены, як у цыліндрычных скляпеннях, а лакальна на чатыры кропкі апоры па вуглах квадрата сяродкрыжжа. Гэта ажыццяўляецца з дапамогай прасторава жорсткіх дыяганальных рэбраў, якія ўтвараюцца пры сутыкненні трохвугольных у плане фрагментаў цыліндрычных скляпенняў — распалубак.

На працягу V—XI стст. у сакральным дойлідстве краін Заходняй Еўропы адбылося знітаванне цэнтрычна-крыжовай кампазіцыі раннехрысціянскага храма з базілікай, далучанай да яго толькі з аднаго заходняга ўваходнага боку, што дазволіла значна павялічыць умяшчальнасць раманскіх сабораў дзякуючы неабмежаваным магчымасцям прамавугольнага плана. Выкарыстанне тут базілікі было зусім невыпадковым, таму што яна была вядома яшчэ ў Старажытным Рыме як тып грамадзянскага збудавання (суда, біржы), якое патрабавала значнай умяшчальнасці, напрыклад базіліка імператара Максенцыя (IV ст. н. э.). У выніку азначанага



Мал. 65. Сабор Санта-Марыя Маджоры ў Пізе. XI—XII стст.

спалучэння ў арэале раманскай архітэктуры, яшчэ да расколу хрысціянскай царквы на каталіцкую і праваслаўную канфесіі, сфарміраваўся храмавы варыянт крыжовай базілікі.


У аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі раманскай базілікі дамінавалі больш высокі і шырокі цэнтральны неф і роўны з ім па вышыні і шырыні папярочны неф (трансепт), якія ў верхнім сячэнні збудавання ўтваралі план у выглядзе выцягнутага ў заходнім кірунку крыжа, пазней названага ў гісторыі архітэктуры «лацінскім». Сяродкрыжжа перакрывалася крыжовым скляпеннем, а звонку вылучалася масіўнай чацверыковай вежай, завершанай востраверхім шатром. Уласна базіліка складалася з няцотнай колькасці падоўжаных нефаў, падзеленых апорамі на шэраг квадратных у плане прасторавых ячэек (травей), якія, таксама як і сяродкрыжжа, перакрываліся крыжовымі скляпеннямі.

З захаду, з боку ўвахода, геаметрычна неабмежаваную дынаміку раманскай базілікі спыняў высокі і плоскі (па шырыні роўны кроку травей) аб'ём фасада-нартэкса з дзвюма магутнымі чацверыковымі вежамі па баках, напрыклад сабор Сан-Трыніта ў Кане (Францыя, XI ст.). Вельмі падобнае 2-вежавае вырашэнне фасада-нартэкса мела ўжо раннехрысціянская базіліка ў Турманіне (Сірыя, V ст. н. э.). Іншы раз востраверхія шатровыя вежы ўзводзіліся на рамёнах крыжа, па баках свету: саборы ў Майнцы і манастыры Лаах (Германія, XI—XIII стст.).

Вырашэнне ўсходняй алтарнай часткі раманскіх сабораў магло быць самае разнастайнае: за трансептам нефы маглі завяршацца асобнымі апсідамі, шэрагам капэл, абхадной галерэяй і інш. Агульным было дамінантнае становішча магутнага алтарнага завяршэння цэнтральнага нефа (прэсбітэрыя), што з цягам часу стала вызначальным.

Найбольшую складанасць для заходнееўрапейскіх дойлідаў гэтага перыяду ўяўляла перакрыццё вялікага пралёту травей цэнтральнага нефа (звычайна ўдвая большага за бакавыя). Удасканаленне канструкцый скляпенняў ішло паступова, эмпірычным шляхам, са шматлікімі разбурэннямі, што зафіксавана ў гістарычных хроніках. Канцэнтрацыя канструкцыйных нагрузак на рэбры крыжовага скляпення дазволіла зменшыць яго масу і адпаведна масіўнасць апорных канструкцый, што адкрывала шлях да канструкцыйных дасягненняў готыкі.

Крок у новую эпоху хрысціянскага храмабудаўніцтва Заходняй Еўропы, эпоху готыкі, быў зроблены ў канцы XII ст. менавіта заменай яшчэ адносна важкаватага крыжовага скляпення нярвюрным скляпеннем на аснове каркаса з перакрыжаваных стральчатых арак з лёгкім запаўненнем. Адносная лёгкасць рабрыстых нервюрных скляпенняў і сістэма пагашэння іх распору з дапамогай вонкавых аркбутанаў і контрфорсаў дазволілі зрабіць храмы заходнееўрапейскай готыкі, пабудаваныя пераважна з натуральнага каменя, неверагодна высокімі, прасторнымі. У мастацка-семантычным вобразе храма адну з галоўных ролей адыгрывае асвятленне сакральнай прасторы, якое ў за-



Мал. 66. Сабор Нотр-Дам у Парыжы. XII—XIII стст.

ходнееўрапейскай архітэктуры вырашалася верхнім двухбаковым асвятленнем цэнтральнага нефа базілікі і вялікімі вокнамі бакавых нефаў. Дзякуючы зніжэнню цяжару скляпенняў і вонкавых сценаў былі павялічаны памеры аконных праёмаў, што стварыла спрыяльныя ўмовы для развіцця мастацтва шматколернага сюжэтнага і дэкаратыўнага вітража.

Купал у раманскай і гатычнай архітэктуры ўвогуле не ўжываўся. На той час ён прысутнічае толькі ў архітэктуры Апенінскага паўвострава, што знаходзілася пад культурным уплывам Візантыйскай імперыі: у саборы Св. Марка ў Венецыі (1043—1085), саборах Равэны і Пізы.


Ва Усходняй Рымскай імперыі з яе шматлікімі правінцыямі, якія мелі даўнія ўласныя будаўнічыя традыцыі, што паходзілі непасрэдна з моцна арыенталізаванай эліністычнай культуры, эвалюцыя раннехрысціянскага храма на першапачатковым этапе дала значна больш разнастайную архітэктурную тыпалогію. Але сакральную архітэктуру розных візантыйскіх рэгіёнаў аб'ядноўвае шырокае і разнастайнае выкарыстанне арачных канструкцый, цыліндрычных скляпенняў і купалоў, якія сістэмна і паслядоўна ўраўнаважваюць адзін аднаго.

Ад старажытных рымлян арка перайшла ва Усходнюю Рымскую імперыю і была выдатна засвоена візантыйскімі будаўнікамі. Але, калі ў Старажытным Рыме арачныя канструкцыі выконваліся са зручнага ў апрацоўцы прыроднага каменя, пераважна вапняковых марскіх адкладаў, якімі багаты Апенінскі паўвостраў, то ў Візантыі асноўным будаўнічым матэрыялам з'яўлялася штучная цэгла-плінфа, зробленая з абпаленай гліны. Гэта паўплывала на тэхналогію арачных канструкцый, а таксама спецыфіку іх ужывання і характар перакрыцця прасторы храма. Візантыйскія майстры, са свайго боку, дасягнулі высокага прафесійнага ўзроўню ва ўзвядзенні мураваных з плінфы цыліндрыч-


ных скляпенняў невялікага пралёту і паўсферычных купалоў на ветразях, распор якіх перадаваўся на падпружныя аркі, размешчаныя па чатырох баках падкупальнага квадрата. З дапамогай гэтых канструкцый ажыццяўляўся пераход ад квадратнага плана да падкупальнага кольца ці барабана.

У першай палове V ст. у Равэне, што знаходзіцца на Адрыятычным узбярэжжы Апенінскага паўвострава (каля Венецыі), было зроблена выдатнае будаўнічае вынаходніцтва. Для перакрыцця цэнтральнай прасторы крыжападобнага збудавання маўзалея Галы Плацідзіі, жонкі імператара Ганорыя (440), было ўжыта поўнае ветразевае скляпенне, якое ўяўляе прынцыпова іншы варыянт перакрыцця квадрата сяродкрыжа (параўнальна з раманскім крыжовым скляпеннем). У гэтым выпадку цыліндрычныя скляпенні рамёнаў крыжа не зыходзяцца шалыгамі ў цэнтры, а спыняюцца па баках сяродкрыжжа падпружнымі аркамі, якія аб'ядноўваюцца паміж сабою прасторавымі трохкутнымі абалонкамі, званымі ветразямі. На ўзроўні шалыгаў скляпенняў яны аб'ядноўваюцца агульным кольцам, на які абапіраецца сферычны купал. З дапамогай ветразяў нагрузка купала, таксама як і крыжовага скляпення, размяркоўваецца на чатыры апоры па вуглах квадрата сяродкрыжжа. Менавіта гэты тып ветразевага купальнага перакрыцця з пэўнымі мадыфікацыямі стаў асновай далейшага развіцця візантыйскай, а пазней і старажытнарускай праваслаўнай архітэктуры.


Росквіт раннехрысціянскага дойлідства ў Візантыйскай імперыі прыпадае на першую палову VI ст., часы праўлення імператара Юстыніяна. У Равэне, якая пры Юстыніяне стала цэнтрам заходняй правінцыі Візантыі, будуюцца зусім розныя па тыпалогіі культавыя збудаванні. Царква Св. Апалінарыя (534–539) уяўляла сабою тып звычайнай базілікі з драўляным бэлечным перакрыццем і частым крокам шматлікіх калон. Адначасова тут будуецца царква Св. Віталя (526–547), якая ўяўляе найбольш завершаны варыянт цэнтрычнага храма з васьміграннай асновай плана. У сталіцы імперыі — Канстанцінопалі — таксама амаль адначасова будуюцца царква Святых Апосталаў і Сафійскі сабор. Першая з іх прадстаўляе найбольш прасторава развіты і даскана-



Мал. 67. Сабор Св. Марка ў Венецыі. XI ст. План



Мал. 68. Сафійскі сабор у Канстанцінопалі. VI ст. План



Мал. 69. Мазаіка "Ісус Хрыстос". Сафійскі сабор у Канстанцінопалі

лы варыянт цэнтрычна-крыжовага раннехрысціянскага храма з пяццю купаламі: над сяродкрыжжам і над рамёнамі крыжа, арыентаванымі па баках свету, з адной вылучанай круглай у плане алтарнай апсідай.


Вышэйшым дасягненнем храмабудаўніцтва Візантыйскай імперыі з'явіўся Сафійскі сабор у Канстанцінопалі, узведзены ў 532–537 гг. дойлідамі Анфіміем з Трал і Ізідорам з Мілета. Вядома, што імператар Юстыніян, які загадаў пабудаваць храм у гонар Іпастаснай Прамудрасці Божай — Сафіі, у захапленні ад яго велічы закрычаў: «Я пераўзышоў цябе, Саламон!» Сама канструкцыйная дасканаласць канстанцінопальскай Сафіі, на думку даследчыкаў, сведчыць пра наяўнасць развітых будаўнічых традыцый, якія паходзяць, хутчэй за ўсё, з Малой Азіі, як і дойліды — стваральнікі гэтага архітэктурнага шэдэўра.

У плане сабор — слаба выцягнуты прамавугольнік. У цэнтры яго размешчаны вялізны падкупальны квадрат, які, аднак, не з'яўляецца сяродкрыжжам, таму што папярочны неф тут адсутнічае. Цэнтральны купал абапіраецца на чатыры падпружныя аркі абапал падкупальнага квадрата і сферычныя ветразі. З усходу і захаду яго распор пагашаецца адваротным распорам паўкупалоў вялікіх храмавых частак, якія развіваюць інтэр'ер сабора па падоўжнай восі, завершанай з усходу адной паўкруглай алтарнай апсідай. З паўночнага і паўднёвага бакоў распор цэнтральнага купала ўспрымаюць магутныя арачныя канструкцыі бакавых нефаў. Унікальная архітэктоніка канстанцінопальскай

Сафіі не паддаецца дакладнаму вызначэнню яе тыпалогіі — гэта не купальная базіліка і не крыжова-купальны храм: у ёй незвычайным чынам спалучыліся элементы цэнтральна-купальнай і базілікальнай структуры.

У складанай архітэктоніцы Сафійскага сабора ў Канстанцінопалі быў дасканала рэалізаваны асноўны прынцып візантыйскай сакральнай архітэктуры — забеспячэнне канструкцыйнай устойлівасці збудавання з дапамогай узаемнага пагашэння распору скляпенняў, што дазволіла перакрыць рабрыстым купалам на ветразях найвялікшы на той час у свеце пралёт — 33 м. Купал падтрымліваюць магутныя прамавугольныя пілоны, выкананыя з натуральнага каменю дзеля большай трываласці. Вонкавыя сцены з вялікапамернай абпаленай цэглы — плінфы, а рэбры купала — са спецыяльнай, больш лёгкай і трывалай пемзавай цэглы. Усё гэта сведчыць аб дакладным разліку нагрузак на тэктанічныя канструкцыі.


Унутры сцены аздоблены шматкаляровым паліраваным мармурам з багатай гамай адценняў. Паверхні купалоў і скляпенняў пакрыты мазаікамі з выявамі святых на залатым фоне, што сімвалізуе святло Божай мудрасці. Архітэктурнае вырашэнне цэнтральнага купала, дзе паміж канструкцыйнымі рэбрамі размешчаны 40 светлавых праёмаў, забяспечвае незвычайнае асвятленне ўнутранай прасторы. Пра купал канстанцінопальскай Сафіі візантыйскі пісьменнік VI ст. Пракопій адзначаў: «Здаецца, што ён не ляжыць на каменным муры, а звісае з неба



Мал. 70. Мазаіка "Маці Божая з дзіцём". Сафійскі сабор у Канстанцінопалі

на залатым ланцугу». Яго сучаснік тэолаг Евагры Схаластык пісаў, што купал Сафіі — «гэта купал Неба на Зямлі». Такім чынам, канстанцінопальская Сафія выступала для сучаснікаў як новая мадэль Сусвету.

Само ўзвядзенне Сафійскага сабора ў Канстанцінопалі стала сімвалам узвышэння Візантыйскай імперыі. У планіроўцы сабора адлюстраваны іерархічная дыферэнцыяцыя грамадства і спецыфіка раннехрысціянскага набажэнства. Асноўныя літургічныя дзеянні адбываліся ў прасторы пад купалам. Першыя купальныя храмы Візантыі не мелі светлавых барабанаў — купал размяшчаўся непасрэдна на апорным кольцы, якое падтрымлівалі падпружныя аркі, і на ветразях. Пазней



Мал. 71. Інтэр'ер Сафійскага сабора ў Канстанцінопалі. Малюнак XIX ст.

для лепшага асвятлення падкупальнай прасторы паміж купалам і апорным кольцам пачалі ўзводзіць вертыкальныя аб'ёмы з вокнамі, так званыя барабаны.

Такім чынам, ужо па свайму генезісу барабаны купалоў мусілі быць абавязкова светлавымі. У далейшым яны ўжываліся аднолькава ў адметных па архітэктурнай тыпалогіі візантыйскіх шматкупальных храмах: цэнтрычна-крыжовых з купалам, крыжова-купальных і купальных базіліках. Даследчыкі зазначаюць, што візантыйскія тэолагі, а ўслед за імі — візантыйскія дойліды былі проста апантаны ідэяй купала і яго нябеснай сімволікі, таму што не было больш дакладнага зрокавага ўвасаблення Неба, як купал.

Пашырэнне цэнтрычна-крыжовай з купалам кампазіцыі ў V—VII стст. адбылося не толькі ў сталіцы Візантыі, але і ў Малой Азіі, Сірыі, Закаўказзі. Высокага ўзроўню хрысціянскае будаўніцтва дасягнула ў Арменіі, дзе былі створаны шматлікія цэнтрычна-купальныя храмы з крыжападобнай формай плана. Тут мелі пашырэнне адметныя кампазіцыі храмаў, званыя тэтраконхамі, у якіх рамёны крыжа замянялі паўкруглыя аб'ёмы (апсіды), перакрытыя купалам у выглядзе чвэрці сферы (конхай). План тэтраконха, такім чынам, нагадвае чатырохпялёсткавую кветку і прыкладам гэтаму — славутыя цэрквы Арменіі ў Эчміядзіне (V ст.), Багаране і Звартноце (VII ст. н. э.).

У VII—VIII стст. у хрысціянскім будаўніцтве Закаўказзя атрымаў пашырэнне яшчэ адзін адметны тып храмавай кампазіцыі, так званыя купальныя базілікі. Але відавочна, што прамавугольная ў плане структура ўласна базілікі, якая складаецца з шэрага аднолькавых прасторавых частак, не прыдатная для размяшчэння на ёй купала. Дзеля гэтага неабходна абавязкова зрабіць крок калон базілікі роўным пралёту, каб утварыць падкупальны квадрат, узмацніць на яго вуглах апоры і такім чынам парушыць натуральную прыроду базілікі. Але па патрабаванню мясцовага духавенства ў Грузіі атрымаў распаўсюджанне тып базілікі, дзе цэнтральны неф быў разбіты пілонамі на шэраг квадратаў, што дазваляла ўзвесці купал над кожным з іх. Напрыклад, базіліка ў Гурджаані, VIII ст., мела два купалы, рытмічна размешчаныя над цэнтральным нефам. Бакавыя нефы перакрываліся цыліндрычнымі скляпеннямі. Купальныя базілікі Закаўказзя звычайна мелі адну вялікую шматгранную апсіду. Шматграннымі былі і светлавыя барабаны купалоў, што надавала іх архітэктуры мастацкае адзінства і суровы аскетызм.

З канца VII ст. палітычнае становішча Візантыйскай імперыі значна пагоршылася. Яна страціла амаль трэць сваіх уладанняў, сярод іх Сірыю і Палесціну. На Балканах узніклі Дунайская Булгарыя (сучасная Балгарыя) і шэраг іншых славянскіх краін. У гэты час у Візантыйскай імперыі выспелі феадальныя адносіны, якія прыйшлі на змену рэшткам антычнага рабаўладальніцтва. Новы ўздым Візантыйскай імперыі звязаны з праўленнем Македонскай дынастыі (867—1057). Гэты перыяд у гісторыі завецца ся-

рэдневізантыйскім. Кансалідацыя ўлады ў нейкай ступені спрыяла выпрацоўцы адзінага цэласнага па архітэктанічнай задуме тыпу храма, названага ў мастацтвазнаўстве крыжова-купальным.

Велічныя храмы перыяду росквіту Візантыйскай імперыі ў сярэдневізантыйскі перыяд замянілі больш сціплыя па памерах культавыя пабудовы, прататыпам якіх з'явілася царква «па-за сценамі Русафы», пабудаваная ў канцы VI ст. Усходнехрысціянскі храм захаваў папярэднюю цэнтрычнасць кампазіцыі, але візантыйскія дойліды творча развілі яе. З'яўленне светлавых барабанаў і павелічэнне разам з гэтым нагрузкі ад купала прымусіла зменшыць памеры пралёта падкупальнага квадрата і ўдасканаліць сістэму ўзаемнага пагашэння распору скляпенняў. Ва ўнутраных вуглах крыжа з'явіліся чатыры дадатковыя аб'ёмы (кампартыменты), злучаныя арачнымі праёмамі з асноўнай унутранай прасторай і перакрытыя невялікімі купаламі, больш нізкімі за цэнтральны купал на сяродкрыжжы. Гэтыя вуглавыя купальныя часткі не толькі павялічвалі прастору малітоўнай залы, але і ўспрымалі распор цэнтральнага купала, што дазваляла забяспечыць яго асвятленне з дапамогай светлавога барабана. Як і ў папярэднія стагоддзі, у сярэдневізантыйскі перыяд літургічнае дзеянне адбывалася пад цэнтральным купалам, дзе размяшчаўся амбон, але ў гэты час яно стала больш паглыблена-малітоўным, менеі рэпрэзентатыўным і пышным.

Крыжовае ядро кампазіцыі магло і далей развівацца і абрастаць кампартыментамі пры захаванні яе цэнтрычнасці. Пры азначанай будове архітэктурных мас план храма ўнізе набыў форму квадрата (ці блізкую да яго), а не чыстага крыжа, як у раннехрысціянскім варыянце. Аднак з нагоды таго, што вуглавыя кампартыменты рабіліся больш нізкімі, план у верхнім падкупальным сячэнні збудавання захоўваў форму роўнаканцовага крыжа, які ў далейшым, у сувязі з паслядоўна праводзімай праваслаўем тэалагічнай праграмай, атрымаў назву «грэчаскага».

Адпаведна азначанай структуры крыжова-купальнага тыпу храма сфарміравалася і пяцігаловая будова вянчаючых мас — з чатырма купаламі, меншымі за цэнтральны, якія размяшчаліся па дыяганалях квадратнага плана, а не па баках свету, як раней. Так склалася традыцыйнае праваслаўнае пяцігалоўе, якое, відавочна, спачатку мела канструкцыйную аснову, а затым набыло сімвалічнае значэнне і ў больш познія часы стала знакавай прыкметай праваслаўнага храма, сімвалізуючы Уваскрашэнне Хрыста і чатырохевангелле. Дзякуючы гэтаму светлая падкупальная прастора становіцца значна вышэй і выразна вылучаецца цэнтр кампазіцыі. Астатнія кампартыменты храма звычайна перакрываліся цыліндрычнымі скляпеннямі невялікага пралёта, якія звaліся закамарамі, а дахавае пакрыццё, зробленае непасрэдна па іх, — пазакамарным. З гэтымі словамі этымалагічна звязана беларускае слова «камора» — памяшканне.

Аснову архітэктурна-мастацкай кампазіцыі крыжова-купальнага


храма складае кантраст магутнага адкрытага цэнтра, увенчанага купалам, з вузкімі бакавымі часткамі, падпарадкаванымі цэнтральнаму крыжоваму ядру. Усё гэта дазваляла зрабіць інтэр'ер храма больш урачыстым. З усходняга боку кожная прасторавая частка кампазіцыі звычайна завяршалася невялікай алтарнай апсідай. Магло быць ад адной да пяці і болей апсід, але найбольш пашыраным варыянтам былі тры алтарныя апсіды, якія ў сярэдневізантыйскай архітэктуры звычайна мелі трох- ці пяцігранную форму.

Неаднаразова адзначалася, што вонкавае дэкаратыўнае аздабленне візантыйскіх сабораў значна саступала кампазіцыйнай і канструкцыйнай дасканаласці архітэктонікі збудаванняў. Параўнальна з раманскімі саборамі, яны амаль не мелі скульптурнага дэкору, дробнай архітэктурнай пластыкі. Паколькі мацунак кожнай асобнай выраблена з абпаленай гліны цагліны быў значна меншым, чым каменнага блока, таму трываласць муроўкі з плінфы дасягалася большай масай сцяны і якасцю рошчыны, у той час як сцены з каменных блокаў былі больш тонкімі.

Каб зменшыць таўшчыню і цяжар сцен, не паслабляючы іх трываласці, візантыйскія будаўнікі пачалі ўключаць у муроўку глухія, заглыбленыя ў сцяне арачныя канструкцыі. Такія аркі завуцца разгрузачнымі — яны ўспрымаюць і размяркоўваюць нагрузку верхніх частак будынка, робяць сцяну больш прасторава жорсткай і ўстойлівай, утвараючы на яе паверхні плоскія арачныя нішы. Паколькі распор гэтых арак перадаецца не на асобныя апоры, а на ўсю сцяну, яны страчваюць ордэрнае аздабленне.

У сярэдневізантыйскім храмабудаўніцтве атрымалі пашырэнне перспектыўныя паўцыркульныя арачныя нішы, аформленыя шэрагам арак, радыусы якіх паступова змяншаюцца і яны заглыбляюцца ў сцяну. Падобныя аркі ўмацоўвалі і рабілі больш лёгкімі барабаны цэнтральнага купала і купалоў над вуглавымі кампартыментамі крыжова-купальнага храма, а таксама паўкружжы алтарных усходніх апсід. З цягам часу яны пераўтварыліся ў суцэльную метрычную аркаду, званую аркатурай, што сімвалізуе райскі сад (напрыклад, у цэрквах Маці Божай XI ст. і Святых Апосталаў XIII ст. у Салоніках). Такім чынам, паступова гэтыя архітэктурна-будаўнічыя элементы пераўтварыліся ў формы-сімвалы, а іх прапорцыі і рытм сталі ўспрымацца як элементы дэкаратыўна-вобразнага вырашэння.

Трэба адзначыць, што агульная тэктоніка і кожная дэталь, кожны слуп і арка, ветразі і барабаны купалоў, аркатурныя паясы, тры кананічныя алтарныя апсіды, што вылучалі ўсходнюю частку цэнтрычнай кампазіцыі, — літаральна ўсё ў асвечанай традыцыяй будове крыжова-купальнага храма мае сімвалічную трактоўку. Сакральна-семантычная праграма крыжова-купальнага храма дапаўнялася сюжэтным і арнаментальным роспісам, мазаікамі і інш. Сваёй завершанасці азначаная аб'ёмна-планавая схема культавага збудавання дасягнула ў паўночнай царкве манастыра Ліпса (908) у Канстанцінопалі.



Мал. 72. Паўночная царква манастыра Ліпса. Візантыя. X ст. План

У X ст. Візантыйская імперыя, якая падвяргалася ваеннай агрэсіі з боку турак, арабаў, нарманаў, усталявала трывалыя палітычныя, эканамічныя і культурныя зносіны з Балгарыяй, Маравіяй, Чэхіяй, Угрыяй і Руссю, якая выступала магутнай сілай ў грамадскім жыцці таго часу.

Для Візантыі, якая знаходзілася на больш высокай ступені духоўна-культурнага развіцця, саюз з ёю быў не менш патрэбным, чым для самой Русі. З гэтай мэтай пачынаюцца прапаганда хрысціянства сярод усходніх славян і адпаведныя палітычныя захады. Глыбокі ідэйны змест і ўрачыстая веліч візантыйскага абраду і сабораў сталі адной з прычынаў прыняцця хрысціянства ў X ст. усходнімі славянамі па візантыйскаму ўзору.

З разгледжаных вышэй шматлікіх архітэктанічных варыянтаў візантыйскага храмабудаўніцтва менавіта крыжова-купальны тып храма стаў асновай развіцця старажытнарускага сакральнага дойлідства. Ён разумеўся як вобраз і строга іерархічная мадэль Сусвету, а яго часткі: аркі, скляпенні, купалы — сталі ўстойлівымі архітэктурнымі формамі-сімваламі.

Відавочна, што працэс фарміравання архітэктурнага тыпу крыжова-купальнага храма адбыўся яшчэ да падзелу хрысціянскай царквы ў 1054 г. на праваслаўную і каталіцкую. Ён быў абумоўлены пэўнымі будаўнічымі дасягненнямі візантыйскіх майстроў па ўзвядзенню ўзаемна ўраўнаважанай сістэмы купалоў адносна невялікіх памераў і не меў яшчэ пазнейшай ідэалагічнай афарбоўкі.

2.4. Пачатковы перыяд старажытнарускага дойлідства

Пачатак мураванага хрысціянскага храмабудаўніцтва Старажытнай Русі з'яўляецца унікальнай з'явай у кантэксце сусветнай культуры. Яно пачалося не з прымітыўных пабудоў, паступовага эмпірычнага засваення новага будаўнічага матэрыялу, але адразу з велічных збудаванняў, якія вызначаліся высокімі тэхнічнымі і мастацкімі якасцямі, што ўвасаблялі шматвяковы вопыт мураванай архітэктуры Канстанцінопаля і розных правінцый Візантыі, балканскіх краін і Закаўказзя. Старажытнарускія дойліды адпачатку атрымалі ўяўленне аб сутнас-

ці архітэктуры і сродках уласцівага ёй адначасовага вырашэння утылітарных, ідэалагічных і эстэтычных задач, якія яны ў далейшым творча развілі.

Нават пры ўліку таго, што будаўнікамі першых рускіх храмаў былі грэкі, таксама як і стваральнікамі першых абразоў, мазаік і фрэскавых роспісаў, высокі ўзровень і хуткія тэмпы развіцця старажытнарускага сакральнага дойлідства сталі магчымымі толькі ва ўмовах дастатковага разумення яго глыбінной семантыкі. Як зазначае Г. Вагнер, прыведзеныя вышэй словы пасланцаў князя Уладзіміра, якія прысутнічалі на богаслужэнні ў канстанцінопальскай Сафіі, сведчаць «не толькі аб «прарыве свядомасці» рускіх людзей уверх, у сферу трансцэндэнтальнага, але і пра персаніфікаваны характар гэтага «прарыва», гэта значыць пра асобаснае ўяўленне абсалюта, і пра духоўнае адзінства з ім» [28. С. 23]. Гэта стала вызначальным для фарміравання новай духоўнай асобаснай свядомасці і самастойнай мастацкай творчасці.


У станаўленні асноўных відаў прасторавага мастацтва на пачатковым этапе разам з візантыйскімі майстрамі ўдзельнічалі найбольш таленавітыя людзі Старажытнай Русі, але пазней, з канца XI ст., пачынаецца сацыяльная і этнічная дыферэнцыяцыя гэтага працэсу. Пераемнасць даўніх будаўнічых традыцый у сакральным дойлідстве — складаны гістарычны працэс, які не тоесны прамому капіраванню кананічных формаў. Відавочна, што створаная ва ўсходнехрысціянскім арэале крыжова-купальная архітэктанічная кампазіцыя не стала строга абавязковым узорам для архітэктуры старажытнарускіх храмаў. У іх прысутнічаюць рысы, адпаведныя галоўнай візантыйска-праваслаўнай архітэктанічнай ідэі, але відавочна і значная свабода ў трактоўцы архітэктурных формаў. Гэтая варыябельнасць канона крыжова-купальнага храма была неабходнай і спрыяльнай для ўвасаблення ўласнай творчасці мясцовых дойлідаў, якая зыходзіла з асаблівасцей мясцовых будаўнічых матэрыялаў і традыцый народнага дойлідства.

Архітэктанічная сістэма крыжова-купальнага храма, пры ўсёй яе кананічнасці, з'яўляецца надзвычай гібкай: яна дазваляе па аднаму прынцыпу ўзвесці культавыя збудаванні з колькасцю апорных слупоў ад 4 да 16 і болей, што вызначаецца ступенню іх рэпрэзентатыўнасці. У сучаснай архітэктурнай археалогіі шырока ўжываецца тыпалагічная характарыстыка храмаў па колькасці апорных слупоў, прадстаўленых на планавай схеме, без дакладнага вызначэння агульнай архітэктанічнай структуры збудавання.

Звычайна, калі да крыжова-купальнай асновы храма з чатырма апорамі падкупальнага квадрата з захаду прыбудаваны нартэкс, аддзелены ад кампазіцыйнага ядра сцяной ці слупамі з арачнымі праёмамі, такі храм вызначаюць як 6-слуповы. Але гэта вызначэнне тыпалагічна недакладнае — падобны храм навукова карэктна вызначаць як крыжова-купальны, 4-слуповы, з нартэксам.


У іншым выпадку, пры ўвядзенні ва ўсходняй частцы перад алтарнай

апсідай дадатковай пары слупоў, якія ўтвараюць прасторавую ячэйку, званую вімай, што семантычна паходзіць яшчэ са Старога Запавета, такі храм патрэбна вызначаць як крыжова-купальны, 4-слуповы, з вімай. Недакладны і бессістэмны падлік апорных слупоў кампазіцыі прыводзіць да тэрміналагічнай блытаніны і шкодзіць навуковаму аналізу творчых метадаў старажытнарускіх дойлідаў.



У сучасным мастацтвазнаўстве ў развіцці манументальнага сакральнага дойлідства Старажытнай Русі вылучаюць два асноўныя перыяды. Першы з іх характарызуецца як дзяржаўна-мітрапалічны і прыпадае на X—XI стст. Мастацкі стыль сабораў гэтага часу іншы раз вызначаецца як «манументальны гістарызм» (Д. С. Ліхачоў), таму што ён найбольш адэкватна выяўляе дух «імперыі Рурыкавічаў». Другі перыяд характарызуецца як прыдворна-княжацкі ці епіскапскі, ахоплівае час з канца XI да сярэдзіны XIII ст. і звязаны з фарміраваннем лакальных мясцовых школ храмабудаўніцтва старажытнарускага перыяду.

Кіеўская мітраполія была заснавана ўжо пры князі Уладзіміры, і першай кафедральнай царквой у Кіеве стала царква Багародзіцы (Дзесяцінная), пабудаваная ў 989—996 гг. Яна ўжо не была «чыстым прадуктам» грэчаскага мастацтва і мела



Мал. 73. Дзесяцінная царква ў Кіеве. X ст.: план і рэканструкцыя

шэраг адметнасцей ад сярэдневізантыйскіх узораў. Яе архітэктура мела больш складаны генезіс, які звязваюць з балканскімі краінамі і Закаўказзем. Мяркуюць, што хрысціянская жонка князя Уладзіміра Ганна, сястра візантыйскага імператара Васілія II, армяніна па паходжанню, прывезла ў Кіеў шмат армянскіх будаўнікоў. У гэты ж час у Канстанцінопаль для аднаўлення купала Сафійскага сабора, што пацярпеў ад пажару, быў запрошаны армянскі дойлід Трдат.


Паводле «Спісу рускіх гарадоў», які ў XVI ст. унесены ў Наўгародскі летапіс, пазначана, што Дзесяцінная царква была аб «полутретьятцати версех», што тлумачыцца даследчыкамі як наяўнасць у ёй 25 купалоў. Архітэктанічна гэта быў трохнефавы трохапсідны 6-слуповы крыжова-купальны храм. Дадаткова Дзесяцінная царква мела ажно два экзанартэкса, што тлумачыцца вялікай колькасцю на той час хрысціян-неафітаў. Гэта надавала крыжова-купальнай аснове храма падоўжанасць. У інтэр'еры размяшчэнне дзвюх пар калонак паміж апорамі падкупальнага квадрата з паўночнага і паўднёвага бакоў цэнтральнага нефа яшчэ больш падкрэслівала падоўжную вось кампазіцыі, так званую «базілікальнасць».

Акрамя Дзесяцінай царквы ў гэты перыяд падобны прыём выкарыстаны толькі ў 4-слуповым крыжова-купальным Спаса-Праабражэнскім саборы Чарнігава (1030—1037), дзе рамёны крыжа з поўдня і поўначы аддзелены хорамі на дзвюх калонках паміж нясучымі апорамі падпружных арак, што падкрэслівае напрамак усход-захад і парушае тым самым зрокавае ўспрыняцце крыжовай прасторы. Яе «базілікальнасць» узмацняе наяўнасць вімы — дадатковай прасторавай ячэйкі перад алтарнай апсідай. Гэту адметнасць чарнігаўскага сабора П. Рапапорт трактуе як канстанцінопальскі ўплыў, а З. Сямёнава — як уплыў Закаўказзя. Аднак, на наш погляд, віма як старазапаветны элемент архітэктуры храмаў мела неабмежаваныя канкрэтна-геаграфічныя магчымасці выкарыстання.


Неабходна разгледзець пытанне пра два процілеглыя прынцыпы арганізацыі ўнутранай сакральнай прасторы: базілікальны (падоўжана прамавугольны) і крыжападобны, што выявіліся ўжо ў першых пабудаваных на Русі мураваных цэрквах XI ст.

Паняцце «базілікальнасць» устойліва выкарыстоўваюць для вызначэння падоўжанага лінейнага часова-прасторавага разгортвання кампазіцыі інтэр'ера, што характэрна для базілікі. Але тэрміналагічна гэта не зусім дакладна, таму што ў гэтым параўнанні не ўлічваюцца асноўныя архітэктанічныя характарыстыкі базілікі, такія як базілікальнае сячэнне і верхняе двухбаковое асвятленне. У выніку залішне вольнае выкарыстанне паняцця «базілікальнасць» часта прыводзіць да вызначэння базілікамі цэнтрычных па сваёй сутнасці крыжова-купальных храмаў, якія маюць прасторавае ядро кампазіцыі ў выглядзе роўнаканцовага крыжа (А. Кулагін, А. Лакотка, С. Тарасаў).

Увасабленнем манументальнага гістарызму, сімвалам дзяржаўнасці і



новага хрысціянскага разумення будовы Сусвету стала ўзвядзенне трох велічных Сафійскіх сабораў: у Кіеве (1017—1037), Ноўгарадзе (1045—1052) і Полацку (1044—1066). «Манументальны гістарызм» Сафійскіх сабораў даследчыкі бачаць не толькі ў тым, што ў іх была яскрава ўвасоблена ідэя дзяржаўнасці, але і ў тым, што тут архітэктурна-мастацкімі сродкамі фізічная катэгорыя «вялікага» (па абсалютных памерах) трансфармавана ў эстэтычную катэгорыю «велічнага».



Мал. 74. Спаса-Прабражэнскі сабор у Чарнігаве. XI ст.: план і падоўжны разрэз

Сама колькасная траістасць сакральных збудаванняў аднаго тыпу і прызначэнне іх агульнай ідэі робіць гэтую з'яву заканамернасцю, устойлівым храналагічным зрэзам жыцця грамадства. Відавочна, што будаўніцтва Сафійскіх сабораў на ўсходнеславянскіх землях было не адзінкавым актам, а мэтанакіраванай праграмай дзеянняў, па сваёй сутнасці, пасвячэннем Русі патранату Прамудрасці Божай — вышэйшай сакральнай ідэі. Менавіта ў гэтым пасвячэнні могуць адзначацца паралелі паміж усходнеславянскімі Сафійскімі саборамі і Канстанцінопальскай Сафіяй, але ні ў якім разе не ў іх архітэктанічнай кампазіцыі. Канстанцінопальская Сафія, безумоўна, уразіла славян велічным і ар-

ганічным спалучэннем набажэнства і архітэктурнай кампазіцыі, аднак пры гэтым яна не стала для іх «першавобразам» у аспекце архітэктурнай тыпалогіі, хаця б з прычыны таго, што іх падзялялі 5 стагоддзяў.


Сімвалічна трыяду Сафійскіх сабораў у Кіеве, Ноўгарадзе і Полацку можна параўнаць з міфічнымі трыма кітамі, на якіх, паводле старажытнай касмаграфіі, трымалася зямля. З кожнага з азначаных Сафійскіх сабораў у далейшым узраслі нацыянальныя школы манументальнага дойлідства трох вялікіх славянскіх народаў: рускіх, беларусаў і ўкраінцаў, таму заслугоўвае ўвагі параўнальны аналіз агульных і адметных творчых прыёмаў і мастацкіх формаў у архітэктуры кожнага з іх.

Усе старажытнарускія Сафійскія саборы пабудаваны па сістэме сярэдневізантыйскага пяцінефнага крыжова-купальнага храма з невялікімі творчымі варыяцыямі элементаў кампазіцыі: колькасці апорных слупоў, купалоў і алтарных апсід, прапорцый планаў і аб'ёмаў, будаўнічага модуля і г. д. Сакральная ўнутраная прастора ўсіх гэтых святынь выразна сфарміравана вакол падкупальнага квадрата ў выглядзе роўнаканцовага грэчаскага крыжа і ўвенчана велічным цэнтральным купалам на светлавым барабане. Тут у аб'яднанні формаў крыжа і купала праявілася высокая духоўная ідэя адзінства галоўных сімвалаў хрысціянскай царквы. Усходнехрысціянская рэлігійная сімволіка цэнтрычнай крыжападобнай унутранай прасторы дакладна выяўлялася і ў вонкавых масах збудаванняў. Таму тэндэнцыя вызначаць іх як «шматнефныя крыжова-купальныя базілікі», якая з'явілася ў беларускім мастацтвазнаўстве апошнім часам, з'яўляецца навукова неабгрунтаванай і недакладнай.

Сафійскі сабор у Кіеве, «мітраполія руская», пабудаваны пры князі Яраславе Мудрым, паводле розных летапісаў, паміж 1017 і 1037 гг., асвечаны ў 1050—1060-я гг. У XI—XII стст. ён неаднаразова ўпамінаецца ў летапісах як месца ўрачыстага пасаджэння на прастол кіеўскіх князёў і месца іх пахавання. У сваёй далейшай гісторыі сабор неаднаразова разбураўся і перабудоваўся. У пачатку XVII ст. абвалілася заходняя частка храма. У канцы XVII—пачатку XVIII ст. сабор перабудаваны ў стылі ўкраінскага барока.

Вывучэнне архітэктурнай гісторыі кіеўскага Сафійскага сабора і асабліва яе ранняга старажытнарускага этапу пачалося ў пачатку XIX ст. Найбольш грунтоўныя даследаванні праведзены ў сярэдзіне XX ст. як з пункту гледжання архітэктурнабудаўнічай археалогіі, так і мастацка-вобразнага аналізу архітэктуры сабора. Апошнім часам выяўлена, што вонкавыя абхадныя галерэі і вежы пабудаваны адначасова з асноўным ядром збудавання, а не прыбудаваны пазней, як устойліва лічылася раней.

Кіеўскі Сафійскі сабор прадстаўляе сабою кампазіцыйна развіты тып крыжова-купальнага храма — 5-нефавага, 12-слуповага, з пяццю паўкруглымі конхавымі апсідамі з усходняга боку. Памеры апсід розныя, але падпарадкаваны рытму і шырыні нефаў, якія яны завяршаюць. Абрыс вялікай апсіды цэнтральнага нефа



Мал. 75. Сафійскі сабор у Кіеве: план і ўсходні фасад, рэканструкцыя


ўнутры паўкруглы, звонку шматгранны, вуглы граняў аздоблены тонкімі паўкалонкамі. Разам з апсідамі параметры асноўнага аб'ёму сабора набліжаюцца да квадрата 29,3 × 29,5 м. Ад цэнтра падкупальнага квадрата (7,5 × 7,7 м) ядро кампазіцыі збудавання ўтварае дакладны роўнаканцовы грэчаскі крыж. Без уліку апсід кампазіцыя храма больш

развіта ў шырыню, што яшчэ дадаткова дапаўняецца двума пралётамі абхадных галерэй, якія абкружаюць асноўны аб'ём з трох бакоў.

Апорныя слупы, што вызначаюць архітэктоніку сабора, маюць выразную крыжападобную форму. Вынас бакавых частак слупоў, як і адпаведных ім лапатак вонкавых сцен, роўны палавіне таўшчыны ствала апорнага слупа альбо сцяны. Падобную форму апорных слупоў мела царква па-за сценамі Русафы ва ўсходняй правінцыі Візантыі. Лічыцца, што яна генетычна паходзіць з культуры Месапатаміі III тысячагоддзя да н. э. Менавіта археалагічныя раскопкі будынка ў шумерскім горадзе Ура з гэткімі ж крыжападобнымі слупамі, найбольш прыдатнымі для перакрыцця пралёта аркамі з сырцовай цэглы, далі падставы лічыць, што шумеры вынайшлі арачную канструкцыю на некалькі тысячагоддзяў раней за візантыйцаў.

Адзначым, што такая канструкцыя апор падпружных арак найбольш характэрная для ранняга перыяду старажытнарускай архітэктуры. Падобную форму слупоў маюць таксама Успенскі сабор Кіева-Пячорскага манастыра, Міхайлаўскі сабор Выдубіцкага манастыра і яшчэ некалькі цэркваў Кіева, Сафійскі сабор у Ноўгарадзе, але ў полацкім Сафійскім саборы форма і канструкцыя апор некалькі іншая, і менавіта яна становіцца найбольш пашыранай у далейшым ва ўсіх рэгіянальных школах старажытнарускага дойлідства.

Вялікія вынасы апорных канструкцый падпружных арак падзялялі ўнутраную прастору на больш адасобленыя часткі. Кампазіцыйна-канструкцыйнае чляненне інтэр'ера дапаўнялася яшчэ 12 меншымі слупамі, размешчанымі папарна ў два



Мал. 76. Сафійскі сабор у Кіеве. Падоўжны разрэз



Мал. 77. Сафійскі сабор у Кіеве. Сучасны выгляд

ярусы ў рамёнах цэнтральнага крыжовага ядра. Ніжнія слупы, якія падтрымлівалі хоры, мелі васьмігранную форму, а над імі размяшчаліся квадратныя ў плане і меншыя па вышыні слупы, злучаныя трайчастымі аркамі. Значная колькасць апор і вертыкальных плоскасцей карэнным чынам мяняла структуру і прапорцыі інтэр'ера, рабіла яго асобныя часткі больш выцягнутымі па вертыкалі, напаўняла іх дынамізмам і ўзнёсласцю. У гэтым можна адзначыць праявы «гатызма» — не як канструкцыйнай аналогіі заходнееўрапейскай готыкі, але адпаведнасці гатычнаму разуменню сакральнай прасторы. Дарэчы, арачныя канструкцыі кіеўскай Сафіі маюць злёгку стральчатую форму, гэта значыць стралу пад'ёма крыху большую за палову пралёта аркі.

Мастацкі вобраз інтэр'ера карэкціраваўся не толькі рытмам вертыкальных чляненняў, але і сродкамі манументальна-сакральнага мастацтва, шматлікімі паліхромнымі мазаічнымі і фрэскавымі кампазіцыямі. У консе алтарнай апсіды размешчана строга сіметрычная мазаічная выява Маці Божай Аранты, якая дапоўнена сіметрычнай кампазіцыяй Еўхарыстыі, размешчанай ніжэй. Тэма Уваскрашэння Хрыста адлюстравана ў інтэр'еры мазаікай з паясной выявай Спасіцеля на сферы купала. Галоўныя ў ідэйна-рэлігійнай іерархіі выявы Маці Божай і Хрыста прадстаўлены на залатым фоне, які выпраменьвае зіхатлівае святло, што, прынамсі, і сімвалізуе Прамудрасць Божую. Паясныя выявы святых, якія займаюць больш нізкае месца ў іерархічнай лесвіцы, размешчаны на сафітах арак і маюць блакітны фон. Захаваліся фрагменты вялікай кампазіцыі з выявамі членаў сям'і Яраслава Мудрага і іншыя свецкія сюжэты. Разам творы манументальна-дэкаратыўнага жывапісу кіеўскай Сафіі складаюць адзінае глыбока сімвалічнае мастацкае цэлае.


Параўнальна з адначасовымі сярэдневізантыйскімі ўзорамі крыжова-купальных храмаў XI ст., кіеўская Сафія вызначаецца значна большай увагай да вонкавай аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі збудавання. Яна пастаўлена на вышэйшай кропцы складанага рэльефу надпойменнага плато высокага правага берага Дняпра, сярод нізкай акаляючай драўлянай забудовы, і мела ўзнёслую трох'ярусную шматкупальную кампазіцыю архітэктурных мас. Ніжні ярус складалі 2-павярховыя адкрытыя абхадныя арачныя галерэі,

завершаныя гарызантальнай лініяй парапета. Яны ўключалі дзве лесвічныя вежы з вітымі ўсходамі. Другі ярус вянчалі паўкружжы закамар асноўнага аб'ёму. Адзначым, што тут закамары размяшчаліся не толькі адпаведна праекцыі цыліндрычных скляпенняў на бакавых вонкавых сценах, але і на ўсіх чатырох фасадах, у чым заключаецца прынцыповае адрозненне ад візантыйскіх узораў. Гэтая рыса — раўназначнасць усіх фасадаў у вянчаючых масах збудавання — у далейшым стане характэрнай для мастацкага вобраза старажытнарускіх храмаў. Да таго ж, рамёны цэнтральнага аб'ёмна-прасторавага крыжа ў кіеўскай Сафіі завяршаліся трыма ступеньчата размешчанымі закамарамі, што яшчэ больш узмацняла агульную ярусную будову кампазіцыі.

Трэці ярус архітэктонікі збудавання складалі 13 шаломападобных купалаў, арганізаваныя ў дынамічную і строга іерархічную кампазіцыю. Велічны цэнтральны купал размяшчаўся на высокім гранёным светлавым барабане, які меў 12 аконных праёмаў. Лічба 12, якая са старажытнасці сімвалізуе дабро і гармонію, тут невыпадковая: яна адпавядае колькасці меншых купалаў святыні. Чатыры купалы на светлавых барабанах размяшчаліся над вуглавымі кампартыментамі па дыяганалях падкупальнага квадрата і сімвалізавалі чатыры кананічныя Евангеллі. Астатнія восем купалаў размяшчаліся па перыметры хораў асноўнага аб'ёму (падобнае размяшчэнне купалаў нагадвае купальную кампазіцыю сабора Св. Марка ў Венецыі таго ж часу).

Старажытнарускія дойліды, якія ўзводзілі кіеўскі Сафійскі сабор, запазычылі ў візантыйцаў не толькі архітэктоніку і семантыку крыжова-купальнага храма, але і непасрэдна звязаныя з імі тэхнічныя і дэкаратыўныя прыёмы. Тут ужыта тэхніка муроўкі з абпаленай цэглы-плінфы са схаваным радам на вапнавай рошчыне з дамешкамі цямянкі, а таксама з выкарыстаннем у ніжняй частцы сцен прыроднага каменя. Падобная адкрытая муроўка сама па сабе з'яўлялася дэкаратыўна выразнай. Перспектыўныя паўцыркульныя арачныя нішы (двух- і трохступенчатыя), якія ў чатыры ярусы размешчаны на апсідах сабора, звычайна лічацца дэкаратыўным элементам. Але тут яны служылі не толькі для аздаблення, а ў першую чаргу — як разгрузачныя канструкцыі, што ўзмацнялі трываласць сцен. Адзінымі цалкам дэкаратыўнымі архітэктурнымі элементамі былі, верагодна, паўкруглыя какошнікі, якія завяршалі грані светлавога барабана цэнтральнага купала і тонкія паўкалонкі на вуглах граняў.

Аркі і скляпенні сабора выкладзены цалкам з плінфы, пры гэтым у муроўцы скляпенняў выяўлена шмат амфарападобных жбаноў-галаснікоў, павернутых раструбамі ўнутр храма, якія служылі рэзанатарамі. У сярэдзіне храма была мазаічная падлога, а ў бакавых частках — з паліваных керамічных плітак. Археолагамі адкрыта таксама шмат мармуровых архітэктурных фрагментаў. Адметнасцю архітэктурна-мастацкага вобраза сабора з'яўляецца непарыўная арганічная ўзаемасувязь канст-



Мал. 78. Сафійскі сабор у Кіеве. Мазаіка "Маці Божая Аранта"


рукцыйна-будаўнічага вырашэння і дэкаратыўнага пачатку.

У Ноўгарадзе, які да другой трэці XII ст. палітычна залежаў ад Кіева, у 1045—1052 гг. пабудаваны ўласны Сафійскі сабор, які шмат у чым паўтарае кіеўскі першаўзор. Гэта таксама 5-нефавы, 12-слуповы крыжова-купальны храм, але толькі з трыма алтарнымі апсідамі, абкружаны шырокай двух'яруснай абхадной галерэяй. Памеры асноўнага аб'ёму, разам з апсідамі, 27 × 24,8 м, некалькі меншыя за кіеўскую Сафію. Адпаведна падкупальны квадрат мае памеры 6,19 × 6,28 м. Крыжовае ядро кампазіцыі перакрыта ўзаемна перпендыкулярнымі цыліндрычнымі скляпеннямі з купалам на светлавым барабане над сяродкрыжжам. Яшчэ чатыры купалы размешчаны над вуглавымі кампартыментамі. Цэнтральная апсіда, як і ў кіеўскай Сафіі, унутры паўкруглая, а звонку — гранёная. Вуглы граняў аздоблены падвеснымі паўкалонкамі, якія, аднак, не даходзяць да зямлі. Светлавыя барабаны купалоў круглыя, а не гранёныя, і аздоблены ўверсе арачкамі з падвеснымі гіркамі, што падкрэслівае іх дэкаратыўны, але не канструкцыйны характар.


Апорныя слупы крыжападобнай формы з вялікімі вынасамі таксама дакладна скампанаваныя, як і ў галоўным храме мітраполіі. Адрозненне складаюць адзінкавыя слупы, якія падтрымліваюць хоры, васьмігранныя ў ніжнім ярусе і квадратныя — у верхнім, злучаныя з апорнымі слупамі двума арачнымі праёмамі (у кіеўскай Сафіі яны групуюцца па два, адпаведна ўтвараючы трайчастыя праёмы).

Абшырная П-падобная абходная галерэя, якая з поўначы, захаду і поўдня абкружае сабор, на ўсходніх тарцах завершана невысокімі, але ў плане значнага памера апсідамі, дзе размешчаны асобныя прыдзелы храма. У паўднёва-заходнім вуглу галерэі знаходзіцца масіўная лесвічная вежа, якая вядзе на хоры сабора. Першапачаткова галерэю, якая істотна ўзбагачае аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю сабора, меркавалі зрабіць аднапавярховай, з часткова адкрытымі аркадамі ніжняга яруса, накшталт кіеўскага прататыпа. Але ў працэсе будаўніцтва над ніжнім узвялі другі цалкам закрыты ярус, завершаны закамарамі.

Муроўка сцен наўгародскай Сафіі выканана з мясцовага груба абколатага прыроднага каменю, падча-



Мал. 79. Сафійскі сабор у Ноўгарадзе: план і сучасны выгляд



санага толькі з боку пасцеляў, у выніку чаго атрымаліся швы адвольнай формы. Скляпенні і падпружныя аркі, якія патрабуюць больш дакладнай будаўнічай тэхнікі, змураваны з цэглы. Муроўка з натуральнага каменю была вельмі трывалай і не патрабавала ўзмацнення разгрузачнымі аркамі. Таму, на наш погляд, яны адсутнічаюць у вонкавых сценах сабора, што надае яго мастацкаму абліччу яшчэ больш суровы аскетычны характар. Гэтая суровасць крыху змякчаецца чаргаваннем у вянчаючых масах збудавання паўкруглых і трохвугольных закамараў. На ўсходнім фасадзе крайнія бакавыя нефы асноўнага аб'ёму завершаны закамарамі ў выглядзе чвэрці круга ці паловы аркі — прыём, які пазней атрымаў пашырэнне не толькі ў наўгародскай, але і ў іншых старажытнарускіх школах дойлідства.

Трэцім фундаментальным творам у кантэксце «манументальнага гістарызму» архітэктуры старажытнарускага перыяду з'яўляецца Са-

фійскі сабор у Полацку, які стаў першым творам мураванага сакральнага дойлідства Беларусі, стрыжнем яго далейшай гісторыі. Ён стаў сімвалам палітычнага ўзвышэння і культурнага росквіту Полацкага княства.

Град Полацак, адзін з найстаражытнейшых усходнеславянскіх гарадоў, упершыню ўпамінаецца ў «Аповесці мінулых часоў» пад 862 г. У розных летапісных славянскіх крыніцах і скандынаўскіх сагах горад меў некалькі аднатыпных назваў: Полотеск, Полотьск, Полтеск, Полтесьюберг. Спачатку гэта было невялікае крывіцкае гарадзішча памерам 0,1 га, якое размяшчалася на востраве ў рэчышчы невялікай рэчкі Палаты, пры ўпадзенні яе ў Заходнюю Дзвіну, галоўную водную артэрыю Беларускага Паазер'я. Вакол яго існавала паселішча на тэрыторыі 6,5 га. Ужо ў X ст. Полацк стаў цэнтрам буйнейшага на беларускіх землях удзельнага княства, і тэрыторыя горада пашырылася да 20 га. У 980 г. тут княжыў першы вядомы полацкі князь Рагвалод, забіты кіеўскім князем Уладзімірам Святаслававічам, які гвалтам узяў за жонку яго дачку Рагнеду.

Праўнук Рагвалода, славуты полацкі князь Усяслаў Брачыслававіч, празваны Чарадзеем, у першай палове XI ст. перанёс гарадскі дзядзінец на высокі правы бераг Заходняй Дзвіны, абмежаваны з захаду Палатой. Умовы рэльефу стварылі натуральныя перашкоды, якія дапоўнілі штучныя драўляныя ўмацаванні таўшчынёю ў некалькі бярвенняў, што рабіла княжацкую рэзідэнцыю непрыступнай. Пры Усяславе Полацкае княства ахоплівала басейн верхняй і сярэдняй частак Заходняй Дзвіны, на паўночным захадзе ўключала гарады Герцыке і Кукейнас (сучасная Латвія), на ўсходзе дасягала Дняпра каля Оршы, на поўдні агінала Менск і вярхоўе Нёмана, кантралявала не толькі этнічныя крывіцкія землі, але і землі, населеныя угра-фінскімі і балцкімі плямёнамі. На працягу ўсяго XI ст. яно заставалася магутным і непарушным. На полацкім дзядзінцы былі пабудаваны харомы князя, жыллё дружыны і заможных гараджанаў. У горадзе квітнелі гандаль і рамёствы (археолагі налічваюць некалькі дзесяткаў вытворчых прафесій па вырабу розных побытавых рэчаў з металу, керамікі, скуры і інш.).

Падчас уладарання Усяслава ў межах княжацкага дзядзінца на высокім правабярэжным надпойменным плато Заходняй Дзвіны палачане паставілі велічны мураваны праваслаўны сабор у гонар «святыя Софеи Премудрости Божия», арыентаваны алтарнай часткай на ўсход, а да воднай артэрыі — бакавым паўднёвым фасадам. Па сваёй сакральнай ідэі і архітэктурнай задуме ён быў падобным да пабудаваных крыху раней Сафійскіх сабораў у Кіеве і Ноўгарадзе. Полацкая Сафія не саступала ім ні памерамі, ні дасканаласцю архітэктанічнай кампазіцыі, ні мастацкай выразнасцю, хаця думка пра яе другаснаць, параўнальна з Кіевам, часта беспадстаўна прыводзілася ў савецкай гістарычнай навуцы. Напрыклад, нават такі таленавіты даследчык, як археолаг І. Хозераў, у кнізе, напісанай у 1946 г., абвінавачвае палачан у «тщеславном стремлении феодаль-

ных кругов... не отстать в строительстве церквей от достижений киевского князя... в гораздо меньших масштабах и скромными материальными средствами, по сравнению с колоссальными богатствами Киева» [149. С. 41].

Сакральная сутнасць хрысціянскага храма спрыяла патрыятычнаму яднанню палачанаў. На пячатцы горада захаваўся надпіс: «Печать Полочькая и стои Софьи». Сафійскі сабор стаў сімвалам палітычнай незалежнасці, у ім адбываліся найбольш значныя грамадскія падзеі: «пасаджэнне на сталец», абвяшчэнне вайны і міру, прысяга на вернасць князю, сустрэчы іншаземных паслоў; захоўваліся дзяржаўны скарб і архіў, вялося складанне летапісаў. Тут пачала свой духоўны подзвіг вялікая беларуская святая Еўфрасіння Полацкая, пра што распавядае помнік пісьменства XII ст. — агіяграфічнае «Жыціе святой і блажэннай і найпадобнейшай Еўфрасінні, ігуменні манастыра Святога Спаса і Найсвяцейшай Ягонай маці, што ў горадзе Полацку», вядомая ў шасці рэдакцыях і каля 100 спісках. У «Жыціі» паведамляецца, што Еўфрасіння «Испроси у епископа, ту сущаго, нарицаемого Ильи, правящего престол святыя Софея в Полотску, дабы ей повелел ту пребывати в церкви святыя Софеи каменныя в голубцы», дзе яна пачала пісаць кнігі сваімі рукамі і прыбытак ад продажу іх аддавала тым, хто папросіць. З яе імем звязваюць стварэнне бібліятэкі Сафійскага сабора, якая была вывезена ў Маскоўскую Русь у XVI ст. падчас Лівонскай вайны.

Даты пабудовы і асвячэння полацкага Сафійскага сабора не пазначаны дакладна ў пісьмовых крыніцах. На падставе розных гістарычных звестак час яго будаўніцтва даследчыкі вызначаюць 1044—1066 гг., што адпавядае храналагічным рамкам паміж пачаткам княжэння Усяслава і яго паходам на Ноўгарад, з якога ён прывёз званы і іншыя трафеі для полацкай Сафіі. Пра аданасць князя Усяслава сваёй святыне зазначае аўтар «Слова аб палку Ігараве»: «Тому в Полотьске позвониша заутренюю рано у святыя Софеи в колоколы, а он в Кыеве звон слыша». Частка гісторыкаў ставіць больш вузкія рамкі, датуючы пабудову полацкага Сафійскага сабора 1050—1055 гг. альбо проста сярэдзінай XI ст. На працягу сваёй шматвяковай гісторыі будынак сабора неаднаразова перабудоўваўся, руйнаваўся, але адраджаўся зноў. Кожны этап рэлігійнай і мастацкай гісторыі полацкай Сафіі настолькі істотны для агульнага развіцця манументальнага дойлідства Беларусі, што будзе разглядацца асобна ў кантэксце гісторыі архітэктуры свайго часу.


Найбольш істотна полацкая Сафія пацярпела ў 1710 г., падчас Паўночнай вайны, калі ў сутарэннях сабора, пераўтворанага па загаду цара Пятра I у парахавы склад, адбыўся выбух. У сярэдзіне XVIII ст. па заказу і на сродкі уніяцкага мітрапаліта Фларыяна Грабніцкага над рэшткамі старажытнай праваслаўнай святыні ў стылі позняга беларускага барока ўзведзены новы грэка-каталіцкі храм, які быў пераарыентаваны алтаром на поўнач. Стваральнікі новага сабора, які існуе за-



Мал. 80. Сафійскі сабор у Полацку: заходні фасад, рэканструкцыя Г. Лаўрэцкага; паўночны фасад, рэканструкцыя Г. Штыхава

раз, праявілі надзвычайны мастацкі густ, творчы такт і вялікую павагу да папярэдняй святыні, захаваўшы максімальна яе рэшткі і нават аўтэнтычныя будаўнічыя матэрыялы.

Для стварэння сіметрычнай кампазіцыі новага уніяцкага Сафійскага сабора, плоскасць сіметрыі якога праходзіць у напрамку поўдзень-поўнач, яны ўзвялі сіметрычна ацалеўшым усходнім апсідам старажытнага сабора тры аналагічныя заходнія апсіды, выкарыстаўшы пры гэтым цэглу-плінфу візантыйскага ўзору. Усё гэта ў далейшым надзвычай ускладніла археалагічныя даследаванні і спарадзіла шматлікія спрэчныя гіпотэзы, прывяло да значных разыходжанняў паміж даследчыкамі ў вызначэнні памераў, агульнай кампазіцыі і тыпалогіі першапачатковага збудавання.



У 1860-я гг. мастак Д. Струкаў, накіраваны Сінодам Расійскай імперыі для вывучэння і фіксацыі праваслаўных стражытнасцей «Северо-Западного края», адным з першых адзначыў ў сутарэннях уніяцкага сабора рэшткі першапачатковай па-


будовы. У канцы XIX ст. існуючы будынак да такой ступені прыйшоў у заняпад, што праз абрушэнні тынкоўкі сталі бачны фрагменты старажытнай муроўкі з плінфы і каменя. Гэта ўзмацніла цікавасць да помніка з боку дарэвалюцыйных расійскіх археолагаў і гісторыкаў архітэктуры. А. Паўлінаў першым выказаў думку пра пазнейшую прыбудову заходніх апсід. У 1909—1913 гг. пад кіраўніцтвам П. Пакрышкіна былі выяўлены зандажамі амаль усе ацалелыя старажытныя часткі і праведзены капітальны рамонт сабора.

У 1915 г. К. Шэроцкім быў апублікаваны план старажытнага Сафійскага сабора ў Полацку, дзе абедзве групы апсід (усходніх і заходніх) прадстаўлены як аўтэнтычныя. Гэтая памылка ў далейшым паслужыла асновай для тэарэтычных разважанняў М. Брунава, які пабудаваў уласную канцэпцыю пра прынцыповую адметнасць полацкай Сафіі ў кантэксце усходнеславянскага дойлідства і моцны ўплыў на яе заходнееўрапейскіх раманскіх архітэктурных формаў.

Аднак М. Шчакаціхін лічыў гэтую канцэпцыю памылковай, а план з дзвюма сіметрычнымі групамі апсід «непраўдападобным». Ён адзначаў, што полацкая Сафія «хоць і мае некаторыя ўласныя асаблівасці ў дэталях, але агулам знаходзіць сабе досыць блізкія аналогіі ў шэрагу іншых славяна-бізантыйскіх помнікаў» [164. С. 105—106]. Адначасова ён лічыць менавіта адметныя дэталі найбольш істотнымі для характарыстыкі дадзенага помніка як узору мясцовага полацкага будаўніцтва.

Складанасць, амаль немагчымасць дакладных прамераў архітэктурных рэшткаў старажытнага праваслаўнага сабора пад падлогай позняга уніяцкага храма адзначалі М. Шчакаціхін і І. Хозераў. Апошні ажыццявіў найбольш поўныя натурныя даследаванні помніка ў 1920—1940-я гг., выявіў асаблівасці яго будаўнічай тэхналогіі. Археалагічныя раскопкі працягваліся ў 1947 г. (Я. Ашчэпкаў) і пазней, у 1967 г. (М. Каргер), калі адбылося раскрыццё значных фрагментаў фрэскавага роспісу. Але яшчэ ў 1970-я гг. П. Рапапорт зазначаў, што полацкі Сафійскі сабор «пакуль што вывучаны слаба» [105. С. 57].

Найбольш грунтоўныя даследаванні помніка былі праведзены археолагамі пад кіраўніцтвам В. Булкіна ў 1975—1980 гг., на падставе якіх канчаткова высветлены спрэчныя моманты ў аб'ёмна-прасторавай структуры полацкай Сафіі, што



Мал. 81. Сафійскі сабор у Полацку. План



Мал. 82. Сафійскі сабор у Полацку. Сучасны выгляд з усходнімі апсідамі

трактаваліся як яе асаблівасці. Пацверджаны час узвядзення заходніх апсід — XVIII ст. Устаноўлена, што форма першапачатковых апсід паўкруглая, а не гранёная, як лічылася доўгі час. Раскопкамі выяўлены таксама прыбудовы да храма, зробленыя ў XII ст., якія ўяўлялі сабою разрозненыя памяшканні, далучаныя да асноўнай часткі пераважна з паўднёвага і ўсходняга бакоў. Сцены ў той час былі ўмацаваны контрфорсамі.

Амаль усе даследчыкі-археолагі асноўным складнікам навуковай атрыбуцыі ставяць *пяцінефавасць* усіх Сафійскіх сабораў, што, аднак, з'яўляецца тыпалагічна і тэрміналагічна недакладным і адлюстроўвае планавае, а не прасторавае ўспрыняцце гэтымі даследчыкамі архітэктанічнай кампазіцыі. Шэраг прасторавых ячэек рознай вышыні і з рознай сістэмай перакрыццяў, пастаўленых па агульнай восі адна за адной, па сутнасці, не з'яўляецца цэласнай аб'ёмна-прасторавай структурай — нефам. Аднак у архітэктурнай археалогіі для характарыстыкі планавых схем помнікаў старажытнага дойлідства гэтая ўмоўнасць стала надзвычай устойлівай і нават дамінуючай. На жаль, многія сучасныя гісторыкі архітэктуры не аспрэчваюць і нават яшчэ больш вольна трактуюць тыпалагічную атрыбуцыю храмаў старажытнарускага перыяду.

П. Рапапорт у «Гісторыі беларускага мастацтва» дакладна вызначае полацкі Сафійскі сабор як крыжова-купальны храм, але тэндэнцыйна характарызуе яго як спрошчаны варыянт кіеўскай Сафіі [105. С. 58]. Сярод гісторыкаў беларускай архітэктуры ўжо М. Шчакаціхін вызначаў архітэктурную тыпалогію гэтага помніка як «кубічна-крыжовую» [164. С. 107], што найбольш блізка да тэрміна «крыжова-купальны храм», шырока прынятага ў сучасным мастацтвазнаўстве. Са свайго боку, на падставе глыбокага архітэктурна-археалагічнага аналізу, І. Хозераў аб'ектыўна зазначыў, што «полацкая Сафія па гарманічнасці чляненняў свайго плана значна апярэдзіла свой прататып — кіеўскую Сафію» [149. С. 29].

Па сваёй архітэктурнай тыпалогіі полацкі Сафійскі сабор XI ст. з'яўляўся крыжова-купальным храмам з выразна выяўленай цэнтрыч-

най кампазіцыяй, дапоўненай трыма больш нізкімі апсідамі з усходняга боку. План асноўнага аб'ёму ўяўляе дакладны квадрат памерамі 26,4 × 26,4 м, з улікам апсід даўжыня храма па восі захад-усход 31,5 м, памеры падкупальнага квадрата 5,5 × 5,7 м (памеры дадзены па «Своду археологических источников»). Полацкая Сафія мела двухвосевую сіметрыю плана і адпаведна сіметрычную будову ўсіх фасадаў, акрамя ўсходняга. Гэта было дасягнута ўвядзеннем у архітэктоніку храма чатырох дадатковых апорных слупоў на ўсход ад падкупальнага квадрата, што ствараля перад сярэдняй алтарнай апсідай дадатковую прасторавую ячэйку — віму, што генетычна паходзіць са старазапаветнага храмабудаўніцтва. На паўночна-заходнім вугле будынка знаходзілася даволі масіўная квадратная ў плане вежа з вітымі ўсходамі ўнутры, што вялі на хоры сабора, прызначаныя для князя і яго світы.

Агульная колькасць апорных слупоў полацкага Сафійскага сабора роўная 16-ці, а не 12-ці, як у кіеўскай і наўгародскай Сафіях. Пралёт паміж слупамі падкупальнага квадрата ўдвая большы за пралёты паміж астатнімі кампартыментамі, што выразна выдзяляе цэнтр кампазіцыі ў выглядзе роўнаканцовага грэчаскага крыжа, які быў асветлены 8-мю ці 12-цю арачнымі праёмамі барабана купала. Астатнія невялікія кампартыменты былі аднолькава згрупаваны па чатыры паміж рамёнамі крыжа. Сістэма іх скляпенняў успрымала нагрузку асноўнага купала па візантыйскай схеме ўзаемнага пагашэння распора.

Ніякіх прыкмет базілікальнасці, гэта значыць наяўнасці падоўжанай шматнефавай структуры з базілікальным сячэннем, полацкая Сафія не мае, таму атрыбуцыя яе шматнефавай базілікай з'яўляецца памылковай. Недакладнасць падобнай атрыбуцыі настолькі відавочная, што яе не патрэбна было і закранаць, калі б яна не атрымала пашырэння ў беларускім мастацтвазнаўстве апошняга часу [71, 75]. У выніку гэта прывяло да параўнання на гэтай падставе і агульнай назве полацкай Сафіі з зусім іншай па тыпалогіі базілікай Св. Сафіі ў Ахрыдзе (памеры плана 27,5 × 17,6 м), што з'яўляецца навукова некарэктным [138].

Строгая ўзаемасувязь канструкцыйных і кампазіцыйных аспектаў славяна-візантыйскай храмавай архітэктуры дазваляе амаль дакладна рэканструяваць аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю збудавання. Унутраная тэктоніка храма выяўлена адпаведным чляненнем фасадаў, якія маюць па пяць праслаў, а не па чатыры, як у папярэдніх святынях. Цэнтральнае прасла па пралёту ўдвая большае за бакавыя, згрупаваныя па два з кожнага боку. Праслы ўсіх фасадаў завяршаліся закамарамі, вышыня якіх была абумоўлена пралётам праслаў, але дзеля кампазіцыйнай цэласнасці вянчаючых мас яны не заўсёды адпавядалі ўнутраным скляпенням, што адзначалася ўжо ў больш ранніх помніках. Пругкая маляўнічая лінія закамар з усіх бакоў стварала аснову велічнаму шматкупальнаму завяршэнню сабора.

Пытанне пра аўтэнтычную кампазцыю вянчаючых мас полацкай

Сафіі з'яўляецца складаным і да канца не вырашаным. У «Спісе рускіх гарадоў», які ў канцы XIV ст. уключаны ў першы Наўгародскі летапіс, «...Полтеск на Двине и на Полоте, древнян, Святая София камена о седми версех», аднак як кампанаваліся тыя вярхі — невядома.

Існуе некалькі магчымых варыянтаў. Найбольш верагодны з іх прапанаваў самы першы даследчык сабора А. Паўлінаў, які добра ведаў спецыфіку і сімволіку праваслаўнага храмабудаўніцтва. Ён лічыў, што чатыры купалы месціліся па дыяганалях падкупальнага квадрата цэнтральнага купала, ствараючы традыцыйнае праваслаўнае пяцігалоўе, а два астатнія — над крайнімі заходнімі кампартыментамі ці, магчыма, вежамі.

Гэтую версію актыўна аспрэчваў М. Шчакаціхін, які акцэнтаваў увагу на раннехрысціянскім сірыйскім генезісе архітэктуры полацкай Сафіі і лічыў, што чатыры меншыя купалы размяшчаліся над рамёнамі крыжовага ядра кампазіцыі па баках свету, а два дадатковыя — над заходнім прытворам.

Беларускі археолаг Г. Штыхаў у сваёй рэканструкцыі, акрамя кананічнага пяцігалоўя, прапануе размяшчэнне двух дадатковых купалоў над усходнімі кампартыментамі, акцэнтуючы такім чынам кампазіцыйную адметнасць сабора. Гэтага, безумоўна, быць не магло з прычыны адсутнасці падобнай традыцыі як да, так і пасля ўзвядзення гэтага храма. Купал над заходне-паўночнай вежай, які ўжо з'яўляецца па ліку восьмым, ва ўсіх рэканструкцыях не ўлічваецца.

Увагу даследчыкаў прыцягвае і сімволіка лічбы 7 у кампазіцыі вянчаючых мас полацкага Сафійскага сабора (нагадваем, у кіеўскай Сафіі купалоў было 13, у наўгародскай — 5). Гісторык архітэктуры Г. Лаўрэцкі прапануе яе старазапаветную трактоўку, цытуючы радок з Прытчаў Саламонавых: «Премудрость (София) построила себе дом, вытесала семь столбов его...» [72. С. 14]. Археолаг С. Тарасаў выводзіць сямігалоўе полацкай Сафіі з шанавання сямі Усяленскіх сабораў, рашэнні якіх прызнавалі аднолькава ўсходняя і заходняя галіны хрысціянства пасля іх падзелу ў 1054 г. Для абгрунтавання сваёй версіі ён цытуе закляцце на крыжы Еўфрасінні Полацкай: той, хто яго вывязе з Полацка, «...будзе праклятый ўсімі айцамі святымі і сям'ю саборамі святымі». Відавочна, што ў архітэктурна-мастацкі вобраз святыні была закладзена глыбокая рэлігійная семантыка.

Купалы полацкай Сафіі, хутчэй за ўсё, мелі паўсферычную, па сутнасці, візантыйскую форму. Пакрыццё купалаў і закамар было зроблена са свінцовых лістоў, пра што сведчаць кавалкі аплыўшага свінца, знойдзеныя пры археалагічных раскопках. Купалы, аздобленыя ўнізе шэрагам паўкруглых какошнікаў, абапіраліся на круглыя светлавыя барабаны з высокімі арачнымі праёмамі, падзеленымі тонкімі паўкалонкамі. Падобную акруглую форму мелі і тры апсіды сабора, афармленыя таксама тонкімі паўкалонкамі з лякальнай цэглы. Менавіта на недакладна вызначанай форме апсід, якія даследчыкі лічылі гранёнымі, будавалі свае канцэпцыі іх сірый-


скага паходжання — М. Шчакаціхін і раманскага ўплыву — М. Брунаў.

У планавым сячэнні апорныя слупы полацкай Сафіі мелі крыжападобную форму, але вынас канцоў крыжа, на якія абапіраюцца падпружныя аркі, як і адпаведных ім лапатак на вонкавых сценах, быў напалову меншы, чым у першых Сафіях і іх візантыйскіх першаўзорах, і роўны толькі чвэрці таўшчыні сцяны ці слупа. Менавіта такі вынас слупоў і лапатак стаў у далейшым найбольш пашыраным у полацкай і іншых рэгіянальных школах дойлідства старажытнага перыяду. Гэты будаўнічы прыём выступае ў полацкай Сафіі як наватарскі.

Крыжовае ядро кампазіцыі ў інтэр'еры сабора з поўначы, захаду і поўдня абкружалі хоры, якія адкрываліся ў яго двайнымі аркадамі, як ў наўгародскай Сафіі, а не трайнымі, як ў кіеўскай. Але як і там, слупы, што падзялялі аркі, унізе былі васьміграннымі, а на верхнім ярусе квадратнымі. Гэты прыём, на наш погляд, як і суцэльны фрэскавы роспіс слупоў, сценаў і скляпенняў інтэр'ера, меў на мэце пэўную дэматэрыялізацыю масіўных аб'ёмаў нясучых канструкцый. Аднак евангельскія сюжэты і выявы святых фрэскавага роспісу мелі, у першую чаргу, дыдактычна-пазнавальны характар. Да нашага часу ў асноўным дайшлі фрагменты раслінnага арнаменту і кампазіцыі «Еўхарыстыі», што размяшчалася ў ніжняй частцы цэнтральнай апсіды, як і ў кіеўскай Сафіі.

На сённяшні дзень зберагліся аўтэнтычныя стужкавыя фундаменты, ніжнія часткі сцен і тры ўсходнія алтарныя апсіды (апошнія на вышыню да 9 м), якія прадстаўлены ў экспазіцыі музея, што працуе ў сутарэннях існуючага сабора. Пры натурным абследаванні старажытных рэштак М. Шчакаціхін адзначыў наяўнасць у заходняй сцяне галоўнага ўваходу з парталам і 8-кантовай хрысцільнай купелі ў прытворы перад ім. Пры раскопках 1980-х гг. археолагамі пад кіраўніцтвам В. Булкіна ў падмурку святыні адкрыты вялікі камень-валун, на якім надрапаны імёны: Давыд, Таўла, Мікула, Капес. Лічаць, што гэта майстры будаўнічай арцелі, запрошанай у Полацк з Ноўгарада, хаця дакладней прафесійнае аб'яднанне будаўнікоў таго часу ў тым жа Ноўгарадзе называлася «дружынай». Слова «арцель» цюркскага паходжання, яно запазычана з расійскай гістарыяграфіі, куды трапіла з суседніх цюркамоўных рэгіёнаў.

Найбольш поўна археолагамі вывучана будаўнічая тэхніка полацкага Сафійскага сабора. Калі ў кіеўскім Сафійскім саборы пераважае муроўка з плінфы (шырокая і плоская абпаленая цэгла візантыйскага ўзору), а ў наўгародскім — з натуральнага каменю, сцены полацкай Сафіі выкладзены ў змешанай тэхніцы, якая спалучала плінфы і прыродны камень, што назіраецца пераважна ў рэштках усходняй сцяны. Апорныя слупы, аркі і скляпенні былі выкладзены цалкам з плінфы. Характар муроўкі з плінфы візантыйскага паходжання і агульны для ўсіх сабораў — са схаваным радам. Няцотныя палосы цаглін выпускаліся на паверхню сцяны праз адзін рад. Прамежкавыя цотныя рады



Мал. 83. Сафійскі сабор у Полацку. Фрагмент муроўкі ўсходняй апсіды

заглыбляліся адносна іх на 2—4 см з мэтай лепшай перавязкі муроўкі і заціраліся ў плоскаці фасада вапнавай рошчынай з дамешкай дробна тоўчанай цэглы, так званай цамянкі. Таўшчыня пластоў рошчыны была роўная таўшчыні цаглін, прыблізна 3,5—4 см. У выніку на неатынкаванай паверхні фасадаў вузкія цёмныя чырвоныя палосы плінфы чаргаваліся з шырокімі (у 10—12 см) бела-ружовымі палосамі рошчыны.

Відавочна, што такая будаўнічая тэхніка з'яўлялася адначасова дэкаратыўна-мастацкім прыёмам, стварала маляўнічую каляровую гаму фасадаў сабораў. У іх аздабленні былі выкарыстаны і іншыя элементы візантыйскай архітэктуры: тонкія паўкалонкі з лякальнай цэглы, палосы меандру (ламаная пад прамым вуглом лінія) і крыжы. На складаных канструкцыях паўкруглых апсід дзеля ўмацавання іх праставай жорсткаці ўжыты двухступенчатыя паўцыркульныя арачныя нішы, якія адначасова з'яўляюцца і разгрузачнымі, і дэкаратыўнымі элементамі. Нішы і светлавыя праёмы чаргаваліся на сценах па вышыні і мелі адпаведна па два ярусы.

Археолагамі вызначаны разнастайны характар ужывання і састаў рошчыны. Наяўнасць у рошчыне цамянкі, якая з'яўляецца гідраўлічным дамешкам, надае муроўцы большую жорсткасць і хуткасць зацвярдзення. У падмурку полацкай Сафіі ў складзе рошчыны выкарыстана менш цамянкі, чым у муроўцы сцен, каб зрабіць яго больш пластычным і падатлівым на дэфармацыі грунту. Гэты ж прыём у далейшым выкарыстаны ў іншых архітэктурных помніках Полацка. Менавіта адметны састаў рошчыны канчаткова абверг гіпотэзу аўтэнтычнасці заходніх апсід. У іх была ўжыта старажытная цэгла візантыйскага ўзору, але ў рошчыне адсутнічала цамянка, а прысутнічаў толькі дамешак пяску. Да таго ж яны толькі далучаліся да заходняй сцяны старажытнага сабора, без перавязкі швоў. У муроўцы сцен сабора выяўлены двайныя па таўшчыні пласты раствору, так званыя сезон-

ныя швы, якія ўзнікалі, калі будаўніцтва прыпынялася на доўгі час, напрыклад, на зіму. Гэтая з'ява назіраецца і ў наўгародскай Сафіі, што ўскосна пацвярджае думку пра ўдзел наўгародцаў у будаўніцтве полацкага сабора. Унутры сцены Сафіі мелі атынкоўку ў два тонкія пласты рошчыны. Верхні з іх (накрыўка) прызначаўся пад фрэскавы роспіс, і з гэтай мэтай у рошчыну дабаўлена мелка нарэзаная бавоўна (ільняное валакно), што ўпітвае і замацоўвае вадзяныя фарбы.

Цэгла-плінфа мела пяць гладкіх граняў і адну верхнюю нягладкую пасцель, іншы раз са слядамі пальцаў, што рабілася дзеля лепшага злучэння з рошчынай. Форма, у якой выраблялiся цагліны, мела сценкі і донца, абітыя свінцом, дзякуючы чаму атрымлівалася роўная паверхня граняў. Прынамсі, характар фармоўкі цаглін дазваляе дакладна чытаць шматлікія клеймы і знакі на іх паверхні, якія сустракаюцца ў муроўцы цэркваў старажытнарускага перыяду Полацка, Смаленска, Чарнігава, Кіева, але адсутнічаюць у наўгародскіх помніках, што ў сваю чаргу ставіць пад пытанне распаўсюджаную гіпотэзу пра наўгародцаў-будаўнікоў полацкай Сафіі. Прычым, па назіраннях археолагаў, ёсць перавага выкарыстання цаглін з пэўнымі клеймамі ў нейкіх адпаведных канструкцыях, напрыклад кляйма накшталт літары «Л» у канструкцыях падпружных арак Пятніцкай царквы ў Смаленску. Гісторыка-геаграфічны дыяпазон ужывання аднолькавых клеймаў і знакаў вельмі шырокі — ад раннехрысціянскіх збудаванняў усходніх правінцый Візантыі, напрыклад Егіпта, да гатычных сабораў Заходняй Еўропы.

Расшыфроўка гэтых знакаў і клеймаў, выяўленне іх значэння ў будаўніцтве старажытных храмаў — адна з важнейшых задач гісторыі архітэктуры сярэднявечча. Сярод шматлікіх версій, якія прапанавалі розныя айчынныя і замежныя даследчыкі, ёсць меркаванні, што гэта мытныя пломбы, знакі княжацкай ці родавай феадальнай уласнасці, знакі цагельных заводаў ці асобных майстроў-будаўнікоў. Аднак гэта не ахоплівае ўсю разнастайнасць і спецыфіку ўжывання клеймаў. Дзве найбольш верагодныя гіпотэзы, як лічыў І. Хозераў: па-першае, гэта прафесійныя адзнакі, умоўны шыфр цэхавай будаўнічай арганізацыі «вольных каменщиков», па-другое, гэта могуць быць рэмінісцэнцыі нейкіх старажытных вераванняў, магічных ці сакральных сімвалаў. Магчыма, у іх спалучаюцца абодва гэтыя варыянты.

Шэраг асаблівасцей назіраецца ў метрычнай сістэме полацкага Сафійскага сабора. У адрозненне ад большасці храмаў іншых усходнеславянскіх рэгіёнаў, тут метрычным модулем з'яўляецца не грэчаскі, а рымскі фут, як і ў шэрагу іншых сакральных збудаванняў полацкага рэгіёна [8. С. 59—72]. Адначасова тут ужываецца больш буйны модуль, так званы «пояс Шымана» (Сымона), які складаецца з чатырох рымскіх футаў (магчыма, маецца на ўвазе памер Шкаплера Маці Божай — падоўжанага кавалка тканіны, які, паводле падання, яна падарыла генералу старажытнага ордэна кармелітаў Сымону. Шкаплер Маці Бо-

жай быў аб'ектам шанавання ордэна і надзяваўся манахамі праз галаву паверх габіта). Падлога сабора была выкладзена з паліваных керамічных плітак.

Па сваіх памерах і складанасці архітэктанічнай кампазіцыі старажытны полацкі сабор нават перавышае наўгародскую Сафію, што ўскосна сведчыць пра эканамічную і палітычную магутнасць Полацкага княства. Полацкую Сафію нельга разглядаць як спрошчаны варыянт кіеўскай ці наўгародскай. Яны разам складаюць адзіную семантычна-стылявую групу на пачатковым этапе станаўлення ўсходнеславянскага хрысціянскага храмабудаўніцтва, якое мела на мэце дзяржаўна-палітычную і ідэйна-рэлігійную кансалідацыю і характарызавалася вызначальным візантыйскім уплывам. Гэты ўплыў паступова змяншаецца з кожным з наступных помнікаў, якія набываюць усё больш кампазіцыйных і канструкцыйных асаблівасцей, што цалкам заканамерна для самастойнай архітэктурнай творчасці славянскіх народаў. Усе закладзеныя ў полацкім Сафійскім саборы наватарскія прыёмы і мадыфікацыі кананічнай візантыйскай схемы крыжова-купальнага храма атрымалі ў далейшым развіццё і паслужылі асновай для фарміравання самабытнай полацкай школы дойлідства.

2.5. Полацкая школа дойлідства

У пачатку XII ст. у развіцці манументальнага сакральнага дойлідства ўсходнеславянскіх рэгіёнаў пачынаецца новы этап, які можна вызначыць як княжацка-епіскапскі. Паралельна з манументальным гістарызмам папярэдняй эпохі, што адэкватна адлюстроўвала крэатыўны дух «імперыі Рурыкавічаў», новы гістарычны перыяд характарызуецца лакальнасцю палітычных мэтаў і зніжэннем эканамічных магчымасцей, што абумоўлена абвастрэннем феадальных міжусобіц. Усё гэта відавочна адбілася на ступені манументальнасці ў маштабах і архітэктанічнай складанасці мураваных храмаў, аднак не пагоршыла іх мастацка-кампазіцыйнай выразнасці. У гэты час старажытнарускія дойліды дасягнулі не менш высокай духоўнасці і гармоніі архітэктурна-мастацкага вобраза праваслаўных святыняў пры іх даволі камерных памерах.

У княжацка-епіскапскі перыяд асноўным паўсюдна становіцца славяна-візантыйскі тып аднагаловага крыжова-купальнага храма з трыма ўсходнімі алтарнымі апсідамі. У розных варыянтах архітэктанічных кампазіцый вар'іруецца толькі колькасць апорных слупоў — ад чатырох асноўных, якія фарміруюць падкупальны квадрат і крыжовае ядро кампазіцыі, да шасці і васьмі. Дадатковыя пары слупоў размяшчаліся на ўсход альбо на захад ад падкупальнага квадрата, у выніку чаго ўзнікалі тыпалагічныя мадыфікацыі крыжова-купальнага храма з вімай ці нартэксам альбо з імі ў сукупнасці.


Мураванае сакральнае дойлідства старажытнарускага перыяду, як і заходнееўрапейская готыка, было пераважна артэфаксам і вынікам палітычна-эканамічнага развіцця гарадоў. Але калі саборы Заходняй Еўропы дзякуючы выключным архітэктанічным магчымасцям раманска-гатычнай базілікі мелі значныя памеры і збіралі ў сябе амаль усё насельніцтва сярэднявечнага горада, старажытнарускія храмы, з прычыны ўстойлівай тэндэнцыі да цэнтрычнай крыжова-купальнай кампазіцыі, мелі невялікія памеры. Таму гарады, якія з'яўляліся цэнтрамі ўдзельных княстваў, звычайна мелі даволі значную колькасць храмаў, часта былі абкружаны ланцугом манастырскіх комплексаў, якія разам з духоўна-асветніцкай выконвалі і абарончую функцыю. Шматлікія сакральныя збудаванні фарміравалі, такім чынам, планіровачную структуру і сілуэтную панараму старажытнарускіх гарадоў дзякуючы сваім маляўнічым архітэктурным масам, якія дамінавалі сярод нізкай аднапавярховай драўлянай забудовы.

Пасля ўзвядзення Сафійскага сабора мураванае храмабудаўніцтва ў Полацку прыпынілася болей чым на паўстагоддзе. Але прыблізна з пачатку XII ст. пры епіскапе Міне (1105—1116) мураванае храмабудаўніцтва аднаўляецца, і ў далейшым узводзіцца даволі значная колькасць мураваных цэркваў, якіх на сённяшні дзень налічваецца восем. Але толькі адна з іх, Спаса-Праабражэнская царква, дайшла да нашага часу з ацалелымі, у асноўным архітэктурнымі, канструкцыямі. Архітэктурна-археалагічныя рэшткі астатніх раскрыты, зафіксаваны і атрыбутаваны шматлікімі даследчыкамі ў розны час.

Характэрна, што ў гістарычнай навуцы праваслаўныя храмы Полацка старажытнарускага перыяду разглядаліся неаднаразова, але пераважна паводле этапаў іх археалагічнага даследавання [105, 106, 142, 145] ці па алфавітна-геаграфічнаму прынцыпу энцыклапедычных выданняў, аднак цалкам бессістэмна з пункту гледжання гісторыі архітэктуры. На падставе аналізу будаўнічай тэхнікі археолагамі навукова дакладна вызначаны магчымыя даты будаўніцтва кожнага з помнікаў. Менавіта разгляд і асэнсаванне архітэктонікі полацкіх храмаў у храналагічнай паслядоўнасці іх узвядзення можа прывесці да вызначэння паслядоўнага развіцця тых ці іншых архітэктурных форм і творчых прыёмаў, этапаў фарміравання гісторыка-культурнага феномена, які ў сучасным мастацтвазнаўстве завецца полацкай школай дойлідства.

На процілеглым ад княжацкага дзядзінца нізкім левым беразе Заходняй Дзвіны, пры ўпадзенні ў яе рэчкі Бяльчанкі, у прадмесці Бельчыцы сынам Усяслава Чарадзея, князем Барысам, у першай чвэрці XII ст. заснаваны манастыр у гонар першых усходнеславянскіх праваслаўных святых князёў Барыса і Глеба (кананізацыя гэтых святых адбылася ў 1127 г., але рэлігійнае свята ў іх гонар адзначаецца ў Іпацьеўскім летапісе некалькі раней, пад 1092 г.). Гэты манастыр адначасова служыў летняй рэзідэнцыяй князя і абарончым фарпостам пры падыходзе да Полацка з поўдня.

Комплекс бельчыцкага Барысаглебскага манастыра, які ўключаў чатыры мураваныя царквы, складаўся на працягу цэлага стагоддзя: ад пачатку XII да пачатку XIII ст. Гэтыя даціроўкі вызначаны археолагамі паводле характару будаўнічай тэхнікі і канструкцый (А. Паўлінаў, І. Хозераў, М. Варонін, П. Рапапорт, Г. Штыхаў і інш.). Трэба адзначыць, што назвы храма Бельчыцкага манастыра, прынятыя ў навуцы, вельмі ўмоўныя і выпрацоўваліся паступова. Паколькі манастыр быў асвечаны ў гонар святых Барыса і Глеба, зразумела, што яго галоўны сабор быў Барысаглебскім — адсюль гэтая назва аднаго з храмаў. Акрамя таго, з сярэдневяковых гістарычных пісьмовых крыніц было вядома, што ў Бельчыцах існавала царква ў гонар Параскевы Пятніцы. У працэсе даследаванняў гэтыя назвы мігравалі ад аднаго храма да другога, пакуль не ўсталяваліся іх сучасныя



Мал. 84. Вялікі сабор Бельчыцкага манастыра. План

вызначэнні, якіх, пры ўсёй іх умоўнасці і спрэчнасці, мы будзем прытрымлівацца.

Магчыма, яшчэ пры князі Барысе Усяслававічы, які памёр у 1128 г., пачалося ўзвядзенне вялікай мураванай царквы, што была разбурана яшчэ ў XVI ст., а ў пачатку XX ст. зроўнена з зямлёю. А. Паўлінаў у сваіх даследаваннях назваў гэты храм Барысаглебскім, што, верагодна, першапачаткова адпавядала сапраўднасці, але пасля яго разбурэння гэтая назва перайшла да другога, меншага па памерах храма, таму яго іншы раз вызначаюць як Стара-Барысаглебскі. У далейшым у публікацыях савецкіх археолагаў ён прадстаўлены пад умоўнай назвай Вялікі сабор Бельчыцкага манастыра і па тэхніцы муроўкі датуецца 1120-мі гг. У 1928 г. археалагічныя раскопкі праведзены І. Хозеравым, у 1965 г. — М. Каргерам, у 1977 г. — П. Рапапортам, у выніку чаго цалкам выяўлены падмуркі сабора, вывучана яго будаўчая тэхніка, што дае дастаткова інфарматыўны матэрыял пра архітэктурнае вырашэнне помніка.

Архітэктанічна гэта быў крыжова-купальны 6-слуповы 3-апсідны храм. Хоць ад Сафійскага сабора яго аддзяляў даволі значны адрэзак часу, у архітэктуры і будаўнічай тэхніцы абодвух сабораў назіраецца шмат агульных рысаў. Як і яго папярэднік, бельчыцкі сабор меў тры паўкруглыя апсіды: вялікую цэнтральную і дзве меншыя сіметрычныя па баках, абрыс якіх добра выяўлены звонку. Перад цэнтральнай апсідай, на ўсход ад падкупальнага квадрата, дадатковая пара слупоў утварала віму, аформіўшы тым са-


мым цэнтрычную, квадратную ў плане кампазіцыю кафалікона, які меў памеры 16,2 × 16,2 м. Разам з апсідамі і прытворамі даўжыня храма па восі ўсход-захад дасягала 23,5 м, шырыня была крыху меншая.

У верхнім сячэнні на ўзроўні апорнага кольца барабана купала храм меў план у выглядзе роўнаканцовага грэчаскага крыжа. Крыжовае ядро кампазіцыі з трох бакоў (з захаду, поўдня і поўначы) развівалі тры даволі вялікія прамавугольныя прытворы, асобныя нізкія пакрыцці якіх, разам з апсідамі, надавалі аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі храма пірамідальнасць. Прытворы пабудаваны ўпрытык да кафалікона, без перавязкі, але цалкам ідэнтычны характар муроўкі дазваляе сцвярджаць, што яны адначасовыя з асноўным аб'ёмам храма. Колькасць вярхоў святыні не вядомая, але ў раскопках знойдзены лякальная сегментападобная цэгла і кранштэйны — верагодна, фрагменты тонкіх паўкалонак аркатурнага фрыза, што аздабляў барабан купала — дэкаратыўны элемент візантыйскага паходжання.

Шмат агульнага з Сафійскім саборам гэты храм мае ў тэхніцы муроўкі. У аснаванні ён меў драўляную канструкцыю, якая складалася з трох радоў дубовых брусоў, злучаных у вузлах жалезнымі штырамі даўжынёю да 24 см. Пад паўкруглымі апсідамі дубовыя лежні ўтваралі шматгранную форму. Яны былі змацаваны вапняковай рошчынай амаль без цамянкі, што, аднак, не перашкодзіла поўнаму згніванню дрэва ў зменлівым рэжыме грунтовых вод. Гэтая будаўнічая канструкцыя была зроблена, зноў жа, дзеля большай свабоды асадачных дэфармацый фундаментаў і паходзіла, відавочна, з храмабудаўніцтва паўднёвых краін, Балкан і Закаўказзя, дзе вільготнасны рэжым фундаментаў менш агрэсіўны. Падмуркі сцен гэтай драўлянай субструкцыі былі выкананы з бутавага каменю на вапняковай рошчыне з дамешкам цамянкі. Дзеля адводу ліўневых сцёкаў ад фундамента вакол будынка была зроблена крыху пакатая адмостка з плінфы па тоўстаму (да 10 см) пласту рошчыны з цамянкай, пакладзенаму проста на зямлю.

Падлогу храма ствараў гладка зацёрты тоўсты пласт вапняковай змазкі з дамешкам вялікіх кавалкаў бітай цэглы, які ўздоўж сцен і слупоў быў аздоблены ў тэхніцы фрэскі белай паласой шырынёю 15—17 см. Падобная крыху меншая паласа (12—15 см) праходзіла і па нізе сцен. Яны былі акантаваны вузкімі чырвона-карычневымі палоскамі. Вышэй плінтусавай паласы ішла панель з фрэскавай размалёўкай, што імітавала мармур: хвалістападобныя блакітныя, зялёныя і вохрыстыя палоскі па беламу фону. Шматлікія фрагменты жывапісу ў раскопках сведчаць, што сцены і скляпенні былі цалкам пакрыты фрэскавым роспісам з выявамі святых і евангельскімі сюжэтамі. У апсідах выяўлены фрагменты падлогі з маёлікавых плітак жоўтага, жаўтавата-зялёнага і чырвонага колераў.

Муроўка сцен Вялікага бельчыцкага сабора выканана з добра абпаленай плінфы з рэльефнымі клеймамі і знакамі, са схаваным радам, што надавала ім традыцыйны дэкаратыўны малюнак з больш вузкіх



Мал. 85. Пятніцкая царква Бельчыцкага манастыра: план і малюнак XIX ст.

чырвоных і шырокіх бела-ружовых палос. Але ў ніжняй частцы сцен, паводле інфармацыі А. Паўлінава, які абследаваў гэты помнік у канцы XIX ст., на меншай стадыі разбурэння, былі гарызантальныя рады мясцовага прыроднага каменю, як і ў полацкай Сафіі. Падобнай у абодвух саборах была і форма крыжападобных апорных слупоў з невялікім вынасам бакавых лапатак. Адпаведныя ім раскрапоўкі вонкавых сцен на адну чвэрць іх таўшчыні І. Хозераў характарызуе як аднаабломныя пілястры.

Відавочна, што як у аб'ёмна-прасторавых, так і тэхналагічных характарыстыках гэты помнік найбольш набліжаны да першаўзору полацкай школы. Аднак крыжова-купальная кампазіцыя Вялікага бельчыцкага сабора з трыма прытворамі ў далейшым сама стала першаўзорам для шэрага помнікаў як полацкага рэгіёна, так і іншых школ старажытнарускага дойлідства, напрыклад цэркваў на дзядзінцы ў Полацку, Міхаіла Архангела і Троіцкай на Клоўцы ў Смаленску, Пятніцкай у Ноўгарадзе, Успенскай у Чарнігаве, Спаскай у Ноўгарадзе-Северскім, Успенскай у Старой Разані, Нараджэння Багародзіцы ў Суздалі, Георгіеўскай у Юр'еве-Польскім і інш. Яны мелі розную колькасць і кампаноўку апорных слупоў кафалікона — агульнай была наяўнасць трох прытвораў па баках свету, што падкрэслівала крыжовую структуру і сімволіку кампазіцыі.

Непадалёку ад Вялікага сабора Бельчыцкага манастыра ў першай

трэці XII ст. быў пастаўлены невялікі мураваны бясстоўпны храм са склепам — магчыма, пахавальня князя Барыса Усяслававіча, так званая Пятніцкая царква. З прычыны нетыповасці яе кампазіцыі для старажытнарускага мураванага дойлідства яна доўгі час лічылася дарэвалюцыйнымі даследчыкамі помнікам храмабудаўніцтва XVII ст. Яна разбурана ў выніку артылерыйскага абстрэлу белапалякамі ў 1921 г. Руіны царквы даследаваліся І. Хозеравым у 1926 і 1928 гг. Ён выявіў першапачатковыя старажытныя фрагменты XII ст. і пазнейшыя прыбудовы, якія адносяцца да 1770—1790 гг.

На час даследавання ад XII ст. ацалелі значныя фрагменты паўднёвай, паўночнай і ўсходняй сцен царквы, якія вызначаюць аўтэнтычныя памеры храма — 5,1 × 5,75 м.

Месцазнаходжанне заходняй сцяны зафіксавана аднаабломнымі лапаткамі. Такім чынам, першапачаткова Пятніцкая царква мела кафалікон, у плане блізкі да квадрата і пры гэтым даволі высокі, каля 7 м, перакрыты корабавым скляпеннем.

Да ўсходняй сцяны прымыкала таксама амаль квадратная ў плане алтарная апсіда, злучаная з кафаліконам праёмам вышынёю 6 м. П. Рапапорт лічыць, што першапачаткова алтарная апсіда адсутнічала, а з захаду да храма прымыкаў невялікі прытвор [106. С. 99].


Пазней заходняя сцяна заменена больш нізкай прамавугольнай у плане часткай, пра што сведчыць іншы характар муроўкі з цэглы больш позняга перыяду. У выніку даўжыня храма дасягнула 8 м.

Сцены былі змураваны з высакаякаснай плінфы з клеймамі ў тэхніцы са схаваным радам на рошчыне з дамешкам цамянкі. Дэкаратыўнасць муроўкі была падкрэслена падфарбоўкай палос плінфы чырвона-карычневым колерам.


Унутры царквы ацалелі рэшткі фрэскавага роспісу, закрытага пазнейшымі напластаваннямі: на паўночнай сцяне — кампазіцыі «Укрыжаванне» і «Грамніцы», на паўднёвай — «Аплакванне», на ўсходніх прасценках, па баках праёма ў алтарную апсіду — выявы князёў Барыса і Глеба. На падставе апошніх І. Хозераў лічыў, што менавіта гэтая царква мела назву Барысаглебскай [149. С. 78]. Ён таксама першым выказаў меркаванне пра прыналежнасць гэтай пабудовы аўтарству дойліда Іаана, якое аспрэчваецца П. Рапапортам.

Архітэктанічна Пятніцкая царква не мае аналагаў сярод помнікаў мураванага дойлідства старажытнарускага перыяду і, на наш погляд, з'яўляецца экстрапаляцыяй у ім прасцейшага тыпу драўлянага праваслаўнага храма таго часу. Яна з'яўляецца першым храмам-пахавальняй з падземнай крыптай; гэты тып храма, відавочна, запазычаны з паўднёвых краін, якія мелі іншы вільготнасны рэжым і больш сухія грунты, але непрыдатнасць яго для мясцовых умоў яшчэ патрэбна было эмпірычна вызначыць.

Акрамя Пятніцкай царквы Бельчыцкага манастыра, у першай палове XII ст. у Полацку існавалі яшчэ два мураваныя храмы, у якіх ажыццяўляліся ганаровыя пахаванні. Іх умоўныя назвы: храм-пахавальня



Мал. 86. Царква-пахавальня на Ніжнім замку ў Полацку. План



Мал. 87. Царква-пахавальня полацкіх епіскапаў. План

полацкіх князёў на Ніжнім замку і храм-пахавальня полацкіх епіскапаў у прадмесці Сялец. Яны па сваіх асноўных параметрах адносяцца да аднаго тыпу славяна-візантыйскага 4-слуповага крыжова-купальнага храма.

Царква на Ніжнім замку, размешчаная на яго рагу, арыентаваным да Палаты, выяўлена і даследавана толькі ў 1976 г. П. Рапапортам. Ацалелі падмуркі і фрагменты ніжніх частак сцен, пры гэтым зусім не захавалася алтарная частка храма, што не дазваляе вызначыць структуру апсід. План кафалікона амаль квадратны (14,1 × 14,5 м). Адпаведна чляненню сцен лапаткамі вызначаны пралёт падкупальнага квадрата — 3,7 м. З паўночнага боку царквы праходзіла галерэя шырынёю 2 м, якая пашыралася на заходнім вуглу. Сярэдняя частка заходняй сцяны ў зоне ўвахода значна большая па таўшчыні, верагодна, тут знаходзілася ўбудаваная лесвіца на хоры.

Царква на Ніжнім замку мае адметную канструкцыю падмуркаў. Асноўныя з іх выкананы з буту без рошчыны і закладзены на глыбіню 1 м, паміж імі зроблена падсыпка з суглінку. У падсыпку паглыблены дадатковыя падмуркі. Муроўка сцен традыцыйная для полацкіх храмаў: са схаваным радам з плінфы, на якой трапляюцца рэльефныя знакі, выкананая на вапняковай рошчыне з дамешкам цамянкі. Унутры царква была размалявана фрэскамі. Лічыць яе пахавальняй дазваляюць знойдзеныя ў раскопках рэшткі разнога саркафага з чырвонага шыферу і шматлікія кавалкі гліняной абмазкі, якой пакрывалі цагляныя надмагіллі.

Тое, што царква ў Сяльцы, адкрытая ў 1947 г. Я. Ашчэпкавым на тэрыторыі Спаса-Праабражэнскага манастыра, мела функцыю пахавальні, пацверджана пісьмовымі крыніцамі. У «Жыціі» святой Еўфрасінні Полацкай адзначана, што епіс-

кап Ілія перадаў ёй месца Спаса на Сяльцы, «идеже братия наша лежа, преже нас бывши епископи». Яе раскопкі праведзены ў асноўным у 1960-я гг. М. Каргерам, у выніку чаго выяўлены значныя фрагменты ніжніх частак сцен і падмуркаў, на падставе якіх зроблена рэканструкцыя планавай схемы збудавання.


Царква-пахавальня полацкіх епіскапаў мела прамавугольны план, блізкі да квадрата, памерам 14,85 × 17,2 м (без апсіды). Чатыры апорныя слупы ў сярэдзіне ўтваралі падкупальны квадрат з даволі значным пралётам — 5,15 м, якому адпавядала шырыня цэнтральнай паўкруглай апсіды. Дзве бакавыя апсіды, паводле гіпатэтычнай рэканструкцыі П. Рапапорта, знаходзіліся ўнутры вуглавых кампартыментаў і не выступалі звонку. Слупы ў сячэнні былі невялікага памеру і крыжападобнай формы з нязначным вынасам лапатак. Таўшчыня сярэдняй часткі заходняй сцяны павялічана да 1,5 м параўнальна з агульнай таўшчынёю сцен, роўнай 1,05 м. Відавочна, што архітэктанічна гэта быў амаль цэнтрычны крыжова-купальны храм з узаема звязанай і шырока раскрытай унутранай прасторай усіх частак.

Асноўны аб'ём царквы-пахавальні полацкіх епіскапаў з поўначы, захаду і поўдня абкружала даволі шырокая (каля 4 м) абхадная галерэя, якая будавалася адначасова з храмам. На паўднёва-заходнім і паўночна-заходнім вуглах галерэі ўтворацы сіметрычныя квадратныя раскрапоўкі. Яшчэ два сіметрычныя квадратныя аб'ёмы-прыдзелы прылягалі да паўночнай і паўднёвай сцен кафалікона на ўсходніх тарцах галерэі і завяршаліся з усходу паўкруглымі апсідамі, што надавала збудаванню пяціапсіднасць з чаргаваннем няцотных вонкавых і цотных схаваных апсід.

Падобнае ўключэнне галерэй з бакавымі прыдзеламі і апсідамі ў кампазіцыю цэнтрычнага 4-слупова крыжова-купальнага храма можна назіраць у двух помніках Смаленска: Петрапаўлаўскай царкве, пабудаванай каля 1127 г., і царкве Іаана Багаслова, якая датуецца 1173 г., але іх архітэктурна-будаўнічыя характарыстыкі вызначаюцца большым прымітывізмам.


Па структуры плана асноўнага аб'ёму храм-пахавальня полацкіх епіскапаў у Сяльцы нагадвае храм-пахавальню полацкіх князёў на Ніжнім замку. Абодва помнікі блізкія па памерах і маюць агульную тэхніку муроўкі і падмуркі з буту, пакладзеныя без рошчыны (у ніжніх частках сцен царквы ў Сяльцы ўключаны таксама рады прыроднага каменю). Гэта дазваляе лічыць, што яны складаюць аднатыпную і адначасовую архітэктанічную групу, пэўны этап у развіцці полацкай школы дойлідства.

Падобную да разгледжаных помнікаў тэхналогію ўзвядзення падмуркаў з буту без рошчыны на падсыпцы з гліны і вапняку, а таксама аналагічны матэрыял муроўкі сцен мела царква, якая знаходзілася на вонкавым баку абарончага рва дзядзінца. Царква «на рву» была выяўлена археолагамі паступова: спачатку, у 1960-х гг., — рэшткі старажытных будаўнічых матэрыялаў: плінфы з рэльефнымі знакамі і княжац-



Мал. 88. Царква "на рву" ў Полацку. План

Мал. 89. Дабравешчанская царква ў Віцебску. План (паводле П. Бараноўскага)



кімі клеймамі, паліваных керамічных плітак (М. Каргер); затым, у 1976 г., — нязначныя рэшткі ўласна храма, датаванага П. Рапапортам сярэдзінай XII ст. Час знішчэння гэтага помніка невядомы, але канчаткова, да падмуркаў уключна, ён зруйнаваны ў пачатку XX ст. Ад царквы ацалелі толькі падмуркі незвычайна вялікай для полацкага дойлідства таго часу алтарнай апсіды даўжынёю 7,5 м, пралёт — 4,45 м. Велічыня пралётаў бакавых частак і наяўнасць у іх дадатковых апсід не ўстаноўлена, таму адсутнічае магчымасць дакладна вызначыць архітэктанічныя характарыстыкі гэтага храма.

Параўнальна з разгледжанымі вышэй 4-слуповымі крыжова-купальнымі храмамі, архітэктанічна дастаткова блізкімі з іншымі ўсходнеславянскімі помнікамі таго часу, марфалагічна адметную групу ў кантэксце полацкай школы дойлідства складаюць тры мураваныя цэрквы, час узвядзення якіх датуецца рознымі даследчыкамі другой чвэрцю

XII ст. Па асаблівасцях архітэктонікі і будаўнічай тэхнікі гэтых помнікаў ёсць падставы лічыць, што пачатак фарміраванню новай мясцовай мадыфікацыі старажытнарускага храма пакладзены не ў Полацку, а ў Віцебску. Першым яе ўзорам стала віцебская Дабравешчанская царква, якая, аднак, заўсёды разглядалася археолагамі паводле геаграфічнага крытэрыя, асобна і пасля ўсіх помнікаў полацкага рэгіёна. Толькі гісторыкі архітэктуры М. Брунаў і М. Шчакаціхін слушна ставілі яе разгляд наперадзе саборнай царквы Спаса-Праабражэнскага манастыра ў Полацку, зазначыўшы пры гэтым, што «віцебская царква была пакладзена ў аснову найболей арыгінальнай плыні беларускае архітэктуры XI—XIII стст.» [15. С. 279].

У летапісных крыніцах не пазначаны дакладны час будаўніцтва Дабравешчанскай царквы ў Віцебску. Паданне, зафіксаванае ў познім «Летапісе Віцебска», адносіць яе ўзвядзенне па загаду княгіні Вольгі да X ст. — гэтай даціроўкі прытрымліваўся першы даследчык помніка А. Паўлінаў. Дакументальныя гістарычныя звесткі пра царкву з'яўляюцца толькі на старонках беларуска-літоўскіх летапісаў у XV—XVI стст. На іх падставе Мацей Стрыйкоўскі адносіў пабудову Дабравешчанскай царквы ў Віцебску да XIV ст. — часу праўлення вялікага князя Альгерда. Але большасць даследчыкаў канца XIX — першай паловы XX ст. лічылі, што ў XIV ст. была ажыццёўлена толькі перабудова святыні.

У 1619 г. па загаду караля Жыгімонта III Вазы віцебская Дабравешчанская царква была перададзена уніятам. Будынак царквы моцна пацярпеў падчас Паўночнай вайны і доўгі час стаяў напаўразбураны. У 1714 г. ён адрамантаваны, а ў 1759 г. капітальна перабудаваны ў стылі позняга барока: быў зняты купал, зменены дахі, прыбудаваны двухвежавы экзанартэкс. Яшчэ да скасавання уніі, у 1831 г., царква была перададзена праваслаўным, адрамантавана ў 1833 г., а ў сярэдзіне XIX ст. перабудавана. Але пры гэтым царкве не вярнулі пачатковы выгляд, а надалі рысы псеўдарускага стылю, узвялі цыбулепадобны купал на глухім драўляным барабане. Адначасова ў старажытных мурах былі прабіты вялікія вокны і часткова закладзены старыя. У гэтым стане Дабравешчанскую царкву даследавалі А. Паўлінаў, М. Брунаў, І. Хозераў, М. Шчакаціхін.

Падчас Другой сусветнай вайны помнік быў часткова разбураны, у 1944 г. яго абмеры праведзены П. Бараноўскім. У снежні 1961 г. па ініцыятыве гарадскіх улад Віцебска Дабравешчанская царква была ўзарвана, засталіся рэшткі муроў вышынёю да 5 м. Пасля гэтага праведзены археалагічныя раскопкі храма: у 1964 г. — Г. Штыхавым, у 1968 г. — М. Каргерам, пазней П. Рапапортам, А. Трусавым. У 1992—1998 гг. ажыццёўлена рэстаўрацыя помніка ў яго аўтэнтычным выглядзе (архітэктар Г. Лаўрэцкі).

Аналіз архітэктурных формаў і будаўнічай тэхнікі Дабравешчанскай царквы ў Віцебску дазволіў даследчыкам датаваць час яе ўзвядзення прыблізна другой чвэрцю XII ст. (каля 1140 г.). Паводле вон-



Мал. 90. Дабравешчанская царква ў Віцебску. Сучасны выгляд

кавага абрысу, царква прадстаўляе прамавугольны ў плане будынак памерамі 18,2 × 11,1 м, завершаны з усходу адной паўкруглай алтарнай апсідай, аздобленай плоскімі вертыкальнымі цягамі (агульная даўжыня па восі ўсход-захад 21 м). Праслы сцен падзелены шырокімі аднаабломнымі лапаткамі з невялікім вынасам, адпаведна чляненню ўнутранай прасторы храма шасцю апорнымі крыжападобнымі слупамі. Два заходнія слупы ўключаны ў тоўшчу сцяны, што аддзяляе нартэкс, астатнія чатыры ўтвараюць падкупальны квадрат, злучаны сістэмай падпружных арак.

Сімвалічнае і кампазіцыйнае значэнне ўрачыста-ўзнёслай прасторы сяродкрыжжа падкрэслена светлавым барабанам на ветразях, завершаным шаломападобным купалам. Пад барабанам знаходзіўся невысокі квадратны пастамент. Відавочна, што віцебская Дабравешчанская царква ў аснове мела пашыраную на той час кампазіцыю крыжова-купальнага 4-слуповага храма, дапоўненую нартэксам. Але часцей яна традыцыйна і не зусім дакладна вызначаецца археолагамі як 6-слуповы трохнефавы храм.

Адметнасцю архітэктонікі Дабравешчанскай царквы з'яўляецца тое, што крок шасці слупоў і нартэкса роўны пралёту падкупальнага квадрата, у выніку чаго ўнутраная прастора храма падзяляецца на аднолькавыя квадратныя ў плане ячэйкі, якія ствараюць цэнтральны неф, завершаны паўкруглай алтарнай апсідай. Бакавыя пралёты паміж слупамі і сценамі амаль удвая меншыя за сярэдні. Пры азначаным вялікім кроку апор абапал цэнтральнага нефа ўтвараюцца выцягнутыя прамавугольныя ў плане прасторавыя ячэйкі, перакрытыя аднолькавымі цыліндрычнымі скляпеннямі-закамарамі, аднак рознай вышыні. Закамары па баках падкупальнага квадрата большыя па вышыні і роўныя скляпенням цэнтральнага нефа, у выніку чаго ў верхнім сячэнні план царквы прадстаў-


ляе крыж, але ўпершыню ў полацкім дойлідстве не дакладна «грэчаскі», роўнаканцовы, а папарна роўнаканцовы па баках свету.

Адметныя прапорцыі агульнага плана збудавання і асобных яго частак, значная перавага даўжыні над шырынёю, падоўжаная выцягну тасць унутранай прасторы фарміруюць яго так званую базілікальнасць альбо «базылікальны характар». На гэтай падставе М. Брунаў лічыў, што ў віцебскай Дабравешчанскай царкве «напластаваліся заходне-эўрапейскія, раманскія элементы, а таксама рысы, якія прыйшлі сюды з Каўказу праз будаўніцтва Галіцкага княства» [15. С. 279]. Аднак травеі (квадратныя ў плане прасторавыя ячэйкі) базілікальных раманскіх сабораў мелі аднолькавую вышыню і крыжовыя скляпенні, што не адпавядае канструкцыйна-будаўнічым прыёмам віцебскай царквы. Па характару цыліндрычных скляпенняў-закамар і рытму чляненя прасторы відавочна, што генетычна яна звязана з усходнімі раннехрысціянскімі храмамі Закаўказзя, якія мелі падобныя прапорцыі планаў і канструкцыі перакрыццяў.

Бакавыя прасторавыя часткі храма з усходу завершаны невялікімі вуглавымі кампартыментамі з паўкруглымі конхавымі нішамі (прафезіс і дзіяканнік), размешчанымі ў тоўшчы ўсходняй сцяны. Звонку яны маюць простакутны абрыс. Такім чынам, тут упершыню ва ўсходнеславянскім дойлідстве выкарыстаны прыём так званых схаваных апсід, які ў далейшым стаў адной з характэрных рыс полацкай школы дойлідства. Падобны прыём схаваных апсід ужываўся таксама ў раннехрысціянскіх храмах Закаўказзя, напрыклад у базіліках у Егвардзе і Ерыруйцы (абедзве — V ст., Арменія) і пазней — у армянскіх цэрквах XII—XIII стст. На гэтай падставе зноў можна гаварыць аб пэўным уплыве на полацкую школу царкоўнага дойлідства праваслаўнай архітэктуры Закаўказзя.

Параўнальна з разгледжанымі больш раннімі помнікамі сакральнай архітэктуры Полацка, яшчэ адной адметнай рысай віцебскай Дабравешчанскай царквы з'яўляецца наяўнасць нартэкса, аддзеленага ад кафалікона суцэльнай мураванай сцяной, над якім размяшчаліся хоры. Паводле абмераў П. Бараноўскага, бакавыя часткі хораў займалі капліцы з невялікімі нішамі-алтарыкамі з усходняга боку. На хоры вяла крутая прамавугольная ў плане лесвіца, цалкам убудаваная ў тоўшчу масіўнай заходняй фасаднай сцяны. Яе размяшчэнне, відавочна, выклікала пэўныя канструкцыйна-будаўнічыя цяжкасці: першая прыступка высока ўзнята над узроўнем падлогі, а восі сіметрыі ўваходнага партала і адпаведнага яму праёма ў алтарнай апсідзе ссунуты ўправа адносна падоўжнай плоскасці сіметрыі збудавання.

Як яшчэ адну адметнасць Дабравешчанскай царквы І. Хозераў адзначае трапецыяпадобны абрыс вімы, якая злёгку пашыраецца ў бок алтара, што мае аналаг у царкве манастыра Хора каля Канстанцінопаля, VII ст. [149. С. 85]. Акрамя галоўнага заходняга партала царква мела ўваходны партал з паўднёвага боку ў зоне падкупальнага квадрата. Парталы мелі арачныя завяршэнні з



Мал. 91. Дабравешчанская царква ў Віцебску. Заходні фасад, рэканструкцыя

двухступеньчатым абрамленнем, выкананыя з плінфы. Амбразуры арачных аконных праёмаў з раструбамі ў два бакі былі выкананы з абчасаных камянёў.

Своеасаблівай была і будаўнічая тэхналогія віцебскай Дабравешчанскай царквы. Будынак меў высокі цокаль — падлога храма знаходзілася амаль на 1 м вышэй тагачаснага ўзроўню зямлі. Падмуркі складзены з бутавага каменю насуха і часткова на вапняковай рошчыне з дамешкам цамянкі. Вышэй сцены змураваны з абчасаных блокаў (квадраў) мясцовага жаўтаватага вапняку (даламіту), рады якіх перамяжаліся радамі добра абпаленай плінфы з рэльефнымі клеймамі і знакамі. Асноўным прынцыпам муроўкі, у якой адсутнічае рэгулярнасць чаргавання тычкоў і лажкоў цаглін, з'яўляецца перавязка вертыкальных швоў. У муроўцы выяўлены два ярусы дубовых сувязей, што апаясвалі будынак па перыметры, і рэшткі дубовых аканіц.

Пласты ружаватай рошчыны былі даволі шырокімі — 4—4,5 см і ў сукупнасці з розным колерам каменных квадраў і плінфы стваралі маляўнічую паліхромную гаму фасадаў, на якіх захаваліся рэшткі вапняковай абмазкі па перыметры квадраў. Унутры сцены і слупы былі атынкаваны і цалкам размаляваны фрэскавым жывапісам, які ў 1623 г. быў закрыты тынкам па загаду уніяцкага мітрапаліта Іасафата Кунцэвіча. У 1926 г. І. Хозеравым выяўлены значныя фрагменты фрэсак. На сённяшні дзень захаваліся фрэскавая выява анёла і паясы геаметрычнага арнаменту з трохвугольнікаў вакол аконных праёмаў і ўнізе сцен. Уваходны партал меў аздобу ў тэхніцы графіці. Частка партала з выявай старажытнага ваяра захоўваецца ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі.


Гісторыка-культурная значнасць віцебскай Дабравешчанскай царквы як узору мураванай манументальнай архітэктуры гэтага рэгіёна пацвярджаецца разнастайнымі дакументальнымі крыніцамі, якія сведчаць пра існаванне ў Віцебску яшчэ двух мураваных храмаў старажытнарускага перыяду. Заснаванне мураванай царквы ў гонар архангела Міхаіла летапіснае паданне, таксама як і Дабравешчанскай царквы, адносіць да часоў княгіні Вольгі — трэцяй чвэрці X ст. [118. Т. 1. С. 455]. Летапіснае паданне пра княгіню Вольгу і заснаванне ёю ў Віцебску

цэркваў Дабравешчання і Міхаіла Архангела, хаця відавочна храналагічна памылковае, дакладна фіксуе геаграфічнае размяшчэнне гэтых храмаў і іх дамінантную ролю ў прасторава-планіровачнай кампазіцыі феадальнага горада: Міхайлаўскай царквы — у структуры Верхняга, Дабравешчанскай — Ніжняга замкаў. Але з-за недастатковасці гісторыка-археалагічных крыніц немагчыма на сённяшні дзень вызначыць, якая з віцебскіх мураваных цэркваў была больш ранняй.

Іншыя клерыкальна-краязнаўчыя крыніцы адносяць пабудову віцебскай Міхайлаўскай царквы да часоў вялікага князя літоўскага Гедыміна — пачатку XIV ст. (А. Семянтоўскі). Але ў гэты час храм, хутчэй, быў знішчаны падчас вялікага пажару горада ў 1335 г. і адноўлены на тым жа месцы ў дрэве. На вядомым «Чарцяжы» Віцебска 1664 г. Міхайлаўская царква прадстаўлена двухзрубавым драўляным збудаваннем з чацверыковай званіцай.


Рэшткі мураванай царквы Міхаіла Архангела ў Віцебску выяўлены археолагамі М. Ткачовым і Л. Калядзінскім у 1978 г. у межах княжацкага дзядзінца на Замкавай гары, раскопкі завершаны Л. Калядзінскім у 1988 г. Знойдзеныя фрагменты муроўкі, плінфы, вапняковых квадраў, мазаічнай смальты і паліванай керамічнай пліткі, на падставе якіх археолагі датуюць узвядзенне храма першай паловай XII ст. — часам княжэння ў Віцебску сына Усяслава Чарадзея — Святаслава Усяслававіча.

Відавочна, што віцебская Міхайлаўская царква, як і Дабравешчанская, была ўзведзена ў змешанай тэхніцы, дзе рады плінфы чаргаваліся з вапняковымі квадрамі з абчэсанымі верхняй і ніжняй гранямі (пасцелямі) і няроўнымі бакавымі. Гэтая тэхніка не з'яўлялася пераходнай ад муроўкі з прыроднага буту да выкарыстання каменных квадраў, як сцвярджаюць некаторыя даследчыкі. Відавочна, што гэтыя розныя тэхнікі муроўкі грунтаваліся на адметных якасцях будаўнічых матэрыялаў: абчэсваць цвёрдыя гнейсавыя пароды каменю даволі складана і працаёмка, а вапняковыя адклады больш лёгкія і зручныя ў апрацоўцы.




Мал. 92. Дабравешчанская царква ў Віцебску. Фрагмент муроўкі XII ст.

У той жа час, адрозна ад Дабравешчанскай царквы, Міхайлаўская царква ў Віцебску была змуравана ў візантыйскай тэхніцы са «схаваным радам», характэрнай для полацкіх помнікаў. Тэхніка муроўкі ўскосна сведчыць на карысць больш ранняга часу яе ўзвядзення. Падлога царквы была ўпрыгожана паліва-



Мал. 93. Барысаглебская царква Бельчыцкага манастыра: план, малюнак XIX ст.



нымі керамічнымі пліткамі жоўтага і зялёнага колераў ромбападобнай і трохвугольнай формы, якія ствараліўзорыстую кампазіцыю з зубчастай палосай уздоўж сцен. Вокны мелі зашкленне ў свінцовым абрамленні і драўляныя аканіцы. Аднак фрагментарныя знаходкі археолагаў не дазваляюць зрабіць рэканструкцыю планавай схемы Міхайлаўскай царквы і аб'ёмна-прасторавых суадносін архітэктонікі збудавання, што дазволіла бы выявіць яе месца ў працэсе эвалюцыі полацкай школы дойлідства.

Магчыма, яшчэ адна мураваная царква старажытнарускага перыяду ў гонар святых Барыса і Глеба была пабудавана ў XII ст. за межамі сярэдневяковага Віцебска, на левым беразе Заходняй Дзвіны ў сутоку яе з ручаём Пескавацік (мясцовасць звалася Сутокі). Гістарычныя звесткі па гэтаму помніку сабраны і сістэматызаваны Р. Баравым. У пачатку XVII ст., верагодна, у сувязі з забойствам віцяблянамі уніяцкага архібіскупа Іасафата Кунцэвіча, невялікая Барысаглебская царква была пераасвечана ў яго гонар як уніяцкая і перабудавана ў стылі барока. «Капліца св. Іасафата, мураваная» пазначана на планах Віцебска XVIII — пачатку XIX ст. Пасля вяртання ў праваслаўе яна была прыпісана да Тадулінскага манастыра. У 1812 г. у крыпце пад царквою знаходзілася сховішча агнястрэльных прыпасаў і пораху французскай арміі. На працягу паўстагоддзя яна паступова прыходзіла ў заняпад, з 1872 г. вялася перапіска царкоўнай кансісторыі і настаяцеля манастыра наконт дазволу «зламаць мураваную ліквідаваную Барысаглебскую царкву», што і было ажыццёўлена канчаткова ў 1888 г.

Стан помніка на 1860-я гг. зафіксаваны на малюнку настаўніка ма-

лявання Віцебскай гімназіі А. Міняты, дзе прастаўлены прамавугольны ў плане культавы будынак, які мае выразныя выцягнутыя па вертыкалі прапорцыі і накрыты двухсхільным дахам з фігурнымі барочнымі франтонамі на абодвух тарцах. Вялікія вокны з паўцыркульнымі арачнымі завяршэннямі размешчаны ў тры ярусы (уключаючы напаўпадземныя вокны ў крыпце). Масіўныя сцены аформлены плоскімі пілястрамі і прафіляванымі карнізамі. На абрысе плана царквы, выкананым Д. Струкавым, бачна, што яна ўяўляла прамавугольны аб'ём з суадносінамі бакоў 2:1 з паўкруглай апсідай, арыентаванай, паводле плана 1825 г., на поўнач. На наш погляд, нельга адназначна сцвярджаць, што гэта храм старажытнарускага перыяду, а не помнік мураванага дойлідства ранняга барока, узведзены на месцы старажытнай праваслаўнай святыні. Аднак не выключана, што віцебская Барысаглебская царква з'яўлялася часткай загараднай княжацкай рэзідэнцыі і храмам-пахавальняй, накшталт Пятніцкай царквы Бельчыцкага манастыра ў Полацку, з якой яна мае пэўнае падабенства.

Многія архітэктурна-будаўнічыя прыёмы, якія ўпершыню назіраюцца ў віцебскай Дабравешчанскай царкве, у хуткім часе былі перанесены ў Полацк, рэзідэнцыю епіскапа, і знайшлі ўвасабленне ў архітэктанічным вырашэнні трэцяга па ліку храма Бельчыцкага манастыра, так званай Барысаглебскай царквы. Яна, як зазначаў П. Рапапорт, ёсць «першая рэдакцыя таго архітэктурнага тыпу, які ў завершанай форме прадстаўлены Спаскім саборам» [105. С. 63].

Паводле «Жыція» святой Еўфрасінні Полацкай, саборная царква Спаса-Праабражэнскага манастыра ў Сяльцы пад Полацкам пабудавана дойлідам Іаанам, магчыма, манахам Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра, які кіраваў мясцовай будаўнічай арцеллю пад патранатам епіскапа Іліі (1123—1143). На падставе архітэктанічнай блізкасці Спаса-Праабражэнскай і Барысаглебскай цэркваў можна сцвярджаць, што і апошняя належыць аўтарству дойліда Іаана, прычым з гэтых двух помнікаў яна, верагодна, больш ранняя.

У 1908 г. Барысаглебскую царкву даследаваў А. Паўлінаў, які, нягледзячы на дакументальныя гістарычныя крыніцы, не прызнаў яе за помнік XII ст. з прычыны значных зменаў архітэктурнай кампазіцыі на працягу яе існавання. На малюнку канца XIX ст. царква выглядае кампактным, амаль кубічным збудаваннем, накрытым пакатым чатырохсхільным дахам, у цэнтры якога на несапраўным васьмігранным барабане ўзвышалася маленькая цыбулепадобная галоўка. Фасады аздоблены шырокімі пілястрамі, а над уваходам зроблена вялікае стральчатага абрысу акно. Царква ў той час знаходзілася ў аварыйным стане, у выніку чаго з 1879 па 1908 г. была зачынена, да 1913 г. адрамантавана, але затым моцна пацярпела падчас грамадзянскай вайны. Каля 1924 г. з дазволу гарадскіх улад насельніцтва разбірала царкоўныя муры на цэглу для гаспадарскіх патрэб.

У 1928 г., калі помнік даследаваў І. Хозераў, усходняя сцяна цалкам адсутнічала, астатнія сцены ўзвышаліся да аснавання скляпенняў. На сённяшні дзень ён цалкам зруйнаваны. І. Хозераў зрабіў частковыя

археалагічныя раскопкі і абмеры, на падставе якіх вызначыў асноўныя характарыстыкі збудавання. Архітэктанічна ён вызначыў Барысаглебскую царкву як «шасціслуповы цэнтральнакупальны храм аб трох нефах, з нартэксам, аддзеленым ад бакавых нефаў глухой сцяной» [149. С. 74]. Заўважым, што вызначэнне «цэнтральнакупальны» не мае сэнсу пры адсутнасці цэнтрычнасці кампазіцыі. Відавочна, што І. Хозераў падмяняў ім паняцце «крыжова-купальны», але ў тыя часы ўжываць слова «крыж», нават тэрміналагічна, было небяспечна.

Асноўны аб'ём царквы (кафалікон) у плане ўяўляў квадрат, бакі якога роўныя 8,3 м. У цэнтры гэтага невялікага аб'ёму чатыры крыжападобныя слупы ўтваралі падкупальны квадрат, пралёт якога быў удвая большы за бакавыя. На ўзроўні апорнага кольца барабана купала цылiндрычныя скляпенні шырокіх пралётаў утваралі роўнаканцовы грэчаскі крыж, арыентаваны па баках свету, а не папарна роўнаканцовы, як у віцебскай Дабравешчанскай царкве. У гэтым можна заўважыць адваротнае ўздзеянне мясцовай полацкай храмабудаўнічай традыцыі на ўсходнехрысціянскія архітэктурнакампазіцыйныя прыёмы. Вуглавыя кампартыменты былі зусім маленькія, што, дарэчы, узмацняла ў інтэр'еры ўражанне ад раскрытасці светлай цэнтральнай крыжовай прасторы. У двух уваходніх кампартыментах былі зроблены схаваныя ў тоўшчы сцяны невялікія паўкруглыя конхавыя нішы-апсідкі. Звонку выступала толькі адна вялікая паўкруглая апсіда, аздобленая тонкімі паўкалонкамі, якая адпавядала пралёту падкупальнага квадрата.

У бельчыцкай Барысаглебскай царкве, як і ў віцебскай Дабравешчанскай, два слупа з шасці цалкам уваходзілі ў тоўшчу заходняй сцяны, што ад самага аснавання аддзяляла кафалікон ад нартэкса, апошні, хутчэй за ўсё, быў больш нізкі і меў самастойнае пазакамарнае пакрыцце. Ніжні ярус нартэкса перакрываўся корабавым скляпеннем, пяты якога ўваходзілі ў муроўку вонкавых бакавых сцен. Над ім месціліся хоры, але ніякіх слядоў лесвіцы, убудаванай альбо прыбудаванай, якая б вяла на іх, археолагамі не выяўлена. Верагодна, яна была драўлянай.

Дрэва ўжыта таксама ў будаўнічых канструкцыях храма. Па ўсяму перыметру будынка ў традыцыйнай муроўцы сцен з плінфы са схаваным радам крыху ніжэй узроўня вокнаў І. Хозераў выявіў канал амаль квадратнага сячэння, дзе некалі праходзіў пояс драўляных сувязей з дубовых брусоў, які, па ідэі, павінен быў змацоўваць канструкцыю, але пазней згніў. Гэты прыём, зноў жа, са старажытнасці практыкаваўся ў мураваным будаўніцтве паўднёвых краін, але, відавочна, не падыходзіў для мясцовага вільготнага клімату. Для ўцяплення царквы ўжываліся драўляныя аканіцы з суцэльнай хваёвай дошкі з трохвугольнай адтулінай пасярэдзіне. У месцах далучэння да адхонаў вокнаў аканіцы абмазваліся глінай, а пазней былі замураваны разам з вокнамі ніжняга яруса. Яшчэ адна рыса ўсходняга ўплыву назіраецца ў падковападобнай форме арак аконных праёмаў нартэкса, таксама


пазней замураваных. На раскрытых пры раскопках адхонах вокнаў археолагамі выяўлены багаты арнаментальны фрэскавы роспіс, адметны па колеру і малюнку арнамента і на кожным з вокнаў.

Агульная архітэктоніка і ўзаемная абумоўленасць аб'ёмна-прасторавых частак збудавання былі дакладна выяўлены на фасадах Барысаглебскай царквы. Сцены асноўнага аб'ёму чляніліся шырокімі плоскімі аднаабломнымі лапаткамі, якія адпавядалі сячэнню і вынасу апорных слупоў. Вузкія праслы сцен адпавядалі пралёту паміж імі і выяўлялі заціснутасць унутранай прасторы вуглавых кампартыментаў. Праслы сцен у два ярусы прарэзвалі вокны, пры гэтым вокны ніжняга яруса размяшчаліся ў двухабломных арачных нішах, якія выконвалі разгрузачную функцыю і былі значна большыя за верхнія аконныя праёмы, што надавала пластыцы сцен пэўную дынаміку. Яна ўзмацнялася неадпаведнасцю радоў муроўкі арачных нішаў адносна агульнай муроўкі сцен. Палосы плінфы дадаткова былі падфарбаваны чырвона-карычневым колерам дзеля ўзмацнення дэкаратыўнага эфекту.

Сцены з усіх бакоў завяршала маляўнічая лінія пазакамар, з якіх па вышыні і шырыні на кожным фасадзе вылучалася цэнтральная, што падкрэслівала цэнтрычнасць асноўнага аб'ёму, увенчанага купалам на светлавым барабане. Пад барабанам, магчыма, знаходзіўся дадатковы пастамент, як у саборнай царкве полацкага Спаса-Праабражэнскага манастыра.

Параўнальна са Спаса-Праабражэнскай царквой Барысаглебская царква мела меншыя памеры, больш простыя абрамленні вокнаў, традыцыйную крыжападобную форму слупоў і аднаабломныя лапаткі, як у папярэдніх помніках сакральнага дойлідства Полацка. У ёй адсутнічала ўбудаваная лесвіца на хоры, а корабавае скляпенне нартэкса, відавочна, паўтарала больш ранняе корабавае скляпенне Пятніцкай царквы таго ж манастыра. Акрамя таго, у ёй больш выразна выяўлены элементы ўплыву раннехрысціянскага дойлідства Закаўказзя. На іх падставе можна ўпэўнена сцвярджаць, што будаўнікі Барысаглебскай царквы Бельчыцкага манастыра мелі духоўна-практычныя стасункі з праваслаўнымі манастырамі закаўказскага рэгіёна.

Саборная царква Спаса-Праабражэнскага манастыра храналагічна і творча завяршае адзначаную групу храмаў і ўздымае да вяршынь сусветнай культуры полацкую школу дойлідства старажытнарускага перыяду. Паводле агіяграфічнага «Жыція» святой Еўфрасінні Полацкай, напісанага ў другой палове XII ст., аднойчы ў сне прападобная Еўфрасіння ўбачыла, як «...узяў яе ангел і павёў туды, дзе была цэркаўка Святога Спаса, метохія Святой Сафіі, што людзі завуць Сяльцом. І паказаў ёй анёл Госпадавы, кажучы так: «Еўфрасіння! Тут належыць быць табе!» Падобны сон убачыў і полацкі епіскап Ілія, які блаславіў Еўфрасінню на заснаванне ў Сяльцы, за 2 км ад тагачаснага Полацка, «идеже братия наша лежа, преже нас бывши епископи», Спаса-Праабражэнскага жаночага манастыра, што часам на-



зываюць таксама Спаса-Еўфрасінеўскім. «И посему блаженная Евфросиния заложи церковь каменну Святога Спаса» на месцы старой драўлянай царквы.

Факт будаўніцтва гэтага храма трактуецца агіяграфічнай крыніцай як цуд, але дакладная дата яго ўзвядзення не вызначана. Яна вар'іруецца рознымі даледчыкамі ад 1043 да 1061 г. Усяго за 30 тыдняў «приставник над делатели церковными» дойлід-манах Іаан (у другой рэдакцыі — Іван), паводле «Жыція» таксама натхнёны анёлам, разам з дружынаю змураваў новую Спаса-Праабражэнскую царкву — адзін з самых выдатных помнікаў усходнеславянскага дойлідства. У канцы будаўніцтва выявілася, што для завяршэння храма не хапае цэглы, якая, пасля шчырай малітвы будаўнікоў, была знойдзена імі ў печы на наступную



Мал. 94. Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку: план і сучасны выгляд


раніцу. Пасля заканчэння будаўніцтва «бысть торжество велие и праздноваша многия дни».

Спасаўская царква — адзіны помнік храмабудаўніцтва Полацка XII ст., які дайшоў да нашага часу не ў рэштках на ўзроўні падмуркаў, а ў архітэктурным стане, аўтэнтычным да ўзроўню скляпенняў. Але аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя вянчаючых мас храма і яго мастацкае аблічча значна зменены пазнейшымі перабудовамі. У пачатку XVII ст. Спасаўская царква перададзена полацкім езуітам, якім належала да 1820 г. (за выключэннем 1656—1667 гг.), затым да 1832 г. — ордэну піяраў. Пры езуітах царква пераўтворана ў касцёл, пабудавана крыпта, істотна перабудаваны нартэкс, над закамарамі надбудаваны верхнія часткі сцен, аб'ёмы аб'яднаны агульным двухсхільным дахам, зменена форма лапатак, якія пераўтвораны ў паўкалоны, затынкавана фрэскавая размалёўка. Будынак моцна пацярпеў падчас ваенных дзеянняў 1812 г., на сценах доўгі час заставаліся сляды куль. У 1832 г. царква вернута праваслаўным, у 1841 г. пры ёй адноўлены жаночы манастыр. У 1833 г. полацкім архітэктарам А. Порта выкананы праект рэканструкцыі храма, які зафіксаваў стан помніка на гэты час. Паводле праекта меркавалася закласці лесвіцу на хоры, што не было ажыццёўлена, але зроблены пілястры, спрошчана форма капітэляў. Рамонты будынка праводзіліся таксама ў 1843—1846 гг. і ў 1910—1913 гг.

Вывучэнне архітэктуры Спасаўскай царквы распачаў у канцы XIX ст. гісторык архітэктуры А. Паўлінаў. Характэрную адметнасць помніка — наяўнасць у аснаванні барабана купала квадратнага пастамента — адзначыў у сваіх замалёўках 1898 г. мастак Д. Струкаў, які працаваў тут па даручэнні Археалагічнай камісіі. У 1914 г. Спасаўскую царкву, разам з іншымі помнікамі старажытнарускага перыяду, вывучаў П. Пакрышкін. У 1920-я гг. архітэктурныя адметнасці Спасаўскай царквы ў кантэксце ўсходнеславянскага манументальнага дойлідства XII—XIII стст. прыцягнула пільную ўвагу савецкіх гісторыкаў архітэктуры і археолагаў.

Амаль аднолькавую графічную рэканструкцыю яе першапачатковага выгляду зрабілі незалежна адзін ад аднаго М. Брунаў і І. Хозераў. Яна доўгі час лічылася канчатковай і публікавалася ў шматлікіх выданнях. У канцы 1970-х гг. П. Рапапортам і Г. Штэндарам праведзены дадатковыя абмеры верхніх частак будынка, якія дазволілі наблізіцца да дакладнага вызначэння аўтэнтычных архітэктурных формаў Спасаўскай царквы. У выніку, на падставе новых глыбокіх архітэктурна-археалагічных даследаванняў, імі зроблена найбольш грунтоўная графічная рэканструкцыя помніка.

Як і папярэднія помнікі полацкай школы дойлідства, Спасаўская царква, паводле архітэктурнай тыпалогіі, — крыжова-купальны храм з кампазіцыйным ядром кафалікона ў выглядзе роўнаканцовага грэчаскага крыжа і больш нізкімі аб'ёмамі нартэкса з захаду і паўкруглай алтарнай апсіды з усходу. Параметры збудавання: даўжыня — 14,4 м (з апсідай — 18,2 м), шырыня — 9,8 м, пад-



Мал. 95. Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку. Паўднёвы і заходні фасады. Рэканструкцыя П. Рапапорта і Г. Штэндэра

купальны квадрат — 2,85 × 2,67 м. Асноўны аб'ём храма мае выцягнутую прамавугольную планавую схему, якая развівае архітэктанічныя асаблівасці разгледжаных вышэй віцебскай Дабравешчанскай і бельчыцкай Барысаглебскай цэркваў. Параўнальна з імі ўнутры Спасаўская царква сапраўды 6-слуповая, але мае болей нідзе не паўтораную кампаноўку і форму апорных слупоў. Крок і пралёт паміж слупамі і сценамі аднолькавы і меншы за іх таўшчыню. Пры азначаным характары чляненне ўнутранай прасторы ўтвараюцца вельмі маленькія квадратныя ў плане вуглавыя кампартыменты. Гэта стварае рэальнае адчуванне перавагі масы матэрыялу над унутранай прасторай храма.


Два слупы-пілоны з усходняга боку падкупальнага квадрата маюць масіўнае прамавугольнае сячэнне. Усходнія кампартыменты кафалікона, дзе размешчаны ахвярнік (прафезіс) і дыяканнік, завершаны паўцыркульнымі конхавымі нішкамі-апсідамі, схаванымі ў тоўшчы сцяны. Яны аддзелены ад вялікай цэнтральнай апсіды масіўнымі сценамі з невялікімі арачнымі праёмамі, што робіць прастору алтарнай часткі моцна выцягнутай у падоўжным напрамку. Іканастас размешчаны паміж усходнімі апорнымі пілонамі, што адпавядае раннехрысціянскай традыцыі ажыццяўлення літургічнага дзеяння ў падкупальнай прасторы, якая была зменена толькі ў XV ст.

Чатыром заходнім апорным слупам унізе, на ўзроўні знаходжання вернікаў, нададзена васьміграннае сячэнне, магчыма, каб аптычна зменшыць уражанне іх масіўнасці. Уверсе ўсе апорныя слупы набываюць аднолькавае квадратнае сячэнне, але на розных узроўнях. Пераход ад васьміграннай формы слупоў да квадратнай у нартэксе ажыццяўляецца на ўзроўні хораў, а ў падкупальных слупах значна вышэй, што дазваляе больш эфектна раскрыць падкупальную прастору, якая раптоўна імкліва ўзносіцца ўверх да светлавога барабана купала на невялікіх ветразях.

Крок нартэкса роўны боку падкупальнага квадрата. Над ім зроблены параўнальна вялікія хоры, якія адкрываюцца ў прастору кафалікона шырокім арачным праёмам. Заходняя фасадная сцяна зроблена надзвычай масіўнай (1,8 м), і ў яе тоўшчы на паўночна-заходнім баку ўбудавана лесвіца на хоры, як і ў віцебскай Дабравешчанскай царкве. У заходніх кампартыментах на ўзроўні хораў размешчаны маленькія капліцы крыжападобнай у плане формы, перакрытыя поўнымі ветразевымі скляпеннямі, накшталт маўзалея Галы Плацідзі і ў Равэне. У іх усходніх сценах зроблены невялікія алтарныя нішы і акенцы, адкрытыя ў бакавыя рамёны крыжовага ядра царквы. Тут некалі месціліся келлі прападобнай Еўфрасінні і яе сястры.

Надзвычайная масіўнасць апорных канструкцый Спасаўскай царквы тлумачыцца задумай дойліда стварыць глыбока сімвалічны ўрачысты і светлы мастацкі вобраз храма як сімвала духоўнага гарэння. Гэтая ідэя яскрава выяўлена ў своеасаблівай ярусна-пірамідальнай аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі храма і непаўторнай арганізацыі яго вянчаючых мас. У кампазіцыі дамінуе строга цэнтрычны аб'ём кафалікона, завершаны на ўсіх чатырох фасадах аднолькавым маляўнічым абрысам закамар з двухступеньчатымі архівольтамі. Крыжовае ядро кафалікона вылучана больш высокімі і шырокімі закамарамі, поле якіх было прарэзана невялікімі крыжападобнымі вокнамі, што падкрэслівала семантыку кампазіцыі. Закамары над заходнімі вуглавымі кампартыментамі не сапраўдныя, паколькі ўнутры яны перакрыты ветразевымі скляпеннямі. Дзеля выяўлення асноўнай мастацка-сімвалічнай ідэі канструкцыйны паўцыркульны абрыс закамар скульптурна дапоўнены кілепадобнымі абрамленнямі, што нагадваюць языкі полымя.

Адметнасцю архітэктонікі Спасаўскай царквы з'яўляецца наяўнасць пад барабанам купала масіўнага амаль кубічнага пастамента, які абапіраўся на падпружныя аркі сяродкрыжжа. Звонку пастамент быў аформлены несапраўднымі закамарамі (какошнікамі) трохлопасцевага абрысу, таксама дапоўненымі кілепадобнымі абрамленнямі яшчэ больш завостранага малюнка, што ўзмацняла нарастаючую ўверх дынаміку форм. Паміж кілепадобнымі завяршэннямі трохлопасцевых какошнікаў на абмазцы барабана купала захаваўся след дыяганальнага кілепадобнага какошніка. Такім чынам, барабан купала нібыта вырастаў з васьмі завостраных пялёсткаў дэкаратыўных какошнікаў, малюнак і




Мал. 96. Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку. Падоўжны разрэз


мастацкая ідэя якіх апярэджваюць па часе матывы заходнееўрапейскай палымнеючай готыкі. Цыліндр барабана падзяляўся тонкімі паўкалонкамі на восем частак, якія прарэзвалі высокія арачныя вокны, і завяршаўся аркатурным поясам. Усю кампазіцыю вянчаў шаломападобны купал з крыжам.


Дэкаратыўны кілепадобны абрыс майстры-будаўнікі наносілі па свежай абмазцы нейкім інструментам з двума паралельнымі зубцамі на адлегласці 2,5 см. Затым паводле гэтага абрысу на шалызе скляпення рабілі падвышэнне з цэглы, пастаўленай на рабро, і з дапамогай вялікай колькасці рошчыны фарміравалі кілепадобнае абрамленне. Не звязаныя канструкцыйна з муроўкай скляпенняў скульптурныя кілепадобныя абрамленні закамар і какошнікаў былі разбураны пры пазнейшых перабудовах. Іх рэшткі, схаваныя ў паддашшы, ацалелі толькі ў некалькіх месцах, таму сам факт іх існавання быў выяўлены даволі нядаўна, у 1976 г.

Калі трохлопасцевая форма ўжо мела прэцэдэнт ужывання ў больш ранніх помнікаҳ старажытнарускага перыяду, то ў выкарыстанні кілепадобнай формы дойліду Іаану аддаецца безумоўны прыарытэт, тым болей што ў яго творы гэтая форма ўжываецца шырока, шматпланава, мэтанакіравана і гарманічна. Форма кілепадобнай аркі паходзіць з культуры старажытнай Персіі, а ва ўсходнеславянскім рэгіёне раней полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы адзначана толькі ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве ў выглядзе так званых «гародчатых вянцоў».

Акрамя дэкаратыўна-семантычнай ролі сістэма кілепадобных какошнікаў і закамар мела таксама утылітарную функцыю: яна прызначалася для адводу з дахаў ліўневай вады і снегу. Карніз какошнікаў меў вынас да 25 см, каб пазбегнуць зацякання сцен. Стыкі паміж какошнікамі і закамарамі мелі нахіленыя вадасцёкавыя жалабы. Гэтая сістэма прынцыпова адрознівалася ад вадамётаў-выдраў, характэрных для іншых школ старажытнарускага дойлідства, і сведчыць пра творчую самастойнасць мясцовых будаўнікоў. Ніжні ярус пірамідальнай кампазіцыі Спасаўскай царквы складалі невысокія аб'ёмы нартэкса і алтарнай апсіды з самастойнымі пластычнымі пакрыццямі. Над паўднёвым і паўночным фасадамі нартэкса былі зроблены несапраўдныя закамары, а над імі ўзведзены плаўныя ніцыя сценкі дзеля гарманічнага злучэння плас-








Мал. 97. Знакі на полацкай плінфе (паводле М. Каргера)

тычных завяршэнняў аб'ёмаў і таксама для вадасцёку.

Фасадныя сцены царквы, адпаведна канструкцыйнаму чляненню інтэр'ера апорнымі слупамі, раскрапаваны шырокімі двухабломнымі лапаткамі, прычым верхні аблом выкананы з лякальнай цэглы і мае скругленую форму, магчыма, каб візуальна зменшыць іх масіўнасць. На вуглах будынка спалучалася такім чынам па чатыры абломы, што рабіла абрысы аб'ёмаў прасторава неакрэсленымі. Адначасова вязкі вертыкальных ліній аптычна ўзмацнялі накіраванасці кампазіцыі ўверх.

У прапарцыянальным строі і размяшчэнні аконных праёмаў таксама перавага нададзена вертыкалям. Аконныя праёмы з паўцыркульнымі завяршэннямі размешчаны ў два ярусы і першапачаткова былі афармлены броўкамі. Вокны ніжняга яруса ў паўтары разы большыя за верхнія. Над ніжнім ярусам вокнаў броўкі мелі паўцыркульны абрыс, а над верхнім — кілепадобны, што ўзмацняла вертыкальную дынаміку фасадаў. Броўкі дэкарыравалі і два дзвярныя парталы, размешчаныя ў цэнтры заходняга фасада нартэкса і паўднёвага фасада кафалікона. Партал на паўночным фасадзе не выяўлены.

Будаўнічая тэхналогія Спасаўскай царквы агульная з іншымі пом-



Мал. 98. Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку: фрэска "Невядомая святая", схема роспісаў цэнтральнай апсіды і вімы (паводле А. Сяліцкага)

нікамі полацкай школы дойлідства. Падмуркі з буту сярэдніх памераў пакладзены насуха. Па таўшчыні яны большыя за сцены і маюць скругленыя пашырэнні ў апорных вузлах. Муроўка сцен выканана з якаснай плінфы з рэльефнымі знакамі на вапняковай рошчыне з дамешкам дробнай цамянкі ў тэхніцы са схаваным радам. Броўкі над праёмамі выкладзены з чатырох радоў плінф, з якіх ніжні рад афармлены зубцамі, а тры верхніх зроблены ў выглядзе полак са схаваным сярэднім радам, зацёртым рошчынай і размаляваным фрэскавым арнаментам. Археолагамі выяўлены лякальныя плінфы вялікага памеру з адным

закругленым вуглом і паліваныя керамічныя пліткі першапачатковай падлогі храма.

Вялікую гісторыка-культурную каштоўнасць прадстаўляе фрэскавы роспіс інтэр'ера Спаса-Праабражэнскай царквы, які захаваўся да нашых дзён у значнай колькасці фрагментаў. Падчас валодання храмам езуітамі старажытныя фрэскі былі атынкаваны і забелены, часткова адкрыты пры рамонце ў 1833 г., але затым замаляваны алейнымі фарбамі ў 1835, 1840, 1890 і 1914 гг., што нанесла ім значную шкоду. У савецкі час мастакамі-рэстаўратарамі паслядоўна праводзілася расчыстка фрэсак ад позніх напластаванняў — у 1929, 1937—1940, 1950, 1972 гг. Вынікі гэтай працы сістэматызаваны мастацтвазнаўцамі В. Церашчатавай і А. Сяліцкім. У сувязі з неспрыяльным тэмпературна-вільготнасным рэжымам пазнейшыя алейныя запісы сталі інтэнсіўна разбурацца і адбылося самараскрыццё новых шматлікіх фрагментаў фрэсак. Вядзецца іх рэстаўрацыя (У. Ракіцкі).

На падставе даследаванняў зроблена рэканструкцыя ўсяго сакральнага фрэскавага роспісу, які цалкам займаў сцены, слупы і скляпенні Спаса-Праабражэнскай царквы. Вертыкальная і гарызантальная будова фрэскавага цыклу падпарадкавана структуры іерархіі нябеснай і зямной. Ён уключае шматфігурныя кампазіцыі на евангельскія сюжэты і шматлікія выявы святых, размешчаныя па вертыкалі ў некалькі рэгістраў паводле філафофска-тэалагічнага візантыйскага светапогляду комнінаўскага перыяду.

Фрэскавы жывапіс вызначаецца высокімі мастацкімі вартасцямі, прафесіяналізмам, вытанчанасцю колеравай гамы, псіхалагізмам і індывідуальнасцю асобасных характарыстык. Строга франтальныя выявы спалучаюцца з экспрэсіўнымі ракурсамі фігур, разгорнутых на тры чвэрці. Пад выявай невядомага святога на адной з граняў паўночнаўсходняга падкупальнага слупа на пазёме ў тэхніцы графіці зроблены надпіс: «Месяца сентября представился раб Божий Иван», магчыма, славуты полацкі дойлід. Сярод жаночых вобразаў фрэскавага цыкла ёсць гіпатэтычная выява Еўфрасінні Полацкай, якая вызначаецца амаль партрэтнай рэалістычнасцю і высокай адухоўленасцю.

Выявы святых прадстаўлены ў цёплай колеравай гаме вішнёва-чырвоных, карычневых, жоўтых, ружовых і зялёных таноў на цёмна-сінім альбо шэра-сінім фоне. Выяўлена, што для афарбоўкі фонаў выкарыстаны мясцовы матэрыял — настой палёных яловых шышак, а ў келлі прападобнай Еўфрасінні з той жа мэтай выкарыстана палёная косць, што з'яўляецца візантыйскім прыёмам. Гэта сведчыць пра адпаведнае комплекснае паходжанне тэхналогіі фрэсак.


Спаса-Праабражэнская царква па сваёй архітэктурнай тыпалогіі — славяна-візантыйскі крыжова-купальны храм — не вылучаецца прынцыпова сярод іншых храмаў княжацка-епіскапскага жанру старажытнай Русі, аднак шэраг наватарскіх прыёмаў, закладзеных у аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі полацкай царквы, зрабілі гэты помнік якасна новым

этапам у агульным рэчышчы ўсходнеславянскага дойлідства. У шматлікіх публікацыях Спасаўская царква характарызуецца як вежападобная, аднак гэтае параўнанне відавочна недастатковае для складанай шматаспектнай задумы аўтара.

Тэндэнцыю да пірамідальна-яруснай кампазіцыі ў больш ранніх манументальных помніках, такіх як разгледжаныя вышэй Сафійскія саборы і іншыя, дойлід Іаан віртуозна развіў на прыкладзе невялікага камернага аднагаловага храма, надаўшы яму унікальны мастацкі вобраз. Сваімі творчымі метадамі Іаан апярэдзіў сучасных яму майстроўбудаўнікоў. Найбольш характэрным з гэтых метадаў і праграмным для далейшага развіцця сакральнага дойлідства з'яўляецца гарманічнае падпарадкаванне канструкцыйна-будаўнічых прыёмаў мастацка-сімвалічнай задуме. У архітэктурным вырашэнні Спасаўскай царквы ўпершыню выявіліся мастацка-канструкцыйныя прыёмы, якія сталі характэрнымі для розных рэгіянальных школ старажытнарускага дойлідства з канца XII і да канца XVII ст.

Наступны крок у развіцці адметных архітэктурна-мастацкіх якасцей полацкай школы дойлідства зроблены ў так званай княжацкай царкве, пабудаванай на дзядзінцы старажытнага Полацка прыблізна за 50 м ад Сафійскага сабора. Яе будаўніцтва датуецца археолагамі трэцяй чвэрцю XII ст. Нязначныя рэшткі гэтага збудавання былі адкрыты археалагічнымі экспедыцыямі 1966—1967 гг. пад кіраўніцтвам М. Каргера. Былі выяўлены фрагменты аднаго апорнага падкупальнага слупа, а таксама паўночнай і паўднёвай сцен на вышыню да 1 м, якія дазволілі вызначыць агульныя параметры (24 × 16 м) і рэканструяваць планавую схему храма. На падставе прамавугольнага абрысу і колькасці апорных слупоў рэканструяванай планавай схемы княжацкі храм у Полацку ўстойліва вызначаюць як 3-нефавы, 6-слуповы, 3-апсідны [5. С. 509], хаця на самой справе ніводнае з гэтых вызначэнняў не адпавядае сапраўданай архітэктоніцы збудавання.

Архітэктанічна царква на дзядзінцы з'яўляецца крыжова-купальным храмам з вімай, які марфалагічна суадносіцца з Вялікім саборам Бельчыцкага манастыра, але ўключае ўжо шэраг пазнейшых творчых напрацовак полацкай школы дойлідства, напрыклад схаваныя бакавыя апсіды, двухабломныя скругленыя лапаткі (ці сплошчаныя паўка-



Мал. 99. Царква на дзядзінцы ў Полацку. План


лоны, як вызначае іх П. Рапапорт), зробленыя накшталт адпаведных формаў Спасаўскай царквы.

Аснову аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі княжацкага храма складае цэнтрычны квадратны ў плане кафалікон. Ядро кампазіцыі мела выгляд роўнаканцовага грэчаскага крыжа і перакрывалася ўзаемна перпендыкулярнымі цыліндрычнымі скляпеннямі з купалам на светлавым барабане над сяродкрыжжам. Падкупальны квадрат утваралі чатыры крыжападобныя заходнія слупы (з шасці, якія мяркуюцца паводле планавай схемы). Два дадатковыя слупы былі размешчаны на ўсход ад падкупальнага квадрата і служылі апорай вянчаючых мас кафалікона.

Цэнтральны пралёт унутранай прасторы з усходу завяршала роўная з ім па шырыні вялікая алтарная апсіда, апаясаная з асноўным аб'ёмам агульнай цягай карніза. З дапамогай дадатковай прасторавай ячэйкі вімы алтарная аспіда была значна развіта ў падоўжным напрамку і завяршалася магутным паўкружжам. Бакавыя апсіды (ахвярнік і дыяканнік) былі размешчаны ў невялікіх аб'ёмах, больш нізкіх за кафалікон, і аддзелены ад цэнтральнай апсіды сценамі з арачнымі праёмамі. Адрозна ад Вялікага сабора Бельчыцкага манастыра тут унутраны паўцыркульны абрыс бакавых апсід не выступаў звонку, а быў схаваны ў тоўшчы ўсходняй сцяны, што надавала планавай схеме княжацкага храма прамавугольны абрыс і стварала незвычайны рытм чляненняў паўночнай і паўднёвай сцен.

Нартэкс у царкве на дзядзінцы адсутнічаў. Функцыянальна яго замянялі тры больш нізкія за асноўны аб'ём прамавугольныя ў плане прытворы, якія афармлялі ўваходы ў храм, размешчаныя па восях падкупальнага квадрата з трох бакоў свету: захаду, поўдня і поўначы. Разам з аб'ёмамі бакавых апсід, верагодна, аднолькавай з імі вышыні, прытворы складалі ніжні ярус піраміда-льна-яруснай кампазіцыі збудавання, падкрэслівалі семантыка-сімвалічную ролю цэнтрычнага крыжова-купальнага ядра. Відавочна, што тут дакладна паўторана ідэя Вялікага сабора Бельчыцкага манастыра, аднак параўнальна з ім шырыня прытвораў меншая і роўная пралёту бакавых частак асноўнага аб'ёму, у выніку чаго кампазіцыя збудавання дапаўняецца нібыта дадатковымі нефамі. Акрамя таго, да бакавых паўночнага і паўднёвага прытвораў з усходу далучаны невялічкія конхавыя апсіды, надаючы ім функцыю асобных храмавых прыдзелаў. У чымсьці гэта развівае ідэю больш ранняга храма-пахавальні полацкіх епіскапаў, дзе прыдзелы з апсідамі замыкаюць з усходу абхадную галерэю. У выніку маляўнічая пластыка ўсходняй сакральнай часткі княжацкага храма будуецца на чаргаванні трох няцотных выступаючых і дзвюх цотных схаваных апсід.

Арыгінальная, але пры гэтым строга іерархічная і кананічная кампаноўка аб'ёмаў узбагачала і ажыўляла агульную кампазіцыю збудавання, надавала ёй мастацкую адметнасць, што, безумоўна, уражвала сучаснікаў. Архітэктоніка княжацкага храма ў Полацку была амаль дакладна паўторана ў царкве



Мал. 100. Царква Цуда Міхаіла Архангела ў Смаленску. План

Цуда Міхаіла Архангела ў Смаленску (Свірскай), будаўніцтва якой датуецца 1180—1190 гг. Гэта сведчыць пра непасрэдныя стасункі архітэктурна-будаўнічых школ Полацка і Смаленска. Аўтэнтычныя формы і канструкцыі Свірскай царквы, нягледзячы на пазнейшыя перабудовы, ацалелі да барабана купала ўключна: падпружныя аркі скляпенняў, пастамент пад барабанам і ветразі. Яна мае амаль тыя ж памеры (23,6 × 16,3 м) і планавую схему, што і полацкі княжацкі храм, таму яе аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя паслужыла асновай архітэктурнай рэканструкцыі знешняга выгляду апошняга, зробленай Г. Штыхавым. Аднак, падкрэслім, у сапраўднасці менавіта полацкая царква паслужыла прататыпам смаленскай.

У заходнім прытворы смаленскай царквы Міхаіла Архангела выяўлены скляпенні, якія падзялялі яго на два ярусы. На другім ярусе, як лічаць, месціліся хоры для князя і яго сям'і. У бакавых прытворах-прыдзелах скляпенні ніжняга яруса не выяўлены. Яны перакрываліся скляпеннямі-закамарамі вялікага пралёта. Падобным чынам, верагодна, былі вырашаны прытворы полацкай царквы, якія дадаткова былі афармлены кілепадобнымі абрамленнямі.

Дынамічная кампазіцыя вянчаючых мас княжацкага храма на дзядзінцы ў Полацку творча развівала наватарскія прыёмы будаўніцтва больш ранняй Спаса-Праабражэнскай царквы. Пераход ад падпружных арак скляпенняў да апорнага кольца барабана купала ажыццяўляўся з дапамогай квадратнага пастамента і невялікіх ветразяў. Вуглавыя кампартыменты кафалікона на фасадах завяршаліся закамарамі ў выглядзе чвэрці круга, што разам з павышанымі паўцыркульнымі закамарамі крыжовага ядра кампазіцыі стварала трохлопасцевы абрыс завяршэння ўсіх чатырох фасадаў храма.

Сценавыя палі (фасы) закамар сяродкрыжжа і прыдзелаў, магчыма, як і ў смаленскай царкве, прарэзвалі трайныя аконныя праёмы, з якіх больш высокі цэнтральны завяршаўся паўцыркульнай аркай, а бакавыя — паўаркамі, што падкрэслівала трохлопасцевы абрыс завяршэння фасадаў. Матыў трохлопасцевай аркі паўтораны яшчэ раз у выглядзе какошнікаў на пастаменце барабана купала. У аснаванні шаломападобнага купала светлавы барабан, прарэзаны васьмю аконнымі праёмамі, быў аздоблены парэбрыкам і аркатурным поясам. У дэкоры хра-

ма былі шырока ўжыты паясы парэбрыкаў, надаконныя броўкі, кілепадобныя абрамленні паўцыркульных арачных формаў.


Параўнальна са Спасаўскай царквой кампазіцыя храма на дзядзінцы больш ураўнаважаная, але не менш гарманічная і дасканалая па задуме. Апорныя канструкцыі княжацкай царквы меней масіўныя, а ўнутраная прастора больш светлая і адкрытая. Для іх характэрны агульныя будаўнічая тэхніка і тып дэкору.

Падмуркі княжацкай царквы складзены з валуноў насуха. Муроўка сцен са схаваным радам з плінфы са шматлікімі рэльефнымі знакамі на тарцах. Сярэдзіна сцен запоўнена бутам. У раскопках выяўлены лякальная цэгла разнастайных узораў, паліваныя керамічныя пліткі і фрагменты фрэскавага жывапісу. Пластыку фасадаў узбагачалі двухабломныя лапаткі, пры гэтым скругленыя рэбры верхняга аблома стваралі мяккі светлаценявы пераход. На вуглах спалучалася некалькі абломаў, што стварала неакрэсленасць іх абрысу і тонкія светлаценявыя нюансы. Адначасова шматлікасць абломаў у архітэктанічных вузлах збудавання падкрэслівала яго вертыкальную дынаміку, накшталт гуртаў-нервюр стромкіх калон заходнееўрапейскай готыкі, што нараджалася ў той жа час.


Развіццё полацкай школы дойлідства завяршае чацвёрты па ліку храм бельчыцкага Барысаглебскага манастыра, так званы трыконх, ці храм з бакавымі апсідамі. Пра гэты помнік вядома даўно, але ён надзвычай мала даследаваны. Ужо ў XVIII ст. храм быў цалкам зруйнаваны. У той час узгорак разрылі з мэтай выкарыстання пяску, прычым выпадкова выявілі рэшткі старажытнага храма і зафіксавалі яго ў выглядзе схематычнага малюнка, які на сённяшні дзень з'яўляецца асноўнай дакументальнай графічнай крыніцай. Пад алтарнай часткай была адзначана наяўнасць вялікага склепа, верагодна, крыпты.

У канцы XIX ст. рэшткі збудавання даследаваў А. Паўлінаў, які адзначыў, што сцены змураваны з якаснай плінфы, на рошчыне з дамешкам бітай цэглы, а сярэдзіна іх запоўнена бутам. Ім выяўлена таксама лякальная цэгла са скругленым тарцом. Гэтыя рысы, на наш погляд, збліжаюць будаўнічую тэхніку старажытнага храма з разгледжаным вышэй княжацкім храмам на дзядзінцы і дазваляюць датаваць яе ўзвядзенне другой паловай XII ст.

Паводле вельмі недакладна выкананай планавай схемы, азначаны храм умоўна вызначаюць як трыконх, ці храм з бакавымі апсідамі, і датуюць даволі шырока: XII—XIII стст. [31, 106, 145]. Навуковы мастацтвазнаўчы аналіз паказвае, што ў рэчаіснасці храм архітэктанічна прадстаўляў сабою ўсё той жа крыжова-купальны тыпалагічны варыянт, характэрны для полацкага дойлідства. Чатыры апорныя слупы ўтваралі падкупальны квадрат даволі вялікага пралёта. Бакавыя часткі мелі пралёт амаль утрая меншы, што разам з моцна выцягнутым прамавугольным абрысам плана зноў жа вяртае нас да групы полацкіх храмаў, створаных пад уплывам хрысціянскай архітэктуры Закаўказзя.



Мал. 101. Храм "з бакавымі апсідамі" Бельчыцкакга манастыра паводле малюнка канца XVIII ст.



Мал. 102. Царква ў Мінску. План

Рытм апорных канструкцый, суадносіны іх масы і прасторы ў гэтым храме можна параўнаць з віцебскай Дабравешчанскай царквой. Аднак яго найбольш характэрнай адметнасцю з'яўляецца наяўнасць двух бакавых прытвораў у выглядзе паўцыркульных апсід з уваходамі, размешчанымі з поўдня і поўначы па восі падкупальнага квадрата. Бакавыя апсіды, верагодна, перакрываліся конхамі, па памерах адпавядалі алтарнай апсідзе і былі больш нізкія за асноўны аб'ём храма, што надавала яму тую дынамічную піраміда́льна-ярусную аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю, якая актыўна фарміравалася ў гэты час у полацкай школе дойлідства.

Паколькі старажытны Мінск (Менск) у XII ст. знаходзіўся на перыферыі Полацкага княства, у склад якога ўваходзіў, то рэшткі адзінай мураванай царквы на менскім дзядзінцы патрэбна разглядаць у кантэксце полацкай школы дойлідства. Падмуркі царквы раскрыты археолагам В. Тарасенкам падчас раскопак 1945—1951 гг., які паводле ўскосных знаходак датаваў яе будаўніцтва першай паловай XII ст. Пазней вывучэннем помніка займаліся Э. Загарульскі, які адносіў яго закладку да канца XI ст., Л. Аляксееў, Г. Штыхаў, які ў 1976 г. удакладніў, што на гэтым месцы першапачаткова была драўляная царква, а будаўніцтва мураванай пачалося толькі ў XII ст. Храм быў толькі закладзены на ўзроўні падмуркаў і недабудаваны, пра што сведчыць адсутнасць падлогі і слядоў сцен збудавання ці іх абрушэння.

Падмуркі выкананы ў драўлянай апалубцы ў выглядзе дзвюх сценак з буйных злёгку абчэсаных камянёў, прастора паміж якімі запоўнена дробным бутам на вапняковой рошчыне. Унутраная сценка месцамі выкладзена з вапняковых плітак з перавязкай швоў. Зверху падмуркі заліты рошчынай, як для сезоннага перапынку, але без слядоў далейшай муроўкі. Тым не менш ацалеўшыя часткі даюць магчымасць вызначыць агульныя габарыты і мяркуемую архітэктоніку царквы, даволі незвы-

чайную ў кантэксце ўсяго старажытнарускага дойлідства.

Гэта мусіў быць кампактны 4-слуповы крыжова-купальны храм (памерам 12 × 12 м) з трыма апсідамі, з якіх сярэдняя значна выступала параўнальна з бакавымі (даўжыня разам з цэнтральнай апсідай 16,3 м). Цэнтрычнасць пабудовы не дазваляе вызначаць яе як трохнефавы храм [145. С. 24]. Унутраны паўкруглы абрыс бакавых апсід не адпавядае вонкаваму, які зроблены ў чвэрць круга, што надае алтарнай частцы своеасаблівы трохлопасцевы абрыс. Падобны прыём адзначаны намі толькі яшчэ ў адным помніку старажытнарускага перыяду — царкве ў сяле Ушчыж (Чарнігава-Северская зямля, сучасная Бранская вобласць), якая датуецца канцом XII — пачаткам XIII ст. Падкупальны квадрат менскай царквы (даўжыня бакоў каля 3,3 м) вылучаны чатырма слупамі таксама незвычайнай Г-падобнай формы, падмуркі якіх выкладзены з невялікіх камянёў на рошчыне, а паміж імі зроблены стужкавыя падмуркі з буту, пакладзенага насуха.

На ўнутраных паверхнях сценак падмуркаў ацалелі сляды трох лапатак. Характэрна, што паўночна-ўсходняя лапатка не адпавядае падмуркам слупоў падкупальнага квадрата. З вонкавага боку сляды лапатак адсутнічаюць. Пэўны прымітывізм будаўнічых канструкцый надае гэтаму помніку рэгіянальную адметнасць.

Падчас раскопак на замчышчы ў Мсціславе археолагам Л. Аляксеевым выяўлены кавалкі плінфы без прыкмет наяўнасці рошчыны, на падставе чаго ён лічыў, што недзе паблізу ў канцы XII — пачатку XIII ст. быў змураваны храм, месца размяшчэння якога яшчэ не выяўлена.

Развіццё полацкай школы дойлідства старажытнарускага перыяду ахоплівае два стагоддзі — ад сярэдзіны XI да сярэдзіны XIII. Яно пачалося з узвядзення ў Полацку велічнага Сафійскага сабора па ўзору сярэдневізантыйскага крыжова-купальнага храма і было абумоўлена пашырэннем на беларускіх землях хрысціянства, палітычным і эканамічным уздымам Полацкага княства.

На фарміраванне полацкай школы дойлідства на пачатковым этапе вызначальны ўплыў аказала дзейнасць тут наўгародскіх майстроў. Разнастайныя па архітэктанічнай задуме сакральныя помнікі полацкай школы дойлідства аб'ядноўваюць і адначасова вылучаюць сярод іншых рэгіянальных школ агульная будаўнічая тэхніка, метрычны модуль, адметныя кампазіцыйныя прыёмы. Акрамя руска-візантыйскіх архітэктанічных схем у шэрагу мясцовых помнікаў назіраецца ўплыў архітэктуры Закаўказзя і Малой Азіі. Са свайго боку творчыя метады полацкіх майстроў аказалі відавочнае ўздзеянне на стварэнне лепшых узораў старажытнага дойлідства Смаленска і Гародні.

2.6. Гродзенская школа дойлідства

У старажытнарускі перыяд на тэрыторыі сучаснай Беларусі другой па часе і колькасці помнікаў стала гродзенская школа дойлідства, якая вызначаецца своеасаблівымі архітэктурна-мастацкімі характарыстыкамі і будаўнічымі прыёмамі, генезіс якіх дастаткова складаны і да канца не выяўлены. Гродна (летапісны Городень, Городна, Городня) упершыню ўпамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1128 г. як цэнтр удзельнага княства, у 1240 г. горад увайшоў у склад ВКЛ. У XII ст. тут разам з развіццём шматлікіх рамёстваў і гандлю пачалося ўласнае мураванае сакральнае будаўніцтва. Яго паходжанне звычайна звязваюць з уплывам Валынска-Галіцкіх земляў, што даволі спрэчна, паколькі помнікі дойлідства Уладзіміра-Валынскага, Луцка, Галіча па часе датуюцца пазней за гродзенскія і маюць больш выразныя аналагі з Кіевам. Да таго ж Гродна быў далучаны да Галіцка-Валынскага княства толькі часова ў сярэдзіне XIII ст., з 1253 г. па 1270-я гг., калі вялікі князь літоўскі Трайдзень зноў вярнуў горад у склад ВКЛ.

Вывучэнне гродзенскай школы дойлідства пачалося пазней за полацкую і напачатку тычылася ўласна аднаго помніка — Барысаглебскай царквы ў Гродна. На пачатак археалагічна-архітэктурных даследаванняў у ёй адзінай, нягледзячы на значныя страты, захаваліся архітэктурна-будаўнічыя канструкцыі да ўзроўню скляпенняў. У далейшым з пашырэннем кола археалагічных даследаванняў было выяўлена яшчэ некалькі помнікаў сакральнага дойлідства старажытнарускага перыяду ў самім Гродна і рэгіёне яго ўплыву, якія адкрыты толькі на ўзроўні падмуркаў. Параўнаўчы архітэктурна-археалагічны аналіз гэтых аб'ектаў з гродзенскай Барысаглебскай царквой і помнікамі полацкай школы дойлідства дазволіў вызначыць агульныя і адметныя рэгіянальныя ўласцівасці, даць ім навуковую атрыбуцыю і верагодныя даціроўкі.


Помнікі гродзенскай школы дойлідства іншы раз аб'ядноўваюць этнаграфічным паняццем «Чорная Русь». На мяжы Белай і Чорнай Русі гістарычна паўстае царква святых Барыса і Глеба ў Навагрудку, якая датуецца археолагамі ў межах усяго XII ст. [106. С. 101] ці другой паловай XII ст. [56. С. 81]. Падмуркі і часткі паўночнай і паўднёвай сцен (на вышыню да 1,5 м) гэтай старажытнай святыні выяўлены ў 1961—1965 гг. археалагічнымі экспедыцыямі пад кіраўніцтвам М. Каргера пад будынкам існуючай цяпер Барысаглебскай царквы, пабудаванай у пачатку XVI ст. у стылі готыкі. Былі выяўлены таксама значныя фрагменты абшырнай абходнай галерэі (шырыня 3,2 м). Аднак цалкам не захаваліся ўсходнія алтарныя апсіды, апорныя слупы і заходняя частка храма, у выніку чаго зробленая археолагамі рэканструкцыя яго планавай схемы з'яўляецца гіпатэтычнай.

Рэканструяваныя параметры збудавання абумоўлены размяшчэннем лапатак з невялікім вынасам на


ацалелых частках сцен храма і абходнай галерэі. У выніку графічная рэканструкцыя прадстаўляе цэнтрычны квадратны ў плане 4-слуповы крыжова-купальны храм (шырынёй 13 м) з трыма кананічнымі паўцыркульнымі апсідамі, абкружаны з трох бакоў галерэяй, больш шырокай з заходняга боку. У сценах галерэі размяшчаліся арачныя разгрузачныя нішы, якія, магчыма, выкарыстоўваліся для ганаровых пахаванняў.

Па агульных прапорцыях плана і наяўнасці абходнай галерэі гэты помнік нагадвае храм-пахавальню полацкага Спаса-Праабражэнскага монстыра і царкву на Малой Рачоўцы ў Смаленску, што генетычна звязвае яго з полацкай школай дойлідства. Лапаткі ўнутраныя маюць невялікі вынас, што сведчыць пра такія ж вынасы апорных слупоў, а звонку яны двухступеньчатыя са скругленымі вугламі верхняга ўступа, як і ў полацкай Спаса-Праабражэнскай царкве.

Тэхніка муроўкі навагрудскай Барысаглебскай царквы змяшаная. У асноўным яна выкладзена з буйных блокаў-квадраў вапняковага паходжання ў спалучэнні з 1-2-3-м радамі плінфы рознага профілю на рошчыне з дамешкам цамянкі, як у віцебскай Дабравешчанскай царкве. Сцены галерэі выкананы ў традыцыйнай тэхніцы са схаваным радам. У зоне падкупальнага квадрата выяўлены ацалеўшы фрагмент падлогі з паліваных керамічных плітак у выглядзе круга дыяметрам 75 см. Знойдзены таксама кавалкі тынкоўкі з рэшткамі фрэскавага роспісу і графіці. Будаўнічая тэхніка зноў жа



Мал. 103. Барысаглебская царква ў Навагрудку. План



Мал. 104. Царква ў Ваўкавыску. План

вяртае нас да помнікаў Полацка і Віцебска, што сведчыць пра пераемнасць творчых метадаў паміж дзвюма вядучымі школамі дойлідства на беларускіх землях.

Рухаючыся далей на захад, у напрамку да Гродна, адзначаем яшчэ адзін помнік старажытнарускага перыяду — падмуркі царквы на гарадзішчы пад назвай «Замчышча» ў Ваўкавыску, у планавай схеме якой ужо прысутнічаюць пэўныя прыкметы ўласна гродзенскай школы дойлідства. Як і разгледжаны вышэй помнік, археалагічны аб'ект у Ваўкавыску, які ўяўляе падмуркі прамавугольнага ў плане храмавага збудавання памерам 22 × 16 м, датуецца археолагамі па-рознаму: першай альбо другой паловай XII ст.

Ён быў раскрыты раскопкамі пад кіраўніцтвам В. Тарасенка і Г. Пеха, затым даследаваўся П. Рапапортам (1959) і М. Каргерам (1966). Імі не выяўлена ніякіх прыкмет муроўкі ці абрушэння сцен альбо плінфы са слядамі рошчыны.

Як і ў Менску, царква на замчышчы ў Ваўкавыску па нейкіх прычынах так ніколі і не была дабудавана, хаця для будаўніцтва было назапашана шмат цэглы — звычайнай, з клеймамі, трапецыяпадобнай, са скругленымі бакамі і інш. У вялікай яме была нарыхтавана вапняковая рошчына. Асабліва трэба засяродзіць увагу на тым, што побач з падмуркам раскапаны шэраг вялікіх камянёў з адным адшліфаваным бокам. Увядзенне ў муроўку прыродных камянёў, якія выходзілі на фасады адшліфаваным бокам, з'яўляецца прыкметай гродзенскай школы дойлідства. Планавая схема падмуркаў у яшчэ большай ступені характэрная для рэгіянальнай будаўнічай школы, блізкая да Ніжняй царквы на дзядзінцы ў Гродна, асабліва ў вырашэнні алтарнай часткі.

Паводле плана археолагі вызначаюць помнік у Ваўкавыску як 6-слуповы храм, што не зусім дакладна, таму што пара ўсходніх слупоў толькі акрэслена лапаткамі, пры гэтым яны ўваходзяць у масу сцяны, што абмяжоўвае віму апсіды. Крывая апсіды не зусім дакладная і слаба выступае сегментам за межы прамавугольнага абрысу плана, у які ўваходзяць простакутныя бакавыя апсіды. Падкупальны квадрат фарміравалі чатыры заходнія слупы. У такім разе, паводле архітэктурнай тыпалогіі, гэты помнік неабходна вызначыць як 4-слуповы з вімай крыжова-купальны храм, паколькі тут у сістэме перакрыццяў утвараўся роўнаканцовы крыж.

У наступных збудаваннях мясцовай школы — Ніжняй, Прачысценскай і Барысаглебскай цэрквах Гродна — усходнія слупы ўжо вылучаны з масы сцяны, але пры гэтым іх тыпалагічнае вызначэнне застаецца тым жа.


Апорныя слупы царквы ў Ваўкавыску мелі яшчэ крыжападобную форму з невялікім вынасам лапатак, характэрную для полацкага рэгіёна. На паўднёва-заходнім вуглу меркавалася ўзвесці вялікую амаль квадратную ў плане вежу. Прызначэнне стужкавых падмуркаў, якія ідуць унутры храма з паўднёвага і паўночнага бакоў паралельна асноўным, пакуль што не знайшло тлумачэння.

З пункту гледжання эвалюцыі кампазіцыйных і будаўнічых прыёмаў наступным этапам фарміравання гродзенскай школы дойлідства была, верагодна, Прачысценская царква ў Гродна, адкрытая археолагамі пад кіраўніцтвам І. Чарняўскага

толькі ў 1980 г. пры раскопках на тэрыторыі былога базыльянскага кляштара, але вядомая па дакументах XV–XVI стст. У пачатку XVIII ст. побач з рэшткамі старажытнай праваслаўнай святыні была ўзведзена мураваная уніяцкая царква ў гонар Раства Багародзіцы.

Захаваліся падмуркі і частка сцен Прачысценскай царквы агульнымі памерамі 19,1 × 12,7 м. Тры алтарныя апсіды таксама прамавугольныя, са зрэзанымі вугламі. Цэнтральная апсіда нязначна выступае і аддзелена ад бакавых сценамі і квадратнымі ў плане слупамі, паміж якімі, відавочна, былі арачныя праёмы. Падкупальны квадрат утвараюць чатыры заходнія больш масіўныя апорныя слупы, васьмігранныя ў плане (квадрат са зрэзанымі вугламі). Кроку слупоў на вонкавых сценах адпавядаюць плоскія лапаткі. Археолагі, зноў жа, не зусім дакладна вызначаюць царкву як 6-слуповы трохнефавы храм замест крыжова-купальнага з вімай, як патрабуе архітэктурная тыпалогія. Царква мела ўваходы з трох бакоў свету, а ў цэнтральнай усходняй апсідзе знаходзіліся мураваныя ўзвышэнні для размяшчэння прастола і трона горняга месца.

Падмуркі Прачысценскай царквы выкладзены з дробных камянёў насуха, вышэй выраўнены радамі цэглы на рошчыне. Падлога была выкладзена з квадратных і фігурных паліваных плітак па тонкіх пластах рошчыны, дробных камянёў і пяску (захаваўся некрануты фрагмент). Муроўка сцен з плінфы ў роўнаслаёвай тэхніцы ў ніжняй частцы сцен уключала даволі буйныя



Мал. 105. Прачысценская царква ў Гродне (паводле І. Чарняўскага)

камяні рознага колеру з адшліфаваным фасадным бокам. У раскопках выяўлены таксама керамічныя пліткі вонкавай аздобы фасадаў і керамічныя жбаны-галаснікі мясцовай вытворчасці — характэрныя атрыбуты гродзенскай школы дойлідства.

З прычыны архітэктанічнай і канструкцыйнай блізкасці ёсць падставы лічыць, што Прачысценская царква была пабудавана, верагодна, у сярэдзіне XII ст., амаль адначасова з так званай Ніжняй царквой у Гродна. Гісторыкі разыходзяцца ў даціроўцы будаўніцтва Ніжняй царквы, розныя крыніцы даюць 1116 г. ці 1128–1141 гг., другую альбо трэцюю чвэрць XII ст., але дакладна

вядома, што ўжо ў 1183 г. яна была знішчана пажарам. У Іпацьеўскім летапісе паведамляецца: «Того же лета Городен погоре всь и церквы каменная от блистание молния и шибения грома». Пазней, у XIV ст., на яе месцы была змуравана другая царква, якая ў гісторыі архітэктуры атрымала назву Верхняй.

Рэшткі Ніжняй царквы выяўлены Я. Ядкоўскім пры археалагічных раскопках Замкавай гары ў 1932 г. Даследаванне помніка працягвалі варшаўскі археолаг З. Дурчэўскі (1936—1939), пасля Другой сусветнай вайны — М. Варонін (1947—1949). Рэканструкцыю унікальнай падлогі святыні зрабіла М. Малеўская. Рэшткі царквы музеефікаваны і ўваходзяць у склад Гродзенскага гісторыка-культурнага запаведніка.


Ад помніка ацалелі падмуркі і сцены, часам на вышыню да 2—3,5 м і нават 4 м, якія даюць дакладнае ўяўленне аб планавай схеме, будаўнічай тэхніцы, канструкцыях і дэкаратыўным аздабленні збудавання. План Ніжняй царквы амаль цалкам паўтарае Прачысценскую. Гэта крыху перакошаны прамавугольнік са злёгку зрэзанымі вугламі памерам 18,4 × 11,7 м. Цэнтральная апсіда паўцыркульная, звонку нязначна выступае сегментнай дугой. Бакавыя апсіды ў плане прамавугольныя, але на ўзроўні 1 м ад падлогі набываюць лучковы абрыс. Міжапсідныя сцены і пара квадратных усходніх слупоў, з праёмамі паміж імі, вылучаюць прастору вімы. Чатыры заходнія слупы, якія ўтвараюць падкупальны квадрат, круглыя ў сячэнні і крыху больш масіўныя, паколькі яны падтрымлівалі апорнае кольца купала. Адпаведна кроку апорных слупоў сцены раскрапаваны плоскімі лапаткамі: унутры плоскімі, звонку — са скругленымі вугламі.

Відавочна, што ў аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі збудавання дамінаваў 4-слуповы крыжова-купальны аб'ём, да якога далучалася больш нізкая трохапсідная алтарная частка з вімай. Найбольш блізкі да гэтага вызначэння архітэктар В. Слюнчанка, які адзначыў, што храм «тыпу ўпісанага крыжа» [7. С. 169], археолагі ж вызначаюць яго як «6-слуповы» [106. С. 102], «6-слуповы трохнефавы» [51. С. 78].

Царква мела тры ўваходы, размешчаныя па баках свету, без слядоў ступеньчатых абрамленняў. У паўднёва-заходнім кампартыменце размешчаны вежападобны круглаваты ў плане аб'ём, дзе знаходзіліся вітыя ўсходы на скляпеністыя хоры, якія адкрываліся ва ўнутраную прастору храма двума арачнымі праёмамі. Адрозна ад лесвіцы, убудаванай у фасаднай сцяне віцебскай Дабравешчанскай царквы, у гродзенскай Ніжняй царкве прадстаўлены цалкам новы варыянт лесвіцы на хоры. Гэты камунікатыўны вузел з'яўляецца больш кампактным і канструкцыйна ўстойлівым. У пэўным сэнсе дадзены прыём можна разглядаць як перадумову вежаў з вітымі ўсходамі ў беларускіх замках і цэрквах-крэпасцях часоў абарончага дойлідства, тэрытарыяльна сканцэнтраваных у тым жа рэгіёне.

Будаўнічая тэхніка Ніжняй царквы цалкам аналагічная Прачысценскай царкве. Падмуркі выкананы з дробных камянёў насуха, выраўнены радамі цэглы. Муроўка сцен роў-


наслаёвая з плінфы на вапняковай рошчыне, з уключэннем у ніжняй частцы буйных (у дыяметры да 1,4 м) гранітных і гнейсавых камянёў, адшліфаваных з фасаднага боку, якія разнастайнымі адценнямі ўзбагачалі каляровую гаму сцен, пазбаўленых тынкоўкі. Вышэй фасады былі ўпрыгожаны рознакаляровымі паліванымі керамічнымі пліткамі. На адным з аконных прасценкаў ацалеў дэкор у выглядзе квадрата з карычневых маёлікавых плітак, размешчаных па вертыкалі, і зялёных — па



Мал. 106. Ніжняя царква ў Гродне. План

Мал. 107. Ніжняя царква ў Гродне. Музеефікаваныя рэшткі





Мал. 108. Барысаглебская царква ў Гродне. Малюнак В. Гразнова, XIX ст.

гарызанталі. У верхнія часткі сцен было ўмуравана шмат керамічных жбаноў-галаснікоў, адчыненых гарлавінамі ўнутр царквы.

Інтэр'ер храма не меў фрэскавага роспісу. Асноўны дэкаратыўны акцэнт прыпадаў на ўзорысты дыван падлогі з маёлікавых плітак 17 відаў і 3 колераў: карычневых, зялёных і жоўтых. У вуглавых частках падлога была выкладзена з плітак у «шахматным» парадку, пад хорамі — з цэглы. Складаны ўзор падлогі ў падкупальным квадраце ў выглядзе роўнаканцовага грэчаскага крыжа, які быў утвораны пяццю кольцамі і стужкавым арнаментам з рознакаляровых фігурных плітак, падкрэсліваў сакральную і кампазіцыйную ідэю храма.

Паколькі іканастасаў у праваслаўных храмах да XV ст. не было, алтарную частку Ніжняй царквы вылучала невысокая драўляная алтарная перагародка, аздобленая меднымі лістамі з пазалотай, на якіх выгравіраваны выявы святых у абрамленні складанага і плеценага арнаменту. Пры раскопках знойдзены таксама фрагменты металічных царкоўных прадметаў — панікадзілаў, лампадаў, рэшткі звана з рэльефным надпісам.

Вяршыняй развіцця гродзенскай школы дойлідства (у сэнсе дасканаласці выяўлення самабытных кампазіцыйна-канструкцыйных прыёмаў) стала Барысаглебская царква ў Гродна, пабудаваная на высокім і крутым правым беразе Нёмана на тэрыторыі пасада, аддзеленага ад княжацкага дзядзінца рэчкай Гараднічанкай. Як лічаць шматлікія даследчыкі, царква была пабудавана ў канцы XII ст., паводле М. Вароніна — у 1180-я гг.

У канцы XIV ст. вялікі князь літоўскі Вітаўт асадзіў на навакольнай тэрыторыі захопленых ім у палон жыхароў прадмесця Пскова Каложы, у выніку чаго царква атрымала дадатковую ўласную назву — Каложская. У XV — пачатку XVI ст. тут існаваў праваслаўны манастыр, які атрымаў маёмасныя ахвяраванні ад караля Аляксандра Ягелончыка ў 1500 г. і Жыгімонта I Старога ў 1508 г., у гэты час царква была адноўлена мясцовым дойлідам Богушам Багутовічам. У XVI ст. храм часова знаходзіўся ў запусценні. У пачатку XVII ст. манастыр перададзены базыльянам, царква пры гэтым зноў часткова перабудавана. Былі зняты хоры, зменена форма вокнаў. У інвентары 1783 г., складзеным базыльянскім архімандрытам Ігнатам Кульчынскім, паведамляецца, што «царква Барыса і Глеба пабудавана ў часе ўдзельных князёў, яшчэ да хрышчэння Літвы». Там жа адзначана, што «ў самай сярэдзіне царквы стаяць чатыры круглыя калоны, цагляныя, пабеленыя вапнаю».

За сваю 800-гадовую гісторыю Барысаглебская царква перажыла некалькі перабудоў, рэлігійных канверсій, часы занядбання. Але галоўнай небяспекай для існавання святыні стала прыродная стыхія. Ужо ў 1720 г. размыты Нёманам берагавы абрыў падышоў да самых сцен будынка, што прывяло да нязначнага нахілу. У выніку апоўзня 2 красавіка 1853 г. паўднёвая сцяна храма і частка заходняй абваліліся ў рэчку. У 1889 г. абвалілася паўднёвая апсіда. Толькі ў 1897 г. бераг быў зама-

цаваны, а на месцы разбураных сцен пастаўлены драўляныя.

Пытанні кансервацыі Барысаглебскай царквы разглядаліся Імператарскай археалагічнай камісіяй у 1896 г., у 1904 г. пры Сінодзе створана спецыяльная камісія па яе рэстаўрацыі. Праект рэканструкцыі помніка ў выглядзе пяцікупальнага храма візантыйска-рускага ўзору выкананы акадэмікам архітэктуры П. Пакрышкіным у 1914 г., але ён не быў рэалізаваны (матэрыялы апублікаваны М. Вароніным).

Нягледзячы на шматлікія кансервацыйна-рамонтныя работы (у 1910, 1935, 1970 і 1985—1987 гг.), гэты адзін з самых выдатных помнікаў беларускага дойлідства і сёння знаходзіцца ў аварыйным стане. Сваім, хаця б частковым, існаваннем у складаных прыродных умовах ён абавязаны, можна сказаць, толькі высокаму будаўнічаму ўзроўню гродзенскай школы дойлідства старажытнарускага перыяду.

Рэшткі Барысаглебскай царквы першым даследаваў В. Грозноў у 1864 г., які зрабіў яе шматлікія замалёўкі з розных пунктаў агляду, выявіў наяўнасць у муроўцы галаснікоў і рэльефных знакаў на плінфе, фрагменты фрэскавага роспісу ў алтарнай частцы. Раскопкі падмуркаў і падлогі ажыццявіў у 1935 г. Я. Ядкоўскі. Пасля Другой сусветнай вайны помнік даследавалі археолагі І. Хозераў (1946), П. Рапапорт і А. Трусаў (1981, 1983—1984). Сярод гісторыкаў архітэктуры асаблівасці гродзенскай Барысаглебскай царквы ў пачатку XX ст. вывучалі І. Гарнастаеў, П. Пакрышкін (абодва прапанавалі розныя гіпатэтычныя графічныя рэканструкцыі), у 1920-я гг. — М. Шчакаціхін, які настойліва адшукваў аналагі адметных архітэктурных формаў і будаўнічых прыёмаў, і ў канцы XX ст. — Г. Лаўрэцкі, які прапанаваў уласную рэканструкцыю помніка.

Археолагамі скрупулёзна даследаваны тэхналагічна-будаўнічыя характарыстыкі Барысаглебскай царквы, аднак архітэктоніка збудавання тыпалагічна вызначаецца імі не зусім дакладна. Большасць даследчыкаў вызначае гэты помнік як 6-слуповы трохапсідны храм, у той час як яго планавая схема ўтрымлівае відавочна 8 апорных слупоў. З іх 6 аднолькавыя, круглыя у сячэнні, на квадратных у плане стылабатах, уверсе яны набываюць крыжападобнае сячэнне з невялікім вынасам лапатак, дзеля пераходу да падпружных арак скляпенняў. Яшчэ два ўсходнія апорныя слупы (у сячэнні — квадрат са зрэзанымі вуглами) злучаюцца арачнымі праёмамі з міжапсіднымі сценкамі, утвараючы прастору вімы, як і ў Ніжняй царкве на дзядзінцы. Калі не ўлічваць іх у архітэктанічнай кампазіцыі Барысаглебскай царквы, то такім жа чынам Ніжняя царква не можа лічыцца 6-слуповай, таму што ў ёй на пару заходніх слупоў менш, чым у Барысаглебскай, а алтарныя часткі вырашаны аналагічна. Падобнае вырашэнне алтарнай часткі з вімай, утворанай міжапсіднымі прасценкамі і злучанымі з імі дадатковымі апорнымі слупамі, у помніках розных рэгіянальных школ старажытнарускага перыяду трапляецца вельмі рэдка.


Дадзены прыклад можна прыблізна суаднесці з больш раннім Спа-

саўскім саборам у Чарнігаве, храмам паблізу Васільеўскай царквы ва Уладзіміры-Валынскім і са значна больш блізкімі царквой на дзядзінцы ў Полацку і Вялікім саборам Бельчыцкага манастыра, разгледжанымі вышэй.

Ядро аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі гродзенскай Барысаглебскай царквы складалі, як звычайна ў крыжова-купальных храмах, чатыры цэнтральныя слупы, якія ўтваралі падкупальны квадрат і роўнаканцовы крыж у вянчаючых масах збудавання. Два заходнія апорныя слупы прасторава вылучалі нартэкс, які ў гэтым помніку не быў аддзелены суцэльнай сценкай, як, напрыклад, у віцебскай Дабравешчанскай царкве.

Над нартэксам месціліся хоры, якія ішлі таксама ўздоўж паўночнай і паўднёвай сцен аж да ўсходніх апорных слупоў падкупальнага квадрата. На паўночнай сцяне на вышыні 5 м захаваўся выступ, які паказвае месца размяшчэння хораў. Асабліва цікава, што ў гэтым помніку прадстаўлены яшчэ адзін, даволі незвычайны варыянт лесвіцы на хоры. Іх было дзве, і яны размяшчаліся, верагодна, сіметрычна ў сярэдзіне вонкавых сцен паўночнай і паўднёвай апсід і далей да хораў. Паўднёвая лесвіца была замуравана пры ліквідацыі хораў і пасля абрушэнняў храма захавалася фрагментарна.

Такім чынам, Барысаглебская царква ў Гродна ўяўляе сабой 8-слуповы трохапсідны крыжова-купальны храм даволі развітай аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі, з вімай і нартэксам. У выніку пазнейшых перабудоў і стыхійных разбурэнняў




Мал. 109. Барысаглебская царква ў Гродне. План

сістэма скляпенняў старажытнага храма цалкам знішчана, невядомы дакладная вышыня ядра кампазіцыі і яе суадносіны з алтарнай часткай і нартэксам, невядома колькасць купалаў храма. Таму гіпатэтычныя рэканструкцыі першапачатковага вобліку святыні істотна розняцца паміж сабой.

Рэканструкцыя П. Пакрышкіна прапанавала пяцікупальную будову вянчаючых мас з вялікім цэнтральным купалам і чатырма меншымі па дыяганалях плана, як у Спасаўскім саборы Чарнігава, што, відавочна, не адпавядала сапраўднасці, паколькі помнікі XII ст., так званага епіскапска-прыдворнага перыяду, мелі звычайна толькі адзін купал.

М. Шчакаціхін лічыў больш слушнай рэканструкцыю І. Гарнастаева, дзе ў аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі збудавання па вышыні выразна вылучана крыжова-купальнае ядро. У аснаванні купала ўзаемна перпендыкулярныя цыліндрычныя скляпенні ўтвараюць роўнаканцовы крыж. Алтарная частка і нартэкс значна больш нізкія за асноўны аб'ём. Аднак агульныя прапорцыі



Мал. 110. Барыса-глебская царква ў Гродне. Паўночны фасад

збудавання, вальмавыя пакрыцці паверх закамараў вуглавых кампартыментаў і нартэкса сведчаць, што даследчык экстрапаліраваў тут архітэктурныя формы больш позняй пскоўскай школы дойлідства XIII—XIV стст.

Найбольш верагоднай, але ўсё ж гіпатэтычнай, з'яўляецца рэканструкцыя Г. Лаўрэцкага [72. С. 25], які прапануе агульную вышыню нартэкса і цэнтральнага ядра храма, у выніку чаго ў верхнім падкупальным сячэнні перакрыцці ўтвараюць выцягнуты лацінскі крыж. Аналагічную сістэму ўзаемасувязі пакрыцця роўнавысокіх кафалікона і нартэкса, якая падкрэслівае так званую базілікальнасць структуры храма, гэты даследчык прымяняе і ў рэканструкцыі віцебскай Дабравешчанскай царквы [72. С. 21], а таксама царквы ў Тураве [72. С. 27]. Аднак ва ўсіх гэтых помніках вышыня нартэкса магла быць меншай за асноўны аб'ём і ствараць ярусна-пірамідальную кампазіцыю крыжова-купальнага храма накшталт полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы.

Сучасная вышыня паўночнай і ацалеўшай часткі заходняй сцяны гродзенскай Барысаглебскай царквы роўная вышыні алтарных апсід. Яны былі выраўнены, верагодна, пры перабудове храма ў XVII ст. Адначасова аўтэнтычныя вузкія і высокія вокны з паўцыркульным арачным завяршэннем былі заменены на характэрныя для часоў барока вялікія вокны з лучковым сегментным завяршэннем.

Царква мела тры ўваходы, размешчаныя па восях падкупальнага квадрата з трох бакоў свету, якія мелі двухступеньчатыя арачныя абрамленні. Лапаткі, якія ўмацоўвалі

сцены, адпавядалі апорным слупам. Унутры лапаткі былі плоскія, на іх абапіраліся пяты падпружных арак, звонку — трохступеньчатыя, з верхнім скругленым выступам-паўкалонкай, і завяршаліся закамарамі. Тры паўкруглыя апсіды да ўзроўню перакрыццяў мелі аднолькавую вышыню, а вышэй перакрываліся конхамі рознай вышыні, адпаведна радыусу паўкружжаў апсід. У архітэктанічных адносінах збудаванне ўяўляла сабою цудоўна згарманізаваную сістэму архітэктурных аб'ёмаў з адкрытай і ўзнёслай сакральнай прасторай, што дасягалася надзвычай рацыянальнымі і дасканалымі для таго часу будаўнічымі метадамі.

Своеасаблівая будаўнічая тэхналогія гродзенскай школы дойлідства дасягнула ў Барысаглебскай царкве свайго росквіту. Дзякуючы ёй можна выявіць генезіс і этапы станаўлення разнастайных творчых прыёмаў, якія яна акамулявала. Падмуркі царквы выкладзены з невялікіх камянёў насуха на глыбіню 1,5 м. Муроўка сцен выканана пераважна з плінфы ў роўнаслаёвай тэхніцы на вапнавай рошчыне з дамешкам цамянкі і вугляў. Цагліны на тарцах маюць рэльефныя знакі; выкарыстоўвалася таксама лякальная цэгла: трапецыяпадобная, са скругленымі вугламі і інш. Пад апорнымі круглымі слупамі (дыяметрам каля 1,2 м) зроблены квадратныя ў плане базы вышынёю ў тры рады плінфы. У ніжняй частцы ў муроўку сцен уключаны вялікія камяні граніту і гнейсу з адным адшліфаваным бокам, што выходзіць на паверхню фасада. Памеры камянёў, выкладзеных амаль роўнымі радамі, паступова змяншаюцца па велічыні ўгору. Гэтым прыёмам дасягаецца павелічэнне трываласці і паступовае змяншэнне цяжару сцен, што сведчыць пра прафесійнае эмпірычнае валоданне асновамі статыкі збудаванняў. Адначасова даволі працаёмкая апрацоўка (абчэсванне і шліфоўка) фасаднай паверхні валуноў надае муроўцы сцен больш шляхетны і эстэтычны выгляд, узбагачае каларыстычную гаму разнастайнымі адценнямі, уласцівымі натуральнаму каменю.

Вышэй пояса змяшанай муроўкі з плінфы і каменю ў ніжняй частцы сцен дэкаратыўны акцэнт пераходзіць на шырокі пояс з рознакаляровых фігурных маёлікавых плітак, які апярэзвае будынак па ўсяму перыметру, на палову яго вышыні. Формы плітак самыя розныя: квадратныя, прамавугольныя, трапецыяпадобныя, круглыя. Яны ствараюць мудрагелісты ўзор у выглядзе роўнаканцовых грэчаскіх крыжоў у разнастайнай аранжыроўцы. Найбольш часта сустракаюцца крыжы з закругленымі канцамі ці складзеныя з пяці квадратаў, размешчаных дыяганальна па ўзаемна перпендыкулярных восях. Іншы раз крыжы аб'яднаны ў больш складаныя сімвалічныя геаметрычныя фігуры, падобныя да рунаў. Характэрна, што дэкаратыўны пояс з маёлікавых крыжоў канцэнтруецца на ўзроўні, зручным для агляду яго чалавекам, і мае па сваім прызначэнні антрапаметрычны характар.

Аздобу фасадаў Барысаглебскай царквы М. Шчакаціхін параўноўвае «з мармуровымі і алябастравымі аздобамі, якія ўжываліся ў Візантыі



Мал. 111. Барысаглебская царква ў Гродне: сучасны выгляд і інтэр'ер

і на Усходзе», і пры гэтым падкрэслівае, што яна з'яўляецца «адзіным ня толькі ў Беларусі, але і наагул на славянскім грунце выпадкам, калі ў будове XII ст. сталецьця захавалася кахляная орнаментыка фасадаў». З другога боку, ён адзначае наяўнасць пэўных паралеляў гродзенскім «кахлям» у арнаментальных матывах фрэскавага жывапісу смаленскіх цэркваў таго ж часу [164. С. 129—130].

Яшчэ больш адметнай і генетычна складанай асаблівасцю гродзенскай школы дойлідства з'яўляецца ўжыванне ў будаўнічых канструкцыях Барысаглебскай царквы шматлікіх керамічных жбаноў-галаснікоў, адкрытых раструбамі ўнутр храма. Па археалагічных знаходках відавочна, што гэты прыём выкарыстоўваўся і ў іншых сакральных збудаваннях гродзенскага рэгіёна. Яны ўмураваны ў тоўшчы сцен амаль роўнымі гарызантальнымі радамі з інтэрвалам у 35 см па вертыкалі і 31 см па гарызанталі, пры гэтым на значных па памерах плоскасцях сцен яны размешчаны ў шахматным парадку, а на крывалінейных і невялікіх паверхнях апсід і лапатак больш адвольна, але дастаткова шчыльна.

Адтуліны дакладна супадаюць з унутранай паверхняй муроўкі. Ужыванне гэтага прыёму ў сусветнай будаўнічай практыцы з'яўляецца дастаткова старажытным і мае, па меркаванні даследчыкаў, дваістае прызначэнне. Першае з іх і больш старажытнае — увядзенне ў муроўку пустацелых керамічных вырабаў з мэтай зрабіць верхнія часткі сцен і скляпенні больш лёгкімі, не паслабляючы іх трываласці. Трэба адзначыць, што акрамя аблягчэння канструкцый пустацелае керамічнае начынне таксама павялічвае прасторавую жорсткасць уласна сцяны і паляпшае тэмпературны рэжым памяшканняў, паколькі паветра ўнутры жбаноў з'яўляецца добрым захавальнікам цяпла.

Падобны канструкцыйны прыём ужываўся ўжо ў Старажытным Рыме, Візантыі і Малой Азіі, дзе для гэтай мэты ў якасці лёгкага будаўнічага матэрыялу іншы раз ужываліся гліняныя амфары з завостранымі донцамі і ручкамі, замураваныя спіральна ў верхнія часткі купалаў. Пры рамонце кіеўскай Сафіі ў 1809 г. у аснаванні скляпенняў выяўлена глінянае начынне ў выглядзе амаль круглых гаршчкоў, якія былі цалкам замураваны і відавочна не служылі рэзанатарамі.

Характэрна, што керамічныя жбаны-галаснікі гродзенскай Барысаглебскай царквы па форме і памерах у найбольшай ступені набліжаюцца да амфар, ужытых у царкве Св. Віталя ў Равэне VI ст. (толькі з плоскім донцам і без ручак), і мала падобныя да невялікіх гаршчкоў у мурах кіеўскай Сафіі.

Верагодна, з цягам часу было заўважана, што калі пустацелыя гліняныя прылады, умураваныя ў сцены, мелі адтуліны, павернутыя ў інтэр'ер будынка, то яны пачыналі працаваць як рэзанатары. У сакральных памяшканнях павялічваўся час рэверберацыі, чым паляпшалася гучанне царкоўных тэкстаў і спеваў. Такім чынам, другім важным прызначэннем керамічнага начыння мураваных канструкцый стала

ўзмацненне гукавога рэзанансу, паляпшэнне акустычных якасцей грамадскіх збудаванняў, што адбілася ў характэрнай назве гэтых прылад — галаснікі. Колбападобныя з шырокім раструбам гаршчкі-галаснікі атрымалі распаўсюджанне ў царкоўным будаўніцтве Ноўгарада і Пскова канца XII—XIV ст., дзе яны ўжываліся ў даволі нязначнай колькасці ў верхніх частках сцен і скляпеннях. Гэтая з'ява ў рускім мастацтвазнаўстве доўгі час лічылася выключным прыярытэтам пскоўска-наўгародскай рэгіянальнай школы.

Аднак сярод шматлікіх рэгіянальных школ старажытнарускага перыяду менавіта гродзенская Барысаглебская царква з'яўляецца першым і адзіным помнікам XII ст., дзе ў поўным аб'ёме і рознабакова прадстаўлены прыём увядзення ў мураваныя будаўнічыя канструкцыі керамічных рэзанатараў-галаснікоў. Да таго ж вонкавыя сцены і лапаткі дадаткова ўмацаваны разгрузачнымі арачнымі нішамі, што павялічвае іх прасторавую ўстойлівасць. У выніку дакладнага тэхнічнага разліку ўдалося максімальна аблегчыць будаўнічыя канструкцыі ўсяго збудавання. Пралёт падкупальнага квадрата ў гродзенскай Барысаглебскай царкве прыблізна 4 м у параўнанні з 2,85 м у полацкай Спаса-Праабражэнскай царкве.


Як і ў Полацку, сцены гродзенскіх храмаў звонку не тынкавалі. Як дэкаратыўны элемент выступалі тэхналагічныя асаблівасці муроўкі: роўныя палосы плінфы і рошчыны, рознакаляровыя плямы адшліфаваных паверхняў валуноў, вытанчаная і мудрагелістая маёлікавая аздоба ў выглядзе разнастайных крыжоў. Унутры сцены, наадварот, тынкавалі і бялілі, у рошчыну дабаўлялі нарэзаную салому і вугаль. У адрозненне ад полацкіх храмаў, гродзенская Барысаглебская царква толькі ў алтарнай частцы была аздоблена фрэскавымі кампазіцыямі, што зафіксавана ў 1864 г. першым даследчыкам гэтага помніка В. Грязновым. Рэшткі фрэсак адкрыты падчас рэстаўрацыйных работ у 1085—1986 гг.

На скляпеннях паміж апсідамі захаваліся выявы Сонца і Месяца, а на адхонах праёмаў — фрагменты сціплага арнаменту. Асноўны мастацкі акцэнт ва ўбранні інтэр'ера зроблены на паліхромную ўзорыстую падлогу, выкладзеную з квадратных, трохвугольных і фігурных кафляў з зялёнай і жоўтай палівай. Над першапачатковай падлогай святыні археолагамі выяўлены пласт чорнай зямлі таўшчынёю 5—8 см. Вышэй знойдзены кавалкі плітак без палівы з рэльефным арнаментам — рэшткі больш позняй падлогі, верагодна, XV ст. У XVIII ст. была зроблена цалкам новая падлога з мармуровых пліт.


Ацалелыя фрагменты аўтэнтычнай архітэктурнай кампазіцыі і будаўнічых канструкцый Барысаглебскай царквы ў Гродна дазваляюць канстатаваць, што старажытныя мясцовыя будаўнікі добра валодалі эмпірычнымі асновамі практычнай геаметрыі, статыкі збудаванняў, будаўнічай акустыкі і іншымі творчымі метадамі прафесійнага майстэрства. У межах кананічнай візантыйскарускай кампазіцыі крыжова-купальнага храма выкарыстанне унікальнай тэхнікі муроўкі з уключэннем

прыроднага каменю і пустацелага глінянага начыння дазволіла прынцыпова ўдасканаліць статыку нясучых канструкцый збудавання, зрабіць больш адкрытай і светлай яго ўнутраную прастору, палепшыць акустыку. Акрамя высокага для свайго часу тэхнічнага ўзроўню, гродзенская школа дойлідства валодала яркімі адметнымі мастацкімі характарыстыкамі.

Нягледзячы на пэўныя паралелі ў архітэктурнай кампазіцыі і будаўнічай тэхніцы помнікаў полацкай і гродзенскай школы дойлідства старажытнарускага перыяду, відавочна, што кожная з іх ішла самастойным шляхам у развіцці творчых метадаў і інтэрпрэтацыі кананічнага праваслаўнага візантыйска-славянскага крыжова-купальнага храма. Характэрна, што і на наступных этапах развіцця сакральнага дойлідства феадальнага перыяду полацкі і гродзенскі рэгіёны стабільна заставаліся важнейшымі духоўнымі асяродкамі, дзе творча перапрацоў-



Мал. 112. Царква на гарадзішчы ў Тураве. План



Мал. 113. Царква ў Тураве. Паўднёвы фасад. Рэканструкцыя Г. Лаўрэцкага

валіся мастацкія запазычанні і на іх падставе фарміраваліся самабытныя мясцовыя архітэктурна-будаўнічыя прыёмы.

Сярод рэгіянальных школ сакральнага дойлідства старажытнарускага перыяду на тэрыторыі сучаснай Беларусі асобае месца займае мураваная царква на гарадзішчы ў Тураве. Яе пачалі будаваць у сярэдзіне XII ст., падчас епіскапства Кірылы Тураўскага, але ў хуткім часе сцены і падмуркі па нейкіх прычынах далі значныя расколіны, у выніку чаго ўжо ў канцы XII — пачатку XIII ст. былі зроблены пэўныя намаганні для яе ўмацавання. Быў прыўзняты ўзровень падлогі, да ўсходняй пары слупоў даданы магутныя контрфорсы з праёмам паміж імі ў цэнтральную апсіду.

Рэшткі царквы выяўлены ў 1961 г. археолагамі П. Рапапортам і М. Палубаярынавай, цалкам раскрыты ў 1962—1963 гг. М. Каргерам. Раскопкі праводзіліся таксама П. Лысенка. Ацалелі падмуркі і рэшткі сцен на вышыню да 0,5 м, у алтарнай частцы — месцамі да 2 м, што дало археолагам магчымасць вызначыць збудаванне як 6-слуповы трохапсідны храм памерам 28,2 × 16,5 м. Два заходнія слупы ўмоўныя: яны толькі пазначаны лапаткамі на сцяне, якая аддзяляе нартэкс.

З пункту гледжання архітэктонікі збудавання — гэта тыповы 4-слуповы крыжова-купальны храм з трыма паўкруглымі алтарнымі апсідамі і нартэксам. Агульнай кампазіцыяй ён у найбольшай ступені нагадвае Успенскі сабор Елецкага манастыра ў Чарнігаве, пабудаваны ў 1120-х гг. Апорныя слупы маюць крыжападобную форму з невялікім вынасам і адпаведныя лапаткі на ўнутранай паверхні сцен. Звонку лапаткі двухступеньчатыя са скругленымі вуглами верхняга ўступа. Усходнія лапаткі на вонкавых і міжапсідных сценах азначаюць месца паніжэння вышыні апсід.

Больш нізкім быў, верагодна, і нартэкс, хаця, паводле рэканструкцыі Г. Лаўрэцкага, нартэкс мае вышыню, аднолькавую з асноўным аб'ёмам храма. Над нартэксам месціліся хоры, куды вялі вітыя ўсходы, размешчаныя ў паўночна-заходнім вуглу. Ад іх ацалела тонкая сценка ў чвэрць круга, накшталт гродзенскай Ніжняй царквы. У вуглах кафалікона каля нартэкса і ў самім нартэксе знойдзены тры саркафагі з шыферных плітаў. Ад вонкавай заходняй сцяны захаваўся толькі невялікі фрагмент без вуглавых частак.

Падмуркі царквы ў Тураве закладзены на глыбіні 1,2 м і выкладзены насуха з невялікіх валуноў. Муроўка сцен выканана ў роўнаслаёвай тэхніцы на вапняковай рошчыне з дадаткам тоўчанай цэглы. Пазнейшыя пераробкі XIII ст. маюць іншы фармат цэглы. Сцены царквы ўнутры не былі размаляваны фрэскамі. Ацалелі фрагменты перапаленых керамічных плітак падлогі, што дае падставы меркаваць аб вялікім пажары ў храме.

Кавалкі старажытнай плінфы выяўлены пры раскопках пінскага замчышча ў 1957 г. Т. Раўдзінай і пры даследаванні пінскага калегіума ў 1982 г. І. Чарняўскім, што сведчыць аб магчымасці існавання ў Пінску помніка дойлідства XII—XIII стст., рэгіянальна і тыпалагічна блізкага

тураўскай царкве. Беларускі археолаг А. Трусаў выказвае меркаванне, што «ў Тураве і Пінску, якія па свайму эканамічнаму развіццю мала ў чым саступалі буйным гарадам Полацкага і Гродзенскага княстваў, існавала ў XII ст. свая самабытная архітэктурная школа» [145. С. 35]. Па сваіх архітэктанічных і тэхналагічных характарыстыках яна, магчыма, займала прамежкавае становішча паміж гродзенскай і чарнігаўскай школамі сакральнага дойлідства. Аднак развіццё тут самабытнай самастойнай архітэктурна-будаўнічай творчасці было абарвана неспрыяльнымі сацыяльна-палітычнымі абставінамі.

Высновы

Паводле славутай трыяды старажытнарымскага тэарэтыка архітэктуры Вітрувія, сапраўдны твор манументальнага дойлідства спалучае ў сабе «карыснасць, трываласць і прыгажосць». Кожны з гэтых абавязковых кампанентаў архітэктуры грунтуецца на пэўным сацыяльна-гістарычным кантэксце, з прычыны чаго ўтрымлівае ў сабе шматгранную гісторыка-культурную інфармацыю. З пункту гледжання карыснасці відавочна, што манументальнае мураванае сакральнае (ці хрысціянскае храмавае) дойлідства стала найбольш запатрабаваным у XI—XII стст. ва ўсходнеславянскім рэгіёне з прычыны дзяржаўнага прыняцця тут хрысціянскага веравызнання, што з'явілася штуршком для дынамічнага і ўсебаковага развіцця культуры. Архетыпам манументальнага мураванага праваслаўнага храма паслужыў сярэдневізантыйскі крыжова-купальны храм з няцотнай колькасцю апсід і купалаў, што абумоўлена праваслаўным канфесійным канонам і паступовым шматвяковым фарміраваннем гэтай архітэктурна-канструкцыйнай сістэмы збудаванняў.

Характэрнай адметнасцю генезісу старажытнарускага манументальнага дойлідства ў цэлым з'яўляецца перанос на новую глебу ўжо добра распрацаваных архітэктурных формаў і будаўнічых метадаў, што дазволіла яму акумуляваць больш развітыя культурныя традыцыі і ўзняцца на адпаведны агульнаеўрапейскі ўзровень духоўнай і мастацкай практыкі. Першы этап станаўлення манументальнага дойлідства на Русі быў адзначаны сімвалічным узвядзеннем па візантыйскаму ўзору трох Сафійскіх сабораў — галоўных храмаў буйнейшых раннефеадальных княстваў: Кіеўскага, Наўгародскага і Полацкага.

З пункту гледжання трываласці і прыгажосці найбольш дасканалай і згарманізаванай аб'ёмна-прасторавай кампазіцыяй, з глыбокай сімволіка-семантычнай праграмай і рацыянальным узаемадзеяннем нясучых і нясомых мураваных канструкцый, у сярэдневізантыйскім дойлідстве лічыўся пяцігаловы храм з трыма алтарнымі апсідамі. Ён меў цэнтрычнае ядро ў выглядзе роўнаканцовага грэчаскага крыжа з купалам над сяродкрыжжам, а таксама чатыры купалы па яго дыяганалях

над больш нізкімі вуглавымі аб'ёмамі-кампартыментамі, так званае кананічнае праваслаўнае «пяцігалоўе». Запазычаны ўсходнімі славянамі разам з будаўнічай тэхналогіяй, гэты тып храма атрымаў далейшае развіццё і пэўныя трансфармацыі, у выніку чаго ў XII ст., у так званы епіскапска-княжацкі перыяд, найбольш пашыраным у азначаным рэгіёне стаў аднагаловы чатырохслуповы крыжова-купальны храм.

Ужыванне на агромністай тэрыторыі Усходняй Еўропы, побач з візантыйскімі ўзорамі, творчых мясцовых архітэктурных прыёмаў, розных будаўнічых модулей і тэхнік муроўкі прывяло да фарміравання самабытных рэгіянальных старажытнарускіх школ дойлідства, сярод якіх пачэснае месца займаюць полацкая і гродзенская архітэктурна-будаўнічыя школы XI—XII стст. На жаль, з прычыны феадальных міжусобіц, наступнай шматвяковай экспансіі каталіцызму, шматлікіх войн і іншых сацыяльных катаклізмаў большасць помнікаў таго часу зруйнавана. З больш як 20 помнікаў сакральнага мураванага дойлідства старажытнарускага перыяду на беларускіх землях толькі ў двух — Спаса-Праабражэнскай царкве ў Полацку і Барысаглебскай царкве ў Гродна — фрагментарна ацалелі архітэктурныя канструкцыі, што дае падставы для рэканструкцыі аўтэнтычнага стану не толькі іх, але і астатніх архітэктурна-археалагічных аб'ектаў, якія захаваліся ў рэштках на ўзроўні падмуркаў і ніжніх частак сцен.

Хаця амаль па кожнаму помніку на працягу больш як стагоддзя неаднаразова праводзіліся археалагічныя даследаванні, архітэктурнаму аналізу, выкананаму археолагамі толькі на падставе планавых схем, без уліку генезісу архітэктонікі збудаванняў, уласціва пэўная недастатковасць, а часам і навуковая недакладнасць. Многія, нават знаныя археолагі, абапіраюцца ў атрыбуцыі помнікаў сакральнага дойлідства толькі на колькасць апорных слупоў і структуру планаў, не ўлічваючы комплексна архітэктоніку збудаванняў, кананічныя суадносіны функцыянальных частак храма, наяўнасць крыжова-купальнага ядра аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі і яе семантыку. Яны аб'ектыўна выяўляюць лакуны, стымулююць новыя даследаванні, дазваляюць перайсці да гістарычных абагульненняў.

Пераважная большасць сакральных помнікаў XI—XII ст. на беларускіх землях прадстаўляе розныя варыянты крыжова-купальнага храма з кампазіцыйным ядром у выглядзе роўнаканцовага ці папарна роўнаканцовага крыжа ў сячэнні на ўзроўні падкупальнага квадрата. Гэты факт супярэчыць недакладнаму вызначэнню храмаў па ўмоўнай колькасці слупоў ці нефаў. Агульная архітэктоніка трансфармуецца толькі ў накірунку дапаўнення гэтага ядра вімай альбо нартэксам ці тым і іншым разам, што не выходзіць за старазапаветныя традыцыі сакральнага будаўніцтва.

Наватарскімі мадыфікацыямі ранехрысціянскіх візантыйскіх канонаў і тэхналагічных метадаў у мяс-

цовым храмабудаўніцтве стала стварэнне пірамідальна-ярусных аб'ёмна-прасторавых кампазіцый з дапамогай больш нізкіх прытвораў, арыентаваных па баках свету, надбудовы пастамента пад барабанам купала, прыём «схаваных» апсід і г. д. Важнымі аспектамі фарміравання мясцовых сярэдневяковых школ дойлідства з'яўляюцца выкарыстанне новых канструкцыйна-будаўнічых прыёмаў, эмпірычнае ўдасканаленне статыкі збудаванняў, ужыванне прыроднага каменю цвёрдых парод як будаўнічага матэрыялу і дэкаратыўнага сродку, далейшая распрацоўка акустычных і ацяпляльных якасцей сакральных збудаванняў.

Разгляд канфесійна-семантычных, архітэктурна-мастацкіх і будаўніча-тэхналагічных характарыстык праваслаўных цэркваў XI—XIII стст. полацкага і гродзенскага рэгіёнаў у храналагічнай паслядоўнасці дае магчымасць больш дакладна вызначыць генезіс архетыпаў культавых збудаванняў, шматвектарныя мастацкія ўплывы, самастойныя творчыя прыёмы мясцовых майстроў і як вынік — аб'ектыўна раскрыць першапачатковыя этапы станаўлення беларускага манументальнага дойлідства ў цэлым.

Літаратура

1. *Агеев Ю. С.* Архитектура южной и западной Руси в XII—XIII вв. // Всеобщая история архитектуры: В 12 т. Т. 3. Л; М., 1966.
2. *Алексеев Л. В.* Полоцкая земля. М., 1966.
3. *Алексеев Л. В.* По Западной Двине и Днепру в Белоруссии. М., 1974. 243 с.
4. *Археографический* сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Вильна, 1912. Т. 13. 392 с.
5. *Археалогія* і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1993. 702 с.
6. *Архиепископ* Сергий (Голубцов). Церковная архитектура // Символика русского храмоздательства. М., 1994. Вып. 17. С. 47—60.
7. *Архітэктура* Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1993. 613 с.
8. *Афанасьев К. Н.* Построение архитектурной формы древнерусскими зодчими. М., 1961. 296 с.
9. *Баравы Р.* Невядомы помнік старажытнабеларускай архітэктуры // Спадчына. 1993. № 1. С. 64—68.
10. *Бартенев И. А.* Форма и конструкция в архитектуре. Л., 1963. 293 с.
11. *Бартенев И. А., Батажкова В. Н.* Очерки истории архитектурных стилей. М., 1985. 284 с.
12. *Батюшков П. Н.* Белоруссия и Литва: Исторические судьбы Северо-Западного края. СПб., 1890. 382 с.
13. *Без-Корнилович М. О.* Исторические сведения о примечательных местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений, к ней же относящихся. СПб., 1855.
14. *Боровой Р. В., Булкин В. А.* Из истории церкви Бориса и Глеба в Витебске // Проблемы изучения древнерусского зодчества. СПб., 1996.
15. *Брунов Н.* Беларуская архітэктура XI—XII ст. // Зборнік артыкулаў па этнаграфіі, антрапалогіі, псіхалогіі і гісторыі мастацтва Інбелкульта. Менск, 1928. С. 267—307.
16. *Брунов Н. И.* Извлечение из предварительного отчета о командировке в Полоцк, Витебск и Смоленск в сентябре 1925 г. М., 1926.

17. *Брунов Н. И.* К вопросу о некоторых связях русской архитектуры с зодчеством южных славян // Архитектурное наследство. М., 1952. Т. 2.

18. *Брунов Н. И.* К вопросу о самостоятельных чертах русской архитектуры X—XII вв. // Русская архитектура. М., 1940. С. 124 и далее.

19. *Брунов Н. И.* Мастера древнерусского зодчества. М., 1953.

20. *Бубенька Т. С.* Раскопки окольного города феодального Витебска // Археологические открытия 1982 г. М., 1983.

21. *Бубенька Т. С.* Исследования в Витебске // Археологические открытия 1983 г. М., 1984.

22. *Булкин В. А.* Исследование Софийского собора в Полоцке // Археологические открытия 1980 г. М., 1981. С. 331—332.

23. *Булкин В. А., Булкин В. А., Смирнов В. Н., Ратнер И. Е.* Раскопки в Полоцке // Археологические открытия 1978 г. М., 1979. С. 430—431.

24. *Булкин В. А.* Работы в Верхнем замке в Полоцке // Археологические открытия 1979 г. М., 1980. С. 358—359.

25. *Булкин В. А., Раппопорт П. А., Шолохова Е. В.* Раскопки архитектуры в Полоцке // Археологические открытия 1977 г. М., 1978. С. 410.

26. *Булкин В. А., Раппопорт П. А., Штендер Г. М.* Раскопки памятников архитектуры в Полоцке // Археологические открытия 1976 г. М., 1977. С. 400.

27. *Вагнер Г. К.* Канон и стиль в древнерусском искусстве. М., 1987.

28. *Вагнер Г. К.* Византийский храм как образ мира // Византийский временник. № 47. М., 1986. С. 16—41.

29. *Вагнер Г. К., Владышевская Т. Ф.* Искусство древней Руси. М., 1993. 254 с.

30. *Воронин Н. Н.* Древнее Гродно // Материалы и исследования по археологии СССР. М., 1954. № 41. С. 19 и далее.

31. *Воронин Н. Н.* У истоков русского национального зодчества // Ежегодник Института истории искусств. М., 1952.

32. *Всеобщая* история архитектуры / Под ред. Б. П. Михайлова. М., 1958. Т. 1.

33. *Всеобщая* история архитектуры / Под ред. Б. П. Михайлова. М., 1962. Т. 2.

34. *Габрусь Т. В.* Монументальное белорусское зодчество XI—XII вв.// Христианизация Руси и белорусская культура. Мн., 1988. С. 303—313.

35. *Габрусь Т. В.* Мураваныя харалы: Сакральная архітэктура беларускага барока. Мн., 2001. С. 12—26.

36. *Ганецкая І.* Маёліка // Археалогія і нумізматыка: Энцыклапедыя. Мн., 1993. С. 288—289.

37. *Голан А.* Миф и символ. М., 1994. С. 109.

38. *Голубинский Е.* История русской церкви. М., 1904.

39. *Грот К.* Из истории Угрии и славянства в XII в. Варшава, 1889.

40. *Грязнов В. В.* Коложская Борисоглебская церковь в г. Гродно. Вильно, 1893.

41. *Димитрий.* Книга житий святых. Месяц май, 23 мая. Киев, 1700.

42. *Дубінін А.* «Вавілон» у храмавым будаўніцтве Беларусі // Мастацтва. № 7 (244), ліпень 2003. С. 35—37.

43. *Евгений* (Болховитинов). Описание Киево-Софийского собора и киевской иерархии. Киев, 1825.

44. *Егоров Ю. А.* Градостроительство Белоруссии. М., 1954. 282 с.

45. *Живописная* Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении / Под ред. П. П. Семенова. СПб.; М., 1882. Т. 3. Литовское и Белорусское Полесье. Репринт: Мн., 1994.

46. *Загарульскі Э. М.* Археалагічнае вывучэнне дзяцінца старажытнага Мінска // Весці АН БССР. 1960. № 4. С. 55—56.

47. *Загорульский Э. М.* Возникновение Минска. Мн., 1982. С. 198—202.

48. *Загорульский Э. М.* Древний Минск. Мн., 1963.

49. *Збор* помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Віцебская вобласць. Мн., 1985.

50. *Збор* помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Гомельская вобласць. Мн., 1985.

51. *Збор* помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Гродзенская вобласць. Мн., 1986.

52. *Збор* помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Мінск. Мн., 1988.

53. *Зорин Н.* Минувшее и настоящее г. Полоцка. Полоцк, 1910.

54. *Караулов Е. В.* Каменные конструкции: Их развитие и сохранение. М., 1966.

55. *Каргер М. К.* К истории полоцкого зодчества XII в. // Новое в археологии. М., 1972. С. 355—359.

56. *Каргер М. К.* Раскопки церкви Бориса и Глеба в Новогрудке // Краткие сообщения Ин-та археологии АН СССР. 1977. Вып. 150.

57. *Каргер М. К.* Храм-усыпальница в Евфросиньевском монастыре в Полоцке // Советская археология. 1977. № 1. С. 241—244.

58. *Карташев А. В.* Очерки по истории русской церкви. М., 1999. Т. 1—2.

59. *Касьпяровіч М.* Беларуская архітэктура. Віцебск, 1925. 39 с.

60. *Касьпяровіч М.* Матэрыялы для вывучэння віцебскай краёвай літаратуры і мастацтва. Мн., 1927.

61. *Кацер М. С.* Белорусская архитектура: Исторический очерк. Мн., 1956.

62. *Кацер М. С.* Изобразительное искусство Белоруссии дооктябрьского периода. Мн., 1969.

63. *Колединский Л. В.* О церкви Св. Михаила в Витебске (конец XI — начало XII вв.) // Проблемы изучения древнерусского зодчества. СПб., 1996.

64. *Колединский Л. В.* Раскопки в Витебске // Археологические открытия 1979 г. М., 1980.

65. *Корач В.* Два типа кафедральных соборов XI в. в областях, связанных с Византией // Средневековая Русь. М., 1976.

66. *Красовицкий П. М.* Памятники церковной старины Полоцко-Витебского края и их охранение // Полоцко-Витебская старина. Витебск, 1911. Ч. 1. С. 119—141.

67. *Кудрявцев М., Кудрявцева Т.* Русский православный храм: Символический язык архитектурных форм // Символика русского храмоздательства. М., 1994. Вып. 17. С. 65—87.

68. *Кудряшов В. И.* Гродно. М., 1960.

69. *Кудряшов В. И.* Полихромия в древнерусской архитектуре города Гродно // Материалы конференции молодых ученых АН БССР. Мн., 1960. С. 152—155.

70. *Кузнецов А. В.* Своды и их декор. М., 1938.

71. *Кулагін А. М.* Праваслаўныя храмы на Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. Мн., 2001. 320 с.

72. *Лаврецкий Г.* Православное зодчество Беларуси. Мн., 1995. 98 с.

73. *Лакотка А. І.* Дойлідства // Беларусы: У 8 т. Мн., 1997. Т. 2. С. 140—158.

74. *Лакотка А. І.* Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры. М., 1999. С. 216—222.

75. *Лаўрэцкі Г.* Казань у камені: Архітэктурная спадчына Літоўскай Русі // Праваслаўе. С. 41—55.

76. *Логвин Г. Н.* О деревянном зодчестве домонгольской Руси // Средневековая Русь. Мн., 1976. С. 150—165.

77. *Лысенко П. Ф.* Города Туровской земли. Мн., 1974.

78. *Максимов П. Н.* Собор Спасо-Евфросиньевского монастыря в Полоцке. Михаило-Архангельская церковь в Смоленске и др. // Русское зодчество. М., 1953. Вып. 2.

79. *Максимов П. Н.* Творческие методы древнерусских зодчих. М., 1968. 240 с.

80. *Малевская М. В.* К реконструкции майоликового пола Нижней церкви в Гродно // Культура Древней Руси. М., 1966. С. 147—156.

81. *Малевская М. В.* Архитектурный комплекс новогрудского детинца XIII—XIV вв. // Древнерусское государство и славяне. Мн., 1983. С. 122—125.

82. *Материалы* для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба: Виленская губерния / Сост. А. Корева. СПб., 1861.

83. *Материалы* для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба: Гродненская губерния / Сост. П. Бобровский. СПб., 1863. Ч. 2.

84. *Материалы* для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба: Минская губерния / Сост. И. Зеленский. СПб., 1864. Ч. 2.

85. *Мельников А.* Путь непечален: Исторические свидетельства святости Белой Руси. Мн., 1992. 240 с.

86. *Мифы* народов мира. М., 1987. Т. 1.

87. *Монгайт А. Л.* Фрески Спасо-Евфросиньевского монастыря в Полоцке // Культура Древней Руси. М., 1966. С. 134—140.

88. *Мысліцелі* і асветнікі Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1995.

89. *Мялешка С.* Праца навукова-дасьледчае экспэдыцыі цэнтральных дзяржаўных рэстаўрацыйных майстэрняў у г. Полацку // Наш край. 1929. № 8—9. С. 77—78.

90. *Некрасов А. И.* Византийское и русское искусство. М., 1924.

91. *Некрасов А. И.* Очерки по истории древнерусского зодчества XI—XVII вв. М., 1936.

92. *Николай* (Троицкий). Христианский православный храм в его идее // Символика русского храмоздательства. М., 1994. № 17. С. 22—47.

93. *Новгородская* первая летопись старшего и младшего изводов. М.; Л., 1950.

94. *Орловский Е.* Гродненская старина. Ч. 1. Город Гродно. Гродно, 1910. 244 с.

95. *Павлинов А. М.* Древние храмы Витебска и Полоцка // Труды IX Археологического съезда в Вильне, 1893 г. М., 1895. Т. 1. С. 19—26.

96. *Павлинов А. М.* История русской архитектуры. М., 1894.

97. *Покровский Н. В.* Памятники христианской архитектуры. СПб., 1910.

98. *Покровский Н. В.* Происхождение древнехристианской базилики: Церковно-археологическое исследование. СПб., 1880. 47 с.

99. *Покровский Н. В.* Церковная археология. Пг., 1916.

100. *Полное* собрание русских летописей. М., 1962. Т. I.

101. *Полное* собрание русских летописей. Т. XXI. С. 210.

102. *Пселл М.* Хронография. М., 1978.

103. *Раппопорт П. А.* Древнерусская архитектура. СПб., 1993.

104. *Раппопорт П. А.* Метод датирования памятников древнего смоленского зодчества по формату кирпича // Советская археология. 1976. № 2. С. 89.

105. *Раппопорт П. А.* Мураванае дойлідства заходнерускіх земляў XI—XII стст. // Гісторыя беларускага мастацтва. Мн., 1987. Т. 1. С. 57—72.

106. *Раппопорт П. А.* Русская архитектура X—XIII вв. // Археология СССР: Свод археологических источников. Л., 1982. Вып. Е. С. 1—47.

107. *Раппопорт П. А., Штендер Г. М.* Спасская церковь Евфросиньева монастыря в Полоцке // Памятники культуры: Новые открытия. Л., 1980. С. 459—468.

108. *Раппопорт П. А.* Церковь Благовещения в Витебске // Памятники культуры. Новые открытия. М., 1987. С. 522.

109. *Ратшин А.* Полное собрание исторических сведений о всех бывших в древности и ныне существующих монастырях и примечательных церквах России. М., 1852.

110. *Русь* святая: Краткая иллюстрированная история православия на Руси. М., 1995. 308 с.

111. *Рыбаков Б. А.* Архитектурная математика древнерусских зодчих // Советская археология. 1957. № 1. С. 83—112.

112. *Рыбаков Б. А.* Знаки собственности в княжеском хозяйстве Киевской Руси // Советская археология. М.; Л., 1940. Вып. 6. С. 227—257.

113. *Рыбаков Б. А.* Из истории культуры Древней Руси. М., 1984.

114. *Рыбаков Б. А.* Киевская Русь // История СССР с древнейших времен до наших дней. М., 1966. Т. 1. С. 450—489.

115. *Рыбаков Б. А.* Язычество древних славян. М., 1981. 621 с.

116. *Рэлігія* і царква на Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 2001. 365 с.

117. *Сапунов А. П.* Архив Полоцкой духовной консистории. М., 1898.

118. *Сапунов А. П.* Витебская старина. Витебск, 1883—1888. Т. I—V.

119. *Сапунов А. П.* Католическая легенда о Параскеве княжне Полоцкой. Витебск, 1888.

120. *Сапунов А. П.* Полоцкий Софийский собор. Витебск, 1888.

121. *Сапунов А. П.* Река Западная Двина: Исторический обзор. Витебск, 1893.

122. *Семенова З. Ф.* Традиции раннехристианского зодчества Византии и Закавказья в русской архитектуре // Архитектурное наследство. М., 1996. № 41. С. 13—22.

123. *Сементовский А. М.* Белорусские древности. СПб., 1890. С. 105.

124. *Сементовский А. М.* Витебск и уездные города Витебской губернии. СПб., 1864.

125. *Сементовский А. М.* Витебск: Статистический очерк // Памятная книжка Витебской губернии на 1864—1865 гг. Витебск, 1865.

126. *Сементовский А. М.* Полоцкая Софийская церковь // Памятная книжка Витебской губернии на 1878 г. Витебск, 1878. С. 61.

127. *Сементовский А. М.* Старинные материалы для географии, истории и археологии России. Витебск, 1886.

128. *Слюнчанка В. Г.* Барысаглебская Каложская царква ў Гродне: Гісторыка-архітэктурны нарыс. Мн., 1992. 41 с.

129. *Слюнченко В. Г.* Архитектурные памятники Полоцка. Мн., 1988. 46 с.

130. *Слюнченко В. Г.* Полоцкий Софийский собор. Мн., 1987. 47 с.

131. *Слюнькова И. Н.* Архитектура городов Верхнего Приднепровья XVII — середины XIX в. Мн., 1992. 144 с.

132. *Слюнькова И. Н.* Монастыри восточной и западной традиций: Наследие архитектуры Беларуси. М., 2002. С. 21—42

133. *Собрание* древних грамот и актов городов Минской губернии, православных монастырей, церквей и по разным предметам. Мн., 1848.

134. *Спегальский Ю. П.* К вопросу о взаимодействии деревянного и каменного зодчества в древней Руси // Архитектурное наследство. М., 1972. № 19. С. 63—69.

135. *Статистические* сведения о церквах и церковных притчах Полоцкой епархии // Памятная книжка Витебской губернии на 1889 г. Витебск, 1889.

136. *Страчаная* спадчына / Уклад. Т. В. Габрусь. Мн., 1998. 351 с.

137. *Сяліцкі А. А.* Фрэскі царквы Благавешчання ў Віцебску // Помнікі старажытнабеларускай культуры // Мн., 1984.

138. *Тарасаў С.* Полацкая Сафія: Да пытання паходжання старажытнарускіх архітэктурных традыцый // Каштоўнасці мінуўшчыны. Мн., 2000. С. 43—50.

139. *Тарасенка В. Р.* Вынікі раскопак Мінскага замчышча ў 1945—1949 гг. // Весці АН БССР. 1854. № 4. С. 70.

140. *Тарасенко В. Р.* Древний Минск // Материалы по археологии БССР. Мн., 1957. С. 213—232.

141. *Ткачев М. А., Колединский П. В., Бубенька Т. С.* Средневековый Витебск // Труды V Междунар. конгресса славянской археологии. Киев, 1985.

142. *Трусаў А. А.* Манументальнае дойлідства Беларусі XI—XVIII стст.: Гісторыя будаўнічай тэхнікі. Мн., 2001. 204 с.

143. *Трусаў А. А.* Старонкі мураванай кнігі: Манументальная архітэктура эпохі феадалізму і капіталізму. Мн., 1990.

144. *Трусаў А. А., Угрыновіч А. В.* Беларуская паліхромная кафля // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. Мн., 1983, № 4.

145. *Трусов О. А.* Памятники монументального зодчества Белоруссии XI—XVII вв. Мн., 1988. 160 с.

146. *Флиер А. Я.* Эволюция планов каменных православных храмов на территории Украины с X по середину XVII в. // Архитектурное наследство. М., 1977. № 35. С. 112—126.

147. *Флоренский П. А.* Храмовое действо как синтез искусств // Маковец: Журнал искусств. 1922, № 1. С. 6—14.

148. *Хозераў І.* Полацкае будаўніцтва старадаўняга перыяду // Запіскі аддзялення гуманітарных навук. Кн. 6. Працы камісіі гісторыі мастацтва. Менск, 1928. Т. 1. Сш. 1. С. 111—120.

149. *Хозеров И. М.* Белорусское и смоленское зодчество XI—XIII вв. Мн., 1994. 211 с. Репринт.

150. *Хозеров И. М.* К исследованию конструкции Спасского храма в Полоцке. Смоленск, 1928.

151. *Христианство:* Энциклопедический словарь // Под ред. С. С. Аверинцева. М., 1993—1995. Т. 1—3.

152. *Церашчатава В. В.* Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI—XVIII стст. Мн., 1986. 183 с.

153. *Чантурия В. А.* Архитектурные памятники Белоруссии. Мн., 1982. 223 с.

154. *Чантурия В. А.* История архитектуры Белоруссии: Дооктябрьский период. Мн., 1969. 287 с.

155. *Чантурия В. А.* История архитектуры Белоруссии. Мн., 1977. 319 с.

156. *Чарняўская Т. І.* Архітэктура Віцебска. Мн., 1980. 112 с.

157. *Чарняўскі І. М.* Новы помнік архітэктуры XII ст. у Гродне // Спадчына. 1982.

158. *Шероцкий К.* Софийский собор в Полоцке // Записки отделения русской и славянской археологии имп. Российского археол. об-ва. Пг., 1815. Т. 10. Ч. 2. С. 79—84.

159. *Штыхаў Г. В.* Полацкія фрэскі XII стагоддзя // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі 1970. № 1. С. 29—30.

160. *Штыхов Г. В.* Города Полоцкой земли (XI—XIII вв.). Мн., 1978. 216 с.

161. *Штыхов Г. В.* Древнеполоцкое каменное зодчество // Белорусские древности: Доклады к конференции по археологии Белоруссии. Мн., 1967. С. 260 — 275.

162. *Штыхов Г. В.* Киев и города Полоцкой земли // Киев и западные земли Руси в IX—XIII вв. Мн., 1982. С. 56.

163. *Шуази О.* История архитектуры. М., 1935—1937. Т. 1—2.

164. *Шчакаціхін М.* Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Менск, 1928. Т. 1. 278 с.

165. *Энцыклапедыя* гісторыі Беларусі. Мн., 1993—2003. Т. I—VI.


166. *Энцыклапедыя* літаратуры і мастацтва Беларусі. Мн., 1984—1987. Т. I—V.

167. *Якобсон А. Л.* Закономерности развития средневековой архитектуры XI—XV вв. Л., 1987.

Глава 3

МУРАВАНАЯ САКРАЛЬНАЯ АРХІТЭКТУРА БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ДА СТВАРЭННЯ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ (КАНЕЦ XIII – ТРЭЦЯЯ ЧВЭРЦЬ XVI ст.). ГОТЫКА І РЭНЕСАНС

(Т. В. Габрусь)





3.1. Ступень вывучанасці праблемы

Магутны пласт матэрыяльнай і духоўнай сярэдневяковай культуры Заходняй і Цэнтральнай Еўропы, створаны ва ўлонні тэалагічнай канцэпцыі святога Аўгусціна, аснову якога складае манументальнае каталіцкае храмабудаўніцтва, у сучасным мастацтвазнаўстве вядомы пад негатыўнай па сутнасці назвай — «готыка», што азначае «варварскае мастацтва» ці «мастацтва эпохі варварства».

Ацэнка і лёс мастацтва готыкі ў гісторыі мастацтвазнаўства ў цэлым даволі складаны. Духоўныя каштоўнасці і эстэтычныя характарыстыкі гатычнага мастацтва ў Новы час прайшлі шлях ад поўнага іх непрымання ў эпоху Адраджэння да ідэалізацыі ў эпоху рамантызму, потым — ад рамантычнага культу ірацыянальнасці мастацкіх формаў готыкі да гэткага ж культу рацыяналізму яе канструкцыйнай сістэмы (стральчатыя аркі, аркбутаны, нервюрныя скляпенні) на мяжы XIX—XX стст. І толькі мастацтвазнаўства XX ст. у працах Ф. Шлюсера, Э. Маля, Э. Панофскага, П. Франкля, І. Хейзінгі, Г. Зедльмайра пачало разглядаць готыку як цэласны мастацкі стыль у арганічнай сукупнасці яго эстэтычнай канцэпцыі і мастацкіх формаў.

«Бацькам готыкі» лічаць абата Сугерыя, настаяцеля манастыра Сен-Дэні пад Парыжам, пад кіраўніцтвам якога ўпершыню былі знітаваны ў адзіную канструкцыю стральчатая арка і нервюрнае скляпенне. Зарадзіўшыся ў Францыі ў XIII ст., гатычнае мастацтва з цягам часу ахапіла і запаланіла ўсю Заходнюю, Цэнтральную і Паўночную Еўропу, дзе ў розных іпастасях існавала аж да сярэдзіны XVI ст. У гэты час тэакратычная палітыка каталіцкай царквы сутыкнулася тут з тэндэнцыяй аб'яднання земляў і кансалідацыяй шэрагу еўрапейскіх манархічных дзяржаў. Заходнееўрапейскае мастацтвазнаўства падкрэслівае, што ў мастацтве готыкі змешаны «таленты раманскіх і германскіх народаў». Аднак у развіцці самабытных формаў так званай «цаглянай готыкі» немалую ролю адыгралі краіны Цэнтральнай Еўропы: Аўстрыя, Трансільванія, Чэхія, Прусія, Польшча і інш. Такім чынам, у вялікі цывілізацыйны працэс стварэння гатычнага мастацтва ўліліся славянскія народы.

Менавіта на Беларусі магутная хваля гатычнага мастацтва накацілася на бераг іншага культурнага арэала. З прычыны аддаленасці нашага рэгіёна ад асяродка ўзнікнення і пашырэння готыкі, складаных са-

цыяльна-палітычных абставін фарміравання дзяржаўнасці, пераважна праваслаўнай, а не каталіцкай канфесіянальнай арыентацыі асноўнай колькасці насельніцтва краіны, станаўленне готыкі ў сакральным дойлідстве Вялікага княства Літоўскага адбывалася са значным храналагічным спазненнем і ў надзвычай своеасаблівых формах, абумоўленых панаваннем тут на папярэднім этапе візантыйскіх архетыпаў.

Гістарыяграфія беларускага сакральнага дойлідства XIII—XVI стст. мае некалькі рознабаковых складаючых. У першую чаргу гэта гістарычныя пісьмовыя і графічныя крыніцы, на падставе якіх вызначаецца і ўдакладняецца навуковая атрыбуцыя помнікаў манументальнай сакральнай архітэктуры. Найбольш раннія, пераважна апакрыфічныя, звесткі пра заснаванне цэркваў і касцёлаў прыводзяцца ў беларускалітоўскіх летапісах і хроніках XV—XVI стст., нататках іншаземных паслоў і ўдзельнікаў ваенных падзей. Больш грунтоўную гістарычную інфармацыю прадстаўляюць дакументы Літоўскай метрыкі, Акты, выдадзеныя Віленскай археаграфічнай камісіяй, якія ўтрымліваюць фундушавыя запісы, каралеўскія прывілеі і пацвярджальныя граматы.

Важную ролю ў навуковай атрыбуцыі помнікаў сакральнага дойлідства ВКЛ адыгрываюць шматлікія інвентары манастырскіх комплексаў з апісаннямі храмаў, іх начыння, верагоднымі датамі будаўніцтва, імёнамі фундатараў, зместам фундацый і г. д. Гэтыя матэрыялы ў значнай колькасці захоўваюцца ў рукапісным аддзеле Навуковай бібліятэкі Вільнюскага універсітэта, Дзяржаўных гістарычных архівах Літвы, Расіі і Рэспублікі Беларусь. Паколькі інвентары часта складаліся людзьмі без прафесійнай падрыхтоўкі і з суб'ектыўным падыходам, то ў іх іншы раз назіраюцца разыходжанні, цьмяныя вызначэнні, фальсіфікацыі датаў на карысць сваёй канфесіі, што часам патрабуе аб'ектыўнай навуковай расшыфроўкі і карэкціроўкі тэкстаў.

Асабліва каштоўнымі першакрыніцамі з'яўляюцца архіўныя графічныя матэрыялы, якіх, аднак, вядома надзвычай мала. Гэта малюнкі, гравюры, карты і планы гарадоў і мястэчак ВКЛ XV—XVI стст. з выявамі культавых будынкаў розных канфесій, сярод якіх найбольш вядомымі з'яўляюцца гравюры Вільні, Нясвіжа, Клецка радзівілаўскага гравёра і картографа Т. Макоўскага пачатку XVII ст., гравюра Гродна XVI ст. М. Цюндта, малюнак С. Пахалавіцкага «Аблога Полацка войскам Стэфана Баторыя 11—30 жніўня 1579 г.».

У першай палове XIX ст. спектр графічных матэрыялаў значна пашырыўся за кошт абмерных чарцяжоў, якія выконваліся рознымі ведамствамі Расійскай імперыі пры перадачы ў іх валоданне зачыненых каталіцкіх і уніяцкіх цэркваў і манастыроў. Гэтыя матэрыялы захоўваюцца ў калекцыях праваслаўнага Імператарскага Сінода і Расійскага ваенна-гістарычнага архіва. Вялікую каштоўнасць маюць мастацка-краязнаўчыя замалёўкі XVIII—XIX стст. з выявамі архітэктурных ансамблей гарадоў і асобных помнікаў дойлідства, выкананыя мастакамі Н. Ордам,

Д. Струкавым, Ю. Пешкам, Ф. Смуглевічам, В. Грязновым, М. Пятровым і інш.

Стан помнікаў старажытнага дойлідства на пачатак XX ст. зафіксаваны на шматлікіх фотаздымках і паштоўках, сярод якіх найбольшую навуковую каштоўнасць мае вядомая калекцыя братоў Блзукевічаў. Татальная фотафіксацыя помнікаў нацыянальнага дойлідства з мэтай іх аўтэнтычнай рэстаўрацыі праводзілася Віленскім таварыствам аматараў навук з удзелам Я. Булгака, Е. Ромера, Ф. Рушчыца і інш.

На падставе архіўных графічных матэрыялаў сучасныя даследчыкі непасрэдна грунтуюць уласны гісторыка-архітэктурны аналіз, ствараюць новыя навуковыя канцэпцыі. У 1990-я гг. у навуковы ўжытак уведзены архіўны альбом чарцяжоў XVI ст. з Нясвіжа, атрыбутаваны намі як «альбом Д.-М. Бернардоні», які не толькі адзначае пачатак архітэктурнага праектавання ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе, але і ўтрымлівае каштоўную інфармацыю пра шэраг помнікаў сакральнага дойлідства Беларусі готыка-рэнесанснага перыяду, якія на сённяшні дзень ужо не існуюць.

Навуковае асэнсаванне гістарычнай ролі і мастацкай самабытнасці сакральных помнікаў ВКЛ часоў готыкі і рэнесансу пачалося з клерыкальна-краязнаўчых выданняў і энцыклапедычна-статыстычных даведнікаў XIX ст. У даволі значнай колькасці даследаванняў гісторыка-краязнаўчага характару, напісаных дарэвалюцыйнымі гісторыкамі, этнографамі, служыцелямі культу і даследчыкамі-аматарамі, разглядалася галоўным чынам рэлігійная гісторыя асобных архітэктурных помнікаў. У гэтых працах не закраналіся тэарэтычныя мастацтвазнаўчыя пытанні, а спробы зрабіць архітэктурны аналіз былі даволі рэдкія і малапрафесійныя. У цэлым яны змяшчаюць багаты факталагічны матэрыял, але яго інтэрпрэтацыя як на рускай, так і на польскай мове часта вызначаецца тэндэнцыйнасцю, спробамі абгрунтаваць у азначаным рэгіёне сацыяльна-культурныя прыярытэты праваслаўнай альбо каталіцкай канфесіі (П. Бацюшкаў, П. Пакрышкін, А. Кіркор, Т. Нарбут, М. Баліньскі, Т. Ліпіньскі, У. Сыракомля, Ч. Янкоўскі).

Найбольш дакладнымі навуковымі крыніцамі з'яўляюцца архітэктурна-археалагічныя даследаванні гатычнага дойлідства ВКЛ, пачатак якім паклаў беларускі гісторык і археолаг граф К. Тышкевіч. Яны працягнуты польскімі даследчыкамі М. Сакалоўскім, Я. Зубржыцкім, Я. Ядкоўскім, А. Шышка-Богушам. Асабліва істотнае навуковае значэнне мае праца Я. Ядкоўскага, прысвечаная цэрквам, прыстасаваным да абароны на Літве і Літоўскай Русі. Яна дапоўнена абмернымі чарцяжамі помнікаў, якія стварылі аснову для далейшага мастацтвазнаўчага вывучэння нацыянальнай манументальнай архітэктуры гэтай эпохі. Разам з азначанымі даследчыкамі, у гістарычных межах Заходняй Беларусі помнікі гатычнага дойлідства ВКЛ з мастацтвазнаўчага і археалагічнага пунктаў гледжання працягвалі даследаваць М. Маралеўскі, С. Лёранц, Я. Вайцяхоўскі, Ю. Клос і інш.

Адметнае мастацтвазнаўчае паняцце «беларуская готыка» ўпершыню і дастаткова грунтоўна сфармуляваў і напоўніў канкрэтным зместам заснавальнік айчыннага мастацтвазнаўства М. Шчакаціхін, які ў адрозненне ад папярэднікаў, польскіх і расійскіх даследчыкаў, разглядае «беларускую царкоўную готыку» як вынік мастацкай творчасці аднаго народа, а не толькі як матэрыяльную аснову супрацьлеглых расійска-польскіх клерыкальна-шавіністычных пазіцый, і акцэнтуе ўвагу на нацыянальных каранях гэтай культурнай з'явы. Нягледзячы на рэальныя тагачасныя палітычныя абставіны, падзел Беларусі паводле Рыжскай дамовы 1921 г., ён слушна разглядаў сярэдневяковую гісторыю Беларусі ў гістарычных межах ВКЛ. Для вывучэння генезісу і эвалюцыі стылёвых характарыстык беларускага культавага дойлідства XV—XVI стст. ім зроблены высокапрафесійны архітэктурна-стылістычны аналіз касцёлаў Св. Ганны і бернардзінцаў у Вільні, а таксама праваслаўных цэркваў-крэпасцяў у Сынковічах, Маламажэйкаве (Мураванцы) і Супраслі.

У сваёй мастацтвазнаўчай канцэпцыі М. Шчакаціхін прытрымліваўся тэорыі паслядоўнага прагрэсіўнага развіцця архітэктурных формаў на падставе запазычанага першаўзору, у выніку часам перабольшваў уплыў на мясцовае храмавае будаўніцтва нямецкай готыкі. Гэты ўплыў быў не адзіным і адбываўся, хутчэй, апасродкавана, праз замкавае будаўніцтва. Адпаведна сваёй канцэпцыі, М. Шчакаціхін лічыў касцёл Св. Ганны ў Вільні найбольш яркім і найбольш раннім узорам готыкі ў ВКЛ, перанятым з Нямеччыны. На думку даследчыка, ён паўплываў на архітэктуру больш познягa віленскага касцёла бернардзінцаў з трыма вежамі на вуглах, а той — на фарміраванне 4-вежавых кампазіцый абарончых цэркваў Беларусі, якія і сталі квінтэсенцыяй самабытнасці беларускай готыкі.

Гісторыка-архітэктурныя даследаванні пасляваеннага часу, якіх, дарэчы, было няшмат (Ю. Ягораў, М. Кацар, А. Міцянін, У. Чантурыя), толькі з большага закраналі аб'екты беларускай готыкі, адкінуўшы ўжо помнікі Вільні, у асноўным паўтаралі мастацтвазнаўчую канцэпцыю М. Шчакаціхіна. На мяжы 1960—1970-х гг. кола даследаваных помнікаў архітэктурнай готыкі ВКЛ значна пашырылі працы маскоўскай даследчыцы А. Квітніцкай і шэрага літоўскіх даследчыкаў (А. Янкавячэне, В. Дрэма, С. Абрамаўскас). Наступны паглыблены этап даследавання беларускіх помнікаў дойлідства абарончага перыяду пачаўся ў канцы 1970—1990 гг., чаму спрыяла распрацоўка дзяржаўнай навуковай праграмы «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» (У. Алісейчык, С. Багласаў, Т. Габрусь, А. Кулагін, А. Пятросава, Т. Чарняўская, Ю. Якімовіч).

Адначасова пачалася хваля адраджэння найбольш старажытных айчынных гісторыка-культурных каштоўнасцей, што спрыяла фарміраванню ў межах арганізацыі «Белспецпраектрэстаўрацыя» прафесійных кадраў архітэктараў-рэстаўратараў (В. Гліннік, С. Друшчыц, В. Калнін, В. Слюнчанка, Г. Лаўрэцкі). Но-

вую інфармацыю для мастацтвазнаўчага аналізу далі гісторыкі М. Ткачоў, А. Трусаў, А. Кушнярэвіч, якія, з'яўляючыся адначасова археолагамі-практыкамі, значна ўдакладнілі вывучэнне сакральных помнікаў перыяду абарончага дойлідства новымі гістарычнымі дадзенымі, увялі ў навуковы зварот шэраг раней маладаследаваных аб'ектаў, ацалеўшых у археалагічным стане ці з розначасовымі архітэктурна-будаўнічымі напластаваннямі.

Натурныя стратыграфічныя даследаванні з вызначэннем будаўнічых матэрыялаў і тэхналогій дазваляюць больш дакладна датаваць час будаўніцтва і перабудоў помнікаў. У сучасных беларускіх калектыўных працах і манаграфіях па гісторыі беларускага мастацтва і культуры, а таксама ў энцыклапедычных выданнях тэма нацыянальнай адметнасці сакральнага дойлідства ВКЛ інтэрпрэтавана пераважна беларускімі археолагамі і гісторыкамі архітэктуры: Т. Габрусь, А. Кушнярэвічам, А. Лакоткам, М. Ткачовым, А. Трусавым, Ю. Якімовічам.

3.2. Агульныя перадумовы развіцця дойлідства абарончага перыяду

З канца XIII ст. у развіцці беларускага сакральнага дойлідства пачаўся якасна новы этап, што звязана з аб'яднаннем этнічнай Белай Русі і этнічнай Літвы ў агульную дзяржаву — Вялікае княства Літоўскае, тэрытарыяльным і сацыяльным ядром якога былі беларускія землі. Неабходнасць гэтага дзяржаўнага саюза была абумоўлена знешняй пагрозай татара-мангольскай навалы з усходу і агрэсіяй крыжацкіх ордэнаў з захаду. Таму манументальнае дойлідства ВКЛ з канца XIII ст. набыло татальна абарончы характар. Яшчэ напачатку фарміравання дзяржаўнасці з'яўляецца адметны тып абарончага збудавання — асобна размешчаная шмат'ярусная цыліндрычная мураваная вежа-данжон. Падобныя вежы ўваходзілі ў абарончую сістэму многіх гарадоў, якая са старажытнасці складалася з натуральных прыродных перашкод і штучных драўляных умацаванняў (частаколаў, гародняў).

На працягу XIII ст., калі насельніцтва нашага краю мусіла вытрымліваць знешнія і ўнутраныя выпрабаванні, змагацца за палітычную і эканамічную незалежнасць, мураванае праваслаўнае храмабудаўніцтва прыйшло ў амаль поўны колькасны і якасны заняпад. Паступова былі страчаны многія прафесійныя прыёмы, прынесеныя візантыйскімі майстрамі і ўдасканаленыя мясцовымі царкоўнымі «делателями». Аднак паводле шматлікіх гістарычных крыніц, у гэты час працягвалася актыўнае будаўніцтва драўляных цэркваў, якія захоўвалі прыёмы мясцовага народнага цяслярства.

Пэўны час (з 1253 па 1270-я гг.) гродзенскі рэгіён знаходзіўся пад уладай і ўплывам Валынска-Галіц-

кага княства, што спрыяла будаўніцтву ў Гродна, Навагрудку, Камянцы, Брэсце мураваных абарончых вежаў так званага валынскага тыпу. У Іпацьеўскім летапісе пад 1277 г. адзначана адначасовае будаўніцтва (разам з вежамі-данжонамі і з цэглы аднолькавага фармату) мураваных цэркваў у Камянцы і Брэсце — Дабравешчанскай і святога Пятра, ад якіх не засталося ніякіх слядоў. Архітэктанічна яны былі, верагодна, апошнімі ўзорамі храма крыжова-купальнага тыпу з элементамі гродзенскай школы дойлідства.

На мяжы XIII—XIV стст. з прычыны складаных знешніх ваенна-палітычных абставін асноўным тыпам манументальнага будаўніцтва ў ВКЛ, побач з драўлянымі крэпасцямі, стаў мураваны замак — збудаванне з замкнутым унутраным двором, абнесеным магутнымі вежамі і сценамі, якому ўласціва спалучэнне абарончых, жылых і прадстаўнічых функцый. Адпаведна сваёй павышанай капітальнасці і рэпрэзентатыўнасці замак звычайна займаў асноўнае месца ў горадабудаўнічай структуры гарадоў і мястэчак, якія мелі цалкам драўляную забудову.

На заходніх межах дзяржавы ў XIV — пачатку XV ст. створаны абарончы пояс з шэрага мураваных замкаў (Вільня, Коўна, Трокі, Меднікі, Крэва, Гродна, Ліда, Навагрудак, Любартаў, Луцк, Камянец-Падольскі), якія мелі агульнадзяржаўнае прызначэнне і з'яўляліся рэзідэнцыямі вялікага князя, у іх падпісваліся гістарычныя пагадненні, дамовы, уніі, прымаліся замежныя паслы. Такім чынам, замкі спалучалі ў сабе жылыя і абарончыя функцыі, а таксама задачы прадстаўніцтва. Характэрна, што ўсе без выключэння мураваныя замкі часоў станаўлення ВКЛ сканцэнтраваны на лініі ад Вільні да Беластока: у Гродна, Навагрудку, Лідзе, Крэве, Меднікаў, Троках.

Галоўная ідэя, закладзеная ў тагачасныя манументальныя збудаванні, — ідэя бяспекі, аховы, абароны. Эстэтыка дойлідства таго перыяду, перш за ўсё, — у моцы і велічы замкавых сценаў і вежаў, дасканаласці і надзейнасці фартыфікацыйных элементаў: валоў, равоў, пад'ёмных мастоў, уязных брамаў, баявых галерэяў і інш. Формы замкавых вежаў паўтаралі традыцыйныя архітэктурныя кампазіцыі чацверыкоў і васьмерыкоў драўляных крэпасцей і цыліндрычных мураваных вежаў-данжонаў, па большасці былі прызматычныя, квадратныя ў плане (Меднікі, Крэва, Ліда); маглі быць таксама васьмігранныя ад аснавання (Вільня), васьмярык на чацверыку (Навагрудак, Мір, Любча) альбо цыліндрычныя (Гродна, Трокі, Коўна).

Спалучэнне магутных сценаў і вежаў разнастайных формаў надавала абліччу замкаў мастацкую адметнасць. Да замкавых сцен часта далучалася мураваная княжацкая камяніца (Вільня, Гродна, Трокі). Ярусы вежаў і жылыя памяшканні перакрываліся раманскімі крыжовымі альбо цыліндрычнымі з распалубкамі скляпеннямі, пазней гатычнымі нервюрнымі скляпеннямі зорчатага малюнка. Усё гэта разам стварае непаўторнае і своеасаблівае


мастацкае асяроддзе, сугучнае з сацыяльным быццём нашага краю ў тыя часы.

Перыяд абарончага дойлідства адзначаны адметнай будаўнічай тэхнікай. На змену плінфе прыйшла брусковая вялікапамерная, званая літоўскай, цэгла-пальчатка (з барознамі ад пальцаў). Візантыйскія тэхнікі муроўкі (роўнаслаёвую і са схаваным радам) замяніла гатычная альбо вендская (балтыйская) сістэма муроўкі. У будаўніцтве замкаў і храмаў атрымала пашырэнне трохслаёвая па вертыкалі тэхніка муроўкі («лусковая») з цэглы і неапрацаванага прыроднага каменю. Вонкавыя і ўнутраныя часткі сцен узводзіліся з цэглы, а прастора паміж імі запаўнялася бутам і вапняковапясчанай рошчынай з дадаткам дробных камянёў і бітай цэглы дзеля большай таўшчыні і трываласці муроў. Верхнія часткі сценаў, вуглы, скляпенні і адкосы праёмаў выконваліся цалкам з цэглы.


Агульнафартыфікацыйны характар манументальнага мураванага будаўніцтва XIII — першай паловы XVI ст. прадстаўляе ў гісторыі беларускай архітэктуры этап, які ўстойліва вызначаецца як «перыяд абарончага дойлідства», прычым ігнаруюцца яго стылёвыя характарыстыкі. Аднак у развіцці храмабудаўніцтва на Беларусі гэты перыяд не быў адназначны. Наадварот, паступовае пранікненне каталіцтва значна змяніла і ўскладніла палітру архітэктурных формаў і сімвалаў, пашырыла сродкі мастацкай выразнасці, надаўшы ім нацыянальную адметнасць. Разам з гэтым у айчыннае дойлідства прыйшлі архітэктурна-мастацкія формы і канструкцыі заходнееўрапейскай готыкі. Сутыкненне дзвюх асноўных хрысціянскіх канфесій і адначасова культурных арэалаў — візантыйскага і лацінскага — стала спецыфічным элементам гісторыі Беларусі, зыходным пунктам разнастайных мастацкіх інтэрпрэтацый і палітычных інтэнцый. Гэты факт істотна паўплываў на фарміраванне нацыянальнай свядомасці яе насельніцтва.

3.3. Эвалюцыя праваслаўнага храмабудаўніцтва канца XIII — пачатку XV ст.

Пісьмовыя гістарычныя крыніцы: летапісы, хронікі, інвентары — сведчаць пра дастаткова актыўнае будаўніцтва ў канцы XIII — пачатку XV ст. праваслаўных цэркваў і заснаванне шматлікіх манастыроў на тэрыторыі ўсяго ВКЛ. Аднак большасць праваслаўных храмаў таго часу былі драўляныя, яны неаднаразова гарэлі і аднаўляліся. Будаўніцтва жа мураваных праваслаўных цэркваў, відавочна, колькасна і якасна зніжалася. Фундацыі і перабудовы праваслаўных мураваных сакральных збудаванняў звязаны ў асноўным з асобамі вялікакняжацкага статуса.



Мал. 114. Верхняя царква ў Гродне. План



Мал. 115. Верхняя царква ў Гродне. Агульны выгляд (злева направа): паводле Г. Лаўрэцкага, паводле А. Трусава, аксанаметрычны разрэз (паводле Т. Андрыячыка)

Пры вялікім князі літоўскім Альгердзе ў сярэдзіне XIV ст. перабудавана Дабравешчанская царква ў Віцебску. Па фундацыі першай жонкі Альгерда — княгіні Марыі Віцебскай — у 1345—1346 гг. у Вільні пабудавана мураваная царква Параскевы Пятніцы, якая сваім архітэктурным абліччам нагадвала крыжова-купальныя храмы старажытнарускага перыяду. Яшчэ адна праваслаўная царква Св. Мікалая ў Вільні змуравана ў другой палове XIV ст. другой жонкай Альгерда — княгіняй Уллянай Цвярской. Мураваная Прачысценская царква ў Вільні пабудавана па фундацыі самога Альгерда, а Дабравешчанская ў Троках — па фундацыі вялікага князя Вітаўта. Да пачатку XV ст. адносіцца будаўніцтва мураваных цэркваў Св. Сергія і Вакха ў Брэсце, Прачыстай Багародзіцы ў Троках і шэрага іншых. Адны з іх цалкам знішчаны, другія атрымалі настолькі значныя пераробкі, што на іх падставе немагчыма выразна выявіць архітэктанічную і мастацкую эвалюцыю праваслаўнага храмабудаўніцтва таго часу.

Найбольш вядомыя і даследаваныя праваслаўныя культавыя пабудовы канца XIII—XIV стст. — Верхняя царква ў Гродна і царква на замчышчы ў Навагрудку — маюць выразныя прыкметы прымітывізацыі архітэктурна-будаўнічага працэсу. Рэшткі невялікай мура-

ванай царквы былі выяўлены Я. Ядкоўскім падчас археалагічных раскопак гродзенскага замка ў 1932—1937 гг. над рэшткамі больш старажытнага храма XII ст. Адпаведна свайму размяшчэнню гэтыя археалагічныя помнікі атрымалі назвы Ніжняй і Верхняй цэркваў.


Ад апошняй ацалелі падмуркі і фрагменты паўночнай і паўднёвай сцен асноўнага аб'ёму і алтарнай апсіды на вышыню 1—1,5 м, а таксама фрагмент аднаго з двух больш позніх па часе ўзвядзення апорных слупоў, якія даюць уяўленне аб планавай схеме збудавання (з 1939 г. прадстаўлены ў асобным экспазіцыйным павільёне). У вызначэнні даследчыкамі часу будаўніцтва Верхняй царквы ёсць пэўныя разыходжанні: ад сярэдзіны ці канца XIII ст. (Я. Ядкоўскі, Я. Вайцяхоўскі, З. Дурчэўскі, А. Кушнярэвіч) да канца XIV — пачатку XV ст. (М. Варонін, М. Ткачоў, А. Трусаў). Малаверагодным з'яўляецца будаўніцтва праваслаўнай царквы ў замку Вітаўта ў канцы XIV ст., але з археалагічных дадзеных відавочна, што ў гэты час яна была істотна перабудавана.

Верхняя царква на гродзенскім замчышчы па архітэктанічнай задуме значна саступала Ніжняй. Яна складалася з асноўнага квадратнага ў плане аб'ёму памерамі 8,9 × 8,8 м, са скошанымі вугламі, да ўсходняй сцяны якога далучалася адна паўкруглая апсіда даволі значных памераў. Квадрат плана крыху перакошаны, сцены маюць розную таўшчыню і няправільную перавязку швоў, што сведчыць пра прафесійную недасканаласць будаўнікоў. У муроўцы сцен спалучаюцца два тыпы цэглы (тонкая плінфападобная і вялікапамерная брусковая) і выкарыстана лусковая тэхніка з запаўненнем унутранай прасторы ў тоўшчы сцен дробным каменнем.

Характэрна, што ў муроўку сцен Верхняй царквы ўведзены таксама валуны з адным адшліфаваным бокам, якія пры гэтым не заўсёды выходзяць на паверхню фасадаў. А. Кушнярэвіч бачыць у гэтым «тыпалагічную прыкмету гродзенскай школы дойлідства XII ст.» [80. С. 26], але хутчэй за ўсё ў дадзеным выпадку будаўнічы матэрыял зруйнаванай Ніжняй царквы быў выкарыстаны бессістэмна пры ўзвядзенні новага храма, як лічыў М. Варонін. Для надання прасторавай жорсткасці і ўстойлівасці сцяне апсіды ў ёй з унутранага боку зроблены разгрузачныя арачныя нішы глыбінёю ў 2 цагліны.

Гэты храм, які першапачаткова меў унутры драўлянае перакрыцце, пры перабудове ў канцы XIV ст. быў перакрыты гатычнымі нервюрнымі скляпеннямі, крыжовымі альбо зорчатымі. Нервюры скляпенняў былі зроблены з лякальнай цэглы стральчатай формы. Для апоры скляпенняў у сярэдзіне асноўнага аб'ёму, былі пастаўлены два слупы крыжападобнай формы, дадаткова ўмацаваны арачны праём у алтарную апсіду. Верхняя частка сцен была ўпрыгожана крыжападобнай цэглай.

Даследчыкі таксама разыходзяцца ў вызначэнні агульнай архітэктонікі Верхняй царквы. Яе надзвычай простая планавая схема дае магчымасць стварыць розныя варыянты вянчаючых мас збудавання.



Мал. 116. Навагрудак. Царква на замку. Планы першай і другой паловы XIV ст. (паводле М. Малеўскай)

Існуе некалькі гіпатэтычных рэканструкцый Верхняй царквы.

Найбольш ранняя з іх рэканструкцыя Т. Андрэячыка, выкананая ў 1938 г., прадстаўляе яе як цэнтрычнае збудаванне, цалкам перакрытае вялікім паўсферычным купалам на светлавым барабане, якоя абапіраецца на конхавыя ветразі па вуглах асноўнага аб'ёму.

Паводле рэканструкцыі А. Трусава, храм быў перакрыты высокім клінападобным дахам з высокім мураваным шчытом, які чамусьці значна адступае ад плоскасці сцяны заходняга фасада, а колькасць вокнаў на фасадах аднолькавай шырыні розная (па 2 альбо 3).

Даволі ўмоўная рэканструкцыя Г. Лаўрэцкага скарачае колькасць вокнаў да аднаго на кожным фасадзе, а ў сярэдзіне вільчыка двухсхільнага даха дадае галоўку з крыжам на глухім барабане. Апсіда ва ўсіх рэканструкцыях перакрыта паўсферычнай конхай, але мае розную вышыню: ці больш нізкую за асноўны аб'ём, ці роўную з ім, апярэзаную паверсе аркатурным поясам, які пераходзіць ў пояс машыкуляў у падашшы [85]. На нашу думку, ёсць яшчэ адзін магчымы варыянт пакрыцця цэнтрычнага асноўнага аб'ёму (квадратнага ў плане з моцна скошанымі вугламі) шатровым васьмігранным дахам, накшталт абарончых вежаў, але дапоўненым галоўкай з крыжам у цэнтры.

Вялікую гісторыка-культурную каштоўнасць мае праваслаўная царква, пабудаваная ў першай палове XIV ст. у гонар Прасвятой Багародзіцы на замчышчы ў Навагрудку, рэшткі якой са шматлікімі будаўнічымі напластаваннямі адкрыты археолагамі М. Маляўскай і М. Ткачовым. Ад храма XIV ст. ацалелі падмуркі, частка сцен і падкупальных слупоў. Як лічаць, першапачаткова гэта было бесслуповае квадратнае ў плане збудаванне (13,5 × 13,5 м), перакрытае нервюрнымі скляпеннямі. Да яго з усходу прылягала адна больш нізкая алтарная апсіда, а з захаду — адпаведны па шырыні невялікі ўваходны прытвор-экзанартэкс. Паўночны і паўднёвы фасады раскрапоўвалі сіметрычныя рызаліты з бакавымі ўваходамі. Квадрат плана асноўнага аб'ёму і паўкружжа апсіды былі разбіты тэхнічна недакладна, што сведчыць аб невысокай прафесійнасці будаўнікоў.

Царква на навагрудскім замчышчы пастаўлена на падмурку глыбінёю 2 м, выкананага з бутавых камянёў на вапнава-пясчанай рошчыне. Сцены таўшчынёю 1,2 м выкладзены з вялікапамернай цэглы-пальчаткі, у алтарнай частцы маюць вендскую тэхніку муроўкі, а ў астатніх частках храма — гатычную. Унізе сцены па перыметры былі звязаны магутнымі драўлянымі брусамі,

ад якіх ацалелі ўнутраныя каналы (падобны прыём назіраўся на ранніх этапах у полацкай школе дойлідства). Вуглы ўваходных рызалітаў і прытвора былі вымураваны з жаўтавата-зялёных блокаў вапняковага туфу, што, відавочна, мела не толькі канструкцыйную, але і дэкаратыўную функцыю. Маляўнічае спалучэнне розных колераў і фактур будаўнічых матэрыялаў у гэты час паранейшаму заставалася асноўным архітэктурна-дэкаратыўным прыёмам.

Археолагі зазначаюць, што чатыры апорныя крыжападобныя ў сячэнні слупы былі пастаўлены ў сярэдзіне ці другой палове XIV ст. падчас рэканструкцыі царквы. Іх традыцыйнае размяшчэнне ў інтэр'еры храма сведчыць, што яны прызначаліся для апоры барабана купала, але восі апор не адпавядалі раскрапоўкам фасадаў, якія былі, верагодна, ніжэй за асноўны аб'ём.

Да 1775 г. у царкве на навагрудскім замчышчы праходзілі сесіі Літоўскага Трыбунала — вышэйшага апеляцыйнага суда ВКЛ, таму яна неаднаразова перабудоўвалася. У другой палове XVIII ст. яна была перададзена ў касцёл. Як сведчаць археалагічныя дадзеныя, памеры храма былі паступова павялічаны ва ўсіх напрамках: спачатку павялічана алтарная частка, затым развіты ў падоўжным напрамку кафалікон (да 34 м), прыбудаваны бакавыя прытворы, а з паўднёвага боку — сакрысція і вежа складанай канфігурацыі. У сярэдзіне XVIII ст. пластыка галоўнага фасада набыла рысы позняга барока з моцна выпукла-ўвагнутай паверхняй, хвалістымі карнізамі і звязкамі слаістых пілястраў. Помнік разбураны ў XIX ст.

Назначная колькасць і прымітывізм архітэктанічных кампазіцый мураваных праваслаўных цэркваў канца XIII—XIV ст. сведчаць пра пэўны заняпад будаўнічага майстэрства і адстутнасць выразных мастацкастылістычных характарыстык у храмабудаўніцтве таго часу.

3.4. Каталіцкае храмабудаўніцтва XIII—XIV стст.

У «Апісанні земляў», створаным каталіцкім манахам-місіянерам у XIII ст., упершыню згадваецца Белая Русь як самастойнае геаграфічнае паняцце. Аўтарам выказваецца жаданне прывесці гэтыя землі і іх насельніцтва «да праўдзівага Бога» і будаваць тут касцёлы. Ужо ў пачатку XIII ст. паўночнанямецкімі «ганзейскімі» купцамі былі заснаваны і ўзведзены касцёлы ў Полацку і Смаленску, верагодна, мураваныя, якія, акрамя асноўнай культавай функцыі, выкарыстоўваліся таксама для захавання тавараў. Як лічаць, першыя касцёлы прадстаўлялі тып збудавання з адным апорным слупом у цэнтры блізкага да квадрата плана, пашыраны ў Скандынавіі і іншых краінах Паўночнай Еўропы, як у свецкім, так і сакральным будаўніцтве.

Пасля заключэння Ягайлам у 1385 г. Крэўскай уніі з Каронай

Польскай і хрышчэння ў 1387 г. насельніцтва Літвы і сталіцы Вялікага княства Літоўскага — Вільні па каталіцкаму абраду будаўніцтва тут касцёлаў актывізавалася. Хрысціянізацыя ВКЛ па лацінскаму абраду адбывалася ў адпаведнасці з наступным заяўленнем Ягайлы ад 22 лютага 1387 г.: «хочучы таксама памножыць каталіцкую веру ў нашых літоўскіх і рускіх краях, са згоды і з дазволу нашых наймілейшых братоў, князёў і ўсёй шляхты літоўскай зямлі, мы вырашылі, разпарадзіліся і нават прысягнулі, заручыліся і дакрананнем да святых таямніц пакляліся ўсіх радавітых літоўцаў абоіх полаў, любога становішча, прызвання або годнасці, якія жывуць у нашых літоўскіх і рускіх дзяржавах, да каталіцкай веры і паслушэнства Святому Рымскаму Касцёлу схіліць, далучыць, заклікаць, а то нават і прымусіць, незалежна ад іх веравызнання». Паводле гэтага ж дэкрэта, у выпадку змешаных шлюбаў праваслаўны бок павінен быў абавязаны да прыняцця каталіцтва. Вялікі князь літоўскі Вітаўт у дзяржаўнай палітыцы таксама прытрымліваўся арыентацыі на каталіцкую царкву.

Самыя першыя мураваныя каталіцкія касцёлы ў ВКЛ, пабудаваныя па фундацыі Ягайлы і Вітаўта, былі даволі значных памераў. Гэта адлюстроўвала сур'ёзнасць намераў фундатараў і той факт, што будаўнікамі першых каталіцкіх святынь былі, відавочна, замежныя майстры. Пранікненню формаў заходнееўрапейскай гатычнай архітэктуры, у першую чаргу — з Італіі і Германіі, у ВКЛ спрыялі сацыяльна-палітычныя і эканамічныя абставіны. Першыя гатычныя мураваныя касцёлы былі ўведзены ў буйнейшых гарадах дзяржавы — Вільні і Коўна (апошні па Нёману меў развітыя гандлёвыя стасункі з землямі Паўночнай Германіі), таму ў іх назіраецца выразны ўплыў нямецкай готыкі, што адзначае большасць даследчыкаў. Уплыў Італіі быў абумоўлены зацікаўленасцю вялікакняжацкай улады патранатам Папы Рымскага, імкненнем вялікага князя Вітаўта да каралеўскай кароны. Характэрна, аднак, што Вільня, нават пасля хрышчэння яе жыхароў па каталіцкаму абраду, і ў далейшым доўгі час уваходзіла ў зону з перавагай праваслаўнага насельніцтва.


Як вядома, архітэктурна-канструкцыйная сістэма заходнееўрапейскай готыкі адпачатку была распрацавана для павелічэння ўмяшчальнасці гарадскіх сабораў. Ужо ў раманскіх саборах выкарыстанне структуры базілікі, раўнамерны крок апор якой можа працягвацца неабмежавана, дазволіў павялічыць іх планавыя памеры. Узаемазвязаная гатычная сістэма рабрыстых нервюрных скляпенняў, аркбутанаў і контрфорсаў дазволіла аблегчыць сцены і апорныя слупы, адначасова павялічыць вышыню храмаў.

Класічныя ўзоры нямецкай готыкі ў розных варыянтах уяўлялі пераважна трохнефавыя базілікі з трансептам, які ствараў у плане лацінскі крыж, і адной выцягнутай апсідай прэсбітэрыя, абкружанай хорам. З захаду, з боку ўвахода, крок базілікі спыняў нартэкс, завершаны адной (саборы ў Фрэйбургу, Ульме) ці дзвюма вежамі (саборы ў Кёльне,


Страсбургу). Адметнай трохвежавай кампазіцыяй галоўнага фасада (з вялікай цэнтральнай і маленькімі бакавымі вежамі) вызначаецца Фраўэнкірхе ў Нюрнбергу (1350—1380, архітэктар Пётр Парлірж).

На гэтай аснове ў землях Паўночнай Германіі быў выпрацаваны спрошчаны тып гатычнага храма. Структура базілікі была скарочана да мінімальных памераў, засталіся ўсяго 4 апорных слупа, якія падзяляюць унутраную прастору храма на тры нефы. Аднак раўнамерны крок апорных слупоў сведчыць пра базілікальны генезіс новай архітэктанічнай структуры, званай залавай. Па сутнасці, яна складалася з дзевяці роўнавысокіх травей, якія перакрываліся нервюрнымі скляпеннямі розных тыпаў.

У спрошчаным варыянце рамана-гатычны базілікальна-залавы тып храма стаў узорам для каталіцкага храмабудаўніцтва ВКЛ і з цягам часу прыцярпеў пэўную трансфармацыю пад уплывам мясцовых будаўнічых традыцый. Пры запазычанні агульнай архітэктонікі і будаўнічай тэхналогіі з цэнтральнаеўрапейскай цаглянай готыкі, у мураваным касцёльным гатычным будаўніцтве ВКЛ не выкарыстоўваліся абходныя галерэі хораў і аркбутаны, вельмі рэдка прысутнічаў трансепт. Галоўны фасад на ранніх этапах найчасцей быў бязвежавым, што сведчыць, хутчэй, пра ўплыў не паўночнанямецкай, а паўночнаітальянскай готыкі (саборы ў Асізі, Сіене, Пізе, XIII — пачатак XIV ст.). Пры гэтым, калі для заходнееўрапейскай готыкі былі характэрныя абавязкова квадратныя ў плане травеі больш



Мал. 117. Сабор у Сіене. Італія. XIV ст.



Мал. 118. Касцёл Св. Станіслава ў Вільні. Выява пачатку XVI ст. (паводле Т. Нарбута)

нізкіх бакавых нефаў, тут яны набываюць прамавугольны план і скляпенні аднолькавай вышыні з цэнтральным нефам. Звонку ўсе нефы накрываліся агульным двухсхільным дахам кроквеннай сістэмы, з'яўленне якога звязана з пранікненнем у мясцовае будаўніцтва гатычных канструкцый. Калі план збудавання паводле абрысу набліжаўся да квадрата, памеры травей станавіліся іншы раз амаль роўнымі. Падобная структура стала асновай для пазнейшых дзевяціпольных сінагог ВКЛ.

Мураваны кафедральны касцёл Св. Станіслава ў Вільні ўзведзены ў тэхніцы гатычнай муроўкі ў 1387—1388 гг. па фундацыі Ягайлы. Першапачаткова ён складаўся з асноўнага аб'ёму (у плане выцягнуты ў папярочным напрамку прамавугольнік), выцягнутай паўцыркульнай апсіды прэсбітэрыя і прамавугольнай у плане вежы-нартэкса пры ўваходзе. З паўночнага боку да апсіды прылягала адна прамавугольная сакрысція. Асноўны аб'ём падзяляўся 4 слупамі на тры нефы. Сцены ўсіх аб'ёмаў былі ўмацаваны масіўнымі контрфорсамі прамавугольнага сячэння, на вуглах пастаўленымі дыяганальна (па лініі канцэнтрацыі распору крыжовага скляпення).

Пасля пажару 1419 г. перабудаваны па загаду Вітаўта (у сувязі з яго мяркуемай каранацыяй), дабудоўваўся на працягу XV ст., разам з Ніжнім замкам перабудаваны ў 1530-я гг. у стылі рэнесансу італьянскімі архітэктарамі Б. Джаноці і Дж. Чыні. Карэнным чынам касцёл Св. Станіслава перабудаваны ў канцы XVIII ст. у стылі класіцызму архітэктарам Л. Стуока-Гуцэвічам. Шматлікія перабудовы і стылістычныя напластаванні не даюць больш дакладнай інфармацыі пра яго аўтэнтычны выгляд.

На схіле Замкавай гары ў Вільні за 200 м на паўночны захад ад касцёла Св. Станіслава на мяжы XIV—XV стст. у тэхніцы гатычнай муроўкі пастаўлены яшчэ адзін касцёл, які нагадваў па архітэктуры свайго папярэдніка. Гэта першы віленскі касцёл Св. Ганны, які належаў ордэну францысканцаў. Вядомы паводле археалагічных даследаванняў літоўскага даследчыка А. Таўтавічуса. Будынак касцёла складаўся з асноўнага аб'ёму і вялікай, амаль роўнай яму па шырыні, апсіды прэсбітэрыя (без вімы). Да галоўнага фасада была далучана, верагодна, чацверыковая вежа-нартэкс. Сцены былі ўмацаваны масіўнымі контрфорсамі, пастаўленымі ў канструцыйных вузлах таксама дыяганальна.

У 1551 г. на месцы невялікага гатычнага храма па загаду апошняга караля з дынастыі Ягелонаў Жыгімонта II Аўгуста пачалося будаўніцтва новага мураванага касцёла ў гонар Св. Ганны і Св. Барбары. Пасля смерці караля велічны храм у стылі рэнесансу, які ўзводзіў італьянскі архітэктар Дж. Чыні, не быў завершаны і ў 1661 г. разабраны.

Ужо да канца XIV ст. на беларускіх землях па фундацыі караля Уладзіслава Ягайлы і вялікага князя Вітаўта было заснавана 6 касцёлаў: у Крэве (1387), Абольцах (1387), Гайне (1387), Быстрыцы (1390), Навагрудку (1393), Ашмянах (1398). З іх мураваным быў, верагодна, толькі фарны касцёл у Навагрудку, пабудаваны да 1385 г. у гонар Усіх Свя-







Мал. 119. Бакавыя апсіды фарнага касцёла ў Навагрудку. XIV ст.

тых. Ад яго ацалелі толькі першапачатковыя гатычныя фрагменты: тры бессістэмна скампанаваныя капліцы розных памераў і формы з нервюрнымі скляпеннямі і каляровымі вітражамі. Памяшканні капліц маюць гранёныя алтарныя часткі, арыентаваныя ў розныя бакі свету і, магчыма, прысвечаныя розным святым, што адлюстроўвае яшчэ рэмінісцэнцыі паганства.

У 1413 г. была заключана Гарадзельская унія, адпаведна якой даваліся льготы каталіцкім установам, на дзяржаўныя пасады прызначалі пераважна феадалаў-католікаў. Па выбару Вітаўта і па ўласнай згодзе 47 беларуска-літоўскіх магнатаў разам з сем'ямі ўвайшлі ў польскія гербавыя брацтвы, абавязковай умовай чаго з'яўляліся прыналежнасць да каталіцкага веравызнання і будаўніцтва касцёлаў. Гэта спрыяла пашырэнню кола фундатараў каталіцкіх храмаў.

У выніку азначаных палітычных інспірацый з часу хрысціянізацыі Літвы і да 1500 г. толькі на тэрыторыі Беларусі было заснавана 90 каталіцкіх парафій, а да 1550 г. іх агульная колькасць узрасла да 152. Паводле пісьмовых гістарычных крыніц на 1569 г. (год заключэння Люблінскай уніі) на беларускіх землях зафіксавана 176 касцёлаў, аднак большасць з іх, відавочна, былі драўлянымі. Характэрна, што каталіцкія парафіі былі сканцэнтраваны галоўным чынам у зоне змешанага літоўска-рускага насельніцтва па лініі Пружаны — Клецк — Мінск — Друя — Вільня. Гэтую лінію можна лічыць за ўсходнюю мяжу распаўсюджання архітэктурных формаў еўрапейскай готыкі, але гэтая мяжа не рэзкая і мае даволі шырокі арэал дыфузнага ўзаемадзеяння з руска-візантыйскімі традыцыямі храмабудаўніцтва.


Толькі вельмі нязначная частка касцёлаў XV—XVI стст. была змурована з цэглы. У нешматлікіх мураваных храмах, якія мелі нязначна выяўленыя абарончыя рысы (этымалагічна касцёл — кастэль, маленькая крэпасць), акрамя богаслужэнняў, праводзіліся сеймы, цэхавыя сходы рамеснікаў, навуковыя дыспуты і тэатральныя прадстаўленні.

На працягу XV—XVI стст. мураваныя касцёлы ў стылі готыкі ўзведзены не толькі ў Вільні і Коўна, але і ў невялікіх перыферыйных маёнтках мясцовай магнатэрыі і шляхты каталіцкага веравызнання: Уселюбе, Ішкалдзі, Іўі, Гнезна, Геранёнах, Сапежышках, Клецку, Нясвіжы. Па сваёй архітэктоніцы гэта аднанефавыя ці трохнефавыя залавыя храмы з бязвежавым ці аднавежавым галоўным фасадам, з адной выцягнутай апсідай прэсбітэрыя і аднасна тонкімі сценамі, умацаванымі контрфорсамі, унутры перакрытыя нервюрнымі гатычнымі скляпеннямі, а звонку накрытыя высокімі кроквеннымі дахамі. У пачатку XVI ст. у архітэктуры мураваных касцёлаў, побач з гатычнымі формамі і канструкцыямі, пачынаюць з'яўляцца рысы рэнесансу.

Найбольш выразна архітэктурна-мастацкі ўплыў нямецкай готыкі назіраецца ў касцёле Узнясення Дзевы Марыі ў Коўна, званага фарай Вітаўта, першае дакументальнае ўпамінанне пра які звязана з прывілеем 1436 г. ганзейскім купцам адпраўляць там набажэнствы.


Касцёл змураваны па фундацыі вялікага князя літоўскага Вітаўта ў 1408—1411 гг., пазней быў перададзены каталіцкаму жабрацкаму ордэну францысканцаў. Святыня неаднаразова перабудоўвалася ў XVII—XVIII стст., у 1853 г. перададзена пад праваслаўную царкву, у 1919 г. вернута каталікам, у 1938 г. рэстаўравана.


Прамавугольны асноўны аб'ём касцёла падзелены 4 слупамі на тры нефы роўнай вышыні, першапачаткова перакрытыя нервюрнымі крыжовымі скляпеннямі (зараз цыліндрычнымі з распалубкамі). Дзве сіметрычныя, але недакладна разбітыя ў плане капліцы, роўныя па шырыні кроку апор, нагадваюць трансепт і надаюць плану выгляд лацінскага крыжа. Выцягнуты 5-гранны прэсбітэрый мае 2-часткавую віму, перакрытую нервюрнымі скляпеннямі. Звонку асноўны аб'ём накрыты высокім двухсхільным дахам з муравanымі франтонамі на тарцах, завершанымі вертыкальнымі слупкамі, якія імітуюць пінаклі, пашыраныя ў заходнееўрапейскай готыцы. Апсіда прэсбітэрыя мае больш нізкі двухсхільны дах. Нартэкс храма вырашаны ў выглядзе 5-граннага аб'ёму, накшталт барбакана, завершанага высокай шмат'яруснай вежай, уверсе васьмерыковай з вастраверхім шатром. Вуглы і сцены збудавання ўмацаваны магутнымі ступеньчатымі контрфосамі з вялікімі адхонамі для вадасцёку. Па баках галоўнага фасада пастаўленыя дыяганальна, ніжнія ярусы контрфорсаў раскрапаваныя стральчатымі разгрузачнымі арачнымі нішамі. Архітэктурнаму абліччу помніка ўласцівы гатычны вертыкалізм і ўзнёсласць. Будынак змураваны ў гатычнай тэхніцы з трохграннай падрэзкай швоў.



Мал. 120. Касцёл Узнясення Дзевы Марыі ў Коўна: план і агульны выгляд

Рысы адаптацыі формаў нямецкай готыкі выразна выяўлены ў архітэктуры парафіяльнага касцёла Св. Мікалая ў Вільні. Гэтая парафія заснавана ганзейскімі купцамі і рамеснікамі, запрошанымі вялікім князем Гедымінам у 1322 г. у сваю новую сталіцу. Першапачаткова драўляны касцёл у 1439 г. быў перада-





Мал. 121. Касцёл Св. Мікалая ў Вільні: план і галоўны фасад

дзены ордэну францысканцаў, якія, верагодна, самі змуравалі новы касцёл, асвечаны ў 1440 г. У пачатку XVI ст. Мікалаеўскі касцёл істотна перабудаваны і рэкансекраваны (паўторна асвечаны, 1514), пазней неаднаразова гарэў і перабудоўваўся, рэстаўраваўся ў 1955 і 1988—1989 гг. Кляштар францысканцаў скасаваны ў 1845 г.

Пра непрафесійнасць будаўнікоў Мікалаеўскага касцёла сведчыць тэхнічная недасканаласць збудавання: вуглы не прамыя, сцены перакошаны, недакладна разбіты грані алтарнай часткі, перавязка муроўкі нерэгулярная і г. д., што не перашкодзіла яму стаць каштоўным помнікам архітэктуры свайго часу. План асноўнага аб'ёму блізкі да квадрата (15,8 × 13 м). Інтэр'ер падзелены слупамі на тры нефы, якія нязначна розняцца па шырыні. Кожная з 9 травей перакрыта гатычным скляпеннем з адметным малюнкам нервюр. Нартэкс у храме адсутнічае. Галоўны бязвежавы фасад фланкаваны па баках дыяганальна пастаўленымі контрфорсамі. Роўная па вышыні з асноўным аб'ёмам 5-гранная апсіда прэсбітэрыя таксама ўмацавана контрфорсаміі і накрыта больш нізкім дахам. З поўначы да яе прылягала адна невялікая сакрысція, завершаная вежай.

Асноўны мастацкі акцэнт зроблены на высокім востравугольным шчыце франтона, завершанага вертыкальнымі слупкамі. Масіўнасць франтона змяншаюць выцягнутыя стральчатыя арачныя нішы, якія адначасова надаюць яму прасторавую ўстойлівасць і мастацкую выразнасць. Ярусны, але не гарызантальны, характар размяшчэння нішаў узмацняе вертыкальную дынаміку прысадзістага збудавання. Разгрузачныя арачныя нішы візуальна змяншаюць масіўнасць контрфорсаў. Каларыстычную гаму фасада ўзбагачае дэкор з цэглы жоўтага, чырвонага і карычневага колераў, створаны, верагодна, у канцы XV ст.

На тэрыторыі сучаснай Беларусі з вядомых на сённяшні дзень помнікаў мураванага каталіцкага хра-

мабудаўніцтва найбольш раннім узорам готыкі з'яўляецца ў сваёй аўтэнтычнай аснове касцёл Яна Хрысціцеля ў вёсцы Уселюб, размешчаны за 13 км на поўнач ад першай сталіцы ВКЛ Навагрудка (сучасны Навагрудскі р-н). Храм пабудаваны, верагодна, па фундацыі канюшага вялікага князя Вітаўта — Яна Неміры ў гонар свайго нябеснага патрона. Іншыя звесткі прыводзяцца ў інвентары касцёла за 1849 г. [98, ф. 4, спр. 2586], дзе пазначана, што ён заснаваны ў першай палове XV ст. князем Андрэем Уселюбскім (Неміровічам, сынам Яна). У 1576 г. па загаду Мікалая Радзівіла Чорнага касцёл прыстасаваны пад кальвінскі збор, а ў 1642 г. зноў вернуты каталікам па ініцыятыве біскупа віленскага Станіслава Давойны.

Знешні выгляд уселюбскага касцёла значна зменены шматлікімі перабудовамі ў XVI—XX стст., што тычыцца агульнай архітэктонікі, формы вокнаў, характара пакрыцця. Гэты помнік у 1980-я гг. грунтоўна даследаваны беларускімі рэстаўратарамі (Р. Баравы, А. Кушнярэвіч, В. Гліннік), выяўлены пісьмовыя гістарычныя крыніцы па розных этапах яго будаўніцтва, праведзены стратыграфічныя даследаванні, на падставе чаго выканана рэканструкцыя першапачатковага аблічча касцёла.

Паводле гіпатэтычнай рэканструкцыі, першапачаткова будынак храма складаўся з асноўнага прамавугольнага ў плане аб'ёму (12,8 × 9,8 м) і больш нізкай пяцігранной апсіды прэсбітэрыя даволі значных памераў (агульная даўжыня будынка 23,5 м). З паўночнага боку да прэсбітэрыя прылягала невялікая сакрысція з аднасхільным дахам, перакрытая нервюрнымі зорчатымі скляпеннямі. Асноўны аб'ём быў накрыты высокім двухсхільным гонтавым дахам, аддзеленым ад вальмавага даха над больш нізкай алтарнай апсідай мураваным франтонам. Высокі мураваны шчыт даха на галоўным фасадзе ўпрыгожвалі тры высокія стральчатыя арачныя нішы.




Мал. 122. Касцёл Св. Мікалая ў Вільні. Інтэр'ер

Падобны абрыс мелі і аконныя праёмы. Усяго налічвалася пяць вокнаў: два акна размяшчаліся на паўднёвым, адно — на паўночным і яшчэ два — на тарцовай і паўднёвай гранях апсіды. На галоўным заходнім фасадзе асіметрычна адносна цэнтральнай восі знаходзілася паўцыркульная арачная ніша.


Адносна тонкія сцены гатычнага збудавання ва ўсіх канструкцыйных вузлах умацоўвалі ступеньчатыя контрфорсы (на вуглах граняў і пасярэдзіне сценаў асноўнага аб'ёму), якія мелі вынас да 2 м і шырыню каля 1,5 м. У тоўшчы сцен паўднёва-заходняга вугла знаходзілася лесвіца, што вяла ў паддашак храма. У цэнтры кафалікона раскопкамі выяўлены падмурак апорнага слупа, які падтрымліваў яшчэ недасканалае крыжова-зорчатае скляпенне. Падобнае скляпенне перакрывала алтарную апсіду, якая злучалася з асноўным аб'ёмам вялікай стральчатай аркай, што ўспрымала на сабе нагрузку мураванага ўсходняга шчыта даха.

Археолагі і рэстаўратары лічаць, што першапачаткова ўселюбскі касцёл меў нескладаную 1-слуповую структуру, распаўсюджаную ў сярэдневяковым дойлідстве Цэнтральнай і Паўночнай Еўропы. У суадносінах прасторы і масы сцен, характары пакрыцця, гранёных формах алтарнай часткі ўселюбскага касцёла разам з рысамі «цаглянай готыкі» відавочны ўплыў традыцый мясцовага драўлянага дойлідства.

Ніжнія рады падмурка ўселюбскага касцёла, які заглыблены на 2 м адносна тагачаснага ўзроўня зямлі, выкладзены з вялікіх і сярэдніх валуноў насуха, а вышэй звязаны вапнава-пясчанай рошчынай і клінамі з цэглы. Сцены змураваны з



123. Уселюб. Касцёл Яна Хрысціцеля: план; галоўны і паўднёвы фасады, рэканструкцыя (паводле В. Глінніка)






Мал. 124. Уселюб. Касцёл Яна Хрысціцеля. Агульны выгляд з боку апсіды

гладкай цэглы ў тэхніцы лусковай муроўкі з гатычнай перавязкай. Поласці ўнутры сцен запоўнены дробным бутам і рошчынай. Месцамі бессістэмна выкарыстаны перапаленая цэгла і цагліны з сеткавым арнаментам на гранях, што адлюстроўвае пошукі новых дэкаратыўных сродкаў. У канцы XVI ст., калі святыняй валодалі кальвіністы, быў зменены характар перакрыцця ўнутранай прасторы, разабраны апорны слуп, гатычныя скляпенні заменены драўлянай столлю, счасаны нервюры скляпенняў у сакрысціі і стаўшыя непатрэбнымі без нагрузкі мураваных скляпенняў контрфорсы на бакавых фасадах і вуглах апсіды.

З рэшткаў цэглы XV ст. у тэхніцы рэнесанснай муроўкі выканана верхняя частка сцен прэсбітэрыя, што адбылося, верагодна, пры перабудове храма ў другой палове XVII ст. з мэтай выраўнавання вышыні алтарнай часткі і асноўнага аб'ёму для надання агульнай архітэктоніцы збудавання барочнай базілікальнасці. У гэты ж час былі павялічаны вокны, на паўночным фасадзе дзеля сіметрыі зроблена яшчэ адно акно, аконныя перамычкі заменены на барочныя з лучковым абрысам, зроблена новае пакрыццё даха з пляскатай дахоўкі.

У 1788 г. будынак храма пацярпеў ад пажару, быў перабудаваны ў 1790—1800 гг. У гэты час, паводле вопісаў, ён меў мураваныя хоры і цагляную падлогу, у ім знаходзіліся два каштоўныя старадаўнія абразы. Яшчэ раз помнік перабудаваны ў 1841—1849 гг. Каля 1897 г. да галоў-



Мал. 125. Ішкалдзь. Троіцкі касцёл. План

нага фасада касцёла прыбудавана магутная 3-ярусная вежа з гранёнымі вежачкамі па баках, завершаная востраверхім шатром, што надало збудаванню рысы несапраўднай готыкі, а таксама дабудавана несіметрычная паўднёвая сакрысція. На фотаздымках 1930-х гг. бачна: асноўны аб'ём храма і роўнавысокая з ім апсіда прэсбітэрыя накрыты агульным высокім дахам «з заломам», характэрным для рамантычных архітэктурных плыняў таго часу — вынік дзейнасці рэстаўратараў Заходняй Беларусі віленскай школы. У 1988—1991 гг. касцёл адноўлены і рэкансекраваны пад тытулам святога Казіміра.

Наступным крокам у развіцці мясцовага мураванага касцёльнага храмабудаўніцтва з'яўляецца Троіцкі касцёл у Ішкалдзі (Баранавіцкі р-н), пабудаваны да 1471 г. (дата асвячэння) па фундацыі «дзедзіча Уселюба» Мікалая Неміровіча, спадчынніка Яна Няміры. Троіцкі касцёл амаль цалкам захаваў сваю аўтэнтычную структуру, нягледзячы на складаную рэлігійную гісторыю, амаль такую ж, як у папярэдніка. У другой палове XVI ст. па загаду М. Радзівіла Чорнага Троіцкі касцёл быў прыстасаваны пад кальвінскі збор, у 1641 г. вернуты католікам, падчас руска-польскай вайны сярэдзіны XVII ст. моцна пашкоджаны. У 1866 г. касцёл зачынены, з 1868 па 1919 г. прыстасаваны пад праваслаўную царкву і адпаведна рэканструяваны, у 1918 г. зноў вернуты католікам, у 1969 г. закрыты, у 1980-я гг. рэстаўраваны і дзейнічае па прызначэнні. Дзякуючы архітэктанічнай і мастацкай сапраўднасці гэты помнік прыцягваў і будзе прыцягваць шматлікіх даследчыкаў.

Параўнальна з уселюбскім касцёлам, ад якога яго аддзяляе каля трэці стагоддзя, архітэктанічная кампазіцыя ішкалдскага касцёла ўяўляе значна больш дасканалую інтэрпрэтацыю цэнтральнаеўрапейскіх гатычных формаў. Архітэктоніка абодвух помнікаў мае шмат агульнага, але ёсць і істотныя адрозненні, што сведчаць пра пэўную стылявую эвалюцыю.

Ішкалдскі касцёл складаецца з прамавугольнага ў плане асноўнага аб'ёму і выцягнутай пяцігранай ап-

сіды прэсбітэрыя з прамавугольнай двухпавярховай сакрысціяй з паўночнага боку. Агульныя параметры будынка 26,4 × 13,5 м. У месцы далучэння сакрысціі да асноўнага аб'ёму размешчаны вежападобны аб'ём у чвэрць круга з вітымі ўсходамі ў патайную скарбніцу над сакрысціяй і ў паддашак, што канструкцыйна ўмацоўвае вугал будынка.

Асноўны аб'ём накрыты высокім клінападобным дахам, па вышыні роўным яго сценам. Дах апсіды аддзелены ад асноўнага мураваным франтонам. Апсіда прэсбітэрыя роўная па вышыні асноўнаму аб'ёму, але крыху больш вузкая, таму пры захаванні агульнага нахілу вільчык даха на ёй больш нізкі. Масіўны мураваны шчыт даха на галоўным фасадзе падтрымліваюць контрфорсы. Яго магутныя схілы маюць ступеньчата-пластычны абрыс, які працягвае тэму дыяганальна пастаўленых вуглавых контрфорсаў. Важкасць шчыта змяншаюць і надаюць прасторавую ўстойлівасць плоскія паўцыркульныя арачныя нішы, якія выконваюць адначасова разгрузачную і дэкаратыўную функцыі. Лаканічная строгая кампазіцыя вянчаючых мас збудавання надае яму надзвычайную маналітнасць і цэласнасць.

Унутры прастора кафалікона падзелена чатырма крыжападобнымі слупамі з узаемна перпендыкулярнай сістэмай падпружных арак на тры нефы, бакавыя з якіх удвая больш вузкія за цэнтральны. Крок апор аднолькавы, раўнамерны. Гэта прынцып канструкцыйна-прасторавага члянення раманскіх базілік, але тут кожная прасторавая ячэйка мае не квадратны, а прамавугольны план. Усе травеі перакрыты крыжовымі з нервюрамі скляпеннямі, аднолькавай вышыні, што надае інтэр'еру залавы характар. Роўная з імі па вышыні квадратная ў плане віма прэсбітэрыя злучана з кафаліконам стральчатай аркай і перакрыта зорчатым нервюрным скляпеннем. Па шырыні алтарная апсіда больш шырокая за цэнтральны неф.

Сцены храма ў канструкцыйных вузлах умацаваны контрфорсамі, якія дакладна адпавядаюць сістэме падпружных арак. Контрфорсы на вуглах асноўнага аб'ёму і апсіды пастаўлены дыяганальна і маюць ступеньчата-пластычны абрыс, што адпавядае характару размеркавання на іх нагрузкі. Контрфорсы на бакавых фасадах былі, відавочна, счасаны ў больш позні час. Лагічнае і прафесійнае канструкцыйнае вырашэнне дазволіла зрабіць сцены ішкалдскага касцёла па-гатычнаму тонкімі, а інтэр'ер — адкрытым і светлым.

Больш дасканалым, у параўнанні з папярэднікам, з'яўляецца і дэкаратыўнае афармленне: далейшае развіццё атрымаў матыў плоскіх арачных нішаў, якім нададзена ярусная кампазіцыя і білатэральная (двухбаковая) сіметрыя. Вось сіметрыі акцэнтуе стральчаты ўваходны праём, над якім у тры ярусы размешчаны паўцыркульныя арачныя нішы і круглая ніша на самым версе фасада. Бакавыя нішы размешчаны сіметрычна, але не на адным узроўні з цэнтральнымі, а крыху ніжэй, што падкрэслівае дынаміку агульнай кампазіцыі галоўнага фасада. Нішы ўпрыгожваюць таксама паверхні сту-





Мал. 126. Ішкалдзь. Троіцкі касцёл: агульны выгляд з боку галоўнага фасада, агульны выгляд з боку алтарнай апсіды

пеньчатых контрфорсаў. Першапачаткова іх выбеленыя плоскасці ствараліе кантрастнае колеравае спалучэнне з адкрытай муроўкай сценаў — характэрны дэкаратыўны прыём беларускай готыкі.

Будынак касцёла ўзведзены з гладкай цэглы на вапнава-пясчанай рошчыне ў тэхніцы балтыйскай муроўкі. У ніжняй частцы ў муроўку сцен уведзена перапаленая цэгла, якая, у адрозненне ад уселюбскага касцёла, ужо арганізавана ў арнаментальны сеткавы ўзор як элемент дэкаратыўнага афармлення. Каларыстычнае вырашэнне храма ўзбагачалася пакрыццём даха зялёнай паліванай дахоўкай.

Да другой паловы XIX ст. сцены не былі атынкаваны, але ўнутры, як вынікае з інвентара 1782 г., скляпенні і апорныя слупы былі распісаны фрэскамі з выявамі святых, геаметрычнымі і раслінными арнаментамі, якія на той час ужо знаходзіліся ў дрэнным стане. Дата стварэння фрэскавых роспісаў не вядомая. Як лічаць, яны створаны ў першай палове XVI ст., не пазней 1537 г. Магчыма, на іх стварэнне паўплываў багаты фрэскавы роспіс Дабравешчанскага сабора Супрасльскага манастыра, што паспрыяла пераносу ў гатычны каталіцкі храм візантыйска-рускіх дэкаратыўных прыёмаў.

Яшчэ адну прыкмету візантызму можна бачыць у паўцыркульнай форме арачных нішаў і аконных праёмаў, а таксама дадатковага ўвахода ў сярэдзіне паўднёвага фасада. Даволі вялікія вокны размешчаны толькі на паўднёвым фасадзе асноўнага аб'ёму і апсіды, а на паўночным баку яны адсутнічаюць. Гэты прыём дазваляў добра асвятліць інтэр'ер касцёла і адначасова абараніць яго ад неспрыяльных кліматычных умоў, залішняй аэрацыі і страт цяпла. Магчыма, што змяншэнне колькасці праёмаў мела таксама абарончыя мэты.


Паводле інвентару 1675 г. вядома, «што цвінтар касцёльны даўна быў мурам абмураваны і валам абсыпаны», знішчаны ў пачатку XVII ст. кальвіністамі. Пад прэсбітэрыем знаходзілася крыпта, з якой быў выхад


на цвінтар (пазней засыпана зямлёй). У тым жа інвентары паведамляецца, што ў касцёле дзве сакрысціі, чаго ў рэальнасці не было. Магчыма, такім чынам вызначаны два паверхі аднаго аб'ёму сакрысціі, ніжняе памяшканне якога перакрыта мураваным цыліндрычным скляпеннем, а верхняе (скарбніца) — драўлянай бэлечнай столлю.

Троіцкі касцёл у Ішкалдзі не мае вертыкальнай кампазіцыі, ажурных канструкцый, багатага скульптурнага аздаблення, уласцівых для гатычнай Заходняй Еўропы. Зрокава ён масіўны і важкаваты. Але яго своеасаблівая скульптурная пластыка, дзе зусім няма прамых ліній, зграбныя прапорцыі сцен і контрфорсаў, імклівая дынаміка шчыта даха не пакідаюць сумневу ў яго гатычным характары, вельмі самабытна і творча трактаваным. Відавочна, што менавіта ў гэтым помніку найбольш яскрава выяўлены асноўныя архітэктурна-мастацкія асаблівасці беларускай касцёльнай готыкі.

Вялікае падабенства з ішкалдскім касцёлам у сваім аўтэнтычным выглядзе меў Петрапаўлаўскі касцёл у мястэчку Іўе (цяпер цэнтр раёна Гродзенскай вобласці). У гісторыі беларускай архітэктуры яго будаўніцтва доўгі час адносілася да 1630-х гг., калі ваявода мсціслаўскі Мікалай Кішка заснаваў тут кляштар бернардзінцаў. На падставе гістарычных, стратыграфічных, архітэктурна-археалагічных даследаванняў А. Кушнярэвіч зрабіў больш дакладную навуковую атрыбуцыю гэтага помніка.

Мураваны касцёл ў гонар Св. Пятра і Паўла ў Іўі пабудаваны па фундацыі ваяводы трокскага, маршалка ВКЛ Пятра Яновіча з роду Мандзігіраў і яго сына Яна ў 1491—1495 гг. Паводле фундуша, пры ім у той час ужо існаваў невялікі драўляны кляштар францысканцаў. Як і іншыя помнікі каталіцкага храмабудаўніцтва, Петрапаўлаўскі касцёл у другой палове XVI ст. перайшоў да пратэстантаў, затым у першай






Мал. 127. Іўе. Касцёл Св. Пятра і Паўла: сучасны план і агульны выгляд з боку алтарнай апсіды

палове XVII ст. вернуты католікам, перададзены кляштару бернардзінцаў, якія прыбудавалі да паўночнай сцяны прэсбітэрыя мураваны жылы корпус. У далейшым кляштарны комплекс быў пашыраны, набыў П-падобную канфігурацыю і ўтварыў разам з касцёлам замкнуты ўнутраны двор. У 1878 г. касцёл быў рэкансекраваны біскупам віленскім Т. Зянковічам, чаму папярэднічала істотная перабудова святыні: зроблена новая сістэма апор і скляпенняў, пры ўваходзе ўбудаваны вузкі нартэкс з хорамі, на галоўным фасадзе надбудаваны ажурныя шмат'ярусныя вежы ў стылі віленскага барока.

Сучасны стан касцёла, такім чынам, уяўляе складаны рознастылявы кангламерат. У першапачатковым выглядзе будынак касцёла складаўся з роўных па вышыні асноўнага прамавугольнага ў плане аб'ёму (21,6 × 19,3 м) і выцягнутай пяціграннай аспіды прэсбітэрыя. Характэрна, што прамавугольнік плана асноўнага аб'ёму большы ў папярочным напрамку, як у касцёле Св. Станіслава ў Вільні. Параўнальна з ішкалдскім касцёлам, дзе віма прэсбітэрыя мае квадратны план, у іўеўскім касцёле яна складаецца з двух прамавугольнікаў, што павялічвае даўжыню апсіды. Але тут апсіда больш вузкая, у выніку чаго больш выразнай становіцца розніца ў вышыні вільчыкаў дахаў асноўнага аб'ёму і апсіды, якія маюць аднолькавы нахіл. Гэта стварае больш дынамічную ступеньчатую кампазіцыю вянчаючых мас, якая нарастае ў бок галоўнага фасада, дзе тарэц даха раней, верагодна, завяршаўся шчыпцом.

Гэтую дынаміку своеасабліва падкрэсліваюць масіўныя ступеньчатыя контрфорсы (шырыня 1,2 м) з вялікім вынасам (да 1,7 м), пастаўленыя на вуглах граняў апсіды. Падобныя контрфорсы ўмацоўвалі таксама даволі тонкія сцены ўсяго збудавання. На вуглах з боку галоўнага фасада яны былі пастаўлены дыяганальна, а каля прэсбітэрыя — перпендыкулярна бакавым фасадам, што адрознівае гэты помнік ад ішкалдскага касцёла. Ступеньчатая структура контрфорсаў у беларускай готыцы, магчыма, замяняла ўзаемазвязаную сістэму контрфорсаў і аркбутанаў, якая характэрна для заходнееўрапейскай готыкі і не сустракаецца ў аўтэнтычных гатычных сакральных помніках Беларусі.

Наяўнасць контрфорсаў, характар іх размяшчэння, па-гатычнаму тонкія сцены і адначасова значная шырыня будынка сведчаць, што першапачаткова Петрапаўлаўскі касцёл быў не аднанефавы, а трохнефавы, з аднолькавай вышынёю травей, перакрытых нервюрнымі скляпеннямі, таксама як ішкалдскі касцёл. Гатычная сістэма апор і скляпенняў была, верагодна, разабрана ў той час, калі храмам валодалі пратэстанты, якія пад уплывам мастацтва рэнесансу імкнуліся пазбавіцца ад архаічных элементаў готыкі. Але паколькі ўнутраную прастору храма даволі вялікага пралёта цяжка было перакрыць адным цыліндрычным рэнесансным скляпеннем, яе перакрылі больш лёгкай драўлянай бэлечнай столлю. Паколькі далейшы рэлігійны лёс гатычных мураваных касцёлаў, пабудаваных на мяжы XV—XVI стст.,



Мал. 128. Касцёл Св. Юр'я ў Кейданах. План (паводле А. Янкевічэне)

меў шмат агульнага, гэты выпадак далёка не адзіны.

Будынак Петрапаўлаўскага касцёла пастаўлены на падмурку з валуноў вялікіх і сярэдніх памераў магутнасцю каля 2 м. Сцены ўзведзены з гладкай цэглы ў тэхніцы балтыйскай муроўкі на вапнавапясчанай рошчыне з загладжанымі швамі, трапляецца таксама перапаленая цэгла-жалязняк, але не ў якасці дэкаратыўнага арнаменту. Будынак кляштара мае ўжо рэнесансную тэхніку муроўкі.


Вельмі падобную да ішкалдскага касцёла архітэктоніку маюць некалькі каталіцкіх храмаў, размешчаных на тэрыторыі сучаснай Літвы: касцёл Св. Юр'я ў Кейданах (уладанні Радзівілаў), касцёл Узнясення Дзевы Марыі ў Мяркіне, касцёл Найчысцейшай Дзевы Марыі ў Троках. Апошні з іх найбольш ранні (пачатак XV ст.), пабудаваны па фундацыі вялікага князя Вітаўта і мае выразныя рысы будаўнічага прымітыву: моцна перакошаны план асноўнага аб'ёму і апсіды прэсбітэрыя. Касцёл у Мяркіне пабудаваны па фундацыі 1434 г. караля Уладзіслава Ягайлы, а касцёл у Кейданах, верагодна, — на мяжы XV—XVI стст.

Усе гэтыя помнікі маюць трохнефавую залавую структуру асноўнага аб'ёму, пяцігранную апсіду прэсбітэрыя, умацаваныя ступеньчатымі контрфорсамі і спарадычна вежамі з вітымі ўсходамі ў розных вуглах, а таксама звычайна адну сакрысцію з паўночнага боку апсіды.


Вышыня травей залавай структуры аднолькавая да аснавання скляпенняў. Узровень шалыгі скляпенняў у бакавых нефах, пры іх меншым пралёце за асноўны неф, мог быць некалькі больш нізкім, што залежала ад стралы пад'ёма распалубак. Найбольш позні з азначаных святынь — касцёл Св. Юр'я ў Кейданах, уладанні князёў Радзівілаў біржайскай лініі, меў дадаткова магутную чацверыковую вежу-нартэкс на галоўным фасадзе. Усе гэтыя касцёлы маюць агульную тэхніку муроўкі і архітэктурна-дэкаратыўныя характарыстыкі: стральчатыя абрысы праёмаў і плоскіх арачных нішаў, ромбападобны арнамент з перапаленай (клінкернай) цэглы. Даволі значная колькасць гатычных кас-

цёлаў разгледжанага тыпу на тэрыторыі гістарычнай Літвы сведчыць, што гэты архітэктанічны варыянт з'яўляўся найбольш прыдатным для мясцовага каталіцкага храмабудаўніцтва таго часу.

У XV — пачатку XVI ст. у буйнейшых гарадах Вялікага княства Літоўскага, хрышчоных па каталіцкаму абраду, — Вільні і Коўна, было ўзведзена некалькі гатычных храмаў больш значных памераў і некалькі адметнага архітэктанічнага тыпу: 8-слуповых трохнефавых бязвежавых «протабазілік» з амаль роўнай вышынёю ўсіх нефаў, накрытых звонку агульным высокім двухсхільным дахам, з моцна выцягнутай апсідай прэсбітэрыя (касцёлы Св. Яна, Узнясення Дзевы Марыіі, Св. Францыска



Мал. 129. Касцёл Св. Юр'я ў Коўна: план (паводле А. Янкевічэне) і агульны выгляд



і Бернарда ў Вільні, Св. Юр'я і Св. Пятра і Паўла ў Коўне). Па большасці гэта былі святыні жабрацкіх каталіцкіх ордэнаў францысканцаў і бернардзінцаў, якія першымі прыйшлі ў ВКЛ, чым тлумачацца тыпалагічная адметнасць і вялікія памеры азначаных касцёлаў.


Характэрна, што ў ВКЛ і Кароне Польскай бернардзінцы былі адгалінаваннем ордэна францысканцаў. Абодва гэтыя адгалінаванні францысканскага ордэна мігрыравалі з Паўночнай Італіі, што вызначыла архітэктурныя асаблівасці іх касцёлаў, у першую чаргу — адсутнасць нартэксаў і бязвежавыя фасады, характэрныя для гатычнай архітэктуры Італіі. Акрамя таго, кляштарныя каталіцкія храмы звычайна сумяшчалі функцыі ордэнскага статута з парафіяльнымі, што вымагала іх большую ўмяшчальнасць. Прыналежнасць святыні манаскаму ордэну выразна выяўляецца ў павелічэнні прэсбітэрыяў, дзе ў час набажэнства знаходзіўся клір. Так, напрыклад, францысканскі касцёл Узнясення Дзевы Марыі ў Вільні, пабудаваны да 1435 г., мае надзвычай выцягнуты прэсбітэрый з трохчасткавай вімай, перакрытай трыма крыжовымі скляпеннямі. Не саступае яму ў памерах і прэсбітэрый бернардзінскага касцёла ў Коўна, пабудаваны да 1492 г. (дата асвячэння).

Вышыня прэсбітэрыя ў гатычных касцёлах была звычайна меншай за вышыню асноўнага аб'ёму ці роўнай яму, але вышыні вільчыкаў дахаў абавязкова мелі значны перапад, што надавала дынаміку вонкавай аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі.

Усе касцёлы азначанай тыпалагічнай групы Вільні і Коўна на працягу XVI—XX стст. неаднаразова перабудаваліся, набылі рысы пазнейшых архітэктурна-мастацкіх стыляў. Іх аўтэнтычны выгляд рэканструяваны часам паводле архітэктурна-археалагічных даследаванняў. З іх вынікае, што ў больш ранніх пабудовах контрфорсы па баках галоўных бязвежавых фасадаў ставіліся дыяганальна, што адпавядала напрамку рэбраў крыжовых скляпенняў і размеркаванню іх распору.

На мяжы XV—XVI ст. атрымалі пашырэнне контрфорсы, пастаўленыя ўзаемна перпендыкулярна на вуглах асноўнага аб'ёму, што, на нашу думку, папярэднічала фарміраванню вуглавых фланкуючых вежаў, напрыклад, у бернардзінскім касцёле Св. Францыска і Бернарда ў Вільні. Ён змураваны ў 1475—1480 гг., але ў 1500 г. яго сцены і скляпенні абваліліся. У 1506—1511 гг. бернардзінскі касцёл адбудаваны нанава нямецкім архітэктарам Міхаэлем Энкінгерам і набыў пры гэтым тры вуглавыя вежы. Чацвёрты вугал збудавання канструкцыйна падтрымліваў далучаны з паўночнага ўсходу корпус кляштара. Стылявыя прыкметы рэнесансу вежы і франтоны набылі, верагодна, пры перабудове ў 1525—1530 гг. У касцёле Св. Пятра і Паўла ў Коўна вуглавыя фасадныя контрфорсы знішчаны пры перабудове на мяжы XVII—XVIII стст. і заменены на чацверыковыя вежы «сармацкага» тыпу.

У 1495—1499 гг. у Вільні, побач з бернардзінскім касцёлам, чэшскім архітэктарам Бенедыктам Раўдам з Прагі і арцеллю нюрнбергскіх майст-



Мал. 130. Ансамбль касцёлаў Св. Ганны і бернардзінскага Св. Францыска і Бернарда ў Вільні. План


роў пабудаваны вядомы шэдэўр віленскай гатычнай архітэктуры — касцёл Св. Ганны, які існуе і зараз. З 1502 г. ён належаў кангрэгацыі Св. Ганны і Св. Марціна, якая аб'ядноўвала каталікаў нямецкага паходжання, з 1581 г. падпарадкаваны кляштару бернардзінцаў. Рафінаванасцю і вытанчанасцю сваіх вострых ажурных архітэктурных формаў ён выпадае з агульнага рэчышча развіцця гатычнага дойлідства ВКЛ. У яго муроўцы выкарыстана больш за 30 тыпаў фасоннай цэглы. Касцёл аднанефавы (19,0 × 8,7 м) з пяцігранай апсідай прэсбітэрыя і вузкім нартэксам. Неф, у плане роўны прыблізна двум квадратам, перакрыты двума зорчатымі нервюрнымі скляпеннямі.

Асаблівай арыгінальнасцю вызначаецца кампазіцыя галоўнага фасада. Вось сіметрыі падкрэслена парталам з трох стральчатых арак, аб'яднаных вялікай паўцыркульнай аркай з кілепадобным абрамленнем, вяршыня якога працягнута вышэй гранёным эркерам і вежачкай, завершанай востраверхім шатром з фіяламі і крабамі, характэрнымі для цэнтральнаеўрапейскай готыкі. Падобныя завяршэнні маюць роўныя з ім па вышыні гранёныя вежы па баках фасада-нартэкса. Паміж гэтымі трыма вертыкальнымі дамінантамі размешчаны больш нізкія вежачкі-

пінаклі, ствараючы надзвычай багаты сілуэт і вертыкальную дынаміку галоўнага фасада. Архітэктура віленскага касцёла Св. Ганны нібыта акцэнтуе сваю архітэктанічную і мастацкую адметнасць ад іманентнага развіцця мясцовага гатычнага дойлідства, але незвычайная для заходнееўрапейскай готыкі форма паўцыркульнай аркі ў кілепадобным абрамленні мае аналагі ў беларускім праваслаўным храмабудаўніцтве больш ранняга перыяду.

Архітэктанічна гатычныя касцёлы гістарычнай Літвы ўяўляюць сабой самабытнае ўсходнеславянскае адгалінаванне цэнтральнаеўрапейскай «цаглянай» готыкі. З прычыны адметных сацыяльна-гістарычных абставін, пачаткам станаўлення на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага каталіцкай канфесіі тут адбывалася ўзаемадзеянне тагачасных заходнееўрапейскіх гатычных формаў і канструкцый з традыцыямі візантыйска-рускага праваслаўнага храмабудаўніцтва.

У складаных грамадска-палітычных умовах супрацьстаяння дзвюх асноўных хрысціянскіх канфесій каталіцкі храм мусіў мець пэўныя абарончыя рысы, што адбілася ў этымалогіі самой яго назвы: касцёл — кастэль (маленькая крэпасць). Характэрна, што большасць мураваных гатычных касцёлаў на беларускіх землях месцілася ў невялікіх мястэчках, пры неабходнасці станавіліся пунктамі абароны іх насельніцтва. Адным з распаўсюджаных мясцовых фартыфікацыйных прыёмаў з'яўляецца адсутнасць аконных праёмаў на паўночных фасадах храмаў.



Мал. 131. Касцёл Св. Ганны ў Вільні. Галоўны фасад


Характар будаўнічага матэрыялу (вялікапамерная цэгла) абумовіў архітэктанічна-канструкцыйныя адрозненні мураваных гатычных касцёлаў ВКЛ ад узораў заходнееўрапейскай каменнай готыкі. У першую чаргу, гэта своеасаблівая трансфармацыя ўзаемазвязанай гатычнай сістэмы ажурных аркбутанаў і контрфорсаў, якая дазваляла рабіць гатычныя саборы Заходняй Еўропы неверагодна лёгкімі і высокімі, у масіўныя ступеньчатыя контрфорсы, што ўмацоўвалі сцены і вуглы збудавання ў месцах перадачы на іх нагрузкі скляпенняў. У выніку гэтага гатычныя касцёлы Беларусі маюць невялікія памеры і адносна тонкія сцены.

Асноўнай агульнай прыкметай беларускай сакральнай готыкі і заходнееўрапейскай з'яўляецца наяўнасць у сістэме перакрыцця збудаванняў нервюрных скляпенняў (крыжовых і зорчатых). Як і ў іншых краінах «цаглянай» готыкі, нервюры выконваліся з фасоннай цэглы, а не каменю. Іх меншая трываласць абмяжоўвала велічыню пралётаў скляпенняў, прыводзіла да ўскладнення сеткі нервюр, што ў выніку спрыяла фарміраванню і выкарыстанню зорчатых, а пазней і сотавых альбо крышталёвых гатычных скляпенняў, калі нервюрны каркас запоўнены трохграннымі пірамідкамі, падобнымі на крышталь (апошнія маюць уласную ўнутраную прасторавую жорсткасць).

3.5. Беларуская царкоўная готыка

Сацыяльна-ідэалагічная і мастацкая экспансія каталіцкага гатычнага храмабудаўніцтва на землях гістарычнай Літвы і Беларусі спрыяла ўзаемадзеянню архітэктурных формаў у мясцовым сакральным дойлідстве абедзвюх хрысціянскіх канфесій, што вяло да выпрацоўкі самабытных будаўнічых прыёмаў і архітэктанічных варыянтаў беларускай царкоўнай готыкі. На мяжы XV—XVI стст. назіраецца непасрэдны ўплыў ранняй касцёльнай готыкі ў праваслаўным храмабудаўніцтве. Асабліва выразна і непасрэдна ён адбіўся на архітэктурна-мастацкім абліччы Барысаглебскай царквы ў Навагрудку і Святадухаўскай царквы ў Кодне (сучасная Польшча). З невялікімі варыяцыямі яны маюць аналагічную з ішкалдскім касцёлам аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю і гатычныя канструкцыі скляпенняў, распор якіх успрымаецца контрфорсамі. Для іх уласціва нехарактэрная для праваслаўных храмаў папярэдняга часу аднаапсіднасць.

Барысаглебская царква ў Навагрудку змуравана ў 1517—1519 гг. па фундацыях гетмана ВКЛ Канстанціна Астрожскага і кіеўскага мітрапаліта Іосіфа Солтана на падмурках папярэдняга праваслаўнага храма XII ст., у выніку чаго агульная глыбіня падмуркаў дасягнула 2,8 м. У ніжняй частцы сцен выкарыстаны будаўнічы матэрыял старажытнай царквы: плінфа і вапняковыя пліты; вышэй сцены выкладзены з вялікапамернай цэглы-пальчаткі на вапнякова-пясчанай рошчыне. У 1620 г. Барысаглебская царква адышла да уніятаў, у 1624 г. пры ёй уніяцкім мітрапалітам Іосіфам Руцкім былі заснаваны мужчынскі і жаночы базыльянскія манастыры. У 1624—1632 гг. навагрудская Барысаглебская царква перабудавана па фундацыі Аляксандра Храптовіча. Гатычны фасад, структура якога дакладна невядомая (у паддашшы ацалеў фрагмент мураванага франтона), заменены магутным фасадам з дзвюма масіўнымі чацверыковымі вежамі з байніцамі і вітымі ўсходамі ўнутры. У 1839 г. царква вернута праваслаўным і ў 1870-я гг. перабудавана ў псеўдарускім стылі, паводле праекта 1866 г., рэканструявана ў 1923—1924 гг. Доўгі час выкарыс-



Мал. 132. Барыса-глебская царква ў Навагрудку. План




Мал. 133. Барыса-глебская царква ў Навагрудку. Агульны выгляд

тоўвалася як архіўнае сховішча. Помнік дайшоў да нашага часу са шматлікімі стылявымі напластаваннямі, у выніку чаго ў вызначэнні яго першапачатковых памераў ёсць разыходжанні.

Аўтэнтычная архітэктура Барысаглебскай царквы пачатку XVI ст. мела яскрава гатычны характар. Яна складалася з асноўнага трапецыяпадобнага ў плане аб'ёму (крыху звужаны з заходняга боку) і больш нізкай за яго пяціграннай алтарнай апсіды, якія былі накрыты высокімі двухсхільнымі дахамі, што стварала нарастаючую падоўжную дынаміку кампазіцыі. Унутры асноўны аб'ём (23,5 × 16 м, пралёт каля 14 м) падзелены чатырма слупамі і сістэмай падпружных арак на дзевяць роўнавысокіх травей, перакрытых зорчатымі нервюрнымі скляпеннямі. Але арганізацыя прасторы тут зусім іншая, чым у ішкалдскім касцёле.

Шырыня нефаў у Барысаглебскай царкве аднолькавая, а крок слупоў і кампаноўка скляпенняў вы-



Мал. 134. Царква Св. Духа ў Кодне. План

лучаюць у сістэме перакрыццяў папарна роўнаканцовы крыж, які ўяўляе сабою нейкае спалучэнне роўнаканцовага грэчаскага крыжа з «базілікальнай» падоўжанасцю інтэр'ера. У цэнтры кафалікона выразна вылучаны квадрат сяродкрыжжа. Гэта стала прычынай таго, што пры перабудове храма ў другой палове XIX ст. зорчатае нервюрнае скляпенне цэнтральнай травеі разабралі і на яго месцы паставілі псеўдарускі купал, а пры пазнейшай рэканструкцыі зноў узвялі крыжовае скляпенне.

Унутры кафалікон і шырокая алтарная апсіда прасторава злучаны паміж сабою трыма стральчатымі аркамі амаль аднолькавай вышыні, што, верагодна, імітавала кананічную праваслаўную трохапсіднасць. Рызніца і ахвярнік у храме адсутнічаюць. Апорныя слупы крыжападобныя ў сячэнні з невялікімі выступамі, на якія абапіраюцца стральчатыя падпружныя аркі. З прычыны недакладнасці разбіўкі вонкавых сцен царквы падпружныя аркі ў плане не паралельныя, што патрабавала пэўнай карэкціроўкі пры ўзвядзенні скляпенняў. Нервюры скляпенняў не аддзяляюцца ад апорных слупоў гарызантальнымі цягамі, а працягваюцца вертыкальнымі гуртамі, што надае інтэр'еру Барысаглебскай царквы гатычную ўзнёсласць. Унутры тонкія сцены збудавання амаль на ўсю вышыню ўмацаваны стральчатымі разгрузачнымі арачнымі нішамі.

Звонку сцены асноўнага аб'ёму і вуглы апсіды ўмацаваны контрфорсамі, але не ступеньчатымі, прамавугольнымі ў сячэнні, як у гатычных касцёлах, а больш вытанчанымі, шматграннымі, аднолькавага сячэння па ўсёй вертыкалі, якія завершаны шматсхільнымі дашкамі. Акрамя шматгранных контрфорсаў, на бакавых фасадах прысутнічаюць плоскія лапаткі, магчыма, счасаныя пазней контрфорсы. На паўднёвым фасадзе зроблены дадатковы ўваход у выглядзе паўцыркульнай аркі. Своеасаблівы дэкаратыўны матыў стварае аркатура з вертыкальных цяг, выкананых з лякальнай цэглы, завершаных стральчатымі арачкамі. Верхнюю частку фасадаў будынка апярэзваюць ажурныя карункі з трох ярусаў стральчатых арачак. Струмень вертыкаляў аркатуры, граняў контрфорсаў, вялікіх стральчатых вокнаў стварае непаўторнае аблічча гэтага выдатнага помніка беларускай готыкі.

Святадухаўская царква ў Кодне, уладанні роду Сапегаў на Падляшшы (сучасная Польша), змуравана ў 1513—1520 гг. па фундацыі ваяводы віцебскага і падляшскага Івана Сапегі і яго сына ваяводы навагрудскага Паўла Сапегі. У пачатку XVII ст. яна перайшла да уніятаў, у 1817 г. зачынена. Напаўразбураны стан царквы ў другой палове XIX ст. зафікса-

ваны малюнкам В. Гразнова. У XX ст. царква адрэстаўравана і дзейнічае як касцёл.

Характэрна, што па сваёй архітэктоніцы Святадухаўская царква ў Кодне больш нагадвае ранні ішкалдскі Троіцкі касцёл, а не праваслаўную Дабравешчанскую царкву Супрасльскага манастыра, больш блізкую да яе па канфесійнай прыналежнасці, рэгіёне і даце пабудовы.

Яна складаецца з прамавугольнага (блізкага да квадрата) асноўнага аб'ёму, накрытага высокім двухсхільным дахам з мураванымі франтонамі на тарцах, і адной выцягнутай алтарнай апсіды з вялікай вімай і паўцыркульнай усходняй сцяной, накрытай асобным больш нізкім дахам (агульныя памеры 28,4 × 17 м). Да паўночнай сцяны апсіды прылягае прамавугольная ў плане рызніца. Параўнальна з ішкалдскім касцёлам, пэўныя адрозненні назіраюцца ў паўкруглай, замест гранёнай, форме алтарнай сцяны (гэта ўжо рэнесансны элемент) і размяшчэнні круглай вежы з вітымі ўсходамі не на паўночна-ўсходнім, а паўночна-заходнім вугле кафалікона. Паўночны фасад, як і ў гатычных касцёлах, не меў аконных праёмаў.

У архітэктанічнай структуры кодзенскай Святадухаўскай царквы відавочна малапрафесійнае эмпірычнае засваенне гатычных канструкцый. Разбіўка плана праведзена тэхнічна не дасканала, яго прамавугольны абрыс моцна перакошаны, восі вонкавых сценаў і апорных слупоў не паралельныя адна адной. Цікавай адметнасцю гэтай святыні з'яўляецца канфігурацыя сячэння апорных слупоў у выглядзе роўнаканцовага крыжа з вялікім вынасам рамёнаў. Ступеньчатыя контрфорсы пастаўлены часам не перпедыкулярна да сценаў і ў месцах, якія не адпавядаюць апорам падпружных арак. У выніку знікае канструкцыйная ўзаемазвязанасць вонкавых нясучых сцен і сістэмы перакрыццяў. Усё гэта адбілася на неаднароднасці, хаатычнасці і шчыльнасці малюнка нервюр скляпенняў. На галоўным заходнім фасадзе контрфорсы працягнуты вышэй цягі карніза і ўмацоўваюць важкі шчыт мураванага франтона.


Пры выразным прымітывізме, можна сказаць, будаўнічым прафесійным варварстве, архітэктурнае вырашэнне Святадухаўскай царквы спалучае стылявыя характарыстыкі мясцовай готыкі і рэнесансу з элементамі візантызму. Паверсе сцен будынак апярэзвае прафіляваны рэнесансны карніз. Шчыт франтона падзелены гарызантальнымі цягамі на тры ярусы, якія запоўнены шэрагамі падвесных (з гіркамі) плоскіх арачных ніш. Плоскасці ніш былі выбеленыя і стваралі колеравы кантраст з адкрытай муроўкай з добра абпаленай чырвонай цэглы. Паміж ярусамі ніш знаходзіліся паліхромныя маёлікавыя медальёны-ўстаўкі з выявамі святых у «візантыйскім» стылі. Абрыс франтона ўзбагачаюць высокія мураваныя слупкі, накрытыя двухсхільнымі дашкамі, якія імітавалі вытанчаныя фіялы заходнееўрапейскай готыкі. Над уваходам у паўцыркульным арачным партале месціўся герб Сапегаў, а вышэй партала круглае акно-ружа. У дэкаратыўным вырашэнні Святадухаўскай царквы ў аснаванні сцен выкарыстаны таксама арнаментальны

пояс рамбічнага сеткавага арнаменту з перапаленай цэглы цёмна-ліловага адцення, што дадаткова ўзбагачала агульную каларыстычную гаму і адпавядала традыцыям мясцовай готыкі.

Можна сцвярджаць, што спалучэнне гатычных формаў і канструкцый з семантыкай праваслаўнага храма ўжо само па сабе надае своеадметнасць беларускай готыцы. З яшчэ большай выразнасцю гэтыя рысы выявіліся ў славутых праваслаўных цэрквах-крэпасцях канца XV — пачатку XVI ст., у архітэктурнае вырашэнне якіх кампазіцыйна, канструкцыйна і функцыянальна ўключаны фартыфікацыйныя элементы, што стварыла прынцыпова новае ідэйна-мастацкае цэлае. Чатырохвежавыя абарончыя праваслаўныя цэрквы ВКЛ уяўляюць унікальны феномен у кантэксце стылявога развіцця еўрапейскай архітэктуры. Таму іх генезіс, працэс станаўлення і стылявыя характарыстыкі прыцягваюць асабліва пільную ўвагу даследчыкаў — археолагаў і гісторыкаў архітэктуры Беларусі, Літвы і Польшчы. На сённяшні дзень існуе некалькі канцэпцый паходжання чатырохвежавых гатычных цэркваў-крэпасцей.

Класік беларускага мастацтвазнаўства М. Шчакаціхін адзначаў уплыў на фарміраванне беларускай царкоўнай готыкі «папярэдніх нямецка-гатычных форм», у першую чаргу, праз архітэктурныя помнікі Вільні. Ён прапануе лічыць «адным з першых помнікаў цытадэльна-царкоўнага будаўніцтва на Беларусі» трохвежавы бернардзінскі касцёл у сталіцы дзяржавы Вільні, змураваны ў цэгле паводле адных звестак — у 1512—1516 гг., паводле другіх (і больш верагодных) — у 1525 г. Ён адзначае, што «абарончы характар... паасобных частак бернардзінскага касцёла выяўлены не зусім яшчэ выразна», магчыма таму, што гэты храм, «які знаходзіўся ў цэнтральнай частцы вялікага места (Вільні), яшчэ не меў патрэбы ў асабліва грунтоўным умацаванні і не складаў цалкам адасобленае цытадэльнае адзінкі: хутчэй ён проста ўваходзіў у лінію ўмацаванняў Дольнага замка». Гэтымі прычынамі, а таксама пазнейшымі перабудовамі даследчык тлумачыць спецыфічную асіметрычную аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю касцёла з трыма вуглавымі вежамі, з якіх паўднёва-ўсходняя вызначаецца шэрагам архітэктурных асаблівасцей, уласцівых стылістыцы протарэнесансу.

У віленскім бернадзінскім касцёле, як адзначае М. Шчакаціхін, «цалкам адкінуты звычайныя архітэктурныя эфекты нямецкае царкоўнае готыкі з заменай іх на своеадметны, крыху болей суровы і важкі, але надзвычай паважны манументалізм». У гэтым помніку даследчык бачыць «нейкую наогул не ўласцівую готыцы тэндэнцыю да ўзмоцненага падкрэслівання канструкцыйных ліній... як у гарызантальным, так і вертыкальным напрамку», а таксама «выключнае ўжыванне паўцыркульных арак, што адбівае ў сабе характэрную для беларускай готыкі новую стылістычную плынь». Не зважаючы на даволі познюю дату будаўніцтва, ён лічыць, што ўсё гэта назіраецца ў віленскім бернардзінскім касцёле ўпершыню, таму гэты пом-




Мал. 135. Выява Сафійскага сабора ў Полацку з малюнкаў XVI—XVIII стст. (паводле М. Ткачова)

нік з'явіўся, на яго думку, «пачаткам цікавага працэсу самастойнага развіцця беларускае царкоўнае готыкі». Згодна з гэтым меркаваннем, М. Шчакаціхін разглядае пазнейшыя, на яго погляд, помнікі беларускай готыкі — чатырохвежавыя цэрквы-крэпасці ў Сынковічах, Маламажэйкаве і Супраслі — менавіта ў такой паслядоўнасці, якая адлюстроўвае гіпатэтычны эвалюцыйны працэс, заснаваны на паступовым ускладненні архітэктурных формаў, аб'ёмна-прасторавых кампазіцый, фартыфікацыйных элементаў і дэкору.

Вядомы гісторык і археолаг М. Ткачоў, не задаволены стройнай, але храналагічна непадмацаванай канцэпцыяй генезісу і эвалюцыі беларускай царкоўнай готыкі М. Шчакаціхіна, слушна адзначыў, што «Вільня хаця і была ў той час сталіцай Вялікага княства Літоўскага, але знаходзілася ў самай глыбіні дзяржавы і знешняя небяспека паражала ёй куды менш, чым тым гарадам, якія стаялі на паўднёвых і ўсходніх рубяжах. Гэта дае падставы лічыць радаводную віленскага бернардзінскага касцёла не дастаткова аргументаванай для таго, каб прызнаць гэты помнік родапачынальнікам, а Вільню — месцам узнікнення новага напрамку ў беларускім дойлідстве. Адначасова факты прымушаюць шукаць на Беларусі той цэнтр сярэдневяковай культуры, дзе б існавалі здаўна будаўнічыя традыцыі, меліся высокакваліфікаваныя кадры дойлідаў і трывалая эканамічная база, а рэальная пагроза знешняй небяспекі рашуча паставіла б на парадак дня пытанне інкастэляцыі храмаў». М. Ткачоў пачаў мэтанакіравана шукаць і знайшоў гэтае месца.

На падставе шэрага гістарычных крыніц і графічных матэрыялаў М. Ткачоў вызначыў, што ў 1494—1501 гг. старажытны сабор Св. Сафіі ў Полацку быў перабудаваны ў абарончы, што і робіць яго «першым цытадэльным храмам з чатырма нарожнымі вежамі» [126, С. 125]. Як сведчаць пісьмовыя крыніцы, Са-



Мал. 136. Полацк, 1579 г. Фрагмент малюнка С. Пахалавіцкага

фійскі сабор з'яўляўся апошнім пунктам абароны горада, у час небяспекі там жыў сам ваявода са сваёй сям'ёй і блізкімі. У ім захоўваліся святыні і скарб горада, земскія кнігі полацкага ваяводства, адбываліся ўрачыстыя сходы гараджан.

Будынак сабора на працягу XVI — пачатку XVIII ст. (да поўнага знішчэння) неаднаразова гарэў і перабудоўваўся. Выгляд яго на той час вядомы па малюнку С. Пахалавіцкага «Аблога Полацка войскам Стэфана Баторыя 11—30 жніўня 1579 г.» і плану Полацка 1707 г. з аб'ёмнымі выявамі асноўных манументальных збудаванняў горада, хаця гэтыя выявы даволі ўмоўныя і схематычныя. На малюнку 1579 г. сабор прадстаўлены велічным пяцігаловым збудаваннем з чатырма трох'яруснымі вежамі на вуглах і светлавым барабанам, завершаным высокім шатром у цэнтры. Асабісты сакратар караля Стэфана Баторыя Р. Гейдэнштэйн так апісвае Сафію таго часу: «Храм у замку агромністы, на прыгожай мясцовасці і выдатна пабудаваны з каменю».

У канцы XVI ст. Сафійскі сабор перайшоў да уніятаў, у 1607 г. пацярпеў ад пажару і адбудаваны да 1618 г. Паводле запісак архімандрыта гродзенскага кляштара базыльянаў Ігната Кульчынскага вядома, што уніяцкі архібіскуп полацкі і віцебскі Язафат Кунцэвіч «у чатырох нарожных вежах вярхі непатрэбныя і царкве ніякай красы не прыдаваўшыя скінуў, а сярэднюю вежу, прыгожа аздобіўшы, зрабіў яшчэ больш высокай». Адсюль вынікае, што вежы гэтыя існавалі, што пацвярджае сапраўднасць малюнка С. Пахалавіцкага.

Аднак шматлікімі групамі археолагаў, якія даследавалі гэты помнік, не было выяўлена ніякіх рэштак нарожных абарончых вежаў. Гэта адбылося, верагодна, таму, што тут абарончыя вежы не былі ўзведзены ад падмуркаў, як меркаваў М. Ткачоў і інш., а надбудаваны над квадратнымі ў плане вуглавымі кампартыментамі старажытнага Сафійскага сабора. Менавіта тут і такім чынам адбыўся пераломны момант у фарміраванні новага тыпу чатырохвежавых праваслаўных цэркваў-крэпасцей, шляхам налажэння рэгулярнай схемы замкавага будаўніцтва на візантыйска-рускі тып крыжова-купальнага храма.

Гісторык архітэктуры А. Кушнярэвіч, на падставе працаў літоўскіх даследчыкаў, прапануе іншую версію паходжання чатырохвежавых абарончых цэркваў ВКЛ. Ён лічыць высновы М. Ткачова недастаткова абгрунтаванымі і зноў вяртаецца ў Вільню, дзе прапануе лічыць узорам для наступных чатырохвежавых праваслаўных храмаў кафедральны касцёл Св. Станіслава, які быў перабудаваны вялікім князем Вітаўтам у пачатку XV ст. У якасці аргумента прыводзіцца выява касцёла на гравюры Вільні пачатку XVI ст., апублікаваная ў свой час гісторыкам Т. Нарбутам. Пры гэтым канстатуецца, што па архітэктуры віленскі кафедральны касцёл з'яўляецца паўторам гатычнага сабора ў Фрамборку XIV ст.


Аднак гісторыя пабудовы і перабудоў касцёла Св. Станіслава, які радыкальна рэканструяваўся ў розных стылях не менш пяці разоў, яшчэ больш цьмяная, чым Сафійскага сабора. Да таго ж, вежы на азначаным малюнку станіславаўскага касцёла пачатку XVI ст. не фланкіруюць яго асноўны аб'ём і ў сячэнні значна меншыя за які-небудзь магчымы канструкцыйны вузел кампазіцыі. Яны, па сутнасці, не з'яўляюцца вежамі, гэта значыць самастойным цэнтрычным збудаваннем з перавагай вертыкальных прапорцый, а толькі служаць дэкаратыўнымі элементамі вянчаючых мас збудавання гатычнымі вежачкамі-пінаклямі. Не выключана, што гэтыя вежачкі-пінаклі былі надбудаваны арцеллю майстроў, што будавалі ў той час гатычны касцёл Св. Ганны.

Такім чынам, вежы касцёла Св. Станіслава ў Вільні генетычна зусім не адпавядаюць баявым вежам абарончых праваслаўных цэркваў. Стромкія круглыя вежы з вітымі ўсходамі ўнутры, якія фланкуюць вуглы беларускіх праваслаўных храмаў-крэпасцей, паводле функцыі і кампазіцыі, больш блізкія вежам раманскага сабора ў Трыры сярэдзіны XI ст.

У гісторыі беларускага мастацтва і архітэктуры добра вядома тры-



Мал. 137. Сабор у Трыры. Германія, XI ст.



Мал. 138. Дабравешчанскі сабор Супрасльскага манастыра. План


яда праваслаўных чатырохвежавых абарончых цэркваў ВКЛ у Сынковічах, Мураванцы (Маламажэйкаве) і Супраслі. Гэтыя самабытныя помнікі нацыянальнага дойлідства грунтоўна даследаваны ў працах П. Пакрышкіна, М. Сакалоўскага, Я. Ядкоўскага, А. Шышка-Богуша, М. Шчакаціхіна, М. Ткачова і інш. Да нашага часу яны звычайна разглядаліся ў гэтай устойлівай паслядоўнасці, адпаведна нарастанню іх кампазіцыйнай і тэхнічнай складанасці і дасканаласці.


Але, як гэта ні парадаксальна, у такой сацыяльна абумоўленай з'яве, якой з'яўляецца сакральнае дойлідства, бег часу не заўсёды працуе на яго тэхнічную і эстэтычную дасканаласць. На нашых землях эпоха готыкі з'явілася менавіта часам занядбання і страты прафесійных навыкаў храмавага будаўніцтва, якое прыйшло да нас праз Візантыю ад крыніц ранняга хрысціянства. І ў той жа час тут адбывалася інтэнсіўнае і творчае ўспрыняцце формаў і канструкцый готыкі праз цагляную архітэктуру цэнтральнаеўрапейскіх краін. У гэтым двухвектарным працэсе і пачалі фарміравацца нацыянальныя адметнасці беларускай готыкі, не толькі эстэтычныя, але і семантычныя.

Намі прапануецца ўласная канцэпцыя паслядоўнага фарміравання архітэктанічных кампазіцый чатырохвежавых храмаў беларускай готыкі. На наш погляд, гіпотэза С. Александровіча і М. Ткачова пра першаснасць у гэтым працэсе перабудовы ў чатырохвежавы храм старажытнага Сафійскага сабора ў Полацку не выклікае пярэчанняў.

Удакланенне храналогіі будаўніцтва і логіка мастацтвазнаўчага аналізу, заснаванага на паслядоўнай архітэктанічнай эвалюцыі, сведчаць, што наступным пасля полацкай Сафіі збудаваннем, дзе далей была развіта ідэя цэрквы-крэспасці, стаў Дабравешчанскі сабор праваслаўнага манастыра ў Супраслі, пабудаваны ў 1505—1510 гг. непадалёку ад Беластока, на заходніх межах беларускіх земляў. Яго фундатар, праваслаўны магнат А. Хадкевіч, зазначыў у сваёй грамаце: «Абы тот манастыр... на нашай отчизне твердо на веки стоял нашим вспоможением» [127. С. 46]. У 1511 г. мураваны манастырскі сабор асвяціў архіепіскап смаленскі Іосіф Солтан, які садзейнічаў будаўніцтву храма, прыстасаванага як для рэлігійных абрадаў, так і для абароны мясцовага праваслаўнага насельніцтва ў час небяспекі. Гэтая праграма прысутнічае ў функцыі і семантыцы Дабравешчанскага сабора з чатырма баявымі вежамі, якія фланкіравалі вуглы збудавання.

Архітэктоніка супрасльскага Дабравешчанскага сабора выразна захоўвала элементы дойлідства старажытнарускага перыяду. Па сутнасці,









Мал. 139. Дабравешчанскі сабор Супрасльскага манастыра: уверсе — агульны выгляд з гравюры XIX ст. і падоўжны разрэз (паводле П. Пакрышкіна), унізе — агульны выгляд з гравюры XIX ст. і заходні фасад (фота пачатку XX ст.)

ён уяўляў сабой гатычную мадыфікацыю руска-візатыйскага крыжова-купальнага храма. У ім адным, сярод трыяды праваслаўных цэркваў-крэпасцей Беларусі, захаваліся двухвосевая сіметрыя вянчаючых мас са светлавым купалам на сяродкрыжжы і трохапсіднасць, уласцівыя кананічнаму праваслаўнаму крыжова-купальнаму храму.

Прамавугольны, выцягнуты па падоўжнай восі кафалікон (малітоўная зала) падзелены чатырма слупамі на тры нефы, з якіх бакавыя былі значна вузейшыя за цэнтральны. Структура інтэр'ера, такім чынам, мела ярка выяўленую «базілікальнасць». У той жа час апорныя слупы (два васьмігранныя і два квадратныя ў сячэнні) кампазіцыйна ўтваралі сяродкрыжжа і падтрымлівалі самкнёны купал са светлавымі вокнамі-люнетамі. Надзвычай высокі гранёны барабан купала наскрозь прарэзваў масіўную кроквенную канструкцыю гатычнага даха і паддашак, дзе месціліся памяшканні для абаронцаў храма. Астатнія прасторавыя ячэйкі інтэр'ера былі перакрыты разнастайнымі гатычнымі скляпеннямі: крыжовымі на нервюрах, зорчатымі, сеткавымі.

Тры нефы лагічна завяршалі тры апсіды гранёнай формы. Звонку вялікая цэнтральная апсіда па вышыні была роўная з асноўным аб'ёмам, унутры яна падзялялася скляпеннямі на два паверхі: над алтаром месцілася патайная скарбніца. Накрываў цэнтральную апсіду вальмавы дах, больш нізкі за асноўны. Бакавыя апсіды, зусім нязначныя па памерах і вышыні, кампазіцыйна падпарадкоўваліся цэнтральнай, у іх размяшчаліся кананічныя для праваслаўнага храма рызніца і дыяканнік. Да заходняга фасада прылягаў невялікі прытвор пад двухсхільным дашкам з паўцыркульным уваходным праёмам, умацаваны контрфорсамі. Унутры над нартэксам знаходзіліся хоры, якія абапіраліся на заходнюю пару слупоў.

Своеасаблівы сімбіёз архітэктурных формаў усходняга і заходняга паходжання адлюстраваны ў арганізацыі вонкавых мас будынка. Ён быў накрыты ўзаемна перпендыкулярнымі двухсхільнымі дахамі, што ўтваралі ў плане ўжо не кананічны роўнаканцовы грэчаскі крыж, а папарна роўнаканцовы. Тарцы дахаў з чатырох бакоў свету закрывалі мураваныя шчыты-франтоны са своеасаблівым дэкорам: рытмічна размешчаныя плоскія паўкруглыя двухступеньчатыя арачныя нішы былі аб'яднаны магутным паўкружжам, у чым яскрава бачная тэма руска-візантыйскага пазакамарнага пакрыцця.

Першапачаткова купал звонку меў цыбулепадобнае пакрыццё, як і вуглавыя вежы, што зафіксавана на абразе 1644 г. з выявай царквы. Візуальна гэта стварала традыцыйнае праваслаўнае пяцігалоўе па дыяганалях плана і падкрэслівала ўсходні генезіс храма. Барочныя фігурныя завяршэнні вежаў і купала на сяродкрыжжы зроблены пазней, калі манастыр стаў належаць базыльянам. У 1635—1655 гг. тут змураваны двухпавярховы палац уніяцкага архібіскупа ў стылі ранняга барока.

У адрозненне ад полацкага Сафійскага сабора таго часу, у супрасльскай царкве круглыя абарончыя вежы з байніцамі і вітымі ўсходамі


ўнутры ўжо не былі надбудаваны над вуглавымі часткамі, а ад самага аснавання фланкіравалі па рагах прамавугольны аб'ём кафалікона. Пры гэтым яны маюць надзвычай выцягнутыя гатычныя прапорцыі і толькі адно гарызантальнае чляненне — аркатурны пояс на ўзроўні цокаля будынка.

Не закранаючы вежаў, паддашак царквы па ўсяму перыметру апярэзваў пояс скошаных уніз вокнаў-машыкуляў, уключаючы і алтарную частку, чаго не знойдзеш у іншых беларускіх цэрквах-крэпасцях, магчыма, таму, што над ёй была зроблена патайная скарбніца. Усё гэта сведчыць пра высокі ўзровень прыстасаванасці збудавання да абарончых функцый і ўскосна пра тое, што супрасльскі Дабравешчанскі сабор найбольш ранні з беларускіх цытадэльных храмаў. У далейшым сумяшчэнне ў алтарнай частцы сакральных і прагматычных функцый (захаванне маёмасці), відавочна, было прызнана недапушчальным.


Нягледзячы на выразны абарончы характар храма, яго архітэктурна-мастацкае аблічча мела святочны, жыццесцвярджальны выгляд, які ствараўся каляровым кантрастам адкрытай чырвонай муроўкі і белых атынкаваных элементаў дэкору, праёмамі разнастайных формаў, вытанчанымі прапорцыямі вежаў. Цокаль будынка быў аздоблены рытмічным сеткавым арнаментам з перапаленай цэглы. Хоры з боку галоўнага фасада асвятлялі крулыя вокны-люнеты. У дэкоры ўсіх фасадаў шырока выкарыстаны аркатурныя паясы, якія адначасова мелі сімвалічна-сакральную функцыю. Абарончы па прызначэнню пояс машыкуляў вырашаны ў выглядзе рытмічнай аркатуры, абапертай на ступеньчатыя кансолі, і з'яўляўся адным з асноўных кампазіцыйна-дэкаратыўных элементаў у мастацкім абліччы збудавання.

Каля 1557 г. інтэр'ер супрасльскай Дабравешчанскай царквы быў аздоблены выдатным фрэскавым роспісам. Па характару іканаграфіі і тэхніцы выканання роспіс адпавядае прыёмам позневізантыйскага мастацтва. Лічаць, што фрэскі выкананы сербам-манахам Нектарыем, пра якога дакладна вядома, што ён распісваў цёплую царкву манастыра. Пасля захопу Канстанцінопаля туркамі ў 1453 г. Візантыйская імперыя перастала існаваць, таму не выпадкова, што праваслаўныя майстры мусілі шукаць прытулку ў паўночных краінах.

Надпісы на фрэсках былі выкананы на стараславянскай мове кірыліцай. У сістэме размяшчэння фрэсак назіраліся пэўныя адхіленні ад канонаў. У царкве меліся дзве кампазіцыі «Дабравешчання»: адна у ніжнім рэгістры на алтарнай сцяне, другая на паўднёвай сцяне. Апорныя слупы, злёгку стральчатыя падпружныя аркі, барабан купала займалі выявы святіцелей, прарокаў і айцоў царквы, у скуф'і купала знаходзілася кампазіцыя «Хрыстос Уседзяржыцель». Важную ролю ў фрэскавым роспісе адыгрываў арнамент, пераважна раслінны, са стылізаванымі кветкамі мясцовай флоры. Вытанчанае каларыстычнае вырашэнне роспісаў надавала інтэр'еру храма надзвычай мажорны настрой.



У 1771 г., калі супрасльская Дабравешчанская царква належала уніятам, адбылася карэнная змена ў афармленні яе інтэр'ера. Фрэскі былі закрыты багатай ляпной аздобай у стылі позняга барока, але засталіся цэлымі. Пасля скасавання уніі старажытны храм вернуты праваслаўным. У 1852—1859 гг. фрэскі пацярпелі ад вады, якая працякала праз скляпенні, і былі забелены. У 1891 г. пабелку ліквідавалі сухім спосабам і пашкодзілі пры гэтым фрагменты фрэсак. У 1911 г. архітэктуру і роспісы сабора даследаваў П. Пакрышкін. 28 ліпеня 1944 г. гітлераўцы пры адступленні ўзарвалі



Мал. 140. Троіцкая царква ў Вільні: план і паўднёвы фасад (паводле А. Самукене)

Дабравешчанскую царкву. Кавалкі сцен і фрэсак у 1945—1946 гг. зафіксавалі польскія рэстаўратары пад кіраўніцтвам У. Пашкоўскага і адрэстаўравалі ў 1964—1966 гг. Ацалелыя 30 фрагментаў захоўваюцца ў Беластоцкім краязнаўчым музеі. На сённяшні дзень святыня адноўлена.


Наступнымі па часе пасля супрасльскага Дабравешчанскага сабора былі тры праваслаўныя царквы Вільні: Мікалаеўская, Троіцкая і Прачысценская, якія амаль адначасова, у 1514—1516 гг., былі заснаваны гетманам ВКЛ К. Астрожскім, а пазней істотна перабудаваны. Першапачаткова, як сведчыць структура падмуркаў і фрагменты сценаў з гатычнай муроўкай, яны ўяўлялі сабой 3-апсідныя, 4-слуповыя, у пла-

не блізкія да квадрата збудаванні з планавай схемай крыжова-купальнага храма і фартыфікацыйнымі элементамі. Аднак і пасля шматлікіх перабудоў і напластаванняў гэтыя святыні захавалі часткі нервюрных і сотавых скляпенняў і фланкіруючых вежаў [80. С. 55–56, 86–92]. Узведзены ўжо пасля іх віленскі касцёл бернардзінцаў з яго трыма вуглавымі вежамі, такім чынам, з'явіўся толькі водгукам у каталіцкім будаўніцтве на архітэктуру тагачасных праваслаўных храмаў горада.




Мал. 141. Царква Міхаіла Архангела ў Сынковічах: галоўны фасад і агульны выгляд





На сённяшні дзень сваю аўтэнтычнасць у найбольшай ступені захаваў адзіны помнік беларускай праваслаўнай готыкі — царква-крэпасць у в. Сынковічы (Зэльвенскі р-н), асвечаная ў гонар Архангела Міхаіла. Касметычныя рамонты, якія праводзіліся ў 1841 і 1880—1881 гг., не змянілі істотна яе аблічча. Унікальнасць і гістарычная



Мал. 142. Царква Міхаіла Архангела ў Сынковічах: план і фрагмент інтэр'ера


сапраўднасць архітэктанічнага вырашэння храма зрабілі яго помнікам архітэктуры сусветнага значэння. Архаічнасць архітэктурных формаў сынковіцкай царквы і адсутнасць дакладнай даты пабудовы вымагалі шматлікіх даследчыкаў лічыць яе найбольш ранняй. М. Шчакаціхін сцвярджае, што неабходна адкінуць «усе тыя фантастычныя дапушчэнні, якія часам адносілі яго пабудову ледзь не да 10—11 сталецьця». На падставе стылістычных адзнак ён лічыць, што «агульная гатыцкая канструкцыя Сынкавіцкае царквы ўжо сама па сабе паказвае на пэўную эпоху: але прысутнасць у гэтым будынку характэрных позне-гатыцкіх скляпеньняў, асабліва так званага «крышталёвага» зорчатага скляпеньня ў дзяканіку, яшчэ болей звужае тыя хранолёгічныя межы, у якіх паўстаньне такога будынку можна лічыць магчымым: для Беларусі гэта канец XV або пачатак XVI сталецьця» [141. С. 243].

Адышоўшы ад пашыранай, аднак недакладнай даціроўкі будаўніцтва храма 1407 г., прапануемай краязнаўцамі, большасць гісторыкаў архітэктуры спынілися на даволі абмежаваным адрэзку часу — пачатку XVI ст. Паводле шэрага архітэктурна-мастацкіх характарыстык,


сынковіцкая Міхайлаўская царква была ўзведзена амаль адначасова (але, верагодна, пазней) з віленскай Троіцкай царквой і тымі ж майстрамі. Магчыма, яна мела за фундатара таго ж К. Астрожскага [80. С. 69]. Асноўным аргументам на карысць гэтага з'яўляецца аналагічнае вырашэнне алтарных частак гэтых храмаў і наяўнасць аркатурнага пояса вакол усходніх вежаў і алтарных апсід на ўзроўні цокаля збудаванняў.

Архітэктанічна сынковіцкая Міхайлаўская царква ўяўляе чатырохвежавы трохапсідны храм залавага тыпу. Асноўны аб'ём (у плане крыху перакошаны прамавугольнік, блізкі да квадрата) накрыты двухсхільным кроквенным дахам, па вышыні большым за сцены будынка, з магутнымі мураванымі франтонамі на тарцах. Унутраная прастора кафалікона падзелена чатырма апорнымі слупамі (унізе квадратнымі, вышэй 8-граннымі) на тры нефы ці дзевяць амаль роўных па памерах травей, перакрытых крыжовымі скляпеннямі. Апорныя слупы і лапаткі, якія адпаведна ім раскрапоўваюць сцены, злучаны падпружнымі аркамі. Пяты скляпенняў размешчаны на адной вышыні, а шалыгі скляпенняў цэнтральнага нефа крыху больш высокія, адпаведна велічыні яго пралёта. У структуры інтэр'ера адначасова і прысутнічае, і знікае ідэя грэчаскага крыжа ў аснове кампазіцыі. Характэрна, што вельмі блізкі па задуме сімбіёз рамана-візантыйскіх прыёмаў выкарыстаў у канцы XV ст. італьянскі дойлід А. Фіяраванці пры будаўніцтве Успенскага сабора Маскоўскага Крамля.

З усходу да асноўнага аб'ёму далучаны тры больш нізкія роўныя паміж сабою па вышыні паўкруглыя алтарныя апсіды. Па шырыні апсіды адпавядаюць нефам і злучаны з імі паўцыркульнымі арачнымі праёмамі. Паўднёвая апсіда (дзяканнік) перакрыта сотавым скляпеннем. Звонку трохлопасцевы абрыс апсід



Мал. 143. Царква Міхаіла Архангела ў Сынковічах: папярочны разрэз (паводле У. Чантурыя) і паўднёвы фасад





Мал. 144. Царква Міхаіла Архангела ў Сынковічах. Выгляд алтарнай часткі

з дапамогай ступеньчатых арачных тромпаў уверсе аб'яднаны плаўнай крывой, што дазволіла накрыць алтарную частку агульным хвалістым конусападобным дахам. Такім чынам, на ўзроўні падлогі, згодна праваслаўнай традыцыі, царква была трохапсіднай, а ў верхнім сячэнні аднаапсіднай.

У адзначанай структуры збудавання надзвычай арганічна і самабытна знітаваліся элементы візантыйска-рускай планавай схемы крыжова-купальнага храма і раманская структура травей, перакрытых крыжовымі скляпеннямі. Самабытнасць і унікальнасць помніка яшчэ больш узмоцнены ўвядзеннем фартыфікацыйных элементаў мясцовага абарончага дойлідства. Пры гэтым мэтазгоднасць гатычных канструкцый, абарончых прыставанняў і архітэктонікі храма непарыўна звязана з іх мастацкай выразнасцю. Чатыры баявыя вежы, якія фланкіруюць вуглы храма, вырашаны неаднолькава. Заходнія вежы па баках галоўнага фасада маюць у сячэнні васьмігранную форму. Скошаныя грані ніжняга яруса вежаў дадаткова ўмацаваны вертыкальнымі контрфорсамі. Акрамя сваёй асноўнай функцыі, гэтыя контрфорсы ствараюць выразную градацыю святла і ценю. Паўночна-ўсходняя і паўднёва-ўсходняя вежы круглыя ў плане і шчыльна датыкаюцца да сцен будынка. Унутраная прастора вежаў з вітымі ўсходамі злучана з кафаліконам вузкімі праходамі, зробленымі ў даволі тоўстых сценах.

Усе вежы аднолькавай вышыні і накрыты традыцыйнымі для беларускага абарончага дойлідства невысокімі шатрамі-каўпакамі. Вышыня вежаў складае прыблізна дзве чвэрці вышыні даха асноўнага аб'ёму, чым ствараецца дынамічная і гарманічная будова вянчаючых мас. Архітэктурна-мастацкую цэласнасць збудавання падкрэслівае магутны пояс машыкуляў, які апярэзвае асноўны аб'ём па ўсяму перыметру і падзяляе вежы на два амаль роўныя па вышыні ярусы. Скошаныя ўніз арачныя вокны-машыкулі, прызначаныя для ліцця вару ці смалы, падзелены ступеньчатымі кансольнымі прасценкамі, над якімі размешчаны байніцы.

Алтарная частка сынковіцкай царквы пазбаўлена абарончых прыстасаванняў; яе сімвалічна абараняе аркатурны пояс, які ахоплівае

апсіды і ўсходнія вежы. Падобны пояс прысутнічаў і ў супрасльскай Дабравешчанскай царкве, але там ён апярэзваў увесь будынак разам з поясам машыкуляў. У больш позніх пабудовах акцэнт перанесены з дэкаратыўнасці аркатурнага пояса на яго сакральна-сімвалічную сутнасць. Алтар кожнага хрысціянскага храма, як яго галоўная святыня, у розныя моманты богаслужэння сімвалізуе рай нябесны з дрэвам жыцця, дом Цара Нябеснага, Гроб Гасподзень і іншыя семантычныя структуры. Аркатурныя паясы вакол алтарных апсід узніклі яшчэ ў візантыйскім дойлідстве. «Столбцы» і арачкі сімвалізавалі ідэальныя дрэвы райскага саду, дзе жывуць святыя-ахоўнікі. Выкарыстанне іх у сакральным будаўніцтве мела функцыю духоўнага абярэга.

Асноўны мастацкі акцэнт зроблены на велічным шчыце галоўнага фасада сынковіцкай царквы. На ім у шэсць ярусаў размешчаны адзінацаць тыпаў плоскіх нішаў розных памераў і канфігурацый: круглых і арачных (паўцыркульных, лучковых, падвесных падвойных і патройных, з рознымі пралётамі). Рытмічны лад нішаў падпарадкаваны цэнтральна-восевай сіметрыі. Гэта надае дэкаратыўнаму вырашэнню шчыта строгі і ў той жа час маляўнічы і вытанчаны характар. Вось сіметрыі фасада падкрэслена стральчатым арачным акном і гранёным эркерам з дазорным акенцам, размешчаным на самым версе франтона, што ўзбагачае светла-ценявыя мадуляцыі вялікай паверхні.

Мастацкую выразнасць франтона яшчэ больш падкрэсліваў кантраст пабеленых плоскасцяў нішаў і чырвонай адкрытай муроўкі сценаў, нагадваючы чырвона-белыя арнаменты нацыянальных ручнікоў. І гэтае падабенства таксама не выпадковае. У народнай духоўна-бытавой сімволіцы абрадаваму ручніку адводзілася шмат функцый, сярод якіх была і функцыя абярога ад ліхога. Ручнік лічылі своеасаблівым каналам сувязі паміж чалавекам і Богам. Менавіта з гэтай патрэбы спыняўся вернік перад уваходам у храм, захоплены гармоніяй рытмаў і глыбінай знакавасцю архітэктурнай геаметрыі. Аналагічны сакральна-апотрапейны характар меў крыж, выкладзены з перапаленай цэглы на верхнім ярусе паўночна-заходняй вежы.

Мураваны франтон на ўсходнім тарцы даха асноўнага аб'ёму амаль закрыты высокім гонтавым дахам над апсідамі і толькі па баках аформлены ступеньчата размешчанымі падвойнымі арачнымі нішамі. Паўцыркульныя падвойныя і патройныя арачныя нішы на абодвух франтонах падзелены даволі шырокімі плоскімі падвескамі на ступеньчатых кансолях — элемент, распаўсюджаны ў гатычным замкавым дойлідстве Заходняй Еўропы. Гэтакі ж дэкор вежаў і сцен мае самы славуты помнік айчыннага абарончага дойлідства — замак у Міры (Карэліцкі р-н), пабудаваны ў пачатку XVI ст., амаль адначасова з праваслаўнымі абарончымі цэрквамі.

Бакавыя фасады сынковіцкай царквы прарэзаны высока размешчанымі стральчатымі вокнамі, па два з поўдня і поўначы. Усходнія травеі не маюць бакавога асвятлення, таму што іх сцены перакрыва-

юць фланкіруючыя вежы. Ніжнія часткі сцен умацоўваюць невысокія гранёныя контрфорсы, узнятыя ўсяго на вышыню аркатурнага пояса. Суадносіны вокнаў і контрфорсаў ствараюць на бакавых фасадах своеасаблівы шахматны рытм, уласцівы толькі гэтаму помніку.

Сцены Міхайлаўскай царквы ўзведзены з вялікапамернай цэглы ў тэхніцы гатычнай муроўкі. Тоўстыя швы вапнякова-пясчанай рошчыны падрэзаны і маюць трохгранную форму, што з'яўляецца характэрным будаўнічым прыёмам таго часу. Да галоўнага фасада храма прылягае даволі значных памераў невысокі прытвор (у плане таксама перакошаны прамавугольнік), фланкіраваны на вуглах круглымі вежачкамі і накрыты аднасхільным дахам. Перавязка швоў паміж прытворам і сценамі храма адсутнічае. Аднак па характару муроўкі і будаўнічаму матэрыялу лічаць, што ён пабудаваны таксама ў пачатку XVI ст., крыху пазней за царкву. Функцыянальна ён выконваў ролю экзанартэкса. Першапачаткова ўваход у яго быў зроблены толькі з паўднёвага боку, адкуль ён быў прыкрыты баявой вежай. Унутранага нартэкса ў сынковіцкай царкве не было, і хоры ў ёй таксама адсутнічаюць.

Характэрна, што ў дэкоры беларускай царкоўнай готыкі дамінуе форма паўцыркульнай, а не стральчатай аркі, якая найбольш характэрна заходнееўрапейскай готыцы. У цэрквах-крэпасцях стральчатая арка выкарыстоўваецца толькі ў тых канструкцыйных элементах, якія ўспрымаюць значную нагрузку (скляпеннях, аконных праёмах), сцвярджаючы, такім чынам, іх гатычную прыроду. Пры гэтым страла пад'ёму спічастых арак была звычайна не вельмі значнай.

Царква-крэпасць у Сынковічах з'яўляецца прыкладам таго, як паўцыркульныя аркі ў дэкоры і канструкцыях беларускай готыкі (разгрузачныя нішы на франтонах, аркатурныя паясы), якія з'яўляюцца архітэктурнымі формамі-сімваламі візантыйскага паходжання, даволі арганічна спалучыліся ў мясцовым дойлідстве з вызначальнымі канструкцыйна-мастацкімі элементамі заходнееўрапейскай готыкі.

Паслядоўны эвалюцыйны працэс формаўтварэння беларускай царкоўнай готыкі завяршае абарончая царква Раства Багародзіцы ў вёсцы Мураванка (сучасны Шчучынскі р-н), пабудаваная паміж 1516 і 1542 г. Яна прыцягвала пільную ўвагу шматлікіх даследчыкаў дарэвалюцыйнага часу, Заходняй Беларусі, Літвы і БССР (Я. Ядкоўскі, А. Шышка-Богуш, М. Сакалоўскі, М. Шчакаціхін, А. Янкявічэне і інш.). У мастацтвазнаўстве першай паловы XX ст. царква вядомая пад назвай Маламажэйкаўскай. Удакладненне яе навуковай атрыбуцыі паводле геаграфічнай прывязкі зроблена пры падрыхтоўцы выдання «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі».

Дакладная дата будаўніцтва царквы невядомая. У больш ранніх пераважна клерыкальна-краязнаўчых даследаваннях заснаванне царквы датуюць 1407 г. на падставе недакументаванай дакладна гістарычнай крыніцы спасылкі на інвентар 1648 г. Аднак апошнія гістарычныя і мастацтвазнаўчыя даследаванні свед-



Мал. 145. Царква Нараджэння Багародзіцы ў Мураванцы. Агульны выгляд


чаць пра іншы час яе ўзвядзення, больш позні амаль на стагоддзе.

Магчыма, што фундацыю царквы ажыццявіў князь Васіль Палубенскі, які ў 1514 г. атрымаў ад караля Жыгімонта I Старога прывілей на валоданне маёнткам Мажэйкаў у Жалудоцкім павеце. Паводле спадчыннага тастамента падканюшага віленскага Шымкі (Сымона) Мацкевіча, састаўленага ў 1542 г. на карысць царквы, у той час яна ўжо была змураваная. У сярэдзіне XVI ст., падчас руска-шведска-польскай вайны, царква была моцна пашкоджана і адноўлена праз некалькі гадоў, затым пацярпела ад абстрэлу шведскім войскам у 1706 г. і знаходзілася ў занядбаным стане да пачатку XIX ст. У 1817 г. (па іншых крыніцах — у 1822 г.) святыня была адрамантавана, пры гэтым нязначна зменены верх франтонаў.

Стан помніка ў сярэдзіне XIX ст. зафіксаваны графічнымі выявамі фасадаў царквы, выкананымі М. Пятровым, якія, аднак, пры пэўнай інфарматыўнасці ўтрымліваюць шмат недакладнасцей. Больш капітальна царква была рэканструявана ў 1871—1872 гг., што прывяло да пэўных зменаў у яе абліччы, асабліва ўваходнай часткі. Да галоўнага фасада прыбудавалі прытвор, а заходнія вежы надбудавалі на адзін дадатковы ярус са скразнымі праёмамі для размяшчэння званоў, што надало ўраўнаважанай кампазіцыі збудавання не ўласцівую ёй дынаміку. У гэты ж час часткова замуравалі арачны праём паміж алтарнай апсідай і кафаліконам і на муры замацавалі іканастас, у 1930-я гг. гэтую сцяну ліквідавалі.


Стылістычныя асаблівасці сведчаць, што царква Раства Багародзі-

цы ў Мураванцы ўзведзена пазней за Міхайлаўскую царкву ў Сынковічах. Архітэктанічна гэтыя чатырохвежавыя помнікі беларускай царкоўнай готыкі вельмі падобныя, але ў мураванкаўскай царкве рысы позняй готыкі выяўлены больш яскрава. Да таго ж яна пабудавана больш прафесійна з тэхнічнага пункту гледжання: тут ажыццёўлена больш дакладная разбіўка плана, рэалізавана больш дасканалая познегатычная структура скляпенняў.




Будынак пастаўлены на магутны падмурак з бутавых камянёў сярэдніх памераў на вапнякова-пясчанай рошчыне з дадаткам дробных камянёў і бітай цэглы. Глыбіня падмурка 2,4 м, шырыня — да 3 м, з адступам сцен ад яго вонкавай паверхні на 0,7 м. Муры царквы выкананы з якасна абпаленай вялікапамернай цэглы-пальчаткі ў тэхніцы гатычнай муроўкі на вапнякова-пясчанай рошчыне з характэрнай для пачатку XVI ст. трохграннай расшыўкай швоў.

Агульная архітэктоніка мураванкаўскай царквы надзвычай простая і лаканічная, падкрэслена статычная. Асноўны амаль квадратны ў плане аб'ём царквы накрыты высокім двухсхільным дахам з магут-



Мал. 146. Царква Нараджэння Багародзіцы ў Мураванцы: план і падоўжны разрэз



Мал. 147. Царква Нараджэння Багародзіцы ў Мураванцы. Скляпенні ў інтэр'еры

нымі мураванымі франтонамі на тарцах і фланкіраваны на вуглах чатырма круглымі баявымі вежамі з конусападобнымі шатровымі дахамі. Унутры залавая прастора кафалікона (15 × 13,5 м) падзелена чатырма васьміграннымі апорнымі слупамі, злучанымі паўцыркульнымі падпружнымі аркамі, на тры нефы ці, дакладней, на 9 травей.

Квадратныя ў плане травеі цэнтральнага нефа перакрыты зорчатымі скляпеннямі з рэзка прафіляванымі нервюрамі, а прамавугольныя травеі бакавых нефаў — сотавымі ці крышталёвымі познегатычнымі скляпеннямі складанага геаметрычнага малюнка. Распор скляпенняў перадаецца на вуглавыя вежы і даволі тоўстыя сцены (каля 2 м). У выніку адзначанай сістэмы пагашэння распору скляпенняў усё збудаванне пазбаўлена контрфорсаў — вызначальнага элемента готыкі. Рытмічна і высока размешчаныя аконныя праёмы з паўцыркульнымі арачнымі завяршэннямі надаюць інтэр'еру раўнамернае двухбаковае асвятленне, але не змяншаюць пры гэтым абарончых якасцяў збудавання.

Увогуле ў пэўнай статычнасці і ўраўнаважанасці архітэктурных формаў мураванкаўскай царквы адчуваюцца павевы протарэнесансу, што адзначаў яшчэ М. Шчакаціхін. У канструкцыі збудавання паўцыркульныя аркі шматразова арганічна спалучаюцца са стральчатымі, напрыклад, падпружныя аркі і дыяганальныя рэбры скляпенняў.

У архітэктоніцы мураванкаўскай царквы страчваецца яшчэ адна прыкмета візантыйска-рускага крыжова-купальнага храма — трохапсіднасць, характэрная для больш ранніх помнікаў беларускай царкоўнай готыкі. З усходу царква завяршаецца адной вялікай паўкруглай алтарнай апсідай замест трох кананічных (агульная даўжыня храма 21,7 м). Больш нізкая за асноўны аб'ём алтарная апсіда злучана з малітоўнай залай шырокім арачным праёмам стральчатага абрысу, што ўспрымае нагрузку мураванага ўсходняга франтона. Звонку алтарная апсіда

накрыта конусападобным дахам, а ўнутры перакрыта суцэльным конхавым скляпеннем з распалубкамі, нервюры якога ўтвараюць больш буйны і выразны зорчаты малюнак, параўнальна са скляпеннямі травей асноўнага аб'ёму.

Тры аконныя праёмы алтарнай часткі паўцыркульнымі завяршэннямі ўкампанаваны ў распалубкі скляпення. Сіметрычнасць аконных праёмаў алтарнай часткі адносна падоўжнай восі збудавання пры будаўнічай разбіўцы крыху парушана, што можна бачыць на вонкавай сцяне апсіды, дзе на паўднёва-ўсходнім прасценку размешчаны дзве паўцыркульныя арачныя нішы, а на паўночна-ўсходнім толькі адна і, дадаткова, маленькая круглая ніша. Архітэктурна-археалагічныя даследаванні пад кіраўніцтвам Л. Паўлавай паказалі, што першапачаткова вокны былі размешчаны ніжэй, але амаль адразу іх замуравалі і ўзнялі да ўзроўню вокнаў асноўнага аб'ёму, верагодна, з абарончымі мэтамі. У алтарнай апсідзе выяўлены таксама дзве байніцы, што сведчыць пра сумяшчэнне ў ёй сакральных і фартыфікацыйных функцый.

Асноўнымі фартыфікацыйнымі элементамі мураванкаўскай царквы-крэпасці з'яўляюцца чатыры магутныя круглыя вежы, якія арганічна ўваходзяць у архітэктурныя масы асноўнага аб'ёму, надаючы яму маналітнасць і паважны манументалізм. Першапачаткова вежы былі аднолькавай вышыні, што яшчэ больш падкрэслівала гарманічную статыку кампазіцыі. Аднак па структуры і функцыянальнаму прызначэнню вежы істотна розняцца паміж сабою.

Заходнія вежы ў дыяметры большыя за ўсходнія і ў іх размешчаны мураваныя вітыя ўсходы. Яны прыкрывалі адзіны ўваход у святыню, таму мелі больш развітую сістэму байніц (5 ярусаў). Вітыя ўсходы ва ўсходніх вежах былі драўляныя і колькасць байніц меншая (4 ярусы). Характэрна, што ў мураванкаўскай царкве непасрэдна з алтарнай апсіды зроблены праходы ва ўсходнія вежы, у ніжнім ярусе якіх, відавочна, знаходзіліся рызніца і дзяканнік, што звычайна месціліся ў бакавых апсідах. Такім чынам, гэтым абарончым элементам была нададзена сакральная функцыя кананічных праваслаўных апсід.

Колькасць байніц, іх памеры і форма на кожным ярусе розныя: з раструбамі ўнутр вежаў ці скошаныя ўніз у залежнасці ад размяшчэння і прызначэння. Па дзве байніцы размешчана на заходнім і ўсходнім франтонах. Аднак байніц-машыкуляў, якія па перыметры апярэзвалі супрасльскую і сынковіцкую цэрквы, у мураванкаўскай царкве значна менш: іх усяго чатыры на галоўным і па тры на бакавых фасадах асноўнага аб'ёму. Гэта сведчыць пра тое, што яе абарончая сістэма была разлічана ўжо на ручную агнястрэльную зброю і большую адлегласць абстрэлу.

У аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі мураванкаўскай царквы ўражвае прадуманасць і функцыянальная універсальнасць усіх яе частак. Разлічаны на нядоўгатэрміновую аблогу, храм мае падземныя сутарэнні для захавання правіянта і зброі, дадатковых падземных ходаў адтуль не выяўлена. У адрозненне ад сын-

ковіцкай, мураванкаўская царква доўгі час не мела ўваходнага прытвора. Дзеля большай бяспекі невялікі нартэкс нібыта ўцягнуты ўнутр збудавання. Ён займае толькі першую травею пры ўваходзе, зграбна вылучаны стральчатымі арачнымі праёмамі і над ім размешчаны адкрытыя хоры, што не замінае агульнаму асвятленню інтэр'ера.

Над адзіным уваходам у царкву-крэпасць знаходзілася ніша са спецыяльнай прыладай для абароны ў выглядзе каванай жалезнай кратыгерсы, якая была знята ў пачатку XIX ст. Сучасны прытвор-экзанартэкс з маленькімі круглымі вежачкамі на вонкавых вуглах прыбудаваны толькі ў 1870-я гг., падчас капітальнай рэканструкцыі царквы, але даволі ўдала імітуе яе аўтэнтычную стылістыку.

Пры агульнай блізкасці архітэктанічнай структуры дэкаратыўнае вырашэнне мураванкаўскай царквы, параўнальна з сынковіцкай, мае больш упарадкаваны рытмічны лад з адчувальнымі прыкметамі эстэтыкі рэнесансу. Гэта відавочна і ў яруснай будове шчыта галоўнага фасада з фігурнымі абрысамі, і ў метрычным рэнесансным рытме архітэктурных элементаў, і ў ордэрнай прафіліроўцы карніза, які па ўсім перыметры завяршае сцены будынка.

Новая стылістычная афарбоўка архітэктурных фрмаў стварае новае агульнае мастацкае ўражанне. Тут упершыню назіраецца пэўная незалежнасць дэкора ад фартыфікацыйных элементаў. Статычнасць кампазіцыі падкрэслена дамінаваннем гарызанталей. Лінія абрэза цокаля крыху вышэй прадубліравана дэкаратыўнай палосай парэбрыка, затым на бакавых фасадах рытмічным шэрагам аконных праёмаў з высокімі спаранымі арачнымі нішамі ў прасценках. Вышэй над імі на бакавых фасадах размешчаны пояс падвесных арачных нішаў і шэраг арачных байніц-машыкуляў, схаваных у тоўшчы сцяны, якую аздабляў геаметрычны арнамент з перапаленай цэглы, характэрны для мясцовай готыкі.

Адметнае вырашэнне мае галоўны фасад, падзелены поясам машыкуляў і прафіляваным карнізам на манументальна-статычную ніжнюю частку і дынамічны фігурны франтон. Па восі сіметрыі фасада суровыя муры, пазбаўленыя дэкаратыўнай аздобы, прарэзваюць уваходны праём, вырашаны па-мастацку своеасабліва: ён завершаны лучковай аркай, укампанаваны ў стральчаты партал і аздоблены маляўнічым кілепадобным абрамленнем. Вышэй фасадная сцяна асноўнага аб'ёму раскрапавана трыма магутнымі арачнымі нішамі з лучковымі завяршэннямі і круглым акном па сярэдзіне цэнтральнай нішы. Строгі рытм, буйныя чляненні, глухія паверхні сцен і фартыфікацыйныя элементы надаюць ніжняй частцы фасада сярэднявечны аскетычны выгляд.

Пластычнае вырашэнне франтона стварае зусім іншую духоўную аўру. У ім гатычны вертыкалізм выразна спалучаецца са спакойным рэнесансным рытмам, плоскаснасць — з глыбінёй прасторы. Крыху ўвагнутыя схілы франтона раскрапаваны востраверхімі вертыкальнымі элементамі, што надае яму маляўнічы дынамічны абрыс. Дынаміка кампа-

зіцыі ўзмацняецца чляненнем франтона на два ярусы, з якіх верхні значна ніжэйшы за ніжні. Высокая сцяна франтона зроблена больш тонкай за фасадную сцяну, да таго ж яна не звязана мурамі з асноўнай канструкцыяй збудавання. Таму, каб сцяна франтона трымалася, ёй нададзена ўнутраная прасторавая жорсткасць з дапамогай шматлікіх разгрузачных арачных нішаў.

Аздоба ніжняга яруса ўключае тры паўцыркульныя арачныя нішы, унутры якіх ступеньчата размешчаны падвойныя падвесныя і невялікія лучковыя нішы. Верхні ярус франтона запоўнены своеасаблівай кампазіцыяй з некалькіх разнастайных нішаў, у якой дамінуе вялікая падвойная ніша з «гіркай».

Генезіс падвеснай (з невялікай падвескай-«гіркай» пасярэдзіне) арачнай нішы даволі працяглы і складаны. Ён відавочна звязаны з аркатурнымі паясамі, якія ўпрыгожвалі алтарныя часткі раманскіх сабораў Заходняй Еўропы і візантыйска-славянскага рэгіёна X—XII стст. З цягам часу спалучэнне ўкарочаных аркатурных кранштэйнаў з вертыкальнымі элементамі (слупкамі, пілястрамі) стварыла самастойную архітэктурна-дэкаратыўную форму. Ужыванне гэтай формы ў канструкцыях разгрузачных арачных нішаў атрымала шырокае распаўсюджанне ў протарэнесанснай архітэктуры ўсёй Еўропы. На працягу першай паловы XVI ст. гэтая архітэктурная форма актыўна пашыраецца як у царкоўным, так і замкавым будаўніцтве ВКЛ (Ніжні замак у Вільні, замак Іллінічаў у Міры).

У беларускім сакральным дойлідстве падвойныя і патройныя падвесныя арачныя нішы ўпершыню з'яўляюцца на франтоне галоўнага фасада сынковіцкай царквы. У мураванкаўскай царкве выбеленыя падвойныя арачныя нішы з «гіркамі» становяцца асноўным дэкаратыўным матывам усяго збудавання. Тут яны размешчаны на фасадах асноўнага аб'ёму, абарончых вежах і алтарнай апсідзе ў розных варыянтах памераў і рытмаў.

Шматлікія арачныя нішы сваёй канструкцыйнай жорсткасцю ўмацоўваюць муроўку сцен і функцыянальна замяняюць контрфорсы, якія становяцца архаічным рудыментам готыкі. Менавіта іх шырокае выкарыстанне дазволіла будаўнікам мураванкаўскай царквы адмовіцца ад контрфорсаў і надаць пабудове рэнесансную стылістыку.

Адначасова эфектны кантраст чырвонага колеру адкрытай цаглянай муроўкі сцен і выбеленых канструкцыйна-дэкаратыўных элементаў (нішаў, карнізаў, раструбаў аконных праёмаў, машыкуляў і байніц) надаваў збудаванню надзвычайную мастацкую выразнасць. Урачысты жыццесцвярджальны характар каларыстычнага вырашэння ўзмацняў чырвоны колер пакрыцця даха пляскатай дахаўкай, фрагменты якой выяўлены археалагічнымі даследаваннямі.

Улічваючы надзвычай шматпланавы генезіс архітэктурных формаў праваслаўных храмаў беларускай готыкі, даволі складана дакладна вызначыць іх тыпалогію. Больш ранія з іх: Дабравешчанскую царкву ў Супраслі і Прачысценскую ў Віль-

ні — можна вызначыць як крыжова-купальныя храмы абарончага тыпу. Але, пачынаючы з сынковіцкай царквы, страчваецца асноўная генетычная прыкмета крыжова-купальнага храма купал на сяродкрыжжы. Дах становіцца двухсхільным, падоўжным па восі ўсход-захад, з мураванымі шчытамі на тарцах.

У мураванкаўскай царкве трансфармуецца яшчэ адна кананічная асаблівасць праваслаўнага храма — трохапсіднасць. Адначасова ў яе стылістыцы з'яўляюцца рысы протарэнесансу, знікаюць контрфорсы, фартыфікацыйныя элементы прыстасоўваюцца да агнястрэльнай зброі. Уласцівы помнікам беларускай царкоўнай готыкі абарончы характар з'яўляецца сацыяльна абумоўленай і арганічнай рысай архітэктуры таго часу, але не галоўнай прыкметай яе своеадметнасці. Іх мастацка-стылістычная і канструкцыйна-будаўнічая эвалюцыя ў цэлым вызначаецца творчым падыходам і нацыянальнай самабытнасцю.

3.6. Позняя готыка і рэнесанс у сакральным дойлідстве XVI ст.

Дасканаласць і рацыянальнасць канструкцыйнай сістэмы заходнееўрапейскай готыкі дагэтуль не пакідае выклікаць захапленне, але паступовы ідэйна-эстэтычны заняпад стылю, абмежаванага сярэдневяковай схаластыкай, з сярэдзіны XV ст. спрыяў ідэйнаму аднаўленню ўзораў антычнай класікі, станаўленню ў Італіі эпохі Адраджэння.

У архітэктурнай форматворчасці італьянскага рэнесансу важнейшую ролю адыграла вяртанне да антычнай паўцыркульнай аркі ў сукупнасці з класічнай ордэрнай трактоўкай апор. Цікавае паэтычнае выказванне «тытана Адраджэння», вялікага вучонага, мастака і архітэктара Леанарда да Вінчы пра канструкцыйную існасць паўцыркульнай аркі: «Што ёсць арка? Арка не што іншае, як сіла, створаная дзвюма слабасцямі, бо арка ў збудаваннях складаецца з двух чвэрцяў круга, кожная з гэтых чвэрцяў круга, вельмі слабая сама па сабе, імкнецца ўпасці, але пры сутыкненні адно з адным абедзве слабасці пераўтвараюцца ў адзіную сілу» [87].

Адным з непасрэдных каналаў распаўсюджання ідэй італьянскага архітэктурнага рэнесансу на нашых землях стаў другі шлюб караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта I Старога з Бонай Сфорца, з роду міланскіх герцагаў, якая прыбыла ў Кракаў у 1518 г. з вялікай світай, што ўключала і прыдворных мастакоў. Сярод іх быў і шэраг італьянскіх архітэктараў: Францыскус Італікус, Франчэска дэла Лора, Барталамеа Бярэці, Нікола дэ Касціглёнэ і інш., якія прымалі ўдзел у адбудове Вавельскага замка ў першай палове XVI ст. Відавочна, што яны былі добра знаёмыя з творчасцю Леанарда да Вінчы, які жыў у Мілане да 1516 г.

Яны прынеслі ў архітэктуру Каралеўства Польскага характэрны элемент рэнесанснай архітэктуры Італіі — атык, аформлены раўнамерным шэрагам плоскіх паўцыркульных арачных нішаў, які затым быў перанесены ў палацавае долідства ВКЛ і атрымаў назву "польскі". Адначасова з'явіліся і элементы антычнай ордэрнай архітэктуры: пілястры, прафіляваныя карнізы і г. д. Усе гэтыя навацыі адбіліся ў мастацкім абліччы Ніжняга (Дольнага) замка ў Вільні, які адбудоўваўся пры Жыгімонце I Старым.

Бона Сфорца прыняла надзвычай актыўны ўдзел у палітычным, эканамічным і культурным жыцці краіны, шчыра падтрымлівала тут традыцыі мецэнацтва, актыўна спрыяла ўмацаванню каралеўскай улады, эканамічнымі сродкамі аказвала ціск на буйных мясцовых магнатаў. Менавіта падчас яе ўладарання пачаўся інтэнсіўны рост гарадскіх населеных пунктаў, развіццё рамёстваў і гандлю, многія гарады і мястэчкі атрымалі магдэбургскае права, "лакацыйныя прывілеі".

Замест горадабудаўнічай структуры ранняга сярэдневякоўя, у першай палове XVI ст. узнік новы тып гарадской планіроўкі. Узятыя ўспадчыну са старажытных часоў горадабудаўнічыя ўтварэнні (дзядзінец — замак, пасады — прадмесці) дапаўняюцца новымі структурамі, звязанымі з развіццём эканомікі, грамадскіх інстытутаў, што абумовіла новую арганізацыю побытавага асяроддзя. Ядром горада альбо мястэчка становіцца гандлёвая плошча, размешчаная побач з умацаваным замкам феадала ці ўвогуле без яго. Побач з кучавой, бессістэмнай жылой забудовай актыўна фарміруецца рэгулярная лінейная планіроўка з сеткай вуліц, якія ўтвараюць кварталы, што звaліся тады "сотні".

Складаная палітычна-канфесіянальная сітуацыя, пашырэнне рэфармацыі, феадальныя міжусобіцы ў сярэдзіне XVI ст. вымагалі ад магнатаў і шляхты ўмацоўваць свае жылыя рэзідэнцыі. Пад уплывам эстэтычнага і тэхнічнага ўздзеяння архітэктуры італьянскага Адраджэння замкавае дойлідства Беларусі паступова трансфармавалася ў палацава-замкавае.

Пры будаўніцтве феадальных рэзідэнцый у другой палове XVI ст. атрымалі распаўсюджанне бастыённыя фартыфікацыйныя сістэмы старaітальянскага і новаітальянскага тыпаў, блізкія да «ідэальных» узораў (Любча, Заслаўе, Ляхавічы, Стары Быхаў, Нясвіж, Слуцк). Пры гэтым фартыфікацыйныя прыстасаванні ўдасканальваюцца і выносяцца за межы асобных будынкаў, акаляючы горад ці мястэчка ў цэлым, разам з гандлёва-рамесніцкімі пасадамі.

У 1550—1560 гг., пры Жыгімонце II Аўгусце, быў рэканструяваны ў формах рэнесансу Ніжні замак у Вільні. Услед за гэтым архітэктарам Скота з Пармы (таксама з Паўночнай Італіі) у рэнесансным стылі быў перабудаваны Стары замак князя Вітаўта ў Гродна. Суровая замкавая камяніца атрымала дэкаратыўна-абарончы атык, былі пашыраны вокны, інтэр'еры аздоблены арнаментальнай разьбой з мармуру, што надало ёй выгляд палаца. Характэрныя матывы італьянскага архітэктурнага рэнесансу (паўцыркульныя

ордэрныя аркады галерэй, лоджый, атыкаў) можна бачыць на старажытных графічных выявах многіх гарадоў Беларусі.

Пачатак XVI ст. адзначаны пранікненнем мастацкіх прыёмаў італьянскага рэнесансу ў сакральнае дойлідства ВКЛ і знітаваннем іх з познегатычнымі формамі і канструкцыямі. Характэрнай асаблівасцю мясцовага дойлідства з'яўляецца той факт, што паўцыркульная арка здаўна прысутнічала тут як спадчынны элемент візантыйскай архітэктуры. Таму яе шырокае выкарыстанне ў пераходны перыяд ад готыкі да рэнесансу абумоўлена не толькі італьянскімі ўплывамі, але і традыцыямі праваслаўнага храмабудаўніцтва папярэдняга часу.

Больш выразна ўплыў італьянскага архітэктурнага рэнесансу выяўлены ў паступовым і нясмелым пранікненні элементаў антычных ордэраў: прафіляваных карнізаў, ордэрных пілястраў, якія прыйшлі на змену машыкулям і контрфорсам. Яшчэ больш запаволена адбываліся змены ў архітэктоніцы храмаў. У Вільні ў стылі італьянскага рэнесансу былі перабудаваны па фундацыі караля Жыгімонта I Старога касцёл Св. Станіслава і Уладзіслава, пазней, па фундацыі караля Жыгімонта II Аўгуста касцёл Св. Ганны і Барбары, які так і не быў завершаны.

У другой чвэрці XVI ст., адначасова з усёй Цэнтральнай Еўропай, у Вялікім княстве Літоўскім пашырыўся рэфармацыйны рух, які дасягнуў свайго апагею ў 1560-я гг. Ён лагічна вынікаў з тагачасных сацыяльна-палітычных абставін дзяржавы, спрыяў фарміраванню атмасферы талерантнасці ў рэлігійным жыцці грамадства, што зафіксавана юрыдычна Статутам 1588 г. Пратэстантызм меў тут шырокую сацыяльную базу ў сярэдніх і вышэйшых пластах грамадства, праводзіў актыўную адукацыйную і асветніцкую дзейнасць. Значная колькасць буйных беларуска-літоўскіх магнацкіх родаў (Радзівілы, Сапегі, Кішкі, Глебавічы, Хадкевічы і інш.), каб замацаваць ідэалаічна сваю незалежнасць як ад каталіцкай Польшчы, так і ад праваслаўнай Маскоўскай дзяржавы, «зрабілі стаўку» на пратэстантызм. Найбольш пашыраным рэфармацыйным кірункам на Беларусі быў кальвінізм, у меншай ступені атрымалі пашырэнне лютэранства і антытрынітарызм (арыянства).

У другой палове XVI — першай палове XVII ст. на яе тэрыторыі дзейнічала каля 90 кальвінскіх абшчын, было адчынена 198 пратэстанцкіх храмаў-збораў. У час росквіту рэфармацыйнага руху большасць кальвінскіх абшчын ажыццяўляла сваю дзейнасць на аснове храмаў іншых канфесій, галоўным чынам касцёлаў, перададзеных ім фундатарамі-аднавернікамі. У сакральным дойлідстве пашырэнне рэфармацыйнага руху абумовіла распаўсюджанне мастацкіх уплываў пратэстанцкіх краін: Германіі, Чэхіі, Нідэрландаў — так званага паўночнага рэнесансу. Мураванае каталіцкае храмабудаўніцтва ў гэты час было замаруджана. У правінцыі ўзведзены некалькі познегатычных касцёлаў, якія ў час рэфармацыі падвергліся канверсіі і былі перабудаваны. Помнікі праваслаўнага мураванага дойлідства

другой паловы XVI ст. цалкам адсутнічаюць.

Касцёл Міхаіла Архангела ў Гнезна (Ваўкавыскі р-н), пабудаваны ў першай палове XVI ст., адзначыў з'яўленне ў беларускім позднегатычным каталіцкім храмабудаўніцтве элементаў рэнесансу. Існуюць апакрыфічныя краязнаўчыя паданні, што ён заснаваны ў 1121 г. Гэтая дата пазначана таксама ў інвентары святыні XIX ст. [98, ф. 4, спр. 2615], яна ж была выціснута на цагліне фасада. Аднак гэтая апакрыфіка не мае ніякіх рэальных гістарычных падцвярджэнняў і звязана з тым, што Гнезна пад Ваўкавыскам, відавочна, блытаюць з аднайменнай старадаўняй сталіцай Вялікапольшчы.

Міхайлаўскі касцёл у маёнтку Гнезна фундаваны яго ўладальнікамі Янам і Эльжбетай Шамятовічамі ў 1524 г., кансекраваны ў 1527 г. У 1555 г. маёнтак перайшоў ва ўладанне Гераніму Хадкевічу, актыўнаму прыхільніку рэфармацыйнага руху. Ён пераўтварыў касцёл у кальвінскі збор, якім ён і заставаўся амаль цэлае стагоддзе, да 1643 г., калі зноў быў вернуты католікам.

Касцёл быў змураваны ў архітэктурна-канструкцыйных формах цэнтральнаеўрапейскай готыкі. Пратэстанты надалі яму рысы мясцовага рэнесансу, характэрныя для іх канфесіі. Гэтыя гістарычныя падзеі і архітэктурна-будаўнічыя працэсы з цягам часу зліліся ў адно мастацкае цэлае, дапоўненае пазнейшымі перабудовамі, у выніку чаго вельмі складана выявіць аўтэнтыку помніка. Гэтаму дапамагаюць гістарычныя крыніцы, архітэктурная археалогія і архітэктурна-мастацтвазнаўчы аналіз.

Шырокі прамавугольны неф гнезнаўскага касцёла завершаны з усходу трохграннай алтарнай часткай (агульная даўжыня 21,45 м). Будынак накрыты высокім двухсхільным дахам з вальмамі над алтаром. Цэласнасць і маналітнасць асноўнага аб'ёму надае візуальную важкасць і прысадзістасць абліччу касцёла, нягледзячы на лёгкасць і дасканаласць гатычных канструкцый, вялікі пралёт нефа і адкрытасць унутранай прасторы. У першую чаргу, гэта адбываецца з прычыны адсутнасці тут перападу вышынь дахаў нефа і алтарнай апсіды, што характэрна для больш ранніх гатычных касцёлаў. Толькі велічная шмат'ярусная вежа на галоўным фасадзе надае дынаміку і ўзнёсласць агульнай кампазіцыі святыні.


Простая і лаканічная, на першы погляд, архітэктоніка касцёла ў сапраўднасці ўтрымлівае ў сабе шмат загадак. Першая з іх — адсутнасць у ім апсіды прэсбітэрыя. Каноны каталіцкай канфесіі выпрацавалі тып храма з адной вялікай апсідай прэсбітэрыя, абапал вімы якога размяшчаліся неабходныя для літургічнага рытуалу дапаможныя памяшканні сакрысціі (ці хаця б адна з іх). Усе разгледжаныя вышэй больш ранніе гатычныя касцёлы мелі па адной сакрысціі з паўночнага боку.

Адсутнасць апсіды прэсбітэрыя і сакрысціі робіць гнезнаўскі касцёл, нягледзячы на яго значныя памеры, падобным да капліцы ці да пратэстанцкіх храмаў больш позняга часу, якія не мелі вылучанага алтарнага памяшкання, напрыклад, каль-

вінскія зборы ў Смаргоні, Кухцічах, Заслаўі, Жодзішках. Акрамя таго, гнезнаўскі касцёл адпачатку меў напаўпадземную крыпту з двума ўваходамі: адзін з іх знаходзіўся ў цэнтры храма, другі выходзіў на тэрыторыю за алтарнай сцяной (гэты выхад быў замураваны ў 1844 г.). Магчыма, крыпта на першапачатковым этапе выконвала функцыю сакрысціі, як гэта было ў цудатворнай капліцы Архангела Рафаіла (пазней Міхаіла) у Нясвіжы, пабудаванай князем М. К. Радзівілам Сіроткам.

Шырыня будынка гнезнаўскага касцёла звонку 13,65 м, унутры — 12 м, таўшчыня сцен у розных месцах 0,8—1,0 м. Відавочна, што пры даволі вялікім пралёце ўнутранай прасторы, сцены па-гатычнаму адносна тонкія. Яны прарэзаны вялікімі перспектыўнымі стральчатымі арачнымі праёмамі вокнаў і ўмацаваны адмысловымі контрфорсамі, а таксама прамавугольнымі нішамі, зробленымі роўнай вышыні з вокнамі, і такім чынам не толькі дэкаратыўна афармляюць прасценкі, але і надаюць сценам унутраную канструкцыйную жорсткасць.


Заслугоўвае ўвагі структура ступеньчатых контрфорсаў, якія ўнізе, на ўзроўні цокаля, маюць прамавугольнае сячэнне, вышэй набываюць гранёную форму і паступова змяншаюцца, становяцца больш вытанчанымі, а ўверсе завяршаюцца кансольна-ступеньчатымі трампамі са схіламі для вадасцёку. Падобная будова контрфорсаў не трапляецца больш ні ў адным помніку беларускай готыкі. Але ёсць больш ранні прыклад ужывання кансольна-ступеньчатых трампаў (канструкцыйнага элемента візантыйскай архітэктуры) у абарончай праваслаўнай царкве ў Сынковічах, дзе яны злучаюць уверсе тры алтарныя апсіды з мэтай узвядзення над імі агульнага даха.



Мал. 148. Касцёл Міхаіла Архангела ў Гнезна. План

Сцены змураваны з цэглы-пальчаткі ў гатычнай тэхніцы на вапнава-пясчанай рошчыне з падрэзанымі швамі, якія ў профілі маюць гранёную форму. Ступеньчатыя трампы, стральчатыя арачныя праёмы вокнаў і ўваходных парталаў, разгрузачныя плоскія нішы і іншыя канструкцыйна-дэкаратыўныя элементы гнезнаўскага касцёла выкананы з фасоннай цэглы. Увогуле прафіляваныя стральчатыя, ступеньчатыя і гранёныя формы з'яўляюцца асноўнымі дэкаратыўнымі матывамі, якія ствараюць адметнае мастацкае аблічча гэтага помніка беларускай готыкі.

Паводле інвентару 1679 г. гнезнаўскі касцёл меў пяць вокнаў, два ўваходы, гонтавы дах, быў перакрыты плоскай драўлянай столлю. Вялікія вокны ў выглядзе стральчатых арак маюць перспектыўна-ступень-



Мал. 149. Касцёл Міхаіла Архангела ў Гнезна. Паўднёвы фасад

чатыя абрамленні. Бакавыя паўднёвы і паўночны фасады вырашаны неідэнтычна. Першапачаткова тры акны знаходзіліся на паўднёвым фасадзе і два — на гранях алтарнай часткі. Вокны на паўночным фасадзе адпачатку адсутнічалі, але звонку іх візуальна замяшчалі адпаведныя вокнам плоскія арачныя нішы ў перспектыўна-стральчатым абрамленні. Падобная ніша знаходзіцца і на тарцовай алтарнай сцяне.

Суцэльны глухі паўночны фасад быў традыцыйным для мясцовай касцёльнай готыкі, што рабілася з мэтай большай ваеннай бяспекі і змяншэння страт цяпла ад аэрацыі. У выніку пазнейшых перабудоў размяшчэнне вокнаў у гнезнаўскім касцёле некалькі змянілася. Сучаснае акно на паўночным фасадзе, відавочна, расчышчана пазней.

Галоўны ўваход зроблены праз вежу па восі сіметрыі храма, дадатковы — у сярэднім прасценку паўднёвага фасада. Па дэкаратыўнай аздобе ён быў багацейшы за галоўны, паколькі выходзіў адразу на вонкавы фасад, але ў 1787 г. да яго прыбудавалі прытвор, а над ім зрабілі характэрнае для таго часу круглае акно-люнету. Калі ў 1839 г. касцёл моцна пацярпеў ад пажару, прытвор разабралі, ён адсутнічае на малюнку Напалеона Орды 1860-х гг. У 1876 г. на тым жа месцы зноў прыбудавалі прытвор, архітэктура якога мела элементы псеўдарускага стылю. У 1931—1932 гг. падчас рэстаўрацыі святыні прытвор перабудаваны паводле праекта архітэктара Т. Плюцыньскага і такім ацалеў да нашага часу.

Спрэчным з'яўляецца характар перакрыцця ўнутранай прасторы гнезнаўскага касцёла на першапачатковым этапе яго існавання. Паводле азначанага інвентару XVII ст., складзенага ў хуткім часе пасля вяртання святыні каталікам, храм на той час быў перакрыты плоскай драўлянай столлю, якую падтрымлівалі 12 драўляных слупоў. У пачатку XVIII ст. моцна разбураны падчас Паўночнай вайны касцёл быў адбудаваны намаганнямі ксяндза С. Гарбоўскага і арандатара маёнтка Я. Трапіньскага, пры гэтым столь і слупы заменены на новыя.

Як сцвярджае гісторык А. Кушнярэвіч, «унутры касцёла падмуркі слупоў не знойдзены, што сведчыць пра адсутнасць у ім мураваных скляпенняў. Іх сляды таксама не выяўлены ў завяршэнні сцен» [80. С. 98]. Але гэта не зусім дакладна. Паводле прыведзенага ім жа плана археалагічных даследаванняў храма, унутры яго з мэтай адшукання падмуркаў гатычных апор быў закладзены толькі адзін шурф, размешчаны па восі значна больш позніх слупоў мураваных арганных хораў, якія замянілі папярэднія драўляныя хоры толькі ў 1902 г. Між тым над стральчатымі праёмамі вокнаў назіраюцца зацёртыя тынкам сляды распалубак, якія сведчаць пра існаванне крыжовых гатычных скляпенняў. Невялікія памеры распалубак скляпенняў дазваляюць меркаваць, што першапачаткова ўсю сістэму перакрыццяў храма залавага тыпу падтрымлівалі шэсць апорных слупоў, размешчаных адпаведна контрфорсам, але пры гэтым бакавыя нефы былі больш вузкія за цэнтральны.

Відавочна, што сістэма скляпенняў гнезнаўскага касцёла першапачаткова паўтарала архітэктоніку гатычнага ішкалдскага касцёла. Калі святыня перайшла да кальвіністаў, якія былі прыхільнікамі ідэалогіі і мастацтва рэнесансу, яны ўспрынялі гатычныя скляпенні як архаіку і каталіцкую спадчыну, таму і замянілі сістэму перакрыццяў, знішчылі гатычныя апоры, каб раскрыць унутраную прастору. Аднак архітэктанічная ўзаемная абумоўленасць сістэмы апор і перакрыццяў сведчыць, што даволі тонкія сцены храма не маглі несці адно вялікае мураванае рэнесанснае цыліндрычнае скляпенне з распалубкамі, пралётам 12 м. У выніку старадаўнія гатычныя скляпенні проста замянялі на драўляную бэлечную столь, якую дадаткова падтрымлівалі драўляныя слупы.


Уласную канструкцыйную жорсткасць вонкавых сцен умацавалі ўвядзеннем сіметрычных паўцыркульных разгрузачных арак на гранях алтарнай часткі і суседніх з імі пралётах. Характэрна, што вось унутранай рэнесанснай арачнай нішы на паўночнай сцяне не супала з восю вонкавай стральчатай гатычнай нішы, у якой пазней прарабілі акно, што сведчыць пра розначасовасць іх стварэння.

Шмат пытанняў ставіць перад даследчыкамі таксама гісторыя будаўніцтва шмат'яруснай уваходнай вежы гнезнаўскага касцёла. Яна далучана да галоўнага фасада без перавязкі муроўкі, гэта сведчыць пра тое, што вежа ўзведзена пазней за асноўны аб'ём, але ў хуткім часе пасля яго, паколькі іх аб'ядноўвае агульная гатычная будаўнічая тэхніка. Вежу звычайна ставілі пасля асадкі асноўнага аб'ёму, каб не было дэфармацый і абвалаў.

Ніжні чацвярык вежы прарэзаны з трох бакоў магутнымі аркамі, якія ўспрымаюць увесь цяжар верхніх ярусаў. Распор бакавых арак перадаецца на сцяну галоўнага фасада, якая ў гэтых месцах адпаведна змацавана разгрузачнымі аркамі. Ва ўзаемазвязанай сістэме пагашэння распору арак адчуваецца высокі прафесіяналізм мясцовых майстроў-будаўнікоў. Вуглавыя часткі двух ніжніх ярусаў вежы дадаткова ўмацоўваць і ўпрыгожваюць плоскія разгрузачныя арачныя нішы кілепадобнай формы, якія генетычна пахо-

дзяць не з заходнееўрапейскай готыкі, а з усходневізантыйскіх рэгіёнаў, дакладней, з Малой Азіі.

На верхнім ярусе вежы, які захаваўся аўтэнтычным толькі на палову вышыні, таксама зроблены плоскія разгрузачныя нішы, але ў выглядзе падвесных арак, характэрных для помнікаў беларускай готыкі і рэнесансу. У інвентары 1830 г. пазна-



Мал. 150. Касцёл Міхаіла Архангела ў Гнезна: агульны выгляд і сучасны галоўны алтар



чана вышыня вежы — 31 м (49 локцяў), пасля пажару 1839 г. яе вышыня была ўсяго 20 м.


На малюнку Н. Орды вежа прадстаўлена адноўленай на ўсю вышыню і накрытай невысокім шатровым дахам з дробнымі вальмамі над раскрапаванымі вуглавымі гранямі. Іначай выглядае на малюнку і франтон даха асноўнага аб'ёму. Пасля рэстаўрацыі 1930-х гг. тарэц даха на галоўным фасадзе закрывае масіўны двух'ярусны ступеньчаты атык, вуглавыя раскрапоўкі верхняга яруса вежы трактаваны як контрфорсы з кансольна-ступеньчатымі трампамі. Два ніжнія ярусы вежы перакрыты цылідрычнымі скляпеннямі, паверхі трэцяга яруса падзелены драўлянымі насцідамі.

Літаральна кожная частка архітэктурна-мастацкай кампазіцыі касцёла Міхаіла Архангела ў Гнезна ставіць пытанні гісторыкам і мастацтвазнаўцам, патрабуе расшыфроўкі. Але відавочна, што архітэктура гнезнаўскага касцёла злучыла рысы мясцовай готыкі са станаўленнем рэнесанснага светапогляду ў першай палове XVI ст.

Яшчэ ў большай ступені свой аўтэнтычны выгляд страціў Мікалаеўскі касцёл у вёсцы Геранёны (Іўеўскі р-н), змураваны пасля 1529 г. пры старажытным замку па фундацыі яго ўладальніка ваяводы віленскага Альбрыхта Гаштольда. Прамавугольны ў плане храм з выцягнутай пяціграннай апсідай прэсбітэрыя (амаль прамавугольнай са зрэзанымі вуглами) па прапорцыях планавай схемы нагадвае папярэднія гатычныя помнікі.

Як паказалі археалагічныя раскопкі, будынак пастаўлены на падмурку з бутавых камянёў магутнасцю каля 2 м. Сцяна галоўнага фасада ўмацавана на вуглах моцна выступаючымі контрфорсамі, якія зроблены ў адну лінію з бакавымі фасадамі (у XVIII ст. афармлены як ордэрныя анты). Перпендыкулярныя да іх контрфорсы на бакавых фасадах пазней счасаны. Адносна тонкія сцены збудавання абумовілі замену ў ім мураваных скляпенняў драўляным лучковым скляпеннем. Па сваёй аўтэнтычнай архітэктоніцы, фармату цэглы і гатычнай тэхніцы муроўкі геранёнскі касцёл паўтарае рэгіянальна блізкі да яго больш ранні Петрапаўлаўскі касцёл у Іўі.

Пасля моцнага пажару ў 1771—1779 гг. Мікалаеўскі касцёл у Геранёнах быў істотна перабудаваны ў стылі позняга барока на сродкі мясцовага шляхціца Яна Гераніма Пробача: фасады сціпла дэкарыраваны пілястрамі і прафіляванымі карнізамі, вокны атрымалі лучковае завяршэнне, тарэц даха на галоўным фасадзе закрыў высокі атыкавы франтон. Адначасова зменена начынне інтэр'ера. Мураваныя алтары (галоўны і два бакавыя) выкананы ў стылі барочнага класіцызму, афармлены калонамі карынфскага ордэра, драўлянай паліхромнай скульптурай і жывапісам. У 1859 г. прыбудаваны сіметрычныя сакрысціі, у 1883 г. — уваходны прытвор. У аўтэнтычнай сакрысціі былі мураваныя скляпенні, у пазнейшых зроблены драўляныя столі і падлогі. У 1828—1929 гг. праводзілася рэстаўрацыя касцёла як помніка барока. У 1934 г. мастаком К. Чарнецкім выканана сюжэтная і арнаментальная размалёўка інтэр'ера.



Спалучэнне рэнесансных рысаў з познегатычнымі элементамі выразна назіраецца ў архітэктуры касцёла Яна Хрысціцеля ў Запішкісе (Сапежышках), што пад Коўна (сучасная Літва). Храм пабудаваны на беразе Нёмана па фундацыі ўладальніка маёнтка вялікага канцлера літоўскага Льва Сапегі ў 1578 г. У пачатку XVII ст. з паўночнага боку да касцёла прыбудавана сакрысція,



Мал. 151. Касцёл Св. Мікалая ў Геранёнах: план і агульны выгляд


якая зараз не існуе. Будынак касцёла быў часткова перабудаваны ў XVIII ст., пры гэтым набыў рысы барока, некалькі разоў рамантаваны ў XIX ст., у 1923 і 1954—1955 гг. падвяргаўся рэстаўрацыі.

Архітэктанічна касцёл у Сапежышках уяўляе сабой невялікі бязвежавы аднанефавы храм з адной пяціграннай апсідай прэсбітэрыя. У плане блізкі да квадрата (11,6 × 10,2 м) асноўны аб'ём і даволі значных памераў апсіда пастаўлены адзін да аднаго не пад прамым вуглом, што сведчыць пра пэўную прафесійную недасканаласць будаўнікоў. Гэта не шкодзіць, аднак, мастацкай і сты-

лявой выразнасці архітэктуры помніка.

Будынак змураваны з вялікапамернай цэглы ў тэхніцы гатычнай муроўкі, якая не зусім дасканалая і рэгулярная, што надае ёй асаблівую маляўнічасць. Асноўны аб'ём накрыты надзвычай высокім двухсхільным клінападобным дахам з муравanымі франтонамі на тарцах. Вальмавы дах над крыху больш нізкай і больш вузкай апсідай мае аналагічны вугал схілаў, таму яго вільчык значна ніжэйшы за асноўны, што надае агульнай аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі дынаміку, нават пры адсутнасці вежы на галоўным фасадзе.


Адначасова сцены асноўнага аб'ёму і апсіды аб'яднаны ўверсе гарызантальнай цягай, накшталт фрыза, што надало ніжняй частцы будынка пэўную важкасць і статычнасць. Гэтая статычнасць яшчэ больш узмоцнена наяўнасцю высокага цокаля, аздобленага рытмічна размешчанымі плоскімі стральчатымі арачнымі нішамі. Гэтыя нішы выконваюць адразу некалькі функцый: канструкцыйную (разгрузачную), дэкаратыўную (тут адыгрываюць ролю рытм і колеравы кантраст паміж чырвонай адкрытай муроўкай і атынкаванымі нішамі) і сакральна-сімвалічную (імітуюць дрэвы райскага саду).




Мал. 152. Касцёл Яна Хрысціцеля ў Сапежышках (Запішкіс, Літва). План

Сцены і вуглы будынка касцёла ўмацаваны перпендыкулярна пастаўленымі трох'яруснымі ступеньчатымі контрфорсамі (у сярэдзіне бакавых фасадаў яны пазней счасаныя). У алтарнай частцы яны пастаўлены не па вуглах, як звычайна, а пасярэдзіне скошаных граней, што адлюстроўвае эмпірычныя пошукі новых канструкцыйных рашэнняў. Ярусы завершаны вальмавымі дашкамі для вадасцёку. Ніжні ярус кожнага контрфорса, які адпавядае цокалю, мае прамавугольнае сячэнне і аздоблены такімі ж плоскімі стральчатымі нішамі. Два верхнія ярусы змяншаюцца па памерах і маюць гранёную форму. Прасценкі паміж контрфорсамі пасярэдзіне прарэзаны вялікімі паўцыркульнымі арачнымі вокнамі ў прамавугольным абрамленні, а па баках аздоблены роўнымі з імі па вышыні выцягнутымі стральчатымі арачнымі нішамі. Усе аркі маюць невялікую стралу пад'ёму, таму іх стральчатасць слаба выяўлена. Раўнамерны рытм арачных нішаў, падкрэсленыя гарызантальныя цягі выяўляюць рэнесансныя павевы ў архітэктуры збудавання.

Своеасаблівыя суадносіны цокаля, вышыні сцен і даха сапежышкаўскага касцёла надаюць яго галоўнаму заходняму фасаду незвычаную будову. Ён завершаны вялізным трохвугольным франтонам з трыма ярусамі па-гатычнаму выцягнутых уверх прамавугольных нішаў і





Мал. 153. Касцёл Яна Хрысціцеля ў Сапежышках: падоўжны разрэз і галоўны фасад (паводле А. Янкевічэне)

поясам машыкуляў унізе. Вышыня нішаў паступова змяншаецца ўгору, ствараючы дынамічны вертыкальны рытм. Ніжняя частка фасада гарызантальнымі цягамі таксама падзелена на два ярусы, аздобленыя стральчатымі і прамавугольнымі нішамі, у выніку чаго ствараецца суцэльна дэкарыраваная паверхня.

Вось сіметрыі галоўнага фасада падкрэслена стральчатым парталам увахода ў прамавугольным абрамленні, над ім месціцца вялікае паўцыркульнае арачнае акно, заглыбленае ў прамавугольнай нішы. Дынаміцы гатычных стральчатых арак, якія абмалёўваюць цокаль будынка, нібыта супрацьпастаўлена статыка размешчаных вышэй прамавугольных і паўцыркульных рэнесансных нішаў. З паўночнага боку галоўны фасад замест контрфорса ўмацоўвае магутны пілон, у якім укампанаваны вітыя ўсходы ў паддашак будынка, што надае структуры фасада асіметрыю і натуральнасць, уласцівыя готыцы.

Унутры сапежышкаўскі касцёл першапачаткова, верагодна, быў перакрыты рэнесансным цыліндрычным скляпеннем, што дазваляе невялікі пралёт і магутнасць нясучых канструкцый. Асноўны аб'ём злучаны з апсідай прэсбітэрыя вялікай паўцыркульнай аркай. Пасля рэстаўрацыі інтэр'ер перакрыты плоскай бэлечнай драўлянай столлю. Унутры сцены першапачаткова былі аздоблены фрэскавым жывапісам.

Тыпалагічную разнастайнасць готыка-рэнесансных каталіцкіх святынь Беларусі адлюстроўвае фарны касцёл ў Нясвіжы, закладзены Мікалаем Крыштофам Радзівілам (Сіротка) у 1581 г. У 1582 г. будаўніцтва касцёла было перададзена ордэну езуітаў, якія былі запрошаны ў Нясвіж яго ўладальнікам. Але ўжо ў 1586 г. яшчэ «свежыя» муры касцёла былі разабраны па ініцыятыве біскупа віленскага Юрыя Радзіві-

ла, брата Сіроткі. Прычынай таму сталі, паводле гістарычных дакументальных крыніц, яго недастатковыя памеры і невысокая якасць будаўніцтва. Рэальнай падставай для разбурэння культавага будынка стала яго незвычайная архітэктоніка, якая не адпавядала мэтам контррэфармацыі і ідэалагічным арыенцірам ордэна езуітаў, што выступалі носьбітамі новага мастацкага стылю барока.


Унікальны план гэтага збудавання прадстаўлены ў альбоме чарцяжоў з Нясвіжа, атрыбутаванага намі як «Альбом Бернардоні», што сведчыць пра пачатак архітэктурна-графічнага праектавання ў дойлідстве ВКЛ у апошняй чвэрці XVI ст. Гэта быў значны і прыярытэтны крок у навукова-тэхнічным прагрэсе ва ўсім рэгіёне Цэнтральна-Усходняй Еўропы.

Паводле плана, выкананага ў пэўным маштабе на аркушы паперы з вадзянымі знакамі і гербам Радзівілаў, з надпісам «першы касцёл нясвіжскі, зламаны за Юрага, заложаны ў року 1581», збудаванне мела ў аснове роўнаканцовы грэчаскі крыж [137, ф. 721(589)С, арк. 19-а]. Асноўны прамавугольны ў плане неф быў перакрыты адным цыліндрычным рэнесансным скляпеннем з распалубкамі, шалыгі якіх былі падкрэслены, магчыма, дэкаратыўнымі нервюрамі. З усходу ён завяршаўся не апсідай прэсбітэрыя, а трохграннай алтарнай сцяной, умацаванай контрфорсамі, накшталт гнезнаўскага касцёла. Унутры алтарная сцяна была моцна раскрапавана для стварэння ўбудаванага архітэктанічнага алтара.


Характэрна, што вонкавым контрфорсам у гэтым збудаванні адпавядалі такія ж па памерах унутраныя. Падоўжныя сцены нефа пасярэдзіне заменены на два апорныя крыжападобныя пілоны, якія падтрымлівалі крыжовыя скляпенні сіметрычных прамавугольных аб'ёмаў, што надавалі плану форму крыжа. Вуглы гэтых аб'ёмаў раскрапаваны ўжо не контрфорсамі, а пілястрамі. З паўночнага боку да нефа прылягала адна невялікая сакрысція.

Адметнае вырашэнне мела заходняя частка будынка. Па баках яе ўмацоўвалі перпендыкулярныя да сцен контрфорсы, вонкавыя і ўнутраныя.

Ва ўнутраных вуглах крыжа сіметрычна размяшчаліся круглыя вежачкі з вітымі ўсходамі, што таксама ўмацоўвалі па-гатычнаму тонкія сцены будынка. Прасторавую ўстойлівасць павялічвалі так званыя «манастырскія», альбо «езуіцкія», скляпенні, якія складаюцца з дзвюх распалубак, злучаных па дыяганалі вугла. Бязвежавы галоўны фасад быў раскрапаваны толькі глы-



Мал. 154. Фарны касцёл у Нясвіжы. План (з альбома Д.-М. Бернардоні)





Мал. 155. Троіцкі касцёл у Клецку: план (з альбома Д.-М. Бернардоні), галоўны фасад (фота пачатку XX ст.), выгляд алтарнай часткі (фота пачатку XX ст.)



бокімі нішамі-табернакуламі, магчыма, прызначанымі для сакральнай скульптуры.

Відавочна, што архітэктоніка першага нясвіжскага мураванага касцёла ўяўляла сабой складаны рознавектарны і рознастылявы кангламерат. Яго аб'ёмна-прасторавая структура яскрава адрозніваецца ад 4-слуповых гатычных касцёлаў XV —

пачатку XVI ст. залавага тыпу. Побач з крыжовымі скляпеннямі, у ім прысутнічаюць рэнесансныя цылiндрычныя з распалубкамі і барочныя «езуіцкія» скляпенні, побач з контрфорсамі — пілястры і нішы-табернакулы, убудаваны архітэктанічны алтар.

Але адначасова план збудавання ў выглядзе грэчаскага крыжа і круглыя вуглавыя вежы сведчаць пра ўплыў на яго архітэктурнае вырашэнне традыцый мясцовага праваслаўнага храмабудаўніцтва папярэдняга часу, што і паслужыла прычынай яго мэтанакіраванага знішчэння. Тут мы ўпершыню ў гісторыі беларускага дойлідства сустракаемся з ідэалагічным сутыкненнем паміж семантыкай хрысціянскага храма каталіцкай і праваслаўнай канфесій з негатыўным вынікам.

У тым жа архіўным альбоме чарцяжоў з Нясвіжа канца XVI ст. [137, ф. 721(589)С, арк. 16-а] прадстаўлены план культавага будынка з надпісам на лацінцы: «касцёл места клецкага пана маршалка» (маецца на ўвазе ардынат клецкі Альбрыхт Радзівіл, які з 1585 г. быў маршалкам ВКЛ). Такім чынам, гэты чарцёж амаль дакладна можна датаваць 1585—1592 гг. На ім прадстаўлены адзіны вядомы на сённяшні дзень план фарнага Троіцкага касцёла ў Клецку, які цалкам разбураны ў сярэдзіне XX ст. Захаваліся архіўныя здымкі помніка 1930-х гг., выкананыя Віленскім таварыствам аматараў навук [43, ф. 1135, воп. 3, спр. 502].

Дата пабудовы клецкага Троіцкага касцёла з'яўляецца спрэчнай. Паводле інвентарных «Апісанняў стану плебаніі клецкай у губерніі Менскай» за 1796 і 1800 гг., «мураваны храм тут закладзены згодна з даўнейшай візітай каля 1450 г. коштам Андрэя Маствіловіча, абывацеля навагрудскага, адбудаваны накладам каралевы Боны, уладальніцы Клецка, кансекраваны кім і калі невядома» [99, ф. 178, воп. 27., спр. 252, 271]. У канцы 1550-х гг. прыхільнік рэфармацыі М. Радзівіл Чорны адабраў храм у католікаў і перадаў яго пад кальвінскі збор. Вядома, што тут у 1560—1562 гг. быў магістрам вядомы дзеяч рэфармацыі Сымон Будны. З гэтай прычыны большасць даследчыкаў адносіць час пабудовы мураванага касцёла ў Клецку да сярэдзіны XVI ст., прыблізна да 1550—1552 гг. Аднак, паводле гатычнай тэхнікі муроўкі, яго будаўніцтва датуюць нават XV ст. [80, С. 101—103], але аналагічную тэхніку муроўкі і памер цэглы маюць таксама Троіцкі касцёл у Чарнаўчыцах і кальвінскі збор у Кухцічах, пабудаваныя ў канцы XVI ст.

У згаданых апісаннях касцёла адзначана, што ён «старасвецкі», памерамі 59 × 25 аршынаў, з адною мураванаю вежаю, купал якой у 1796 г. быў абабіты драніцамі, а ў 1800 г. яна ўжо была без даху і крыжа; на ёй знаходзіліся званы. Унутры будынак меў «негладкія старасвецкія» скляпенні, сцены былі атынкаваны і часткова распісаны. Побач з прэсбітэрыям з паўночнага боку знаходзілася сакрысція са скляпеністым перакрыццём, а пад ёю скарбніца; памяшканні гэтыя злучаліся дзеля большай бяспекі люкам з прыстаўной лесвіцай. Пад падлогай з квадратнай цэглы знаходзіліся чатыры ганаровыя пахаванні. Інвентары змя-

шчаюць таксама падрабязныя апісанні алтароў і іншага «драўлянага начыння» выдатнай «сніцарскай работы», аднак не даюць дакладнага ўяўлення пра архітэктуру храма.

Першае графічнае адлюстраванне збудавання захавалася на гравюры Клецка, выкананай Т. Макоўскім на мяжы XVI—XVII стст., яго дапаўняе план касцёла з «альбома Бернардоні». З іх відавочна, што на той час фарны касцёл у Клецку меў трохчасткавую структуру і складаўся з асноўнага прамавугольнага нефа, пяціграннай апсіды прэсбітэрыя (з адначасткавай вімай) і магутнай васьміграннай вежы з ніжнім чацверыковым ярусам-нартэксам, завершанай высокім шатром. Неф і алтарная апсіда ад пачатку былі аднолькавай вышыні, аб'яднаны агульным прафіляваным карнізам і накрыты дахам з галоўкай у месцы злучэння аб'ёмаў. Гэтым клецкі касцёл прынцыпова адрозніваецца ад познегатычных касцёлаў, у якіх прэсбітэрый і дах над ім больш нізкія за асноўны аб'ём і аддзелены ад яго мураваным франтонам. Наяўнасць апсіды прэсбітэрыя і яе форма сведчаць пра першапачатковае каталіцкае паходжанне помніка.

Даволі тонкія сцены Троіцкага касцёла звонку ўмацоўвалі рытмічна размешчаныя контрфорсы пастаяннага прамавугольнага сячэння, а не ярусна-ступеньчатыя, як у гатычных помніках. У інтэр'еры ім адпавядалі двухступеньчатыя ў сячэнні ўнутраныя контрфорсы. На гэтыя канструкцыйныя вузлы перадаваўся распор вялікага цылiндрычнага скляпення з распалубкамі, без падпружных арак і нервюр. Чатыры верхнія ярусы вежы мелі ў плане аднолькавае сячэнне, але розную адвольную вышыню. Такая будова і прапорцыі ярусаў вежы рабілі яе візуальна масіўнай (верхні ярус і завяршэнне вежы перароблены ў канцы XVII ст.). Па версе сцен і ярусаў вежы праходзілі прафіляваныя карнізы. Аконныя праёмы і разгрузачныя нішы маюць паўцыркульныя арачныя завяршэнні. На ярусах вежы і франтоне прысутнічаюць круглыя вокны ў квадратных рамачных нішах. На архіўным плане збудавання адзначаны нішы-табернакулы на галоўным фасадзе. Такім чынам, гатычныя контрфорсы спалучаліся са сціплым рэнесансным дэкорам, гатычная структура аб'ёмаў — з рэнесанснай трактоўкай інтэр'ера.

На архіўным чарцяжы сячэнне вежы заштрыхавана больш шчыльна за сцены нефа. Да таго ж, на плане вежы паказаны тры вялікія, верагодна, арачныя, праёмы ўваходаў, якіх пазней не было. Ёсць падставы меркаваць, што чарцёж выкананы ў час прыбудовы вежы да касцёла, а гэта звычайна рабілася крыху пазней, пасля асадкі асноўнага будынка. Перавязка ў муроўцы паміж імі адсутнічае, што дазваляла забяспечыць правільнае размеркаванне нагрузак паміж канструкцыйна рознымі часткамі. Усе гэтыя факты сведчаць пра найбольш позні з верагодных варыянтаў час будаўніцтва мураванага храма ў Клецку — 1580-я гг. Услед за гэтым у беларускім мураваным сакральным дойлідстве пачалася эпоха барока, але яшчэ пэўны час існавалі готыка-рэнесансныя рэмінісцэнцыі.

Нягледзячы на невялікую колькасць помнікаў каталіцкага храмабудаўніцтва сярэдзіны XVI ст. і іх значныя перабудовы ў пазнейшы час, можна адзначыць пэўныя агульныя рысы рэлігійнай гісторыі і архітэктонікі познегатычных касцёлаў Беларусі. У працэсе эвалюцыі мураванага касцёльнага будаўніцтва Беларусі перыяду позняй готыкі і рэнесансу ў архітэктоніцы храмаў адбыўся пераход ад бязвежавай аднанефавай ці трохнефавай залавага тыпу (з роўнай вышынёй усіх травей) структуры з нервюрнымі гатычнымі скляпеннямі да аднавежавай аднанефавай з рэнесанснымі цыліндрычнымі скляпеннямі з распалубкамі. Агульнай рысай у гэтых тыпах збудаванняў засталася толькі адна кананічная для мясцовага каталіцкага храмабудаўніцтва апсіда прэсбітэрыя.

Амаль усе вядомыя мураваныя гатычныя каталіцкія храмы Беларусі ў сярэдзіне ці другой палове XVI ст. былі перададзены пратэстантам, якія мадэрнізавалі іх адпаведна сваім канфесійным канонам і тэндэнцыі да секулярызацыі храмабудаўніцтва. На характары перабудоў адбілася станаўленне рэнесанснага светапогляду і адпаведных архітэктурна-мастацкіх прыёмаў. Узаемазвязаная гатычная сістэма апор і скляпенняў успрымалася як архаіка і спадчына каталіцызму, таму яна мэтанакіравана знішчалася і замянялася элементамі рэнесанснай архітэктуры. Аднак пазбаўленыя контрфорсаў і ўнутраных апор, гатычныя збудаванні страчвалі канструкцыйную жорсткасць і не маглі несці важкае суцэльнае рэнесанснае скляпенне вялікага пралёта, у выніку чаго большасць з іх засталіся ў далейшым з драўлянымі бэлечнымі перакрыццямі. Гэтыя факты ўскладняюць навуковую атрыбуцыю аўтэнтычных помнікаў каталіцкага храмабудаўніцтва XV — пачатку XVI ст.

Высновы

На працягу XIII—XVI стст. у беларускім сакральным дойлідстве адбывалася інтэнсіўнае ўзаемадзеянне руска-візантыйскіх і заходнееўрапейскіх рамана-гатычных архітэктурных формаў і выпрацоўка на гэтай аснове самабытных мастацкастылістычных характарыстык мясцовага дойлідства. На першапачатковым этапе фарміравання новай дзяржаўнасці ў межах ВКЛ у праваслаўным мураваным дойлідстве Беларусі назіраецца паступовае занядбанне прафесійных будаўнічых прыёмаў, прымітывізацыя архітэктонікі крыжова-купальнага храма. Будаўніцтва ў гэты час першых мураваных касцёлаў мела спарадычны характар і несла адметную сацыяльна-канфесійную афарбоўку. Архітэктоніка найбольш ранніх аднаслуповых касцёлаў трансфармавала структуру свецкіх залавых пабудоў Заходняй і Паўночнай Еўропы.

Пранікненне ў сакральнае дойлідства ВКЛ архітэктурных формаў готыкі з выразнай мастацка-канструкцыйнай стылістыкай пача-

лося ў канцы XIV ст., разам з хрышчэннем у 1387 г. этнічнай Літвы па каталіцкаму абраду. Крыніцамі ўплыву сталі адначасова гатычныя саборы паўночнанямецкіх земляў, з якімі меліся актыўныя гандлёва-эканамічныя стасункі, а таксама гатычная і протарэнесансная архітэктура Італіі, краіны, якая з'яўлялася цэнтрам палітычнай і ідэалагічнай экспансіі каталіцызму. Менавіта ў Паўночнай Італіі ў пачатку XIII ст. быў створаны каталіцкі манаскі ордэн францысканцаў, актыўная прапаведніцкая дзейнасць якога ў хуткім часе перакінулася на краіны Цэнтральнай Еўропы, у тым ліку і Польшчу. Тут гэты жабрацкі ордэн атрымаў самастойнае адгалінаванне ордэна бернардзінцаў.

Францысканцы і бернардзінцы першымі сярод шматлікіх іншых каталіцкіх ордэнаў прыйшлі на тэрыторыю ВКЛ, дзе пабудавалі найбольш раннія і маштабныя каталіцкія саборы ў выглядзе трохнефавых протабазілік, з бязвежавым галоўным фасадам і адной моцна выцягнутай апсідай прэсбітэрыя для размяшчэння кліра (Вільня, Коўна). Звычайна першыя манастырскія касцёлы ВКЛ не мелі нартэкса, што можна патлумачыць, магчыма, цёплым кліматам Італіі і адсутнасцю неафітаў у краінах з даўнімі і трывалымі традыцыямі каталіцызму.

Развітая рамана-гатычная трохнефавая базіліка ў архітэктуры паўночнанямецкіх земляў была істотна трансфармавана: скарочана да трох мінімальных крокаў апорных слупоў ці дзевяці травей, перакрытых скляпеннямі амаль роўнай вышыні, што надавала інтэр'еру залавы характар. Азначаны архітэктанічны варыянт атрымаў пашырэнне ў будаўніцтве невялікіх парафіяльных касцёлаў ВКЛ, фундаваных мясцовымі магнатамі (Ішкалдзь, Кейданы, Іўе).

Асноўнымі прыкметамі гатычнай стылістыкі ў іх сталі рабрыстыя нервюрныя скляпенні (крыжовыя, зорчатыя, крышталёвыя), стральчатыя арачныя канструкцыі і контрфорсы, якія дазволілі зменшыць таўшчыню сцен і агульную масу перакрыццяў. З прычыны выкарыстання ў мясцовым дойлідстве ў якасці будаўнічага матэрыялу не прыроднага каменю, а буйнапамернай цэглы, класічную французскую гатычную сістэму аркбутанаў і контрфорсаў тут замянілі масіўнымі ступеньчатымі контрфорсамі, якія сталі характэрнай прыкметай беларускай готыкі.

На раннім этапе станаўлення гатычных канструкцый вуглавыя контрфорсы размяшчалі дакладна па лініі дыяганальнага рабра скляпенняў, пазней іх сталі ставіць узаемна перпендыкулярна да сцен будынка, па два на кожным вуглу, з мэтай павелічэння яго ўстойлівасці. Тыя ж канструкцыйныя функцыі выконвалі і невялікія круглыя вежы з вітымі ўсходамі, якія вялі ў паддашак храма. Яны маглі быць размешчаны на розных вуглах будынка, а гэта сведчыць, што іх размяшчэнне ў касцёльным гатычным будаўніцтве не мела пэўнага мастацка-кампазіцыйнага значэння.

Гатычныя формы і канструкцыі каталіцкіх касцёлаў аказалі вызначальны ўплыў на эвалюцыю мясцовага праваслаўнага храмабудаўніц-

тва на мяжы XV—XVI стст. Многія мураваныя праваслаўныя цэрквы амаль дакладна паўтарылі архітэктоніку і канструкцыі папярэдніх гатычных касцёлаў, але захавалі пры гэтым пэўныя рысы візантызму (Барысаглебская царква ў Навагрудку, Святадухаўская царква ў Кодне).

Больш самастойнае і творчае ўзаемадзеянне гатычных фораў з традыцыйным мясцовым дойлідствам прывяло да ўзнікнення ў агульнаеўрапейскім кантэксце унікальнага гісторыка-культурнага феномена — чатырохвежавых праваслаўных абарончых цэркваў. Акрамя адметных і не ўласцівых заходнееўрапейскай готыцы канфесійных канонаў, іх архітэктура вызначаецца развітай сістэмай фартыфікацыйных прыстасаванняў.

Удакладненне ўзаемадзеяння і эвалюцыі архітэктонікі першых мураваных касцёлаў і праваслаўных цэркваў-крэпасцей XV—XVI стст. сведчыць, што самабытная беларуская царкоўная готыка стала вынікам іманентнага зліцця ў адзінае мастацкае цэлае планавай схемы візантыйска-рускага крыжова-купальнага храма з формамі і канструкцыямі еўрапейскай готыкі, пераасэнсаваных і інтэрпрэтаваных мясцовымі майстрамі ў кантэксце этнаграфічнай сакральнай сімволікі абярэга, што бярэ пачатак з дахрысціянскіх часоў.

Першая палова XVI ст. адзначана пранікненнем у сацыяльнае жыццё ВКЛ ідэй рэфармацыі і мастацкіх матываў рэнесансу, якія паступова ўпляталіся ў канву познегатычнага храмабудаўніцтва. Гэты працэс адзначаны з'яўленнем элементаў архітэктурнага ордэра, пашырэннем у канструкцыях і дэкоры збудаванняў рэнесанснай паўцыркульнай і падвеснай аркі, адмаўленнем ад гатычных нервюрных скляпенняў і контрфорсаў на карысць цыліндрычных скляпенняў вялікага пралёта, з распалубкамі. У сярэдзіне XVI ст. адбываецца пераход да іншай архітэктанічнай структуры касцёла: аднанефавай, залавага тыпу, з больш нізкай апсідай прэсбітэрыя і адной магутнай шмат'яруснай вежай пры ўваходзе (Троіцкі касцёл у Клецку), што стварала нарастанне дынамікі кампазіцыі ў бок галоўнага фасада. Менавіта з гэтым готыка-рэнесанснym тыпам храма сакральнае дойлідства Беларусі ў канцы XVI ст. увайшло ў новую агульнаеўрапейскую культурна-гістарычную эпоху барока.

Літаратура

1. *Акты,* относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. СПб., 1851. Т. 4. 1588—1632 гг. 583 с.

2. *Античность.* Средние века // Новое время: Проблемы искусства. Сб. ст. М., 1986. 256 с.

3. *Археографический* сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при управлении Виленского учебного округа: В 14 т. Вильна, 1867—1904.

4. *Архимандрит* Модест. Супрасльский Благовещенский монастырь // Литовские епархиальные ведомости. 1864. № 3. С. 74—88; № 4. С. 108—116; № 5. С. 157—163.

5. *Архимандрит* Николай (Долматов). Супрасльский монастырь: Историко-статистическое описание. СПб., 1892.

6. *Архітэктура* Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1993.

7. *Баравы Р. В.* Невядомы помнік беларускай готыкі // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1987. № 2. С. 20—24.

8. *Бартенев И. А.* Форма и конструкция в архитектуре. Л., 1963. 293 с.

9. *Бартенев И. А., Батажкова В. Н.* Очерки истории архитектурных стилей. М., 1985. 284 с.

10. *Батюшков П. Н.* Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-Западного края. СПб., 1890. 182 с.

11. *Без-Корнилович М. О.* Исторические сведения о примечательных местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений, к ней же относящихся. СПб., 1855. 356 с.

12. *Белорусский* архив древних грамот. М., 1824. 148 с.

13. *Бобринский М.* Православные святыни Новогрудка // Виленский вестник. 1864. № 126. С. 23.

14. *Брунов Н. И.* Альбом архитектурных стилей. М., 1937.

15. *Булкин В. А.* Архитектурно-археологические работы в Полоцком Софийском соборе // Археологические открытия 1975 г. М., 1976. С. 416—417.

16. *Булкин В. А.* Проблемы изучения Полоцкого Софийского собора // Древнерусское государство и славяне. Мн., 1983. С. 113—114.

17. *Василевский В. Г.* Очерк истории города Вильны // Памятники русской старины в западных губерниях. СПб., 1872. С. 361.

18. *Васюк Г. В., Карев Д. В.* Православная церковь в Великом княжестве Литовском и Польше XIV—XVIII вв. // Наш радавод. Гродно, 1991. Кн. 3. Ч. 2. С. 203—210.

19. *Виноградов А. А.* Православные святыни г. Вильна. Вильна, 1906. 246 с.

20. *Виноградов А. А.* Супрасльский Благовещенский монастырь. Вильна, 1900. 15 с.

21. *Воронин Н. Н.* Древнее Гродно: По материалам археологических раскопок 1932—1949 гг. М., 1954. 240 с.

22. *Всеобщая* история архитектуры / Под ред. Б. П. Михайлова. М., 1958. Т. 1.

23. *Всеобщая* история архитектуры / Под ред. Б.П. Михайлова. М., 1962. Т. 2.

24. *Всеобщая* история архитектуры: В 12 т. Т. 6. Архитектура России, Украины и Белоруссии. XIV — первая половина XIX в. М., 1968. 567 с.

25. *Габрусь Т.* Архитектура Беларуси XVI в. в свете коллекции чертежей Д. М. Бернардони / Нясвіж: Гісторыя—культура—мастацтва. Варшава; Мн., 1998. С. 150—163.

26. *Габрусь Т. В.* Да гісторыі будаўніцтва касцёла Міхаіла Архангела ў Гнезна // Мат. навук. канф. «Праблемы ідэнтыфікацыі мастацкай спадчыны Нясвіжа ў агульнаеўрапейскім кантэксце культуры». Мн., 2004. С. 29—34.

27. *Габрусь Т. В.* Мураваныя харалы: Сакральная архітэктура беларускага барока. Мн., 2001.

28. *Габрусь Т.* «Першы касцёл нясвіжскі» ў кантэксце гісторыі еўрапейскай архітэктуры //Нясвіж: Гісторыя—культура—мастацтва. Варшава; Мн., 1998. С. 21—26.

29. *Габрусь Т. В.* Плоскія арачныя нішы ў мураваным дойлідстве Беларусі: Канструкцыя, мастацкая форма, сакральны сімвал // Інсітнае мастацтва Беларусі. Гісторыя: Суадносіны з народнай культурай. Сучаснасць: тэндэнцыі развіцця. Віцебск, 2003. С. 24—36.

30. *Габрусь Т.* Рэнесансная арка ў архітэктуры Беларусі: Крыніцы паходжання // Мат. навук. канф. «Матэрыяльная і духоўная культура замкаў Беларусі». Мн., 2003. С. 36—48.

31. *Габрусь Т. В.* Эвалюцыя форм і канструкцый апсід у манументальнай архітэктуры Беларусі перыяду феадалізму // Помнікі культуры: Новыя адкрыцці. Мн., 1985. С. 104—109.

32. *Габрусь Т. В., Якімовіч Ю. А.* Мураванае культавае дойлідства // Гісторыя беларускага мастацтва: У 6 т. Мн., 1987. Т. 1. С. 156—173.

33. *Ганецкая І. У.* Будаўнічыя матэрыялы // Археалогія Беларусі: У 4 т. Мн., 2001. Т. 4. Помнікі XIV—XVIII стст. С. 315—319.

34. *Гейденштейн Р.* Записки о Московской войне (1578—1582) // Издание Археологической комиссии. СПб., 1889. С. 95—101.

35. *Голубев С. Т.* Материалы для истории Западно-русской церкви. Киев, 1891. 83 с.

36. *Готика:* Архитектура. Скульптура. Живопись / Под ред. Р. Томана. Кёльн, 1998. 520 с.

37. *Гриневичюте-Янкавичене А.* Основные черты пространства и формы однонефных и зальных готических зданий Литвы // Научные труды высших учебных заведений Литовской ССР. Сер. Строительство и архитектура. Вильнюс, 1962. Т. 1. С. 235—254.

38. *Грыцкевіч А. П.* Вялікае княства Літоўскае // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1994. Т. 2. С. 389—391.

39. *Грязнов В. В.* О древних церквах Северо-Западного края // Известия VII археологического съезда. Ярославль, 1887. № 10. С. 7—10.

40. *Гуревич Ф. Д.* Древний Новогрудок: Посад — окольный город. Л.: Наука, 1983. 158 с.

41. *Дакументы* і матэрыялы па гісторыі Беларусі ў сярэднія вякі (VI—XVI стст.). Мн., 1998. 190 с.

42. *Дакументы* па архітэктуры і картаграфіі Беларусі ў архівах Санкт-Пецярбурга і Вільні. Мн., 1994. 139 с.

43. *Дзяржаўны* гістарычны архіў Літвы.

44. *Добрянский Ф. Н.* Старая и новая Вильна. Вильна, 1904. 324 с.

45. *Довгялло Д. И.* К истории православной Западно-русской церкви до половины 17 в. Вильна, 1908. 68 с.

46. *Довгялло Д. И.* Памятка о Борисоглебской церкви г. Новогрудка Минской губернии: Археологический очерк. Новогрудок, 1915. 10 с.

47. *Документы,* объединяющие историю Западно-Русского края и его отношение к России и Польше. СПб., 1868. 658 с.

48. *Дорошевич Э., Конон В.* Очерк истории эстетической мысли Белоруссии. Мн., 1972.

49. *Дюби Ж.* Европа в средние века. Смоленск, 1994.

50. *Егоров Ю. А.* Градостроительство Белоруссии. М., 1954. 282 с.

51. *Ермаловіч М.* Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае. Мн., 2000. 448 с.

52. *Живописная* Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении / Под ред. П. П. Семенова. СПб.; М., 1882. Т. 3. Литовское и Белорусское Полесье.

53. *Жлутка А.* Пункціры вялікага шляху: Спроба кароткага падсумавання гісторыі каталіцкага касцёла на Беларусі // Наша вера. 2000. № 4(14). С. 62—69.

54. *Замечательности* Северо-Западного края. Вильна, 1868. Вып. 1.

55. *Захватович Ян.* Польская архитектура. Варшава, 1967. 545 с.

56. *Збор* помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Віцебская вобласць. Мн., 1985.

57. *Збор* помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Гродзенская вобласць. Мн., 1986.

58. *Иодковский И.* Церкви, приспособленные к обороне, в Литве и Литовской Руси // Древности. М., 1915. Т. 6. С. 248—311.

59. *История* архитектуры в избранных отрывках / Сост. М. Алпатов, Д. Аркин, Н. Брунов. М., 1935.

60. *История* европейского искусствознания от античности до конца XVIII в. / Под ред. Б. Р. Виппера. М., 1963.

61. *Калядзінскі Л.* Усходнеславянскія традыцыі і заходнееўрапейскія навацыі ў матэрыяльнай культуры гарадоў Беларусі X–XVII стст. // Мат. Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларусь паміж Усходам і Захадам: Беларусіка». Мн., 1997. С. 24–26.

62. *Каргер М. К.* Раскопки церкви Бориса и Глеба в Новогрудке // Краткие сообщения Ин-та археологии АН СССР. М., 1977. Вып. 150. С. 79–85.

63. *Касьпяровіч М.* Беларуская архітэктура. Віцебск, 1925. 39 с.

64. *Кацер М. С.* Белорусская архитектура: Исторический очерк. Мн., 1956.

65. *Квитницкая Е. Д.* Малоизвестные зальные сооружения Белоруссии конца XV – начала XVI в. // Архитектурное наследство. М., 1967. № 16. С. 3–12.

66. *Квитницкая Е. Д.* Особенности средневековых храмов Белоруссии // Архитектурное наследство. М., 1975. № 23. С. 79–87.

67. *Кожин Н. А., Сидоров А. А.* Архитектура средневековья. М., 1940. 158 с.

68. *Конон В. М.* От ренессанса к классицизму: Становление эстетической мысли Белоруссии в XV–XVIII вв. Мн., 1978. 158 с.

69. *Копысский З. Ю.* Социально-экономическое и политическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в. Мн., 1992. 115 с.

70. *Копысский З. Ю.* Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в. Мн., 1966. 220 с.

71. *Круис Е., Риффенбург Б.* Соборы мира: Атлас чудес света. М., 1998.

72. *Краткое* описание Супрасльского Благовещенского монастыря. Вильна, 1885. 43 с.

73. *Краўцэвіч А. К.* Стварэнне Вялікага княства Літоўскага. Мн., 1998. 206 с.

74. *Крачковский Ю. Ф.* Православные святыни города Вильны // Труды XI Археологического съезда в Вильно в 1893 г. М., 1897. Т. 2. С. 223–250.

75. *Кузнецов А. В.* Своды и их декор. М., 1938.

76. *Кушнеревич А.* Одностолпные постройки XII–XV вв. Прибалтики и Белоруссии // Наш радавод. Гродно, 1991. Кн. 3. Ч. 3. С. 400–402.

77. *Кушнярэвіч А.* Архітэктурна-археалагічнае даследаванне Мураванкаўскай царквы //Весці АН БССР. Серыя грамад. навук. 1990. № 5. С. 64–71.

78. *Кушнярэвіч А. М.* Гатычнае сакральнае дойлідства Вялікага княства Літоўскага: Гісторыка-культурная стылістыка // Весці Бел. дзярж. пед. ун-та. 2004. № 1. С. 76–81.

79. *Кушнярэвіч А. М.* Готыка ў Беларусі // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2003. № 3. С. 67–74.

80. *Кушнярэвіч А. М.* Культавае дойлідства Беларусі XIII–XVI стст.: Гістарычнае і архітэктурна-археалагічнае даследаванне. Мн., 1993. 149 с.

81. *Кушнярэвіч А. М.* Новая канцэпцыя генезісу і эвалюцыі чатырохвежавых храмаў гістарычнай Літвы // Мат. навук. канф. «Праблемы ідэнтыфікацыі мастацкай спадчыны Нясвіжа ў агульнаеўрапейскім кантэксце культуры». Мн., 2004. С. 35–39.

82. *Лаврецкий Г.* Православное зодчество Беларуси. Мн., 1995. 99 с.

83. *Лакотка А. І.* Дойлідства // Беларусы: У 8 т. Мн., 1997. Т. 2. 391 с.

84. *Лакотка А. І.* Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры. Мн., 1999.

85. *Лаўрэцкі Г.* Казань у камені: Архітэктурная спадчына Літоўскай Русі // Праваслаўе. 2001. № 1. С. 42–53.

86. *Ле Гофф Ж.* Цивилизация средневекового Запада. М., 1992.

87. *Леонардо да Винчи.* Избранные произведения. Мн.; М., 2000. С. 435.

88. *Либман Л.* Искусство Германии XV и XVI вв. М., 1964. 244 с.

89. *Малевская М. В.* Архитектурный комплекс Новогрудского детинца XIII—XIV вв. // Мат. симпозиума, посвящ. 1500-летию Киева «Древнерусское государство и славяне». Мн., 1983. С. 122—125.

90. *Малевская М. В., Шолохова Е. Д.* Раскопки культовых сооружений Новогрудского детинца XIV—XVII вв. // Археологические открытия 1973 г. М., 1974. С. 376—377.

91. *Маломожейковская* «мурованая» церковь // Виленское Православное Свято-Духовское братство. Вильно, 1907. 18 с.

92. *Маломожейковская* церковь начала XV века в Лидском уезде Виленской губернии // Памятники русской старины в западных губерниях империи / Сост. П. Батюшков. СПб., 1874. Вып. 6. С. 127—132.

93. *Материалы* для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба: Виленская губерния / Сост. А. Корева. СПб., 1861.

94. *Материалы* для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба: Гродненская губерния / Сост. П. Бобровский. СПб., 1863.

95. *Материалы* для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба: Минская губерния / Сост. И. Зеленский. СПб., 1864.

96. *Миловидов А. И.* Церковно-строительное дело в Северо-Западном крае при графе М. Н. Муравьеве. Вильна, 1913. 51 с.

97. *Муратова К. М.* Мастера французской готики XII—XIII вв. М., 1988.

98. *Навуковая* бібліятэка Віленскага універсітэта. Аддзел рукапісаў.

99. *Нацыянальны* гістарычны архіў Беларусі.

100. *Описание* церквей и приходов Минской епархии, составленное по официально затребованным от причтов сведениям: В 9 т. Мн., 1878. 1892.

101. *Орловский Е.* Гродненская старина. Гродно, 1910. Ч. 1. Город Гродно. 244 с.

102. *Падокшын С. А.* Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі. Ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага. Мн., 1990. 285 с.

103. *Памятники* искусства Советского Союза: Белоруссия, Литва, Латвия, Эстония. М.; Лейпциг, 1986. 514 с.

104. *Подокшин С. А.* Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы (первая половина XVI — начало XVII в.). Мн., 1970. 224 с.

105. *Покровский Н. В.* Происхождение древнехристианской базилики: Церковно-археологическое исследование. СПб., 1880. 47 с.

106. *Покрышкин П. П.* Благовещенская церковь в Супрасльском монастыре // Сб. ст. Импер. археолог. комиссии. СПб., 1911. С. 222—237.

107. *Помнікі* мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння. Мн., 1994. 256 с.

108. *Ренессанс.* Барокко. Классицизм: Проблема стилей в западноевропейском искусстве XV—XVIII вв. / Под ред. Б. Р. Виппера. М., 1966. 368 с.

109. *Рогов А. И.* Фрески Супрасля // Древнерусское искусство: Монументальная живопись XI—XVII вв. Сб. ст. ВНИИ искусствознания. М., 1980. С. 343—358.

110. *Россия:* Полное географическое описание нашего отечества: Верхнее Поднепровье и Белоруссия. СПб., 1905. Т. 9.

111. *Савицкий Л.* Маломожейковская (или Мурованая) Пречистенская церковь // Литовские епархиальные ведомости. 1873. № 3. С. 297—300.

112. *Савицкий Л.* Сынковичская Михайловская церковь // Минские губернские ведомости. 1874. № 50. С. 182—184.

113. *Сапунов А. П.* Исторические судьбы Полоцкой епархии с древнейших времен до половины XIX в. Витебск, 1889.

114. *Сапунов А. П.* Полоцкий Софийский собор. Витебск, 1888.

115. *Сементовский А. М.* Старинные материалы для географии, истории и археологии России. Витебск, 1886.

116. *Скарына* і яго эпоха. Мн., 1990. 481 с.

117. *Слюнькова И. Н.* Монастыри восточной и западной традиций: Наследие архитектуры Беларуси. М., 2002. 599 с.

118. *Слюнченко В. Г.* Полоцкий Софийский собор: Историко-архитектурный очерк. Мн., 1987. 48 с.

119. *Собаль В. Е., Ткачоў М. А., Трусаў А. А., Угрыновіч У. В.* Беларуская кафля: Альбом. Мн., 1989.

120. *Соболевский И. В.* Пречистенский собор в Вильне. Вильна, 1904. 43 с.

121. *Собрание* древних грамот и актов городов Вильны, Ковна, Трок, православных монастырей, церквей и по разным предметам. Вильна, 1843. Ч. 1. 208 с.

122. *Собрание* древних грамот и актов городов Минской губернии, православных монастырей, церквей и по разным предметам. Мн., 1848.

123. *Старинные* гравированные карты и планы XV—XVIII веков // Из собрания ГМИИ им. А.С. Пушкина / Сост. Н. М. Борисовская. М., 1992.

124. *Страчаная* спадчына / Уклад. Т. В. Габрусь. Мн., 1998. 351 с.

125. *Тарасаў С. В.* Полацк IX—XVII стст.: Гісторыя і тапаграфія. Мн., 2001. 124 с.

126. *Ткачоў М. А.* Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII стст. Мн., 1978. 142 с.

127. *Ткачоў М. А.* Замкі Беларусі (XIII—XVIII стст.). Мн., 1977. 88 с.

128. *Трусаў А.* Манументальнае дойлідства Беларусі XI—XVIII стагоддзяў. Мн., 2001. 203 с.

129. *Трусов О. А.* Памятники монументального зодчества Белоруссии XI—XVII вв.: Архитектурно-археологический анализ. Мн., 1988. 160 с.

130. *Флиер А. Я.* К вопросу об архитектуре зальных православных храмов начала XVI в. в Белоруссии // Архитектурное наследство. М., 1986. Вып. 34. С. 158—165.

131. *Флиер А. Я.* Эволюция планов каменных православных храмов на территории Украины с X по середину XVII в. // Архитектурное наследство. М., 1977. № 35. С. 112—126.

132. *Францкевич В.* Краткое описание римско-католических костелов г. Вильны // Труды IX Археологического съезда в Вильне. М., 1893. Т. 2. С. 129—133.

133. *Хадыка Т. В.* Крытычны агляд літаратуры па гісторыі архітэктуры Беларусі эпохі феадалізму // Книга, библиотечное дело и библиография в Белоруссии. Мн., 1974. С. 195—209.

134. *Христианство.* Энциклопедический словарь / Под ред. С. С. Аверинцева. М., 1993—1995. Т. 1—3.

135. *Хрусцевич Г. К.* Посад Кодень и его исторические достопримечательности // Памятники русской старины в западных губерниях / Сост. П. Батюшков. СПб., 1865. Вып. 7. С. 241—258.

136. *Церашчатава В. В.* Старажытны беларускі манументальны жывапіс XI—XVIII стст. Мн., 1986. 183 с.

137. *Цэнтральная* навуковая бібліятэка НАН Украіны. Аддзел рукапісаў.

138. *Чантурия В. А.* История архитектуры Белоруссии: Дооктябрьский период. Мн., 1969. 287 с.

139. *Чантурия В. А.* Памятники архитектуры и градостроительства Белоруссии. Мн., 1986. 240 с.

140. *Шуази О.* История архитектуры. М., 1935—1937. Т. 1—2.

141. *Шчакаціхін М.* Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Мн., 1928. Т. 1. С. 220—270.

142. *Якимович Ю. А.* Зодчество Белоруссии XVI — середины XVII в. Мн., 1991.

143. *Якобсон А. Л.* Закономерности в развитии средневековой архитектуры. Л., 1985.

144. *Янкявічэне А. С.* Самабытныя рысы беларускай готыкі // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1974. № 1. С. 15—21.

145. *Ярашэвіч А. А.* Готыка ў Ішкалдзі // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1985. № 3. С. 30—31.

146. *Abramowicz W.* Strony nowogródzkie. Szkice krajoznawcze. Lida, 1938.

147. *Aleksandrowicz B.* Nove zródlo ikonograficzne do oblęzenia Polocka w 1578 r. // Kwartalnik Historii Kultury Materialnej. Warszawa, 1971. Nr. 1. S. 47—108.

148. *Architektura* gotycka w Polsce. Katałog zabytków. Warszawa, 1995. T. 2.

149. *Baliński M.* Historia miasta Wilna. Wilno, 1837.

150. *Baliński M., Lipiński T.* Starożytna Polska pod względem historycznym, geograficznym i statystycznym. Warszawa, 1886. T. 4.

151. *Brykowska M.* Sklepenia kryształowe: niektore problemy. Pózny gotyk // Materiale sesii stowarzyszenia historików sztuki. Warszawa, 1965. S. 124—132.

152. *Bulgak J.* i inny. Polska w krajobrazach i zabytkach. Warszawa, 1930. T. 2.

153. *Długosz J.* Dzieła wszystkie. Kraków, 1869. T. 4.

154. *Durczewski Z.* Stary zamek w Grodnie w swietle wykopalisk dokonanych w latach 1937—1938 // Otbitka z „Niemna". Grodno, 1939. Nr. 1. S. 1—16.

155. *Encyklopedia* Powszechna. Warszawa, 1859—1868. T. 1—27.

156. *Grudziński K.* Klasztory bernardynskie w Polsce w jej granicach historycznych // Kalwaria Zebrzdowska. Warszawa, 1985. S. 433—440.

157. *Historia* sztuki polskiej / Prace zbiorowa pod redakcją Tadeusza Dobrowolskiego i Władysława Tatarkiewicza. Kraków, 1962.

158. *Jakubowski J.* Tomasz Makowski, stycharz i kartograf nieswieszski. Warszawa, 1923.

159. *Jankiawiczene A.* Wschodni obszar wystepowienia gotyki i niektore specyficzne cechy litewskiej architektury XV—XVI w. // Kwartalnik Architektury i Urbanistyki: Teoria i Historia. Warszawa, 1974. T. 19. S. 233—242.

160. *Jankevičienė A.* Gotycka architektura sakralna Litwy i Białorusi // Lituana—Slavica Posnaniensia Studia Historift Artium. Poznań, 1992. T. V. S. 17—45.

161. *Jankevičienė A.* Lietuvos sakralne archtektūros medines. Vilnius, 1998.

162. *Jankevičienė A.* Vilniaus gotikos ansamblis. Vilnius, 1981.

163. *Jankowski Cz.* Powiał Oszmiański. Kraków, 1898. T. I—III.

164. *Jodkowski J.* Grodno. Wilno, 1923.

165. *Kirkor A.* Przechadzki po Wilnie i jego okolicach. Wilno, 1889.

166. *Kłos J.* Wilno: Przewodnik krajoznawczy. Wilno, 1929.

167. *Kochanowski W.* Pobazilianski zespół architektoniczny w Supraslu // Rocznik Białostocki. Białystok, 1963. T. 4. S. 355—395.

168. *Kraszewski J.* Wilno od początkow jego do roku 1759. Wilno, 1840. T. 2.

169. *Kunkel R.* Fundacje Aleksandra Jagiełlonczyka w Wilne i Krakówie // Sztuka okolo roku 1500 / Materiały sesji Stowarzyszenia Historykow Sztuki. Gdańsk, 1996. S. 132—138.

170. *Kunkel R.* Wielke Księstwo Litewskie // Architektura gotycka w Polsce. Warszawa, 1995. T. 2. S. 90—92.

171. *Kunkel R. M.* Późnegotycie cerkwie na zachodnich rubieżach Wielkiego Księnstwa Litewskiego // Sztuka ziem wschodnich Rzeczypospolitej XVI—XVIII w. Lublin, 2000. S. 213—218.

172. *Kurczewski J.* Biskupstwo wileńskie od jego założenia ażdo dni obecnych. Wilno, 1912.

173. *L'architetto* Gian Maria Bernardoni sj tra l'Italia ele terre dell' Europa centro-orientate. Roma MCMIC.

174. *Łopaciński E.* Materyały do dziejów rzemiosła artystycznego w Wielkiem Księnstwie Litewskiem (XV—XIX w.). Warszawa, 1946.

175. *Lorentz St.* Katedra wileńka w XIV i XV w. // Kurjer Wileński. 1934. N. 88. S. 21—24.

176. *Lorentz St.* Wycieczki po województwie Wileńskiem. Wilno, 1932.

177. *Lorentz St.* Wycieczki słonimskie: Krótki przewodnik krajoznawczy po Słonimie oraz Albertynie, Byteniu, Synkowiczach, Zdzięciole i Żyrowicach. Słonim, 1933.

178. *Łoski J.* Cerkiew zamkowa w Kodniu. Warszawa, 1857. 23 s.

179. *Łowmiański H.* Rys hystoryczny województwa nowogródzkiego. Wilno, 1935.

180. *Łoziński J., Miłobędzki A.* Atłas zabytkow architektury w Polsce. Warszawa, 1967.

181. *Łoziński J. Z.* Grobowe kaplice kopułowe w Polsce 1520—1620. Warszawa, 1973.

182. *Makowska K.* Praga—Kraków—Wilno. Współne inspiracje artystyczne: Benedikt Ried (Reit) w Wilne? // Sztuka ziem wschodnich Rzeczypospolitej XVI—XVIII w. Lublin, 2000. S. 55—74.

183. *Malachowicz E.* Śreniowieczne budowle jednofiliarowe na Śląsku // Prace Naukowe Instytutu Historii Architektuty, Sztuki i Techniki Politechniri Wrocławskiej. Wrocław, 1973. Monog. 6. Nr. 7. S. 3—27.

184. *Maliszewski Ed.* Przewodnik po gubernii Grodzoeńskiej. Zarys statystyczno-opisowy. Wilno, 1919.

185. *Mieszkowski Z.* Podstawowe problemy architektury w traktatach polskich ad połowy XVI do początku XIX wieku. Warszawa, 1970.

186. *Miłobędzki A.* Zarys dziejów architektury w Polsce. Warszawa, 1963.

187. *Miłobędzki A.* Póznegotyckie typy sakralne w architekturze ziem polskich // Pózne gotyk. Studia nad Sztuka przełomu Średniowiesza i czasow nowych / Materialy sesji Stowarzyszenia Historykow Sztuki Warszawa, 1965. S. 83—91.

188. *Morelowski M.* Studia i materjay do historyi stosunków artystycznych Polski z Zachodem, a w szczególności z ziemia Liodyjska i z Dawnemi Niderlandami. Wilno, 1935.

189. *Morelowski M.* Zarysy syntetyczne sztuki wileńskiej od gotyki do neoklasicyzmu. Wilno, 1938—1939.

190. *Morelowski M., Tochteman A.* Przewodnik turystyczny po województwie wileńskim. Cz. 1—2. Wilno, 1938—1939.

191. *Mroczko T.* Architektura gotycka na ziemi Chełmińskiej. Warszawa, 1980.

192. *Pamiatki* historyczne Wilenszyzny i Nowogrodczyzny. Wilno, 1935.

193. *Podlasek K.* Kodeń Sapiehów, jego kościoły i starozytny obraz M. B. Gwadełupskiej. Kraków, 1898.

194. *Podręczna* Encykłopedia Kocielna. T. I—XLIV. Warszawa, 1904—1914.

195. *Przeworska D.* Obronna świątynia po-bazylianska w Supraślu // Województwo Białoatockie: Przeszłość, zabytki. Białystok, 1929. S. 31—32.

196. *Remer J.* Wilno. Wilno, 1920.

197. *Rewieńska W.* Miasta i miasteczki w północno-wschodniej Polsce. Wilno, 1938.

198. *Rouba N.* Przewodnik po Litwie i Białejrusi. Wilno, 1909.

199. *Słownik* Geograficzny Królewstwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. Warszawa, 1800—1895. T. 1—14.

200. *Sokołowski M., Worobjew G., Zubrzycki J.* Kościoły i cmentarze warowne w Polsce. // Sprawozdania komisji Historii Sztuki. Kraków, 1906. T. 7. Z. 1—2. S. 483—498.

201. *Stryjkowski M.* Kronika Polska, Litewska, Żmudzka i wszystkiej Rusi. Warszawa, 1846. T. 2.

202. *Syrokomla Wł.* Niemen od źródel do ujścia. Wilno, 1861.

203. *Syrokomla Wł.* Wędrówski po moich niegdyś okolicach. Wilno, 1854.

204. *Syrokomla Wł.* Wycieczki po Litwie w premieniach od Wilna. Wilna, 1858—1860.

205. *Sztuka* około roku 1600 / Materiały Sesji Stowarzyszenia Historyków Sztuki. Warszawa, 1974.

206. *Sztuka* sakralna w Polsce: Architektura. Warszawa, 1956.

207. *Szyszko-Bohusz A.* Warowne zabytki architektury kościelnej w Polsce i na Litwie. Ptkanów, Brochów, Małomożejków, Synkowicze, Supraśl, Wilno // Sprawozdania komisji Historii Sztuki. Wilno, 1915. T. 9. S. 331—376.

208. *Tatarkiewicz Wł.* Polska architektura koscielna w dobie Odrodzenia // Zaszyty Naukowe KUL. Warszawa, 1963. VI. Nr. 4. S. 12—34.

209. *Tatarkiewicz Wł.* Typ Lubelski i typ kaliski w architekture kościelnej XVII w. // Prace Komisji Historii Sztuki. Warszawa, 1937–1938. S. 227–251.

210. *Topińska M.* Budownictwo kopucynów w Polsce w swietle Konstytucji i tradycji zakonu. // Kwartalnik architektury i urbanistyki. Warszawa, 1974. T. XIX. Z. 3. S. 191–216.

211. *Tyszkiewicz E.* Wiadomość historyczna o zgromadzeniach i fundacjach męskich i zeńskich r.-k. klasztorów w dyecezji Wileńskiej // Teka Wileńska. Wilno, 1857. Nr. 2. S. 246–273.

212. *Vilniaus* menas. Spaudos fondas. Kaune, 1940.

213. *Vilnius.* Architektura iki XX amzieus pradžios. Kaune, 1958.

214. *Ważynski A.* Litwa pod względem przesladowania w niej rzymsko-katolickiego Kościoła. Poznań, 1872.

215. *Wojciechowski J.* Kościoł jako budowla // Architektura i budownictwo. R. 3. 1927. S. 8–9.

216. *Wojciechowski J.* Stary zamek w Grodnie // Biuletyn Historii Sztuki i Kultury. Warszawa, 1938. R. 6. S. 119–270.

217. *Wolyniak* [Gużycki I.]. Wiadomosci o dominikancach prowincyi litewskiej. Kraków, 1917. T. 1.

218. *Wolyniak* [Gużycki I.]. Wykaz klasztorów dominikańskich prowincyi ruskiej. Kraków, 1923. T. 2.

219. *Zachwatowicz J.* Architektura polska do połowy XIX wieku. Warszawa, 1956.

220. *Zahorski W.* Kosciol sw. Mikolaja w Wilne. Wilno, 1906. 6 s.

221. *Zwolski B.* Wileńszczyzna, nowogródczyna i białostoczyzna za Zygmunta III. Wilno, 1938.

222. *Źmigrodzki J.* Nowogródek i okolice. Nowogródek, 1927.

223. *Вялікае* княства Літоўскае // Энцыклапедыя: У 2 т. Мн., 2005. Т. 1.

Глава 4

АБАРОНЧАЯ АРХІТЭКТУРА БЕЛАРУСІ X–XIV стст. У КАНТЭКСЦЕ СЛАВЯНСКАЙ І АГУЛЬНАЕЎРАПЕЙСКАЙ БУДАЎНІЧАЙ КУЛЬТУРЫ

(А. Н. Кулагін)




4.1. Прадмова

Вытокі замкава-крапаснога будаўніцтва на Беларусі бяруць пачатак на схіле першага тысячагоддзя славянскага свету, калі адыходзяць у мінулае аседлыя паселішчы першабытна-абшчынных гарадзішчаў і замест драўляна-земляных умацаванняў з'яўляюцца драўляныя і мураваныя цытадэлі — крэпасці і замкі — найбольш канкрэтны атрыбут станаўлення феадалізму. Да шырокага развіцця фартыфікацыйнага будаўніцтва вымушаюць феадальныя войны, неабходнасць абараняць гарады, рэзідэнцыі феадалаў, манастыры (замкі і крэпасці Францыі, Германіі, Іспаніі і іншых еўрапейскіх краін, рускія крамлі і манастыры-крэпасці).

Крэпасці і замкі былі першымі помнікамі манументальнай архітэктуры, іх будаўніцтва ў сярэдневякоўі нават перавышала культавае. Быццам жывы арганізм, яны фарміраваліся, развіваліся і пераўтвараліся на працягу ўсяго свайго існавання, не былі статычнымі збудаваннямі. У іх узвядзенні прымалі ўдзел пакаленні ўладароў і дойлідаў, у выніку чаго замкава-крапасныя комплексы нарашчваліся, быццам прыродныя крышталі. Таму кожны старажытны замак канкрэтны і індывідуальны, часам здаецца архітэктурнай какафоніяй, хаатычным нагрувашчваннем разнастайных абарончых і палацавых збудаванняў. Да гэтага яшчэ дадаюцца патрабаванні і густы, а таксама грашовыя магчымасці пакаленняў уладальнікаў. Менавіта ў гэтай галіне будаўнічай дзейнасці ў першую чаргу выкарыстоўваліся навейшыя дасягненні тэхнікі і будаўнічага мастацтва.

У будаўніцтве замкаў прымалі ўдзел цэлыя пакаленні будаўнікоў. Узводзіліся абарончыя комплексы мігруючымі па ўсёй Еўропе цэхамі «муляраў» , «дойлідаў», «градарубаў», «добрадзярэўцаў», «капачоў», «мурмейсцераў», «валмейсцераў» і іншымі — носьбітамі і распаўсюджвальнікамі дасканалага фартыфікацыйнага мастацтва.

Вялікі князь Гедымін, які пайшоў на збліжэнне з Лівоніяй і разумеў неабходнасць валодання сучасным узбраеннем і замкамі, адкрыў свабодны доступ у сваё княства ўсялякага роду рамеснікам, асабіста запрашаў каменячосаў, майстроў па пабудове балістаў, кавалёў [1. С. 265—267]. Гедымін разумеў, што спыніць наступ крыжакоў могуць толькі мураваныя замкі з моцнымі гарнізонамі. Таму, выкарыстаўшы часовае перамір'е з ордэнам, вясной 1323 г. князь разаслаў запрашэнні на работу розным рамеснікам, у тым ліку і мурарам з ганзейских (паўночна-



Мал. 156. Замак Ліда (Беларусь). Малюнак Я. Драздовіча, 1929 г.

нямецкіх) гарадоў. Ёсць меркаванне, што ганзейскія майстры прынялі непасрэдны ўдзел ва ўзвядзенні Лідскага замка. У канцы XIV ст. запрашэнне кваліфікаваных майстроў для пабудовы замкаў на Беларусі было звычайнай справай [2]. Магістраты ўважліва сачылі за тым, каб усе рамесныя цахі адбывалі ваенна-будаўнічыя павіннасці, што нязменна прадугледжвалася і іх статутамі. Натуральна, да нейкай ступені вырашальным быў удзел мясцовых майстроў у аграмаднай і інтэнсіўнай будаўнічай праграме, асабліва ў XII—XIV стст.

Сама ж праца па ўзвядзенню, аднаўленню і ўтрыманню замкаў заставалася адным з цяжкіх абавязкаў навакольнага сялянства і гараджан: капанне і чыстка равоў, узвядзенне і выпраўленне сцен, вайсковае забеспячэнне і многае іншае. У экстранных выпадках яны вызваляліся нават ад налогаў. У Францыі і Англіі сялянства акрамя сеньяральнай павіннасці несла яшчэ і дзяржаўную баршчыну ад 2 да 3 дзён, прызначаную для аднаўлення замкаў [3].

Павіннасць па ўзвядзенню, аднаўленню і рамонту замкаў была важнейшай сярод гарадскіх мяшчанскіх абавязкаў і ў Беларусі. Напрыклад, у павіннасць гараджан Давыд-Гарадка ўваходзіла будаўніцтва 55 сажняў абарончай сцяны і вежы, насыпка замкавага «копца» і ўмацаванне яго сваямі («палямі»), хварасцянымі сценкамі, падтрыманне пастаяннага ўзроўню вады ў замкавым рове. Кіраваць усім астатнім «будаваннем» замка, у тым ліку дзвюх вежаў, быў павінен замкавы дойлід Іван Буяковіч, які за сваю працу вызваляўся ад усіх павіннасцяў і атрымліваў «аклад» у памеры 5 коп літоўскіх грошаў штогод [4. С. 116].

Рэкруціраванне на цяжкія і знясільваючыя замкавыя работы праклёнам урэзалася ў народны фальклор, рэхам адгукнулася ў народных прымаўках: «Каб цябе закатавалі ў Вільню горы капаць!», «Каб ты на Крэўскі замак каменне цягаў!» [5. С. 14]. Паходжанне назвы замка «Му-

качава» на Украіне паданне выводзіць ад старажытнаславянскага слова «мука» — пакутлівай і знясільваючай была праца падымаць угору каменне для ўзвядзення цытадэлі [6]. Але ў выпадку небяспекі тыя ж сяляне знаходзілі сховішча за моцнымі сценамі крэпасці феадала, у будаўніцтва якой зрабілі свой цяжкі ўклад.

З будаўніцтвам замкаў звязаны жорсткі паганскі забабон: у фальклоры многіх народаў часта сустракаецца вобраз замураванай у сцяну дзяўчыны. Аб такой звычцы апавядаецца, напрыклад, у адной венгерскай баладзе, у якой муляры клянуцца ў тым, што

«Чья бы жена ни явилась первой —
Камнем обложим ее, замуруем
И обожжем, чтоб, скрепленная кровью,
Наша твердыня стояла вовеки» [7].

Існуе паданне аб старым рыцарскім замку ў Гансале на беразе Балтыйскага мора, у сцяне якога была замуравана дзяўчына [8]. Сведкамі падобнай сярэдневяковай лютасці могуць служыць нярэдка сустракаемыя ў муроўцы старажытных збудаванняў чалавечыя астанкі.

Што сярэдневякоўе! У сярэдзіне XIX ст. сялянская дзяўчына Фрося Лысак была жывой замуравана ў склепе палаца Дукора на Беларусі па загаду яго ўладальніка багацейшага памешчыка Асторпа. Будаўнікі беларускага замка ў Міры верылі, што яго трываласць будзе забяспечваць умураваная ў сцяну маска галавы барана. Праўда, і пачуцце прыгожага ў сярэднія вякі часам выхоўвалася вельмі своеасаблівым спосабам: феадалы-эстэты саджалі стваральнікаў уродлівых збудаванняў на ланцуг, на кол, адсякалі правую руку ці выкалывалі вочы [9].

Будаваліся замкі надзвычай хутка, да чаго прымушалі экстрэмальныя абставіны, раптоўная і вострая неабходнасць абараняцца. Замак Шастэль-Пелерын у Сірыі быў збудаваны за шэсць месяцаў, а Сагета — нават за чатыры. Асабліва хутка ўзводзіліся ордэнскія замкі Прыбалтыкі з-за агрэсіўных адносін да захопнікаў-крыжакоў на акупаваных землях. Але застаюцца ўражлівымі тэмпы будаўніцтва аграмадных замкава-крапасных комплексаў і ў адносна спрыяльных умовах. Будаўніцтва вязлізнага і складанага горнага замкавага комплексу Карлштэйн у Чэхіі было завершана ўсяго за 17 гадоў, што пры такім значным аб'ёме будаўніцтва і ва ўмовах сярэдневяковай тэхнікі з'яўляецца выключным выпадкам [10].


* * *

Трагічны лёс старажытных замкаў і крэпасцей быў прадвызначаны ўжо самой іх ваенна-абарончай функцыянальнай сутнасцю. Пасля доўгай асады ў 1362 г. крыжакі руйнуюць замак Коўна, у 1390 г. паляць Крывы замак у Вільне. Незлічоныя разбурэнні прынесла еўрапейскім замкам Стогадовая вайна 1337—1453 гг. паміж Англіяй і Францыяй. Многія з іх, пакінутыя ўладальнікамі, прыйшлі ў заняпад, іншыя былі зруйнаваны па загаду цэнтральных улад. Міжцараванне было страшэнным часам для Германіі, калі ўсталявалася «кулачнае права». Рудольф Габсбургскі (1273) асабіста выступіў супраць уладароў




Мал. 157. Рэшткі замка ў Навагрудку (Беларусь). Фота А. Кулагіна, 1987 г.

Мал. 158. Крэпасць Смаленск (Расія). Гравюра Г. Келера, 1910 г.



шматлікіх замкаў рыцараў-разбойнікаў і зруйнаваў толькі ў адной Цюрынгіі 60 такіх умацаванняў [11. С. 255]. У разгар сялянскай вайны 1524—1525 гг. у Германіі разбураны рамана-гатычны горны замак Вільдэнбург.

Самі ж ордэнскія замкі ў Прыбалтыцы таксама нямала цярпелі ад паўстанняў зняволенага насельніц-



Мал. 159. Замак Геранёны (Беларусь). Малюнак Н. Орды, 1875—1877 гг.

тва. Ахвярай народнага хвалявання ў Юр'еву ноч у 1343 г. паў ордэнскі замак-данжон XIII ст. у Пайдзе на востраве Саарэмаа (Эстонія). У якасці пакарання за паўстанне Лівонскі ордэн прымусіў астравіцян узвесці замак-кастэль Маазілін («Крэпасць раскаяння»). Грознае паўстанне эстаў у 1343—1345 гг. прымусіла лівонцаў накіраваць усе сродкі і намаганні на ўзвядзенне крэпасцей. Ва ўсёй Еўропе знішчалі працу мурароў мяцежнікі. За ўдзел у паўстанні роду Балашаў замак Паважскі Град (Чэхія) у 1698 г., як апора мяцежнікаў, быў разбураны. Такая доля спасцігла і замак саюзніка турак Эмерыка Тэкея ў Зборave (Чэхія). Падчас Жакерыі (1356—1358) сяляне-паўстанцы зруйнавалі ў Францыі звыш 100 рыцарскіх замкаў [12. С. 67].

У Францыі мноства замкаў знаці было зруйнавана ў выніку барацьбы караля з мясцовымі мяцежнымі феадаламі. Нават быў выдадзены загад: «Усякі належачы дваранам умацаваны замак ці дом, які можа пагражаць гораду Парыжу і яго акрузе, павінен быць разбураны і зрыты да аснавання» [13. С. 101]. Цвярдыня самавольства і насілля Філіпа Эльзаскага — замак у Генце — двойчы (у 1332 і 1338 гг.) пакараўся паўстаўшым парыжанам.

Тым не менш у спустошанай войнамі Еўропе захавалася дастаткова замкаў, у якіх жыва адчуваецца іх гістарычнае і архітэктурнае мінулае. Зараз уражанне аазісаў цішыні і гістарычнага супакаення выклікаюць рэшткі беларускіх замкаў у Крэве, Навагрудку, Гальшанах і інш. Адно пакаленне змянялася

другім, і толькі 600-гадовая цытадэль Тракай у Літве засталася ў сваім нязменным выглядзе. Некалькі замкавых манументаў сапраўды еўрапейскага ўзроўню ўпрыгожваюць Славакію — Браціслаўскі крэмль, замак Чорны Камень. Ужо тысячагоддзе пануючы Пражскі крэмль — рэзідэнцыя князёў, потым каралёў і епіскапаў — падзяляе і вызначае лёс Чэшскай дзяржавы. Сімваламі Старажытнай Русі паўстаюць крамлі ў Смаленску і Маскве.

* * *

Вывучэнне сярэдневяковых абарончых збудаванняў Беларусі ажыццяўляецца па трох крыніцах: археалагічных, картаграфічных і пісьмовых. Іх супастаўленне дае магчымасць у агульных рысах аднавіць характар асноўных абарончых збудаванняў краіны, шляхі развіцця іх архітэктуры і планіроўкі. Найбольш старажытныя звесткі аб умацаваннях беларускіх гарадоў і замках падаюць усходнеславянскія летапісы [14]. Больш слушныя апісанні абарончых фарпостаў прыводзяць беларуска-літоўскія, польскія і рыцарскія хронікі XI—XVI стст. [15; 16. С. 223, 228, 243; 17. С. 3, 6—7, 44, 50, 53; 18]. Першыя падрабязныя звесткі аб фартыфікацыі Верхняга замка ў Полацку ёсць у «Полацкай рэвізіі 1552 г.»: «Замок на горе высокой самородной между Двиной и Полотою рублен из дерева соснового в 5 стен городни кроме веж» [19]. Пра падзеі ў Полацкім замку апавядаюць «Запіскі» С. Герберштэйна 1579 г. У апісанні Полацка і яго ўмацаванняў ён надзвычай дакладна і падрабязна апісвае мясцовасць, згадвае два замкі і горад — Запалоцце [16]. Амаль адзіным ізаграфічным дакументам з'яўляецца малюнак С. Пахалавіцкага асады Полацка войскам Баторыя ў 1579 г., які адлюстроўвае стан абарончых ўмацаванняў Верхняга замка. Гэта непасрэдная замалёўка з натуры адлюстроўвае натуральны стан асады і ўзяцця горада каралеўскім войскам. Меўся і іншы план Полацкага замка, якім рускае войска Івана Грознага карысталася ў 1563 г. падчас захопу горада, але ён не захаваўся. Аб ім вядома з вопісу Царскага архіва, які быў складзены ў 1574—1584 гг. [20].

Ваеннай дзейнасці Тэўтонскага ордэна ў Лівоніі, пераважна апісанню войн з літоўцамі і рускімі, прысвечана Літоўская хроніка (каля 1358 г.) капелана лівонскага, правінцыяльнага магістра Германа Вартбурга [21]. Ён неаднаразова суправаджаў лівонскага магістра Арнольда Фіцінгофа (кіраваў ордэнам з 1360 па 1364 г.) і Вільгельма Фрымерсгейма (з 1364 па 1385 г.) у іх паходах на літоўскіх язычнікаў. У прыватнасці, нямецкі храніст Г. Вартбург адзначае будаўніцтва першага ордэнскага замка ў Прыбалтыцы каля 1143 г.: «Перш за ўсё трэба ведаць, што ў той час, калі ў Лівоніі панавалі яшчэ язычніцкія забабоны, па воле Божай міласэрнасці, у гавань р. Дзвіны прыбылі на караблях з таварамі купцы... Пасля з цягам часу названыя купцы заснавалі, з дазволу ліваў, самую першую царкву ў вёсцы Ікескуле. Потым па іх, ліваў, просьбах яны пабудавалі там жа замак» [21]. Па той жа хроніцы браты ордэна пасля адводу ім трэці горада Рыгі пабудавалі ў 1201 г. магут-

ны замак. Вартбург адзначае, што «магістр жа названага рыцарства Хрыстова пабудаваў пасля пакарэння ліваў і летаў некалькі замкаў, а менавіта Зегевольд, Вендэн і Ашэрадэн. Аднак ён разбурыў і знішчыў дашчэнту Кукенойс і Герцыке, у якіх тады жылі ерэтыкі (рускія — *А. К.*)» [21]. Далей Вартбург піша: «Ён жа (магістр Вольквін — *А. К.*) пакарыў эстаў і эзельцаў хрысціянскай веры і налажыў на іх даніну; ён пабудаваў таксама з каменя замак Фелін і невялікі Рэвельскі замак і ўмацаваў іх самым лепшым чынам вежамі і глыбокімі равамі» [21].

Цікавасць даследчыкаў XIX ст. (асабліва пасля паўстання 1863—1864 гг.) да сярэдневяковай беларускай абарончай будаўнічай культуры ў значнай меры насіла рамантычна-патрыятычны характар, была звязана з вандраваннямі па краю, у ходзе якіх больш увагі звярталася на маляўнічасць «сівых руін», чым на іх гістарычнае паходжанне [22]. У адносінах апошняга ішла ўпартая барацьба паміж польскай нацыяналістычнай шляхтай і расійскім царызмам за гісторыка-культурныя прыярытэты на беларускіх землях. Тым не менш у дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі з аднаго і другога бакоў былі змешчаны цікавыя матэрыялы па шэрагу яшчэ не кранутых войнамі XX ст. беларускіх замкаў [23—30]. Для вывучэння Лідскага замка шмат зрабіў беларускі гісторык Т. Нарбут.

У сярэдзіне XIX ст. абмеры і замалёўкі беларускіх замкаў выконвалі рускія вучоныя (іх матэрыялы захаваліся ў архіве Акадэміі мастацтваў у Санкт-Пецярбургу). У 1908—1910 гг. Лідскі замак вывучаў вядомы рускі рэстаўратар Пётр Пакрышкін. Ён зрабіў абмеры сцен і засняў іх (матэрыялы захоўваюцца ў архіве С.-Пецярбургскага аддзялення Інстытута археалогіі РАН). З пачатку XX ст. гісторыяй замка цікавіўся М. Шымялевіч [31].

Менавіта ў гэты час пачалося навуковае даследаванне старажытных замкаў не толькі краязнаўцамі, але і мастакамі. На мяжы XVIII—XIX стст. зрабіў замалёўкі шэрага замкаў польскі мастак Іосіф Пешка, у другой палове XIX ст. — Н. Орда, У. Дмахоўскі, В. Гразноў. Багаты гісторыка-іканаграфічны матэрыял па беларускім замкам змешчаны ў некаторых фундаментальных выданнях другой паловы XIX ст. [23—25, 32]. У канцы XIX ст. распаўсюджваюцца першыя фотаздымкі і паштоўкі з выявамі замкаў (шмат з іх захоўваецца ў рукапісным аддзеле бібліятэкі Вільнюскага універсітэта). Улетку 1929 г. Лідскі замак вывучаў беларускі мастак Язэп Драздовіч, які прысвяціў яму альбом замалёвак (заслугоўваюць увагі яго работы «Выгляд замчышча з паўднёва-заходняга боку» і «Паўночна-заходняя сцяна замка»).

У пачатку XX ст. прафесійнае даследаванне гісторыі асобных помнікаў абарончага дойлідства Беларусі праводзіць І. І. Іядкоўскі [33, 34]. Узвысілася цікавасць да замкаў Заходняй Беларусі, у час уваходжання яе ў склад Польшчы (1918—1939). Шэраг польскіх навукоўцаў (Р. Гюртлер, Е. Рэмер, Ст. Лорэнц, Ю. Вайцахоўскі, Р. Якімовіч і інш.) шмат зрабілі па даследаванню і кансервацыі асобных беларускіх замкаў [35—39]. У 1930-я гг. выходзіць

шмат польскіх выданняў па ваеннаму дойлідству Рэчы Паспалітай, сярод аўтараў якіх былі выдатныя навукоўцы О. Гедэман, М. Марэлоўскі, З. Жмігродзкі, В. Таўрагінскі, Х. Ляўмянскі [40—44]. Адначасова праводзяць даследаванні замкаў і беларускія гісторыкі і археолагі Д. І. Даўгяла, М. Адзярыха, Б. Брэжго, М. Шчакаціхін і інш. [45—49].


Пасля Вялікай Айчыннай вайны архітэктурныя вартасці замкаў зноў прыцягнулі ўвагу даследчыкаў. У гэты час даследаванню абарончага дойлідства Беларусі прысвяцілі сваю творчасць Ю. А. Ягораў, А. Я. Міцянін, У. А. Чантурыя, М. А. Ткачоў і інш. [50—54]. Апошні ў 1970 г. пачаў фундаментальнае археалагічнае даследаванне Лідскага замка, яго працягвалі археолагі А. Трусаў, А. Краўцэвіч. Археалагічнае вывучэнне абарончых канструкцый Верхняга замка ў Полацку праводзілася ў 1978 г. Ленінградскай экспедыцыяй пад кіраўніцтвам В. Булкіна і ў 1988 г. С. Тарасавым.

Для правядзення параўнальна-навуковага аналізу беларускага абарончага дойлідства ў агульнаславянскім кантэксце вельмі спрыяюць фундаментальныя публікацыі чэшскіх даследчыкаў Д. Менцловай [55] і Я. Васіліка [56], славака Э. Грушкі [57], польскага навукоўцы З. Швыхоўскага [58] і інш.

4.2. Гістарычны нарыс

Пачатак другога тысячагоддзя ад Раства Хрыстова, X—XIII стст., сталі эпохай не толькі станаўлення, але ўздыму і развіцця беларускіх і іншых усходнееўрапейскіх зямель, перыядам вялікіх падзей і змен у іх лёсе. Зніклі ў мінулае аседлыя паселішчы першабытных абшчын — гарадзішчы і селішчы. Патрыярхальная сялянская абшчына распалася, землі пераходзяць ва ўласнае карыстанне, вылучаюцца больш багатыя сяляне, нараджаюцца феадальныя адносіны. Сярэдневяковая Еўропа, як коўдра з абрэзкаў, скроена з бязлікасных феодаў, сеньяратаў, памесцяў, вялікіх і малых княстваў, маркізатаў, графстваў, герцагстваў, старостваў. У кожным з гэтых замкнёных міркоў бязмежна пануе горды і ваяўнічы сеньёр — сам сабе імператар і ваявода, суддзя і кат, профіль для ўласнай грашовай чаканкі. Рамеснікі, гараджане і сяляне ў наваколлях замка — яго падданыя, васалы, абарону якіх сеньёр бярэ на сябе.

Паміж землеўладальнікамі вядуцца няспынныя кровапралітныя міжусобіцы, прычыны якіх — палітычны сепаратызм, дынастычныя сваркі, помста, эгаізм і бязмерная прага да ўлады, алчнае імкненне да павелічэння зямельнай рэнты, да бязмежнага панавання над паддаными. Вайна стала звыклай формай жыцця сярэдневяковага грамадства. Суровы гістарычны час у сярэдневяковай Еўропе і славянскім свеце адзначаны шматлікімі жорсткімі войнамі, ваеннымі паходамі, нечаканымі і спусташальнымі набега-



Мал. 160. Замак Люцын (Латвія). Літаграфія з малюнка Н. Орды, 1875—1876 гг.

мі татар і крыжакоў, якія наводзілі жах на беларускае насельніцтва. Імі кіравала імкненне да воінскай славы і багацця, якія здабываліся на поле бітвы, імкненне пашырыць межы палітычнай магутнасці і ўплыву. Часам мэтай ваенных паходаў былі жаданне развіваць гандаль, пошук і засваенне новых гандлёвых шляхоў.

У гэтых гістарычных умовах на першы план выступаюць крэпасці, замкі, гарадскія ўмацаванні як асноўны інструмент дасягнення геапалітычных і сацыяльна-эканамічных мэт буйных феадалаў. Толькі ў Францыі ў XIII—XIV стст. налічвалася каля 50 тысяч замкаў-крэпасцей, умацаваных гарадоў і кляштараў. На Русі будаўніцтва крэпасцей пачалося ў X—XI стст. галоўным чынам з мэтай абароны насельніцтва гарадоў і жыхароў навакольных раёнаў ад набегаў качэўнікаў. У Кіеўскай Русі ў XI ст. было ўмацавана звыш 86 гарадоў.

Узнікненне ўмацаваных гарадскіх паселішчаў на Беларусі ў X—XIV стст. мела ўсходнеславянскую дынастычную аснову. Горад Давыд-Гарадок заснаваны ў пачатку XII ст. унукам Яраслава Мудрага валынскім князем Давыдам Ігаравічам, які ў 1100 г. атрымаў у валоданне Пагарынскія землі. У хроніках Вялікага княства Літоўскага XVI ст. адзначаюцца князі Іван, Юры, Дзмітры, Давыд Ігаравіч, Мітка Давыдавіч, пасля смерці якога горадам завалодаў літоўскі князь Свідрыгайла (пам. 1452). Горад Барысаў закладзены ў 1102 г. мінскім князем Барысам, сынам Усевалада. Заснаванне горада Камянца-Валынскага летапіс прыпісвае князю Уладзіміру Васількa-

вічу, які ў 1276 г. накіраваў свайго набліжанага градаруба Алексу будаваць умацаванае паселішча. Маскоўскі крэмль заснаваны ў 1156 г. князем Юрыем Даўгарукім.

Усобіцы літоўскіх князёў, частыя іх набегі на валоданні адзін аднаго і звязаныя з гэтым разбурэнні былі яшчэ адной прычынай узнікнення ў ВКЛ умацаваных замкаў [59. С. 3].

Вядомае па летапісах з 1116 г. Гродна з яго замкам адыгрывала выдатную ролю ў гісторыі заходнерускіх зямель, з'яўлялася ў XII—XIII стст. сталіцай удзельнага княства. У 1240-х гг. Гродна перашло ў валоданне літоўскіх князёў, і з сярэдзіны стагоддзя пачынаецца барацьба літоўскіх і галіцка-валынскіх князёў за валоданне горадам. Ён папераменна пераходзіў з рук у рукі. Літоўскі князь Эрдзівіл пабудаваў тут новы замак. Галіцкія князі ў 1278 г. згаварыліся з татарамі, хаця безвынікова, адабраць гэты замак. Гродзенскі замак з 1385 г. ва ўладанні літоўскага князя Вітальда. Ён, захапіўшы Брэст і ўзначальваючы войска кароннае, пры падтрымцы Скіргайлы з Літвы, Уладзіміра Кіеўскага і Карыбута Сіверскага з Расіі, узяў Гродна ў 1390 г. Вітальд, карыстаючыся паходам на Літву Конрада Валенрода, адабраў горад у наступным годзе (1391) [60]. У 1391 г. Гродна атрымаў першы «прывілей», які надаваў гараджанам шэраг «вольнасцяў», у тым ліку пазбаўленне ад земскіх павіннасцяў. Гэта садзейнічала хуткаму адраджэнню горада.

У 1382 г. Камянец з яго замкам захапіў польскі князь Януш Мазавецкі, але пасля доўгай аблогі быў вернуты назад літоўскім князем Ягайлам; у 1390 г. яму зноў давялося адбіраць замак у Вітаўта. На лёсе Лідскага замка адбілася вайна за вялікакняжацкі прастол паміж літоўскімі князямі Свідрыгайлам і Сігізмундам у 1443 г. [14. Т. 32. С. 84].

Прыцягваў увагу агрэсараў з Галіцкай зямлі і рэгіянальны цэнтр Панёмання Слонім. Дарэчы, не толькі галіцка-валынскія князі хадзілі на Слонімскую зямлю; яшчэ ў 1040 г. кіеўскі князь Яраслаў Уладзіміравіч перамог літвінаў у наваколлях Слоніма.

Князь Уладзімір Васількавіч, які валодаў Кобрынам у другой палове XIII ст., вядомы як будаўнік абарончых збудаванняў на поўначы Валынскай зямлі. У Кобрыне, хутчэй за ўсё, менавіта ў гэты час быў збудаваны першы замак.

З другога боку супраць Галіцка-Валынскага княства і за яго валоданне выступіў польскі кароль Казімір Вялікі (1310—1370), які захапіў у 1349 г. гарады-замкі Львоў, Галіч, Уладзімір-Валынскі, Бярэсце, выціснуў з Валыні Любарта Гедымінавіча. На дапамогу Любарту прыйшлі яго старэйшыя браты Кейстут і Альгерд. У выніку двух войнаў Казімір Вялікі быў вымушаны пакінуць большую частку сваіх набыткаў. У тым ліку і Кобрын, у якім да канца XIV ст. стала абасноўвацца нашчадкі Альгерда. Адзін з іх, Раман Фёдаравіч, з 1387 г. стаў афіцыйна звацца князем Кобрынскім. Князі Кобрынскія ўвекавечылі сябе будаўніцтвам замкаў і цэркваў.

Шмат разоў падвяргаліся аблогам, разбурэнням, пераходзілі з рук у рукі ў выніку войнаў паміж літоў-

скімі князямі і каралямі польскімі таксама замкі ў Камянцы, Лідзе, Віцебску і інш.

Бесперапыннымі войнамі паміж буйнымі феадаламі характарызавалася гісторыя не толькі сярэдневяковай Лівоніі (Эстоніі і Латвіі). Такая ж доля напаткоўвала еўрапейскія замкі. Кожны феадал лічыў сябе мясцовым каралём (нават чаканілі прыватныя манеты); феадалы люта змагаліся паміж сабой, агнём і мячом спусташаючы землі і руйнуючы замак ворага [61. С. 89]. У час рэканкісты (XI—XIII стст.) у Іспаніі ўзнікла шмат вайсковых замкаў, якія адрозніваліся ад еўрапейскіх феадальных замкаў гэтага часу. Але ніводная еўрапейская краіна не можа параўнацца па інтэнсіўнасці і размаху крапаснога будаўніцтва з Партугаліяй, якая ў той час была вымушана весці барацьбу на два фронты — супраць маўраў і іспанцаў.

Шмат замкаў узнікае ў Францыі і Англіі падчас Стогадовай вайны (1337—1453). У 1135—1154 гг. вайсковыя людзі ў Англіі выйшлі з каралеўскага падпарадкавання, сталі рабаваць і ствараць наезды на мірнае насельніцтва. Сучаснік паведамляў, што спачатку прымусілі «нясчасны народ будаваць замкі, а калі скончылася будаўніцтва, замкі напаўняліся д'ябламі і ліхімі людзьмі. І цягнулі туды ўсіх, у каго падазравалі якое-небудзь багацце...» [62. С. 161] Кароль Стэфан быў вымушаны разбурыць «незаконнанароджаныя» замкі рабаўнікоў [61. С. 91]. У другой палове XV ст. у Англіі палыхае грамадзянская вайна Пунсовай і Белай руж за каралеўскі трон. У выніку з масавым знішчэннем старой феадальнай знаці цярпелі і замкі, на якія ўскладаўся цяжар няспынных феадальных войнаў.

* * *

Верагодна, ёсць рацыя, як і ў Еўропе [58. С. 9], звязваць з'яўленне на Беларусі феадальных замкаў з прыняццем хрысціянства і неабходнасцю ў гэтай сувязі абараняцца ад «паганцаў» ці, наадварот, для іх хрысціянізацыі. Пад гэтым ідэалагічным прыкрыццём на працягу XIII—XIV стст. крываваць коп'і рыцары нямецкіх ордэнаў з жаўнерамі Вялікага княства Літоўскага.

Рэлігійныя, а па-сутнасці ваенна-каланізацыйныя крыжовыя паходы заходнееўрапейскіх феадалаўрыцараў у краіны Усходняга Сярэднеземнамор'я і на землі заходніх славян даюць моцны штуршок будаўніцтву замкаў у XI—XIV стст. [62, 63]. Захліснуўшыя Еўропу рэлігійныя войны абумоўліваюць узнікненне замкавых аплотаў веры. Замак Кунеціцка-Гара (Чэхія) узвялі на базальтавым халме гусіты, ацаніўшыя такі важны стратэгічны пункт: адсюль яны маглі авалодаць не толькі Пардубіцамі, але і горадам Градзец Кралове. Замак Ліелстраўне (Латвія) заснаваў рыжскі архіепіскап у XIII ст. Замак Бзовік (Чэхія) — кляштарны прыстанак, Кромержыж і Нітра — рэзідэнцыі епіскапаў. Тапольчыанкі — чэшскі замак, пабудаваны пасля 1660 г. Іржы Ракошы, членам сям'і кальвінскіх мяцежнікаў, той самай сям'і, якая ўпершыню ўзрушыла асновы габсбургскай манархіі.

Ваенныя ордэны манаствуючых рыцараў ужо да канца XI ст. дасягнулі пануючага становішча на Блізкім Усходзе, у Палесціне і Сірыі. Вырашальнае значэнне ў гэтым, натуральна, мелі вялізныя ордэнскія замкі, асабліва гаспітальераў (іанітаў) і храмоўнікаў (тампліераў). Крыжакі пабудавалі ці перабудавалі каля двухсот крэпасцей і замкаў на параўнальна невялікай тэрыторыі — уздоўж вузкай шасцісоткіламетровай паласы ўсходняга берага Сярэдняземнага мора. Адначасова і на еўрапейскім кантыненце з'яўляецца арабскае фартыфікацыйнае мастацтва (арабскія крэпасці ў Андоры: Энкамп, Ардзіна, Сан-Хулія-дэ-Лорыя).


Калі ў 1291 г. крыжакі былі канчаткова выгнаны з Палесціны, германскія рыцарскія ордэны хутка дасягнулі пануючага становішча ў Еўропе; нямецкая рыцарская алігархія заняла ключавыя пазіцыі ў эканоміцы і палітыцы еўрапейскіх краін. Дзякуючы гэтаму ў руках ордэнскіх улад, гарадскога патрыцыяту, духавенства і рыцараў-васалаў накапіліся значныя матэрыяльныя рэсурсы, што дазваляла разгарнуць вялікае замкавае будаўніцтва. Пасля пераводу ордэна з Палесціны ў Прусію памяць аб Святой зямлі захавалася ў назвах мясцовых ордэнскіх замкаў, якім крыжакі давалі сірыйскія і палесцінскія назвы — Кёнігзберг (каралеўскія горы), Кульма (вяршыня) і інш. Натуральна, што ў такіх умовах замкі ордэнаў былі лепшымі з абарончых збудаванняў свайго часу.

Канец XII—XIV ст. для Усходняй Еўропы — гэта час надзвычай складаны. Ордэны крыжакоў пачалі захопніцкія войны супраць язычніцкіх балцкіх плямёнаў: эстаў, ліваў, латгалаў [62. С. 148]. У пачатку XIII ст. нямецкія і дацкія феадалы пад сцягам «крыжовых паходаў» уварваліся ў Прыбалтыку. Ордэнам мечаносцаў у 1208 г. скарыліся лівы і латгалы, у 1219 г. дацкі кароль Вальдэмар II захапіў зямлю эстаў.

Крыжаносцам неабходна было ўтрымаць захопленыя землі, і яны ўзвялі тут ордэнскія замкі, агульная колькасць якіх дайшла да 150. У Эстоніі з 46 замкаў 17 былі ордэнскімі. Паколькі землі былі захоплены ў крывавай барацьбе з карэнным насельніцтвам, збудаванне надзейных апорных пунктаў стала для захопнікаў справай першай неабходнасці. У 1224 быў пабудаваны замак Вільяндзі (Эстонія), у 1226 г. — Фогельзанк (Прусія).

Г. Вартбург адзначае: «У лета Гасподне 1240 г., замяшчаючы пасаду магістра, брат Дзітрых Гранінгенскі пакарыў зноў Курляндыю, пабудаваў у ёй два замкі: Гольдзінген і Амбатэн (1245 — *А. К.*)» [21]. У 1382 г. ордэн захапіў частку Жамойціі да р. Дубісы, а ў 1398 г. — землі да р. Нявежыс і стаў будаваць тут крэпасці [63. С. 10]. Латгалы і эсты, Аўкштайтыя і Жамойція страцілі свабоду. На працягу XIII—XIV стст. толькі ў Жамойціі было пабудавана звыш 40 замкаў, сярод якіх буйнейшы — у Каўнасе.

У XIII ст. настала чарга і ўсходнім славянам абараняцца ад крыжакоў, асабліва ад Тэўтонскага ордэна, які пашырыў сваю агрэсію і супраць ВКЛ (так званая Вялікая вайна 1409—1411 гг. паміж Тэўтонскім ор-




Мал. 161. Замак Навагрудак (Беларусь). Малюнак І. Пешкі, пачатак XIX ст.

дэнам, Польскім каралеўствам і Вялікім княствам Літоўскім [63. С. 8]).

Каб супрацьстаяць экспансіі Тэўтонскага ордэна крыжаносцаў вялікі князь Гедымін на галоўных напрамках рыцарскай агрэсіі на Усход фарміруе магутны абарончы «мураваны пояс» з замкаў у Лідзе, Навагрудку, Крэве, Гродна, Вільні, Троках і іншых месцах [64]. Асабліва многа абарончых збудаванняў знаходзілася на землях заходняй часткі Беларусі, стаўшых арэнай жорсткіх бітваў і заслонай ад крыжацкай агрэсіі. Так у 1370-х гг. нападам рыцараў-крыжакоў супрацьстаіць замак-данжон у Камянцы, калі ў 1375, 1378 і 1379 гг. атрад рыцараў на чале з комтурам з Бальгі Тэадорам фон Эльснерам рабаваў горад [15. Т. 2. С. 726—765]. Да таго часу на тэрыторыі сучаснай Беларусі праз кожныя 30—50 км былі ўзведзены абарончыя замкі. Амаль усе яны былі прыватнымі ўладаннямі мясцовых арыстакратаў, а тры замкі належалі казне. Дарэчы, у Маскоўскай дзяржаве ў той час не дазвалялася мець замкі ва ўласнай маёмасці. Каб зачыніць рыцарам шлях у глыб, князь Гедымін у 1323 г. загадаў закласці ў Лідзе мураваны замак. Ключом да гэтых земляў з'яўляўся замак у Гродна, авалодаць якім крыжакі імкнуліся пастаянна.


Авалодваючы літоўскімі вёскамі і гарадамі, рыцары дзейнічалі з выключнай цынічнасцю. У 1369 г. яны пабудавалі на захопленай імі літоўскай тэрыторыі крэпасць Готэсвердэр. Літоўскі князь Альгерд, спытаўшы ў тэўтонскага гросмайстра, па якому праву ён будуе крэпасць на зямлі, якая яму не належыць, атрымаў адказ: «Па праву моцнага» [63.



Мал. 162. Крэпасці Полацкай зямлі (зверху ўніз): Казьяны, Сітна, Красная, Туроўля, Суша і Сокал. Малюнкі С. Пахалавіцкага. XVI ст.

С. 18]. Далей у адказе адзначалася, што калі літоўскаму князю гэта не падабаецца, так няхай прыйдзе і паспрабуе разбурыць пабудаванае. Князь Альгерд асадзіў Готэсвердэр і захапіў яго прыступам; нямецкі гарнізон быў знішчаны, а крэпасць разбурана [63. С. 18].

Асабліва цярпелі ад крыжакоў землі Гродзеншчыны і Навагрудчы-




Мал. 163. Замак Лішкаў (Літва). Літаграфія з малюнка Н. Орды, 1861—1867 гг.

ны. Гродна адным з першых падвяргаецца жорсткім нападам: у 1283—1284 гг. вялікае рыцарскае войска пад началам магістра Конрада Цірнберга акупіравала Гродна і спустошыла наваколлі, гэта паўтарылася ў 1295 і 1296 гг. [66. С. 223, 269]. Гродна цярпела ад крыжацкай навалы ў 1306, 1311—1312, 1314 (магістр В. фон Орселен), 1328, 1364 (фон Ханаў), 1373, 1377, 1379, 1393 гг. [1. С. 414]. У гэтыя гады войска магістра Конрада Зака «з агнём і мячом» прайшлося па Гродзеншчыне, спаліла пасад Гродна, але не адолела замак [15. С. 344, 346; 66. С. 223, 261, 266, 267, 292, 308, 322, 349]. Пераходзячы з рук у рукі, горад з замкам, размешчаным на мяжы зямель Тэўтонскага ордэна, шматразова разбураўся ўшчэнт. Але замак хутка адраджаўся, чаму садзейнічала яго важнае стратэгічнае становішча ў Панямонні.

Здаваліся замкі часам і без бою: наёмны гарнізон Навагрудскага замка у 1660 г. здаў замак войскам князя А. І. Хаванскага з-за несвоечасовай выплаты польскім каралём жалавання. Часам непрыступнасць замкаў пасавала перад прамым здрадніцтвам. У 1284 г. абаронцы замка Гродна паспяхова адбівалі штурм тэўтонскіх рыцараў. Аднак дзякуючы здрадзе двух братоў — выхадцаў з Прусіі, замак быў захоплены і зруйнаваны. Узімку ж 1296 г. замак зноў асадзіў атрад тэўтонцаў на чале з камендантам г. Бальгі Зігфрыдам Райбергам. Замак выстаяў, але наваколле было спалена, загінула шмат гараджан, 200 чалавек захоплена ў палон, верагодна, загінуў пад сценамі замка і Райберг. Не здолелі авалодаць замкам крыжакі і ў 1305, 1306, 1311 гг. У лютым—сакавіку 1364 г. нямецкі граф фон Ханаў павёў з Лівоніі войска, у якім было 40 князёў з розных краін Еўропы. Нават англійскія рыцары пераправіліся цераз Ла-Манш. Ад-



Мал. 164. Замак Любча (Беларусь). Малюнак І. Пешкі, пачатак XIX ст.



Мал. 165. Замак Янавічы (Польшча). Літаграфія з малюнка Н. Орды, 1870-я гг.

нак замак выстаяў, і, вымяшчаючы бяссільную ярасць, войска прышэльцаў, як паведамляе храніст, «бесчеловечно опустошило окрестности Гродно, уведя многих людей в неволю». Спусташальны паход быў паўтораны ў жніўні 1373 г. Аднак у 1375 г. войска прэфекта Ратэнлурга герцага Альберта фон Заксена сустрэла моцнае супраціўленне гараджан — шмат рыцараў загінула, частка на чале з герцагам апынулася ў палоне, астатнія кінуліся ва ўцёкі. Яшчэ двойчы (у 1377 і 1379 гг.) прускія крыжакі з удзелам 2000 аўстрыйскіх і іншых еўрапейскіх рыцараў беспаспяхова штурмавалі сцены Гродзенскага замка.

Але быў перыяд (з 1299 да 1328 г.), калі крыжакі не толькі не адважваліся наблізіцца да сцен Гродзенскага замка, але былі вымушаны самі не раз абараняцца ад наступленняў гродзенскай дружыны пад камандаваннем кашталяна замка Давыда Даўмонтавіча, які ўвайшоў у гісторыю пад імем Давыда Гарадзенскага. Князь Давыд праславіўся як мужны абаронца не толькі Гродзенскага замка, але Навагрудка і Пскова, як граза прускіх, лівонскіх, дацкіх і нямецкіх крыжакоў. Ашаламляльнае паражэнне крыжакоў пад Навагрудскім замкам (1314) надоўга адбіла ў іх жаданне сустракацца з князем Давыдам на ваеннай сцежцы. Толькі пасля смерці Давыда (1326) ад здрадніцкага ўдару кінжалам у спіну, у 1328 г. вялікае войска крыжакоў, карыстаючыся падманным адцягваючым манёўрам, абрынулася сіламі на замак, захапіла, абрабавала і спаліла яго.

У 1362 г. крыжакі разбурылі магутны замак у Коўне. У 1384 г. пасля працяглай аблогі і штурму крыжакі ўзялі Лідскі замак і часткова яго разбурылі [50. С. 24—25]. У 1392 г. атрады рыцараў на чале з камандорамі Янам Румпенгаймам, Конрадам Ліхтэнштэйнскім і Вітаўтам, а таксама англійскія рыцары на чале з графам П. Нортумберлендскім зноў напалі на Ліду [67. С. 485]. Такі ж напад нямецкіх рыцараў на чале з графам Ляйнінгенам, англійскіх на чале з графам Бэдфордам і атрадам французаў быў паўтораны ў 1394 г. [68].

У ВКЛ, на тэрыторыі сучаснай Беларусі, казне належалі Лідскі, Крэўскі і Навагрудскі замкі. Яны выбудоўвалі свайго роду муравaную мяжу княства. Адным з такіх буйнейшых абарончых фарпостаў таксама было Гродна, першыя звесткі аб якім як аб сталіцы ўдзельнага княства знаходзяцца ў рускім летапісе 1128 г. Узвёўшы магутныя замкі, беларуска-літоўскае войска ў сваю чаргу набыло здольнасць рабіць сумесныя паходы ў адказ (1306, 1311 і 1315 гг.) [66. С. 200—213].

Абапіраючыся на свае абарончыя збудаванні і замкі, беларускае і прыбалтыйскае насельніцтва вяло больш чым 120-гадовую барацьбу за незалежнасць супраць нямецка-рыцарскай навалы. Узброенае насельніцтва Беларусі і Літвы на працягу 1283—1340 гг. адбівала націск рыцараў у напрамку Жамойціі і Чорнай Русі. Беларуска-прыбалтыйскія замкі і крэпасці ўнеслі значны ўклад у агульную справу вызваленчай барацьбы народаў Усходняй Еўропы супраць агрэсіі рыцараў-крыжакоў.


Да канца XIV ст. наступіў перыяд зацішша, а пасля паражэння тэўтонцаў у Грунвальдскай бітве (1410) ад аб'яднаных ваенных сіл беларусаў, літоўцаў, рускіх, палякаў, украінцаў, тыя ўжо не здолелі падняцца. [63. С. 3].

* * *

Для беларускай зямлі XIII ст. было неспакойным і бурным не толькі з-за крыжацкіх нападаў, але і з-за пагрозы татара-мангольскай навалы.

Многія гарады Беларусі не зведалі спусташальных рэйдаў татара-мангольскіх войскаў дзякуючы сістэме замкава-крапасных збудаванняў [73]. У той жа час у Старажытнарускай дзяржаве татарскае іга амаль да канца XIII ст. (1240—1290-я) спыніла развіццё замкавакрапаснога будаўніцтва (у 1237 г. мангола-татары разбурылі Маскоўскі крэмль), а на паграніччы са Швецыяй, Літвой і валоданнямі Тэўтонскага і Лівонскага ордэнаў будаваліся толькі асобныя драўляныя крэпасці (Пскоў, Ноўгарад). Рыхтуючыся да вырашальнай барацьбы з татарамі, Дзмітрый Данской у 1367 г. загадаў пабудаваць белакаменныя сцены і вежы Маскоўскага крамля. Пасля перамогі ў Кулікоўскай бітве і вызвалення Русі ад татарскага іга ў камяні пачалі ўзводзіць і крапасныя сцены.

Беларускія замкі перш-наперш з'яўляліся першачарговымі аб'ектамі татарскіх набегаў. Асабліва спусташальнымі былі напады крымскіх татар у другой палове XV — першай палове XVI ст. Напрыклад, у 1497 г. яны спустошылі Мазыршчыну, у



Мал. 166. Замак Магілёў (Беларусь). Малюнак І. Пешкі, пачатак XIX ст.

1500 г. спалілі Брэст і Камянец, у 1502 г. ваявалі на Тураўшчыне, у 1503 г. — у наваколлях Слуцка, Клецка, Капыля і Нясвіжа. У 1503 г. 3-тысячная татарская арда дайшла да Навагрудка, у 1505 г. спалены Мінск і іншыя беларускія гарады. Асобныя татарскія атрады даходзілі да Віцебска і Полацка, з якіх захопнікі забралі ў палон каля 100 тысяч жыхароў. Толькі з 30-х гг. XVI ст. спынілася татарская навала на беларускую зямлю.

* * *

Як сімвалы валадарніцтва, дабрабыту і незалежнасці паўсюдна на еўрапейскім і славянскім абшары паўстаюць умацаваныя прыватнаўласніцкія жылішчы феадалаў — замкі. За сценамі непрыступнай фартэцыі феадал меў асабістую адміністрацыю, суд, турму, вайсковы гарнізон, якія выкарыстоўваў дзеля ўтрымання ў паслушэнстве і пакорнасці залежнае насельніцтва, вайсковага прэсінгу і сустрашэння такіх жа, як ён, ваяўнічых суседзяў.

Узводзячы магутную рэзідэнцыю ў Міры, прадстаўнік старажытнага беларускага роду Юры Ільініч перш за ўсё пячэцца аб атрыманні прэсціжнага тытула, але ў 1520 г. памірае, так і не дачакаўшыся ажыццяўлення жаданай мары. Вось розніца жыцця каменя і чалавека — складзены ў архітэктурны манумент, ён кароткатэрмінова цешыць славалюбства вяльможы, але застаючыся ў стагоддзях — уваходзіць ў свядомасць цэлых пакаленняў, народаў.

Замкі і крэпасці ўжо да сярэдзіны XIII ст. з'яўляліся не толькі абарончымі фарпостамі, але і важнейшымі грамадска-палітычнымі, эканамічнымі і рэлігійнымі цэнтрамі дзяржавы. У Крэўскім замку ў 1385 г. была падпісана Крэўская унія — дзяржаўна-прававы саюз, з якога пачалося збліжэнне Вялікага княства Літоўскага з Польшчай і стварэнне новай дзяржавы — Рэчы Паспалітай. У анатацыі да малюнка Гродна і яго замка, зробленага Г. Адэльгаузерам у 1567 г., а ў наступным годзе гравіраваным нюрбержцам М. Цюндтам, гаварылася, што ў Гродна ў час сейма прыбылі розныя замежныя пасольствы, сярод якіх рускае, якое складалася з 1200 чалавек. У 1568 г. лідская шляхта прасіла караля Сігізмунда-Аўгуста, «абы суды земскія ў... павеце Лідскім отправованы былі ў замку, а не па корчмам на месце». Як ваенна-адміністрацыйны цэнтр Лівонскага ордэна ў сярэдзіне XIV ст. узводзіцца замак Курэсаарэ ў Эстоніі.

Замкам надавалася вялікае значэнне. Па ваенных законах сярэднявечча захоп сталічнага замка азначаў перамогу над усёй краінай, княжацкага ці графскага — над памесцем [74. С. 6]. Таму замкі як суб'екты дзяржаўнай значнасці з'яўляліся аб'ектамі лёсавызначальных ваенна-палітычных падзей, прыстанкам для ўцекачоў і дысідэнтаў. У другой палове XVI ст. Крэўскі замак прытуліў беглага рускага князя Андрэя Курбскага [74, 76]; у замку Трокі на Літве хаваўся правадыр татарскай Арды, у Лідскім замку — хан Тахтамыш (з 1396 па 1399 гг.) і хан Даўлет Хаджы-Гірэй (з 1434 па 1443 гг.). Зламеснае адценне замкам надаюць каварныя і жорсткія дзеянні, што адбываліся ў іх падзямеллях. У 1382 г.

у змрочных сутарэннях Крэўскага замка па загаду Ягайлы вераломна быў задушаны яго дзядька — князь Кейстут — асноўны прэтэндэнт на вялікакняжацкі прастол [65. С. 236]. Вядома паданне аб князёўне Тараканавай — таямнічай «Чорнай даме», заточанай у падзямеллі Нясвіжскага замка.


Замкі ахоўвалі і зачынялі камунікацыйныя шляхі, напрыклад, французскі замак Самюр узведзены ў XII ст. як фарпост для кантроля над стратэгічнай дарогай у гарады Тур і Пуацье. Невялікі замак ў Кондзе ў Латарынгіі пабудаваны пры пераправе. Каб уявіць ролю прырэчных замкаў, дастаткова нагадаць задушэнне паўстання «жакаў» у Парыжы, калі з дапамогай гэтых збудаванняў, размешчаных па рэках Сене, Марна і Уаза, быў перакрыты завоз прадуктаў у сталіцу [13. С. 98; 12. С. 74]. Каб стаць гаспадаром усіх гандлёвых шляхоў ад Парыжа да Арлеана і ад Этампа да Шартра французскі кароль Людовік VI (1108—1137) быў вымушаны весці працяглую барацьбу з феадальнымі замкамі на гэтых накірунках [77. С. 105].

Раннія ўмацаваныя гарады на Беларусі ўзнікаюць на асноўных гандлёвых шляхах і стратэгічных накірунках. Напрыклад, Дуброўна — на дарозе з Оршы ў Смаленск, пры гэтым каля замка сфарміравалася гандлёвая плошча. Як стратэгічны пункт на перакрыжаванні гандлёвых шляхоў ставіцца замак-данжон Камянец. Размяшчэнне ўмацаванай крэпасці ў Бабруйску на важнай воднай артэрыі р. Бярэзіне — важкім гандлёвым шляху — адкрывала дарогу на поўдні ў Кіеў, на поўначы (праз сістэму волакаў і азёр) — у Заходнюю Дзвіну і Балтыйскае мора. Тут жа, каля замка, дзейнічала пераправа цераз Бярэзіну.

У стомленай феадальнымі міжусобіцамі Еўропе, якая ішла да цэнтралізацыі, фартыфікацыі становяцца будаўнічай ініцыятывай хутчэй дзяржаў і гарадоў, чым феадалаў. У гэты час ствараюцца нацыянальныя дзяржавы, дзе змяняючая феадальную анархію абсалютная манархія выступае кансалідуючым цэнтрам нацыянальнага адзінства. Новыя замкі ўвасабляюць сабой магутнасць каралеўскай улады, якая супрацьпастаўляла сябе насіллю феадальнай анархіі.

Асобную групу складаюць пагранічныя крэпасці, традыцыя ўзвядзення якіх бярэ пачатак у глыбокай старажытнасці ў Старажытным Егіпце, Асірыі, Вавілоне, Персіі, Старажытным Рыме і інш. У сярэдневякоўі ўзводзіліся замкі як пагранічныя фарпосты звычайна ў аддаленні адзін ад другога ў межах 10 км: людзі сеньёра маглі лёгка і хутка ў іх сабрацца, выступіць на мяжу ўладання. «Камянецкі стоўп» і Брэсцкі замак узніклі ў другой палове XIII ст. як пагранічныя апорныя пункты валынскага князя Уладзіміра Васількавіча супраць літоўскага князя Трайдэна [5. С. 6].

Значную ролю выконвалі беларускія крэпасці ў парубежным рэгіёне са Старажытнай Руссю. Захаваныя дагэтуль на Полаччыне сляды былых замкаў даюць падставу сцвярджаць, што на прасторы паўночна-ўсходняй Беларусі ў свой час існавала да 25 паасобных ваенных умацаваных паселішчаў, сярод якіх былі



Мал. 167. Замак Каралін (Беларусь). Літаграфія з малюнка Н. Орды, 1868 г.

Варонецкі, Полацкі, Сітнаўскі, Тураўлянскі, Гомельскі і інш. Значная іх колькасць тлумачыцца тым, што Полаччына ляжала на перакрыжаванні тэрытарыяльных інтарэсаў Маскоўскай дзяржавы і Рэчы Паспалітай. Паказальна ў гэтым плане крэпасць Варонеч. Полаччына была заваявана Іванам Грозным, а Варонеч лічыўся пскоўскім прыгарадам. У 1581 г. Стэфан Баторый адваяваў яго, але пры падпісанні міру ён застаўся за Масквой. У час самазванцаў Варонеч зноў увайшоў у склад Беларуска-Літоўскага гаспадарства і праіснаваў да другой паловы XVII ст.

Феадал старанна межаваў свае ўладанні мытнымі заставамі, на якіх купцоў бязлітасна абіралі гандлёвай, мастовай, паромнай, дарожнай і іншымі мытамі. За права «мыто брати с купцоў» вялася сапраўдная барацьба. Нямецкія замкі Латгаліі цалкам кантралявалі аптовы і заморскі гандаль. Быццам турнікет стаяў замак Будацін (Славакія) каля моста цераз раку Ваг, прапускаючы толькі тых гандляроў, якія цешылі машну мадзьярскага мытніка звонам грошаў. У ніжнім цячэнні Віслы ў Польшчы Тэўтонскі ордэн праз замак у Таруні (XIII—XIV стст.) браў аграмадныя пошліны з тавараў, якія сплаўляліся па рацэ, і ўзбагачаўся за кошт польскага вывазу [62. С. 254]. На скрыжаванні гандлёвых дарог стаяў і Камянецкі замак у Беларусі.

* * *

У сярэднявеччы замкі былі асяродкамі актыўнага дзяржаўнага ваенна-палітычнага, культурнага і гаспадарчага жыцця. За сценамі за-

мкаў кіпелі гарачыя пачуцці і бурлівыя палітычныя баталіі, рыцарскія турніры і раскошныя банкетаванні.

Паэтычна ажыўленыя літаратурныя творы пераносяць нас у часы няспынных ваенных штурмаў замкаў. Для таго каб авалодаць феадальнай цытадэллю, асаджаючыя выкарыстоўвалі тараны, сценабітныя машыны, асобныя машыны для кідання коп'яў, камянёў і зажыгальных снарадаў, эскаладу — штурм з дапамогай прыстаўных лесвіц. Перад асадай замка захопнікі імкнуліся перш за ўсё засыпаць роў: кідалі туды каменне і зямлю. Потым пачыналі разбураць сцяну: на асобных слупах падвешвалі аграмаднае тоўстае бервяно з жалезным наканечнікам і, раскачваючы яго, білі ў сцяну. Часам гэты снарад-таран ставілі на колы і прыкатвалі да сцяны. Узводзіліся спецыяльныя драўляныя, пастаўленыя на колы вежы («гуляй-горад»), роўныя па вышыні абарончым сценам. На іх верхнім ярусе ствараліся высоўныя масты-пераходы. [78. С. 40]. Прысунутыя да сцен замка, яны давалі магчымасць перабрацца на яго сцены па перакідному мастку і такім шляхам уварвацца ўнутр цытадэлі. З пераходам да актыўнай абароны на сценах і вежах з'яўляюцца машыкулі — выступы з брустверам і адтулінамі ўнізе для навясной стральбы з лукаў і арбалетаў, а пазней — і з лёгкай агнястрэльнай зброі, кідання на галовы ворага камянёў, ліцця вару. Аднак захапіць замак прыступам пры тагачасным узроўні ваеннага майстэрства было вельмі цяжка, таму, як правіла, прыбягалі да шматмесячнай аблогі, разлічваючы на канец сіл і прыпасаў у абаронцаў.

Гістарычныя і літаратурныя крыніцы сведчаць, што тэрыторыя Вялікага княства Літоўскага ў сярэднявеччы арганічна ўваходзіла ў арэал распаўсюджання агульнаеўрапейскай рыцарскай культуры, гадаванай ў асяроддзі феадальных замкаў. Рыцар быў абаронцам не толькі прыгожай дамы, але і свайго горада, які ўспрымаўся як сімвал краіны, дзяржавы. Таму на кафлі і гарадскіх пячатках таго часу мы бачым пешага ці коннага рыцара на фоне горада (кафля з Магілёва).

Рыцарская ідэя знайшла ўвасабленне перш за ўсё ў сістэме рыцарскага выхавання. Менавіта ў ёй мы знаходзім адлюстраванне кодэкса рыцарскай годнасці. Як вядома, адметная рыса гэтага кодэкса — культ зброі. Таму вобраз рыцара асацыіруецца не толькі з латамі, шаломам, шчытом, але і з мячом. Нездарма менавіта ён ёсць галоўны атрыбут пасвячэння ў рыцары. На нашай кафлі XVI—XVII ст. таксама бачым не проста выяву рыцара са зброяй, а рыцара, які ваяўніча ўздымае яе, дэманструе меч сваім сябрам і ворагам. Унікальная кафля знойдзена на летапіснай Менцы. На ёй паказана цэлае наша двухрадавае рыцарскае войска, узброенае дзідамі, якое пад кіраўніцтвам конных рыцараў ідзе ў паход, калі верыць надпісу, «к великому Новугороду». У калекцыі Гродзенскага гісторыка-культурнага запаведніка ёсць кафля з выявай узброенага мячом і баявой сякерай воіна, што ляжыць пад схіленым ветрам дрэвам. 17 сакавіка 1597 г. кароль Жыгімонт III надаў Віцеб-

ску магдэбургскае права з прысуджэннем герба, на якім «в блокитном поле образ святого Спаса Збавителя нашего, и при том зараз трохи нижей меч голый червоный, што ся мает розуметь кровавый».

Умацаваныя гарадзішчы, крэпасці і замкі становяцца першаасновай фарміравання славянскіх і еўрапейскіх гарадоў з глыбокай старажытнасці. Па сутнасці, гісторыю агульнаеўрапейскага горадабудаўніцтва можна адлічваць ад узнікнення першых абарончых збудаванняў. Крэпасці і замкі ў X–XIV стст. становяцца цэнтрамі фарміравання буйных паселішчаў. Ад Замкавай гары ў Віцебску пайшоў горад: тут «у лета 974» княгіня Вольга, аблюбаваўшы роўнае і высокае месца, заснавала замак. У Польшчы панавалі гарады «бургаўскага» тыпу, якія фарміраваліся вакол замка. Тыповы горад Трэнчын у Славакіі вырас як дадатак да феадальнага замка [79. С. 50]. У Францыі гарады Монпелье, Монтабань, Ліль, Блуа, Шатадэн разрасліся вакол аднайменных замкаў [80. С. 139].

Замкі з'яўляліся і цэнтрамі тэрытарыяльнага рассялення — навакольныя паселішчы цягнуліся да іх, каб жыхары (яны ж і будаўнікі замка) мелі магчымасць хутка схавацца за яго сценамі ў часы небяспекі. Планіровачную структуру, напрыклад, Навагрудка вызначае яго замак, ад якога адыходзілі вуліцы, назвы якіх адпавядалі прафесіям жыўшых тут рамеснікаў: Рыцарская, Кавальская, Сядлярская. Каля сцен замкаў традыцыйна ўтвараліся рынкі і праводзіліся кірмашы.

Паблізу абарончых комплексаў (на прадзамчы, прадграддзі, прадгор'і) сяліліся рамеснікі, пасады якіх натуральна пашыралі межы горада. Да Мсціслаўскай крэпасці праз вал прымыкаў неўмацаваны пасад XII—XIII стст. [81. С. 120]. Старажытнае крапасное паселішча Вроцлава ў X ст. мела плошчу каля 2 га, але пасля двухразовага павелічэння за кошт уключэння прадграддзяў да XIII ст. займала тэрыторыю ў 4,2 га [82]. У выніку паступова замкі пераўтвараліся ў складаныя комплексы абарончых збудаванняў, жылых, культавых і гаспадарчых пабудоў (замкі Кусі ў Францыі, Харлек ва Уэльсе і інш.).

У Віцебску на працягу IX — пачатку X ст. узнікла два паселішчы: у падножжы ўмацаванай Замкавай гары (пры вусці Віцьбы) і некалькі далей на беразе Дзвіны, каля Пілатава ручая. У акаймаванні ручая ніжэй Замкавай гары размяшчалася трэцяе паселішча. Такім чынам, Віцебск як горад да часу падання аб ім у 974 г. сфарміраваўся з шэрага асобных пасадаў, якія паступова зліліся ў адзіны горадабудаўнічы комплекс з адасобленай рэльефнай дамінантай Замкавай гары, цалкам занятай абарончым дзядзінцам. Далей з канца X ст. на правым беразе Віцьбы забудоўваецца яшчэ адзін пасад — Узгор'е. Да XIII ст. ужо існавалі прадмесці Заручаўе (за Пілатавым ручаём) і Задунаўе (паблізу ручая Дунай, на ўсход ад пасада). Засяляцца Узгор'е пачало з канца X — пачатку XI ст., аднак да другой паловы XVI ст. з'яўлялася звычайным слаба ўмацаваным гарадскім пасадам.

Пасля атрымання горадам магдэбургскага права для будаўніцтва грамадскага комплексу было выбрана Узгор'е, бо Верхні і Ніжні замкі да таго часу ўжо не мелі свабоднай тэрыторыі. Відаць, да гэтага тут існавала ўжо гандлёвая плошча на беразе Віцьбы, таму яе і выкарысталі для далейшай забудовы. Праз увесь Узгорскі пасад праходзіла вялікая галоўная вуліца, якая вяла да моста праз Віцьбу і гандлёвай плошчы. Ад яе ў розныя бакі адыходзілі вулачкі і завулкі (адзін з іх меў назву Іванскага). Тэрыторыю Узгор'я перасякаў ручай (дарэчы, не паказаны на «чарцяжы»), названы ў інвентары Слізкім. У пасадзе знаходзілася 332 двары, пераважна рамесніцкія (кавалі, пушкары, цесляры і інш.), драўляныя цэрквы.

Акрамя гэтых частак горада інвентар згадвае яшчэ чатыры пасады: Задунайскі, Заручаўскі, Слабадскі і Рускі. Задунайскі (або Задунаўскі) пасад размяшчаўся на ўсход ад Ніжняга замка, за ручаём Дунай. На яго тэрыторыі існавалі 61 мяшчанскі двор і гумнішча. У Заручаўскім пасадзе размяшчалася 158 двароў і мураваная царква Св. Духа. У пасад вяла Заручаўская брама, каля якой стаяла царкоўная багадзельня («шпітальная халупа»). Слабадскі і Рускі пасады ўтваралі раён, вядомы пад назвай Задзвінне. Яны ўключалі адпаведна 165 і 207 двароў. На беразе Дзвіны ў Рускім пасадзе стаяла драўляная царква Св. Пятра. Вось такі выгляд меў горад Віцебск у першай палове XVII ст.

Нягледзячы на вялікія і частыя разбурэнні, ён усё ж актыўна развіваўся, з'яўляўся важным эканамічным і рэлігійным цэнтрам. Сфарміравалася складаная архітэктурна-планіровачная структура, якая ўключала сем планіровачных утварэнняў (два замкі і пасады). Вялікую ролю ў ёй адыгрывалі абарончыя збудаванні. Аднак ужо вызначыўся і іншы перспектыўны кірунак развіцця грамадскага цэнтра, які перамясціўся на Узгор'е. Менавіта гэты раён у далейшым склаў аснову фарміравання новага архітэктурнага цэнтра горада ў XVIII—XIX стст.

У XII — першай палове XIII ст. дзядзінец-замак Гродна «абрастае» рамесна-гандлёвымі пасадамі, якія акаймоўваюць яго, нібы веерам, на ўсход, паўночны ўсход і захад у межах лукавіны р. Гараднічанкі і ўзвышша (пазней Ніжняга замка). На захад ад Замкавай гары, на супраць-леглым беразе Гараднічанкі, фарміруецца Каложскі пасад (жыхары яго былі пераселены з Пскоўскай губерні ў колькасці 11 000 чалавек пры захопе князем Вітаўтам у 1405 г. прыгарада Пскова Каложы).

Гродна развівалася вакол старажытнага замка па адыходзячым ад яго галоўным гандлёвым шляху і размешчаным уздоўж пасадам (слабодам). Указанні на існаванне прадмесцяў адносяцца да канца XIII — пачатку XIV ст. [15. С. 269, 271, 272]. У гэты час ужо склаліся асноўныя раёны засялення і галоўныя гандлёвыя магістралі, намеціліся тыя абрысы гарадской структуры, якую канчаткова высвятляе вопіс 1560 г. Найбольш раннім дакументам, які прама ўказвае на планіроўку Гродна, з'яўляецца грамата князя Вітаўта, выдадзеная ў 1389 г. гродзенскім яўрэям: «Пусть гродненские

евреи находятся на тех участках, на которых теперь живут, т. е. от моста Гродненского замка по обе стороны улицы, ведущей к Рынку, вплоть до улицы, которая идет с Замковой улицы к Подолу» [83].

Адзначаныя горадабудаўнічыя працэсы цалкам супадалі з прынцыпамі фарміравання старажытнарускіх гарадоў. Напрыклад, замак як асноўны горадастваральны элемент характарызуе планіровачную структуру Выбарга пад Пецярбургам, які сфарміраваўся вакол мураванай крэпасці 1293 г. Масква развівалася за кошт прылягаючых да крамля пасадаў, а яе планіроўка набыла радыяльную схему адпаведна зыходзячымся дарогам з іншых гарадоў. Крамлі вызначылі планіровачную аснову цэнтраў шматлікіх рускіх гарадоў (Тулы, Ніжняга Ноўгарада і інш.).

Абмежаваная плошча крапасных і замкавых тэрыторый не дазваляла весці пашыраную гаспадарку. Таму па-за іх межамі звычайна ствараліся замкавыя фальваркі. Такая «дапаможная» гаспадарка мелася пры замку Давыд-Гарадка; фальварак уключаў 3-камерны дом з сенямі, курнай хатай і каморай, клець, сырніцу на падклецці, пякарню «для быдла», абору з 4 адрынамі, вазоўню, сенніцу, гумно і інш.

4.3. Выкарыстанне прыродных умоў

Пры вызначэнні месца пад замак яго стваральнікі кіраваліся стратэгічнымі асаблівасцямі дадзенай мясцовасці і ландшафту, улічвалі ўсе перавагі, якія мог даць рэльеф для забеспячэння галоўнай мэты — бяспекі і абароненасці. Замкі імкнуліся ўзводзіць на ўзвышаных цяжкадаступных месцах: на абрывістых скалах, стромкіх берагах рэк, сярод непраходных балот. Таму пры ўзвядзенні замкаў перавага аддавалася месцам ранейшых гарадзішчаў, таму што яны размяшчаліся з улікам усіх пераваг, якія магла даць мясцовасць для забеспячэння абароненасці (Гомель, Ліда). Таму сярэдневяковыя замкі арганічна ўпісваліся ў навакольны ландшафт, дамінавалі над мясцовасцю і завяршалі яе натуральныя формы і асаблівасці, што пацвярджаюць і сёння манументальныя руіны замка ў Навагрудку ці замка Троскі ў Чэхіі, імпазантныя руіны Спішскага замка ў Славакіі. Сярэдневяковыя замкі і ў колерных адносінах зліваліся з навакольнай мясцовасцю, таму што матэрыялы, з якога яны ствараліся, былі яе арганічнай часткай. Усё гэта надавала замкам маляўнічасць, узмацняла іх пластычную выразнасць [84, 85].

Прырода і асаблівасці рэльефу, малюнак ракі вызначалі і кампазіцыйную вось замкавага комплексу ці канфігурацыю крэпасці. Акрамя таго, планіровачная вось, да якой прывязваліся асобныя збудаванні, была вызначана практычнай неабходнасцю і патрэбнасцю; яе трасіроўка заснавана на дасканалым веданні месца і навакольля.

Да замкаў вялі толькі прасёлкавыя дарогі, якія губляліся ў ма-



Мал. 168. Замак Зінькаў (Украіна). Літаграфія з малюнка Н. Орды, 1870-я гг.

ляўнічай мазаіцы палёў і знікалі ў далечыні ў лясным непраходным гушчары, які ў наваколлі замка высякаўся на патрэбы будаўніцтва. Мясцовасць павінна была бесперашкодна праглядацца і няздольнай служыць прыстанішчам нечаканаму «госцю». Арганічнае зліцце архітэктуры замкаў з прыродай — тая якасць, што робіць каштоўнасць твора дойлідства вечнай. Зараз цяжка ўявіць без сярэдневяковых замкаў, нават у рэштках, сілуэты шэрага беларускіх гарадоў, пейзажы Чэхіі і Славакіі, даліну ракі Луары ў Францыі.

Моцнае ўздеянне на структуру крэпасцей і замкаў аказвала канфігурацыя водных шляхоў. Гродзенскі замак узнікае на правым, нагорным беразе Немана, пры ўпадзенні ў яго ракі Гараднічанкі. Пры сутоку рэк Гарынь і Няпраўда, на акруглым гарадзішчы мысавага тыпа ўзнікае Давыд-Гарадок. Старажытнае паселішча Віцебска заснавана на Замкавай гары левага берага Заходняй Дзвіны пры ўпадзенні ў яе Віцьбы; Дуброўна — пры ўпадзенні Дубровенкі ў Днепр, Бабруйск — пры зліцці рэк Бярэзіны і Бабруйкі. Брэсцкі замак знаходзіўся на мысе правага берага Буга пры ўпадзенні ў яго ракі Мухавец. Умацаванне Мінскага замка размяшчалася на невялікім узвышшы пры сутоку рэк Свіслачы і Нямігі; абмежаванне дзядзінца рэкамі і забалочанай тэрыторыяй з паўночнага боку забяспечвала яму стратэгічныя перавагі пры абароне. Князь Гедымін у 1323 г. закладвае

замак у Лідзе на штучнай пясчанай выспе, насыпанай на балоцістай нізіне ў сутоку рэк Лідзеі і Каменкі [86. С. 15].

Там, дзе не было рэк, праводзілі ваду ў равы вакол замка. Камянецкую вежу-замак з трох бакоў абкружаў роў, які абвадняўся ракой Лясная. Замак у Крычаве з захаду быў акаймаваны пратокай з вялікай сажалкі Ставок. На заходнім узбярэжжы возера Варонеч, ля ракі Ушача стаяў умацаваны замак, пабудаваны па загаду караля Жыгімонта Аўгуста.

Паводле старадаўняй славянскай традыцыі ўмацаваныя паселішчы атрымлівалі назву па меншай рэчцы, што ўпадала ў большую (крэпасці ў Бабруйску, Полацку, Віцебску і інш.). Заканамернасці размяшчэння крэпасцей на беразе ракі, ручая ці возера і на водападзеле адзначаны і ў старажытнарускім горадабудаўніцтве [87, 88]. Крэпасць на правым беразе Акі і Волгі заснаваў у 1221 г. у Ніжнім Ноўгарадзе вялікі князь уладзімірскі Георгій Усеваладавіч [89, 90]. Мала дзе замкі звязаны так арганічна з воднымі ландшафтамі, як уздоўж Луары ў Францыі. Яны, як і прырэйнскія германскія замкі, звычайна будаваліся над абрывістым берагам ці на ўзвышаным мысе, створаным згібам ці злучэннем рэк (замак Гаяр на беразе Сены). Раннегатычны замак у Звінкаве ў Чэхіі ўзведзены пры зліцці Влтавы і Атавы.

На Беларусі не існавала надводных замкаў. Яскравым прыкладам выкарыстання воднай перашкоды для ўзмацнення абарончых якасцяў фартэцыі з'яўляецца замак-кастэль Тракай (другая палова XIV — пачатак XV ст.), размешчаны ў суседняй Літве на востраве пасярод возера Гальве. Таксама выступае сярод Жэнеўскага возера змрочная грамада Шыльёнскага замка. На працягу V—XV стст. на высокіх халмах пры сутоку рэк Нярыс і Вільня, на месцы ранніх паселішчаў (II ст. да н. э.) склаўся адзін з галоўных абарончых комплексаў Літвы, гістарычнае ядро Вільні — замак. Самы стары літоўскі замак у Каўнасе быў збудаваны пры зліцці рэк Нёмана і Нярыс. Замак Гольм у Латвіі размясціўся на востраве Заходняй Дзвіны і дадаткова акаймоўваўся ровам. На востраве ракі Одры размяшчалася старажытнае ўмацаванае паселішча Вроцлава ў Польшчы.

Па тапаграфічнаму прынцыпу сярэдневяковыя замкі падзяляюцца на нізоўныя, ці мысавыя, і высотныя, ці астраўныя. Пры розных ваенна-інжынерных традыцыях яны ўзводзіліся па агульнаму для еўрапейскага абарончага дойлідства прынцыпу — поўнае падпарадкаванне сістэмы абароны ўласцівасцям прыроднага рэльефу, выкарыстанне розніцы вышынь мясцовасці ў абарончых мэтах [54. С. 13]. Таму сярэдневяковыя беларускія крэпасці ў сваёй тапаграфічнай аснове падобны да абарончых збудаванняў суседніх рэгіёнаў: Ноўгарадскай зямлі, Смаленшчыны, Сярэдняга Падняпроўя і Прыбалтыкі. Помнікі абарончай архітэктуры Беларусі сведчаць аб цесных культурных сувязях з за-

ходнеславянскім мірам — Валынню, Польшчай і Чэхіяй.

Нізоўныя замкі запаўнялі тэрыторыю старажытных гарадзішчаў, якія звычайна знаходзіліся пры зліцці рэк. Нізоўныя замкі на раўніннай мясцовасці на невялікіх грунтовых халмах мелі ў плане выгляд прамавугольніка больш ці менш правільнай формы з вуглавымі вежамі.

Замкі сваім пануючым становішчам на даляглядзе служылі прыкметнымі арыенцірамі-дамінантамі, кантрастна вылучаліся сярод навакольнай, пераважна драўлянай нізкай забудовы. Такія замкі ў большасці выпадкаў прыстасоўвалі да рэльефу ўзгоркавай мясцовасці, і таму яны мелі няправільную планіровачную канфігурацыю.

Гродна першапачаткова развівалася на высокім правым беразе Нёмана пры ўпадзенні ў яго ракі Гараднічанкі, а дзядзінец у XI ст. забудаваны на вышэйшай рэльефнай адметцы — на Замкавай гары (32 м над узроўнем вады), якая мела форму трохкутніка. У Гродне нагорны правы бераг Нёмана падступае да ракі стромкімі, моцна зрэзанымі выступамі. Бліжэйшы да вусця Гараднічанкі выступ адмежаваны глыбокім ровам. Зямля з яго была выкарыстана для падсыпкі халма, на вяршыні якога збудаваны замак. Гравюру Гродна, выкананую Гогенбергам у 1572 г., суправаджае змястоўнае апісанне: «Гродно, расположенный на реке, которую называли прежде Кроном, а теперь Неманом, отчасти на горе, а отчасти на равнине, сообразно с обыкновением, которое царит в этой стране... Город не обнесен стеной и не имеет впереди себя фортов; ворота его не укреплены, и он не защищен башнями. Имеет замок и королевский дворец, расположенный на выдающемся месте, представляя собой безопасную резиденцию для короля Польши» [91].

Цэнтрабежным характарам арганізацыі гарадской прасторы вылучаўся шэраг польскіх гарадоў: блізкім суседствам быў звязаны з гарадской забудовай замак Хенцыны; размяшчэннем звонку гарадскіх сцен вылучаўся замак у Ленчыцах.

З пункту гледжання развіцця горада найменш пашыранай з'яўлялася цэнтраімклівая планіровачная структура, калі вакол замка фарміравалася гарадская забудова, абнесеная кальцавой абарончай сцяной; унутры панавала жыллёва-абарончая вежа (Камянец) ці палац, церам ці харомы. Падобнае пануючае становішча сярод гарадской забудовы, напрыклад, меў замак у Чэрску (Польшча).

Частая ваенная небяспека прымушала беларускіх дойлідаў развіваць гарады праз велічэнне колькасці замкаў. У апісаннях ваенных дзеянняў падчас міжусобнай барацьбы Ягайлы з Вітаўтам у 1390 г. у Гродне адзначаюцца Верхні і Ніжні замкі (на былым дзядзінцы, прадгор'і, на месцы былога пасада). Тое ж адбылося ў Віцебску (Верхні і Ніжні замкі). У склад гістарычнага ядра Вільні ўваходзілі тры замкі: Верхні на Замкавай гары, Ніжні — у яе падножжа, Крывы — на халме.

4.4. Планіроўка крэпасцей

Узнікненне мураваных ваенна-крапасных умацаванняў на Беларусі адносіцца да XIII ст. і цесна звязана з абарончай арганізацыяй старажытных гарадзішчаў: акаймаванне валамі і равамі, парканам ці каменным мурам, размяшчэнне ў центры драўляных будынкаў паселішча. Такая сістэма ўмацаванняў нязменна трымалася стагоддзямі, на працягу якіх развівалася ў больш складаную планіровачна-канструкцыйную арганізацыю драўлянай крэпасці ў больш значных палітычна-гандлёвых асяродках.

Планіровачная арганізацыя старажытных крэпасцей вызначалася ўмовамі рэльефу мясцовасці, таму іх канфігурацыя заўсёды канкрэтна індывідуальная і непаўторная. У планіровачнай арганізацыі крапасных комплексаў Беларусі пануюць акруглыя абрысы з канцэнтрычнымі валамі. Так, Мсціслаўская крэпасць займала акруглую абкружаную валам пляцоўку на Замкавай гары (вышыня да 20 м) на беразе ракі Віхра. Такую ж канфігурацыю мела ўмацаванае гарадзішча ў Якімаўцах (Малдова) [92. Т. 9. С. 76]. У Расіі форму авала мела крэпасць Ніжняга Ноўгарада.

З пераходам да мураванага будаўніцтва канфігурацыя крэпасцей набывае рэгулярны 4- ці 3-вугольны абрыс: польскія мураваныя крэпасці-замкі Чэрск (XIV ст.), Цехануў (пачатак XV ст.). Але часцей планіровачная канфігурацыя мела форму шматкутніка. Замак у Радашковічах меў форму няправільнага чатырохкутніка [93]. У арабскім свеце такія замкі сустракаюцца ў канцы X ст. (квадратная ў плане крэпасць Каіра, заснаваная ў 969 г.). Старажытны крэмль Масквы, заснаваны на вяршыні халма пры зліцці рэк Няглінкі і Масквы, атрымаў у плане форму няправільнага трохкутніка. Рэльеф мясцовасці вызначыў трохвугольны абрыс плана Гродзенскага Старога замка (працягласць крапасных сцен дасягала амаль 300 м, таўшчыня — каля 3 м). На трохкутнік у плане быў падобны і Верхні замак у Полацку.

На тэрыторыі сярэдневяковых крэпасцей, апаясаных магутнымі сценамі, вакол замка ці гандлёвай плошчы складалася сетка крывых і вузкіх вуліц. З пашырэннем гарадоў з-за высокай шчыльнасці іх забудовы за межамі крэпасці вырасталі рамесна-жылыя слабоды, якія ў сваю чаргу абкружалі новым поясам умацаванняў. Такім чынам, вызначалася трасіроўка кальцавых вуліц, што спалучаліся з радыяльнымі вуліцамі, якія шлі ад цэнтра да гарадскіх варот. У выніку складалася радыяльна-кальцавая (радзей веерная, прамяністая) горадабудаўнічая планіровачная структура, характэрная як для беларускіх, так і еўрапейскіх (крэпасць Нёрдліген у Германіі) сярэдневяковых гарадоў.

У рускіх гарадах такая планіровачная структура складалася ў крамлях («дзяцінцах», «градах»). Як і на Беларусі, яны звычайна фарміраваліся на высокім месцы, на берагах каля сутоку рэк, акаймоўва-

ліся ровам з вадой, вызначаліся ў залежнасці ад рэльефу мясцовасці значнай даўжынёй сцен і колькасцю вежаў. Але ў адрозненне ад заходнееўрапейскіх крэпасцей, старажытнарускія крамлі былі больш вялікімі, таму што абаранялі не толькі палац ці церам князя, баярскія двары, але і ўключалі амаль цалкам грамадска-адміністрацыйныя, гаспадарчыя і культавыя збудаванні. Напрыклад, калі Наўгародскі крэмль (1044) займаў плошчу 10,5 га, дык Тауэр у Лондане — усяго каля 4 га, а замак Сфорца ў Мілане — каля 2. Тып крэпасці з двума коламі крапасных сцен, распаўсюджаны на Блізкім Усходзе і часткова ў Еўропе (крэпасць Каркасон у Францыі), на Беларусі не сустракаецца.

Земляныя валы старажытных гарадоў Беларусі ў XI—XIII стст. дасягалі вышыні ад 2—3 да 6—9 м і шырыні ад 6—7 да 20—30 м. Аднак на Беларусі не сустракаюцца крэпасці з персямі — адсыпка зямлі з рова на прыступным баку адразаемага ад мацерыка мыса (Пскоў, Ізборск). Існаванне персяў у гэты час даказана расейскімі археалагічнымі раскопкамі [94]. Для разбурэння такіх персяў у Пскове палачане ў 1065 г. выкарысталі парокі (каменямёты) [95].

Крапасныя вежы ўяўлялі сабой шмат'ярусныя пабудовы, прыстасаваныя для самастойнай абароны і прыкрыцця бліжэйшых падыходаў да сцен. Вежы з'яўляліся апорнымі пунктамі крапасной агароджы і размяшчаліся па вуглах крапасных сцен і падзялялі іх працяглыя ўчасткі на шэраг праслаў; часцей яны ставіліся на ўчастках, менш абароненых прыроднымі ўмовамі. Вежы былі вышэй сцен і ўнутры абсталяваны трапамі для пад'ёму зброі, камення, вару і іншых абарончых сродкаў. Унутрысценныя лесвіцы месціліся з таго боку, адкуль не чакалі атакі; пры гэтым лесвіца на баявыя ярусы вяла не агульным маршам, а перарваным на кожным ярусе. Лесвіцы ніколі не адпавядалі адна другой па паверхах, уваходы да іх старанна хаваліся, што ўскладняла ворагу магчымасць трапляць з паверха на паверх. Другой улоўкай абаронцаў крэпасці з'яўлялася стварэнне першага маршу лесвіцы з дрэва, каб было магчыма хутка яе ўзняць наверх.

Уезд у Мсціслаўскую крэпасць ажыццяўляўся праз вежу, пастаўленую ў месцы, дзе вал перарываўся і ствараў так званы захаб — зрух вала ў глыбінным напрамку [81. С. 120]. Працягласць міжвежавых сценавых праслаў вызначалася дальнабойнасцю арбалетаў, стрэлы якіх павінны былі перакрыжоўвацца ў інтэрвале ад адной вежы да другой, і таму знаходзіліся ў межах каля 40 м [97].

Праз глыбокія запоўненыя вадой равы перакідваліся масты — адзіная магчымасць трапіць у крэпасць. Мост на жалезных ланцугах (часам называўся «лябёдным») толькі для сябра ці мірнага грамадзяніна апускаўся, а ў хвіліну небяспекі яго паднімалі, і роў станавіўся непраходным.

Праз такі мост ажыццяўлялася сувязь з горадам Мсціслаўскай крэпасці [96. С. 120]. Усцейская вежа Полацкай крэпасці мела мост цераз Палату, што выразна бачна на малюнку горада 1579 г. Уязная вежа

квадратнага сячэння размяшчалася ў паўднёва-ўсходнім вуглу Гродзенскага замка і злучалася з горадам пад'ёмным драўляным мостам; у верхнім ярусе вежы месціліся блокі пад'ёму і апускання моста праз глыбокі яр. З Ніжняга замка Віцебска праз браму і драўляны мост, перакінуты цераз рэчку Віцьбу, траплялі ў пасад Узгор'е. Звычайна драўляныя масты былі пад'ёмнымі. Прайсці да брамы крэпасці Радашковічы, акаймаванай ставамі, было магчыма толькі па мосце-ўзводзе, які падымаўся з дапамогай калаўротаў і ланцугоў. Бліжэйшая да французскага замка Каркасон частка моста была пад'ёмнай, а стацыянарная з боку горада прыкрывалася барбаканам, абаронцы якога давалі магчымасць падняць мост пры нападзе ворага. Устаў 1449 г. крэпасці ў Судаке прадугледжваў абавязковы пад'ём моста ноччу [98. С. 57].

Кампазіцыйным цэнтрам славянскіх крапасных комплексаў звычайна з'яўлялася культавае збудаванне. У Верхнім замку Віцебска гэта драўляная Міхайлаўская царква [99]; у Ніжнім замку — мураваная Благавешчанская царква X ст. Па цэнтры Гродзенскага замка ў першай палове XII ст. была пабудавана так званая Ніжняя царква, на рэштках якой у канцы XIV ст. узведзена новая Верхняя царква. Старажытны дзядзінец Давыд-Гарадка сярод жылой забудовы меў 2-зрубную царкву.

У Расіі адначасова з будаўніцтвам крамля Ніжняга Ноўгарада ў 1221 г. у яго цэнтры ўзводзіцца драўляная Міхайлаўская царква, а ў 1225 г. мураваны Спаса-Праабражэнскі сабор і ў 1227 г. Архангельскі храм [100. С. 237]. Драўляная царква вызначала цэнтр Маскоўскага крамля пры Юрыі Даўгарукім у сярэдзіне XII ст., а мураваныя храмы — пры Іване Каліце ў першай палове XIV ст.

Гэты кампазіцыйны прынцып арганізацыі крапаснога комплексу захоўваецца і ў лацінскіх краінах. Першапачаткова драўляная, а потым мураваная раманская капліца Св. Марціна ўзводзіцца ў першай палове XII ст. у цэнтры Вроцлаўскага замка [101. С. 192]. Асноўнай вертыкальнай дамінантай з'яўлялася «касцёльная вежа» (царква Божай Маці, 1357) чэшскага замка Карлштэйн.

Вялікае значэнне для жыццяздольнасці крэпасці мела водазабеспячэнне. Частай прычынай капітуляцыі абложанага замка пісьмовыя крыніцы называюць адсутнасць ці дэфіцыт пітной вады. Напрыклад, абаронцы непрыступнага іспанскага наскальнага замка Кальюр былі вымушаны здацца французам у 1640-х гг. толькі таму, што быў засыпаны выбухам адзіны калодзеж [102].

Ва ўсходняй частцы двара Лідскага замка пры раскопках знойдзены рэшткі драўляных калодзежных зрубаў. Не гаворачы аб пітной вадзе з калодзежа ці крыніцы, у межах сцен замка ці вала вада была неабходна для запаўнення роваў і «беркілаў» (басейнаў і цыстэрн), у якія адводзілася дажджавая вада пры дапамозе складанай сістэмы труб. Ідэальным было б стварэнне вадаёма ўнутры крэпасці, як гэта было на гарадзішчы ў Якімаўцах (Малдова, IX–XI стст.) [92].

Але ў Беларусі, каб вырашыць гэту праблему, крэпасці надзяляліся ў падножжы спецыяльнымі вежамі з патаемным ходам да вады. Адна з вежаў Навагрудскага замка так і называлася Калодзежнай. З Магілёўскага замка патаемныя хады вялі да Дняпра і Дубровенкі. Вежа, што выконвала такія функцыі, была агульнаеўрапейскім элементам крапаснога будаўніцтва.

Горны замак у Мукачаве на Украіне меў калодзеж глыбінёй у 85 м, для якога навакольныя сяляне былі прымушаны пастаўляць штогод канат даўжынёй 95 м [7. С. 15]. А падвальнае памяшканне замка-данжона ў Судаке з'яўлялася цыстэрнай для пітной вады (на 40 м^3) [98. С. 57].


На малюнку Лідскага замка В. Гразнова адлюстраваны адзін з данскераў на ўсходняй сцяне. З боку ракі да сцяны крэпасці Германа ў Нарве (Эстонія) быў прыбудаваны калодзежны данскер, што служыў таксама мэтам абароны. Чатырохгранны данскер быў збудаваны ў XIV ст. у Вышагародскім замку (Тоопеа) у Таліне. Меліся таксама спецыяльныя ўнутрызамкавыя насосы для таемнай падачы ў замак вады па трубах (рурам) — «помпы медяные або спижные за штемпелями железными». Ваданасоснае прыстасаванне абслугоўвалася спецыяльным майстрам — рурмістрам.

4.5. Драўлянае крапасное будаўніцтва

З працэсам феадальнага драбнення і складвання самастойных княстваў у другой палове XI — першай палове XIII ст. на беларускіх землях з'яўляюцца першыя драўляныя абарончыя ўмацаванні. Яны часта разбураліся ўшчэнт, гарэлі, але менавіта дрэва давала магчымасць хуткага ўзвядзення і аднаўлення пашкоджаных умацаванняў. Таму іх гісторыка-архітэктурны аналіз, у многім гіпатэтычны, заснаваны на археалагічных даследаваннях, рэканструкцыях, літаратурнадакументальных крыніцах. Такія крэпасці з'яўляліся першаасновай гарадоў Старажытнарускай дзяржавы.

Першыя феадальныя крэпасці ў славянскім арэале X—XIV стст. будаваліся з дрэва і зямлі і называліся дрэва-земляными ўмацаваннямі. Вакол узвышанай будаўнічай пляцоўкі выкапвалі як мага больш шырокі і глыбокі роў, зямлёй з якога накідвалі вал; па яго грэбню ўбівалі і звязвалі паміж сабой абцясаныя брусы ці бярвенні, якія стваралі частакол (вастракол, тын), перарваны драўлянымі вежамі.

У XVI ст. гарадскія ўмацаванні Міра мелі выгляд земляного вала з драўляным «парканам» і чатырма драўлянымі ўязнымі брамамі. Бабруйскі замак, які стаяў на беразе Бярэзіны і займаў плошчу 0,7 га, быў акаймаваны валам («перакопам») з драўляным астрогам («штакетам дубовым вакол абведзены») і трыма вежамі, адна з якіх з'яўлялася брамнай [4. С. 38]. Характар арганізацыі Полацкага Верхняга замка «крепко-




Мал. 169. Драўлянае крапасное будаўніцтва: Радашковічы, Камянец, Свіслач, Тара (Расія)

го дуба» дае малюнак асады Полацка войскам Баторыя ў 1579 г. На малюнку горад абнесены сцяною, мае 14 вежаў, адзін данжон у цэнтры, фортку і браму. Маскоўскі крэмль пры Іване Каліце ў 1339 г. меў дубовыя сцены ўздоўж вала, Ніжагародская крэпасць таксама была зямляна-драўлянай.

У другім выпадку на валах стаялі сцены ў выглядзе венчатых канструкцый з адной вежай-брамай. У насыпах валаў некаторых гарадоў ужываліся каменна-гліняныя канструкцыі ў выглядзе падпорных сценак (Полацк), а таксама драўляныя субструкцыі (Мінск, Пінск, Давыд-Гарадок, Ваўкавыск). Такі тып крэпасці быў характэрны і для заходнееўрапейскага абарончага будаўніцтва XI—XII стст. [80. С. 35—36].

Драўляныя сцены на земляных валах у залежнасці ад стратэгічных якасцей мясцовасці былі неаднолькавымі па сваёй структуры. Напрыклад, Навагрудскае ўмацаванне мела трывалыя сцены ў выглядзе двухраднага вастраколу або гародняў, пярэднія сценкі якіх секліся ў 2—3 бервяна. Барысаўскі замак, збудаваны ў XIII — пачатку XIV ст., займаў пляцоўку каля 2 га, акаймаваную земляным валам, ровам і драўлянымі сценамі з вуглавымі вежамі. У «Полацкай рэвізіі 1552 г.» адзначана агульная колькасць гародняў на Верхнім замку (204) і асобна — колькасць гародняў паміж вежамі: «Замок... рублен из дерева сосново-



Мал. 170. Навагрудскі замак. Рэканструкцыя

го в 5 стен городни кроме веж» [19]. У апісанні асады і ўзяцця Полацка Гейдэнштэйнам адзначаецца трываласць сцен яго замка, складзеных з некалькіх зрубна перавязаных паміж сабой дубовых вянцоў [17. С. 59]. Гародні Верхняга замка ў Полацку выяўлены і археалагічнымі раскопкамі. Валамі з дрэва-земляными ўмацаваннямі акаймоўваўся трохчастковы комплекс раннесярэдневяковага паселішча Вроцлава [82].

У таўшчыню вала Мінскай крэпасці былі закладзены масіўныя бярвенні, якія з'яўляліся своеасаблівым каркасам, што ўмацоўваў яго схілы. Другі этап будаўніцтва вала адрозніваецца цалкам іншымі прыёмамі яго ўзвядзення. Выкарыстоўвалася канструкцыя з крукамі, якія выраблялiся з добра апрацаваных дубовых сукоў. Выступаючы на 18—20 см, яны падтрымлівалі ад спаўзання ўніз даўгаватыя масіўныя бярвенні таўшчынёй 30 см, якія ўкладаліся ў выглядзе сцяны ўздоўж будучага ўнутранага боку вала. Даўжыня кароткіх папярочных бярвенняў з крукамі не больш 2 м. З супрацьлеглага іх канца рабіліся дзве прамавугольныя дзіркі для забіўкі калоў. Такія кароткія перакладзіны размяшчаліся упоперак прадольнага бярвення праз 1,8—2 м. Стварала ся сценка вышынёй у чалавечы рост, з якой ярусамі выступалі кароткія круччы. Прастора паміж збудаванай канструкцыяй і першапачатковым валам засыпалася пяском.

Унутрывальную канструкцыю з кручкамі ў Польшчы называюць «гакавай» (ад слова «гак» — крук). Яна была шырока распаўсюджана ў гарадах заходніх славян у X—XII стст. Падобная канструкцыя вала знойдзена археолагамі на тэрыторыі крамля ў Маскве, а таксама ў Ноўгарадзе, дзе яна датуецца XI ст. У культурным слоі Мінскага замка знойдзена добра выкананае ўтулкавае цясла для лёгкай ручной работы. Аналагічныя цёслы ў Ноўгарадзе знойдзены ў слаях X—XI стст.

Да 1570-х гг. адносіцца апісанне капітанам каралеўскай арміі А. Гваньіні адбудаваных віцебскіх замкаў:

«Оба эти замка укреплены башнями и стенами, которые построены из дуба и наполнены землёй и камнями» [84. С. 60]. «Падымны рэестр» Бабруйска 1638 г. паказвае, што горад быў акаймаваны валам з драўляным астрогам, магістральныя вуліцы заканчваліся брамамі па лініі вонкавых гарадскіх умацаванняў [4. С. 37]. Замак знаходзіўся на беразе Бярэзіны, меў вал («перакоп») з драўлянымі сценамі («штакетом дубовым вокруг обведен»). Сярод сцен знаходзілася тры вежы, з якіх адна з'яўлялася брамай, астатнія — абарончымі. Агульная плошча замка са знешнімі абарончымі збудаваннямі («с перекопом, штакетом и будованьем») складала 1 морг (0,71 га).

Традыцыя стварэння крапасных сцен спосабам гародней працягвалася ажно да сярэдзіны XVI ст. Адпаведна тапаніміцы, паселішча Гарадзец (згадваецца ў летапісе пад 1142 г.) павінна было мець крэпасць; назва Гродна (Гародня, Гарадзень — ад нямецкага Garten, Gartena) сведчыць аб паходжанні горада як крэпасці (паводле летапісу 1128 г.). Літоўская метрыка сведчыць, што ў 1529 г. Мсціслаўская крэпасць зноў умацавана 20 гароднямі, для чаго былі прыцягнуты людзі з многіх беларускіх гарадоў; астатнія ж умацаванні рабіліся самімі мсціслаўцамі [5. С. 139]. З пісьмовых крыніц можна меркаваць, што да XVI ст. Мсціслаўская крэпасць мела некалькі вежаў (адну праязную), шмат гарадзен, умацаваных забраламі, з якіх можна было назіраць ход боя з ворагам і супрацьстаяць эскаладнаму штурму з дапамогай прыстаўных лесвіц. Сцены драўлянай Радашковіцкай крэпасці паміж вежамі таксама былі выкананы з гародняў (даўжыня іх 3,5 м).

Тыповым прыкладам сярэдневяковага драўлянага замка з'яўлялася абарончае ўмацаванне Бабруйска, узнікшае ў эпоху Кіеўскай Русі [84. С. 37—40]. Галоўны дом замка ўяўляў сабой 2-павярховае збудаванне, крытае піленымі дошкамі-тарціцамі. Ён нагадваў церамы рускіх баяр. На першым паверсе мелася хата на 2 акны з кафлянай печкай, цагляным каміном, лавамі, а таксама камора і кухня. Верагодна, гэты паверх выкарыстоўваўся ў гаспадарчых мэтах і як жыллё дваровых. На другі паверх да верхняй галерэі з дзядзінца знадворку вяла 2-маршавая лесвіца пад дахавым пакрыццём; з галерэі траплялі ў сенцы, якія асвятляліся акном з алавянным пераплётам. Сенцы падзялялі паверх на дзве паловы: у правай знаходзіліся вялікая сталовая, пакой і малы пакойчык-камора (для захоўвання «дробных рэчаў»). У сталовай — 6 акон у алавянных пераплётах, уздоўж сцен стаялі лавы. У супрацьлеглай частцы дома знаходзіліся дзве ізбы, спальня і пакой з прыбіральней. Усе яны злучаліся анфіладна, ацяпляліся пячамі і камінамі з зялёнай кафлі. Пакой нагадваў камору ці скарбніцу — тут замест лаў каля сцен стаялі 5 вялізных куфраў. З гэтага пакоя ўнутраная лесвіца спускалася на першы паверх. З гаспадарчых пабудоў ў бабруйскім замку інвентар згадвае 3 свірна, піўніцу, 2 пякарні, турму. Усе яны былі пакрыты дахам з дошак. Свірны адносіліся да двух тыпаў: 2-павярховы на падклеце і 1-павярховы на падрубе. Піўніца ўяў-

ляла сабой вялізны каменны склеп з трыма памяшканнямі: два ніжнія і адно верхняе. У вялізнай пякарне мелася дзве «хлебныя» печы з адным цагляным дымаходам.

Тыповай драўляна-земляной крэпасцю з'яўляўся Мінскі замак. Яго дзядзінец у плане меў авальную форму плошчай 3 га, быў абнесены высокім земляным валам (шырыня ў падножжы 14 м, вышыня 8—10 м) з драўлянай сцяной-парканам агульнай даўжынёй каля 800 м. Уезд у дзядзінец знаходзіўся з паўднёвага боку, адтуль адзначаны разрыў вала, канцы якога ссунуты адносна адзін аднаго. Уезд у крэпасць праходзіў праз умацаваную 2-вежавую браму (другая палова XI ст.), якая ўяўляла сабой крытыя зверху аб'ёмныя вароты (7,1 × 17,4 м, вышыня 12 м), бакі якіх утвараліся двума радамі чатырох падоўжаных рубленых клецяў. Гарадская брама складвалася са зрубаў, пастаўленых адзін на другі. Ніжнія зрубы з дубовых бярвёнаў былі запоўнены зямлёй і служылі масіўным падножжам брамы. Зроблена графічная рэканструкцыя брамы з прыцягненнем як аналагу «Залатых варот» у Кіеве пацвярджае блізкасць матэрыяльнай культуры, агульны гістарычны лёс гарадоў у розных княствах Старажытнай Русі.

Галоўная вуліца, якая пачыналася ад гарадской брамы, працягнулася з поўдня на поўнач уздоўж Свіслачы. Ад галоўнай адгалінoўваліся тры больш вузкія вуліцы. Усе яны мелі драўляныя насцілы-маставыя. Тэрыторыя дзядзінца была разбіта на асобныя ўчасткі пад гарадскія сядзібы, якія ўяўлялі сабой размешчаныя ўздоўж вуліц замкнутыя двары з жылымі і гаспадарчымі пабудовамі, агароджанымі частаколам.

Археолагі адзначаюць стабільнасць гарадскіх сядзіб: больш познія збудаванні ўзводзіліся на месцы ранейшых, часта з выкарыстаннем захаваўшыхся ніжніх вянцоў у якасці фундамента. Магчыма, гэта з'ява была следствам высокай шчыльнасці забудовы дзядзінца. У гэтай сувязі можна меркаваць, што за ўладальнікамі гарадскіх сядзіб замацоўваліся вызначаныя ўчасткі.

З ростам эканамічнай значнасці Мінска і павелічэннем колькасці яго насельніцтва тэрыторыі дзядзінца становіцца недастаткова. Горад выходзіць за межы крапасных сцен, займаючы суседнія землі, найбольш прыгодныя для забудовы. На поўдзень ад дзядзінца ў радыусе да 300 м знойдзены пабудовы гарадскога пасада XIII—XIV стст. Пераважным тыпам жылых збудаванняў тут, як і ў іншых старажытнарускіх гарадах ў IX—XIII стст., з'яўляўся зруб 1-камерны дом плошчай ад 12 да 25 кв. м. Такія дамы звычайна рубіліся ў просты вугал («у чашу», «у абло») з астаткам даўжынёй 20—30 см.

Аднак ёсць і пабудовы, рубленыя больш складаным будаўнічым прыёмам («у лапу»). Першыя вянцы тоўстых бярвёнаў зруба клаліся непасрэдна на зямлю, а часам на каменныя валуны ці драўляныя плахі. Падлога была дашчатая, радзей земляная. Глінабітная печ тапілася «пачорнаму». У гаспадарчых пабудовах адзначаецца пераважна слупавая канструкцыя сцен [53. С. 21—22].

Двухсхільныя дахі пабудоў мелі франтоны, выкананыя з самцоў (лемягаў) — бярвёнаў такой жа таўшчыні, што і ў сценах зруба [103].

Прыкладам дробнафеадальнага ўмацавання можа служыць Раманаўскі замак (цяпер в. Леніна Горацкага р-на) [104]. Драўляныя збудаванні былі абнесены валам і астрогам. Цэнтр кампазіцыі — галоўны жылы дом з сенцамі — (2 жылыя пакоі, алькеж, 3 каморы) быў накрыты драніцай, унутры сцены памяшканняў атынкаваныя. Непадалёку стаялі турма, дом старосты (меў сенцы, 2 жылыя памяшканні, камору), варыўня, пякарня. Гаспадарчы двор уключаў 2-павярховую скарбніцу, свірны, вазоўню, стайню, склеп, з замкам злучаўся варотамі. Па-за межамі замка размяшчаўся комплекс са стадолай, гумном з 2 асецямі, броварам.

Старажытны Магілёўскі замак XIII ст. стаяў на высокім узгорку са стромкімі схіламі пры ўпадзенні ракі Дубровенка ў Дняпро. Умацаваная пляцоўка (звыш 1 га) па перыметры была абнесена пясчана-гліняным абарончым валам (вышыня 5 м, шырыня ў падножжы каля 16 м), на якім (паводле інвентару 1604 г.) стаялі 7 вежаў (з іх 2 вежы-брамы з пад'ёмнымі мастамі), злучаных сценамі-гараднямі, накрытымі гонтавымі стрэшкамі. Вежы (тры 5-ярусныя, чатыры 4-ярусныя; ніжнія ярусы 4-гранныя, верхнія — 8-гранныя) былі накрыты 4-схільнымі дахамі з драніцы. З аднаўленнем у 1638 г. пасля пажару таксама меў выгляд астрога з 2 брамамі.

Цэнтрам Крычава з'яўляўся замак акруглай формы ў выглядзе драўлянага частакола. Па яго перыметры месціліся жылыя і гаспадарчыя пабудовы, у цэнтры — Мікалаеўская царква. З захаду акаймаваны пратокай з вялікай сажалкі. Тут жа на пратоцы каля замка размешчаны бровар. На усход ад замка стаяла ратуша з гандлёвымі радамі ў цэнтры выцягнутай уздоўж берага ракі прамавугольнай плошчы. Плошча была забудавана па перыметры драўлянымі дамамі. Далей на ўсход яна пераходзіла ў новую ламанай формы плошчу, у цэнтры якой стаялі цэрквы Параскевы Пятніцы і Уваскрасення Хрыстова. З усходу горад быў абмежаваны вадаёмам Прачысціна, за якім таксама склаўся раён забудовы. Стыхійная ў аснове планіроўка ва ўсходняй частцы набліжалася да радыяльнай [105].

Крычаў упамінаецца пад назвай Кречют ва «устаўной грамаце» смаленскага князя Расціслава Мсціслававіча пад датай 30 верасня 1136 г., з якой вядома, што ў горадзе ў гэты час ужо была царква Багародзіцы. Археалагічныя раскопкі паказалі, што горад узнік першапачаткова на гарадзішчы ў паўночнай частцы сучаснага паселішча, на левым беразе ручая Крычавец, пры ўпадзенні яго ў Сож. У XII ст. гэта гарадзішча было пакінута і горад перанесены на так званую Замкавую гару, размешчаную на высокім правым беразе Сожа, у месцы ўпадзення ў яго ручая. Новае ўмацаванне займала выступ берагавога плато плошчай больш за 0,5 га, вышынёй над узроўнем вады каля 15 м. У XIV ст. тут сфарміраваўся драўляны замак.

Паводле інвентару 1673 г., цэнтральным кампазіцыйным ядром го-

рада з'яўляўся замак на беразе Сожа, абкружаны высокай драўлянай сцяной пад дранічным пакрыццём. Інвентар, акрамя замкавай брамы, не адзначае іншых вежаў. Брама стаяла сярод «паркана» з боку горада, да яе праз роў быў перакінуты высокі мост на «ізбіцах», з узводам перад варотамі. Замак у гэты час уяўляў сабой слаба ўмацаваны княжацкі двор, у якім пераважалі жылыя і гаспадарчыя пабудовы. На дзядзінцы знаходзіліся дамы князя і кіраўніка староства, склеп-піўніца, 2-камерны дом з белай хатай і сенцамі, вялікі і малы свіраны з засекамі для збожжа, 3 спіхлеры, стайня. Горад меў рынак (усяго 5 двароў) і больш дзесятка вуліц.

З рэестра магчыма заключыць, што планіроўка не была строга рэгулярнай. Частка горада (34 двары з Пятніцкай царквой) адзначана як астрог, гэта значыць яна была ўмацаванай. Акрамя таго, яшчэ 11 двароў былі «острожныя». Планіровачную арганізацыю складалі магістральныя і мясцовыя вуліцы, а таксама вуліцы-слабоды, забудова якіх вагалася ад 8 да 67 двароў. Адна з вуліц называлася Крычавец і шла ўздоўж аднайменнага ручая. Усяго ўчасткаў пад забудову налічвалася 395 з 345 «дымамі» [84. С. 186].

Паводле інвентару 1620 г. забудова мястэчка Лоск фарміравалася ўздоўж адной доўгай вуліцы, якая цягнулася ад замка да гандлёвай плошчы і была забудавана найбольш свабодна (1,7 пляца на двор). Па дадзеных канца XIX ст. замак займаў авальную ў плане плошчу (каля 1,5 га) вышынёй 30 лакцей (19,5 м) над безыменным ручаём — прытокам Бярэзіны; быў абкружаны вадзяным ровам і абнесены валам. Аснову яго абароны складалі крытыя гонтам сцены-гародні, сярод якіх стаялі тры вежы. Адна з іх была ўязной, аб'ядноўвала замак з мястэчкам. У яе ніжняй частцы знаходзіўся праезд, які закрываўся жалезнымі кратамі, наверсе размяшчаліся тры хаты і сені. У верхні ярус траплялі па вонкавай лесвіцы праз галерэю. Другая вежа называлася агароднай, трэцяя безымянная.

Будучы па свайму характару прыватнаўласніцкім, замак у Лоску нагадваў умацаваны магнацкі двор. На яго дзядзінцы знаходзіліся два жылыя дамы, кухня, скарбніца і склеп-піўніца. Галоўны жылы дом, названы ў інвентары «большим», уяўляў сабой значнае па памерах палацавае збудаванне пад гонтавым дахам з 42 памяшканнямі і мезанінам наверсе, які займала парадная зала. Другі дом меў развітую ярусную кампазіцыю і быў завершаны гадзіннікавай вежай; перад уваходам па фасаду праходзіла аркадная галерэя — гэта значыць, што будынак ужо набыў рэнесансныя рысы. Асобна ад замка, на ставе знаходзіліся замкавая лазня і бровар. Перад замкам месціўся фальварак, які складаўся з дзвюх частак: у першай размяшчаўся двор з домам і склепам-піўніцай, 2 стайні і свіран; у другой — грыдня з сенцамі, клець, гумно і асець з «присенком» [84. С. 61].

Паводле інвентару 1631 г., крэпасць (замак) у Давыд-Гарадку мела характар 1-часткавага комплексу на высокім штучным узгорку, схілы якога ўмацоўвалі драўляныя сваі і плятнёвыя канструкцыі, завяр-

шаліся па грэбні драўлянай сцяной з трыма баявымі вежамі. Гарадзішча-крэпасць плошчай 100 × 100 м у форме амаль правільнага круга была акаймавана валам (вышыня 2 м), знешні бок якога меў тэрасны профіль і ўмацоўваўся драўлянымі клецямі-гараднямі. Шчыльная забудова дзядзінца насіла рэгулярны характар, вуліцы мелі драўляныя маставыя.

Важнейшай з крапасных вежаў з'яўлялася надбрамная, забяспечаная пад'ёмным мостам з герсамі. Надбрамная вежа Радашковіцкай крэпасці мела памеры 4 × 10 сажняў, была «рубленая с протесья великого доброго» вышынёй у 4 паверхі. Першы паверх вежы праразала брама; на другі вёў «усход», праз які траплялі ў «сені», прыстасаваныя да абароны. На гэтым жа паверсе знаходзілася «вялікая святліца» з паліванаю печчу і 2 сталамі. Трэці паверх быў таксама прыстасаваны да абароны. Тут мелася невялікая гармата. Дах вежы быў абабіты «белым железом».

Вуглавая сечаная з бярвення вежа Радашковіцкага замка (4-гранная, 5 × 5 сажняў), якая стаяла ў 20 сажнях ад вежы-брамы, таксама была 3-павярховай. Першы паверх служыў свіранам, другі — капліцай, трэці быў прыстасаваны да абароны, бо тут таксама мелася гармата.

Асаблівасцю размяшчэння вызначаліся вежы Верхняга замка ў Полацку ў 1552 г. Шэсць вежаў з дзевяці былі размешчаны парамі, прычым у адной вежы з дзвюх мелася брама, альбо фортка. Такі фартыфікацыйны прыём меў на мэце выкарыстанне фланкіруючага агню адной з вежаў для прыкрыцця брамы ў другой, як найбольш слабай у абарончых адносінах і адначасова галоўнай для нападу ворага.

4.6. Мураванае замкава-крапасное будаўніцтва

У XIII ст. у развіцці ваенна-інжынернага будаўніцтва славян адбыліся істотныя зрухі. Пасіўную аблогу, якая панавала ў X—XII стст., змяніла новая тактыка — больш плённы актыўны штурм. Яна была абумоўлена з'яўленнем новай асаднай тэхнікі: каменямётных і сценабітных машын-парокаў, самастрэлаў, бамбардаў.

Раней асноўным сродкам абароны была стральба з гарадскіх сцен; менавіта яна не дазваляла ворагу наблізіцца ўшчыльную да сцен і забрацца на іх. Цяпер жа з дапамогай каменямётаў стральбу можна было паралізаваць. Ударамі парокаў імкнуліся разбурыць участак сцяны або збіць з яе бруствера забаролы і пазбавіць абаронцаў прыкрыцця. З'яўленне новай тактыкі захопу гарадскіх умацаванняў было яркім сведчаннем развіцця не толькі ваенна-інжынернага мастацтва, але і ўсёй ваеннай арганізацыі на славянскіх землях.

Упершыню «парокі» згадваюцца ў Ноўгарадскім IV летапісе пад 1065 г. Выкарыстанне на Беларусі складанай тэхнікі каменямётаў абу-

моўлена і цеснымі сувязямі з Візантыяй пасля прыняцця хрысціянства. Не дзіўна, што ў XIII ст. кідальныя машыны сталі звычайнай зброяй войскаў беларускіх князёў. Так, у 1206 г. князь Уладзімір Полацкі ўжыў каменямёты пры асадзе рыцарскага замка Гольм [69. С. 90]. У 1224 г. яго сын, кукенойскі князь Вячка, абараняючы горад Юр'еў, здолеў проціпаставіць нямецкай асаднай тэхніцы сваю тэхніку, пабудаваўшы шмат баліст і патэрэл, якія наносілі значны ўрон ворагу [69. С. 225—238].

Несумненна, што згаданы вышэй паварот у тактыцы асады не мог не прывесці да істотных змен не толькі ў арганізацыі абароны, але і ў пабудове саміх умацаванняў, паколькі паўстала патрэба адмовіцца ад драўляных канструкцый і перайсці да мураванага будаўніцтва. Гэта асабліва прыкметна ў заходніх раёнах Беларусі, на землях колішніх княстваў Гродзенскага, Навагрудскага, Берасцейскага, Тураўскага. На гравюры Гродна XVI ст. даецца выгляд Старога замка, які ён атрымаў у выніку перабудовы Вітаўтам. Гэта было магутнае збудаванне з мураванымі сценамі і пяццю вежамі. Самая старая з іх (XIII ст.), высокая цыліндрычная («стоўп»), стаяла непадалёку ад брамы. Мураванай у гэты час стала крэпасць Туроўля.

З XII ст. у структуру дрэва-земляных умацаванняў пачалі ўключаць мураваныя вежы. Гэты этап развіцця фартыфікацыйнага мастацтва прайшоў увесь славянскі свет. Мураваныя крапасныя сцены на месцы старога вала акольнага горада Ноўгарада ўзводзяцца ўжо ў 1239—1305 гг., а ў 1387 г. наўгародцы ўзводзяць мураваную крэпасць Порхаў [106. С. 13]. Крэмль Ніжняга Ноўгарада апаясваецца мураванымі сценамі ў 1500 г. Драўляныя сцены Пскоўскай крэпасці ў 1387 г. умацоўваюцца мураванымі вежамі [106. С. 24]. Дубовыя сцены Маскоўскага крамля пры Дзмітрыі Данскім у 1367 г. заменены мураванымі. Мураваныя крэпасці-крамлі ўзамен драўляна-земляных умацаванняў былі закладзены ў Кіеве (1037), Юр'еве (1030—1037), Пераяслаўлі (1090), Ізборску (1330), Туле, Каломне, Зарайску, Казані, Растове Вялікім, Смаленску (1596), Серпухаве, Астрахані і інш. [107]. Мураваныя 4-гранныя шмат'ярусныя вежы ўзводзяцца ў асяроддзі драўляна-земляных умацаванняў польскіх замкаў у Легніцы і Любліне [101. С. 198; 108. С. 20]. Па тых жа ваенна-тактычных прычынах да канца XIII ст. драўляныя крапасныя сцены Вроцлава. паступова змяняюцца мураванымі [101. С. 201]. Іх вышыня вагалася ад 20 да 30 м, а ў найбольш буйных заходнееўрапейскіх замках дасягала 40 м (Кусі ў Францыі) ці 60 (Анжэ ў Францыі).

З XII ст. у структуру дрэва-земляных умацаванняў і беларускіх крэпасцей пачалі ўключаць мураваныя вежы (Гродна). Паводле гісторыка М. Стрыйкоўскага, у Віцебску «Ольгерд укрепил Верхний замок каменной стеною и башнями и украсил этот замок палатами» [15]. Будаўніцтва мураваных умацаванняў Віцебскага замка было скончана пасля смерці Альгерда яго жонкай, якая (сведчаць хронікі таго часу) горад «муром вокруг обвела с

баштами вынеслыми и вежами» [5. С. 121] (агульная даўжыня мураваных сцен каля 1750 м). Цэнтр цяжкасці абароны пераносіцца на крапасныя вежы, злучаныя курцінамі. Пры гэтым 4-гранныя крапасныя вежы саступаюць месца акруглым, цыліндрычным ці шматкутным у плане, якія стратэгічна былі больш надзейнымі.

Крапасныя вежы ў асноўным узводзіліся з валуноў і цэглы (Гродна). Палявы камень на Беларусі быў найбольш даўнім і распаўсюджаным будаўнічым матэрыялам пры фартыфікацыйных работах. Ім брукаваліся схілы земляных валаў і пешаходныя дарожкі ўздоўж іх, а нярэдка і замкавыя падворкі [109, 110]. Пачынаючы з XIII ст., з яго ўзводзіліся муры многіх магутных замкаў (Навагрудак, Ліда, Крэва). На захадзе Старажытнарускай дзяржавы сцены шэрага крэпасцяў выкладаліся з цвёрдага плітняку, асабліва ў Пскове і памежавых крэпасцях гэтай зямлі (Ізборск, Востраў, Гдоў, Кабыла, Варонеч, Порхаў) [106. С. 14, 24].

Унутры драўляныя накаты падзялялі мураваныя вежы на ярусы, кожнаму з якіх адпавядаў шэраг байніц, пашыраных унутр і размешчаных пасярэдзіне прасценкаў. Унутраная функцыянальная арганізацыя вежаў рускай крэпасці Порхаў, верагодна, была ідэнтычнай: два ніжніх яруса былі турэмнымі, верхнія — жылымі (для стражы, палацавага памяшкання ўладальніка замка на выпадак яго хавання ад небяспекі). Уваход ствараўся як мінімум на другім надземным ярусе вежы з ганкам над валам ці абарончай сцяной. Ключавыя баявыя вежы крэпасці Ніжняга Ноўгарада падзяляліся на тры ярусы — падэшвенага, сярэдняга і верхняга бою [100. С. 242].

Асабліва старанна ўмацоўваліся ўязныя брамы, пры якіх часам рабіліся дадатковыя вежы, вынесеныя за знешні бок рова і звязаныя з прадзамчам ці самім горадам пад'ёмным мостам. У заходнееўрапейскіх крэпасцях уваход звычайна фланкіраваўся дадатковымі вежамі, што забяспечвала яго моцнае флангавае прыкрыццё (Каркасон у Францыі, брама Порта Сапрана ў Генуі). У Пскоўскай крэпасці ўваходы абараняліся дадатковымі ўмацаваннямі ў выглядзе паўкруглай ці прамавугольнай у плане сцяны, якая закрывала вароты ў асноўнай сцяне ці вежы. Такі прыём, узмацняючы ахоўныя магчымасці крэпасці з боку ўезда, атрымаў распаўсюджанне ў старажытнарускай фартыфікацыі і называўся «захабам» (Пскоў) [106. С. 24—25]. Такой паўкруглай сцяной абараняўся ўваход у крэпасць у Фамагусце ў Каіры і Мікольскія вароты Маскоўскага крамля. Такая абарона ўвахода была створана і ў Лідскім замку, але з унутранага боку [111]. З двара малы ўваход абараняла падковападобнае ў плане збудаванне, ад якога засталіся нязначныя сляды фундамента. Часам вонкавыя і ўнутраныя вароты аб'ядноўваліся працяглым праходам паміж дзвюма сценамі (вароты ў Талаўскай і Цёмнай вежах у Ізборску, Мікольскія вароты ў Востраве). Вароты былі з дуба, абітага жалезам з масіўнымі засовамі.

4.7. Замкі-данжоны

4.7.1. Перадумовы ўзнікнення

Адным з першых тыпаў мураванага замка з'яўлялася вежа-данжон, прыстасаваная да самастойнай абароны, незалежна ад астатніх умацаванняў. Думка аб усходнеславянскіх вытоках тыпу замка-данжона (donjon — дом гаспадзіна) здаецца спрэчнай [5. С. 9]. Замкі гэтага тыпу не звязаны з канкрэтнымі нацыянальнымі асаблівасцямі, таму што будаваліся паўсюдна ад Азіі да Еўропы як ідэальны тып умацаванага жылля феадала. Тым больш, што феадальны лад у беларускім арэале амаль нічым не адрозніваўся ад заходніх суседзяў — Польшчы, Чэхіі, Венгрыі, Прыбалтыкі, Старажытнай Русі.

Такія замкі-вежы будаваліся рымлянамі, а потым франкамі яшчэ ў першым тысячагоддзі; са старажытных часоў яны існавалі ў Пярэдняй Азіі. Умацаванні ў выглядзе данжона, абнесенага абарончымі сценамі і крапаснымі будынкамі, яшчэ за 70 год да панавання франкаў былі раскіданы па Палесціне (Крак, Мергеб, Тартоз, Аджлун і інш.) [96]. Менавіта з іх з пачатку IX ст. пачынаюцца традыцыі еўрапейскага мураванага замкавага будаўніцтва [90. С. 205; 111. С. 18]. Вежы-данжоны ў краінах Цэнтральнай і Заходняй Еўропы распаўсюджваюцца ў XII—XIII стст. Ва Францыі, дзе яны называліся «plessis» или «ferte», старэйшымі з датаваных данжонаў з'яўляюцца замкі Лош (994), Фрэтэваль (1040), Манрэзор (пачатак X ст.), Бажансі (XI ст.), Гент (1176—1180), Лавардэн (XI ст.). Першапачатковая рэзідэнцыя Луўр у Францыі, пабудаваная Філіпам Аўгустам у пачатку XIII ст., уяўляе сабой не што іншае, як акаймаваны ровам і земляным валам данжон.


Стваральнікамі гэтага тыпу замкаў лічацца нармандцы.

На землях Чэхіі, Венгрыі, Польшчы будаўніцтва данжонаў таксама прыпадае на XIII ст. [114. С. 61; 115. С. 119—136]. Да 1257 г. адносяцца звесткі аб мураваных вежах у Вроцлаве; другой паловай XIII ст. датуюцца вежы-данжоны ў замках Аполе, Глогуў, Левіньскі, Вленьскі, Мыша Вежа і інш. [116. С. 19, 47, 57—58, 81]. Падобныя вежы былі ў Любліне і Драгобычы [117. С. 211, 220]. Аналагічнымі фартэцыямі пакрываецца Прыбалтыка (Турайда ў Латвіі, Фелін, Рэвель, Віндава, Вайсенштэйн) [118, С. 89; 119. С. 36—37; 120. С. 59, 220]. Такі замак нямецкія рыцары ўзвялі ў Пайдзе на востраве Эзель (Саарэмаа) у Эстоніі.


Вежападобнае ўмацаванае жытло распаўсюджваецца ў Закаўказзі. У ніжнім паверсе размяшчаўся хлеў, на другім — жыллё [120. С. 175]. Трэці паверх, забяспечаны машыкулямі, быў прызначаны для абароны. Такая цыліндрычная вежа-данжон (нагадвае Камянецкую) з'яўлялася ядром замка ў в. Іцары ў Дагестане і прызначалася для мясцовага князя Кайтага. Шмат данжонаў (кёшку) узводзілася ў гэтым рэгіёне [121, 122]. У Баку дойлід Масуд у XII ст. узводзіць магутны цыліндрычны





Мал. 171. Замак Інаўроцлаў (Польшча). Літаграфія з малюнка Н. Орды, 1870-я гг.




Мал. 172. Замак Мыша Вежа (Польшча). Літаграфія з малюнка Н. Орды, 1870-я гг.























Мал. 173. Замкі-данжоны: Дуўр (Англія), Лош (Францыя), Ліда (Беларусь), Фюрстэнберг (Германія), Гродна (Беларусь), Іцар (Дагестан), Балаклава (Украіна), Мардакян (Азербайджан), Астрахань (Расія)

8-ярусны аб'ём — абарончы данжон [123]. У Закаўказзі выкарыстанне цыліндрычных вежаў тлумачыцца тым, што іх стваральнікі былі знаёмы з традыцыямі еўрапейскага фартыфікацыйнага мастацтва, якое прадугледжвала выкарыстанне сценабітных машын, але ў гарах яны не сустракаюцца з-за непатрэбнасці [120].

З другой паловы XIII ст. вежы-данжоны распаўсюджваюцца і ва ўсходнеславянскім свеце. На Ук-

раіне, асабліва на Валыні, паўстаюць замкі-вежы ў Чартарыйску, Бялавіне, Стоўп'і, Холме і інш. [116. С. 202—223]. Пры гэтым валынскія вежы параўноўваюцца з заходнееўрапейскімі данжонамі [90. С. 205]. У Холме стаяла «вежа в среде города высока, яко же бити с нея окресть града, с(ох)здана каменеемь вь высотоу 15 локоть, создана же сама де(ре)вомь тесанымь и оубелена яко сырь светящися на всеи стороны...» [124. Стб. 844].

Вежы-данжоны з'яўляюцца ў IX ст. на Русі, дзе былі «асноўнымі элементамі абароны» крэпасці, разлічаныя на «кругавы абстрэл» [90. С. 141, 149]. Іх пранікненне ва ўсходнеславянскія землі ажыццяўлялася праз заходняе Памор'е, Польшчу, Валынь [90. С. 204, 205]. Адзіночныя вежы-замкі ў XIV ст. меліся і на землях паўночна-заходняй Русі: Пскове, Ізборску, Арэхаве, Карэле і іншых гарадах [125]. Драўляныя вежы-данжоны выяўлены археолагамі ў Любечы [126], Баішыне [127. С. 59—61], Надзеждзіне [127. С. 81], Уладзімерцы [90. С. 145], Рославе [129]. Такую шмат'ярусную абарончую вежу, якая ўзвышаецца сярод крамля з муравanымі сценамі і 8 вежамі (1580—1620), можна назіраць на гравюры XVII ст. «Узяцце Астрахані атрадам Сцяпана Разіна 24 жніўня 1670 г.» [92. Т. 5. С. 339]. На французскай мініяцюры XV ст. «Узяцце Канстанцінопаля» адлюстравана цыліндрычная вежа ў цэнтры хрысціянскай сталіцы. Такі ж фарпост меўся ў Каралеўскім замку ў Віндзоры (Вялікабрытанія, каля 1272 г.) [92. Т. 5. С. 71].


У сярэднявеччы адбывалася будаўніцтва мураваных абарончых вежаў і на тэрыторыі Беларусі [130]. Замкі-данжоны XIII ст. меліся ў Камянцы, Гродна, Брэсце, Навагрудку (Шчытавая і на Малым замку), у Полацку (з малюнка 1579 г.) [131, 132], Тураве, Радашковічах, Шклове, Мядзелі, Крэве [133. С. 66], Верагодна, і ў Пінску. Аўтар Іпацьеўскага летапісу паведамляе аб данжонах ў Камянцы і Брэсце, у якім князь Уладзімір Васількавіч «созда столпь камень, высотою, яко каменецкий...» [134]. Да тыпу данжонаў адносяць і вежападобны палац князя Альгерда XIV ст., які існаваў на Верхнім замку ў Віцебску [4. С. 43, 87, 269]. Эфектыўнасць Полацкага данжона ў час вядзення баявых дзеянняў адзначае ў сваіх запісах Гейдэнштэйн [17. С. 67]. У цэнтры дзядзінца замка ў Мсціславе ў XIII—XIV стст. узвышаўся 8-гранны драўляны данжон [135. С. 167]. Падобныя вежы ставіла ў Мінску войска цара Аляксея Міхайлавіча ў 1654 г.: «поставили туры большие и насыпали» [136]. Высокая цыліндрычная вежа, што стаяла непадалёку ад брамы Гродзенскага замка, верагодна, і з'яўлялася тым самым слупом, які пабудавалі літоўскія князі ў XIII ст. «по местному славянскому обычаю». Самая старажытная пабудова Вільні — абарончая вежа-данжон Ніжняга замка (XIII ст.). Уся гэта экстрапаляцыя сведчыць аб тым, што беларускія дойліды ведалі і асвойвалі агульнаеўрапейскае фартыфікацыйнае мастацтва і інжынерыю.

З'яўленне на Беларусі мураваных «валынскіх вежаў» у XII ст. абумоўлівалася неабходнасцю ўдас-



Мал. 174. Замак Камянец (Беларусь). Літаграфія з малюнка Н. Орды, 1868 г.

каналення старых драўляных умацаванняў гарадоў [116. С. 221—222; 128. С. 625]. Будаўніцтва высокай мураванай вежы скарачала плошчу забудовы, пазбаўляла ад неабходнасці ўзвядзення масіўных абарончых сцен (хаця пазней іх неабходнасць аказалася відавочнай і для данжона). Высокая шмат'ярусная мураваная вежа была больш устойлівай супраць тактыкі актыўнага штурму, што змяніла папярэднюю пасіўную асаду. Вежа была практычна непрыступнай для асаднай тэхнікі таго часу (каменямётаў) [137]. Пры гэтым абаронцам забяспечваліся спрыяльныя ўмовы для больш інтэнсіўнай стралковай абароны, для вядзення па ворагу прыцэльнай стральбы з усіх відаў зброі: лукаў, арбалетаў, самастрэлаў [90. С. 163]. Акрамя таго, значна павялічвалася дальнасць стральбы, скарачаліся так званыя мёртвыя зоны абстрэлу, можна было весці кругавы, а ў некаторых выпадках і фланкіруючы агонь па найбольш небяспечных участках з напольнага боку ўмацаванняў [128. С. 625]. Гэтыя вежы з'яўляліся вузламі дальнабойнай абароны; нават пры захопе крэпасці праціўнік не мог схавацца ад абстрэлу стралкоў, якія знаходзіліся на вежы [138]. Данжон з'яўляўся апошнім аплотам абаронцаў крэпасці, таму аб ім старанна клапаціліся, рамантуючы пры кожным пашкоджанні [139. С. 36]. Важнасць гэтага тыпу абарончага збудавання яскрава адлюстравана ў Іпацьеўскім летапісе пры апісанні «столпа» ў Гродна пад 1277 г.: «столпь бо бе камень, высокь, стоя перед вороты города и бяхоу в немь заперлися проузи (прусы — *А. К.*) и



Мал. 175. Замак Шонбург (Чэхія). Фота 1972 г.

не бысть имь мимо нь поити к городу: побивахоуть бо со столпа того. И тако приступиша к немоу и взяша. И страхь же великь и оужасть паде на городе (гараджан — *А. К.*) и быша аки мертве, стояще на заборолехь города о взятьи столпа, зане то бысть оупование ихь...» [124. Стб. 878].

Данжоны ставіліся ізалявана як унутры — пасярэдзіне крэпасці (Холм, Карлштэйн, Шонбург у Чэхіі), так і звонку — перад уязной брамай (Гродна, Мсціслаў). Французскія і германскія данжоны часцей далучаліся да адной з абарончых сцен. Заходнееўрапейскія данжоны з'яўляліся цэнтрамі цэлай сістэмы, звычайна двайных абарончых сцен (Луўр у Парыжы) [140. С. 98].

З XII ст. у Заходняй Еўропе пачалі шырока выкарыстоўваць дагнявую артылерыю і данжоны пачалі страчваць самадастатковасць. Таму іх сталі атачаць магутнымі паясамі мураваных сцен з баявымі галерэямі і вежамі, запоўненымі вадой глыбокімі ровамі з перакіднымі мастамі, на якія пераносіўся цяжар абароны ўмацавання. Узмацненне знешніх муроў замка прывяло да перагляду дойлідамі самой ідэі неабходнасці існавання прыстасаванага выключна да пасіўнай абароны данжона, бо ў новых варунках калі б залога была змушаная замкнуцца ў такой вежы, капітуляцыя або вынішчэнне яе былі б толькі справай часу. Таму з другой паловы XII ст. роля данжона ў сістэме ўмацаванняў актывізавалася. Ён часта размяшчаўся ў лініі муроў, а ў некаторых выпадках нават выносіўся па-за іх перыметр, фланкіруючы агнём сваіх байніц падыходы да брамы і асобныя праслы абарончых сцен [141]. Пры гэтым высотнаму стаўпу адводзілася не цэнтральнае, як гэта часта лічаць, месца, а на адной з аканечнасцей крапасной сцяны. Вялікая 4-гранная вежа-данжон пастаўлена ў вуглу 4-кутніка абарончых сцен замка Нючопінг у Швецыі.

Фартыфікацыя развіваецца і ўскладняецца, рэзідэнцыя феадала пераўтвараецца ў развіты абарончы комплекс, у поўнай меры адпавядаючы разуменню «замак». Замкавы двор пераўтвараецца ў невялікае паселішча, дзе важнае месца адводзіцца храму-капэле. Прыстанкам уладальніка становіцца асабісты будынак, больш зручны, чым змрочная і цесная вежа-данжон, за якой застаецца роля апошняга сховішча пры захопе ворагам крапасных сцен.

Да канца XIV ст. форма данжона ўскладняецца; для феадала пачынаюць будаваць асобны палац. Тэрыторыя замка акаймоўваецца мураванай ці драўлянай крапасной сцяной з вежамі (часам аб'яднанымі галерэямі); у сістэму абарончых збудаванняў уключаюцца равы, вежавыя брамы і інш. Ядром замка Ліелстраупе ў Латвіі з'яўляўся магутны 4-гранны данжон XIV ст., да якога пад прамым вуглом прыбудаваныя жылы корпус, службовы флігель і царква. На месцы спаленага ў 1214 г. ордэнскага замка ў Турайда ў Латвіі закладваецца епіскапская цытадэль, у двары якой маецца галоўная дамінанта — грандыёзная адвольна пастаўленая цыліндрычная вежа-данжон XIII ст. Астатнія замкавыя будынкі далучаюцца да праслаў абвадной сцяны. Замкі чэшскіх феадалаў у XIII ст. складаліся з «града» і «прадграддзя» і звычайна мелі ў цэнтры данжон і капліцу (Кржываклат, Звінкаў).

Прататыпам такога тыпу крэпасці-данжона з'яўляліся германскія бургфрыды (burgfried), у якіх схема забудаванага франкскага двара спалучаецца з вежай, абкружанай ровам і палісадам. У адрозненне ад англійскіх і французскіх данжонаў такога тыпу галоўная вежа германскіх замкаў была цалкам пазбаўлена жылой і рэзідэнцыянальнай функцый. Бургфрыд атачаўся абарончай сцяной, пад аховай якой каля яго падэшвы размяшчаліся жылыя і гаспадарчыя пабудовы [142]. У выпадку захопу атакуючымі знешняй лініі муроў умацавання такая вежа служыла апошнім прыстанкам, дзе жыхары маглі схавацца і, уцягнуўшы за сабою драбіны (уваход у бургфрыд звычайна знаходзіўся на ўзроўні 2—3-га паверхаў), чакаць дапамогі. Сілуэт бургфрыда звычайна больш стройны, чым у данжона, які з-за сваёй функцыі мусіў мець значную кубатуру.

Як данжоны, так і бургфрыды з'яўляліся галоўнымі вежамі заходнееўрапейскіх замкаў, месцамі, дзе абаронцы маглі працягваць супраціўленне нават пасля захопу непрыяцелем знешняй лініі ўмацаванняў. У залежнасці ад часу, месца і абставінаў узвядзення яны маглі быць драўлянымі ці мураванымі, стаяць асобна ці ў канструкцыйнай сувязі з іншымі будынкамі і абарончымі сценамі. Розніца паміж данжонам і бургфрыдам заключаецца ў тым, што першы спецыяльна будаваўся як жыллё гаспадара замка, а другі быў цалкам пазбаўлены жылой і рэпрэзентыўнай функцый.

З XIII ст. ідэя пасіўнага данжона знікае, а жыллё гаспадара замка нярэдка вырашаецца ў форме не абарончай вежы, а значна больш камфортнага палаца пад надзейнай абаронай знешніх муроў. У Францыі ў XIII ст. пры агульным павелічэнні маштабу замкавых умацаванняў данжон набыў форму чатырохкутніка масіўных мураваных сцен, па перыметры якіх з унутранага боку размяшчаліся жылыя і гаспадарчыя будынкі. На кутах канструкцыі ўзводзіліся акруглыя вежы, адна з якіх магла выконваць ролю данжона ў данжоне. Такі шырокі данжон, часта нават з унутраным дваром, меў прыземісты, не заўжды вежападобны сілуэт.

4.7.2. Архітэктура

Вежа-данжон з'яўлялася прасцейшым тыпам абарончага збудавання. У сячэнні падобныя фартэцыі першапачаткова былі квадратнымі (Навагрудак і Брэст у Беларусі, Арк, Авіньён, Манрэзор і Лош у Францыі; характэрныя для Шатландыі), шматграннымі (8-гранныя данжоны Правінс і Правэн, 6-граны Гізор у Францыі) і востравугольнымі ў выглядзе дзюбы ці лодкі. Чатырохгранная форма данжона паступова змяняецца больш прыстасаванай да кругавой абароны круглай, цыліндрычнай, часам канічнай (замак Кійу ў Эстоніі) ці авальнай формай (Сэн-Савер, Луўр і Шатадэн у Францыі). Пераход да цыліндрычнай формы данжона абумоўліваўся тым, што сценабітныя машыны разбуралі гранёныя вежы, выбіваючы вуглавыя камяні. Данжон замка ў Этампе (Францыя) уяўляў сабой групу чатырох быццам зросшыхся цыліндрычных вежаў; данжон замка Худан — цыліндры з чатырма далучанымі круглымі вежачкамі.

Эвалюцыя канфігурацыі данжона прасочваецца на прыкладзе Віленскага данжона, які першапачаткова быў квадратны ў плане (захаваўся ніжні паверх); пазней на яго рэштках была надбудавана 4-ярусная цыліндрычная вежа з байніцамі. З пераходам да актыўнай абароны на сценах і вежах з'яўляюцца машыкулі — выступы з брустверам і адтулінамі ўнізе для навясной стральбы з лукаў і арбалетаў, кіданя на галовы ворага камянёў.

Уваход у вежу размяшчаўся на ўзроўні 2—3-га ярусаў. Дзвярны праём вежы Турайда ў Латвіі для большай недаступнасці быў узняты ажно на ўзровень трэцяга паверха, дзе знаходзілася купальная зала з камінам. Акаймаваны магутнымі сценамі 4-гранны французскі данжон Лош меў уваход на вышыні 3 м ад зямлі ў вузкай вежачцы, да якой прыстаўлялася лесвіца, а наверх вяла ўнутраная вінтавая лесвіца ў 150 прыступкаў. Прамежкавы ўваходны ярус, дзе знаходзілася стража (прататып кардэргардыі), — прыём, распаўсюджаны ў англійскіх данжонах. Уваходны арачны праём данжона Цімахо ў графстве Лаоіс у Ірландыі ўзняты на вышыню 5 м ад зямлі.

Данжоны Старажытнарускай дзяржавы пераважна ўзводзіліся з дрэва [81. С. 168]. Драўляныя данжоны першапачаткова ўзводзіліся і ў Заходняй Еўропе [80. С. 35—36]. Такая зрубная вежа з падвойнымі сценамі (6 × 6 м) выяўлена ў Любечы (XI — пачатак XII ст.) [126. С. 22], 6-гранная



Мал. 176. Белая Вежа, г. Камянец

драўляная вежа-данжон — у Баішыне (XII—XIII стст.) [127. С. 59—61]. Асобная вежа, якая стаяла ўнутры Радашковіцкай крэпасці, верагодна, таксама з'яўлялася данжонам — 4-павярховае 4-граннае сечанае з бярвення збудаванне. Дыяметр Мсціслаўскага драўлянага 8-граннага данжона вышынёй 13 м набліжаны як да драўляных (вежа ва Уладзімерцы — каля 14 м), так і мураваных вежаў таго часу (Камянецкі данжон — 13,5 м). Мсціслаўскую вежу параўноўваюць з цэнтрычным збудаваннем у Рославе. Важна адзначыць, што гэта былі не крапасныя вежы ў лініі абарончых сцен, а самастойныя, вынесеныя за іх межы вежы-данжоны.

Шырокае распаўсюджанне падобнага тыпу замка абумоўлівалася хуткім і неадкладным яго ўзвядзеннем, што асабліва было спадручна пры замацаванні за сабой акупіраванай тэрыторыі. Адначасова данжоны мелі магутнае нават па сучасным меркам канструкцыйнае вырашэнне, адэкватнае ўстрашальна цыклапічнаму маштабу збудавання. Мураваныя стаўпы-фарпосты дасягалі вышыні 30 (Камянец у Беларусі, Бажансі і Шатадэн у Францыі) і болей метраў (37 м — вышыня данжона Лош у Францыі), у дыяметры былі да 30 м (Баструп у Данії). Асабліва грандыёзных памераў дасягалі некаторыя данжоны Францыі: дыяметр вежы замка Кусі (1225—1240) складаў 35 м, а вышыня — 64 м. У час аблогі ён мог змясціць каля 500 абаронцаў, а тронная зала 3-га паверха збірала ўвесь рыцарскі гарнізон у 100—150 чалавек. Таўшчыня іх сцен ў аснаванні часам дасягала 5—6 м (замкі-данжоны Канісбора ў Англіі, (1185—1190); Баструп у Данії (1077—1085), Дзявочая вежа ў Баку (XII ст.). Выкладзеныя з бутавага каменю сцены Віленскай вежы дасягалі таўшчыні да 4 м.

Канструкцыі былі масіўнымі, з вялікім запасам трываласці. Але з-за эмпірычнасці праектавання былі і пралікі: у 1183 г. абвалілася перакрыцце рыцарскай залы Эрфуртскага замка ў Германіі [105. С. 561]. Адным з прыёмаў узвядзення крапасной вежы-данжона было выкарыстанне ў якасці будаўнічых лясоў толькі палогай вінтавой лесвіцы — такім спосабам узводзіўся французскі данжон Лош яшчэ ў 994 г. [96. С. 515].

Архітэктура цыклапічных слупоў уяўляла сабой як бы квінтэсенцыю суровага і драматычнага духу часу, поўнага небяспек і трывог: шматфункцыянальная, суровая, цяжкавагавая, замкнёная, пагражальна непрыступная і ўстрашальная, з чорнымі праваламі вузкіх вокан-байніц. Тут адсутнічае вытанчаная дасканаласць ліній, але выступае эмацыянальна-драматычнае напружанне: адчуванне бяссілля і прыгнечанасці, уласнай нязначнасці ўзнікае перад магутнасцю ўзнятых да нябес мураваных мас.

4.7.3. Планіроўка

Данжон — гэта не толькі абарончы, але і жылы будынак, вырашаны ў форме вежы, на той час ідэальны тып умацаванага жылля феадала [133. С. 59]. Расійскі даследчык старажытнарускага дойлідства Рапапорт пісаў: «У некаторых з мураваных вежаў меліся даволі ўмяшчаль-

ныя памяшканні, быць можа, служыўшыя не толькі для размяшчэння, але і для жылля абаронцаў. Таму магчыма, што гэтыя вежы ў вядомай меры аналагічныя заходнееўрапейскім данжонам» [128. С. 619—627]. У замку-данжоне ў Венсэне (Францыя) на першым паверсе размяшчалася кухня, на другім — жылое памяшканне і зала з камінам, верхні прызначаўся для абароны. Данжон у Луўры быў прыстасаваны для працяглага жыцця ва ўмовах аблогі: акрамя калодзежа меў значны запас правіянту і нават асобную пякарню.

Драўляныя перакрыцці падзялялі вежу-данжон на шэраг паверхаў, на другім звычайна знаходзіўся адзіны ўваходны праём. У перакрыццях праразаліся люкі, праз якія па прыстаўным лесвіцам забяспечвалася сувязь паміж паверхамі. Але часцей міжпавярховыя лесвіцы ўбудоўваліся ў тоўшчу сцяны і асвятляліся вузкімі вокнамі-шчылінамі (Камянец).

Паверхі данжона замка Таўэр у Лондане (XI ст.) аб'ядноўваліся вітымі лесвіцамі ў вуглавых вежачках, злучанымі паміж сабой калідорамі ў тоўшчы сцен. Паверхі французскага данжона Лош злучаліся ўнутранай вінтавой лесвіцай ў 150 прыступкаў.

Ніжні ярус часта забіваўся баластам з каменных глыб, другі, цёмны, служыў складам, трэці звычайна з'яўляўся жылым, добра асветленым. Тут меўся камін ці ачаг з казырком-выцяжкай для вываду дыму. Такія «залы», абавязковыя для ўсіх сярэдневяковых данжонаў, служылі жыллём сеньёру і яго сям'і. Верхняя пляцоўка вежы, звычайна апяразаная зубчастым крэмальерным парапетам, служыла для абароны і дазору.

У данжоне Кійу (Эстонія) ніжні паверх быў прыстасаваны да абароны: часта размешчаныя байніцы для пішчаляў сведчаць аб тым, што замак быў прыстасаваны для вядзення гарызантальнага перакрыжаванага агню. Другі паверх жылы; трэці служыў для абароны; вакол яго размяшчалася навісаючая абхадная баявая драўляная галерэя («урдаж»).

Для англійскіх данжонаў характэрна стварэнне паміж ніжнім і асноўным верхнім паверхам прамежкавага яруса, на якім знаходзілася стража (прататып кардэргардыі). Уборныя прадугледжваліся ў тоўшчы сцен.

4.7.4. Інтэр'ер

Суровому знешняму вобліку данжонаў адпавядаў і характар іх інтэр'ераў. Змрочныя і панурыя, малаўтульныя памяшканні данжона бедна асвятляліся рэдкімі і вузкімі вокнамі-шчылінамі з жалезнымі кратамі ў аграмаднай таўшчыні сцяны ці праз адтуліны ў перакрыццях, як у французскім замку Кусі. Уладальнікаў падобных збудаванняў больш турбавала іх непрыступнасць і абароназдольнасць. Таму часцей усяго іх інтэр'еры замыкаліся цяжкімі скляпеннямі, неафарбаванымі сценамі з дзікага каменя, вузкімі, цёмнымі, сырымі і змрочнымі праходамі і вінтавымі лесвіцамі, дзе цяжка разысціся дваім. Праўда, некаторыя элементы раскошы прыўнеслі ў інтэр'ер рыцарскіх замкаў крыжовыя

паходы — мяккія сарацынскія дываны закрываюць халодную мураваную падлогу, сірыйскае шкло замяняе ў вокнах праалееную бумагу.

Данжоны ацяпляліся. У абавязковай для сярэдневяковых замкаў рыцарскай зале быў камін ці ачаг у нішы з каўпаком-дымаходам. У інтэр'еры ўсіх трох паверхаў вежы Таўэра ў Лондане меліся каміны і латрыны. Камінам ацяпляліся жылыя ярусы данжонаў Турайда (Латвія) і Кійу (Эстонія). Часам выкарыстоўваліся размешчаныя ў падвале каларыферы, цёплае паветра якіх падавалася па сценных каналах у жылыя памяшканні (замак Курэсаарэ).

Уражлівым кантрастам нават сціпламу камфорту данжона былі мураваныя склепы, змрочныя і вільготныя падзямеллі. Часцей усяго яны выкарыстоўваліся пад турму ці астрог. Гэтыя «майстэрні катаванняў» у Францыі атрымалі сумную назву «убліет» ад французскага слова «забываць» («oubliette»). Дастаткова нагадаць сумна вядомую Бастылію, парыжскую крэпасць, якая з XV ст. пераўтварылася ў дзяржаўную турму. У падзямеллі Лошскага данжона, у вядомай прыдуманай Людовікам XI жалезнай клетцы пяць месяцаў прасядзеў пасля смерці свайго патрона прыдворны дыпламат Комін. Звычайна з гэтых склепаў адыходзілі падземныя хады за межы цвярдыні, але не для вязняў, а як апошняя надзея іх уладальніка на выратаванне. У 1903 г. пад 3-мятровым культурным слоем вакол Камянецкай вежы быў адкрыты такі глухі склеп. Ніжні ярус данжона часам забіваўся баластам з каменных глыб (Лош, Ланжэ), служыў сховішчам арсенала. На цокальным паверсе данжона звычайна быў калодзеж (Кусі і Лош у Францыі).

Павышанай мастацкай апрацоўкай вылучаліся невялікія замкавыя капліцы, капэлы, звычайна размешчаныя ў верхнім ярусе данжона. Вельмі багата былі апрацаваны капліца замка Тартоз і капэла замка Шастэль-Пелерын у Сірыі — выкарыстоўваўся фрэскавы роспіс. Самым шыкоўным у Еўропе замкавым храмам лічылася капэла ў лонданскім Таўэры. Фрэскі пакрывалі інтэр'еры французскага данжона Бажансі. Цудоўным жывапісам упрыгожана капэла Св. Крыжа, размешчаная ў верхнім ярусе данжона чэшскага каралеўскага замка Карлштэйн, — крыжовыя скляпенні пакрыты пазалотай, аркі праёмаў распісаны фрэскамі [79. С. 66].

Ва ўбранні некалькі змрочнага сярэдневяковага замкавага інтэр'ера нярэдка аддаюць перавагу шпалернай абіўцы сцен — шчыльныя, тканыя з шэрсці «карціны» ўцяплялі памяшканні і былі больш надзейныя, чым роспісы, якія дрэнна трымаліся на сырых сценах. Яны надавалі больш прыбраны выгляд залам замкаў, іх рэўнасна калекцыянавалі як каштоўнасці. Карл V (Мудры) толькі аднаму парыжскаму майстру Міколе Батаю, уладальніку аграмаднай дывановай майстэрні ў Парыжы, за трынадцаць гадоў заказаў звыш 250 шпалер для сваіх замкаў. Інтэр'еры замка Анжэ ўпрыгожваліся шматлікімі шпалерамі, створанымі ў перыяд з XIV па XVI ст. Самым прыкметным з'яўляецца дыван «Апакаліпсіс», выкананы для Людовіка I Анжуйскага ў 1376—1380 гг.

Міколай Батаем па замалёўках фламандскага мастака Энекена (Жана Бандоля) з Бруге [143]. Уражваюць памеры самага старажытнага ў Францыі дывана: даўжыня каля 168 м (захавалася палова), вышыня — 5,5 м. Кампазіцыйна ён падзяляўся на сем частак, якія ўключалі звыш ста сюжэтаў.

Залы Мірскага замка ў Беларусі былі ўпрыгожаны габеленамі мясцовай вытворчасці са сцэнамі з жыцця яго ўладароў, магнатаў Радзівілаў. Сярэдневяковыя замкавыя шпалеры і габелены, што захоўваюцца зараз у музеях, знаёмяць нас з вайсковым духам рыцарскіх баталій, адкрываюць кволы і элегантны мір куртуазнага кахання. Аднак асноўным упрыгожаннем замкавых капліц усё ж заставаліся развешаныя па сценам сцягі, гербы і зброя.

4.7.5. Помнікі-данжоны

Упершыню прынцыпы раманскага стылю і готыкі былі выкарыстаны пры будаўніцтве паміж 1276—1288 гг. вежы-данжона ў Камянцы. Яго ўзводзілі валынскія майстры («градаруб» Алекса) пад уплывам польскай архітэктуры. Данжон складаў цэнтральны вузел кальцавога вала з драўлянымі ўмацаваннямі на ім. У архітэктурнай трактоўцы назіраюцца элементы раманскага стылю: паўцыркульныя аркі дэкаратыўных плоскіх ніш, якія тынкаваліся і бяліліся, і байніц, крэмальерны парапет з 14 зубцоў у завяршэнні, пояс-парэбрык з укладзенай «на вугал» цэглы. Элементамі ранняй готыкі з'яўляюцца верхнія шчыліны-байніцы і дзвярны праём, якія маюць стральчатую форму, нервюрнае скляпенне з кранштэйнамі. Унутры захаваліся гнёзды ад драўляных бэлек, якімі вежа падзялялася на пяць ярусаў; на верхнюю баявую пляцоўку з 5-га яруса выводзіць цагляная лесвіца ў тоўшчы сцяны. Уваходны дзвярны праём размяшчаўся на ўзроўні 4-га яруса. Такое высокае размяшчэнне адзінага ўвахода характэрна для германскага бургфрыда [130. С. 101] і польскіх данжонаў [144]. Вышыня «стаўпа» — 30 м, вонкавы дыяметр — 13,5 м, таўшчыня складзеных з брусчатай цэглы сцен — 2,5 м.

Паводле Іпацьеўскага летапісу 1277 г., абарончая, падобная на камянецкую, вежа тыпу «данжон» мелася ў Гродна, які з канца 1240-х гг. уваходзіў у склад Вялікага княства Літоўскага. У 1253 г. Данііл Галіцкі ўключыў яго ў склад Галіцка-Валынскага княства. Верагодна, пры Данііле на дзядзінцы сярод драўляных умацаванняў узведзена вежа-данжон з муру тыпу Камянецкай. Яе выгляд і архітэктурна-стылёвыя асаблівасці добра бачныя на гравюры Г. Адэльгаўзера і М. Цюндта 1568 г. Вежа мела цыліндрычную звужаную ўверсе форму, 4 ярусы бою і верхнюю баявую пляцоўку, акаймаваную крэмальерным парапетам. Вежа мела дыяметр каля 12 м і таўшчыню сцен каля 3 м. Яе гладкая сцяна, умацаваная ў ніжняй частцы 3-вугольнымі контрфорсамі, была прарэзана вузкімі вокнамі-байніцамі, завяршалася зубчастым гатычным атыкам і шатром са

шпілем, на якім быў умацаваны «ветренник» у выглядзе сцяга-вымпела. Гэтая вежа з'явілася галоўнай высотнай дамінантай Верхняга замка.

Паводле Іпацьеўскага летапісу, «столп высотою яко и Каменецкий» быў узведзены ў Брэсце ў часы князя Уладзіміра Васількавіча ў XIII ст. Замак па сваіх планавафартыфікацыйных асаблівасцях падобны да такой жа пабудовы ў Стоўп'і на Валыні [116. С. 215]. Вежа была чатырохкутнай у плане са знешнімі памерамі 5,9 × 6,3 м.

У XIV ст. літоўскі князь Альгерд, які стаў віцебскім князем пасля шлюбу з мясцовай князёўнай Марыяй, умацаваў у Віцебску Верхні замак і пабудаваў тут мураваны палац тыпу данжона [145, 146]. На малюнку Полацка, зробленым С. Пахалавіцкім у 1579 г., у паўночнай частцы і ў цэнтры Полацкага замка паказаны дзве вежы, пастаўленыя асобна за сценамі замка. Самая старажытная мураваная пабудова Вільні — адна з абарончых вежаў Ніжняга замка (XIII ст.). Яе сцены з палявога каменю мелі таўшчыню да 4 м.

Тураўская вежа існавала ў другой палове XIII — пачатку XIX ст. (разбурана ў 1830-я гг.) і размяшчалася на дзядзінцы старажытнага горада, з'яўлялася галоўным абарончым збудаваннем замка. Адносілася да тыпу валынскіх вежаў. Была пабудавана з цэглы на вапнавым растворы. Паводле планаў XVIII—XIX стст. мела форму цыліндра дыяметрам 11 м. Унутры падзялялася на некалькі баявых ярусаў.

4.7.6. Заняпад крапасных збудаванняў

У сувязі з развіццём артылерыйскай зброі (гармата з'яўляецца на палях бітваў з 1346 г.) адбываецца змена функцыянальнай прыналежнасці данжона. Ён паступова страчвае сваю першапачатковую абарончую значнасць, функцыя абароны пераносіцца на подступы да замка (равы, сцены, бастыёны), а данжон пераўтвараецца ў палац (часам у турму). Напрыклад, у англійскай фартыфікацыі канца XIII — пачатку XIV ст. данжоны ўжо, як правіла, не ўзводзяцца, цэнтр цяжару абароны пераносіцца на крапасныя вежы. Былыя данжоны з пераважнай функцыяй сховішча і абароны прыстасоўваюцца выключна пад жыллё ў XIV ст. (П'ерфон у Францыі). Палацавыя памяшканні вынесены ў канцы XIV ст. з іспанскіх данжонаў Сатамаёр і Бельвер у самастойныя будынкі, злучаныя з імі пераходамі. Замкі-данжоны спарадычна ўзнікаюць яшчэ ў эпоху Рэнесансу. Напрыклад, васальскі цыліндрычна-канічны замак-вежа Кійу ў Эстоніі пабудаваны Ф. фон Тызенгаўзенам у 1510-х гг., данжон Юсэ ў Францыі — у 1485—1520 гг. Данжон французскага замка Шамбор узводзіцца ў 1513—1559 гг. Францыскам I як палац для пацехі і палявання.


Такім чынам, на землях Беларусі, як і ўсёй Еўропы, у X—XIV стст. былі распаўсюджаны крапасныя ўмацаванні з адзіночнымі мураванымі вежамі-данжонамі. Магутныя мураваныя вежы павялічылі стратэгічныя якасці гарадоў і іх былых драўляна-земляных крэпасцей.

4.8. Замкі-кастэлі


4.8.1. Прычыны ўзнікнення


Другім, больш фундаментальным і маштабным з'яўляўся тып замка-кастэля, што атрымаў распаўсюджанне ў XII—XIV стст. Магутныя рэгулярныя замкі-кастэлі інспіраваны правобразам старажытнарымскіх умацаваных ваенных лагераў (Кастэль дэль Монце ў Італіі, XIII ст.). Але рыцарскія ордэны запазычылі яго пры крыжовых паходах на Блізкі Усход і распаўсюдзілі ў еўрапейскім арэале [147].

Лепшым узорам такой крэпасці з'яўляецца замак у Мальбарку (каля 1280 г.). Гэта невялікая камтурыя — квадратны замак-манастыр, акаймаваны сцяной з чырвонай цэглы. Замкі такога тыпу былі вядомы ў XIII ст. у Германіі, Данії, Скандынавіі і іншых землях [148]. Ад назвы гэтага тыпу замка паходзяць некаторыя геаграфічныя назвы, напрыклад Касцелец у Чэхіі; «кастэла» — замак, дзякуючы гэтаму слову цэлая вобласць Іспаніі ў XIII ст. стане называцца Касціліяй («краіна замкаў»). Характэрныя сілуэты замкаў увайдуць у геральдыку мясцовага дваранства — касцільцаў [149]. У XIII ст., званым эпохай вялікіх заваяванняў, вырашальная роля ў Іспаніі належала Касцільскаму каралеўству. У Італіі ад назвы гэтага тыпу замка паходзяць гарады Кас-











Мал. 177. Замкі-кастэлі: Марыонэс (Шатландыя), Шаганар (Расія), Барысаў (Беларусь), Курэсаарэ (Эстонія)



Мал. 178. Замак Крэва (Беларусь). Літаграфія з малюнка Н. Орды, 1875–1877 гг.



Мал. 179. Замак Меднікі (Літва). Літаграфія з малюнка Н. Орды, 1875–1877 гг.

тэль-Сан-Джавані, Кастэльнова-дзі-Сота, Кастэль-Фларэнціна. Пазней англа-нарманы пачалі ўзводзіць замкі вялікіх памераў квадратнай формы, што надавала ім магутнасць (замкі ў Трыме і Кэрыкфергусе).

Разумеючы, што захапіць і ўтрымаць пад сваёй уладай літоўска-беларускія землі немагчыма, рыцары вырашылі ўзводзіць базавыя замкі-кастэлі. Будаваліся яны надзвычай хутка, што прадвызначалася непрыхільным стаўленнем жыхароў акупіраваных тэрыторый да заваёўнікаў. Размяшчаліся на мяжы завяванай вобласці каля буйных населеных пунктаў або на асноўных гандлёвых шляхах і скрыжаваннях стратэгічных дарог. Для крыжацкіх гарнізонаў замкі-кастэлі былі своеасаблівымі гаспадарча-стратэгічнымі тыламі, дзе захопнікі размяшчаліся для часовага пастою, збору даніны, папаўнення правіянту ці хаваліся ў час небяспекі.

Асабліва шмат кастэляў узвялі лівонскія рыцары ў Прыбалтыцы. На землях, якія непасрэдна мяжуюць з Беларуссю, першы кастэль узведзены ў 1186 г. рыцарамі Лівонскага ордэна ў Гольме (Латвія). Такія фартэцыі, падобныя на рыцарскія кастэлі, на Беларусі з'яўляюцца ў першай палове XII ст. у Міры, Лідзе, Крэве; у Літве — Тракаі, Медніках, у Эстоніі — Вастселійна, Нарве, Ракверэ, Пыльтсамаа, Хаапсалу. У XIII—XIV стст. крыжаносцы ўзвялі на тэрыторыі куршаў у Латгаліі, Земгаліі і іншых прыбалтыйскіх землях шэраг кастэляў: Валькенберг, Кандау, Тукум, Альсунга, Дурбан, Альтона, Арайшы і інш. Непасрэдны ўплыў крыжацкай архітэктуры на воблік Тракайскага замка адзначае М. Шчакаціхін [49. С. 152]. Па тыпу рыцарскага замка шведы ў 1293 г. узводзяць мураваны замак у Выбаргу пад Пецярбургам. У Славакіі добра вядомы прамавугольны ў плане з вуглавымі цыліндрычнымі вежамі замак-кастэль Чорны Камень, заснаваны ўдавой чэшскага караля Першэмысла Атакара I у сярэдзіне XIII ст. Падобныя замкі ўзнікаюць у Еўропе нават у пачатку XVI ст. — Марытзбург (Германія). Каралеўская ўлада Швецыі будуе шэраг замкаў-кастэляў па ўсходнім узбярэжжы краіны. Разам з тым замкі-кастэлі не сустракаюцца ні ў Расіі, ні на Украіне.

Умовы крыжацкай агрэсіі прымусілі Беларуска-Літоўскую дзяржаву прыняць усе прыёмы ваеннай тактыкі, што былі ўжыты яе ворагамі ў працэсе экспансіі, каб належным чынам арганізаваць адпаведную абарону. Дасканалае германскае фартыфікацыйнае мастацтва з'явілася той асновай, на якой выросла замкавая архітэктура Беларусі [49. С. 141]. Аднак запазычаныя ад крыжакоў першаўзоры замкаў-кастэляў павінны былі ўспрыняць і традыцыі мясцовых абарончых умацаванняў. Узнікненне ў XIV ст. і распаўсюджанне кастэляў было для ўсіх народаў Еўропы, як і Беларусі, новым значным крокам у развіцці і ўдасканаленні ваеннага дойлідства. Планіровачная кампазіцыя 4-кутнага абарончага збудавання на нізкім рэльефе стане характэрнай асаблівасцю ваеннага дойлідства XV—XVI стст.

4.8.2. Планіроўка


Лівонскі ордэн меў вопытных будаўнікоў-фартыфікатараў і адыграў вядомую ролю ў амаль 300-гадовым развіцці замкава-крапасной архітэктуры Прыбалтыкі і Беларусі, асабліва ў стварэнні замкаў-кастэляў. Тутэйшыя дойліды разам з запрошанымі замежнымі майстрамі, узяўшы за ўзор рыцарскі кастэль, прыстасавалі гэты тып абарончага збудавання да мясцовых патрэб. Яны значна павялічылі плошчу замкавага двара, дзе ў час небяспекі магло схавацца не толькі войска, але і мірнае навакольнае насельніцтва. Абарона кастэляў складалася з драўляных або мураваных сцен, земляных валаў і равоў, напоўненых вадой [147]. Прамавугольная форма замка пашырала агляд і дазваляла весці бакавы флангавы абстрэл ворага на бліжэйшых подступах да сцен. Жыццё жыхароў такіх замкаў было абмежавана ўнутранымі памяшканнямі, згрупаванымі вакол унутранага двара, а ў так званых свабодных кастэлях — у адвольна размешчаных будынках. Замкавы двор кастэля абавязкова брукаваўся (Ліда, Крэва).

Тып замка-кастэля сіметрычнай чатырохкутнай пабудовы, умацаванай масіўнымі мурамі і вежамі, канчаткова ўсталяваўся ў Прусіі ў канцы XII — пачатку XIII ст. Крыжацкія ж замкі ў Прыбалтыцы набывалі часам планіроўку няправільнай прамавугольнай канфігурацыі як пад уплывам рэльефу мясцовасці, так і папярэдніх умацаванняў, якія служылі падставай да заснавання новага крыжацкага прыстанку. Часам крыжацкія замкі з'яўляліся пераробкамі і перапрацоўкамі заваяваных старадаўніх умацаваных гарадзішчаў і дзядзінцаў (Валькенберг у Прыбалтыцы). Такім чынам, мясцовае абарончае будаўніцтва адпаведна адбілася і на характары заходнееўрапейскага тыпу замка-кастэля як у некаторых дэталях і канструкцыях, так і ў агульным характары планіровачнай арганізацыі [139. С. 32].

Да пачатку XIV ст. у крыжацкіх замках усталяваўся закончаны і дасканалы тып замка-кастэля. Квадратная ці прамавугольная канфігурацыя замка складалася з чатырох паасобных карпусоў, якія абкружалі ўнутраны двор-дзядзінец; уздоўж унутраных сцен карпусоў праходзілі баявыя галерэі («абаронны ход» ці «верганг» з байніцамі).

Аснову магутнасці кастэляў складалі высокія мураваныя выведзеныя пад лінейку сцены ў форме чатырохвугольніка з вуглавымі вежамі. Кастэль Гольм у Латвіі займаў прамавугольны ўчастак зямлі памерамі 40 × 34 м, абведзены мураванай сцяной таўшчынёй 3,0 × 3,35 м. Аналагічную прамавугольную форму набыў замак-кастэль Вышгарад у Таліне. Але часцей планіроўка замка набывае канфігурацыю няправільнай трапецыі, што дыктавалася асаблівасцямі рэльефу мясцовасці і ўмовамі будаўнічай пляцоўкі. У гэтых адносінах ідэнтычныя замкі ў Лідзе, Крэве, Медніках.

Галоўнай часткай кастэля з'яўлялася вялікая вартавая вежа-брама ў некалькі ярусаў, выкананая ў вельмі масіўнай муроўцы і ў не-





Мал. 180. Лідскі замак: уверсе — малюнак В. Гразнова, першая палова XIX ст., унізе — фотаздымак, канец XX ст.

калькі ярусаў. Наверсе вежа завяршалася стромкім шатровым дахам з чарапічным пакрыццём альбо баявой пляцоўкай. Старажавая вежа з'яўлялася абавязковым атрыбутам кастэля, але часцей ёй адпавядалі вуглавыя вежы меншага памеру, круглай ці 4-граннай формы. Выне-

сеныя за перыметр сцен вуглавыя вежы забяспечвалі магчымасць вядзення з іх фланкіруючага агню. З унутранага боку замкаў Ліда, Крэва, Меднікі і Гольм да сцен былі прыбудаваны 4-гранныя вежы, якія яшчэ больш узмацнялі абароназдольнасць кастэля. Паверхі замкавых вежаў злучаліся між сабой унутранымі ўсходамі, якія пачыналіся толькі з другога паверха, так што трапіць на яго магчыма было выключна праз прыстаўную нестацыянарную лесвіцу. У паўднёвай сцяне замка Каркасон на вышыні 4 м размешчаны невялікі паўцыркульны ўваходны праём, трапіць да якога было магчыма таксама толькі з дапамогай прыстаўной лесвіцы.

Праз роў, які звычайна акружаў кастэль, перакідаўся пад'ёмны мост, які вёў у замак і падымаўся пры дапамозе тоўстых ланцугоў у час небяспекі. Праезд з пад'ёмным мостам, які вёў да ўязнога данжона, меў замак Тракай (Літва). У 1812 г. адступаючыя французы спалілі пад'ёмны мост і сапсавалі шлюз Лепельскага замка (Беларусь). Каб падрыхтавацца да вырашальнага адпору і разгрому рыцараў Тэўтонскага ордэна, у Навагрудку пачынаюцца вялізныя будаўнічыя работы па пашырэнню замка, пры гэтым дзверы ў надбрамную вежу запіраюцца на дубовых завесах, якія ўмацоўваюцца ў таўшчыні сцяны.

У скляпенні ўязной вежы Мірскага замка маецца шчыліна, праз якую апускалася акаваная заслона-герса, калі было неабходна нечакана адрэзаць перадавы атрад ворага ад астатняга войска.

У замку Каркасон (Францыя) уваход абаранялі дзве металічныя рашоткі, якія скідваліся зверху; гэтыя пад'ёмныя герсы кіраваліся незалежна адна ад адной з нязлучаных паміж сабой памяшканняў у таўшчыні сцяны з мэтай выключэння магчымасці зламыснага зговару. Праз роў замка Каркасон перакінуты мураваны мост, які ў трох метрах ад уваходу прарываўся: разрыў перакрываўся з'ёмным драўляным трапам — правобразам пад'ёмнага моста, шырокае выкарыстанне якога пачалося толькі з росквітам фартыфікацыі ў XIV ст.

Трапіць у Лідскі замак-кастэль можна было толькі з дапамогай пад'ёмнага моста, аб існаванні якога сведчыць вялікая разгрузачная ніша ва ўязной вежы.

Звычайна на першым паверсе падобнага замка размяшчаліся стража, кладавыя, канцылярыя, скарбец, архіў і інш. Як правіла, пры замках меліся суд і турма; у Вроцлаўскім замку згадваюцца лазня, кухня, туалет [100. С. 199]. Другі паверх адводзіўся пад парадныя і жылыя апартаменты ўладара. Прыватнаўласніцкія замкі надзяляліся мудрагелістымі прыстасаваннямі, патаемнымі пакойчыкамі, таямнічымі ходамі і сутарэннямі. Уладальнік замка Бларні ў Ірландыі ўчыніў пры ўваходзе лоўлю для нежаданых наведвальнікаў, якія, устаўшы на пліту, маглі трапіць у падземную турму-убліет, як толькі вартаўнік па загаду гаспадара адсоўваў спецыяльную клямку.

У верхняй частцы сцен замкаў-кастэляў абавязкова ствараўся рад байніц і праходзіла драўляная га-

лерэя-памост для воінаў (Гольм). У Лідскім замку ніжэй байніц уцалелі скразныя адтуліны ад кансольных бэлек, якія служылі апорай драўлянай галерэі-памосту для воінаў, якая ішла па перыметры замкавых сцен [150]. Аналагічныя сляды ад бэлек меліся ў Крэўскім замку, што сведчыць аб наяўнасці ў мінулым перыметральнай баявой галерэі-памоста, з якой праз байніцы вялася абарона замка.

Агульная сістэма плана і будаўніча-тэхнічныя асаблівасці Лідскага замка, у аснове якога — тып рыцарскага кастэля, маюць шмат агульнага з аналагічнымі пабудовамі паўднёвай Скандынавіі, што тлумачыцца яго будаўніцтвам майстрамі з Готланда.

Калі браць за стылеўтваральную аснову канструкцыйныя элементы, то беларускія замкі-кастэлі неабходна лічыць сімбіёзнымі раманагатычнымі. Так, арачныя праёмы Лідскага замка маюць як гатычную спічастую, так і раманскую цыркульную форму; асабліва характэрны гатычны аркатурны фрыз, які ішоў пад байніцамі. Праём спічастай формы выяўлены ў Крэўскім замку.

У замкавым будаўніцтве Беларусі і Літвы быў шырока распаўсюджаны метад так званай лусковай муроўкі, калі плоскасці сцен выкладаліся цэглай, а ўнутры запаўняліся забутоўкай з валуноў і шчэбню на вапне (Ліда). У муроўцы сцен беларускіх замкаў, у адрозненне ад прускa-крыжацкіх, найбольш пашырана выкарыстоўвалася мясцовае бутавае каменне, а не выключна цэгла. Гэта абумовіла пэўную архаічнасць архітэктурных форм, асабліва ў надворных фасадах замкаў. Замкавыя сцены выкладаліся з груба апрацаваных вапняковых пліт або нават з натуральнага каменю; цэментная рошчына запаўнялася бітай цэглай. Тэхніка такой муроўкі нагадвае сценавую канструкцыю («паўбутавая муроўка», муроўка «ў каробку»), якая ўжывалася, пачынаючы з XIII ст., пры пабудове асобных наўгародскіх цэркваў [49. С. 144]. Часам цэгла выкарыстоўвалася выключна для вонкавай абліцоўкі сцен замка, аснову якіх складала мяшаная цаглянабутавая муроўка, а таксама для выкладкі праёмаў і асобных дэталяў дэкору (Крэва, Трокі).

Мядзінінкай — самая буйная на Літве крэпасць кастэльнага тыпу (XIII—XIV стст.) — амаль квадратны замкнёны двор з 4-граннымі вуглавымі вежамі. Шэдэўр абарончага дойлідства Літвы, кампактны замак-кастэль стаіць сярод возера Гальве ў Тракаі. Ён складаецца з княжацкага палаца-рэзідэнцыі, абнесенага абарончымі сценамі вакол трапецыяпадобнага двара з 2-павярховымі казематамі, з трыма магутнымі вуглавымі вежамі і надбрамнай вежай. Замак-рэзідэнцыя Раўдоне ў Літве меў два карпусы, аб'яднаныя абарончымі сценамі вакол чатырохвугольнага двара; па вуглах паўночнага корпуса былі дзве цыліндрычныя вежы і адна па цэнтры паўднёвага корпуса. Прыблізна ў другой палове XIII ст. закладзены замак Курэсаарэ (Эстонія) — прамавугольны рэгулярны кастэль. Верагодна, і крэпасць Германа ў Нарве ўяўляла сабой такі ж тып пабудовы.

Унутры кастэля мастацка-дэкаратыўнай трактоўкай акцэнтаваліся перш за ўсё рэпрэзентацыйныя залы і замкавыя капліцы. Асноўнымі атрыбутамі ўбрання іх інтэр'ераў з'яўляліся развешаныя па сценах сцягі, гербы і зброя. Самая раскошная ў гэтым плане была капэла замка Таўэр у Лондане: інтэр'еры ўпрыгожваліся шліфаваным гіпсам, каменнай разьбой і ізразцамі, керамічнай і мармуровай падлогай.

Гісторык Т. Нарбут, які даследаваў руіны Лідскага замка ў канцы XVIII ст., засведчыў, што ў адной з вуглавых вежаў знаходзіліся раскошныя залы і пакоі на верхнім паверсе, на ніжнім — судовая і архіўная хаты, на ніжніх паверхах таксама размяшчаліся суд, архіў і турма [67. С. 477]. Царква размяшчалася ў верхнім ярусе вежы Лідскай кастэлі і была абліцавана керамічнай пліткай белай палівы і разным каменным дэкорам. Бясспрэчна, што некаторыя паверхі вежы Лідскага замка выкарыстоўваліся пад жыллё; археалагічныя знаходкі (паліваная кафля з роспісам чырвонага колеру, рэшткі посуду) пацвярджаюць сведчанне гісторыка Т. Нарбута аб наяўнасці ў вежы на верхнім ярусе параднай залы і пакояў. На ніжнім паверсе вежы Лідскага замка таксама размяшчаўся склеп-турма; на верхніх паверхах жылі князь, чэлядзь і начальнік замкавай варты. Княжацкія пакоі размяшчаліся на другім паверсе, дзе вокны значна большыя і шырэйшыя за астатнія. Трэці паверх выконваў абарончыя функцыі. Над ім, відаць, меўся яшчэ адзін ярус бою. Аб гэтым сведчаць існаваўшыя яшчэ ў XIX ст. рэшткі лесвіцы ў тоўшчы вежавай сцяны, якая вяла наверх [65. С. 235]. Княжацкія пакоі Крэўскага замка, відаць, былі распісаны фрэскамі (выяўлены сляды тынкоўкі з фрэскавым жывапісам на аконных ліштвах).

4.8.3. Помнікі-кастэлі

Адзначаныя асаблівасці замкаў-кастэляў характэрны як для крыжацкіх рыцарскіх прыстанкаў (Рыга, Вендэн, Дзвінск), так і для беларуска-літоўскіх.

Першы на тэрыторыі Беларусі мураваны замак тыпу кастэль узнік у Лідзе ў 1323 г. пры князі Гедыміне. Ён размешчаны ў нізіннай балоцістай мясцовасці, пры зліцці двух рэк, на штучным 4-мятровым насыпе, ад горада адмяжоўваўся ровам з вадой. У плане замак уяўляе перакошаны чатырохкутнік з двума вуглавымі, размешчанымі па дыяганалі вежамі, якія мелі не толькі абарончае значэнне, але павялічвалі магчымасць панарамнага агляду навакольля. Аснову абароны складалі магутныя 15-мятровыя сцены з байніцамі і ўнутранай драўлянай галерэяй уздоўж верхняй частцы. Сцены акаймоўвалі аграмадны брукаваны двор-плошчу (каля 80 × 80 м), на якім знаходзіліся нешматлікія драўляныя пабудовы, у тым ліку і праваслаўная царква. Асноўны масіў сцен і вежаў складзены з валуноў, найбольш адказныя часткі і ўсе архітэктурныя дэталі выкананы цаглянай муроўкай: вуглы сцен, аркі ўваходаў, нішы, каміны, скляпенні



Мал. 181. Замак Крэва (Беларусь). Фота А. Кулагіна, 1984 г.

вежаў, байніцы, аркатурны пояс на галоўным фасадзе і гладкія дэкаратыўныя цагляныя паясы па ўсіх фасадах. У замке шырока выкарыстаны элементы цаглянай готыкі: балтыйская муроўка паясоў і частак сцен, стральчатыя аркі, аркатурны пояс з чырвонай цэглы на атынкаванай паверхні гарызантальнай цягі, нервюрныя стральчатыя скляпенні. У Лідскім замку аснову абароны складалі сцены, а вежы служылі галоўным чынам для жылля і не выступалі за 4-вугольны абрыс сцен. У абарончых сценах буйныя камяні размешчаны гарызантальнымі радамі паміж цаглянай муроўкай. Размеры камянёў памяншаюцца з вышынёй іх размяшчэння. Унізе яны даходзяць да 1 м, наверсе — да 25—30 см. Вышэй 8 м сцены складзены цалкам з цэглы.

Ёсць думка, што ў адной з вежаў Лідскага замка знаходзілася праваслаўная царква. Т. Нарбут, напрыклад, лічыць, што царква размяшчалася ў адной з вежаў з самага заснавання замка да 1533 г., калі была перанесена ў горад і названа ў гонар Георгія Пераможцы [67. С. 2]. І сапраўды, у час археалагічных раскопак на падлозе 1-га паверха былі знойдзены рэшткі абліцовачнай пліткі і абломкі нейкіх упрыгожванняў з каменю. Унутранай прасторы гэтага памяшкання (8,3 × 8,3 м) хапіла б, каб размясціць у ёй невялікую царкву [86. С. 16].

Крэўскі замак-кастэль быў узведзены ў пачатку XIV ст. і ў плане мае форму няправільнага 4-кутніка (85 × 108,5 × 71,5 × 97,2 м). Першапачаткова вышыня муроў дасягала 12—13 м пры таўшчыні 2,5—3 м. Замак меў

дзве вежы, якія былі ўзведзены праз 5—10 гадоў пасля будаўніцтва сцен і размяшчаліся ў кутках па дыяганалі [151]. Паўночная Княжацкая вежа памерамі 18,65 × 17 м выступала за перыметр замкавых муроў і фланкавала заходнюю, а таксама паўночную (у якой знаходзілася брама) сцены ўмацавання. Вежа пры таўшчыні муроў ад 2,5—2,6 м на ўзроўні трэцяга паверху, да 3 м унізе мела вышыню больш за 25 м. Вышыня ярусаў дасягала 4,8—5 м, першапачатковыя перакрыцці паміж імі былі зроблены па драўляных бэльках. У сярэдзіне XV ст. у цэнтры вежы быў узведзены слуп, на які абапіраліся нервюрныя скляпенні. Будынак меў не менш чатырох паверхаў і склеп-турму ўнізе, пераходы паміж якімі знаходзіліся ў тоўшчы сцен. Трэці і чацвёрты паверхі вежы мелі вялікія вокны са спічастымі перамычкамі, адкосы якіх былі размаляваны фрэскамі. На гэтых паверхах размяшчаліся жылыя княжацкія пакоі, іх сцены і столь таксама былі аздобленыя фрэскамі [152].

4.9. Канвенцкія дамы

У другой палове XIII ст. на тэрыторыі ўладанняў Тэўтонскага ордэна ў Прусіі і ўздоўж Балтыйскага ўзбярэжжа (Лівоніі) узнік тып замка, названы «канвенцкі дом». У Германіі такія замкі засноўваюцца рыцарскімі ордэнамі ў Марыенбургу і Мейсэне (замак Альбрэхта, Саксонія). Канвенцкі дом — гэта ў першую чаргу замак ордэна, які стаў узводзіцца пасля канчатковага ўсталявання рыцараў на захопленых землях з канца XIII ст. і поўнасцю дамінаваў у XIV ст. У гэты час тып цаглянага замка-кляштара распаўсюдзіўся ў Паўночнай Польшчы і Прыбалтыцы. У Эстоніі з 46 замкаў 12 належалі епіскапам. Такія замкі існавалі ў Мальбарку ў Польшчы (Верхні замак, каля 1280 г.), Вентспілсе, Рызе, Цэсісе (скончаны ў 1290 г.) у Латвіі, Курэсаарэ (XIV ст.) і Пярну (канец XIII ст.) у Эстоніі. На Беларусі гэты тып замка не выяўлены, верагодна, таму што крыжакі і іх магістры і епіскапы не паспелі грунтоўна ўладкавацца на нашых землях.

Падобныя абарончыя збудаванні ўяўлялі сабой разнавіднасць замка-кастэля ў яго далейшым развіцці. Нават самі замкі-кастэлі прыстасоўваліся пад канвенцкія дамы (замкі Пыльтсамаа, Нарва і Ракверэ ў Эстоніі). Адначасова дойліды ордэна запазычылі шмат чаго з фартыфікацыйнага будаўніцтва ўсходняга Міжземнамор'я, з якім пазнаёміліся ў час крыжовых паходаў. Гэтыя буйныя комплексы складаліся з уключаных у абарончыя сцены масіўных будынкаў-флігеляў, якія акаймоўвалі прамавугольны двор. Магутныя вонкавыя сцены і вуглавыя вежы канвенцкага дома забяспечвалі яго абарону. Часам у цэнтры такога замка ставіўся данжон.

Перадумовамі ўзнікнення гэтага тыпу замка былі спецыфіка арганізацыі і ўклад унутранага жыцця ордэна, набліжанага да манастырскага, характар яго іерархічнага складу

і кляштарнага вобраза жыцця. Ордэнская тэрыторыя была падзелена на шэраг абласцей. Абшчына асноўнагарыцарскагаканвентупершапачаткова, як правіла, складалася з 12 рыцараў пад началам комтура ці фогта (у наступным іх колькасць павялічылася). Патрабаваліся вялікія памяшканні — капэла, зала капітула, спальня (дарміторый), трапезная (рэфекторый ці рэмтэр), капліца, шпіталь, лазня і інш.

Падобны набор памяшканняў меў канвенцкі дом у Курэсаарэ (Эстонія): у паўночнай частцы на вышыні двух паверхаў знаходзілася капэла з гранёным слупом у цэнтры, побач у паўднёва-заходнім флігелі — парадны рэфекторый, крыжовыя скляпенні з нервюрамі якога абапіраліся на 8-гранныя слупы. Гэтыя залы зручней усяго было размяшчаць у чатырох флігелях, далучаных да сцен кастэля і акаймляючых прамавугольны двор (клаузуру). Канвенцкі дом, па сутнасці, уяўляў сабой уціснутыя ў кастэль жылыя будынкі. Знешне такая крэпасць выклікала ўражанне замкнёнага блока, створанага чатырма крыламі, акаймляючымі прамавугольны двор. У адным з крылаў знаходзілася брама, якая злучала двор са знешнім мірам. Вакол двара, як правіла, праходзіла 2-ярусная скляпеністая аркада-галерэя. Яна, як і ў кляштарных комплексах, называлася клуатрам — крыжовым ходам (замак Германа ў Нарве, Эстонія). На галерэю выходзілі дзверы памяшканняў: парадных на другім паверсе і гаспадарчых на першым. Баявая галерэя звычайна накрывалася асобным дахам са схілам унутр двара.

Канвенцкія дамы мелі, як правіла, абшырнае прадзамкавае ўмацаванне (форбург); такіх форбургаў нярэдка было некалькі. Маштабы комплексу, да ўзвядзення якога прыцягваліся мясцовыя будаўнікі, арганізацыйны і ваенны вопыт ордэнаў, цэнтралізаванае кіраўніцтва будаўніцтвам — усё гэта забяспечвала прагрэсіўнае развіццё ордэнскіх фартыфікацый.

Буйнейшы ў Прыбалтыцы замак тыпу канвенцкага дома пабудаваны ў 1330—1353 гг. у Рызе для магістра Лівонскага ордэна. Службовыя памяшканні і капэла другога паверха, пакоі магістра, дарміторый мелі крыжовыя скляпенні, а трапезная і зала капітула — ячэістыя (сотавыя). У сярэдзіне XIV ст. у крэпасці Германа ў Нарве (Эстонія), пабудаванай у часы магістра ордэна мечаносцаў Фольквіна ў (1229), узводзіцца канвенцкі дом, па вуглах якога ўзвышаліся дзве вісячыя старажавыя вежы.

«Канвентхаузы» будаваліся, аднак, не толькі на тэрыторыі ордэна; іх бралі за ўзор і пры будаўніцтве епіскапскіх замкаў і ўмацаваных кляштараў. Па ўзору канвенцкага дома ў 1330-х гг. пачалося будаўніцтва замка епіскапа Саарэ-Ляанемаа ў Курэсаарэ на востраве Саарэмаа (Эстонія). Гэта адзіны сярэдневяковы замак падобнага тыпу ў Прыбалтыцы, захаваўшы ў асноўным свой першапачатковы воблік. Штуршком да пабудовы гэтай магутнай цытадэлі паслужыла грознае паўстанне астравіцян у 1344—1345 гг.

Замак мае ў плане форму квадрата. Для сувязі паміж флігелямі на першым і другім паверхах маюц-

ца галерэі. Галоўныя памяшканні размяшчаюцца на першым паверсе. Усходнюю частку паўднёвага крыла займае квадратная капэла, нервюрныя скляпенні якой абапіраюцца на 8-гранны слуп. Побач размешчаны святочны рэфекторый — абшырная двухнефавая зала, перакрытая нервюрным скляпеннем, абапёртым на масіўныя 8-гранныя слупы. У заходнім крыле ёсць жылыя памяшканні і дарміторый, у паўночным — яшчэ адзін дарміторый. На паўночна-заходнім вуглу стаіць магутная вежа «Стурвальт», на паўночна-усходнім — невялікая вежа Доўгі Герман. Гэта вежа ў выпадку небяспекі служыла сховішчам — яна была адмежавана ад суседніх памяшканняў глыбокай шахтай праз усе паверхі (служыла таксама адходным месцам). У сутарэнні былі кухня, калодзеж, лазня і склады. Тут жа меліся шахты для абагрэву цёплым паветрам святочнага рэфекторыя і жылых пакояў епіскапа. Замак быў абкружаны прамавугольным форбургам.

На высокім беразе р. Гаўі захаваліся руіны замка Сігулда (Латвія) тыпу канвенцкага дома. Закладзены мечаносцамі ў 1237 г., ён пераходзіць ва ўладанне Лівонскага ордэна і перабудоўваецца, набываючы нерэгулярны абрыс, які адпавядаў рельефу мясцовасці. Захавалася частка сцен капэлы і рыцарскай залы (выкладзеныя з грубага аколатага вапняку) з рэшткамі скляпенняў, гатычнымі праёмамі вокнаў і фрагментамі скупой апрацоўкі інтэр'ераў і фасадаў (ніша ў выглядзе крыжа).

Мечаносцы каля 1220 г. на абасобленым ровам узвышшы ўзводзяць замак Турайда (Літва) у выглядзе сістэмы форбургаў, які меў абрыс адпаведны рэльефу мясцовасці. З 1237 г. — рэзідэнцыя магістра Лівонскага ордэна. Захаваліся рэшткі першапачатковай аднанефавай капэлы. У апошняй чвэрці XIV — пачатку XV ст. на гэтым месцы пабудаваны замак тыпу канвенцкага дома.

Старажытнейшай часткай замка Вастселійна (Эстонія, 1342) з'яўляецца пабудаваная на мысе 4-гранная вежа з капліцай і цэйгаўзам. У трэцяй чвэрці XIV ст. быў пабудаваны галоўны корпус у выглядзе спрошчанага канвенцкага дома, складзенага з трох флігеляў. У гэты час замак лічыцца самым магутным у Старой Лівоніі.

У канцы XIII ст. пачалося будаўніцтва галоўнага будынка замка Вільяндзі (Эстонія) тыпу канвенцкага дома. Ад гэтай самай буйной на той час пабудовы такога тыпу ў Лівоніі (кожны бок — каля 55 м) захаваліся толькі ніжняя частка сцен і заходняя сцяна. Асноўныя памяшканні замка — капліца і зала капітула — размяшчаліся ў паўночным крыле. Над яго паўночна-заходнім вуглом узвышалася квадратная, моцна высунутая наперад вежа. Скульптурны дэкор гэтай крэпасці вылучаецца сваім выключным багаццем.

Набліжаную да канвенцкага дома планіроўку меў замак Каркасі (Эстонія), ён атрымаў нерэгулярную адпаведную рэльефу мясцовасці канфігурацыю. Значную тэрыторыю крэпасці займае форбург. Яго прасторны двор быў акаймаваны адзінкавымігаспадарчымізбудаваннямі, непасрэдна далучанымі да

крапасной сцяны форбурга з валуноў. Рэгулярны ў плане галоўны будынак з капліцай адмяжоўваўся ад форбурга ровам.

Замак-кастэль тыпу канвенцкага дома захаваўся у Айзпуце (Латвія). Выкладзены з грубых валуноў, 4-вугольны ў плане, ён узведзены ў апошняй чвэрці XIII ст. Ордэнскі замак Бауска (Латвія) узведзены ў 1443—1450-я гг. на схіле скалістай грады, што падзяляе рэкі Мемеле і Муссу, як рэзідэнцыя фогта. Мае своеасаблівую планіровачную схему: вежы размешчаны не па вуглах, як у канвенцкім доме, а пасярэдзіне праслаў крапасных сцен. Ордэнскі замак Лудза (Латвія) пабудаваны з цэглы на высокім мысе паміж двух азёр у выглядзе нагорнага вежавага замка, дапоўненага прыбудовай, якая нагадвае канвенцкі дом, і крапасной сцяной абшырнага прадзамка (форбурга).

Да сярэдзіны XV ст. з-за ўсё большага распаўсюджвання артылерыі выпрацаваны ў XIV ст. тып канвенцкага замка стаў непатрэбным; у пачатку XV ст. дабудоўваліся старыя канвенты, але новых ужо не ўзводзілі. Была і іншая прычына адмовіцца ад канвенцкага дома. Ордэну прыходзілася ўсё часцей карыстацца паслугамі наёмнікаў. Высветлілася, што беспрыбытковую і клапатлівую справу абароны танней даручыць нанятым для гэтай мэты прафесіяналам, зрабіўшым вайну сваім промыслам. Для іх уладкавання (патрэбных для абслугоўвання агнястрэльных гармат спецыялістаў, колькасць якіх усё павялічвалася) будынак канвента не быў прыстасаваным, таму што гэта, па сутнасці, быў замак-кляштар, дзе замкнёна жыла невялікая колькасць рыцараў і прыслугі. Больш прыдатным стаў менавіта тып лагера-кастэля, які ўяўляў сабой нешта падобнае на казарму. Акрамя таго, патрэбна мець на ўвазе, што ў XV ст. пачалося разлажэнне ўнутранага жыцця ордэна, і манаскіх правілаў і ўставаў ўжо строга не прытрымліваліся.

4.10. «Арліныя гнёзды»


Найбольш эфектныя і ўражваючыя па эстэтычнаму і эмацыянальнаму ўздзеянню высотныя наскальныя замкі: на вяршыні крутога схлястанага вятрамі ўцёса, быццам арлінае гняздо, прыюціўся прыстанак гордага феадала; уросшая ў круцізну грамада пануе над наваколлем, апавяшчаючы аб сіле і магутнасці ўладара. Сама назва чэшскага замка Орлік адлюстроўвае нязменна ўзнікаючую асацыяцыю з лунаючай над цяснінай грознай птушкай. Арганічным сімбіёзам прыроды і твора рук чалавечых прадстаюць заснаваны на скале замак Троскі ў Чэхіі, лунаючы над белымі ўцёсамі сярод аголенай бязлеснай мясцовасці Спішскі замак і наскальны замак Арава ў Славакіі; заслугоўвае захаплення сярэдневяковы замак Чырвоная Горка, што вянчае вяршыню крутой вапняковай скалы (Чэхія). Некалькі цудоўных горных замкаў узвялі ў XIII ст. тэўтонскія рыцары ў Венгерскім каралеўстве

(Паўднёвай Трансільваніі), запрошаныя сюды для абароны яго межаў. Рэшткі невялікага наскальнага замка захаваліся ў Міраве ў Польшчы. На вяршыні ўцёса пры зліцці рэк пастаўлены англійскі замак Пемброк (каля 1200 г.). Быццам з самых недраў скалы вырастае серымі грамадамі ўмацаванняў замак у Судаке ў Крыме [97. С. 55].

У марных спробах адваяваць гроб Гасподзен крыжакі ў паходах







Мал. 182. Замкі — «арліныя гнёзды»: Эльц (Германия), Гродна (Беларусь), Зальцбург (Аўстрыя),

на Усход сутыкнуліся са складанымі крапаснымі збудаваннямі і замкамі, якімі былі задоўга да іх усеяны горы Кілікіі і Сірыі — Крака, Сафета, Маргата і інш. З часам менавіта гэтыя непрыступныя горныя крэпасці былі ўзяты за аснову самых дасканалых еўрапейскіх замкаў. Там жа запазычылі крыжакі і канцэнтрычную кампазіцыю «арлінага гнязда» ў выглядзе сістэмы двайных-трайных крапасных сцен. «Замак змей» — галоўная крэпасць князёў Кілікійскіх былой Арменіі (Турцыя) — уяўляе сабой складаную, але кампактную цытадэль, абкружаную трыма абручамі непрыступных крапасных сцен глыбока эшаланіраванай абароны. Падобныя горныя цвярдыні ўзводзяць у Сірыі і самі крыжакі — Гаргар, Арымон, Бір. Назапашаны крыжакамі на Усходзе фартыфікацыйны вопыт увасабляецца ў французскіх замках Кусі і Шато-Гаяр.

Па тапаграфічных умовах замкаў такога тыпу на Беларусі не з'явілася, затое меліся ў Эстоніі (Ацепля), Венгрыі (Вышаград, 1241), Чэхіі (Арава, Троскі, Чырвоная Горка), Славакіі (Спішскі замак), Англіі (Бестан, каля 1225 г.).

У нейкай ступені да гэтага тыпу можна аднесці замак на Замкавай гары ў Гродна (32 м над узроўнем вады), які ў XII ст. становіцца княжацкай рэзідэнцыяй. Яго планіроўка вызначылася канфігурацыяй вяршыні халма, на якім ён быў створаны. План нагадваў няправільны трохкутнік са скошанай паўднёва-ўсходняй вяршыняй, дзе размяшчаўся ўезд. Магутныя сцены (таўшчыня да 2,5—3 м) былі выкладзены са слаёў камянёў з выраўніваючым слоем вялікапамернай цэглы, звонку ўмацаваны контрфорсамі. Тэхніка будаўніцтва запазычана са збудаванняў крыжакоў, мела гатычныя рысы.

Першапачаткова замак меў 5 баявых вежаў: адну цыліндрычную (стары данжон XIII ст.) і чатыры 4-гранныя памерамі 12 × 12 м. Праязная вежа-брама стаяла на паўднёвым усходзе, у ніжняй частцы мела турму. У верхнім ярусе Гродзенскага замка месціліся блокі пад'ёму і апускання моста. Круглая вежа знаходзілася з усходняга боку брамы. Трэцяя вежа (Сярэдняя) размяшчалася ў прасле сцяны на беразе Нёмана, чацвёртая і пятая фланкіравалі паўночна-заходні і паўночна-ўсходні вуглы крэпасці.

Вежы ўнутры падзяляліся на некалькі баявых ярусаў, завяршаліся высокімі пакрыццямі. Да паўночна-ўсходняй сцяны замка, паміж брамай і пятай вежай, прыбудаваны 1-павярховы палац (45 × 15 м), які меў некалькі паслядоўна аб'яднаных адно з другім трох крылаў: у плане ў форме квадрата, прамавугольніка і няправільнага чатырохкутніка. Сцены праразалі вузкія вокны тыпу байніц.

Пазней ў яе паўднёвай частцы пабудаваны мураваныя княжацкія палаты (захавалася паўночная сцяна даўжынёй 9,7 і вышынёй 2 м). Палаты складаліся з дзвюх памяшканняў: вялікага (у заходняй частцы будынка) і меншага, падзеленага сцяной на два пакоі. Будынак быў узведзены з цэглы-плінфы ў тэхніцы роўнаўслаёвай муроўкі, звонку аформлены радамі амаль неапрацаваных камянёў, што было характэрна для мясцовай школы дойлідства XII ст.

4.10.1. Рамана-гатычны стыль

У архітэктурна-мастацкай трактоўцы замкаў увасобіліся рысы агульнаеўрапейскага раманскага стылю, які папярэднічаў развіццю готыкі ў раннесярэдневяковым еўрапейскім дойлідстве X—XIII стст. Вызначальная роля належала ўрачыстасуровай, надзвычай масіўнай крапасной архітэктуры (замкі-крэпасці з данжонамі, кляштарна-ордэнскія комплексы, цэрквы, гарадскія дамы), уражанне ад якой выклікалася магутнасцю сцен, падкрэсленай вузкімі праёмамі арачных вокнаў-байніц, ступеньчата паглыбленымі парталамі, лапаткамі, аркатурнымі фрызамі, галерэямі. Важнейшым элементам архітэктурнай кампазіцыі выступаюць суровыя вежы архаічнай 4-граннай формы.

Збудаванні вызначаліся манументальнасцю, масіўнасцю канструкцый, аздабляліся абстрактна-геаметрычным арнаментам і скульптурай на тымпанах парталаў, капітэлях апор. У інтэр'ерах плоскія драўляныя перакрыцці замяняюцца цыліндрычнымі і крыжовымі скляпеннямі. У архітэктурным дэкоры пераважаў скульптурны і арнаментальны рэльеф, у фрэсках — лапідарнасць малюнка, скаваны арнаментальна-плоскасны характар кампазіцыі, умоўная трактоўка фігур.

На жаль, цяжкасць у аднаўленні раманскага стылю абумоўлена стратай большасці аўтэнтычных помнікаў замкава-крапасной архітэктуры Беларусі ці іх значнымі зменамі і дэфармацыямі ў пазнейшыя часы. Рысы архітэктуры раманскага стылю з'явіліся ў замкава-крапасным дойлідстве Беларусі ў XIII—XIV стст. (Камянец, Навагрудак, Ліда, Крэва, Трокі) [53. С. 32]. Элементы познераманскага белакаменнага дэкору адзначаюцца ў архітэктуры замка Турайда (Латвія, каля 1220 г.). Характэрным сведчаннем пранікнення раманскага стылю ў дэкарыроўку замкаў-кастэляў з'яўляецца выкарыстанне аркатурнага фрыза ў замку Трокі (Літва). Прыкметна, што гэты раманскі дэкаратыўны матыў шырока выкарыстоўваецца ў беларускім царкоўным дойлідстве XII—XIV стст. Капітэлі раманскага стылю суседнічаюць з гатычнымі ў архітэктуры канвенцкага дома-замка Вільяндзі ў Эстоніі. Першыя збудаванні раманскага замка Вроцлава з'яўляюцца ў 1240-х гг. [100. С. 191].

Рэфектарый канвенцкага дома-замка Курэсаарэ (Эстонія) замест падпружных арак быў перакрыты транверсальнымі нервюрамі, іх профілі складаюцца з грушападобных паяскоў і жалабкоў. У падобных нервюрах вырашаны аконныя пераплёты і элементы скляпенняў крыжовага ходу. Гэта сведчыць, што ў гэтым замку працавалі майстры з Цэнтральнай Еўропы, верагодна, з Багеміі. Нервюрныя скляпенні выяўлены ў вежы Лідскага замка. Характэрнае стральчатае скляпеністае перакрыцце, абапёртае на цэнтральны слуп, мела зала французскага данжона ў Венсэне.

Замкавая готыка Беларусі мела мала агульнага з класічнай саборнай готыкай, але ярка прагледжваецца яе падабенства з паўночна-

германскай цаглянай готыкай. Яна выступае тут у значна спрошчаным выглядзе, яе формы інтэрпрэтаваны ў духу большай строгасці, прастаты, разумовага практыцызму. Істотную ролю ў гэтай трансфармацыі адыгралі схільныя да аскетызму мастацкія праграмы рыцарска-манаскіх ордэнаў. Замкавая готыка адрознівалася кансерватыўнасцю і цяжкавагавасцю, малой расчленена-насцю архітэктурных мас, была больш масіўнай, аскетычна скупой на дэкор, затое з багатай арнаментыкай фасадаў, якая дасягалася выкарыстаннем паліванай керамікі і стварэннем багатага малюнка атынкаваных і пабеленых нішаў, кантрасна вылучаных на густа-чырвоным фоне цаглянай муроўкі (Камянец). Арачная форма праёмаў змянілася стральчатай (Камянец). Над парадными памяшканнямі ўзводзіліся рабрыстыя скляпенні са складаным узорам нервюр: крыжовыя, пальмавыя, зорчатыя, крысталічныя і г. д. (замак Альбрехтсбург у Мейсэне, 1471—1485).

Узводзілі гэтыя пабудовы цэхі муляраў, імёны якіх да нашых дзён не дайшлі. Цэхі муляраў мігравалі па Еўропе, распаўсюджваючы лепшыя прыёмы і дасягненні еўрапейскай готыкі і будаўнічага мастацтва.

Гатычныя замкі Чэхіі мелі ўнутраныя двары з гатычнымі галерэямі-аркадамі, парадныя памяшканні з сетчатымі скляпеннямі (Крывакатэ, Звікаў). Другая палова XIII ст. у чэшска-славацкім замкавым дойлідстве акрэсліваецца «пршэмыслаўскай готыкай» — вяршыняй замкавага будаўніцтва Еўропы (замкі Карлштэйн, Канапіштэ, Чэшскі Штэрнберк) [140. С. 104].

З готыкай стылістычна звязана архітэктура замка Тракай (Літва) — упрыгожанне радамі фасоннай цэглы, нервюрныя, крыжовыя, зорчатыя скляпенні, абапёртыя на кансолі-маскароны, вітражнае ашкляненне, роспіс альбо фрэска свецкага зместу. Зоркавыя гатычныя скляпенні меліся ў галоўнай вежы ордэнскага замка Бауска (Латвія).

4.11. Заключэнне

Скрозь стагоддзі дайшлі да нас апранутыя ў моцную кальчугу ўмацаванняў, некалі населеныя адважнымі ратаборцамі, непрыступныя замкі. У гады цяжкіх выпрабаванняў, калі пад пагрозай было само існаванне памесцяў, гарадоў, цэлых народаў, яны станавіліся для людзей надзейным сховішчам, цытадэллю, кузняй зброі, школай мужнасці і разумення калектыўнай салідарнасці перад пагрозай іншаземнага зававання. Замкі як аб'екты агульнадзяржаўнага значэння ўвайшлі ў нацыянальную гісторыю як Беларусі, так і іншых еўрапейскіх народаў.

Крэпасці і замкі — гэта непасрэдныя ўдзельнікі беларускай гісторыі, барацьбы беларускага народа з ворагамі, сведкі яго перамог. Вакол іх гартаваліся землі Кіеўскай Русі, Аукштайтыі ды Жмудзі, фарміравалася беларуская дзяржаўнасць. Беларускія замкі спынілі татара-ман-

гольскую навалу на Еўропу і тым самым выратавалі яе ад спусташэння. Адначасова абарончыя фарпосты маладой беларуска-літоўскай дзяржавы з'явіліся непраходнай перашкодай для прасоўвання крыжацкай агрэсіі на Старажытнарускую дзяржаву.

Замкава-крапасное будаўніцтва Беларусі знаходзілася ў адносна адзінай культурнай агульнасці заходнееўрапейскага і славянскага сярэднявечча. Замкі Беларусі і Прыбалтыкі ўяўлялі сабой аднародную і цэласную групу, у іх архітэктурна-планіровачнай арганізацыі вызначальную ролю адыгрывала фартыфікацыйнае мастацтва крыжацкіх ордэнаў. У ордэнскай дзяржавы і прускіх суседзяў нашы продкі пазычылі новыя будаўнічыя традыцыі і прыёмы, матэрыялы і інш. Праз запазычанне ўзораў крыжацкай фартыфікацыйнай архітэктуры Беларуска-Літоўская дзяржава наогул была моцна звязана з нямецкім сярэдневяковым мастацтвам, пад уплывам якога беларускае дойлідства пайшло шляхам паўночнанямецкай готыкі. Замкава-крапасное дойлідства, асабліва XIII—XIV стст., адыграла даволі важную ролю ў далейшым развіцці беларускай архітэктуры, заклаўшы падмурак для стылістычнага развіцця не толькі ваеннага, але і грамадскага і нават царкоўнага будаўніцтва. Разам з тым мясцовае фартыфікацыйнае будаўніцтва прымала пэўны спецыфічны характар пад уплывам папярэдніх абарончых умацаванняў.

Літаратура

1. *Пашуто В. Т.* Образование Литовского государства. М., 1959. С. 265—267.
2. *Codex* Epistolaris Vitoldi, magni ducis Lithuaniae (1376—1430). Krakow, 1882. S. 147.
3. *Очерки* социально-экономической истории Англии и Франции XIII—XVII вв. М., 1960. С. 140.
4. *Якимович Ю. А.* Зодчество Белоруссии XVI — середины XVII в.: Справочное пособие. Мн., 1991.
5. *Ткачев М. А.* Замки Белоруссии. Мн., 1987.
6. *Троян М. В.* Мукачевский замок. Ужгород, 1982. С. 11.
7. *Черняк В. З.* Семь чудес и другие. М., 1990. С. 124.
8. *ПСРЛ.* М., 1975. Т. 32. Стб. 19, 23, 132, 135.
9. *Станькова Я., Пехар И.* Тысячелетнее развитие архитектуры. М., 1987. С. 139.
10. *Мацa И. Л.* Архитектура Чехословакии. М., 1959. С. 66.
11. *Очерки* из истории и народных сказаний (средняя история). М., 1886.
12. *Французская* деревня XII—XIV вв. и Жакерия. М.; Л., 1935.
13. *Рузер Л. И.* От рабовладельческой общины к пролетарской революции. М.; Л., 1927.
14. *ПСРЛ.* СПб., 1908. Стб. 63, 64, 132, 232, 282, 816, 876, 878, 927; М., 1956. Т. 29. Стб. 300; М., 1962. Т. 1. Стб. 20, 159, 300.
15. *Stryjkowski M.* Kronika Polska, Litewska, Zmodzka i wszystkiej Rusi. Warszawa, 1846—1848. T. 1—2.
16. *Герберштейн С.* Записки о московских делах. СПб., 1908.
17. *Гейденштейн Р.* Записки о Московской войне (1578—1582). СПб., 1889.
18. *Второе* хождение дьяка Трифона Коробейникова в святые земли // Чтения ОИДР при Московском университете. М., 1897. Кн. 1. Ч. 2. Л. 5—7.

19. *Лаппо И. И.* Полоцкая ревизия 1552 года. М., 1905. С. 1.

20. *Городские* поселения Российской империи. СПб., 1860. Т. 1. С. 237.

21. *Die* livlandische Chronik Hermann's von Wartberge. Aus dem Lateinischen ubersetzt von Ernst Strehlke. Berlin und Reval, 1864.

22. *Улащик Н. Н.* Очерки по археологии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода. М., 1973. С. 70.

23. *Живописная* Россия. СПб., 1882. Т. III.

24. *Материалы* для географии и статистики России. СПб., 1861—1864.

25. *Сапунов А. П.* Витебская старина. Витебск, 1883—88. Т. 1—4.

26. *Шпилевский П. М.* Путешествие по Полесью и белорусскому краю. СПб., 1858.

27. *Описание* каменной башни близ Каменца // Вестник Западной России. 1870.

28. *Балабушевич В.* Краткий исторический очерк Каменец-Литовского и современное состояние... построенной в XIII в. каменной башни // Литовские епархиальные ведомости. 1881. № 15, 24.

29. *Старый* замок и Коложская церковь // Памятная книжка Гродненской губернии на 1890 г. Гродно, 1889.

30. *Авенариус Н. П.* Башня волынского князя Владимира Васильковича в Каменце-Литовском // Труды о-ва исследователей Волыни. Житомир, 1902. Т. 1.

31. *Шимелевич М.* Город Лида и Лидский замок. Вильно, 1905. С. 40—41.

32. *Россия,* полное географическое описание нашего Отечества. СПб., 1905. Т. 9.

33. *Иодковский И. И.* Замок в Мире // Древности. М., 1915. Т. 6.

34. *Иодковский И. И.* Храмы, приспособленные к обороне, на Литве и Литовской Руси // Древности. 1915. Т. 6.

35. *Gurtler R.* Roboty konserwatorskie na gorze Zamkowej w Nowogrodku // Ochrona zabytkow. Warszawa, 1930—1931.

36. *Remer J.* Architektura monumentalna w wojewodstwie Nowogrodskim. Nowogrodek, 1926.

37. *Lorentz St.* Konserwacja ruin zamkowych w Wilenszczyznie i Nowogrodczyzne // Ochrona zabytkow. Warszawa, 1930—1931. T. 1—4.

38. *Wojcechowski J.* Stary zamek w Grodnie. Warszawa, 1938.

39. *Jakimowicz R.* Dawidgrodek. Pinsk, 1931.

40. *Hedemann O.* Historia powiatu Braslawskiego. Wilno, 1930.

41. *Morelowski M.* Zrysy syntetyczne sztuki Wilenskiej od gotyki do neoklasicyzmu. Wilno, 1938—1939.

42. *Zmigrodzki J.* Nowogrodek i okolice. Nowogrodek, 1931.

43. *Tauruginski B.* Nieswiez. Warszawa, 1937.

44. *Lowmianski H.* Rys historyczny wojwodstwa Nowogrodskiego w lego dzisiejszych granicach. Wilno, 1935.

45. *Даўгяла З.* Барысаўскі замак // Працы археалагічнай камісіі. Менск, 1930.

46. *Даўгяла З.* Аршанскі замак // Працы археалагічнай камісіі. Менск, 1930.

47. *Адзярыха М.* Апісанне Койданаўскага замку // Наш край. 1926. № 1.

48. *Брэжго Б.* Замкі Віцебшчыны. Вільня, 1933. Кн. 1.

49. *Шчакаціхін М.* Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Мн., 1928.

50. *Егоров Ю.* Градостроительство Белоруссии. М., 1954;

51. *Митянин А. Я.* Оборонительные сооружения Белоруссии XIII—XVII вв. // Сборник научных работ Института строительства и архитектуры АН БССР. Мн., 1958. Вып. 1.

52. *Митянин А. Я., Чантурия В. А.* Выдающиеся памятники белорусского зодчества // Строительство и архитектура Белоруссии. Мн., 1958. Вып. 2.

53. *Чантурия В. А.* История архитектуры Белоруссии. Мн., 1969.

54. *Ткачоў М. А.* Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII стст. Мн., 1978.

55. *Menclova D.* Ceske hrady. Praha, 1972.

56. *Vasiliak E.* Nad hrady a zamky. Praha, 1970.

57. *Hruska E.* Stavba miest. Bratislava, 1970.

58. *Swiechowski Z.* Sztuka romanska w Polsce. Warszawa, 1982.

59. *Турцевич Ар.* Трокский замок. Вильна, 1901.

60. *Encyklopedyja* powszechna. Warszawa, 1862. T. 10. S. 751.

61. *Петрушевский Д. М.* Очерки из истории английского государства и общества в средние века. М., 1937.

62. *Виппер Р.* История Западной Европы в средние века. М., 1923.

63. *Караев Г. Н.* Грюнвальдская битва. М., 1996.

64. *Тарасаў К. І.* Памяць пра легенды. Постаці беларускай мінуўшчыны. Мн., 1994.

65. *Balinski M., Lipinski T.* Starozytna Polska. Warszawa, 1846. T. 3.

66. *Skriptores* Rerum Prussikarum (SRP). Leip ig, 1861. T. 1.

67. *Narbutt A.* Dzieje narodu Litewskiego. Wilno, 1939. T. 5.

68. *Remer J.* Architektura monumentalna w w-wie Noaogrodzkim. Nowogrodek, 1926. S. 44.

69. *Латвийский Г.* Хроника Ливонии. М., 1938.

70. *Тихомиров М. Н.* Средневековая Москва в XIV—XV вв. М., 1957.

71. *Маркс К., Энгельс Ф.* Сочинения. М., 1962. Изд. 2-е. Т. 22. С. 19.

72. *Gloger Z.* Geografia historyczna. Krakow, 1900. S. 302.

73. *Пашуто В. Т.* Очерки по истории Галицко-Волынской Руси. М., 1950. С. 287.

74. *Будрейка Э.* Вильнюсский замок. Вильнюс, 1980.

75. *Lorentz St.* Wycieczki po wojwodstwie Wilenskim. Wilno, S. 39—41.

76. *Zahorski W.* Zamek w Krewie // Ziemia. Krakow, 1912. S. 777.

77. *Сидорова Н. А.* Очерки по истории ранней городской культуры во Франции. М., 1953.

78. *Андреев Н.* Западноевропейское средневековье. М.; Пг., 1923.

79. *Маца И. Л.* Архитектура Чехословакии. М., 1959.

80. *Лависс Е. и Рамбо А.* Культура и цивилизация Западной Европы в эпоху крестовых походов (1095—1270). М., 1895.

81. *Алексеев Л. В.* Древний Мстиславль в свете археологии // Гістарычна-археалагічны зборнік. Мн., 1995. № 6.

82. *Kazmierczyk J.* Wroclaw lewobrzezny we wczesnym sredniowieczu. Wroclaw, 1970. Cz. II. Rozdz. I. S. 11.

83. *Бершадский С. А.* Русско-еврейский архив. СПб., 1882. Т. 1. С. 26.

84. *Якимович Ю. А.* Зодчество Белоруссии XVI — середины XVII в.: Справочное пособие. Мн., 1991.

85. *Лаппо И. И.* Полоцкая ревизия 1552 года. М., 1905.

86. *Ткачоў М. А.* Лідскі замак // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1971. № 2. С. 15.

87. *Стерлигов В. Д.* Одна из градостроительных проблем столицы // Архитектура и строительство Москвы. 1959. № 4.

88. *Стерлигов В. Д.* Градостроительное истолкование ландшафтных закономерностей // Архитектура и строительство Москвы. 1959. № 10.

89. *Сурмина И. О.* Самые знаменитые крепости России. М., 2002. С. 237.

90. *Раппопорт П. А.* Военное зодчество западнорусских земель X—XIV вв. // Материалы и исследования по археологии СССР. М., 1967. № 140.

91. *Квитницкая Е. Д.* Планировка Гродно в XVI—XVIII вв. // Архитектурное наследство. 1964. № 17. С. 18.

92. *БСЭ.* М., 1972.

93. *Митянин А. Я., Вараксин Н. В.* К вопросу о деревянном замковом строительстве в Белоруссии (XVI—XVII вв.) // Сборник научных работ Ин-та строительства и архитектуры АН БССР. 1960. Вып. 3. С. 206. Рис. 2.

94. *Мокеев Г. Я.* Что такое перси Пскова // Архитектурное наследство. М., 1972. № 19. С. 27—31.

95. *Мокеев Г. Я.* Перси Пскова (по историческим данным и морфологическим признакам) // Архитектурное наследство. 1972. № 20. С. 27.

96. *Шуази О.* История архитектуры. М., 1937. Т. 2.

97. *Секиринский С. А.* и др. Крепость в Судаке. Симферополь, 1983.

98. *Теринговров Д. Я.* Новый путеводитель по г. Витебску. Витебск, 1913. С. 10.

99. *Сурмина И. О.* Самые знаменитые крепости России. М., 2002.

100. *Malachowicz E.* Romanski zamek na Ostrowiu we Wroclawiu // Kwartalnik architektury i urbanistyki. 1973. T. XVIII. Zeszyt 3—4.

101. *Жедон Таллеман де Рео.* Занимательные истории (жизнь Франции эпохи Генриха IV и Людовика XIII). Л., 1974. С. 100.

102. *Штыхов Г. В.* Охранные раскопки в Минске // За передовую науку. 5 сентября 1986 г.

103. *Энцыклапедыя* літаратуры і мастацтвазнаўства Беларусі. Мн., 1987. Т. 4. С. 488.

104. РГИА, ВУА, ед. хр. 22075.

105. *Всеобщая* история архитектуры. М., 1968. Т. 6.

106. *Тверской Л. М.* Русское градостроительство до конца XVII в. Л.; М., 1953.

107. *Rozpedowski J.* Zamek romanski w Legnicy // Szkice Legnickie VI. Wroclaw, 1971.

108. *Воронин Н. Н.* Древнее Гродно // Материалы и исследования по археологии СССР. М., 1954. № 41. С. 129—137;

109. *Ткачоў М. А.* Исследования памятников военного зодчества Белоруссии // Археологические открытия. 1969. М., 1970. С. 312.

110. *Трусов А. А.* Древних стен возрождение. Прошлое и настоящее Лидского замка. Мн., 1990.

111. *Кетр А.* Castles in Color. Pool, 1977.

112. *Krassowski W.* Dzieje budownictwa i architektury na ziemiach Polski. Wydawnictwo Arkady. 1990. T. 2.

113. *Reichertova K.* K problematice vyzkumu stredoveke tvrze. Pamatky archeologicke, r. LII. Praha, 1961.

114. *Gero L.* Magyarorszagi varepiteszet. Budapest, 1955.

115. *Guerquin B.* Zamki Slaskie. Warszawa, 1957.

116. *Раппопорт П. А.* Волынские башни // МИА. 1952. № 31.

117. *Вартберг Г.* Ливонская хроника. Сборник материалов и статей по истории Прибалтийского края. Рига, 1879. Т. 2.

118. *Нейман В. И.* Военное зодчество в Прибалтийском крае в средние века // Труды IX Археологического съезда в Вильне 1893 г. Вильна, 1893. Т. 1.

119. *Псковские* летописи. М., 1955. Вып. 2.

120. *Гольдштейн А. Ф.* Башенные сооружения горного Дагестана // АН. 1973. № 21.

121. *Усейнов М., Бретаницкий Л., Саламзаде А.* История архитектуры Азербайджана. М., 1963. С. 59.

122. *Умаров С. П.* Средневековая материальная культура горной Чечни XIII—XVII вв. Автореф. дис. ... канд. ист. наук. М., 1970. С. 16.

123. *Усейнов М., Бретаницкий Л., Саламзаде А.* История архитектуры Азербайджана. М., 1963. С. 62—65.

124. *Ипатьевская* летопись // ПСРЛ. М., 1962. Т. II. Стб. 844.

125. *Косточкин В. В.* Русское оборонное зодчество (конец XIII — начало XVI в.). М., 1962. С. 96—97.

126. *Рыбаков Б. А.* Любеч — феодальный двор Мономаха и Ольновичей // КСИА. 1964. Вып. 99. С. 22.

127. *Юшко А. А.* Московская земля в XI—XIV вв. М., 1991.

128. *Раппопорт П. А.* Оборонительные сооружения западной Волыни XIII—XIV вв. // Swiatowit. Warszawa, 1962. T. 24.

129. *Отклики* и заметки // Рабочий путь. Смоленск, 1927. № 130.

130. *Kajzer L.* Zamki i spoleczenstwo. Lodz, 1993. S. 101.

131. *Тарасаў С. В.* Полацк 9—17 стст. Гісторыя і тапаграфія. Мн., 1998. С. 44—46, 50.

132. *Алексеев Л. В.* Проблема становления культово-оборонного зодчества Руси в свете раскопок в Мстиславле // РА. 1993. № 4. Рис. 9.

133. *Макараў М.* Да пытання пра выкарыстанне тэрміну «данжон» (donjon) у беларускай гістарычнай літаратуры // Гістарычны альманах. Гародня, 2001. Т. 5.

134. *Лысенко П. Ф.* Берестье. Мн., 1985. С. 57.

135. *Алексеев Л. В.* Смоленская земля в XI—XIII вв. Очерки истории Смоленщины и Восточной Белоруссии. М., 1980.

136. *Беларускі* архіў. Менск, 1931. Т. III. С. 183.

137. *Dalbor W.* Wczesnosredniowieczny Grod w Gnieznie // Swiatowit. Warszawa, 1955. T. XXI. S. 239.

138. *Кирпичников А. Н.* Военное дело на Руси. Л., 1976. С. 61.

139. *Нейман В. И.* Военное зодчество в Прибалтийском крае в средние века // Труды IX Археологического съезда. 1895. Т. 1.

140. *Станькова Я., Пехар И.* Тысячелетнее развитие архитектуры. М., 1987.

141. *Kenyon J. R., Thompson M.* The Origin Of The Word «Keep» // Medival Archaeolology. Volume 38. London, 1994. P. 40, 49.

142. *Brockhaus* Enzyklopadie in 24 Banden. T. 3. Mannheim, 1987. P. 120.

143. *Турин В. С.* Города и замки Луары. М., 1986. С. 176.

144. *Krassowski W.* Dzieje budownictwa i architektury na ziemiach Polski. Wydawnictwo Arkady. 1990. T. 2. S. 106.

145. *Батюшков П. Н.* Белоруссия и Литва. СПб., 1890. С. 373—374;

146. *Помнікі* гісторыі і культуры Беларусі. 1973. № 2. С. 27—28.

147. *Абрамаускас С.* К вопросу генезиса крепостных сооружений типа «кастель» в Литве // Строительство и архитектура. Вильнюс, 1963.

148. *Glasen K. H.* Die mittelalterlach Kunst im Gebiste des Deutsch ordensstaaten Preussen. I. Die Burgbauten. Konigsberg, 1927. P. 13—28.

149. *Франко Кардини.* Истоки средневекового рыцарства. М., 1987. С. 343.

150. *Szukiewicz W.* Zamek w Lidzie // Ziemia. Krakw, 1911. T. 2. S. 748.


151. *Ткачоў М. А., Чарняўскі І. М.* Крэўскі замак // Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1993. С. 352.

152. *Чарняўскі І. М.* Грамадскае мураванае дойлідства Беларусі ў 12—15 стст. // Помнікі мастацкай культуры Беларусі. Мн., 1989. С 111.

Глава 5

АРХІТЭКТУРА ШЛЯХОЎ ЗНОСІН IX–XIII стст.

(А. С. Сардараў)



5.1. Пачатак фарміравання шляхоў зносін і іх уплыў на ландшафт беларускіх зямель са старажытных часоў

Развіццё цывілізацыі і культуры, а таксама пераўтварэнне ландшафту на беларускіх землях цесна звязаны і ў многім вызначаліся існаваннем і накірункам шляхоў руху старажытных плямёнаў. Першапачатковымі шляхамі зносін, дадзенымі прыродай, былі рэкі. Менавіта яны вызначалі месцы рассялення (стаянак) старажытнага чалавека і шляхі яго магчымых міграцый.

Археалагічныя знаходкі і даследаванні паказваюць, што стаянкі неандэртальцаў знаходзіліся на берагах шэрага рэк: Свяцілавічы на Беседзі, Абідавічы на Дняпры, Бярдыж на Сожы, Юравічы на Прыпяці. Галоўныя прычыны гэтага ў эпоху палеаліту былі наступныя.

1. Рух старажытнага чалавека, перш за ўсё ў пошуках вады і ежы, з'яўляўся неад'емнай формай яго існавання.

2. Ежа і вада, у сваю чаргу, натуральным чынам звязаны з рэкамі і рачнымі далінамі:

— тут групаваліся дзікія жывёлы, якія былі аб'ектам палявання (месцы вадапояў);


— рака з'яўлялася крыніцай вады;

— аб'ектам рыбалоўства была рыба, якая вадзілася ў рацэ.

3. Уласцівая чалавеку якасць эвалюцыйнага развіцця свядомасці, што звязана з атрыманнем дадатковай інфармацыі аб навакольным асяроддзі пры перамяшчэннях.

Акрамя «кароткіх зносін» у пошуках ежы, што магло, відавочна, здарацца на абмежаваных тэрытарыяльных адрэзках (1—5 км), ужо ў эпоху пераходу палеаліту да мезаліту (ад 15—10 тысяч гадоў таму) існавалі «доўгія зносіны», якія вымяраліся сотнямі кіламетраў. Гэтыя зносіны звязаны з кліматычнымі зменамі: старажытныя плямёны спачатку мігруюць на поўдзень пры наступленні ледавіка, а потым зноў рассяляюцца на пакінутых ледавіком тэрыторыях. На змену ледавіку на беларускія землі прыходзяць лясы, і толькі рэкі злучаюць тэрыторыі рассялення розных плямёнаў. Мезалітычныя стаянкі таксама выяўляюцца па берагах Нёмана, Прыпяці, Буга, Сожа, Дняпра і Заходняй Дзвіны. Дадатковай прычынай «прыцягнення да рэк» стаў той факт, што менавіта на берагах рэк часта выходзілі крэмневыя адклады, якія таксама сталі прыроднай крыніцай матэрыялаў для першасных прылад працы каменнага веку: сякер, нажоў, скрабкоў і г. д.

Пераход ад стаянак па шляхах міграцый да пастаянных паселішчаў ажыццяўляўся на беларускіх



Мал. 183. Сувязь паселішчаў палеаліту і неаліту з рачнымі камунікацыямі на Беларусі

землях у эпоху неаліту — паміж 4500 і 1800 гг. да н. э. Археалагічныя знаходкі, якія выяўляюць арэалы этнакультурнага адзінства тых ці іншых плямёнаў у эпоху неаліту, таксама цесна звязаны з рачнымі шляхамі зносін: нёманская, днепра-данецкая, верхнядзвінская, нарвенская (заходнедзвінская) археалагічныя культуры. Самым простым сродкам руху становіцца човен — выдаўбленая з бервян старажытная лодка.

Балта-славянскі перыяд беларускай гісторыі (VI—VII стст. н. э.) характарызуецца важным ландшафтным пераўтварэннем — акрамя самых простых паселішчаў пачынаюць ствараца (будавацца) гарадзішчы з валамі і ўмацаваннямі, якія часцей за ўсё размяшчаюцца па мысах рэк ці каля іх злучэнняў. Гэта мілаградскія і зарубінецкія культуры, якія адносяцца да «жалезнага» стагоддзя і размяшчаліся ў басейнах рэк.

Акрамя асноўных напрамкаў міграцыі славянскіх (старажытна-беларускіх) плямёнаў, якія суправаджаліся асіміляцыйным працэсам балтаў, менавіта ў гэты гістарычны перыяд тут фарміруюцца першыя «транснацыянальныя маршруты». Яны фарміруюцца па рэках Заходняя Дзвіна і Днепр, па іх водападзелах, а таксама ад Балтыйскага мора па Нёмане. Гэтыя шляхі зносін фарміруюцца і падтрымліваюцца, у прыватнасці, паходамі вікінгаў на хуткасных парусна-вёславых суднах.

Беларускія рэкі становяцца не толькі крыніцай ежы, але і маршрутамі гандлёвых зносін, шляхамі ваенных паходаў, а таксама яшчэ больш магутнай крыніцай інфармацыі пра навакольны свет, пра новыя землі і народы, якія іх насяляюць. Археа-

лагічныя знаходкі пацвярджаюць гэты факт (прадметы быту вікінгаў ці скарбы рымскіх, візантыйскіх, арабскіх манет).

Рэкі, найстаражытныя шляхі зносін, у многім вызначаюць формы рассяленняў старажытных славян, продкаў беларусаў: крывічоў (палачан), дрыгавічоў, радзімічаў, а таксама фарміруюць іх матэрыяльна-прасторавае наваколле, актыўна змяняючы ландшафт.

Менавіта ўздоўж рэк ствараюцца могільнікі (курганнага, камернага тыпаў), менавіта тут з'яўляюцца старажытныя свяцілішчы, ставяцца язычніцкія ідалы.

5.2. Існаванне пастаянных зносін паміж удзельнымі княствамі


У IX–X стст. на землях, дзе жылі продкі сучасных беларусаў (крывічы-палачане, радзімічы, дрыгавічы), адбываецца распад першабытна-абшчыннага ладу і фарміраванне феадальных адносін. Гэты працэс вызначаецца як сацыяльна-эканамічным развіццём народаў, так і прыродна-ландшафтнымі (прасторавымі) фактарамі, перш за ўсё — наяўнасцю камунікацыйных калідораў і зносін.

«Доўгія зносіны» — гэта па-ранейшаму асіміляцыйны рух славян у бок Балтыкі, а таксама пранікненне на беларускія землі варагаў (нарманаў), што неслі не толькі аб'екты матэрыяльнай культуры, але і новыя сацыяльныя ідэі (напрыклад, структуру ўлады: князь — дружына).

Адначасова ў канцы X ст. пачынаюць узнікаць і новыя дзяржаўныя ўтварэнні: Полацкае княства на поўначы беларускіх зямель і Тураўскае — на поўдні. Яны ўзніклі непасрэдна на важнейшых водных шляхах, звязаных паміж сабою і з асноўным камунікацыйным калідорам «поўнач — поўдзень» — шляхам «з варагаў у грэкі».

Ужо гарадзішчы-паселішчы першабытна-абшчыннага перыяду беларускай гісторыі звязаны з вадаёмамі (натуральнымі камунікацыямі). Узнікненне ж гарадоў было абумоўлена не толькі рэкамі, але і воднымі транспартна-камунікацыйнымі вузламі: старажытны Полацк размяшчаўся на тым жа адрэзку Заходняй Дзвіны (якая выходзіць да Балтыйскага басейна), дзе з поўначы ў яе ўпадала Палата (мясцовыя зносіны), а з поўдня — Ула і Ушача, звязаныя праз валокі (сухапутныя адрэзкі шляху «з варагаў у грэкі») з Дняпроўска-Чарнаморскім басейнам. Тураў жа, які размяшчаўся на сярэдняй плыні Прыпяці, таксама выходзіў і на шлях «з варагаў у грэкі», і праз Піну, Мухавец і Заходні Буг у Польшчу, Лівонію і Балтыйскі басейн.

Ужо першыя пісьмовыя паведамленні ўказваюць на камунікацыйны працэс як на найбольш важны фактар развіцця нашых зямель: Рагвалод прыйшоў з-за мора «и имяше волость в Полотьске, а Тур, Турове» [2. Стб. 63–64].



Мал. 184. Галоўныя камунікацыйныя (доўгія) маршруты на Беларусі ў раннім сярэдневякоўі

Адзяржаўленне, утварэнне новых сацыяльна-палітычных і эканамічных структур на Беларусі цесна звязана з кантролем тэрыторый з цэнтраў княстваў, які ажыццяўляўся па водных і сухапутных камунікацыях.

Ужо першая згадка Полацка пад 882 г., які «под Олгом суще», гаворыць аб тым, што кіеўскі князь Алег кантраляваў гэтую тэрыторыю, ажыццяўляючы паходы за зборам даніны па азначаных водных і сухапутных маршрутах. У 902 г. Алег ідзе на грэкаў «на конях и кораблях» [1. Стб. 29], узяўшы, як вядома, у паход крывічоў і радзімічаў — продкаў беларусаў. Пад 980 г. Іпацьеўскі летапіс апісвае паход кіеўскага князя Уладзіміра на Полацк: «...и приде Володимир на Полотеск» [2. Стб. 63—64].

У XI—XII стст. па меры ўзнікнення новых гарадоў на беларускіх землях сістэма камунікацыйных сувязей становіцца больш разгалінаванай, ахопліваючы ўсё больш шырокія прасторы. «В то же время посла князь Мстислав браю свою на Кривичи, четырми пути, Вячеслава из Турова, Андрея из Володимира, а Всеволодка из Городка и Вячеслав Ярославич из Клеченска. Тем повеле ити к Изяславлю, а Всеволоду Олеговичу повеле ити со своею браю на Стрежев к Борисову» [1. Стб. 297—298]. Пад 1158 г.: «В то же лето идее

Изяслав на Ярославичи к Туров...» [1. Стб. 491—492]. Пад 1159 г. аб Рогваладзе Барысавічу: «...приехав к Случеску» і «...поиде к Менеску» [2. Стб. 493—495]. Пад 1180 г.: «Святослав ... поиде к Рогачеву, из Рогачева поехал по Днепру к Киеву» [2. Стб. 621].

Такім чынам, у XI—XII стст. на беларускіх землях фарміруецца ўстойлівая сетка сухапутных зносін, якія звязвалі як мясцовыя княствы з кіеўскімі, калянёманскімі землямі («сярэднія зносіны»), але і праз іх з Балтыйскім і Чарнаморскім басейнамі («дальнія зносіны»).

Найбольш важным у гэты перыяд былі водна-сухапутныя камунікацыі, якія звязвалі цэнтры княстваў з Балтыйскім і Чарнаморскім басейнамі: Полацк—Кіеў (маршруты па рэках і берагах рэк Заходняя Дзвіна, Уле, Эсе, волаках, Бярэзіне і Дняпру), Полацк—Лівонія (па Заходняй Дзвіне), Полацк—Ноўгарад—Пскоў—Тураў—Кіеў, Кіеў—Бярэсце. У той жа час надзвычай важнымі сталі «ўнутраныя зносіны»: Полацк—Тураў, Полацк—Мінск, Полацк—Друцк, Полацк—Ізяслаў, Мінск—Слуцк, Мінск—Ізяслаў, Ізяслаў—Лагойск, Мінск—Орша, Полацк—Віцебск, якія, аднак, адыгралі ролю не толькі як «княжацкія маршруты», але і безумоўна садзейнічалі развіццю гандлёвых зносін, распаўсюджанню рамёстваў, духоўных ведаў.

Нараджэнне і развіццё беларуска-літоўскай дзяржавы ў заходніх раёнах у XII—XIII стст. таксама адбываецца пад непасрэдным уздзеяннем важнейшага камунікацыйнага калідора, якім з'яўлялася рака Нёман. Менавіта Нёман з яго прытокамі Шчарай, Плісай, Россю вызначалі ўсталяванне Гродзенскага, Ваўкавыскага, Навагрудскага, Слонімскага княстваў, а таксама будучы вектар іх сацыяльна-эканамічнага развіцця да Вільні. Гродзенскія князі ў 1127 г. накіроўваюцца ў полацкія землі (каб прыняць удзел у паходзе Мсціслава Кіеўскага), у 1132 г. — на Літву, у 1183 — на полаўцаў; гэта значыць існуюць камунікацыйныя сувязі Гродна і з Поўначчу, і з Поўднем, і з Паўночным Захадам. Спаборніцтва балтыйска-літоўскіх князёў (Міндоўга, Войшалка, Тотвіла) з галіцка-валынскімі князямі таксама адбываецца ва ўмовах інтэнсіўных паходаў, якія вызначаюцца ўстойлівай камунікацыйнай сеткай.

5.3. Вытокі будаўніцтва на старажытных шляхах

Накірунак і інтэнсіўнасць развіцця матэрыяльнай культуры ў раннім сярэднявеччы на беларускіх землях у многім вызначаліся і забяспечваліся прыроднымі ўмовамі, якія тут існавалі. Прырода была крыніцай жыццядзейнасці і фактарам, які ўскладняў развіццё цывілізацыі. Мноства лясоў на гэтых землях давала цудоўны матэрыял для сельскагаспадарчай дзейнасці. У той жа час лясы займалі тэрыторыі, якія не маглі быць занятымі сельскагаспадарчымі землямі, лясы таксама значна ўскладнялі развіццё ўстойлівых шляхоў зносін, што па-

куль вызначаліся, галоўным чынам, воднымі шляхамі.


Можна адзначыць тры прыродна-ландшафтныя фактары, якія непасрэдна вызначылі накірунак развіцця шляхоў зносін на беларускіх землях. Гэта наяўнасць лясоў як крыніцы будаўнічага матэрыялу, але ў той жа час як затрымкі для стварэння пастаянных шляхоў зносін; наяўнасць водных перашкод (рэк, ручаін, балот), якія ўскладнялі рух, але і садзейнічалі (рэкі) фарміраванню прыродных мадэляў дарог. Акрамя таго, наяўнасць воднага ледніковага каменя, якое таксама ўжо ў раннім сярэднявеччы пачынае адыгрываць ролю дапаможнага будаўнічага матэрыялу.

Вытворчыя навыкі сярэднявечнага беларуса таксама фарміраваліся па наступных тэхналагічных накірунках. Гэта, перш за ўсё, земляныя работы: будаўніцтва простых валоў, равоў (умацаванні), зямлянак (жылля), курганаў (могільнікі), а таксама сельскагаспадарчая апрацоўка зямлі (ворыва, будаўніцтва межаў). Другі важны накірунак — гэта праца з дрэвам, якое, акрамя вытворчасці прылад працы і побыту, выкарыстоўваецца ў якасці будаўнічага матэрыялу для ўмацавання жылля (ствалы, галіны). Каменная творчасць ўзнікае як элемент будаўнічага працэсу падчас узвядзення свяцілішчаў, маршрутных арыенціраў (Рагвалодаў і Барысаў камяні), але і як непасрэдна будаўнічы матэрыял пры закладцы прымітыўных фундаментаў.

На падставе прагрэсіўнага развіцця будаўнічых навыкаў, а таксама эвалюцыі відаў перамяшчэння і транспартных сродкаў развіваюцца тэхналогіі ўладкавання і формы замацавання на мясцовасці шляхоў зносін. Можна прапанаваць наступную храналагічную табліцу.

Тэхналогія ўстройства пастаянных дарог паміж гарадамі і паселішчамі была цесна звязана таксама з сацыяльна-палітычнымі ўмовамі і, перш за ўсё, з характарам перамяшчэння вялікіх ваенных атрадаў, якія накіроўваліся князямі для збору даніны. Летапіс указвае, напрыклад, на падрыхтоўку князя Уладзіміра да паходу на свайго сына Яраслава, які ўладарыў у Ноўгарадзе: «... и рек Володимир: теребите путь и мостите мост» [1. Стб. 130]. Тут непасрэдна ўзгадваюцца два тэхналагічныя прыёмы ўладкавання прымітыўных дарог: цярабленне (расчыстка) шляхоў у лесе ад дрэў і хмызнякоў і ўладкаванне мастоў, грэбляў праз водныя перашкоды.

Форма шляхоў зносін	Тэхналогія ўладкавання	Від перамяшчэння, транспартны сродак	Гістарычны перыяд узнікнення
Сцежка паміж жыллём да месцаў палявання, рыбалоўства	Утоптванне па меры перамяшчэння	Пешаходны	Палеаліт
Шляхі паміж паселішчамі	Расчышчэнне лесу, уладкаванне часовых гацей	Пешаходны, верхам на конях	Палеаліт
Пастаянныя дарогі паміж гарадамі і паселішчамі, вуліцы ў гарадах	Земляныя працы (канавы), устройства пастаянных масткоў, грэбляў, машчэнне	Гужавы (падводы, вазы)	IX—XII стст.



Мал. 185. Развіццё тэхнікі драўляных машчэнняў (па П. Лысенка, П Русаву)

У перыяд ранняга сярэднявечча ўзнікае і форма транспартнага перамяшчэння на санях з выкарыстаннем коней як цяглавай сілы. Гэты від транспартных зносін быў асабліва зручны ўзімку, калі водныя перашкоды замярзалі. У Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай пад 1256 г. гаворыцца аб Мантвіле Жамойцкім, які «насылал казацкими дорогами Литву на плендрование краев, обачивши ку тому и зиму тугую для прибытия рек, озер и бродов». Усталёўваўся, «ставился» зімнік — санны шлях, які нярэдка праходзіў па льду рэк і па-ранейшаму звязваў асноўныя гарады і паселішчы. Улетку рэкі адыгрывалі ролю шляхоў зносін падчас перамяшчэння на ўсход на лодках з выкарыстаннем волакаў пры пераходзе з аднаго воднага басейна ў другі: «... а гды где мъли з войском тягнути, то и лоди тыи з собой везли и тягли» [3. Стб. 18].

Важнейшым этапам развіцця тэхналогіі дарожнага будаўніцтва ранняга сярэднявечча на беларускіх землях было выкарыстанне дрэва як матэрыялу для машчэння гарадскіх вуліц і маставога матэрыялу пры пераходзе праз водныя перашкоды.

Верагодна, яшчэ ў эпоху неаліту пры фарміраванні пастаянных сцежак да паселішчаў, да кавалкаў зямлі, якія апрацоўваліся па берагах рэк, галіны дрэў і хмызнякоў і ствалы дрэў пачынаюць выкарыстоўвацца як дапаможны матэрыял пры пераходах праз брудныя месцы, ручаіны, вузкія рэкі. Як тэхнала-

гічны будаўнічы працэс гэты навык замацоўваецца з развіццём тэхнікі апрацоўкі дрэва (нарыхтоўка бярвенняў, расшчамленне іх на дошкі, выдаленне галін). Па меры эвалюцыі будаўнічай тэхнікі і ўзрастання патрэбы ва ўстойлівых сувязях грэблі праз балоты або вузкія водныя рэчышчы ўсталёўваюцца шляхам звязвання галін пучкамі (зрошчванне) і ўкладкай бярвенняў у некалькі радоў, часам з замацаваннем іх адзін з адным. Магчыма, на каменні-валуны таксама абапіраліся такія прымітыўныя масткі.

Аднак праблемай уладкавання ўстойлівых камунікацыйных сувязей (вуліц і дарог) былі не толькі водныя перашкоды, але і ў цэлым звышвільготная глеба, што асабліва характэрна для вясенняга і восеньскага сезонаў ва ўмовах беларускага клімату і ландшафту.

У X—XIII стст. на беларускіх землях развіваецца тэхніка драўлянага будаўніцтва (у тым ліку зрубная тэхніка), якая заснавана на эмпірычным усведамленні працы канструкцыі, нясучай і нясомай яе частак, іх узаемасувязі. Удасканаленне інструмента (сякера, прымітыўная ручная піла) і тэхнікі апрацоўкі дрэва дазваляе ствараць не толькі аб'ёмныя збудаванні разнастайнага прызначэння, але і канструяваць гарызантальныя дарожныя машчэнні.

Гэтыя тэхналогіі прымяняліся ў старажытных беларускіх гарадах (Полацк, Бярэсце, Гарадок, Мсціслаў і інш.) пры машчэнні вуліц. Калі самыя старажытныя маставыя ўяўлялі сабой простыя бярвенні або колатыя дошкі, шчыльна пакладзеныя на зямлю, дык пазней з'яўляюцца 2—3 лагі, пакладзеныя ўздоўж (нясучы элемент), на якія ўкладваліся колатыя дошкі або бярвенні ўпоперак. Археалагічна такія канструкцыі выяўлены ў старажытных гарадах Беларусі, прычым яны выкарыстоўваліся на працягу многіх стагоддзяў (ярусны характар пры раскопках). Маставыя ў Бярэсці носяць яшчэ больш складаны канструктыўны характар. Колатыя дошкі насцілу тут укладваліся па тры лагі ўздоўж, якія, у сваю чаргу, абапіраліся на бярвенні-падкладкі, размешчаныя ўпоперак.

Вядомы гісторык і этнограф XIX ст. П. Шпілеўскі ўзгадвае легенду, паводле якой Бярэсце было заснавана, калі на балоцістым месцы багаты гандляр усталяваў маставую (грэблю) з бярозавых бярвенняў з пакрыццём іх бярозавай карой (бяростай).

Звычайным жа матэрыялам драўляных маставых канструкцый былі сасна і елка, смалістая драўніна якіх рабіла канструкцыі больш доўгатэрміновымі.

Археолагам П. Русавым выяўлены маставыя старажытнага Мінска XIII ст., якія маюць яшчэ больш складаную канструкцыю. Тут выкарыстоўваецца не толькі зрубная тэхніка як элемент, злучаючы папярочныя бярвенні (падмурак маставой) з прадольнымі кладзямі, але і злучэнне колатых дошак маставой з бакавымі бярвеннямі, у сваю чаргу злучаных з папярочнымі падмуркамі. Новым важным элементам былі таксама свайныя фундаменты такіх маставых канструкцый, якія ўсталёўваліся ў выглядзе драўляных сваек (калкоў), забітых у кутах

папярочных падмуркаў. Відавочна, што развітая тэхніка ўладкавання драўляных канструкцый дазваляла не толькі будаваць маставыя гарадоў ранняга сярэднявечча, але і выконваць найбольш простыя масты праз равы ці канавы, асабліва пры падыходах да гарадскіх умацаванняў.

Наступным крокам у развіцці маставой дарожнай тэхнікі на Беларусі сталі каменныя брукаванкі, якія спачатку выкарыстоўваліся як элементы каменных будынкаў; адмосткі перад уваходамі ў каменныя храмы. Аднак ужо ў XII ст. у Гродна з'яўляюцца цэлыя адрэзкі вуліц, брукаваныя каменнем.

5.4. Вобраз шляху ў свядомасці беларуса і яго сувязь з абліччам дарог

Прыродныя фактары і з'явы ў многім вызначалі ўмовы жыццядзейнасці старажытнага чалавека і актыўна ўздзейнічалі на развіццё яго свядомасці. Пры гэтым чалавек толькі вучыўся падпарадкоўваць яе, надзяляючы ўсё жывое і нежывое вакол душой, «анімізіраваў» прыроду.

У першабытнай свядомасці ўсе фактары і з'явы прыроды міфалагізуюцца, надзяляюцца абсалютным сэнсам, архітыпічнымі рысамі, нярэдка становячыся аб'ектамі пакланення. Вядомы старажытнаславянскія культы такіх з'яў прыроды, як сонца, навальніцы, дождж,



Мал. 186. Палявая дарога — сімвал руху ў свядомасці чалавека



Мал. 187. Камень з крыжом — старажытнейшы сімвал і дарожны арыентыр



Мал. 188. Дарогі і рэкі — розныя тыпы шляхоў

урадлівая сіла (Ярыла, Дажджбог, Пярун і інш.). Аб'ектамі вераванняў і культаў станавіліся такія матэрыяльныя прыродныя аб'екты, як вялікія камяні ці дрэвы.

Міфалагічнасць свядомасці старажытнага чалавека актыўна ўздзейнічае на развіццё навыкаў вытворчай дзейнасці, з'яўленне першакрыніц форматворчасці, спосабаў засваення прасторы. Такія працэсы, як уладкаванне ўласнага жытла, родавага паселішча, аранне поля, з'яўляюцца ва ўяўленнях старажытных людзей не толькі матэрыяльным, але і духоўным патрабаваннямі, якія ўзбагачаліся абрадавымі дзеяннямі і формамі.

Сам Рух — неад'емная якасць жыцця, і старажытны чалавек знаходзіць яго ў цыклах прыродных з'яў, у руху сонца, месяца, зорак, у перамяшчэнні жывёл. Рух адбываўся па азначаных маршрутах, лініях, якія таксама ўваходзяць у першабытную свядомасць і становяцца быццам неад'емнымі спадарожнікамі працэсу руху. Лініі могуць указваць напрамак руху, як сляды на снезе, пяску ці траве. Пры фарміраванні родавых паселішчаў і сельскагаспадарчых уладанняў лінія становіцца бачнай мяжой, якая аддзяляе «сваё» ад «чужога». Вось як піша пра гэта даследчык А. Н. Афанасьеў: «...Галава сям'і абыходзіў свае ўладанні па памежнай рысе, паганяючы перад сабой ахвяравальных жывёл, спяваў гімны і прыносіў падарункі» [7]. Мяжа вызначаецца матэрыяльна як утаптаная зямля, баразна ці прасека. Міфалагічная свядомасць старажытных людзей надае гэтым прасторавым лініям асаблівыя сакральныя якасці: тут жывуць багі, якія ахоўваюць межы сваіх уладанняў. У старажытных рымлян гэта Тэрмінус, у старажытных славян — Чур (адсюль рыса, лінія).

Паводле Афанасьева: «па агульным меркаванні індаеўрапейскіх народаў, мяжа была свяшчэннай рысай; памежныя слупы і камяні, усталяваныя для размежавання паселішчаў, служылі рэчавымі, сімвалічнымі знакамі ўладарства родавых пенатаў» [7. С. 71]. Беларусы насыпалі на межах сваіх надзелаў земляныя ўзгоркі, агароджвалі іх частаколам. Магчыма, што і звычай пахавання ля дарог, які ўзгаданы ў Лаўрэнцьеўскім летапісе і прама датычыцца продкаў старажытных беларусаў, таксама быў адной з формаў усталявання памежных слупоў, аддзялення сваёй прасторы ад чужой.

Прыкладна гэтую ж ролю адыгрывалі камяні, якія нярэдка збіраліся з палёў і клаліся ўздоўж межаў, што таксама фарміравала знешні матэрыяльны выгляд дарогі і прымітыўную форму арганізацыі прасторы пастаноўкай спецыяльнага знака. Па некаторых старажытных павер'ях, гэтыя прыдарожныя камяні маглі быць прыстанішчам злых сіл. Адсюль — патрэба «паляпшаць» іх якасці шляхам нанясення петрагліфічных выяў, робячы камяні «сваімі». Пасля хрысціянізацыі беларускіх земляў гэты звычай ператвараецца ў «хрышчэнне» камянёў, нанясенне на іх выяў крыжа як галоўнага рэлігійнага сімвала, здольнага ахоўваць чалавека ў дарозе.

Менавіта міфалагічны вобраз «дарогі» становіцца важнай часткай мно-

гіх язычніцкіх, а пазней і хрысціянскіх абрадаў беларусаў.

«Свая» прастора заўсёды бяспечная, а «чужая» нясе небяспеку, таму дарога, шлях асацыіруюцца ў старажытнай свядомасці з перамяшчэннем у прасторы, з выхадам у яго чужую, неабароненую частку. Адсюль патрэба ў ахове, у дарозе, якую ў язычніцкія часы ў старажытных славян ажыццяўляе Волас (Велес) — «скотий бог» (бог статкаў, пастухоў, людзей і жывёл, якія пастаянна перамяшчаюцца ў прасторы). Волас узгадваецца ў старажытнарускіх летапісах у клятве княгіні Вольгі або ў дамове князя Святаслава з грэкамі.

Пазней, пасля хрысціянізацыі, старажытнаславянскі Велес становіцца святым Уласіем (Аўласам), які таксама цесна звязваецца з траспартнымі сродкамі (канямі) і дарогамі. Вось як пра гэта гаворыцца ў старадаўняй беларускай замове:

«Дай-жа мне, Божа,
Шчасліву дарогу!
Аж святы Юрый
Каня запрагае,
Святы Аўлас дапамагае,
Ад бяды, напасці
Зберагае» [9. С. 40].

Міфалагічныя вераванні старажытнага беларуса праяўляюцца ў абрадах хаджэнняў: абыходаў палёў і жылля, сустрэч і провадаў вясны, новага года, лета (Купалле), выганам скаціны на пашу або падрыхтоўкай коней як асноўнай цяглавай транспартнай сілы.

Міфалагізацыя шляхоў-дарог на самай справе была формай духоўнага (асэнсаванага) усведамлення прасторы, неабходнай складаючай побытавага жыцця беларуса, адным з этапаў яго развіцця. Засваенне было прама звязана з актыўнымі матэрыяльнымі дзеяннямі: накірункам дарог, іх расчысткай, абазначэннем на мясцовасці пастаноўкай слупоў або камянёў, насыпаннем прыдарожных курганоў, падрыхтоўкай і абслугоўваннем транспартных сродкаў.

Літаратура

1. *Полное* собрание русских летописей. Т. 1. М., 1962. 577 с.
2. *Полное* собрание русских летописей. Т. 2. М., 1962. 938 с.
3. *Полное* собрание русских летописей. Т. 32. М., 1975. 233 с.
4. *Нарысы* гісторыі Беларусі. Ч. 1. Мн., 1994. 527 с.
5. *Археалогія* Беларусі. Т. 2. Мн., 2000. 554 с.
6. *Алексеев Л. В.* Полоцкая земля. М., 1966.
7. *Афанасьев А. Н.* Политические воззрения славян на природу. Т. II. М., 1868. 784 с.
8. *Шпилевский П. П.* Путешествие по Полесью и Белорусскому краю. Мн., 2004. 251 с.
9. *Богданович А. Е.* Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Гродно, 1895. 186 с.

Заключэнне

Падсумоўваючы гаворку пра асаблівасці развіцця горадабудаўнічых структур гарадоў Беларусі, можна адзначыць наступныя агульныя заканамернасці.

І. Найбольш старажытныя цэнтры рамяства і гандлю фарміраваліся і як тэрытарыяльна-палітычныя цэнтры раннеславянскіх протанароднасцяў (Полацк, Тураў). Узнікалі яны на стратэгічных кірунках водных шляхоў зносін, перакрыжаваннях водных і сухапутных шляхоў (Полацк, Віцебск, Тураў, Пінск, Брэст, Гродна і інш.).

Як правіла, асноваю старажытных гарадоў служылі ўмацаваныя гарадзішчы.

Усе старажытныя гарады Беларусі ўзнікалі ля сутоку рэк, на аснове мясцовых умацаванняў. Восі водных перашкод вызначалі першапачатковы сектар развіцця горада.

Гарады Беларусі X—XII стст. развіваліся па агульнаславянскай урбаністычнай схеме: град—торг—пасад. Гандлёвая плошча знаходзілася, як правіла, насупраць замкавай брамы. Прасторава-планіровачнае рашэнне гарадоў грунтавалася па цэнтральна-радыяльнай схеме. Пасады ўяўлялі сабою шчыльную сядзібную забудову, якая размяшчалася паабапал вуліц-канцоў.

Цэнтрам (ядром) горада быў умацаваны драўляна-земляны фартыфікацыйны комплекс. Аснову яго складаў земляны вал, увенчаны драўлянымі сценамі і вежамі. З боку міжрэчышча дзядзінец умацоўваўся глыбокім ровам. Некаторыя драўляныя замкі мелі дадатковыя ўнутраныя ўмацаванні (цытадэль). У такім разе астатняя тэрыторыя паміж цытадэллю і валам лічылася вакольным градам. Забудова драўляных замчышчаў (дзядзінцаў) складалася ў асноўным з хорама (сядзібы) князя, военачальніка і жылля дружыннікаў. Маглі знаходзіцца тут і дамы, і майстэрні некаторых рамеснікаў, што абслугоўвалі двор князя і дружыннікаў.

З XI ст. на тэрыторыі дзядзінцаў будуюцца мураваныя цэрквы (Полацк, Віцебск, Тураў, Мінск, Гродна, Ваўкавыск) і драўляныя (Друцк). Даволі хутка царкоўнае будаўніцтва выходзіла і на тэрыторыі пасадаў (Гродна, Траецкае прадмесце і Пятніцкі пляц у Мінску). Узвядзенне белакаменных храмаў (Сафій) сярод драўлянай забудовы паклала пачатак традыцыі спалучэння мураванай сакральнай архітэктуры (цэрквы і кляштары) з дваровай і сядзібнай драўлянай і драўляна-мураванай забудовай, якія атрымалі далейшае развіццё ў XIV—XVIII стст.

У XIII—XIV стст. працягваюць развівацца ранейшыя і ўзнікаюць новыя гарады. Фарміруюцца горадабудаўнічыя інфраструктуры рэгіёнаў Беларусі. Вызначаюцца, акрэсліваюцца гістарычныя правінцыі, цэнтрамі якіх становяцца буйныя гарады: для Паазер'я — Полацк, Віцебск; Падняпроўя — Магілёў; Цэнтральнага рэгіёна — Мінск; Палесся — Брэст, Пінск, Тураў, Мазыр; Панямоння — Гродна, Навагрудак. Сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёнаў абумоўлівае ўзнікненне гарадоў як цэнтраў лакальных тэрыторый, земляў. Гэтыя працэсы выразней абазначыліся пасля ліквідацыі ў Вялікім княстве Літоўскім сістэмы княстваў і ўвядзення адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу на ваяводствы і паветы. Росту гарадоў мясцовага значэння спрыяе развіццё сухапутных шляхоў зносін.

У XIII—XVI стст. адбываецца перамяшчэнне гарадскога цэнтра ад абарончых збудаванняў да грамадска-культавых. Гэты працэс ідзе паступова, па меры росту магутнасці дзяржавы і пераходу да яе стратэгічных абарончых функцый. Умацаванні працягваюць адыгрываць значную ролю ў забудове гарадоў, размешчаных на мяжы набегаў і ваенных сутыкненняў: Магілёў, Рэчыца, Слуцк, Мінск. Тут сітуацыя вымусіла абносіць тэрыторыі пасадаў валамі, будаваць бастыёны, што накладвае адбітак на фарміраванне вулічнай сеткі і кірунак развіцця горада.

У XV—XVI стст. магутным фактарам, які карэнным чынам змяніў горадабудаўнічую сістэму, стала распаўсюджанне магдэбургскага права. Гэта абумовіла прыярытэт комплексаў грамадска-адміністрацыйных і культавых будынкаў у фарміраванні планіроўкі гарадоў. У гарадах Беларусі на змену раннесярэднявечнай схемы град—торг—пасад прыходзіць новая, заходнееўрапейская: град—пасад з торгам у цэнтры. У буйных рэгіянальных і павятовых гарадах утвараюцца новыя цэнтры развіцця: гандлёвая плошча, ратуша, гандлёвыя рады, будынкі гарадскога самакіравання. Узнікаюць паняцці Старога горада (з замкам) і Новага горада.

Планіровачная структура гарадоў пачынае развівацца на аснове вуліц, што адыходзяць ад плошчы ў кірунку галоўных сухапутных шляхоў зносін. Узнікаюць сектары і кварталы забудовы. У XIII—XVI стст. гарадская сядзібная забудова ўяўляла сабою комплекс са шматлікімі жылымі і гаспадарчымі пабудовамі, ворыўнымі землямі і нават сенажацямі.

Культавае і грамадскае будаўніцтва спрыяе развіццю мураванага дойлідства ў архітэктуры гарадоў. Цэнтры апошніх становяцца амаль цалкам мураванымі. У XV—XVI стст. увогуле ў забудове гарадоў рэзка павялічваецца вага мураваных і мяшаных, драўляна-мураваных, фахверкавых канструкцый. Інвентары і гравюры XV—XVII стст. сведчаць, што ў такіх гарадах, як Гродна, Брэст, Нясвіж, Клецк, Навагрудак, Слонім, мураваная і фахверкавая забудова пераважала. Пры ўзвядзенні грамадскіх і жылых будынкаў выкарыстоўваліся двух- і трохпавярховыя рашэнні, складаныя формы дахаў, мансарды, мезаніны і г. д.

У забудове некаторых гарадоў заходніх рэгіёнаў у XIII—XIV стст. мела працяг мураванае будаўніцтва (мяшаная каменна-цагляная муроўка), якое прыйшло сюды з раманскай і гатычнай архітэктуры Еўропы. У XII ст. элементы раманскай архітэктуры прысутнічалі ў муроўцы сцен Гродзенскага замка і Каложскай царквы. У XIII—XIV стст. гатычныя рысы праявіліся ў формах і канструкцыях замка Вітаўта ў Гродне, Барысаглебскай царквы ў Навагрудку. Гатычныя формы і канструкцыі прысутнічаюць і ў шматлікіх дамах рамеснікаў і мяшчан, зафіксаваных на гравюрах Гродна, Клецка, Нясвіжа XVI—XVII стст.

II. На прынцыпы фарміравання гістарычных тыпаў замкаў і крэпасцяў аказвалі ўплыў фактары грамадскіх адносін і ступень грамадскага развіцця. Аднак некаторыя элементы архітэктуры пры трансфармацыі і ўдасканаленні іншых гістарычных этапах захоўвалі свае рацыянальныя магчымасці ў новых умовах.

Тып і моц абарончага збудавання заўсёды залежалі ад стратэгіі, што вызначала ступень доўгачасовасці і масавасці ваеннага сутыкнення.

На формы абарончых збудаванняў уплывалі прыродна-ландшафтныя фактары. Умовы рэльефу падказвалі аптымальныя формы плана і вышынных суадносін форм умацавання.

На беларускай зямлі сфармавалася некалькі гістарычных тыпаў абарончых умацаванняў: замкі (замчышчы) раннесярэднявечных гарадоў (як правіла, былыя гарадзішчы); феадальныя вотчынныя замкі і так званыя «новыя» замкі ў прыватнаўладальніцкіх мястэчках і гарадах.

На любым гістарычным этапе аснову абарончага збудавання складалі земляныя ўмацаванні, валы. У X—XIII стст. гэта былі дасканалыя і прадуманыя ў інжынерным сэнсе збудаванні з унутраным канструкцыйным начыннем, якое павышала як уласную моц насыпу, так і яго нясучыя магчымасці як падмурка для сцен і вежаў. У XIV—XVI стст. са з'яўленнем артылерыі ў Беларусь з Еўропы прыходзяць новыя тыпы земляных умацаванняў галандскай і італьянскай фартыфікацыйных школ: фарты, бастыёны. Бастыённыя валы пяцікутнай формы вянчаюць вуглы замкавых і крапасных пляцовак. Дакладна і ўдала ўзведзеныя валы і бастыёны дазвалялі іншы раз мець надзейную абарону і без дадатковых сцен і вежаў (Заслаўе).

Вялікай разнастайнасці і дасканаласці дасягнулі ў сваім развіцці драўляныя абарончыя канструкцыі. На змену прымітыўнаму частаколу і сценам тыпу «паркан» ужо ў XI—XII стст. прыходзяць зрубныя гародні і тэрасы — двух'ярусныя, з пераходамі ўнутры і баявымі галерэямі звонку. Умацаванні з гародняў і тэрас з'яўляюцца асноўнымі ва ўсходніх рэгіёнах Беларусі. Яны ўжываюцца пры будаўніцтве як замкаў, так і ўмацаванняў гарадоў. Канструкцыі з гародняў паспяхова выкарыстоўваюцца ў XVI ст. супраць артылерыі (Ула).

У X—XIII стст. сфарміраваліся асноўныя тыпы драўляных вежавых канструкцый: вежы-чацверыкі, шасцерыкі, васьмерыкі (круглікі). Цяс-

лярскае майстэрства і веданне тэхнічных магчымасцяў дрэва дазвалялі ўзводзіць не толькі двух'ярусныя, але і чатырох-, пяціярусныя вежы пад стромкімі дахамі з дазорнымі пляцоўкамі ў дахавай канструкцыі. Высокія фартыфікацыйныя вартасці шмат'ярусных вежаў забяспечылі іх выкарыстанне і ў XIV—XVII стст., асабліва ва ўсходніх рэгіёнах, ва ўмовах прымянення агнястрэльнай зброі. У драўляных вежах віцебскіх умацаванняў у XVII ст. абсталёўваліся гарматныя і мушкетныя ярусы. Гарматы паспяхова размяшчаліся ў вежах Копысі і Шклова.

Асобную групу ўмацаванняў складалі брамныя вежы. У X—XIII стст. склаліся іх два асноўныя тыпы: аднавежавыя і двухвежавыя брамы. Аднавежавыя брамы — тыпова ўсходнеславянскі варыянт, яго аналагі — Залатыя вароты ў Кіеве, Уладзіміры і г. д. Шырока выкарыстоўвалася размяшчэнне ў вежавай частцы надбрамнай царквы (Вострая брама ў Вільні). Двухвежавыя брамы хутчэй прыйшлі з раманскай Еўропы. Бакавыя вежы такіх брам выкарыстоўваліся для размяшчэння ваяроў, варты. Існавалі варыянты, калі бакавыя вежы злучаліся пераходным ярусам (Копысь, Радашковічы).

Драўляныя ўмацаванні X—XVII стст. мелі зрубную канструкцыю з кругляка, дахі — на самцах (суцэльны ці разрэджаны закот), з дранкавым (шчэпавым) пакрыццём. Канструкцыйныя вырашэнні вылучаюцца кансерватызмам, які абумоўлены трапна знойдзенымі прыёмамі і веданнем уласцівасцяў матэрыялу. У раннесярэднявечны перыяд былі вядомы вуглавыя звязкі ў «чашку», выбар «драчкі» для гарызантальнай шчыльнай падгонкі бярвенняў. Ведалі цесляры і прыёмы мацавання бярвенняў пры дапамозе нагеляў, нарошчвання даўжыні сцен праз слупы-шулы. Дасканалыя былі і зрубныя, самцовыя канструкцыі дахаў (суцэльны закот, разрэджаны закот). Цесляры X—XIII стст. умелі расколваць бярвенні на брус, дошку, валодалі прыёмамі шчапання дору, дранкі. Выпрацаваныя ў абарончым драўляным дойлідстве канструкцыйныя прыёмы і формы ў наступныя стагоддзі знаходзілі ўжыванне і развіццё ў сакральным і грамадзянскім будаўніцтве.

Мураванае абарончае дойлідства Беларусі пачало фарміравацца ў X—XII стст. у заходніх рэгіёнах. Пад уплывам архітэктуры цэнтральных і заходніх рэгіёнаў Еўропы тут у XII ст. пачалі рабіць мураваныя сцены, а таксама драўляна-мураваныя (фахверкавыя). У XIII—XIV стст. ужо вядомы мураваныя вежы, брамы, комплексы жылых збудаванняў, складскіх будынкаў, казармаў у структуры замкавых комплексаў (замак Вітаўта ў Гродна). У XIV ст. у Панямонні набывае распаўсюджанне тып замка чатырохкутнага плана з вежамі па дыяганалі (Крэва, Ліда). У замкавым дойлідстве Панямоння XIII—XIV стст. выразна прасочваюцца гатычныя рысы, якія маюць, аднак, своеасаблівую мясцовую інтэрпрэтацыю.

III. У XI—XIII стст. на тэрыторыі Беларусі існавалі рэгіянальныя школы муравана-сакральнага дойлідства. Найбольш ранняй і буйнейшай была полацкая школа, прадстаўле-

ная помнікамі Полацка, Спаса-Еўфрасіннеўскага і Бельчыцкага манастыроў. Храмы полацкай школы мелі шэраг спецыфічных асаблівасцяў. Полацкая Сафія вылучалася муроўкай, пабудаванай на чаргаванні валуноў з пластамі плінфы і беларужовай цамянкі, якое стварала сакавіты каларыт. Муроўка мінскага храма XII ст. грунтавалася на спалучэнні валуноў і вапняковых блокаў, што характэрна помнікам раманскай архітэктуры. Муроўка віцебскай школы вылучаецца чаргаваннем каменных блокаў з радамі плінфы. Яе каларыстыка ўзмацнялася расшыўкай швоў.

Колеравасцю і пластычнасцю вылучалася муроўка гродзенскай школы дойлідства. У масіў сцяны ўключаліся рознакаляровыя валуны, паліваная кераміка, маёлікавыя плітки. Блізкія прыклады існуюць у Галіцка-Валынскім рэгіёне, некаторых раёнах Германіі і Паўночнай Італіі, што дае падставы бачыць у помніках гэтай школы праявы асаблівасцяў генезісу архітэктуры Цэнтральнай Еўропы рамана-гатычнай эпохі. Тураўскі храм XII ст. даследчыкі схільныя адносіць да кіеўскай архітэктурнай школы. Яго адметнасць — раўнапластавая муроўка без утопленых радоў.

У XIV—XVI стст. забудова сакральных комплексаў грунтуецца на прынцыпах архітэктурна-планіровачнага супадпарадкавання. Ролю дамінанты адыгрывае храм і яго вежавыя формы. Многія сакральныя ансамблі захоўваюць абарончыя рысы. Працягваецца развіццё рэгіянальных архітэктурных школ: віленскай, гродзенскай, мінскай, полацкай, віцебскай, магілёўскай, пінскай.

Змест

УВОДЗІНЫ *(А. І. Лакотка)* 5

ГЛАВА 1. Градостроительство Беларуси IX–XIV вв. *(Ю. В. Чантурия)* 64

ГЛАВА 2. Мураваная сакральная архітэктура беларускіх земляў XI–XIII стст.: старажытнарускі перыяд *(Т. В. Габрусь)* 106

ГЛАВА 3. Мураваная сакральная архітэктура Беларусі перыяду Вялікага княства Літоўскага да стварэння Рэчы Паспалітай (канец XIII – трэцяя чвэрць XVI ст.). Готыка і рэнесанс *(Т. В. Габрусь)* 212

ГЛАВА 4. Абарончая архітэктура Беларусі X–XIVстст. у кантэксце славянскай і агульнаеўрапейскай будаўнічай культуры *(А. Н. Кулагін)* 296

ГЛАВА 5. Архітэктура шляхоў зносін IX–XIII стст. *(А. С. Сардараў)* 374

Заключэнне *(А. І. Лакотка)* 387

Навуковае выданне

Лакотка Аляксандр Іванавіч,
Габрусь Тамара Віктараўна,
Кулагін Анатоль Мікалаевіч і інш.

АРХІТЭКТУРА БЕЛАРУСІ.
НАРЫСЫ ЭВАЛЮЦЫІ ВА ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКІМ І ЕЎРАПЕЙСКІМ КАНТЭКСЦЕ

У чатырох тамах

Том 1

IX–XIV стст.

Рэдактары: *Н. Б. Губар, Т. А. Гарбачэўская.* Карэктар *Т. С. Клімовіч.*
Мастак *А. А. Кулажэнка.* Мастацкі рэдактар *В. А. Жахавец.*
Тэхнічны рэдактар *Т. В. Лецьен.* Камп'ютэрная вёрстка *Л. І. Кудзерка.*

Падпісана ў друк 28.11.2005 г. Фармат $70\times100^{1}/_{16}$. Папера мелаваная. Гарнітура Пецярбург. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 31,6. Ум. фарб.-адб. 128,3. Ул.-выд. арк. 30,1. Тыраж 1000. Заказ 3120.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі дом «Беларуская навука». ЛИ № 02330/0131569 ад 11.05.2005 г. 220141. Мінск, вул. Ф. Скарыны, 40.

ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа». 220600, Мінск, Чырвоная, 23.

ISBN 985-08-0681-8

9 789850 806818





Мінск
«Беларуская навука»